ПОСТАНОВЛЕНИЕ МИНИСТЕРСТВА ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
27 июля 2017 г. № 90

Об утверждении учебных программ по учебным предметам для I–III классов учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования

В соответствии с частью первой пункта 12 статьи 167 Кодекса Республики Беларусь об образовании Министерство образования Республики Беларусь ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Утвердить прилагаемые:

1.1. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская мова (Навучанне грамаце)» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.2. Учебную программу по учебному предмету «Русский язык» для I класса учреждений общего среднего образования с белорусским языком обучения и воспитания;

1.3. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Матэматыка» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.4. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.5. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Выяўленчае мастацтва» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.6. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Музыка» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.7. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.8. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.9. Учебную программу по учебному предмету «Русский язык (Обучение грамоте)» для I класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.10. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання;

1.11. Учебную программу по учебному предмету «Математика» для I класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.12. Учебную программу по учебному предмету «Человек и мир» для I класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.13. Учебную программу по учебному предмету «Изобразительное искусство» для I класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.14. Учебную программу по учебному предмету «Музыка» для I класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.15. Учебную программу по учебному предмету «Трудовое обучение» для I класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.16. Учебную программу по учебному предмету «Физическая культура и здоровье» для I класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.17. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.18. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.19. Учебную программу по учебному предмету «Русский язык» для II класса учреждений общего среднего образования с белорусским языком обучения и воспитания;

1.20. Учебную программу по учебному предмету «Русская литература (литературное чтение)» для II класса учреждений общего среднего образования с белорусским языком обучения и воспитания;

1.21. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Матэматыка» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.22. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.23. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Выяўленчае мастацтва» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.24. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Музыка» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.25. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.26. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.27. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.28. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання;

1.29. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання;

1.30. Учебную программу по учебному предмету «Русский язык» для II класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.31. Учебную программу по учебному предмету «Русская литература (литературное чтение)» для II класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.32. Учебную программу по учебному предмету «Математика» для II класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.33. Учебную программу по учебному предмету «Человек и мир» для II класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.34. Учебную программу по учебному предмету «Изобразительное искусство» для II класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.35. Учебную программу по учебному предмету «Музыка» для II класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.36. Учебную программу по учебному предмету «Трудовое обучение» для II класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.37. Учебную программу по учебному предмету «Физическая культура и здоровье» для II класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.38. Учебную программу по учебному предмету «Основы безопасности жизнедеятельности» для II класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.39. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання;

1.40. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання;

1.41. Учебную программу по учебному предмету «Русский язык» для III класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания;

1.42. Учебную программу по учебному предмету «Русская литература (литературное чтение)» для III класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения и воспитания;

1.43. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Замежная мова (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская)» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.44. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Матэматыка» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.45. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.46. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Выяўленчае мастацтва» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.47. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Музыка» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.48. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.49. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.50. Вучэбную праграму па вучэбным прадмеце «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання;

1.51. Учебную программу по учебному предмету «Иностранный язык (английский, немецкий, французский, испанский, китайский)» для III класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.52. Учебную программу по учебному предмету «Математика» для III класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.53. Учебную программу по учебному предмету «Человек и мир» для III класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.54. Учебную программу по учебному предмету «Изобразительное искусство» для III класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.55. Учебную программу по учебному предмету «Музыка» для III класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.56. Учебную программу по учебному предмету «Трудовое обучение» для III класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.57. Учебную программу по учебному предмету «Физическая культура и здоровье» для III класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания;

1.58. Учебную программу по учебному предмету «Основы безопасности жизнедеятельности» для III класса учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания.

2. Настоящее постановление вступает в силу через 15 рабочих дней после его подписания.

Министр **И.В.Карпенко**

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская мова (Навучанне грамаце)»
для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навучанне грамаце з'яўляецца пачатковым этапам сістэматычнага вывучэння беларускай мовы, забяспечвае лінгвістычнае і разумовае развіццё навучэнцаў, вырашае задачы эстэтычнага і маральнага выхавання.

У працэсе навучання грамаце вучні не толькі авалодваюць моўнымі навыкамі – фанетычнымі, граматычнымі, лексічнымі, але і засвойваюць камунікатыўныя ўменні ў сферы зносін паміж сабой і з дарослымі. Важным з'яўляецца фарміраванне культуры маўлення і маўленчых зносін.

Чытанне і пісьмо як важныя віды маўленчай дзейнасці спачатку выступаюць толькі ў якасці прадмета навучання, а пасля становяцца сродкам навучання і развіцця навучэнцаў.

Мэты навучання грамаце фарміраванне базавых ведаў, уменняў і навыкаў чытання і пісьма, агульнавучэбных уменняў, навыкаў і спосабаў дзеянняў; развіццё асноўных відаў вуснага і пісьмовага маўлення, пазнавальнага інтарэсу; выхаванне маральна-этычных якасцей, эмацыянальна-каштоўных адносін да навакольнай рэчаіснасці, культуры зносін. Пры гэтым веды, уменні і навыкі разглядваюцца не як мэта, а сродак паўнацэннага развіцця асобы дзіцяці.

Асноўнымі **задачамі** навучання грамаце выступаюць:

– развіццё фанематычнага слыху (уменне распазнаваць і выдзяляць асобныя гукі ў слове і складзе, вызначаць іх паслядоўнасць);

– фарміраванне правільнага вымаўлення гукаў беларускай мовы, засваенне літар беларускага алфавіта і развіццё умення суадносіць іх з адпаведнымі гукамі;

– навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму;

– развіццё цікавасці да чытання як сродку пазнання, фарміраванне чытацкага кругагляду, уменняў працы з рознымі крыніцамі інфармацыі;

– узбагачэнне слоўнікавага запасу;

– развіццё звязнага вуснага маўлення;

– фарміраванне уменняў вучэбнай дзейнасці.

Вядучымі падыходамі да пабудовы вучэбнага працэсу выступаюць *асобасна арыентаваны, лінгвакультуралагічны і кампетэнтнасны*.

Асобасна арыентаваны падыход прадугледжваена ўлік інтарэсаў навучэнцаў і вызначэнне перспектыў развіцця кожнага навучэнца з улікам яго магчымасцей і здольнасцей.

У якасці галоўнага арыенціра *культуралагічнага падыходу* выступае фарміраванне творчай асобы навучэнца, развіццё яго як чалавека культуры, здольнага да культурнага самаразвіцця.

Кампетэнтнасны падыход прадугледжвае атрыманне ў працэсе навучання грамаце асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў.

Да *асобасных вынікаў* належаць цікавасць да вывучэння беларускай мовы, сфарміраванасць асобаснага сэнсу яе вывучэння і каштоўнасных адносін да мовы; пазітыўныя адносіны да чытання, жаданне самастойна чытаць дзіцячыя кнігі; імкненне

авалодаць пісьмом як сродкам зносін, які дазваляе выражаць свае думкі ў пісьмовай форме.

Метапрадметныя вынікі уключаюць наступныя складальнікі: дзейсны (здольнасць да актыўнай творчай дзейнасці ў пазнанні моўных з'яў), інтэлектуальны (валоданне элементарнымі дзеяннямі аналізу, сінтэзу, параўнання, абагульнення, класіфікацыі моўных адзінак), камунікатыўны (уменне ўстанаўліваць кантакты, разумець выказванні іншага чалавека і выражаць свае пачуцці, эмоцыі, жаданні, задаваць пытанні, аргументаваць свае суджэнні), інфармацыйны (здольнасць арыентавацца ў такіх крыніцах інфармацыі, як кніга, расказ дарослага або аднагодкаў, схема; прымяняць атрыманую інфармацыю ў сваёй дзейнасці).

Прадметныя вынікі ўключаюць валоданне элементарнай тэхнікай чытання і пісьма; валоданне першапачатковымі ўяўленнямі пра лексічныя, арфаэпічныя, граматычныя нормы беларускай мовы, правілы маўленчага этыкету; здольнасць будаваць нескладаныя звязныя выказванні для вырашэння камунікатыўных задач; валоданне ўменнем спісываць тэкст, невялікі па аб'ёму, пісаць пад дыктоўку асобныя словы і сказы; валоданне пачатковымі навыкамі сэнсавага чытання тэксту, чытацкай самастойнасці, наяўнасць чытацкага кругагляду – уяўленняў пра творы, іх аўтараў, жанры.

Курс навучання грамаце заканамерна падпарадкоўваецца ***агульным прынцыпам*** пабудовы зместу адукацыі: культураадпаведнасці, прадуктыўнасці, гуманізацыі, аптымізацыі, дыферэнцыяцыі, свядомасці і актыўнасці навучэнцаў, пераемнасці адукацыі і інш.

Важным прынцыпам навучання грамаце з'яўляецца прынцып *мульцікультурнасці* арыентацыі на асваенне нацыянальнай культуры ў адзінстве з агульначалавечымі каштоўнасцямі. У працэсе навучання грамаце ажыццяўляецца нацыянальна-культурная сацыялізацыя дзіцяці, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці на аснове лепшых узораў вуснай народнай творчасці і класічнай літаратуры для дзяцей.

Навучанне чытанню і пісьму арганізуецца ў адпаведнасці з прынцыпамі *прыродаадпаведнасці і індывідуалізацыі*, што мае на ўвазе ўлік узроставых і індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў шасцігадовага ўзросту.

Навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму ажыццяўляецца на аснове ***гукавога аналітыка-сінтэтычнага метаду*** з шырокім выкарыстаннем гульнявых метадаў і прыёмаў.

У навучанні грамаце вызначальным з'яўляецца складовы (пазіцыйны) прынцып беларускай графікі. Ён знаходзіць свае ўвасабленне ў абазначэнні мяккасці зычных і гука [й`] на пісьме. Толькі ў кантэксце склада, арыентуючыся на наступную галосную, вучань здольны вызначыць цвёрдасць і мяккасць зычнага і правільна прачытаць склад.

У працэсе навучання вучні знаёмяцца з гукавой сістэмай беларускай мовы, авалодваюць дзеяннямі гукавога аналізу слова, уменнем адрозніваць зычныя і галосныя гукі, знаёмяцца з літарамі як знакамі для абазначэння гукаў на пісьме.

На ўроках навучання грамаце ажыццяўляецца развіццё фанематычнага слыху дзяцей, азнаямленне вучняў з асноўнымі лінгвістычнымі паняццямі – гукам, словам, сказам. Навучэнцы атрымліваюць уяўленне пра складовую структуру слова, націск.

Змест навучання грамаце пабудаваны такім чынам, каб большасць зычных гукаў і іх літар прадстала перад вучнямі раней за галосныя гукі і іх літары. На фоне засвоеных зычных гукаў і адпаведных літар у дзяцей фарміруецца асэнсаванне галоснага ў складзе. Навучанне чытанню прамых складоў ажыццяўляецца «па падабенству» – *ма, на, ра, та, са* і г.д. Папярэдняе вывучэнне літар зычных гукаў дазваляе вучням хутка авалодаць чытаннем прамых складоў з кожным галосным гукам, што вывучаецца, і перайсці да чытання слоў.

Пасля асваення чытання склада і слова па складах вучні авалодваюць прыёмамі цэласнага чытання слова. Пачынаючы з этапа авалодання чытаннем цэлымі словамі і словазлучэннямі (сказамі), чытанне можа выступаць у якасці сродку навучання розным прадметам.

Паралельна з навучаннем чытанню ажыццяўляецца ***падрыхтоўка рукі дзіцяці да пісьма і навучанне ўласна пісьму***. Першакласнікі вучацца абазначаць на пісьме гукі літарамі, складаць словы з літар і складоў, правільна спісваць літары, склады, словы і кароткія сказы з пісьмовавага і рукапіснага шрыфтоў, пісаць пад дыктоўку словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем, і кароткія сказы з такіх слоў.

На ўроках пісьма развіваюцца мелкія мышцы рукі, адпрацоўваюцца правільныя напісанні літар і іх рацыянальныя злучэнні ў словах, рытмічнасць і плаўнасць пісьма.

Адна з задач навучання пісьму – фарміраванне выразнага, разборлівага, дастаткова прыгожага пісьма, якое з'яўляецца неад'емнай прыметай культуры пісьмовых зносін. Нядбайнае пісьмо абцяжарвае цэласнае ўспрыманне інфармацыі.

З мэтай захавання здароўя навучэнцаў выключаецца патрабаванне абавязковага безадрыўнага напісання літар, складоў і слоў. У час пісьма дзіцяці неабходны чаргаванні напружанняў і расслабленняў. Вучань мае права рабіць невялікія паўзы пасля прапісвання асобных элементаў, літар і складоў. Гэта дае магчымасць своечасова зняць мускульнае напружанне рукі і цела.

На занятках па ***пазакласным чытанні*** ў вучняў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання.

Змест курса навучання грамаце структураваны па раздзелах: *навучанне грамаце; пазакласнае чытанне; развіццё маўлення.*

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

(180[1] гадзін)

[1] Настаўнік сам вызначае неабходную колькасць гадзін на кожную тэму, зыходзячы з уласнага вопыту, улічваючы падрыхтаванасць вучняў, умовы іх работы.Урокі навучання грамаце могуць быць камбінаванымі: на адным і тым жа ўроку настаўнік можа вучыць як чытанню, так і пісьму.

У навучанні грамаце вылучаюць перыяды: падрыхтоўчы (дабукварны), асноўны (букварны) і заключны (паслябукварны).

НАВУЧАННЕ ЧЫТАННЮ

Падрыхтоўчы (дабукварны) перыяд (6 г)[2]

[2] На вывучэнне асобных тэм у вучэбнай праграме даецца прыкладная колькасць гадзін.

Агульнае ўяўленне аб вусным і пісьмовым маўленні

Падзел вуснага маўлення на сказы, фарміраванне элементарнага асэнсавання функцыі сказа (сказ выражае думку, у ім пра кагосьці або пра штосьці гаворыцца). Вызначэнне паслядоўнасці і колькасці слоў у сказе. Прыдумванне сказаў па малюнках з зададзенай колькасцю слоў, з апорай на схемы. Адлюстраванне з дапамогай схемы слоўнага складу сказа, яго лінейнасці (словы ідуць адно за адным). Работа над інтанацыяй сказа.

Знаёмства з намінатыўнай роляй слова, з тым, што слова мае значэнне (сэнс) – словамі называюць прадметы, іх прыкметы і дзеянні. Называнне аднаго і таго ж аб'екта рознымі словамі (*заяц, зайка, зайчык, бяляк...*). Знаёмства з разнастайнасцю слоў (этыкетныя словы і выразы, формы слоў са значэннем ацэнкі (мамачка, сынок, дачушка, добранькі …), словы розных тэматычных груп («Радзіма», «сваякі», «школьныя прылады» …) і інш.).

Выдзяленне зычнага гука ў пачатку слова. Адрозніванне на слых і пры вымаўленні цвёрдых і мяккіх зычных. Падбор слоў з зададзеным гукам.

Асноўны (букварны) перыяд (70 г)

Вывучэнне 10 літар, якія абазначаюць зычныя гукі (С, П, М, Т, Л, Н, Ш, Р, К, Д). Суаднясенне цвёрдых і мяккіх зычных гукаў і адпаведных літар. Распазнаванне літар па іх характэрных прыкметах (ізалявана і ў слове).

Падзел слоў на склады, вызначэнне колькасці і паслядоўнасці складоў у слове, абазначэнне складовага саставу слова на схеме.

Знаёмства з націскным складам. Вычляненне са слова і называнне націскнога склада. Знаёмства з сэнсаадрознівальнай роляй націску (праз параўнанне слоў тыпу *ка'ра – кара'*).

Вывучэнне галосных гукаў і адпаведных ім літар ***А а, Я я, У у, І і, О, о,ы.*** Правільнае суаднясенне гукаў і літар.

Распазнаванне галоснага гука ў складах тыпу ЗГ («цвёрды зычны + галосны»). Чытанне такіх складоў пачаргова з вывучанымі літарамі галоснага гука (**а, у, о, ы**).

Адрозніванне на слых і пры вымаўленні зычных і галосных гукаў, цвёрдых і мяккіх зычных. Выдзяленне ў словах асобных гукаў. Гукавы аналіз слова (вызначэнне паслядоўнасці гукаў у слове, іх характарыстыка – галосны ці зычны, галосны націскны ці ненаціскны, зычны цвёрды ці мяккі). Падбор слоў з зададзеным гукам. Знаёмства на практычным узроўні са звонкімі і глухімі зычнымі.

Цэласнае чытанне трох- і чатырохлітарных слоў. Фарміраванне навыку чытання на тэкстах, якія складаюцца са слоў са складамі ЗГ на кожную вывучаную літару галоснага гука.

Абазначэнне літарамі зычных і галосных гукаў. Знаёмства з мяккім знакам і апострафам. Літары ***Я я, Ю ю, Е е, Ё ё***, якія ўказваюць на мяккасць папярэдняга зычнага. Чытанне слоў і тэкстаў з вывучанымі літарамі.

Паступовае навучанне свядомаму, правільнаму і плаўнаму чытанню ўголас і моўчкі асобных слоў, кароткіх сказаў і невялікіх тэкстаў, зразумелых дзецям па змесце, на аснове правільнага і хуткага пазнавання літар, арыенціроўкі на літару галоснага гука.

Практычнае знаёмства са знакамі прыпынку пры чытанні сказаў («.», «!», «?», «,»).

Чытанне сказа з паўзамі і інтанацыямі, адпаведнымі знакам прыпынку.

Знаёмства з правіламі гігіены чытання.

Заключны (паслябукварны) перыяд (14 г)

Абагульненне, замацаванне ведаў і ўменняў, набытых у працэсе падрыхтоўчага і асноўнага перыядаў навучання грамаце.

Удасканаленне навыку чытання. Навучанне прыёмам цэласнага чытання слова, плаўнаму, свядомаму чытанню сказа. Развіццё навыкаў асэнсаванага чытання невялікіх твораў розных жанраў (вершаў, апавяданняў, казак, забаўлянак, загадак, прыказак і інш.).

Развіццё ўмення чытаць тэкст выразна, перадаваць свае адносіны да прачытанага.

Чытанне дыялогаў па асобах. Інсцэніраванне невялікага знаёмага твора.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па раздзеле «Навучанне чытанню»

Ведаць і разумець:

разумець, што мова з'яўляецца асноўным сродкам зносін паміж людзьмі, што беларуская і руская мовы – дзяржаўныя мовы Рэспублікі Беларусь;

ведаць усе літары беларускага алфавіта, асноўныя характарыстыкі гукаў мовы (галосныя і зычныя гукі, зычныя мяккія – цвёрдыя, звонкія – глухія);

разумець асноўнае адрозненне гукаў ад літар (гукі чуем і вымаўляем, літары бачым і чытаем);

ведаць спосабы абазначэння мяккасці зычных гукаў на пісьме літарамі ***е, ё, і, ю, я*** і мяккім знакам.

Умець:

вычляняць слова ў сказе, гукі ў слове, вызначаць іх паслядоўнасць;

адрозніваць галосныя і зычныя гукі;

правільна вымаўляць мяккія і цвёрдыя зычныя гукі ў слове і ізалявана;

падбіраць словы з зададзеным гукам;

вызначаць месца націску ў слове;

злітна чытаць аднаскладовыя і двухскладовыя словы і плаўна па складах – шматскладовыя;

чытаць невялікія тэксты і вусна расказваць аб прачытаным.

***Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў паўсядзённых зносінах і ў практычнай дзейнасці*:**

самастойна або па пытаннях настаўніка пераказваць добра знаёмы праслуханы або прачытаны мастацкі твор;

самастойна чытаць друкаваны тэкст, адрасаваны дзіцяці (запіскі, невялікія пісьмы, інфармацыйныя паведамленні).

Навучанне пісьму (90 г)

Падрыхтоўчы (дабукварны) перыяд (6 г)

Падрыхтоўка рукі дзіцяці да пісьма: расфарбоўка, маляванне ўзораў, абвядзенне па контуры, штрыхоўка ў розных напрамках, напісанне элементаў літар, іх злучэнне.

Выпрацоўка правільнай паставы навучэнца, асваенне правіл размяшчэння сшытка на парце, умення трымаць ручку пры пісьме.

Асноўны (букварны) перыяд (70 г)

Абазначэнне гукаў адпаведнымі літарамі друкаванага (на ўроках чытання) і пісьмовага шрыфтоў. Знаёмства з напісаннем усіх вялікіх і малых літар, асноўнымі тыпамі іх злучэнняў. Выпрацоўка звязнага і рытмічнага напісання літар і іх злучэнняў у словах, правільнае суаднясенне літар па велічыні, нахілу, раўнамернае размяшчэнне літар і слоў у радку.

Запіс слоў і сказаў з прагаворваннем па складах пасля папярэдняга іх склада-гукавога разбору з настаўнікам, а затым і самастойна.

Засваенне алгарытму спісвання. Спісванне слоў і сказаў з узораў (пісьмовых і друкаваных) з арфаграфічным прагаворваннем. Праверка напісанага праз параўнанне з узорам.

Засваенне алгарытму пісьма пад дыктоўку. Пісьмо пад дыктоўку літар, складоў і слоў, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем.

Вялікая літара ў пачатку сказа, кропка ў канцы яго. Вялікая літара ў імёнах і прозвішчах людзей, мянушках жывёл, назвах гарадоў, вёсак, краін, рэк, азёр.

Знаходжанне слоў, напісанне якіх разыходзіцца з вымаўленнем (словы з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі).

Фарміраванне ўмення пераводзіць друкаваны тэкст ў пісьмовы. Замацаванне і ўдасканаленне прадуктыўных спосабаў чытання слоў і сказаў. Чытанне пісьмовага тэксту.

Удасканальванне работы маўленчага апарату навучэнцаў, навыкаў склада-гукавога аналізу слоў, развіццё вуснага маўлення.

Заключны (паслябукварны) перыяд (14 г)

Удасканальванне навыку пісьма. Захаванне вучнямі асноўных гігіенічных патрабаванняў да пісьма. Замацаванне графічна правільных напісанняў літар і спосабаў злучэння іх у слове. Практыкаванні дзяцей у рытмічным напісанні літар, складоў, слоў, невялікіх сказаў (з 2–3 слоў).

Удасканальванне ўмення правільна (без пропускаў і перастановак літар і складоў) спісваць невялікія тэксты з дошкі і падручніка, пісаць словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем.

Падзел слоў на склады, перанос слоў па складах.

Практычнае прымяненне правіл аб вялікай літары ў імёнах і прозвішчах людзей, мянушках жывёл, назвах гарадоў, вёсак, краін, рэк, азёр; аб напісанні сказаў (вялікая літара ў пачатку, кропка ў канцы сказа).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па раздзеле «Навучанне пісьму»

Ведаць і разумець:

ведаць усе літары беларускага алфавіта;

разумець асноўнае адрозненне гукаў ад літар (гукі чуем і вымаўляем, літары бачым і пішам);

ведаць спосабы абазначэння мяккасці зычных гукаў на пісьме літарамі ***е, ё, і, ю, я*** і мяккім знакам.

Умець:

правільна, без скажэнняў пісаць вялікія і малыя літары, іх злучэнні ў словах;

правільна спісваць словы і сказы, напісаныя ад рукі і надрукаваныя;

граматна (без пропускаў, скажэнняў літар) пісаць пад дыктоўку словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем;

ужываць вялікую літару ў пачатку, кропку ў канцы сказа;

ужываць вялікую літару ў пачаткуўласных імёнаў (імёнаў і прозвішчаў людзей, мянушак жывёл, назваў краін, гарадоў, вёсак, рэк і азёр).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў паўсядзённых зносінах і ў практычнай дзейнасці:

самастойна падпісаць работу (малюнак, выраб і інш.), выкарыстоўваючы вялікую літару для запісу свайго імя;

самастойна скласці і запісаць невялікае паведамленне (1–2 сказы), адрасаванае бацькам або сябру;

самастойна чытаць пісьмовы тэкст, адрасаваны дзіцяці (запіскі, невялікія пісьмы, інфармацыйныя паведамленні).

ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ[1]

[1] Пазакласнае чытанне праводзіцца адзін раз у два тыдні, займаючы другую частку ўрока чытання.

На занятках па пазакласным чытанні ў навучэнцаў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання. Вядучы метад навучання – чытанне-разгляд дзіцячых кніг.

Кола чытання. Невялікія мастацкія творы беларускіх і рускіх (у перакладзе на беларускую мову) пісьменнікаў (1–2 старонкі) з дзіцячай кнігі аб'ёмам 10–20 старонак, назва якой, ілюстрацыі на вокладцы і ў тэксце поўнасцю адпавядаюць яе зместу. Дзіцячыя кнігі ў адпаведным афармленні (багата ілюстраваныя, з буйным шрыфтам).

Тэматыка чытання. Творы для чытання настаўнікам услых: аўтарскія, народныя творы (вершы, дзіцячыя песні, казкі, загадкі, прыказкі, прымаўкі, апавяданні). Асноўныя тэмы дзіцячага чытання: пра Радзіму, дзяцей, сяброўства, працу, жывёл, расліны, прыгоды і чарадзейства.

Работа з дзіцячай кнігай. Пашырэнне ўяўленняў аб тэматыцы дзіцячых кніг. Знаёмства з новымі кнігамі (адна кніга на кожных занятках); выхаванне цікавасці да дзіцячых кніг, выпрацоўка ўмення адрозніваць кнігі па змесце, правільна называць іх, прачытваючы прозвішча аўтара і загаловак; удзел у самых простых літаратурных гульнях па прачытаных у класе кнігах; выкарыстанне ўзораў літаратурнай мовы (загадкі, песенькі і г. д.); выкананне правіл гігіены чытання і захавання кніг.

У *паслябукварны перыяд* працягваецца работа па фарміраванні ўменняў правільна называць кнігу (загаловак, прозвішча аўтара), чытаць услых назву дзіцячай кнігі на вокладцы, тлумачыць назву і суадносіць са зместам твора, пазнаваць знаёмыя эпізоды і сітуацыі на ілюстрацыях дзіцячых кніг, называць герояў, узнаўляць змест эпізоду або сітуацыі з апорай на ілюстрацыю, расказваць аб прачытаным.

Знаёмства са школьнай бібліятэкай. Выбар кнігі ў бібліятэцы (кніжная выстава, ілюстраваны рэкамендацыйны спіс, плакат).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па раздзеле «Пазакласнае чытанне»

***Ведаць і разумець*:**

ведаць асноўныя правілы знаёмства з новай кнігай;

разумець неабходнасць выканання правіл гігіены чытання і захавання кніг.

Умець:

правільна называць знаёмыя кнігі, персанажаў любімых казак, апавяданняў;

інсцэніраваць вядомыя літаратурныя творы, асобныя эпізоды з твораў.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў паўсядзённых зносінах і ў практычнай дзейнасці:

самастойна або пры дапамозе дарослых (выкладчыка, бібліятэкара, бацькоў) выбіраць кнігу па тэме, якая зацікавіла;

самастойна чытаць невялікія па аб'ёме творы з кніг і часопісаў для дзяцей, расказваць пра прачытанае.

РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ[1]

[1] Праца па развіцці маўлення праводзіцца на кожным уроку на працягу вучэбнага года.

Гукавая культура маўлення. Развіццё слыхавой памяці і маўленчага апарату, увагі да гукавога боку мовы (сваёй і чужой). Удасканальванне моўных навыкаў: навучанне нармальнаму тэмпу і рытму маўлення, правільнаму моўнаму дыханню, патрэбнай гучнасці (уменне гаварыць без напружання) і правільнаму інтанаванню (уменне паніжаць і павышаць голас).

Навучанне вымаўленню слоў у адпаведнасці з нормамі арфаэпіі, з захаваннем націску.

Правільнае вымаўленне гукаў роднай мовы, дакладнае ўжыванне падобных гукаў, якія найбольш часта блытаюцца навучэнцамі: [л]–[р], [с]–[з], [ш]–[ж], [п]–[б], [с]–[ш] і г.д. (ізаляванае вымаўленне, а таксама ў словах, фразах і скорагаворках).

Работа над словам. Удакладненне, узбагачэнне і актывізацыя слоўніка навучэнцаў. Правільнае разуменне і ўжыванне слоў – назваў прадметаў, прымет, дзеянняў і тлумачэнне іх значэння. Тэматычная групоўка слоў, іх рода-відавое суаднясенне.

Назіранне за сэнсавымі адценнямі слоў (*слон, слонік, сланяня*). Адрозніванне і разуменне самых простых выпадкаў мнагазначнасці слоў (*іголка швейная, медыцынская і інш.*), аманіміі (*лісічкі, каса*).

Выкарыстанне правільнай граматычнай формы слоў.

Выкарыстанне слоў ветлівасці.

Работа над сказам і звязным маўленнем. Абдумванне адказаў на пытанні настаўніка, дакладнае іх фармуляванне, ужыванне ў адказе сказаў рознага тыпу.

Пераказ знаёмай казкі ці невялікага апавядання (па пытаннях настаўніка).

Складанне па малюнку ці серыі малюнкаў невялікага апавядання (пад кіраўніцтвам настаўніка).

Адказы на пытанні па прачытаных сказах і тэкстах.

Слоўнае маляванне з дапамогай настаўніка па прачытаным. Дапаўненне сюжэта, самастойнае прыдумванне падзей, як папярэдніх, так і наступных да адлюстраваных.

Выказванне сваіх уражанняў ад прагледжаных мультфільмаў, тэлеперадач, тэатральных спектакляў, экскурсій, назіранняў.

Адгадванне загадак, тлумачэнне сэнсу прыказак і прымавак, блізкіх да жыццёвага вопыту навучэнцаў.

Завучванне на памяць вершаў, пацешак, песень, лічылак і ўзнаўленне іх з захаваннем інтанацыі, якая дыктуецца зместам.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па раздзеле «Развіццё маўлення»

Ведаць і разумець:

разумець важнасць умення правільна гаварыць на беларускай мове, захоўваць правілы маўленчага этыкету.

Умець:

правільна вымаўляць гукі беларускай мовы;

правільна ўжываць у маўленні словы па сэнсе, выбіраць найбольш прыдатныя словы для выражэння думкі;

карыстацца вобразнымі выразамі (эпітэтамі, параўнаннямі, метафарамі і да т.п.);

правільна змяняць словы па формах, будаваць сказы розных тыпаў;

утвараць словы з дапамогай суфіксаў (у лісы – лісяня; будуе – будаўнік і да т.п.), прыставак (ляцець – пераляцець, прыляцець);

самастойна або па пытаннях настаўніка пераказваць добра знаёмы праслуханы або прачытаны мастацкі твор;

складаць апавяданне па малюнку, серыі малюнкаў, на зададзеную тэму, расказваць пра падзеі з асабістага жыцця;

інсцэніраваць вядомыя літаратурныя творы, асобныя эпізоды з твораў;

ведаць на памяць 4–6 вершаў, выразна іх дэкламаваць.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў паўсядзённых зносінах і ў практычнай дзейнасці:

арфаэпічна правільна вымаўляць словы беларускай мовы;

інтанацыйна выразна афармляць сваё выказванне;

падтрымліваць размову на знаёмую тэму, адбіраючы неабходныя моўныя сродкі для вырашэння пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач (праяўляць разуменне і ўзаемаразуменне, задаваць пытанне, адказваць, выказваць пажаданне, згоду або нязгоду, завяршаць размову).

Кантрольныя пісьмовыя работы: кантрольнае спісванне – 1 (II паўгоддзе, 15–20 слоў).

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Учебная программа по учебному предмету «Русский язык» для I класса учреждений общего среднего образования с белорусским языком обучения и воспитания

Русский язык

Пояснительная записка

Цель обучения: формирование у учащихся языковых, коммуникативно-речевых умений, обеспечивающих эффективное общение на русском языке в устной и письменной речи.

Задачи обучения:

в рамках языковой компетенции:

формирование представлений о системе русского языка;

усвоение произношения специфических звуков русского языка [г], [г'], [р'], [ч'], [щ'], [д'], [т'] и написания букв *и, щ, ъ*;

усвоение знаний из области фонетики, лексики, морфемики, морфологии, синтаксиса;

овладение произносительными, орфографическими, пунктуационными нормами языка и формирование на их основе орфоэпических, орфографических, пунктуационных умений и навыков;

формирование элементарных способов анализа изучаемых явлений языка (звуко-буквенный разбор слов, разбор слов по составу, по частям речи, по членам предложения);

в рамках коммуникативно-речевой компетенции:

овладение всеми видами речевой деятельности;

обогащение словарного запаса учащихся;

развитие связной устной и письменной речи учащихся, умения пользоваться языком во всех видах речевой деятельности (слушание, говорение, чтение, письмо);

формирование умения работать с орфографическим и толковым словарями;

усвоение речеведческих понятий (текст; тема, основная мысль, заголовок текста; трёхчастное строение текста; план текста; типы текстов);

формирование умения адекватно понимать информацию устного и письменного сообщения (определять тему, основную мысль);

формирование умения отбирать языковые средства для создания собственных высказываний в соответствии с темой и основной мыслью;

овладение формулами речевого этикета;

формирование культуры речевого общения и поведения;

в рамках лингвокультурологической компетенции:

знакомство с элементами культуры и быта русского народа;

обогащение речи учащихся лексикой, пословицами, поговорками, отражающими национальный колорит и мудрость народа;

формирование ценностного отношения к русскому языку как хранителю культуры народа и духовного наследия всего человечества и одновременно воспитание уважения к культуре и языкам других национальностей;

развитие интеллектуальных и творческих способностей учащихся, нравственных качеств личности средствами языка;

развитие устойчивого интереса к изучению русского языка;

развитие интеллектуальных и творческих способностей учащихся, нравственных качеств личности средствами языка;

в рамках метапредметной компетенции:

формирование универсальных (общеучебных) умений и навыков, главными из которых являются умения целеполагания, планирования, контроля, оценки (регулятивные).

Задачи обучения русскому языку решаются в единстве с решением воспитательных задач, неразрывности и взаимодействия языка, культуры и личности ученика.

Направления обучения

Коммуникативная направленность обучения предусматривает взаимосвязанное обучение языку и речи. Теоретические сведения служат средством, обеспечивающим речевое общение в различных видах речевой деятельности. Знакомство с новым языковым явлением, его введение осуществляется не изолированно, а в тексте, предложении, с указанием на его связи с другими явлениями языка, на особенности его употребления в речи. Такой подход способствует развитию у учащихся способности (умений и навыков) решать языковыми средствами коммуникативные задачи в разных ситуациях общения.

Образовательные подходы

Компетентностный подход обусловлен социальными потребностями общества в компетентной, творческой личности с продуктивным типом мышления, способной к культурному саморазвитию, самостоятельному овладению знаниями и способами деятельности, решению конкретных проблем и задач в различных жизненных сферах. Он означает перенос акцента с процесса усвоения знаний на результат обученности учащихся, когда качество обучения русскому языку определяется способностью учащихся эффективно общаться на русском языке в устной и письменной форме. Особенностью компетентностного подхода является также метапредметность – установка на формирование у учащихся универсальных (общеучебных) умений, главными из которых являются умения целеполагания, планирования, контроля, оценки (регулятивные).

Культурологический подход означает реализацию единства и взаимодействия языка, культуры и личности в процессе обучения; направленность содержания обучения на комплексное формирование у учащихся средствами русского языка познавательных способностей, воспитание духовных, нравственных качеств личности; приобщение учащихся к культурным ценностям, выработанным народом; осознания себя как личности, принадлежащей к определенному культурному и языковому сообществу.

Личностно-деятельностный подход является интегрирующим средством в решении заявленных задач обучения русскому языку на I ступени общего среднего образования. Данный подход реализует основные требования к современному учебному процессу. В центре внимания находится ученик с его интересами, потребностями, способностями. Роль учителя не сводится к простой «передаче» знаний. На первый план выдвигается его организаторская и коммуникативная деятельность по созданию условий для учебного общения; организация обучения как сотрудничество и диалог с учащимися, при котором учащийся в процессе обучения выступает не объектом воздействия слова учителя, а субъектом общения с ним на уровне личностного общения. Процесс обучения при этом выстраивается как обучение *учебной деятельности* по овладению *речевой деятельностью* (слушание, говорение, чтение, письмо) на русском языке. Личностно-деятельностный подход в обучении содействует развитию у учащихся языковых и творческих способностей, воспитанию социально значимых качеств личности, пробуждает интерес к созидательной творческой деятельности.

Компетенции и содержание, обеспечивающее их формирование.

Реализация компетентностного подхода в обучении русскому языку учащихся I ступени общего среднего образования проявляется в направленности процесса обучения на формирование у учащихся языковой, коммуникативно-речевой, лингвокультурологической, метапредметной компетенций, в совокупности обеспечивающих развитие умений и навыков эффективного владения русским языком.

Языковая компетенция формируется в процессе усвоения знаний о единицах языка (звук, слог, слово, морфема – окончание, корень слова, приставка, суффикс), предложение, текст; формирование представлений об особенностях функционирования единиц языка в речи, усвоение языковых норм (орфоэпических, орфографических, пунктуационных).

Коммуникативно-речевая компетенция связана с усвоением речеведческих понятий и формированием на их основе умения понимать готовые тексты; отбирать языковые средства и создавать собственные устные и письменные высказывания с учетом целей, задач, ситуации общения, а также правил речевого этикета и социальных норм поведения.

Лингвокультурологическая компетенция формируется через дидактический материал, в процессе работы с текстами различных жанров, в которых закреплены основные нравственные ценности народа и которые отражают историю и культуру русского и белорусского народов. Учащийся осознает себя носителем языка, личностью, которая через язык усваивает систему общечеловеческих и национальных ценностей, культуру речевого общения и поведения.

Метапредметная компетенция связана с формированием у учащихся универсальных (общеучебных) умений и навыков, уровень освоения которых в значительной степени влияет на успешность обучения в последующих классах.

Принципы отбора содержания обучения

Системно-описательный принцип, в соответствии с которым языковой материал в курс русского языка отбирается и изучается в последовательности, отражающей многоуровневый характер русского языка.

Дифференциально-систематический принцип требует, чтобы при отборе языкового материала учитывались языковые явления русского языка, не совпадающие с аналогичными языковыми явлениями белорусского языка, требующие повышенного внимания к ним в процессе обучения.

Принцип функциональности. Опора на принцип функциональности в отборе содержания обучения означает, что языковые сведения должны отбираться с учетом их значимости и важности для решения коммуникативных задач обучения на I ступени общего среднего образования.

Принцип *минимизации* языкового материала при определении содержания обучения русскому языку базируется на учете возрастных и психологических особенностей в характере познавательной деятельности учащихся начальных классов. На основе принципа минимизации отбор языкового материала в учебную программу осуществлён в объёме, который обеспечивает достижение заявленных целей и задач обучения русскому языку учащихся на I ступени общего среднего образования.

Принцип *преемственности и перспективности* в отборе содержания обучения русскому языку проявляется в соблюдении преемственности между дошкольной ступенью образования и начальной школой и перспективности между начальной и базовой школой на содержательном, деятельностном, коммуникативном и эмоциональном аспектах.

Ситуативно-тематический принцип, положенный в основу отбора содержания устного курса русского языка (1 кл.), позволил выделить перечень конкретных тем и ситуаций общения, которые актуальны для учащихся, учитывают их познавательный интерес и возрастные особенности.

Принцип *концентрической организации* и представления содержания языкового материала в программе обеспечивает многократное обращение к изученному материалу с постепенным его расширением и углублением на каждом новом этапе обучения.

Изучаемые разделы языка

Языковой материал в программе представлен системой понятий, определений, теоретических сведений, объединённых таким образом, чтобы создать теоретическую основу для формирования грамматических, орфографических, коммуникативно-речевых умений и навыков.

Структурно программа по русскому языку состоит из трех самостоятельных разделов: «Устный курс русского языка» (I класс), «Вводный курс. Особенности русского языка» (II класс), «Язык и речь» (II–IV классы). В каждом из разделов решаются свои конкретные задачи, которые подчинены цели и основным задачам обучения русскому языку учащихся I ступени общего образования.

Устный курс русского языка (1 кл.)

Устный курс представляет собой предварительный этап в системе обучения русскому языку учащихся учреждений общего среднего образования с белорусским языком обучения и выполняет в основном адаптационную роль. Он направлен на формирование у учащихся первоначальных умений и навыков речевой деятельности на русском языке (слушание и говорение) как основы коммуникативной компетенции. Его главным задачами является формирование умения воспринимать (слушать, слышать и понимать) русскую устную речь, отличать её от белорусской устной речи; постановка путём имитирования произношения специфических звуков русского языка [г], [г'], [р'], [ч'], [щ'], [д'], [т'] и формирование умения правильно произносить их в изученных словах, скороговорках, в заученных наизусть стихотворениях; обогащение словарного запаса учащихся русской лексикой и формирование умения использовать в речевых

высказываниях изученную лексику; усвоение и активизация в устной речи формул речевого этикета (приветствия, прощания, благодарности); чтение отдельных слов, графический облик и лексический смысл которых совпадают в русском и белорусском языках; знакомство с элементами культуры и быта русского народа; осознание красоты, богатства, выразительности и ценности русского языка как духовно-культурного наследия народа; воспитание нравственных и эстетических качеств личности через восприятие произведений русской классической и современной детской литературы и устного народного творчества. Поставленные задачи решаются через содержание устного курса, учебный материал в который отобран на основе *ситуативно-тематического* к принципа. Реализация ситуативно-тематического заключается в определении перечня конкретных тем и ситуаций общения на русском языке, которые актуальны для учащихся 1 класса, учитывают их познавательный интерес и возрастные особенности. Одновременно лексическое наполнение и речевые модели каждой темы обеспечивают элементарное общение учащихся на русском языке в простейших жизненных ситуациях. Презентация учебного материала позволяет уже с первых уроков включать учащихся в речевое общение на русском языке и тем самым реально осуществлять коммуникативную направленность в обучении русскому языку учащихся учреждений общего среднего образования с белорусским языком обучения.

Вводный курс (2 кл.)

Само название «*Вводный курс»* говорит о пропедевтическом характере данного раздела, усвоение которого должно обепечить базу для последующего изучения русского языка. «Вводный курс» является интегрированным курсом, совмещающим в себе задачи обучения чтению и письму на русском языке. Он целиком построен на фонетико-графическом материале, отобранном в результате сопоставительного анализа звуковых систем русского и белорусского языков, составляющем специфику русского языка. Учащиеся знакомятся со звуко-буквенной системой русского языка, специфическими, по сравнению с белорусским языком, звуками [г], [г'], [р'], [ч'], [щ'], [д'], [т'] и буквами *и, щ, ъ*. У них формируются навыки нормативного произношения специфических звуков, а также формируется умение писать слова, предложения с буквами *и, щ, ъ,* отсутствующими в белорусском языке. В процессе чтения и слушания текстов разных жанров происходит накопление и обогащение словарного запаса русской лексикой; формируются умения и навыки, направленные на развитие связной речи (ответы на вопросы по содержанию прочитанных и воспринятых на слух текстов, пересказ несложных текстов, составление небольших высказываний по образцу, по вопросам учителя, по картинкам). Учащиеся упражняются в списывании отдельных слов, предложений, небольших текстов; в составлении словосочетаний и предложений; учатся производить звуковой анализ односложных и двусложных слов. Занятия на этом этапе обучения проводятся в виде интегрированных уроков – без разделения на уроки языка и чтения.

Язык и речь (2–4 кл.)

Звуки и буквы. Главной задачей раздела «Звуки и буквы» является формирование у учащихся умения соотносить звук и обозначающую его букву, осознавать неоднозначность связей, существующих между звуком и буквой; формирование навыков русского литературного произношения и правописных навыков. Учащиеся узнают о смыслоразличительной роли звуков (букв); о слоге и слогообразующей роли гласных звуков; об ударных и безударных гласных звуках и способах проверки написания безударных гласных; о твёрдых и мягких согласных звуках и способах обозначения мягкости и твёрдости согласных на письме; о звонких и глухих согласных звуках; знакомятся с явлениями оглушения парных звонких и глухих согласных в определенных позициях и способах проверки написания парных звонких и глухих согласных в этих позициях; учатся производить звуко-буквенный разбор слов. В процессе изучения раздела «Звуки и буквы» закладываются основы орфографической грамотности учащихся. На практическом уровне они подводятся к осознанию ведущего принципа русской орфографии – морфолого-фонематического.

Слово. Языковой материал раздела **«Слово»** направлен на воспитание у учащихся внимания и интереса к слову, его значению; на развитие умения творчески и осознанно подходить к выбору слов для построения собственных высказываний. У них формируются первичные представления о слове как двусторонней единице, обладающей формой и лексическим значением. Учащиеся узнают об однозначных и многозначных словах, о словах с прямым и переносным значением (на практическом уровне); знакомятся с синонимами и антонимами; с фразеологизмами (на практическом уровне); с межъязыковой омонимией в русском и белорусском языках (на практическом уровне); с орфографическим и толковым словарями русского языка и приёмами работы с ними. Большое внимание уделяется обогащению, развитию и активизации словарного запаса учащихся, работе с пословицами, поговорками, фразеологизмами.

Состав слова. Правописание слов. При изучении состава слова у учащихся формируются представления о значимых частях слова (морфемах) как носителях лексического и грамматического значения слова (корне, приставке, суффиксе, окончании); о роли приставок, суффиксов в образовании новых слов и выражении их смысла; формируется умение ориентироваться в структуре слова; умение проводить разбор слов по составу и опираться на него при решении орфографических задач. Работа над составом слова включает элементы словообразовательного анализа. Внимание учащихся обращается на семантику некоторых морфем, составляющих слово, что способствует осознанию учащимися роли морфем в формировании лексического значения слова, развивает внимание и интерес к происхождению слов, способствует обогащению словаря учащихся, развитию их языкового чутья, мышления. Языковой материал на правописание слов включает широкий круг правил, алгоритмов на правописание безударных гласных, парных звонких и глухих согласных, непроизносимых согласных в корне слова; написание слов с разделительным ***ъ;*** слов с двойными согласными в корне слова, на стыке приставки и корня, корня и суффикса. Вводится понятие об орфограмме, которое используется как рабочий термин при изучении правописания слов.

Части речи. Учащиеся знакомятся с морфологическим строем языка, с такими частями речи, как: имя существительное, имя прилагательное, местоимение, глагол, предлог. Части речи рассматриваются в составе предложений, где слова связаны друг с другом по смыслу и грамматически. Особое внимание уделяется признакам каждой изучаемой части речи: *имя существительное* – число, род, падеж, склонение; *имя прилагательное* – число, род (в единственном числе), падеж; *глагол* – время, число, род (в прошедшем времени единственного числа), лицо (в настоящем и будущем времени), спряжение; *местоимение* – число, лицо, падеж личных местоимений. Формируются навыки правописания падежных окончаний имён существительных, имён прилагательных, местоимений; навыки правописания личных окончаний глаголов настоящего и будущего времени, глаголов на ***-тся, -ться***, гласных перед суффиксом ***-л*** в глаголах прошедшего времени; ***не*** с глаголами. Учащиеся знакомятся с *предлогами*, учатся различать приставку и предлог, употреблять в речи и грамотно писать предлоги.

Предложение. На материале раздела «Предложение» ведётся последовательная работа по формированию синтаксического строя речи учащихся. Они получают представление о предложении как минимальной единице речи, которая обладает смысловой и интонационной законченностью и является средством общения людей. Знакомятся с различными видами предложений по цели высказывания (повествовательными, вопросительными и побудительными) и по интонации (восклицательными и невосклицательными), их использованием в разных речевых ситуациях; учатся устанавливать смысловую и грамматическую связь между словами по вопросам; оформлять конец предложений соответствующими знаками препинания. Знакомятся с главными (подлежащее и сказуемое) и второстепенными (без деления на виды) членами предложения; с однородными (главными и второстепенными) членами предложения; с интонацией перечисления и противопоставления однородных членов предложения, с правилами постановки запятых при однородных членах предложения перед союзами ***и, а, но*** (в письменной речи); с обращением (на практическом уровне); со

словосочетаниями в структуре предложения. В результате учащиеся практически осваивают понятие о связи слов в предложении по смыслу и грамматически. Работа над предложением носит сквозной характер, так как весь программный материал изучается на синтаксической основе.

Текст. Основной задачей раздела «Текст» является формирование у учащихся устойчивого внимания и интереса к собственной речи и речи других людей, развитие коммуникативных умений, творческих способностей, расширение возможностей самовыражения. Учащиеся получают представление об устной и письменной, диалогической и монологической формах речи; о признаках текста (тема, основная мысль, заголовок, связь заголовка с темой и основной мыслью, смысловая связь и определённая последовательность предложений в тексте, структура текста). Узнают о типах текстов (описание, повествование, рассуждение); о смысловом единстве структурных частей текста; о роли абзацев в тексте; о плане текста; знакомятся с правилами речевого этикета; учатся письменно пересказывать тексты по вопросам, по коллективно составленному или готовому плану (изложения); составлять тексты по опорным словам и серии сюжетных рисунков (сочинения). Систематическая работа над текстом дает учащимся возможность наблюдать, всесторонне анализировать изучаемые лексические и грамматические явления в их органической взаимосвязи.

Каллиграфия. Задача каллиграфии – развитие и совершенствование навыков графически правильного начертания букв, их соединений в словах; красивого, быстрого, ритмичного письма слов и предложений. Содержание работы, по возможности, должно быть связано с изучаемым на уроке языковым материалом. Упражнения по каллиграфии способствуют воспитанию у учащихся аккуратности, трудолюбия, добросовестности. Во 2 классе осуществляется постепенный перевод учащихся на письмо в тетрадях с разлиновкой в одну линию.

Содержание учебного предмета

I класс

Устный курс русского языка (30 ч)

Содержание устного курса очерчено 20 отобранными темами и ситуациями общения, которые отражены и раскрыты в прозаических и стихотворных текстах русского фольклора (сказки, загадки, скороговорки, считалки, речевки), прозаических и стихотворных текстах русской детской классики и произведениях современных писателей и поэтов. Лексика и речевые модели отобранных тем и ситуаций обеспечивают элементарное общение учащихся на русском языке в различных жизненных ситуациях, способствуют формированию у них нравственной, эмоциональной, эстетической сторон личности. Основной формой представления языкового материала является речевой образец. Литературные тексты предъявляются учащимся как через образцовую русскую речь учителя (чтение и рассказывание), так и в форме звукозаписи, через электронные средства обучения. Прослушивание текстов сопровождается выполнением заданий, направленных на проверку адекватности восприятия учащимися содержания текстов и включение их в творческий процесс создания собственных высказываний на русском языке. Задания предусматривают различные виды деятельности и формы работы, способствующие тому, чтобы каждый учащийся был активным и равноправным участником коммуникативно-речевого процесса на уроке.

Тематика устного курса русского языка

I. Слушаем, запоминаем, говорим, играем – 20 ч.

1. Мы изучаем русский язык – 1 ч.
2. Знакомство – 1 ч.
3. Осень школьная пришла – 1 ч.
4. Давайте дружить – 1 ч.

5. Моя семья – 1 ч.
6. Учимся вежливости –5 ч.
7. Праздник чудный – Новый год – 1 ч.
8. Что такое хорошо, и что такое плохо – 3 ч.
9. Солнце, воздух и вода – наши лучшие друзья – 2 ч.
10. Добро не умрет, и зло пропадет – 1 ч.
11. Мамин день – 1 ч.
12. Без труда не выловишь рыбку из пруда – 1 ч.
13. Кем быть? – 1 ч.

II Слушаем, говорим, учимся читать – 10 ч.

1. В слова играем, друг друга понимаем – 2 ч.
2. Сказка – в жизни подсказка – 2 ч.
3. Наши домашние любимцы – 1 ч.
4. Земное чудо – лес – 1 ч.
5. С любовью к природе – 1 ч.
6. Учимся видеть прекрасное – 2 ч.
7. День за днем – 1 ч.

Виды деятельности

Различение на слух устной русской и белорусской речи. Восприятие на слух текстов. Заучивание наизусть скороговорок, стихотворных текстов. Построение элементарных высказываний: ответы на вопросы по содержанию прослушанных текстов; драматизация, ролевое воспроизведение. Воспроизведение готовых диалогов, разыгрывание диалогов (по образцу, по заданной ситуации). Построение элементарных высказываний в простейших ситуациях общения (по образцу, по заданной ситуации) с использованием формул русского речевого этикета (приветствие, прощание, благодарность, извинение). Произношение специфических русских звуков [г], [г'], [р'], [ч'], [щ'], [д'], [т'] (формирование первоначальных навыков). Раскрашивание и рисование иллюстраций к прослушанным текстам. Лексические игры, разгадывание ребусов, отгадывание загадок. Чтение (эпизодическое, начиная со второго полугодия) отдельных слов, совпадающих по графическому начертанию и лексическому значению в русском и белорусском языках, а также предложений из 2–5 слов.

Основные требования к результатам учебной деятельности учащихся

Раздел «Устный курс русского языка»

Знать:

слова, составляющие лексический минимум каждого урока;

заученные скороговорки, стихотворения;

изученные пословицы;

формулы речевого этикета: приветствия, прощания, благодарности.

Уметь (владеть способами познавательной деятельности):

различать в потоке речи русскую и белорусскую речь;

различать виды речевой деятельности – слушание, говорение, чтение, письмо;

понимать общий смысл прослушанных произведений;

прогнозировать содержание и устанавливать последовательность событий по данным к текстам иллюстрациям и рисункам;

правильно произносить звуки, а также слова, скороговорки, стихи со специфическими русскими звуками [г, г', р', ч', щ', д', т'];

отвечать на вопросы по содержанию текста, опираясь на лексику вопросов;

вести элементарные ситуативные диалоги с 4-6 репликами-вопросами и репликами-ответами;

читать по слогам и складывать из букв разрезной азбуки отдельные слова, совпадающие по графическому начертанию и лексическому значению в русском и белорусском языках, а также предложения из 2–5 слов;

складывать из букв разрезной азбуки отдельные слова.

Использовать приобретенные знания и умения в практической деятельности и повседневной жизни:

для элементарного общения на русском языке (изученные слова, скороговорки, стихи со специфическими русскими звуками [г, г', р', ч', щ', д', т']; формулы речевого этикета: приветствия, прощания, благодарности; изученные пословицы; ситуативные диалоги с 4-6 репликами-вопросами и репликами-ответами.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Матэматыка»
для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

МАТЭМАТЫКА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навучанне матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана на фарміраванне першапачатковых уяўленняў пра матэматыку як пра навуку, якая вывучае колькасныя адносіны і прасторавыя формы сапраўднага свету. Вучэбны прадмет «Матэматыка» садзейнічае развіццю наглядна-вобразнага і славесна-лагічнага мыслення, закладвае асновы для фарміравання ў навучэнцаў алгарытмічнай культуры, пазнавальнай самастойнасці, паказвае магчымасці прымянення матэматычных ведаў у паўсядзённым жыцці.

Мэта навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі – фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для працягу навучання матэматыцы і іншым вучэбным прадметам на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, набыццё першапачатковага вопыту рашэння вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач; фарміраванне пазнавальных працэсаў і мысліцельных аперацый навучэнцаў.

Задачы навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

сфарміраваць уяўленні пра натуральны ліку і лік нуль на аснове вывучэння ўтварэння, паслядоўнасці, чытання, запісу лікаў, іх разраднага саставу, параўнання лікаў і выканання над імі арыфметычных дзеянняў, вымярэння велічынь і рашэння тэкставых задач;

навучыць распазнаваць, будаваць і даследаваць геаметрычныя фігуры, параўноўваць аднародныя велічыні, вызначаць лікавыя значэнні велічынь з дапамогай вымярэнняў і вылічэнняў;

пазнаёміць са спосабамі прадстаўлення інфармацыі з дапамогай малюнкаў, схем, чарцяжоў, дыяграм, тэсктаў, табліц, матэматычнай сімволікі; сфарміраваць пачатковыя ўменні па пабудове мадэляў рэальных сітуацый з колькаснымі данымі;

стварыць умовы для авалодання асновамі лагічнага і алгарытмічнага мыслення, развіцця прасторавага ўяўлення, матэматычнай мовы;

забяспечыць набыццё пачатковага вопыту прымянення матэматычных ведаў для рашэння вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач;

садзейнічаць развіццю цікавасці да матэматыкі, да даследавання матэматычнай сутнасці аб’ектаў навакольнага свету.

Метадычныя прынцыпы адбору зместу навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі

Прынцып вядучай ролі арыфметычнага матэрыялу. У адпаведнасці з дадзеным прынцыпам асноўнае месца ў змесце вучэбнага прадмета «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі адводзіцца фарміраванню паняцця цэлага неадмоўнага ліку.

Прынцып канцэнтрызму ў вывучэнні арыфметычнага матэрыялу. Згодна з дадзеным прынцыпам арыфметычны матэрыял на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі структуруецца па канцэнтрах: спачатку вывучаюцца адназначныя лікі, потым двухзначныя лікі, далей – трохзначныя лікі і мнагазначныя лікі да мільёна. Вылучэнне канцэнтраў звязана з асаблівасцямі дзесятковай сістэмы злічэння. У кожным канцэнтры навучэнцы знаёмяцца са спосабамі ўтварэння, чытання і запісу лікаў, паслядоўнасцю лікаў, вучацца параўноўваць лікі і выконваць над імі арыфметычныя дзеянні.

Прынцып узаемасувязі змястоўных ліній вучэбнага прадмета «Матэматыка»: арыфметычнага матэрыялу, велічынь, геаметрычнага матэрыялу, элементаў алгебры. У адпаведнасці з дадзеным прынцыпам змястоўныя лініі вучэбнага прадмета «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўзаемазвязаны і дапаўняюць адна адну. Вучэбны матэрыял, які вывучаецца ў рамках адной тэмы, спрыяе лепшаму засваенню матэрыялу другой лініі (перавод з адных адзінак вымярэння ў іншыя спрыяе замацаванню нумарацыі лікаў; рашэнне ўраўненняў заснавана на веданні сувязі паміж кампанентамі і вынікамі дзеянняў; вылічэнне перыметра прамавугольніка звязана з веданнем уласцівасцей арыфметычных дзеянняў і інш.). На кожным уроку комплексна рашаюцца задачы па фарміраванні ўяўленняў пра лік, велічыню, геаметрычныя фігуры і элементы алгебры.

Прынцып інтэграцыі вучэбнай матэматычнай тэорыі і практыкі рашэння тэкставых задач з прыкладным зместам. У адпаведнасці з дадзеным прынцыпам асаблівая роля ў вучэбным прадмеце «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі адводзіцца тэкставым задачам, на прыкладзе якіх навучэнцы знаёмяцца з магчымасцямі прымянення матэматычнай тэорыі для рашэння прыкладных праблем.

Прынцып спалучэння гульнявой і вучэбна-пазнавальнай дзейнасці пры навучанні матэматыцы. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вялікае значэнне надаецца выкарыстанню ў навучанні дыдактычных гульняў. У гэты перыяд адбываецца змена вядучага віду дзейнасці (пераход ад гульнявой да вучэбна-пазнавальнай). Дыдактычная гульня інтэгруецца ў вучэбна-пазнавальную дзейнасць, з аднаго боку, ствараючы магчымасці для вывучэння вучэбнага матэрыялу на даступным для навучэнцаў узроўні, з другога боку – стымулюючы развіццё цікавасці да матэматыкі.

Прынцып навучання матэматыцы на аснове дзейнасці мадэліравання. У адпаведнасці з дадзеным прынцыпам навучанне матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана не толькі на засваенне даступнай для навучэнцаў матэматычнай тэорыі, але і на фарміраванне ў іх пачатковых уяўленняў пра метады пабудовы матэматычных мадэляў. Уменне прадстаўляць істотныя характарыстыкі вывучаемых аб’ектаў з дапамогай мадэляў розных відаў спрыяе ўсвядомленаму фарміраванню матэматычных паняццяў і спосабаў дзейнасці, аказвае станоўчы ўплыў на развіццё пазнавальнай самастойнасці навучэнцаў.

Характарыстыка зместу навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі

У змесце вучэбнага прадмета «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вылучаюцца наступныя *асноўныя* лініі:

арыфметычны матэрыял;

велічыні і іх вымярэнне;

геаметрычны матэрыял;

алгебраічны матэрыял.

З дапамогай простых і састаўных *тэкставых* задач навучэнцы ўдакладняюць і абагульняюць веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні арыфметычнага і геаметрычнага матэрыялу, асноўных велічынь і элементаў алгебры. Тэкставыя задачы даюць магчымасць

прымяняць матэматычную тэорыю для вырашэння практычных праблем. У працэсе рашэння задач развіваюцца маўленне, увага, уяўленне і мысленне навучэнцаў. Змест тэкставых задач забяспечвае пашырэнне кругагляду навучэнцаў, дазваляе рэалізаваць выхаваўчую функцыю навучання.

Вядучая роля ў навучанні матэматыцы адводзіцца арыфметычнаму матэрыялу. Арыфметычны матэрыял вывучаецца канцэнтрычна: адназначныя лікі, двухзначныя лікі да 20, лікі ад 21 да 100, трохзначныя лікі, мнагазначныя лікі ад 1000 да 1 000 000. Пераход да новага канцэнтра суправаджаецца не толькі пашырэннем мноства вывучаных лікаў, але і сістэматызацыяй ведаў, увядзеннем новых паняццяў і спосабаў дзеянняў у дзейнасць навучэнцаў. Лінія велічынь, геаметрычны і алгебраічны матэрыял з'яўляюцца спадарожнымі для лініі лікаў і арыфметычных дзеянняў. Знаёмства з велічынямі, вывучэнне элементаў геаметрыі і алгебры размеркавана па адпаведных канцэнтрах.

Арыфметычны матэрыял

Натуральныя лікі і нуль, арыфметычныя дзеянні над імі. У навучэнцаў фарміруюцца ўяўленні пра натуральны лік як вынік лічэння і вымярэння велічынь, пра ўтварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс лікаў, іх разрадным састаў, пра параўнанне лікаў, арыфметычныя дзеянняі над імі (складанне, адніманне, множанне, дзяленне), пра ўласцівасці арыфметычных дзеянняў (перамяшчальная ўласцівасць складання і множання, спалучальная ўласцівасць складання і множання, размеркавальная ўласцівасць множання), а таксама заснаваныя на гэтых уяўленнях уменні і навыкі.

Долі. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы знаёмяцца з паняццем долі як адной з роўных частак цэлага (прадмета, геаметрычнай фігуры, велічыні), вучацца параўноўваць долі на практычнай аснове, рашаць тэкставыя задачы на знаходжанне долі ліку і ліку па яго долі.

Велічыні і іх вымярэнне

У цеснай сувязі з арыфметычным матэрыялам раскрываецца паняцце велічыні. Важным з практычнага пункта гледжання з'яўляецца навучанне вымярэнню велічынь. Навучэнцы атрымліваюць уяўленне аб тым, што лік з'яўляецца вынікам вымярэння велічынь.

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы знаёмяцца з такімі велічынямі, як даўжыня, плошча, маса, час, і з адзінкамі іх вымярэння. Вызначэнне значэнняў гэтых велічынь заснавана на выкарыстанні вымяральных інструментаў і вылічэнняў. Пры рашэнні тэкставых задач навучэнцы таксама знаёмяцца з прапарцыянальнымі велічынямі, лікавыя значэнні якіх вызначаюцца з дапамогай вылічэнняў (хуткасць, час, адлегласць; цана, колькасць, кошт; ураджайнасць, плошча, ураджай і інш.).

Геаметрычны матэрыял

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы знаёмяцца з геаметрычнымі фігурамі (пункт, прамая, адрэзак, ломаная, вугал, многавугольнік, прамавугольнік, квадрат, акружнасць, круг і інш.); вучацца знаходзіць даўжыні адрэзка і ломанай, перыметр многавугольніка, плошчу геаметрычнай фігуры з дапамогай палеткі, вылічваць плошчу прамавугольніка па даўжынях яго старон, будаваць геаметрычныя фігуры. Навучэнцы выконваюць заданні з геаметрычным зместам, накіраваныя на фарміраванне прасторавых уяўленняў. Знаёмства з геаметрычнымі целамі (куб, прызма, піраміда, цыліндр, конус, шар) у працэсе навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на прапедэўтычным узроўні.

Алгебраічны матэрыял

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы знаёмяцца з алгебраічнымі паняццямі (лікавы выраз, роўнасць, няроўнасць, пераменная, выраз з пераменнай,

ураўненне); вучацца чытаць і запісваць выразы, знаходзіць іх значэнні на аснове правіл парадку выканання дзеянняў, адрозніваць правільныя і няправільныя роўнасці і няроўнасці, абазначаць пераменную літарамі лацінскага алфавіта, знаходзіць значэнне выразу пры зададзеным значэнні пераменнай, рашаць ураўненні на аснове ўзаемасувязі паміж кампанентамі і вынікамі арыфметычных дзеянняў.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (120 г)

Параўнанне прадметаў і мностваў прадметаў, прасторавыя і часавыя ўяўленні

Атаясамліванне і адрозніванне прадметаў па адной уласцівасці: форме (круглыя, трохвугольныя, квадратныя, прамавугольныя), памеры (малыя, вялікія), колеры. Прасторавыя ўяўленні: *зверху, знізу, вышэй, ніжэй, злева, справа, лявей, правей, перад, за, паміж, побач*. Часавыя ўяўленні: *спачатку, потым, раней, пазней, да, пасля; раніца, дзень, вечар, ноч*. Поры года: *вясна, лета, восень, зіма*.

Класіфікацыя прадметаў па адной і дзвюх уласцівасцях. Упарадкаванне прадметаў дадзенага мноства. Параўнанне мностваў прадметаў па колькасці: *столькі ж, больш, менш, больш на, менш на*.

Назвы лікаў ад 1 да 20. Лічэнне прадметаў у межах 20.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па раздзеле «Параўнанне прадметаў і мностваў прадметаў, прасторавыя і часавыя ўяўленні»

Ведаць:

прыметы параўнання прадметаў і груп прадметаў;

прасторавыя катэгорыі (*зверху, знізу, вышэй, ніжэй, злева, справа, правей, лявей, перад, за, паміж, побач*);

часавыя катэгорыі: (*спачатку, потым, раней, пазней, да, пасля; раніца, дзень, вечар, ноч; вясна, лета, восень, зіма*);

назвы лікаў ад 1 да 20.

Умець:

лічыць прадметы ў межах 20;

параўноўваць колькасці мностваў прадметаў;

даваць характарыстыку размяшчэнню прадмета ў прасторы;

вызначаць часавую паслядоўнасць падзей;

упарадкоўваць прадметы па памеры.

Адназначныя лікі (42 г)

Назвы, паслядоўнасць і абазначэнні адназначных лікаў ад 1 да 9.

Лік 0 і яго абазначэнне.

Утварэнне ліку дадаваннем адзінкі да папярэдняга ліку, аднімання адзінкі ад наступнага ліку. Знакі «+», «–».

Параўнанне лікаў. Знакі «>», «<», «=».

Састаў адназначных лікаў. Складанне і адніманне адназначных лікаў на практычнай аснове (з дапамогай лічэння прадметаў). Складанне і адніманне з нулём.

Рашэнне простых задач, якія раскрываюць канкрэтны сэнс арыфметычных дзеянняў складання і аднімання.

Прамая. Пункт. Адрэзак.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па раздзеле «Адназначныя лікі»

Ведаць:

спосабы ўтварэння, паслядоўнасць і абазначэнні адназначных лікаў;

састаў адназначных лікаў;

назвы і абазначэнні арыфметычных дзеянняў складання і аднімання;

адносіны паміж лікамі (*больш, менш, роўна*);

матэматычныя знакі «>», «<», «=»;

структуру задачы, узаемасувязь паміж умовай і пытаннем;

назвы геаметрычных фігур (*пункт, прамая, адрэзак*).

Умець:

чытаць, запісваць і параўноўваць лікі першага дзясятка;

утвараць лікі шляхам дадавання адзінкі да папярэдняга ліку, аднімання адзінкі ад наступнага ліку;

дадаваць і аднімаць адназначныя лікі на практычнай аснове (з дапамогай лічэння прадметаў);

рашаць простыя задачы, якія раскрываюць канкрэтны сэнс арыфметычных дзеянняў складання і аднімання.

Двухзначныя лікі (60 г)

Лік 10. Дзясятак. Састаў ліку 10. Утварэнне лікаў ад 11 да 20. Назвы, чытанне і запіс лікаў ад 11 да 20. Дзесятковы састаў двухзначных лікаў у межах 20. Параўнанне лікаў у межах 20.

Назвы кампанентаў і вынікаў складання і аднімання. Перамяшчальная ўласцівасць складання. Узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння складання.

Табліца складання лікаў у межах 10 і адпаведныя выпадкі аднімання. Прыёмы складання і аднімання лікаў: прылічванне (адлічванне) па адным, складанне (адніманне) па частках, складанне з выкарыстаннем перамяшчальнай уласцівасці складання, адніманне з апорай на сувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння складання.

Пазатаблічнае складанне і адніманне лікаў у межах 20 без пераходу праз дзясятак.

Лікавыя выразы ў 1–2 дзеянні з лікамі ў межах 20 без дужак: чытанне, запіс, знаходжанне значэння.

Падбор невядомага кампанента складання (аднімання) па вядомых кампаненту і выніку.

Рашэнне простых задач на павелічэнне (памяншэнне) ліку на некалькі адзінак.

Рашэнне простых задач на вызначэнне ўмяшчальнасці сасуда і аб’ёму вадкасці (у літрах).

Адзінкі даўжыні: *сантыметр, дэцыметр*. Даўжыня адрэзка. Параўнанне адрэзкаў па даўжыні. Вымярэнне даўжыні адрэзка з дапамогай лінейкі. Пабудова адрэзкаў зададзенай даўжыні. Параўнанне лікавых значэнняў даўжыні. Складанне і адніманне лікавых значэнняў даўжыні.

Адзінка часу *гадзіна*. Вызначэнне часу па цыферблатным гадзінніку з дакладнасцю да гадзіны.

Адзінка масы *кілаграм*. Маса прадмета. Параўнанне прадметаў па масе. Знаёмства з вагамі.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па раздзеле «Двухзначныя лікі да 20»

Ведаць:

спосабы ўтварэння, паслядоўнасць і абазначэнні лікаў ад 10 да 20;

дзесятковы склад лікаў ад 10 да 20;

назвы кампанентаў і выніку дзеянняў складання і аднімання;

перамяшчальную ўласцівасць складання;

узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння складання;

табліцу складання лікаў у межах 10 і адпаведныя выпадкі аднімання;

назвы геаметрычных фігур (пункт, прамая, адрэзак, круг, трохвугольнік, квадрат, прамавугольнік);

назвы адзінак даўжыні (дэцыметр, сантыметр), часу (гадзіна), масы (кілаграм).

Умець:

чытаць, запісваць і параўноўваць лікі ў межах 20;

складаць і аднімаць лікі ў межах 20 без пераходу праз дзясятак;

падбіраць невядомыя кампаненты складання (адніманння) па вядомых кампаненце і выніку;

чытаць і запісваць лікавыя выразы ў 1–2 дзеянні без дужак з лікамі ў межах 20, знаходзіць іх значэнні;

рашаць простыя задачы на павелічэнне (памяншэнне) ліку на некалькі адзінак;

рашаць простыя задачы на вызначэнне ўмяшчальнасці сасуда і аб'ёму вадкасці (у літрах);

параўноўваць, складаць і аднімаць лікавыя значэнні вывучаных велічынь;

выражаць значэнне даўжыні ў розных адзінках вымярэння (дэцыметр, сантыметр);

чарціць адрэзак зададзенай даўжыні і вымяраць даўжыню адрэзка;

вызначаць час з дакладнасцю да гадзіны;

распазнаваць і называць вывучаныя геаметрычныя фігуры;

карыстацца вывучанай матэматычнай тэрміналогіяй.

Паўтарэнне вывучанага ў I класе (10 г)

Адназначныя лікі: утварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс. Састаў лікаў у межах 10. Двухзначныя лікі да 20: утварэнне, паслядоўнаць, чытанне, запіс. Дзесятковы састаў двухзначных лікаў да 20. Параўнанне лікаў у межах 20.

Таблічнае складанне лікаў у межах 10 і адваротныя выпадкі аднімання.

Пазатаблічнае складанне і адніманне лікаў у межах 20 без пераходу праз дзясятак.

Знаходжанне значэнняў выразаў у 1–2 дзеянні без дужак з лікамі ў межах 20.

Рашэнне простых задач, якія раскрываюць сэнс арыфметычных дзеянняў складання і аднімання, на памяншэнне і павелічэнне ліку на некалькі адзінак.

Рашэнне простых задач на вызначэнне ўмяшчальнасці сасуда і аб'ёму вадкасці (у літрах).

Геаметрычныя фігуры: распазнаванне квадрата, круга, трохвугольніка, прамавугольніка. Атаясамліванне і адрозніванне фігур па памеры і колеры. Прамая. Пункт. Адрэзак.

Адзінкі даўжыні: *дэцыметр, сантыметр*. Вымярэнне даўжыні адрэзка з дапамогай лінейкі. Пабудова адрэзка зададзенай даўжыні.

Адзінка часу *гадзіна*. Вызначэнне часу па цыферблатным гадзінніку з дакладнасцю да гадзіны.

Адзінка масы *кілаграм*. Параўнанне прадметаў па масе.

Пры вывучэнні матэматыкі ў I класе авалодваюць наступнымі **відамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці**:

аналізаваць вучэбнае заданне (вылучаць умову і патрабаванне);

разумець і супастаўляць інфармацыю, прадстаўленую ў выглядзе тэксту, малюнка, схемы, лікавага выразу або няроўнасці;

разумець інфармацыю, прадстаўленую ў таблічнай форме;

параўноўваць і класіфікаваць прадметы па адной (дзвюх) уласцівасцях;

вызначаць заканамернасці (правіла, паводле якога складзены шэраг прадметаў, фігур, лікаў і інш.) і выкарыстоўваць іх пры выкананні заданняў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць:

прыметы параўнання прадметаў і груп прадметаў;

прасторавыя і часавыя катэгорыі;

спосабы ўтварэння, паслядоўнасць і абазначэнні лікаў ад 10 да 20;

адносіны паміж лікамі (*больш, менш, роўна*), матэматычныя знакі «>», «<», «=»;

састаў адназначных лікаў;

дзесятковы састаў лікаў ад 10 да 20;

назвы і абазначэнні арыфметычных дзеянняў складання і аднімання; назвы кампанентаў і выніку арыфметычных дзеянняў складання і аднімання;

перамяшчальную ўласцівасць складання;

узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння складання;

табліцу складання лікаў у межах 10 і адпаведныя выпадкі аднімання;

структуру задачы, узаемасувязь паміж умовай і пытаннем;

назвы геаметрычных фігур (пункт, прамая, адрэзак, круг, трохвугольнік, квадрат, прамавугольнік);

назвы адзінак даўжыні (дэцыметр, сантыметр), часу (гадзіна), масы (кілаграм).

Умець:

лічыць прадметы ў межах 20;

параўноўваць колькасці мностваў прадметаў;

даваць характарыстыку размяшчэнню прадмета ў прасторы;

апісваць часавую паслядоўнасць падзей;

упарадкоўваць прадметы па памеры;

чытаць, запісваць і параўноўваць лікі ў межах 20;

складаць і аднімаць лікі ў межах 20 без пераходу праз дзясятак;

падбіраць невядомыя кампаненты складання (аднімання) па вядомым кампаненце і выніку;

чытаць і запісваць лікавыя выразы ў 1–2 дзеянні без дужак з лікамі ў межах 20, знаходзіць іх значэнні;

рашаць простыя задачы, якія раскрываюць канкрэтны сэнс арыфметычных дзеянняў складання і аднімання;

рашаць простыя задачы на павелічэнне (памяншэнне) ліку на некалькі адзінак;

рашаць простыя задачы на вызначэнне ўмяшчальнасці сасуда і аб’ёму вадкасці (у літрах);

параўноўваць, складаць і аднімаць лікавыя значэнні вывучаных велічынь;

выражаць значэнне даўжыні ў розных адзінках вымярэння (дэцыметр, сантыметр);

чарціць адрэзак зададзенай даўжыні і вымяраць даўжыню адрэзка;

вызначаць час з дакладнасцю да гадзіны;

распазнаваць і называць вывучаныя геаметрычныя фігуры;

карыстацца вывучанай матэматычнай тэрміналогіяй.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

арыенціроўкі ў навакольнай прасторы;

ацэнкі памераў прадметаў на аснове пачуццёвага ўспрымання, спосабамі прыкладання і накладання;

параўнання прадметаў па масе і сасудаў па ёмістасці;

вызначэння часу па цыферблатным гадзінніку;

канструявання геаметрычных аб’ектаў;

вырашэння ў побыце розных задач, звязаных з лічэннем прадметаў і вылічэннямі.

Кантрольныя работы:

Кантрольная пісьмовая работа – 1 (II паўгоддзе).

Праверка навыкаў вуснага лічэння – 1 (II паўгоддзе).

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Чалавек і свет»
для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ЧАЛАВЕК І СВЕТ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма вызначае мэту, задачы, структуру і змест вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Інтэграваны характар вучэбнага прадмета абумоўлены ўзроставымі псіхалагічнымі асаблівасцямі навучэнцаў, нацэленасцю на фарміраванне асноў светапогляду. Інтэграцыя звестак з прыродазнаўчанавуковых і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (біялогіі, геаграфіі, фізікі, гісторыі, грамадазнаўства, этыкі, медыцыны) спрыяе фармраванню ў навучэнцаў цэласнай карціны свету ва ўзаемасувязі прыроды, грамадства, чалавека.

Асноўным аб'ектам пазнання навучэнцаў на ўроках «Чалавек і свет» выступае натуральная прырода, што дазваляе паспяхова вырашаць задачы фарміравання экалагічнай культуры, закладае фундамент для працягу вывучэння шэрага вучэбных прадметаў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Мэта вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» – фарміраванне асноў навуковага светапогляду, экалагічнай і духоўна-маральнай культуры, уяўленняў і ведаў пра прыроду, грамадства і чалавека, неабходных для рознабаковага ўзаемадзеяння з навакольным светам.

Дасягненне ўказанай мэты прадугледжвае вырашэнне **наступных задач**:

фарміраванне ўяўленняў і паняццяў пра аб'екты прыроды і з'явы, іх разнастайнасць, адзінства прыроднага і сацыяльнага, месца чалавека ў прыродзе і грамадстве;

авалоданне элементарнымі метадамі пазнання прыроды (распазнаванне, назіранне, экперымент);

развіццё эмацыянальна-каштоўнасных адносін да прыроды, пазнавальнай цікавасці да вывучэння аб'ектаў жывой і нежывой прыроды;

фармраванне вопыту прыродаахоўнай дзейнасці, выкананне экалагічна абумоўленых норм паводзін;

засваенне ведаў пра арганізм чалавека, кампаненты здаровага ладу жыцця і спосабы яго рэалізацыі;

пашырэнне ведаў пра нормы і правілы культураадпаведных паводзін ў навакольным сацыяльным асяроддзі, вопыт маральных адносін да людзей;

выхаванне патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, асноў грамадзянскай культуры;

фарміраванне вопыту пазнавальнай і творчай дзейнасці, развіццё прадметных і агульнавучэбных уменняў, адукацыйных кампетэнцый.

Змест вучэбнага прадмета комплексна прадстаўлена трыма ўзаемазвязанымі адукацыйнымі кампанентамі: «Прырода і чалавек» (вядучы кампанет), «Чалавек і яго здароўе», «Чалавек і грамадства». Змястоўны блок «Мая Радзіма – Беларусь» з'яўляецца састаўной часткай кампанента «Чалавек і грамадства» і вывучаецца ў IV класе на беларускай мове.

У аснову адукацыйнага кампанента «Прырода і чалавек» пакладзена канцэпцыя экалагічнай адукацыі асобы, што прадугледжвае фарміраванне ў навучэнцаў асноў

экалагічнай культуры, засваенне сістэмы першапачатковых экалагічных ведаў і ўменняў, прымяненне іх у канкрэтных жыццёвых сітуацыях, выхаванне беражлівых адносін да прыроды, фарміраванне вопыту практычнай прыродаахоўнай дзейнасці.

Вывучэнне кампанета «Прырода і чалавек» у *I класе* пабудавана па прынцыпе сезоннасці, паколькі даступныя дзецям непасрэдныя назіранні за зменамі ў жывой і нежывой прыродзе даюць наглядны матэрыял для засваення ўзаемазалежнасці з'яў у прыродзе ў розны час года. Абагульненне назіранняў пра сезонныя змены ў прыродзе, накопленых эмпірычным шляхам, дазваляе падвесці навучэнцаў да разумення прычын змены сезонаў у залежнасці ад нераўнамернасці асвятлення нашай планеты Сонцам. Навучэнцы засовойваюць канкрэтныя веды пра змены ў жывой і нежывой прыродзе, вучацца тлумачыць сувязі, якія існуюць паміж асобнымі элементамі жывой і нежывой прыроды, пераконваюцца ў тым, што ў прыродзе ўсё ўзаемазвязана.

У працэсе вывучэння кампанента «Чалавек і яго здароўе» пашыраюцца і паглыбляюцца веды пра спосабы захавання і ўмацавання здароўя, фарміруюцца адпаведныя ўменні і навыкі.

Вывучэнне адукацыйнага кампанента «Чалавек і грамадства» дае магчымасць фарміравання ў навучэнцаў уяўленняў пра краіну, у якой яны жывуць, свой горад (вёску); усведамлення неабходнасці праяўляць увагу і клопат да членаў сям'і, выконваць правілы бяспечных паводзін у паўсядзённым жыцці.

У *II класе* адукацыйны кампанент «Прырода і чалавек» уключае раздзелы: «Нежывая прырода і чалавек» і «Жывая прырода і чалавек».

Асноўная мэтавая ўстаноўка вывучэння раздзела «Нежывая прырода і чалавек» – паглыбленне ўяўленняў навучэнцаў пра ваду, паветра, глебу. Прадметам вывучэння з'яўляюцца ўласцівасці найважнейшых аб'ектаў нежывой прыроды, іх значэнне для чалавека і меры па іх ахове. Пры вывучэнні ўласцівасцей вады, паветра, глебы ствараюцца ўмовы для фарміравання ў навучэнцаў навыкай даследчай дзейнасці, развіцця ўменняў шляхам доследу вызначаць уласцівасці аб'ектаў, параўноўваць і аналізаваць аб'екты навакольнага свету, фіксаваць вынікі назіранняў, рабіць вывады.

Мэта вывучэння раздзела «Жывая прырода і чалавек» – спрыяць фарміраванню ў навучэнцаў гуманных, экалагічна абгрунтаваных і ўсвядомленых адносін да ўсяго жывога.

У аснову адбору зместу раздзела пакладзены краязнаўчы прынцып, які забяспечвае раскрыццё сутнасці вывучаемых паняццяў пры дапамозе фактаў навакольнай рэчаіснасці. Краязнаўчы матэрыял выступае як крыніца тэарытычных ведаў, сродак пазнання і як аб'ект вырашэння пазнавальных задач.

Пры вывучэнні дадзенага раздзела навучэнцы знаёмяцца з групамі раслін і жывёл, устанаўліваюць сувязі, якія існуюць паміж раслінамі і жывёламі, рознымі групамі жывёл, паміж чалавекам і жывой прыродай.

Пры вывучэнні раздзела прадугледжваецца фарміраванне ў навучэнцаў уменняў пазнаваць і апісваць (вусна) прадстаўнікоў раслiннага і жывёльнага свету, устанаўліваць і тлумачыць сувязі ў жывой і нежывой прыродзе, прагназаваць наступствы іх парушэння чалавекам. Засваенне зместу раздзела важна ў аспекце набыцця навучэнцамі экалагічна абумоўленага практычнага вопыту узаемадзеяння з прыродай; выхавання эстэтычных пачуццяў здзіўлення, захаплення прыгажосцю прыроды.

Атрыманыя звесткі пра ўласцівасці вады, паветра, пра аб'екты жывой прыроды з'яўляюцца асновай для вывучэння кампанента «Чалавек і яго здароўе» і выкарыстоўваюцца для далейшага пашырэння ведаў пра здаровы лад жыцця.

Асноўнай мэтай вывучэння кампанента «Чалавек і грамадства» з'яўляецца фарміраванне пазітыўных эмацыянальна-каштоўнасных адносін навучэнцаў да іншых людзей, засваенне ведаў пра правы і абавязкі, правілы паводзін у грамадскіх месцах. Пры вывучэнні тэм «Сям'я» і «Эканоміка сям'і» ў навучэнцаў фарміруюцца элементарныя эканамічныя ўяўленні (гаспадарка сям'і, бюджэт, грошы), якія ў далейшым робяцца асновай эканамічнай граматнасці, выхавання якасцей ашчаднасці, гаспадарлівасці, руплівасці.

У *III класе* вывучэнне адукацыйнага кампанента «Прырода і чалавек» пачынаецца з раздзела «Планета, на якой мы жывём», у ходзе вывучэння якога навучэнцы атрымліваюць агульнае ўяўленне пра планету Зямля. У навучэнцаў фарміруюцца ўяўленні пра глобус як мадэль Зямлі, адбываецца знаёмства з фізічнай картай паўшар'яў. Пры вывучэнні раздзела «Арыентаванне на мясцовасці» навучэнцы атрымліваюць веды пра гарызонт, бакі гарызонту, знаёмяцца за практычнымі спосабамі арыентавання.

Змест раздзела «Мой родны край» дазваляе на краязнаўчым матэрыяле больш глыбока раскрыць узаемасувязі ў прыродзе, сфарміраваць уяўленні пра формы зямной паверхні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, пра карысныя выкапні, іх уласцівасці.

Засваенне ведаў пра нежывую прыроду стварае аснову для вывучэння раслiннага і жывёльнага свету ў тэме «Прыродныя згуртаванні роднага краю». Змястоўнымі элементамі вывучэння дадзенай тэмы з'яўляюцца найбольш распаўсюджаныя прыродныя згуртаванні нашай краіны – лес, вадаём, балота, луг. Навучэнцы даведваюцца пра іх своеасаблівасць, значэнне ў прыродзе, ролю ў жыццядзейнасці чалавека.

На аснове ведаў пра разнастайнасць раслін і жывёл Беларусі фарміруюцца ўменні распазнаваць іх па адметных прыметах, тлумачыць асаблівасці прыстасавання жывых арганізмаў да навакольнага асяроддзя. У сістэме ведаў пра прыроду асабліва важным з'яўляецца засваенне навучэнцамі правіл прыродаахоўных паводзін, узбагачэнне вопыту экалагічна абгрунтаваных паводзін у прыродзе, развіццё эмацыянальна-каштоўнасных адносін да прыроды.

Вывучэнне раздзела «Разнастайнасць раслін і жывёл на Зямлі» накіравана на паглыбленне ўяўленняў пра ўзаемасувязі жывой і нежывой прыроды, сістэматызацыю і пашырэнне ведаў пра асноўныя групы прадстаўнікоў раслiннага і жывёльнага свету.

У адукацыйным кампаненце «Чалавек і яго здароўе» даецца агульнае ўяўленне пра ўнутраныя органы чалавека, функцыі, якія выконваюцца, будову. Асаблівая ўвага надаецца пытанням асабістай гігіены, мерапрыемствам, якія павінны ажыццяўляць навучэнцы для захавання і ўмацавання свайго здароўя. Фарміруецца ўяўленне навучэнцаў пра тое, што правільнае харчаванне з'яўляецца адным з галоўных фактараў захавання здароўя чалавека.

Вывучэнне тэм «Апора цела і рух», «Органы пачуццяў чалавека. Вока – орган зроку», «Органы слыху, нюху, дотыку, смаку» накіравана на фарміраванне ў навучэнцаў спагадлівых і добразычлівых адносін да іншых людзей, выхаванне талерантнасці, цярпімасці і міласэрнасці да інвалідаў, людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Засваенне зместу вучэбнай праграмы «Чалавек і свет» арганізуецца праз урокі-гульні, урокі-падарожжы, урокі-даследаванні і інш. з выкарыстаннем форм, метадаў і прыёмаў, якія забяспечваюць самастойнае набыццё навучэнцамі ведаў і актыўнае засваенне спосабаў пазнання навакольнага свету, захаванне і падтрыманне працаздольнасці навучэнцаў, зняцце фізічнага і псіхічнага напружання.

Сістэма ключавых кампетэнцый на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі фарміруецца шляхам засваення адпаведных кампанентаў зместу адукацыі з дапамогай універсальных вучэбных дзеянняў. Пры гэтым асаблівасці прадмета «Чалавек і свет» дазваляюць зрабіць вывад пра пераважаючую ролю пазнавальных вучэбных дзеянняў, да якіх адносяцца: навыкі ажыццяўлення мысліцельных аперацый (параўнання, класіфікацыі, аналізу, сінтэзу, абагульнення і інш.), навыкі працы з інфармацыяй (пошуку, пераўтварэння, перапрацоўкі, «згортвання» і «разгортвання»; навыкі сэнсавага чытання і інш.), навыкі мадэліравання, у тым ліку з дапамогай знакава-сімвалічных сродкаў.

Пры арганізацыі вучэбнай дзейнасці неабходны перанос акцэнту з прыярытэту зместу адукацыі («Ведаю, што…») на прыярытэт засваення спосабаў дзеянняў («Ведаю, як…»). Вынікам навучання павінны зрабіцца практыка-арыентаваныя прадметныя веды, здольнасць навучэнцаў вырашаць праблемы, паспяхова дзейнічаць у жыццёвых сітуацыях на аснове сфарміраваных кампетэнцый. Дадзены падыход канкрэтызаваны ў змесце вучэбнага прадмета пад назвай «Вопыт практычнай дзейнасці».

Віды вучэбнай дзейнасці навучэнцаў вызначаюцца ў залежнасці ад крыніцы атрымання інфармацыі – на славеснай аснове (аповеду настаўніка, тэксту вучэбнага

дапаможніка, кнігі для чытання, вучэбна-пазнавальнай літаратуры); на аснове ўспрымання ў працэсе назірання за аб'ектамі і з'явамі прыроды і дэманстрацыйнымі доследамі.

Асаблівая ўвага надаецца фарміраванню ўменняў навучэнцаў працаваць з інфармацыяй, прычым не толькі з тэкставай, але і з такімі крыніцамі інфармацыі, як умоўныя абазначэнні, ілюстрацыя, табліца, схема, карта, прыродны матэрыял, раздатачны матэрыял і інш. Таксама ў працэсе навучання могуць выкарыстоўвацца электронныя адукацыйныя рэсурсы і аўдыя-, відэаматэрыялы.

Пазнавальныя вучэбныя дзеянні ажыццяўляюцца пры дапамозе лагічных аперацый вылучэння прымет аб'ектаў і з'яў, упарадкавання, параўнання і класіфікацыі на аснове істотных прымет, устанаўлення аналогіі, прычынна-выніковых сувязей; аналізу, сінтэзу,ываду, абагульнення, сістэматызацыі і інш.

Асаблівае значэнне ў засваенні зместу вучэбнага прадмета маюць экскурсіі, якія дазваляюць пазнаваць навакольны свет праз назіранні, вывучаць навакольныя аб'екты з дапамогай розных органаў пачуццяў, прадстаўляць вынікі пазнання ў выглядзе розных творчых работ (вырабаў, малюнкаў, апавяданняў-апісанняў і да т. п.), набываць вопыт прыродаахоўных паводзін і дзейнасці. Прыродныя з'явы, якія ў змесце праграмы абазначаны зорачкай (*), вывучаюцца па меры іх наступлення ў прыродзе.

У раздзеле праграмы «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў» вызначаны прадметныя веды і ўменні, а таксама патрабаванні па іх выкарыстанні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці, якімі авалодваюць вучні I класа.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (30 г)

Уводзіны (1 г)

Наша Радзіма – Беларусь.

Наша дзяржава – Рэспубліка Беларусь. Дзяржаўны герб і сцяг Рэспублікі Беларусь. Мінск – сталіца нашай Радзімы.

Беларусь – край рэк, азёр, лясоў. Прыгажосць прыроды роднага краю.

Месцараспалажэнне населенага пункта, дзе я жыву, і школы, у якой я вучуся.

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый.

Прырода і чалавек (26 г)

Асеннія змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека (9 г)

Што такое прырода. Жывая і нежывая прырода. Аб'екты прыроды і працы чалавека. Навакольны свет раслін і жывёл. Аб'екты жывой і нежывой прыроды, іх прыметы. Сонца – крыніца святла і цяпла для ўсяго жывога на Зямлі.

Змены ў нежывой прыродзе восенню. Асеннія месяцы года, іх паслядоўнасць. Змены ў нежывой прыродзе восенню ў параўнанні з летам: зніжэнне вышыні Сонца над зямлёй, памяншэнне працягласці дня, пахаладанне паветра, ахаладжэнне вады і глебы; змены стану неба і віду ападкаў (асаблівасці асенніх дажджоў, выпадзенне першага снегу*), першыя замаразкі*.

Расліны – частка жывой прыроды. Жыццё раслін восенню. Уплыў змен у нежывой прыродзе на жыццё раслін восенню. Выспяванне пладоў і насення, іх распаўсюджванне. Завяданне і засыханне травяністых раслін восенню. Змены афарбоўкі лісця дрэў і кустоў. Лістапад.

Жывёлы – частка жывой прыроды. Жыццё жывёл восенню. Разнастайнасць жывёл. Дзікія і свойскія жывёлы. Змены ў жыцці дзікіх жывёл восенню (насякомых, птушак, звяроў і інш.). Памяншэнне колькасці насякомых. Пералёты птушак.

Падрыхтоўка зімовага жылля і корму на зіму. Лінька і змена густаты і афарбоўкі поўсці ў звяроў. Заляганне ў спячку (мядзведзь, вожык, барсук).

Змены ў жыцці свойскіх жывёл восенню. Праца людзей восенню. Значэнне свойскіх жывёл для чалавека. Уплыў змен у прыродзе восенню на жыццё свойскіх жывёл. Клопат чалавека аб свойскіх жывёлах (нарыхтоўка кармоў, падрыхтоўка памяшканняў для жывёл да зімы). Дапамога дзяцей у доглядзе свойскіх жывёл.

Асеннія работы на палях, агародах, садах, парках, на вуліцах гарадоў і вёсак. Дапамога дзяцей дарослым у асенніх работах.

Уплыў змен у прыродзе на жыццё чалавека восенню. Як правільна апранацца восенню, загартоўванне арганізма. Асеннія прагулкі на свежым паветры, іх уплыў на здароўе і настрой чалавека.

Асеннія плады і насенне – крыніца здароўя. Плады і насенне розных раслін. Расліны саду і агарода, у якіх восенню выспяваюць ядомыя плады. Агародніна і садавіна, якія вырошчваюцца ў нашым краі. Іх карысць для здароўя чалавека. Правілы ўжывання агародніны і садавіны.

Асеннія з'явы ў прыродзе (абагульняючы ўрок).

Экскурсія «Змены ў нежывой прыродзе і ў жыцці раслін восенню» (1 г)

Мэтавыя прагулкі «Залатая восень у прыродзе», «Позняя восень»[1].

[1] На экскурсіі і мэтавыя прагулкі, выдзеленыя курсівам, адводзіцца частка ўрока.

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, назіранне, аналіз асенніх змен ў прыродзе, збор прыроднага матэрыялу.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Правядзенне падчас экскурсій і прагулак назіранняў, у час якіх навучэнцы вучацца вызначаць змены ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін і жывёл; фіксаваць вынікі назіранняў. Распазнаванне некалькіх дрэў і кустоў (па лістах); садавіны і агародніны; пазнаванне некалькіх птушак, звяроў.*

Праяўленне клопату аб захаванні і ўмацаванні здароўя ў асенні перыяд.

Зімовыя змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека (7 г)

Змены ў нежывой прыродзе зімой. Як зімуюць расліны. Зімовыя месяцы года, іх паслядоўнасць. Змены ў нежывой прыродзе зімой у параўнанні з восенню: змена вышыні Сонца над зямлёй, працягласці дня і ночы, прамярзанне глебы; змена віду ападкаў. Снег і лёд, снегапады, завеі*. Жыццё раслін зімой. Травяністыя расліны і іх жыццё пад снегам. Хвойныя і ліставыя дрэвы і кусты зімой. Вызначэнне дрэў і кустоў па форме кроны, колеры ствала, пладах, лістах, якія засталіся, шышках (хвойныя дрэвы).

Змены ў жыцці дзікіх жывёл зімой. Прычыны залягання ў спячку некаторых жывёл. Жыццё насякомых, рыб, жаб, змей зімой. Змены ў жыцці лясных звяроў зімой (вавёрка, заяц, воўк, ліса, лось, мядзведзь, вожык). Дапамога людзей дзікім жывёлам у зімовы час.

Жыццё птушак зімой. Птушкі, якія зімуюць. Асаблівасці знешняга выгляду некаторых птушак (галка, варона, сарока, сініцы). Зімовыя госці на нашых вуліцах, у дварах і парках (снегіры, амялушкі, шчыглы). Зіма – галодны час у жыцці птушак. Дапамога чалавека дзікім жывёлам. Удзел дзяцей у вырабе кармушак, падкормцы птушак.

Змены ў жыцці свойскіх жывёл зімой. Праца людзей зімой. Змены ўмоў і ладу жыцця свойскіх жывёл у зімовы перыяд. Клопат людзей аб свойскіх жывёлах у зімовы перыяд. Дапамога дзяцей у доглядзе свойскіх жывёл. Праца людзей зімой у горадзе і вёсцы. Уборка снегу на вуліцах. Падрыхтоўка да вясенняй сяўбы: снегазатрыманне на палях, рамонт сельскагаспадарчай тэхнікі, падрыхтоўка насення да пасеву. Зімовыя работы ў садах, цяпліцах, зернясховішчах і агароднінасховішчах.

Клопат чалавека аб сваім здароўі зімой. Папярэджанне прастудных захворванняў. Як правільна апранацца і загартоўваць арганізм. Значэнне для здароўя зімовых прагулак і гульняў на прыродзе. Правілы паводзін у снегапад, падчас галалёду, пры катанні на каньках, лыжах, санках.

Зімовыя з'явы ў прыродзе (абагульняючы ўрок).

Экскурсія «Змены ў нежывой прыродзе зімой. Як зімуюць расліны» (1 г)

Мэтавая прагулка «Жыццё птушак зімой».

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, назіранне, аналіз зімовых змен у прыродзе, збор прыроднага матэрыялу.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Правядзенне падчас экскурсій і прагулак назіранняў, у працэсе якіх навучэнцы вучацца вызначаць зімовыя змены ў нежывой прыродзе, у жыцці раслін і жывёл; фіксаваць вынікі назіранняў. Выяўленне шляхам доследу, што снег і лёд – гэта замёрзлая вада; вызначэнне шляхам доследу, ці чысты белы снег. Распазнаванне некалькіх відаў дрэў і кустоў у зімовы час (па форме кроны, колеры ствала, лістах і пладах, якія засталіся, шышках (хвойныя дрэвы)); пазнаванне некалькіх відаў птушак, звяроў.*

Падкормка птушак, выраб кармушак.

Праяўленне клопату аб захаванні і ўмацаванні здароўя ў зімовы перыяд, прытрымліванне правіл бяспечных паводзін зімой.

Вясеннія змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека (6 г)

Змены ў нежывой прыродзе вясной. Вясеннія месяцы года, іх паслядоўнасць. Змены ў нежывой прыродзе з надыходам вясны: месцазнаходжання Сонца над зямлёй, працягласці дня і ночы, пацяпленне паветра. Раставанне снегу, адаграванне і высыханне глебы. Крыгаход, вясенні разліў рэк (паводка*).

Вясна і здароўе чалавека. Клопат аб захаванні здароўя вясной (вопратка і загартоўванне арганізма). Прагулкі і гульні ў парку, скверы. Бяспечныя месцы для гульняў. Правілы паводзін каля вадаёмаў вясной.

Вясна – час абуджэння раслін. Набуханне пупышак, распусканне лістоў, цвіценне дрэў і кустоў вясной. Раннеквітнеючыя травяністыя расліны роднага краю. Неабходнасць беражлівых адносін да вясенніх першацветаў.

Змены ў жыцці дзікіх жывёл вясной. Вылет чмялёў, пчол, з'яўленне матылькоў, мурашак. Насякомыя – апыляльнікі раннеквітнеючых раслін. Прылёт і гнездаванне птушак. Залежнасць паміж тэрмінам прылёту птушак і наяўнасцю корму. Беражлівыя адносіны чалавека да птушак у вясеннюю пару года. Змены вясной у жыцці звяроў, жаб, змей, яшчарак.

Змены ў жыцці свойскіх жывёл вясной. Праца людзей вясной. Змена ўмоў жыцця свойскіх жывёл з надыходам вясны. Клопат людзей аб свойскіх жывёлах вясной. Дапамога дзяцей у доглядзе свойскіх жывёл. Праца людзей вясной. Вясеннія работы на палях, у садах, парках, на вуліцах гарадоў і вёсак. Дапамога дзяцей дарослым у вясенніх работах.

Вясеннія з'явы ў прыродзе (абагульняючы ўрок).

Экскурсія «Раннеквітнеючыя расліны – краса прыроды» (мэтавая прагулка «Ранняя вясна – час абуджэння раслін»).

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, назіранне, аналіз вясенніх змен у прыродзе.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Правядзенне падчас экскурсій і прагулак назіранняў, у працэсе якіх навучэнцы вучацца вызначаць прыметы надыходу вясны ў нежывой прыродзе, змены ў жыцці раслін; фіксаваць вынікі назіранняў. Пазнаванне некалькіх відаў раслін, кустоў, раннеквітнеючых травяністых раслін; насякомых, птушак, звяроў.*

Праяўленне беражлівых адносін да першацветаў і птушак вясной.

Дапамога дарослым у вясенніх работах.

Праяўленне клопату аб захаванні і ўмацаванні здароўя ў вясенні перыяд.

Змены ў нежывой прыродзе, жыцці раслін, жывёл і чалавека летам (4 г)

Змены ў нежывой прыродзе і жыцці раслін летам. Летнія месяцы года, іх паслядоўнасць. Змена месцазнаходжання Сонца над зямлёй. Працягласць дня і ночы. Лета – самы цёплы час года. Праграванне паветра, вады, глебы. Летнія дажджы, навальніцы. Расліны летам: цвіценне траў, паспяванне ягад*. Ядавітыя расліны.

Жыццё дзікіх і свойскіх жывёл летам. Звычкі дзікіх звяроў, птушак летам, іх клопат аб патомстве. Жыццё свойскіх жывёл летам. Дапамога дзяцей у доглядзе свойскіх жывёл. Дапамога людзей дзікім жывёлам у летні час.

Лета і здароўе чалавека. Летняе загартоўванне арганізма. Правілы прыёму сонечных і паветраных ваннаў. Гульні на свежым паветры як умова захавання і ўмацавання здароўя. Правілы паводзін у лесе, на лузе, каля вадаёмаў, падчас навальніцы, пры сустрэчы з пчоламі, восамі, змеямі.

Змены ў прыродзе і працоўнай дзейнасці людзей ў розныя часы года (абагульняючы ўрок).

Экскурсія «Першыя прыметы лета ў нежывой прыродзе і ў жыцці раслін».

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, назіранне, аналіз летніх змен у прыродзе.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Правядзенне падчас экскурсій і прагулак назіранняў, у працэсе якіх навучэнцы вучацца ўстанаўліваць наступленне першых прымет лета ў нежывой прыродзе, жыцці раслін; фіксаваць вынікі назіранняў. Пазнаванне некалькіх відаў дрэў, кустоў, травяністых раслін; насякомых, птушак, звяроў.*

Праяўленне клопату аб захаванні і ўмацаванні здароўя ў летні перыяд, прытрымліванне правіл бяспечных паводзін летам.

Чалавек і грамадства (3 г)

Мой горад (вёска). Назва населенага пункта, дзе я жыву. Галоўная вуліца (плошча) роднага горада (вёскі). Транспарт, якім вы карыстаецеся ў сваім населеным пункце. Віды транспарту (пасажырскі, грузавы, спецыяльны). Неабходнасць прытрымлівання правіл дарожнага руху. Культурна-асветніцкія ўстановы горада (вёскі) (бібліятэка, кінатэатр, спартыўныя збудаванні).

Славутасці населенага пункта. Гаспадарчая дзейнасць жыхароў населенага пункта.

Я і мая сям'я. Значэнне сям'і ў жыцці чалавека. Добразычлівыя адносіны ў сям'і. Размеркаванне абавязкаў у сям'і. Пасільная дапамога дзяцей іншым членам сям'і. Правы і абавязкі дзяцей і бацькоў. Адказнасць дзяцей за свае ўчынкі.

Небяспечныя сітуацыі ў доме. Меры бяспекі ў хатніх умовах (пры абыходжанні з бытавой тэхнікай, вострымі прадметамі і г.д.). Правілы супрацьпажарнай бяспекі, асноўныя правілы абыходжання з газам, электрычнасцю, вадой. Нумары тэлефонаў экстраных службаў, па якіх можна выклікаць пажарную аварыйна-выратавальную службу, міліцыю, хуткую медыцынскую дапамогу, аварыйную службу газавай сеткі.

Экскурсія па населеным пункце «Мой горад (вёска)».

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый, мадэліраванне сітуацый.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Пазнаванне галоўных славутасцей горада (вёскі).*

Аказанне пасільнай дапамогі членам сям'і, выкананне дамашніх абавязкаў.

Выкананне элементарных правіл бяспекі ў быце.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць:

назву сваёй краіны, яе сталіцы;

дзяржаўную сімволіку Рэспублікі Беларусь (сцяг і герб);

назву свайго населенага пункта, дамашні адрас, адас сваёй школы;

элементарныя прыметы паняццяў «прырода», «нежывая прырода», «жывая прырода»; «прадметы працы»;

назву кожнай пары года, месяцаў года і іх паслядоўнасць;

сезонныя прыметы змен у нежывой прыродзе, жыцці раслін і жывёл, працы людзей;

некалькі відаў раслін (не менш за 5), кустоў (не менш за 3), травяністых раслін (не менш за 5);

назвы агародніны і садавіны (не менш за 3);

некалькі відаў дзікіх жывёл – птушак (не менш за 5), звяроў (не менш за 5); насякомых (не менш за 3);

некалькі відаў свойскіх жывёл (не менш за 4);

правілы прыходаахоўных паводзін у дачыненні да раслін і жывёл;

пра карысць загартоўвання, прагулак на свежым паветры;

спосабы захавання і ўмацавання здароўя ў розны час года;

правілы бяспечных паводзін на прыродзе ў розны час года;

назву свайго горада (вёскі), сваёй вуліцы, нумар свайго дома;

славутасці свайго населенага пункта (не менш за 2);

віды транспарту (пасажырскі, грузавы, спецыяльны);

правілы бяспечных паводзін дома;

нумары тэлефонаў экстраных службаў, па якіх можна выклікаць пажарную аварыйна-выратавальную службу, міліцыю, хуткую медыцынскую дапамогу, аварыйную службу газавай сеткі.

Умець:

пазнаваць Дзяржаўны сцяг і Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь;

пазнаваць асноўныя славутасці сталіцы Рэспублікі Беларусь;

адрозніваць аб’екты прыроды і прадметы працы чалавека, характарызуючы іх асноўныя адметныя прыметы;

адрозніваць аб’екты жывой і нежывой прыроды;

адрозніваць вывучаныя віды дрэў, кустоў, травяністых раслін;

адрозніваць хвойныя дрэвы ад ліставых (па выніках назіранняў);

вызначаць 3–4 віды дрэў у зімовы час (па форме кроны, колеры ствала, галінах, пладах і лістах, якія засталіся, шышках);

адрозніваць некалькі відаў раннеквітнеючых травяністых раслін (не менш за 2);

адрозніваць садавіну і агародніну;

адрозніваць дзікіх і свойскіх жывёл па істотных прыметах;

тлумачыць даступныя разуменню прычыны сезонных змен у прыродзе, якія назіраюцца;

весці мэтанакіраваныя назіранні за сезоннымі зменамі ў прыродзе, параўноўваць аб’екты, устанаўліваць сувязі паміж зменамі ў нежывой і жывой прыродзе, працы людзей; расказваць пра свае назіранні;

праводзіць доследы, выкарыстоўваючы найпрасцейшае лабараторнае абсталяванне, аналізаваць вынкі; прытрымлівацца інструкцый і правіл тэхнікі бяспекі пры правядзенні доследаў;

тлумачыць неабходнасць выканання правіл прыродаахоўных паводзін падчас экскурсій, прагулак, назіранняў;

прытрымлівацца правіл прыродаахоўных паводзін падчас экскурсій і мэтавых прагулак;

выбіраць бяспечныя месцы для гульняў, прытрымлівацца правіл бяспечных паводзін;

расказваць пра галоўныя славутасці свайго населенага пункта;

ветліва абыходзіцца з дарослымі і равеснікамі.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

апісання раслін і жывёл найбліжэйшага навакольля;

апісання сезонных змен у прыродзе (нежывой, у жыцці раслін), устанаўлення сувязей паміж жыццём жывых арганізмаў і зменамі ў нежывой прыродзе;

прытрымлівання правіл бяспечных і экалагічна граматных паводзін на прыродзе і ажыццяўлення прыродаахоўнай дзейнасці (выраб кармушак, падкормка птушак, беражлівыя адносіны да раннеквітнеючых раслін);

прытрымлівання правіл захавання і ўмацавання здароўя ў розны час года;

апісання галоўных славутасцей сваёй мясцовасці;

прытрымлівання правіл бяспечных паводзін на вуліцы і дома.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Выяўленчае мастацтва»
для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Выяўленчае мастацтва» адыгрывае значную ролю ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі. Ён закліканы вырашаць задачы, звязаныя з перадачай мастацкіх каштоўнасцей культуры, выпрацаваных чалавецтвам, з мэтай эмацыянальна-пачуццёвага і духоўна-маральнага развіцця асобы, фарміравання яе эстэтычнага вопыту і творчага патэнцыялу.

Выяўленчае мастацтва з'яўляецца найважнейшым фактарам пазнання навакольнага свету і феномена чалавека. Пры гэтым узнятыя праблемы падаюцца ў яркай, эмацыянальна афарбаванай форме і ініцыіруюць у адказ эмацыянальныя перажыванні навучэнцаў. У выніку вобразы выяўленчага мастацтва засвойваюцца на эмацыянальным, інтуітыўным і падсвядомым узроўнях.

Майстэрства выканання і выражаныя індывідуальна-аўтарскія рысы твораў выяўленчага мастацтва з'яўляюцца ўнікальнымі, не падлягаюць варыятыўнаму ўзнаўленню. У сувязі з гэтым выяўленчая творчасць у сукупнасці з іншымі формамі мастацкай дзейнасці з'яўляецца істотным фактарам выяўлення і сцвярджэння індывідуальнасці навучэнца, яго здольнасцей, якія вядуць да самаідэнтыфікацыі і выпрацоўкі асабістага погляду на свет. На гэтай аснове навучэнцы вучацца творча пераўтвараць акаляючую рэчаіснасць і свой унутраны свет.

У адукацыйным працэсе прадмет «Выяўленчае мастацтва» вызначаецца дамінаваннем мастацка-творчай дзейнасці. У працэсе заняткаў выяўленчым мастацтвам актыўна развіваюцца такія сферы індывідуальнасці навучэнца, як вобразнае мысленне, фантазія, уяўленне, эмацыянальная сфера, мысліцельная дзейнасць, інтуіцыя і інш. Фарміруюцца прасторавыя і колеравыя ўяўленні, пачуццё меры, рытму, сіметрыі і асіметрыі, прапорцый, кампазіцыйнай раўнавагі, камбінаторныя і сенсорныя здольнасці.

Зыходзячы са спецыфікі вучэбнага прадмета, асноўнай **мэтай** навучання з'яўляецца фарміраванне асноў мастацка-эстэтычнай, духоўна-маральнай культуры навучэнцаў, знаёмства з нацыянальным і сусветным мастацтвам, развіццё патрэбнасці ў мастацка-творчай дзейнасці.

Для рэалізацыі дадзенай мэты ставяцца наступныя **задачы:**

фарміраванне ўяўленняў пра маральна-эстэтычныя каштоўнасці нацыянальнай культурнай спадчыны, выхаванне пачуцця павагі да культурнай спадчыны іншых народаў;

выхаванне эстэтычных адносін да рэчаіснасці, мастацтва, з'яў мастацкай культуры, развіццё эстэтычных пачуццяў і асноў эстэтычнага густу;

развіццё здольнасцей эстэтычнага ўспрымання і ацэнкі твораў мастацтва розных відаў і жанраў;

навучанне асновам выяўленчай граматы; удасканальванне практычных уменняў і навыкаў выяўленчай, дэкаратыўна-прыкладной і канструктарска-дызайнерскай дзейнасці, лепкі;

развіццё зрокавага ўспрымання, кампазіцыйнай і каларыстычнай культуры, прасторавага мыслення, ўяўлення;

развіццё мастацка-творчых здольнасцей і творчай актыўнасці навучэнцаў.

У навучэнцаў ва ўмовах вядучай ролі пазнавальнай дзейнасці фарміруюцца элементы ўяўленняў, ведаў пра эстэтычныя і мастацкія з'явы. Вопыт назапашаных эмацыянальна-пачуццёвых уражанняў і эстэтычных перажыванняў знаходзіць адлюстраванне ў *мастацка-творчай дзейнасці*, спрыяе развіццю творчага патэнцыялу, мастацка-творчых здольнасцей. Формай мастацкай творчасці навучэнцаў з'яўляецца сістэма выяўленча-выразных сродкаў пластычных (прасторавых) мастацтваў.

У выніку мастацкай творчасці навучэнцы набываюць навыкі стварэння *мастацкіх вобразаў*. Мастацка-эстэтычныя якасці работ навучэнцаў будуць удасканальвацца ў працэсе авалодвання імі ведамі ў галіне таго ці іншага віду мастацтва (графікі, жывапісу, скульптуры, архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну).

Узмацненне практыка-арыентаванай накіраванасці адукацыйнага працэсу абумовіла пераход да кампетэнтнаснага падыходу ў вызначэнні мэт і вынікаў мастацка-эстэтычнай адукацыі.

Рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу ў выкладанні выяўленчага мастацтва прадугледжвае інтэграцыю ведаў і творчую самарэалізацыю асобы, фарміраванне ў навучэнцаў пачатковых ***ключавых кампетэнцый*** – асобасных, метапрадметных і прадметных.

Да асобасных кампетэнцый адносяцца:

каштоўнасныя адносіны да нацыянальнага мастацтва свайго народа і народаў свету;

мастацка-вобразнае мысленне, назіральнасць і ўяўленне;

наяўнасць эстэтычных інтарэсаў і патрэбнасцей, эмацыянальна-каштоўнасных крытэрыяў жыццядзейнасці.

Метапрадметнымі кампетэнцыямі, якія фарміруюцца пры вывучэнні выяўленчага мастацтва, з'яўляюцца:

валоданне ўменнем «творчага бачання»;

уменне рацыянальна арганізаваць працэс мастацка-творчай дзейнасці;

імкненне размаўляць пра мастацтва, валоданне культурай сутворчасці.

Прадметнымі (мастацка-эстэтычнымі) кампетэнцыямі (паводле Б.М.Неменскага) выступаюць:

веданне відаў і жанраў пластычных мастацтваў, асаблівасцей відаў мастацкай дзейнасці (адлюстраванне, канструяванне, дэкарыраванне (аздабленне));

разуменне мастацка-вобразнай прыроды мастацтва;

здольнасць эстэтычна ўспрымаць, эмацыянальна ацэньваць і аналізаваць (з пасільным прымяненнем мастацтвазнаўчай тэрміналогіі) творы мастацтва, аб'екты і з'явы прыроды;

прымяненне спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў у працэсе адлюстравання аб'ектаў, канструявання вырабаў з паперы, лепкі з пластыліну, салёнага цеста, стварэння вобразаў у розных мастацкіх тэхніках (аплікацыя, мазаіка, калаж, выцінанка і інш.).

Асноўныя раздзелы вучэбнай праграмы:

«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва» (уключае 2 падраздзелы: «Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці», «Успрыманне твораў мастацтва»);

«Практычная мастацка-творчая дзейнасць» (уключае 4 падраздзелы: «Асваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік», «Адлюстраванне на плоскасці», «Лепка», «Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн»).

«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці» як састаўная частка мастацкай дзейнасці мае ў праграме адносна самастойную сістэму вучэбных задач па фарміраванні эстэтычнай свядомасці і эстэтычных пачуццяў навучэнцаў.

Асаблівая ўвага надаецца сферы эстэтычных і этычных каштоўнасцей нацыянальнай культуры, духоўна-эстэтычнага ўдасканальвання чалавека, эстэтычнага асваення свету прыроды і свету «другой прыроды» – архітэктурнага і прадметнага асяроддзя пражывання чалавека.

Задачай дадзенага змястоўнага кампанента праграмы з'яўляецца мэтанакіраванае развіццё ў навучэнцаў назіральнасці, візуальнага ўспрымання формы і колеру прадметаў, уменне вызначаць адценні колеру аб'ектаў прыроды.

У мэтах сістэматычнага развіцця ў навучэнцаў свядомага падыходу да ўспрымання эстэтычнага ў акаляючай рэчаіснасці змест дадзенага раздзела ў структуры праграмы ад класа да класа паступова пашыраецца. Значнае месца павінна адводзіцца відэаэкскурсіям у прыроду, разгляданню і аналізу фотаздымкаў пейзажаў, архітэктурных збудаванняў, машын, адзення, мэблі – усяго, што можа спрыяць развіццю эстэтычнай чуласці, назапашванню зрокавых уражанняў, развіццю здольнасці заўважаць прыгожае і асаблівае ў звыклым атачэнні.

Змястоўны кампанент **«Успрыманне твораў мастацтва»** садзейнічае засваенню прадмета на мастацтвазнаўчым узроўні. Яго задачай з'яўляецца фарміраванне ключавых арыенціраў успрымання твораў выяўленчага мастацтва, пашырэнне мастацкага кругагляду навучэнцаў, вывучэнне тэарэтычных асноў выяўленчага мастацтва, засваенне яго мовы, сістэмы выразных сродкаў.

У выніку засваення зместу дадзенага раздзела праграмы вучні атрымліваюць уяўленне пра ролю мастацтва ў жыцці чалавека і грамадства, пра асновы нацыянальнага і сусветнага мастацтва, асаблівасці розных відаў і жанраў выяўленчага мастацтва, іх узаемасувязі.

Пры асваенні навучэнцамі твораў айчыннай мастацкай спадчыны выхоўваецца любоў да роднай культуры, адчуванне яе нацыянальнай адметнасці, імкненне працягваць мастацкія традыцыі. Асаблівая ўвага надаецца знаёмству з творчасцю прафесійных і народных майстроў, мясцовымі мастацкімі славутасцямі. Вывучэнне помнікаў архітэктуры і выяўленчага мастацтва, мастацкіх промыслаў і рамёстваў свайго рэгіёна не толькі садзейнічае далучэнню вучняў да творчасці на аснове мясцовых традыцый, але і выхоўвае любоў да роднага краю, павагу да людзей, якія жывуць побач, фарміруе жаданне берагчы і множыць мастацкі набытак свайго сяла ці горада і да т.п.

Пры азнаямленні навучэнцаў з падраздзелам праграмы **«Успрыманне твораў мастацтва»** вельмі важным з'яўляецца развіццё навыкаў успрымання і аналізу твораў айчыннага і сусветнага мастацтва, фарміраванне ведаў і ўяўленняў пра творчасць мастакоў. Развіваюцца здольнасці навучэнцаў суперажываць і эмацыянальна адгукацца на твор выяўленчага мастацтва, яго змест, уменне выказваць да яго свае адносіны. Навучэнцы атрымліваюць навыкі ўспрымання твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, раскрываюць яго змест на аснове засвоеных паняццяў і тэрмінаў, адзначаюць некаторыя даступныя іх разуменню мастацкія сродкі і раскрываюць іх ролю ў стварэнні мастацкага вобраза.

Пералік мастацкіх твораў, прапанаваных у праграме, з'яўляецца прыкладным. У некаторых выпадках настаўніку рэкамендуецца самастойна выбраць творы для азнаямлення навучэнцаў (падбор наглядна-дыдактычнага матэрыялу па ўспрыманні павінен ажыццяўляцца ў адпаведнасці з тэматыкай раздзела, узроставымі асаблівасцямі вучняў). Прыярытэтнае значэнне мае азнаямленне навучэнцаў з творамі беларускай мастацкай спадчыны.

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва (праз дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый) павінна ажыццяўляцца на кожным занятку, акрамя тых урокаў, якія адведзены на вывучэнне асноў выяўленчай граматы. Успрыманне аб'ектаў, з'яў рэчаіснасці і твораў мастацтва, іх шматаспектны аналіз папярэднічае выкананню практычнай работы: у пачатку занятку прадугледжваецца гутарка (мультымедыйная

прэзентацыя), наступная яго частка – практычная рэалізацыя тэмы (стварэнне творчай кампазіцыі, лепка, дэкарыраванне вырабаў (эскіз роспісу, аздабленне адзення і да т.п.)).

Колькасць гадзін, якая адведзена на вывучэнне зместу раздзела **«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва»**, размяркоўваецца на працягу ўсяго навучальнага года, у суме складае ў I класе 8 гадзін.

Па раздзеле праграмы «**Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва»** можна прадугледзець наступныя віды дзейнасці:

параўнанне формы і афарбоўкі аб'ектаў прыроды;

славесная замалёўка асаблівасцей дзённага і вячэрняга асвятлення, параўнанне афарбоўкі прадметаў пры халодным і цёплым дзённым асвятленні;

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага паведамлення «Прыгажосць аб'ектаў і з'яў прыроды»;

успрыманне і абмеркаванне мастацкіх твораў па тэмах, рэкамендаваных у раздзеле праграмы;

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага паведамлення «Віды і жанры выяўленчага мастацтва», «Выразныя сродкі жывапісу», «Выразныя сродкі графікі», «Выразныя сродкі скульптуры» і інш.

Акрамя таго, на уроку могуць арганізоўвацца:

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага сачынення «Прыгожае ў прыродзе і жыцці», «Які колер у снегу», «Які колер у восені» і інш.;

конкурс на лепшае чытанне верша пра прыгажосць пор года, прыродных з'яў і інш.;

відэаэкскурсіі па залах краязнаўчых і мастацкіх музеяў.

У аснову змястоўнага кампанента **«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»** пакладзены прынцып сістэматычнага развіцця ў навучэнцаў уменняў мастацкага мадэліравання свету. У працэсе асваення зместу дадзенага раздзела, які ажыццяўляецца на мастацка-творчым узроўні, набываецца вопыт творчай дзейнасці, развіваюцца мастацкія здольнасці навучэнцаў у галіне колера- і формаўтварэння, засвойваюцца прасторавыя з'явы, фарміруюцца навыкі лепкі, дэкаратыўна-прыкладной дзейнасці, мастацкага канструявання (дызайну).

На занятках выяўленчым мастацтвам навучэнцы малююць, лепяць з натуры, па памяці, па ўяўленні, канструююць, выконваюць работы ў розных мастацкіх тэхніках.

Працэс практычнай мастацка-творчай дзейнасці патрабуе стварэння ўмоў для праяўлення ў навучэнцаў пачуцця радасці ад вынікаў мастацкай працы, упэўненасці ў сваіх сілах, актыўнасці ў выбары мастацкіх сродкаў, тэхнікі і матэрыялу пры выкананні вучэбных і творчых заданняў (кампазіцый), фарміраванне ўменняў самастойна выбіраць сюжэт і рэалізоўваць творчую задуму на практыцы.

Змест раздзела **«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»** уключае:

асваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік;

адлюстраванне на плоскасці;

лепку;

дэкаратыўна-прыкладную дзейнасць і дызайн.

Асваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік прадугледжвае знаёмства з асаблівасцямі, тэхнічнымі прыёмамі і спосабамі працы з рознымі выяўленчымі матэрыяламі ў розных мастацкіх тэхніках. Вялікае значэнне мае наглядны паказ (дэманстрацыя) настаўнікам прыёмаў работы з матэрыяламі і інструментамі.

Адлюстраванне на плоскасці ўключае маляванне з натуры, па памяці, па ўяўленні (або па ўяўленні пасля непасрэдных назіранняў), выкананне сюжэтна-тэматычных кампазіцый, а таксама выкананне накідаў.

Змест практычнай дзейнасці падраздзела прадугледжвае вырашэнне чатырох асноўных груп вучэбных задач:

1) кампазіцыя;

2) форма, прапорцыі, канструкцыя;

3) колер і асвятленне;

4) прастора і аб'ём.

Асваенне дадзеных груп вучэбных задач, якія ляжаць у аснове выяўленчай граматнасці, павінна быць падпарадкавана свядомаму рашэнню мастацкага вобраза ў адпаведнасці з узроставымі магчымасцямі навучэнцаў.

Галоўнае ў рабоце **па кампазіцыі** – асваенне ўсёй паверхні ліста паперы і запаўненне яго выявай, а ў лепцы і дэкаратыўнай рабоце – стварэнне цэльнай формы. Навучэнцы авалодваюць умением выбіраць для кампазіцыі аб'екты адлюстравання згодна з задумай і маляваць іх буйнымі.

У рабоце над **формай** важна вучыць адчуваць вобразны характар формы, імкнуцца да паслядоўнага вобразнага ўскладнення пры яе адлюстраванні. Мадэліроўка формы і аб'ёму ажыццяўляецца тонам і колерам. Для выпрацоўкі навыкаў аналізу формы і яе ажыццяўлення ў мастацкім вобразе вялікае значэнне маюць лепка, дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць, канструяванне, калі навучэнцы працуюць з аб'ёмнай формай.

Асаблівая ўвага надаецца рэалістычнай перадачы **прапорцый і канструкцыі** прадметаў, якія адлюстроўваюцца.

У рабоце **з колерам** ставіцца задача бачыць колер разнастайна, адрозніваць і складаць патрэбныя адценні шляхам змяшэння фарбаў. Аднак мэта навучання асновам колеразнаўства – каларыстычнае рашэнне таго ці іншага мастацкага вобраза ў практычнай творчай дзейнасці.

Навучанне перадачы **прасторы** на паперы пачынаецца ў асноўным у рабоце па назіранні і на зададзеныя тэмы. Галоўная ўвага надаецца фарміраванню ў навучэнцаў паняццяў пра злом плоскасцей і мяжу злому (мяжу падлогі і сцяны, бачную мяжу зямлі і неба) і ўменню правільна размяшчаць прадметы на паверхні падлогі і зямлі.

Лепка прадугледжвае азнаямленне навучэнцаў з прыёмамі і сосабамі лепкі, лепку рэльефу і аб'ёмных форм.

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн прадугледжвае азнаямленне з прыёмамі дэкаратыўнага абагульнення форм і колеру прадметаў (аб'ектаў), відамі арнаменту, асноўнымі кампазіцыйнымі схемамі твораў дэкаратыўна-прыкладнога характару, выкананне кампазіцый з прыроднага матэрыялу (лісты, кветкі, травы і да т. п.), у тэхніцы «аплікацыя», «манатыпія», «трафарэт», выкананне рэльефных кампазіцый з паперы, канструяванне аб'ёмных цацак на аснове разгортак геаметрычных цел і інш.

Спалучэнне выяўленчай дзейнасці з аб'ёмна-прасторавымі відамі работ (лепкай, канструяваннем, мадэліраваннем), камбінаванне тэарэтычнага вывучэння асноў выяўленчай граматнасці з аналізам формы, прапорцый і канструкцыі прадмета, ужыванне і чаргаванне матэрыялаў і мастацкіх тэхнік (гуаш, акварэль, каляровая крэйда, туш, пластылін, гліна, аплікацыя, выцінанка, манатыпія і інш.) дазволіць навучэнцам атрымаць уяўленне пра разнастайнасць сродкаў для стварэння мастацкага вобраза і будзе спрыяць свядомаму выбару матэрыялу ў залежнасці ад зместу і задумы работы.

У настаўніка ёсць магчымасць выбару выяўленчых матэрыялаў для выканання навучэнцамі творчага задання з улікам іх жаданняў, густаў і ўзроставых асаблівасцей.

У мэтах індывідуалізацыі мастацка-творчага працэсу, максімальнага ўліку інтарэсаў і запатрабаванняў навучэнцаў праграма прапануе некалькі тэм для асваення пэўнай вучэбнай выяўленчай задачы. Тэмы з'яўляюцца прыкладнымі, настаўнік можа іх карэкціраваць паводле свайго меркавання. У асобных выпадках дапускаецца свабодны выбар навучэнцамі тэхнікі выканання кампазіцыі, калі гэта не супярэчыць пастаўленай задачы. Для пашырэння ўяўленняў навучэнцаў пра спецыфіку стварэння мастацкага вобраза і ажыццяўлення аналізу вучэбных дасягненняў у розных відах творчай дзейнасці некаторыя тэмы паўтараюцца ў розных класах.

Практычная мастацка-творчая дзейнасць узаемазвязана з успрыманнем і аналізам твораў мастацтва, назіраннямі навучэнцаў за аб'ектамі і з'явамі прыроды (праз экскурсіі і дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый, рэпрадукцыій мастацкіх твораў і фотаздымкаў). Накіды і замалёўкі, зробленыя падчас экскурсій на прыроду і прагляду мультымедыйных прэзентацый, могуць служыць асновай для стварэння мастацкага вобраза пры выкананні навучэнцамі творчых кампазіцый.

Колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне раздела **«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»**, размяркоўваецца на працягу ўсяго навучальнага года, у суме складае ў I класе 52 гадзіны.

Па раздзеле праграмы **«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»** могуць прадуглеждвацца наступныя віды дзейнасці:

параўнанне формы, прапорцый і канструкцыі аб'ектаў, якія адлюстроўваюцца;

параўнанне кампазіцыйнага рашэння мастацкіх твораў, вылучэнне асаблівасцей прасторавага размяшчэння адлюстраваных аб'ектаў;

параўнанне каларыстычнага рашэння мастацкіх твораў, вылучэнне асаблівасцей мадэліроўкі аб'ёму адлюстраваных аб'ектаў, перадачы стану і настрою прыроды і да т.п.;

параўнанне пластычнага рашэння вобразаў у мастацкіх творах розных відаў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

практычнае выкананне мастацка-творчых работ па тэмах, рэкамендаваных у раздзеле праграмы.

Акрамя таго, на ўроку могуць арганізоўвацца:

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага сачынення «Асаблівасці перадачы аб'ёму прадметаў побыту», «Асаблівасці стылізацыі раслінных і жывёльных форм», «Асаблівасці канструявання аб'ёмнай цацкі на аснове разгорткі конуса (цыліндра, куба)» і інш.;

конкурс на лепшую творчую кампазіцыю, выраб, дробны выраб і інш. (праводзіцца ў рамках міні-выстаўкі пры арганізацыі аналізу выкананых на ўроку работ і падвядзення вынікаў урока).

На адным уроку для рэалізацыі мэты і задач вучэбнага прадмета «Выяўленчае мастацтва» мэтазгодным з'яўляецца аб'яднанне вучэбнага зместу двух раздзелаў праграмы.

Праграма рэкамендуе наступнае размеркаванне часу па раздзелах праграмы і відах дейнасці (настаўнік мае права на пераразмеркаванне гадзін паміж падраздзеламі.

Размеркаванне вучэбных гадзін па раздзелах паграмы і відах дзейнасці

Раздзелы праграмы	Віды дзейнасці	Колькасць гадзін
Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва	Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці	**3**
	Успрыманне твораў мастацтва	**5**
Практычная мастацка-творчая дзейнасць	Асваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік	**4**
	Адлюстраванне на плоскасці *Вучэбныя задачы:* *– кампазіцыя* *– прастора* *– форма, прапорцыі, канструкцыя* *– колер*	**26** (9) (2) (7) (8)
	Лепка	**8**
	Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн	**14**
Усяго		**60**

Метады і формы работы з навучэнцамі разнастайныя: аповед, гутарка, дыскусія, выкарыстанне ілюстрацый і дэманстрацый, прагляд мультымедыйных прэзентацый і аналіз прадстаўленага матэрыялу, самастойная работа з падручнікам, выкананне трэніровачных практыкаванняў, выкананне мастацка-творчых практычных работ і інш.; правядзенне заняткаў, якія пабудаваны па законах мастацкай драматургіі, майстар-класаў; выкарыстанне нестандартных форм правядзення ўрокаў: урок-даследаванне, урок-практыкум, урок-падарожжа, урок-экскурсія, урок-гульня, урок-казка, інтэграваны ўрок і інш.; арганізацыя вучэбных экскурсій у музеі, на выстаўкі, па горадзе, сустрэчы і размовы з мастакамі і інш.

Зместам вучэбнай праграмы не прадугледжваецца выкананне практычнай работы ў якасці дамашняга задання. Да наступнага ўрока (на працягу тыдня) навучэнцы павінны падрыхтаваць дапаможны матэрыял, паназіраць за пэўнымі аб'ектамі ці з'явамі прыроды, наведаць разам з бацькамі (аднакласнікамі) мастацкі музей або мастацкую выстаўку і г. д. Па ўласным жаданні навучэнцы могуць падабраць рэпрадукцыі або літаратурны матэрыял, падрыхтаваць паведамленне пра гісторыю стварэння мастацкага твора або пра творчасць мастака, выканаць замалёўкі і накіды з архітэктурнага або скульптурнага помніка (іх асноўнай мэтай з'яўляецца арыентацыя навучэнцаў на эстэтычнае асваенне навакольнага свету: прыроднага, помнікаў культуры, архітэктурных славутасцей свайго горада або сяла і да т.п.). Любую пазаўрочную дзейнасць навучэнцаў настаўнік павінен заахвочваць.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (60 г)

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва (8 г)

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці (3 г)

Эстэтычнае ўспрыманне аб'ектаў прыроды: разнастайнасць форм і колеру у прыродзе (кветкі, лісты, дрэвы). «Прагулка па гарадскім (сельскім) парку» (пажадана выкарыстоўваць мультымедыйную прэзентацыю); параўнальны аналіз формы, вызначэнне адценняў колеру садовых і лугавых кветак, знаходжанне падабенства і адрознення паміж імі. «Кветкі роднай зямлі» (пажадана выкарыстоўваць мультымедыйную прэзентацыю).

Эстэтычнае ўспрыманне аб'ектаў і з'яў прыроды: «Экскурсія па асеннім парку (садзе)», «Экскурсія па вясеннім парку (лесе)», «Зіма-мастачка», «Снежныя скульптуры» (назіранні за станам прыроды ў розныя поры года, пажадана выкарыстоўваць мультымедыйныя прэзентацыі).

Эстэтычнае ўспрыманне архітэктуры Беларусі: «Прыгажосць сучасных архітэктурных збудаванняў Беларусі» (пажадана выкарыстоўваць мультымедыйную прэзентацыю).

Эстэтычнае ўспрыманне прадметнага свету: «Прыгажосць і карысць свету рэчаў» (пажадана выкарыстоўваць мультымедыйную прэзентацыю).

Успрыманне твораў мастацтва (5 г)

Роля выяўленчага мастацтва ў жыцці чалавека. Віды выяўленчага мастацтва: жывапіс (карціна), графіка (малюнак, ілюстрацыя). Творы мастакоў: *І. Шышкін.* «Раніца ў сасновым бары»; *В. Васняцоў.* «Алёнушка», ілюстрацыі да казак А. С. Пушкіна «Казка пра цара Салтана…», «Казка аб мёртвай царэўне і сямі асілках» і інш.

Віды і жанры выяўленчага мастацтва (жывапіс, графіка, скульптура; нацюрморт, пейзаж, партрэт) – мастацкія творы на выбар настаўніка.

Мастацкі вобраз у розных відах выяўленчага мастацтва. Вобраз восені ў творах мастакоў: *С. Каткоў.* «Лагойскі матыў»; *Г. Вашчанка.* «Перад адлётам», «Бульба»; *Л. Шакінка.* «Бабіна лета»; *І. Левітан.* «Залатая восень»; *І. Бродскі.* «Апалае лісце»; *В. Паленаў.* «Залатая восень» і інш. (мастацкія творы на выбар настаўніка).

Стан прыроды ў пейзажах мастакоў (кампазіцыйнае і каларыстычнае рашэнне, эмацыянальнае значэнне колеру). Поры года ў творах мастакоў: *А. Астаповіч.* «Зімні дзень»; *С. Герус.* «Зіма ў Мінску»; *Л. Дударэнка.* «Зімні дзень»; *В. Сумараў.* «Шэрань»; *М. Рамадзін.* «Незамярзаючая рэчка»; *Лі Дзі.* «Чалавек, які вядзе буйвала па снежнай раўніне»; *П. Масленікаў.* «Сакавіцкі вечар»; *А. Гугель.* «Бягуць ручаі»; *В. Цвірка.* «Прыпяць. Вясна»; *В. Бялыніцкі-Біруля.* «Зялёны май»; *П. Крохалеў.* «Вясна. Вяча»; *І. Левітан.* «Вясна – вялікая вада», «Зноў вясна»; *С. Герасімаў.* «Вярба цвіце» (на выбар настаўніка).

Рэалістычныя, дэкаратыўныя і фантазійныя вобразы жывёл у дэкаратыўна-прыкладным і выяўленчым мастацтве (кафлі, прадметах народнага побыту і іх дэкоры, творах мастакоў: *Я. Чарушын* – ілюстрацыі да кніг «Розныя звяры», «Дзеткі ў клетцы»; *В. Ватагін* – малюнкі жывёл; *В. Васняцоў.* «Гамаюн – птушка-вяшчун» і інш.).

Адзінства формы прадмета і яго аздабленне (агоўскія куфры, хахламскі посуд, жостаўскія падносы, дымкаўская цацка і інш.).

Беларускія ручнікі, посцілкі, паясы; народныя саламяныя, гліняныя посуд і цацкі. Функцыя, форма (канструкцыя) і дэкор вырабаў.

Практычная мастацка-творчая дзейнасць (52 г)

Асваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік (4 г)

Асаблівасці, спосабы і прыёмы работы графічнымі матэрыяламі (графітны аловак, туш, фламастары).

Асаблівасці, спосабы і прыёмы работы акварэллю.

Асаблівасці, спосабы і прыёмы работы гуашшу.

Асаблівасці, спосабы і прыёмы выканання манатыпіі.

Асаблівасці, спосабы і прыёмы выканання рэльефных кампазіцый і аб'ёмных вырабаў у тэхніцы «папяровая пластыка». Спосабы афарбоўкі паперы. Прыёмы трансфармацыі паперы: змінанне, згібанне, складванне, гафрыраванне, выгінанне, скручванне.

Асаблівасці, спосабы і прыёмы выканання аплікацыі.

Асаблівасці, спосабы і прыёмы выканання выцінанкі.

Асаблівасці, спосабы і прыёмы выканання кампазіцый з прыроднага матэрыялу (фларыстыка).

Адлюстраванне на плоскасці (26 г)

Кампазіцыя (9 г)

Выбар палажэння ліста паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Адпаведнасць памеру выявы памеру ліста паперы. «Жырафа», «Бегемот», «Кракадзіл», «Слон», «Ракета», «Аўтобус», «Дом», «Асілак», «Прыгажуня» і да т.п. (мастацкія матэрыялы на выбар настаўніка).

Кампаноўка выявы на лісце паперы ў зададзеным фармаце. Узаемасувязь адлюстраваных аб'ектаў (фігур) у кампазіцыі. «Вясёлыя клоўны», «Акрабаты», «Дрэсіроўшчыца і галубы» і да т.п. (гуаш, васковая крэйда).

Гарманічнае запаўненне ліста паперы выявамі, вылучэнне кампазіцыйнага цэнтра. Маляванне пейзажа па памяці і ўяўленні: «Ясны асенні дзень», «Сумная восень», «Асенняя непагадзь» і да т.п. (гуаш або акварэль).

Паняцце пра кампазіцыйную ўзаемасувязь адлюстраваных аб'ектаў, размяшчэнне прадметаў адносна адзін аднаго. «Снягурка і Дзед Мароз», «Два Маразы», «На будоўлі», «Убіраем яблыкі» і да т.п. (гуаш або акварэль).

Перадача характеру і нораву жывёл (добры, злы, хітры, даверлівы, цікаўны і г.д.). Маляванне па ўяўленні вобразаў беларускіх і рускіх народных казак («Храбры певень», «Змей Гарыныч», «Кот Максім»), твораў К. Чукоўскага, С. Маршака і інш. – на выбар навучэнцаў (гуаш або акварэль).

Перадача характэрных асаблівасцей знешняга аблічча і настрою чалавека. «Мая матуля», «Мы з татам гуляем у шахматы», «Бабуля вяжа шалік», «Мой любімы дзядуля», «Мая сястрычка («Мой брацік») з цацкай» і да т.п. (гуаш або акварэль).

Прастора (2 г)

Перадача глыбіні прасторы ў малюнку: «на першым плане», «на другім плане». Выкананне кампазіцыі «Летні адпачынак», «На беразе возера», «На дачы», «На прышкольным участку», «Зімовая прагулка» і да т.п. (каляровыя алоўкі, гуаш).

Форма, прапорцыі, канструкцыя (7 г)

Перадача ў кампазіцыі формы, прапорцый і канструкцыі адлюстраваных аб'ектаў: «Асенні нацюрморт», «Дары лесу», «Садавіна і агародніна» (гуаш або акварэль), «Нацюрморт з простых прадметаў побыту» (матэрыялы на выбар настаўніка).

Перадача ў малюнку характэрных асаблівасцей будовы дрэў (форма, канструкцыя). Маляванне на аснове назіранняў: «Зімовы лес», «Чароўныя дрэвы», «Магутны дуб», «Стройная бярозка» і да т.п. (гелевая ручка з чорным чарнілам, фламастар).

Перадача ў кампазіцыі характэрных асаблівасцей будовы фігуры чалавека і жывёл (канструкцыя, прапорцыі). «Артысты цырка на арэне» (акрабат, клоўн, жанглёр, дрэсіроўшчык і інш.) і да т.п. (гуаш або акварэль).

Колер (8 г)

Колер і фарбы. Паняцце пра асноўныя (жоўты, чырвоны, сіні), састаўныя (аранжавы, фіялетавы, зялёны) колеры, светлыя і цёмныя адценні колеру. Выкананне кампазіцый: «Рознакаляровыя паветраныя шары», «Рознакаляровыя сцягі», «Цвецік-семіцвецік», «Папараць-кветка», «Пунсовая кветачка», «Вішня (яблыня) цвіце» і да т.п. (гуаш або акварэль).

Эмацыянальна-вобразны змест колеру: радасны і змрочны, рэзкі і пяшчотны, спакойны і напружаны: «Добрыя і злыя персанажы казак», «Русалачка». «Кентаўр», «Птушка Сірын» (гуаш або акварэль).

Кампазіцыйныя магчымасці колеру. Цёплы, халодны і змешаны каларыт. Выкананне шматпланавых кампазіцый: «Ясны асенні (зімовы) дзень», «Сумная восень», «Асенняя непагадзь», «Выглянула сонейка» і да т.п. (гуаш або акварэль).

Лепка (8 г)

Прыёмы лепкі. Лепка садавіны і агародніны: «Асенні нацюрморт» (яблык, груша, сліва, агурок, перац, памідор і інш.) (гліна, пластылін або салёнае цеста).

Спосабы лепкі. Складанне цэлага з асобных частак: лепка персанажаў казак і мультфільмаў: «Цуда-Юда – трохгаловы змей», «Ліса», «Віні-Пух» (рознакаляровы пластылін); «Жывёлы на арэне цырка» і інш. (гліна, аднакаляровы пластылін або салёнае цеста; калектыўная работа), «Я катаюся на лыжах (санках)» (гліна або пластылін).

Перадача формы цела і пластыкі жывёл: «Шчаня», «Кошка з кацянятамі», «Мядзведзь», «Казлік» (гліна, пластылін або салёнае цеста).

Дэкаратыўнае рашэнне вобраза пры лепцы цацак. Лепка цацкі ў падарунак родным (гліна, пластылін або салёнае цеста).

Лепка рэльефу: «Рыбка», «Нацюрморт», «Дэкаратыўны букет» і да т.п. (рознакаляровы пластылін).

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн (14 г)

Дэкаратыўнае абагульненне форм і колеру прадметаў (стылізацыя). Пано для школьной сталовай (кухні) «Дэкаратыўны нацюрморт» (гуаш).

Дэкаратыўнае абагульненне форм раслiннага і жывёльнага свету (стылізацыя). Фрыз: «Кветкі, матылькі і птушкі», «Мая Беларусь» (гуаш).

Асаблівасці стварэння мастацкіх вобразў з прыроднага матэрыялу (фларыстыка). Прыёмы выканання кампазіцыі «Кветкавыя матывы», «Забаўныя жывёлы».

Асаблівасці стварэння кампазіцыі «Асенні букет» у тэхніцы «манатыпія».

Віды выцінанкі. Прыёмы выканання кампазіцыі «Дрэва жыцця» ў тэхніцы «выцінанка».

Віды арнаменту. Эскіз арнаменту для аздаблення «шубкі», «рукавічак» і «шапачкі» Снягуркі; пано для спальні (гасцінай), падноса, хусткі для матухны Мяцеліцы (гуаш).

Прыёмы стварэння кампазіцый дэкаратыўна-прыкладнога характару (асноўныя кампазіцыйныя схемы). Выкананне эскіза «Хустка для мамы», «Дыван для лялькі», «Посуд для Васілісы Прыгожай, Бабы Ягі» і да т.п. (гуаш).

Віды аплікацыі (прадметная, сюжэтная, дэкаратыўная). Прыёмы выразання элементаў аплікацыі: «Запаслівы вожык», «Дрэсіраваны леў», «Пудзель Арто», «Вясёлая малпачка», «Зімовы пейзаж» і да т.п. (збліжаныя і кантрасныя адценні паперы).

Рытм у дэкаратыўнай кампазіцыі. Фрыз: «Вясеннія кветкі», «Вясенні пейзаж», «Сняжынкі» (аплікацыя; калектыўная работа).

Прыёмы выканання рэльефнай кампазіцыі з паперы «Новы год у лесе», «У трыдзявятым царстве» і да т.п. (калектыўная работа).

Асаблівасці стварэння рэльефных кампазіцый і аб’ёмных вырабаў у тэхніцы «папяровая пластыка»: «Запрашальны білет», «Віншавальная паштоўка», ёлачныя цацкі, навагоднія сувеніры.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць/разумець:

характэрныя асаблівасці асноўных відаў мастацтва (графіка, жывапіс, скульптура, архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва);

сродкі мастацкай выразнасці твораў графікі, жывапісу, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

назвы асноўных і састаўных колераў; эмацыянальна-вобразныя магчымасці колеру;

назвы мастацкіх матэрыялаў, інструментаў, прылад і правілы работы з імі;

характэрныя асаблівасці гуашавых і акварэльных фарбаў, прыёмы работы з дадзенымі мастацкімі матэрыяламі;

прыёмы лепкі, трансфармацыі паперы, выканання аплікацыі, выцінанкі, манатыпіі і інш.;

асаблівасці кампазіцыйнага размяшчэння аб’ектаў, якія адлюстроўваюцца;

паслядоўнасць выканання жывапіснай, графічнай і скульптурнай (рэльефнай, аб’ёмнай) кампазіцыі, аплікацыі, манатыпіі і інш.

асноўныя кампазіцыйныя схемы, якія выкарыстоўваюцца пры выкананні твораў дэкаратыўна-прыкладнога характару.

Умець:

выбіраць фармат ліста і яго палажэнне ў залежнасці ад зместу кампазіцыі;

цалкам выкарыстоўваць плоскасць ліста паперы, адлюстроўваць прадметы адпаведна фармату;

перадаваць характэрныя асаблівасці формы прадметаў, якія адлюстроўваюцца;

састаўляць колеры, неабходныя для рэалізацыі творчай задумы;

запаўняць малюнак колерам, не пакідаючы прабелаў паміж фігурамі і фонам;

працаваць з мастацкімі матэрыяламі і прыладамі (гуаш, пластылін, васковая крэйда, туш, каляровая папера, клей, пэндзлі, палачкі);

выбіраць дэкор у адпаведнасці з формай і прызначэннем прадмета;

аздабляць плоскія і аб’ёмныя прадметы арнаментам;

прытрымлівацца элементарных правіл культуры працы (арганізацыя і ўборка рабочага месца, акуратныя і беражлівыя адносіны да мастацкіх матэрыялаў і прылад);

актыўна ўдзельнічаць у абмеркаванні і ацэньванні работ аднакласнікаў.

Выкарыстоўваць (прымяняць) у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:
спецыяльную (мастацтвазнаўчую) тэрміналогію (лексіку);
рацыянальныя прыёмы рэзання паперы;
аптымальныя прыёмы трансфармацыі паперы пры канструяванні аб'ёмных цацак;
аптымальныя спосабы лепкі;
розныя мастацкія тэхнікі для вырашэння творчай задумы.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Музыка»
для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

МУЗЫКА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Мэта навучання вучэбнаму прадмету «Музыка» – фарміраванне музычнай культуры навучэнцаў як часткі іх духоўнай культуры.

Кампаненты мэты:

адукацыйны – засваенне музычнага мастацтва праз авалоданне музычнымі ведамі; слухацкімі, выканальніцкімі і кампазітарскімі ўменнямі; засваенне мастацкага спосабу пазнання свету;

выхаваўчы – выхаванне любові да музыкі, мастацтва; прысваенне чалавекам, які расце, каштоўнасцей, закладзеных у змесце твораў мастацтва;

развіццёвы – развіццё музычных, камунікатыўных, творчых здольнасцей; развіццё самастойнасці і ініцыятыўнасці ў вырашэнні творчых задач.

Звышзадачай вучэбнага прадмета «Музыка» з'яўляецца выяўленне цеснай сувязі музыкі і жыцця (Д.Б.Кабалеўскі). Вырашэнне звышзадачы ажыццяўляецца праз выяўленне жыццёвых вытокаў і жыццёвага зместу музыкі, а таксама праз прымяненне ў рэальным жыцці набытых у працэсе навучання ведаў, уменняў, вопыту музычнай і мастацкай дзейнасці.

Задачы вучэбнага прадмета «Музыка»:

1. Фарміраванне прадметнай (музычнай) кампетэнцыі: выхаванне любові да музыкі, засваенне музычнага мастацтва (авалоданне музычнымі ведамі, слухацкімі, выканальніцкімі і кампазітарскімі ўменнямі), развіццё музычных здольнасцей.

Задача вырашаецца праз:

– фарміраванне ўяўленняў аб музыцы як самакаштоўным відзе мастацтва, яе змесце і выразнай мове;

– фарміраванне ўменняў слухаць, выконваць, ствараць музыку;

– развіццё музычных здольнасцей;

– набыццё вопыту ажыццяўлення музычнай дзейнасці.

2. Фарміраванне надпрадметнай (мастацкай) кампетэнцыі: развіццё мастацкага густу, набыццё вопыту самастойнай мастацка-творчай дзейнасці.

Задача вырашаецца праз:

– фарміраванне ўяўленняў аб музыцы як неад'емнай частцы мастацкай культуры, агульнасці зместу розных відаў мастацтва, адрозненнях у іх выразных мовах;

– засваенне мастацкага спосабу пазнання свету;

– развіццё мастацкіх здольнасцей;

– набыццё вопыту мастацка-творчай дзейнасці.

3. Фарміраванне метапрадметнай кампетэнцыі: развіццё камунікатыўных, творчых, аналітычных здольнасцей; уменняў вырашаць праблемы, несці адказнасць за вынікі індывідуальнай і калектыўнай работы.

Задача вырашаецца праз:

– фарміраванне ўяўленняў аб цеснай сувязі музыкі (мастацтва) з жыццём;

– набыццё вопыту вырашэння жыццёвых задач у працэсе мастацкай дзейнасці (у індывідуальнай, групавой і калектыўнай формах);

– развіццё камунікатыўных і творчых уменняў;

– набыццё вопыту змястоўнай ацэнкі вучэбнай (музычнай) дзейнасці.

Спецыфіка вучэбнага прадмета «Музыка» праяўляецца ў адначасовым вырашэнні ўсяго комплексу задач у працэсе навучання.

Прынцыпы навучання і адбору зместу.

Навучанне вучэбнаму прадмету «Музыка» ажыццяўляецца на аснове наступных прынцыпаў:

– *Прынцыпу цэласнасці*, у адпаведнасці з якім музыка ў працэсе навучання разглядаецца ў адзінстве яе складнікаў: зместу, формы, жанравай асновы і выразнай мовы. Прынцып цэласнасці рэалізуецца праз тэматычную пабудову зместу вучэбнага прадмета. Усе тэмы аб'яднаны інтанацыйнай прыродай музыкі; у кожнай з іх інтанацыя выяўляе адно або некалькі сваіх значэнняў.

– *Прынцыпу полімастацкасці*, які дазваляе выйсці за межы прадметнага зместу і разгледзець музыку ў якасці аднаго з праяўленняў мастацкай культуры і ва ўсім багацці яе ўзаемасувязей з іншымі відамі мастацтва. У працэсе навучання акцэнтуецца ўвага на функцыях музыкі, якія з'яўляюцца агульнымі для мастацтва і мастацкай дзейнасці ў цэлым. Прынцып прадугледжвае пашырэнне і паглыбленне зместу навучання і выхавання за кошт узаемадзеяння і ўзаемаўзбагачэння розных відаў мастацтва. Узаемадзеянне мастацтваў выстройваецца вакол агульнага сэнсавага стрыжня, у якасці якога выступае тэматызм, што структуруе змест вучэбнага прадмета.

– *Прынцыпу сувязі з жыццём*, у адпаведнасці з якім успрыманне музыкі (мастацтва) разглядаецца ў якасці мастацка-вобразнага аналага жыцця, а музычная творчая дзейнасць – у якасці працэсу мадэліравання вырашэння жыццёвых праблем. Сацыякультурны кантэкст узнікнення і існавання музычнага мастацтва становіцца неад'емнай часткай зместу вучэбнага прадмета; веды і ўменні з'яўляюцца сродкам пранікнення навучэнцаў у свет музыкі, а праз яго – у разнастайныя праблемы жыцця. Прынцып сувязі з жыццём выступае ў якасці звышзадачы і генеральнай лініі навучання вучэбнаму прадмету.

Адбор зместу навучання вучэбнаму прадмету «Музыка» ажыццяўляецца ў апоры на прынцыпы мастацкай дыдактыкі – *прынцыпы мастацкасці, вобразнасці, асацыятыўнасці, інтанацыйнасці і імправізацыйнасці*.

Раздзелы, якія вывучаюцца.

1 клас: «Свет гукаў», «Як расказвае музыка», «З чаго выросла музыка», «Пра што расказвае музыка».

2 клас: «Сродкі музычнай выразнасці», «Падарожжа ў музычныя краіны – Оперу, Балет, Сімфонію, Канцэрт».

3 клас: «Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы», «Інтанацыя», «Развіццё музыкі», «Будова (формы) музыкі».

Асаблівасці арганізацыі навучання.

Навучанне вучэбнаму прадмету «Музыка» ажыццяўляецца праз выкарыстанне метадаў праблематызацыі і мадэліравання мастацка-творчага працэсу (Л.В.Шкаляр).

Праблематызацыя зместу вучэбнага прадмета забяспечвае разгляд музычных твораў у якасці адказаў на жыццёвыя пытанні, пададзеныя ў эмацыянальна-вобразнай форме. Выкарыстанне метаду прадугледжвае даследаванне працэсу паходжання музыкі, прасочванне працэсу ўзнікнення з'яў і абазначэння паняццяў. Метад дазваляе ператварыць урок музыкі ў жывы даследчы працэс, падвесці навучэнцаў да разумення заканамернасцей

музычнай мовы як сістэмы мастацкіх сімвалаў, музычнай формы як асаблівай арганізацыі гэтых сімвалаў.

Метад мадэліравання мастацка-творчага працэсу накіраваны на ўзнаўленне працэсуальнасці музычных з'яў, забяспечвае дзейнаснае спасціжэнне музычнага мастацтва. На аснове пранікнення ў сутнасць мастацтва і яго заканамернасці аднаўляецца сам працэс паходжання мастацтва. Метад мадэліравання мастацка-творчага працэсу перамяшчае акцэнты з вывучэння вучэбнага матэрыялу на творчыя праяўленні навучэнцаў, дазваляе ім самастойна даследаваць працэсы музычнай творчасці на аснове рэфлексіі дзейнасці кампазітара, выканаўцы, слухача.

У рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу метады праблематызацыі і мадэліравання мастацка-творчага працэсу спалучаюцца з праектнымі формамі і метадамі работы.

Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу з'яўляюцца вучэбныя заняткі. Прытрымліванне прынцыпу «навучанне мастацтву ў формах самога мастацтва» вызначае прыярытэт арганізацыйных форм, якія адпавядаюць прыродзе мастацтва (урок-канцэрт, урок-гульня, урок-майстэрня, урок-тэатралізацыя, урок-кліп і інш.). У рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу шырокае распаўсюджванне атрымліваюць такія формы, як фасілітацыйныя дыскусіі і мастацка-творчыя праекты.

Фасілітацыйныя дыскусіі накіраваны на развіццё самастойнасці навучэнцаў у працэсе засваення вучэбнага матэрыялу, садзейнічаюць развіццю крытычнага мыслення, даследчыцкіх і камунікатыўных уменняў. Мастацка-творчыя праекты прадугледжваюць самастойнае вырашэнне навучэнцамі вучэбнай задачы, забяспечваюць развіццё самастойнасці, здольнасці да самаарганізацыі, гатоўнасці да супрацоўніцтва, стваральнай дзейнасці, садзейнічаюць выкарыстанню набытага вопыту для вырашэння жыццёвых праблем.

Змест вучэбнага прадмета (па класах).

Вучэбны прадмет «Музыка» вывучаецца ў колькасці 1 гадзіна на тыдзень. Працэс навучання музыцы раздзелены на этапы, якія адпавядаюць гадам навучання.

Змест вучэбнага прадмета ўключае:

– прадметныя веды і ўменні (у галіне музычнага мастацтва);

– надпрадметныя веды і вядучыя ўменні (у галіне мастацкай культуры);

– метапрадметныя (жыццёвыя) веды і ўменні (знаходзіць рашэнне праблем, браць на сябе адказнасць і інш.).

Прадметныя веды і ўменні забяспечваюць цэласнае спасціжэнне музычнага мастацтва; надпрадметныя веды і вядучыя ўменні – магчымасць арыентавацца ў разнастайнасці праяўленняў мастацкай культуры, актыўнае самавыяўленне ў мастацкай творчасці; метапрадметныя (жыццёвыя) веды і ўменні – эфектыўнае вырашэнне жыццёвых праблем.

Змест вучэбнага прадмета пабудаваны па лінейна-канцэнтрычным прынцыпе. На кожным этапе навучання пашыраюцца і паглыбляюцца ўяўленні навучэнцаў аб змесце, жанравай аснове, формах і выразнай мове музычнага мастацтва, удасканальваюцца ўменні ўспрымання і практычнай музычнай (мастацкай) дзейнасці.

Стрыжнёвай асновай зместу вучэбнага прадмета з'яўляецца тэматызм, у аснове якога ляжыць распрацаваная Д.Б.Кабалеўскім сістэма абагульненых уяўленняў аб музыцы як аб важнай частцы жыцця грамадства і самакаштоўным відзе мастацтва.

Першы год навучання забяспечвае фарміраванне агульнага ўяўлення аб музыцы як аб «мастацтве інтануемага сэнсу» (Б.У.Асаф'еў). У працэсе навучання фарміруюцца першасныя ўяўленні аб выразнасці гукавога аблічча свету, аб жыццёвых вытоках музыкі, яе ўсеабдымным змесце, багатай палітры выразных сродкаў, першасных музычных жанрах. Успрыманне і практычная музычная дзейнасць забяспечваюць засваенне пазіцый кампазітара, выканаўцы, слухача ў цэласнасці музычнай камунікацыі.

Фарміруюцца наступныя элементы кампетэнцый:

веды (на ўзроўні ўяўленняў) аб:

– гукавой палітры навакольнага свету;

– усеабдымным змесце музыкі, яе жыццёвых вытоках;

– пульсацыі як жыццёвай з'яве і яе праяўленні ў музыцы;

– першасных музычных жанрах;

– выразнай мове музычнага мастацтва;

уменні:

– эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

– выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

– актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці.

На ***другім годзе навучання*** ажыццяўляецца канкрэтызацыя ўяўленняў аб выразнай мове музычнага мастацтва. На аснове набытага вопыту практычнай музычнай дзейнасці ўводзяцца тэрміны, якія абазначаюць асноўныя сродкі музычнай выразнасці (рытм, тэмп, тэмбр, лад, рэгістр, дынаміка). Ажыццяўляецца азнаямленне з жанрамі прафесіянальнай музыкі – операй, балетам, сімфоніяй, канцэртам. Фарміруюцца ўяўленні аб інструментах сімфанічнага аркестра.

Фарміруюцца наступныя элементы кампетэнцый:

веды (на ўзроўні ўяўленняў) аб:

– сродках музычнай выразнасці, іх ролі ў «будаўніцтве» гістарычна сфарміраваных музычных форм;

– жанрах прафесіянальнай музыкі (оперы, балеце, сімфоніі, канцэрце);

– інструментах сімфанічнага аркестра;

уменні:

– эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

– выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

– актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці.

Змест ***трэцяга года навучання*** накіраваны на фарміраванне ўяўленняў аб музыцы як частцы мастацкай культуры. Засвойваюцца катэгорыі і паняцці, уласцівыя розным відам мастацтва (форма, інтанацыя, кампазіцыя, рытм і інш.).

Фарміруюцца наступныя элементы кампетэнцый:

веды (на ўзроўні ўяўленняў) аб:

– песеннасці, танцавальнасці, маршавасці;

– інтанацыі і яе розных значэннях;

– крыніцах і спосабах развіцця музыкі;

– музычным формаўтварэнні, разнастайнасці музычных форм;

уменні:

– вызначаць песенную, танцавальную, маршавую аснову музычных твораў;

– ствараць, выконваць, успрымаць інтанацыі рознага характару з выкарыстаннем магчымасцей розных відаў мастацтва;

– назіраць за развіццём музыкі, самастойна ажыццяўляць яе развіццё;

– увасабляць творчую задуму ў музычнай (мастацкай) форме;

– эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

– выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

– актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці.

З мэтай захавання і жывога існавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў кожным класе засвойваецца рамачны змест, што забяспечвае набыццё вопыту каляндарна-абрадавых дзеянняў у адпаведнасці з традыцыямі рэгіёна.

Лінейна-канцэнтрычны прынцып пабудовы зместу вучэбнага прадмета «Музыка» абумоўлівае выкарыстанне наступных **відаў дзейнасці** на працягу ўсяго перыяду навучання: слуханне, спеў, ігра на музычных інструментах, пластычнае інтанаванне, свабоднае дырыжыраванне, стварэнне, імправізацыя, рытмадэкламацыя, тэатралізацыя, слоўнае, графічнае, пластычнае мадэліраванне, іншыя віды мастацкай дзейнасці.

Ацэначная дзейнасць выступае ў якасці сувязнага звяна паміж пазнавальнай і пераўтваральнай дзейнасцю і з прычыны гэтага з'яўляецца неад'емнай часткай мастацкай творчасці. Навучанне вучэбнаму прадмету ў рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу прадугледжвае пашырэнне прасторы ацэначнай дзейнасці за кошт шырокага выкарыстання самаацэнкі і ўзаемаацэнкі.

Змест вучэбнага прадмета

I чвэрць
СВЕТ ГУКАЎ (8 г)

Прыкладнае планаванне тэмы

Гучальны свет вакол нас (1 г). Гукавая разнастайнасць навакольнага свету (свету прыроды і чалавека). Магчымасць узнаўлення гукаў «гучальнымі» жэстамі.

Прыродныя і механічныя гукі (1 г). Характэрныя асаблівасці прыродных і механічных гукаў. Разнастайнасць гукаў прыроды. Крыніцы механічных гукаў.

Музыка – краіна гукаў (1 г). Асаблівасці музычных гукаў. Адрозненне музычных гукаў ад гукаў прыродных і механічных.

Малюнкі, створаныя пры дапамозе гукаў (2 г). Выразныя магчымасці гукаў. Стварэнне гукавых малюнкаў.

Настрой, перададзены пры дапамозе гукаў (2 г). Разнастайнасць настрояў чалавека. Выразныя магчымасці гукаў у перадачы ўнутранага душэўнага стану.

Падагульняючы ўрок па тэме «Свет гукаў» (1 г).

Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Муз. Н.Сакалоўскага, сл. М.Клімковіча і У.Карызны.

Беларускія народныя песні «Ладу-ладу-ладкі», «Белабока сарока», «Дожджык», «Іграў я на дудцы».

«Где живет музыка». Муз. і сл. В.Кавалёва.

«Насупа». Муз. В.Кавалёва, сл. М.Чарняўскага.

«Слово на ладошках». Муз. А.Паплянавай, сл. Н.Пікулевай.

«Солнышко», «Дождик». Муз. А.Цілічэевай, сл. Л.Дымавай.

«Осень». Муз. М.Красева, сл. М.Івенсэн.

«По грибы». Муз. У.Алоўнікава, сл. Л.Алтухова.

С.Пракоф'еў. «Дождж і вясёлка», «Казачка» (са зб. фартэпіянных п'ес «Дзіцячая музыка»).

Г.Вагнер. «Зязюлька», «Песенька».

Р.Шуман. «Песенька жняцоў», «Паляўнічая песенька» (са зб. фартэпіянных п'ес «Альбом для юнацтва»).

Э.Грыг. «Птушачка».

А.Хачатуран. «Вячэрняя казка».

П.Падкавыраў. «Ку-ку».

Д.Шастаковіч. «Катрынка».

Ж.-Ф.Рамо. «Курыца».

М.Рымскі-Корсакаў. «Акіян – мора сіняе» (аркестравы ўступ да оперы «Садко»).

Спосабы дзейнасці: слуханне і класіфікацыя гукаў (прыродных, механічных, музычных); узнаўленне гукаў пры дапамозе «гучальных» жэстаў і гукаперайманне; узнаўленне музычных гукаў голасам і на музычных інструментах; «маляванне голасам», развучванне і выкананне песень, у якіх прысутнічае выяўленчы пачатак; дэкламацыя вершаў з выкарыстаннем гукавыяўленчых эфектаў; «агучванне» карцін; стварэнне гукавых кампазіцый на зададзеную тэму.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Навучэнцы павінны:

мець уяўленні аб:

разнастайнасці гукаў навакольнага свету;

прыродных і механічных гуках;

асаблівасцях, выразных і выяўленчых магчымасцях музычнага гуку;

умець:

(група прыватных уменняў)

услухоўвацца ў гукі навакольнага свету; распазнаваць прыродныя, механічныя і музычныя гукі;

узнаўляць музычныя гукі (голасам і на музычных інструментах), перадаваць пры дапамозе гукаў настрой;

выкарыстоўваць прыродныя, механічныя, музычныя гукі ва ўласнай мастацкай дзейнасці, пры стварэнні гукавых малюнкаў;

(група ключавых уменняў)

удзельнічаць у калектыўнай мастацка-творчай дзейнасці;

знаходзіць спосабы самавыяўлення сродкамі музычнага мастацтва;

ацэньваць вынікі практычнай дзейнасці;

выкарыстоўваць набыты вопыт:

у самастойнай мастацка-творчай дзейнасці;

у дамашнім музіцыраванні.

II чвэрць

ЯК РАСКАЗВАЕ МУЗЫКА (8 г)

Прыкладнае планаванне тэмы

Што і як можна расказаць пры дапамозе гукаў (1 г). Роля гукаў у стварэнні музычных малюнкаў. «Вобразнасць» і «выразнасць» у музыцы.

Гукаперайманне (1 г). Гукаперайманне як імітацыя гучання навакольнага свету. Выяўленчыя і выразныя магчымасці гукаперайманння. Прыёмы гукаперайманння.

Святло і цень у музыцы (лад) (1 г). Спосабы перадачы святла і ценю ў музыцы. Выразныя магчымасці ладу.

Хуткае і павольнае ў музыцы (тэмп) (1 г). Спосабы перадачы хуткага і павольнага ў музыцы. Выразныя магчымасці тэмпу.

Гучнае і ціхае ў музыцы (дынаміка) (1 г). Спосабы перадачы гучнага і ціхага ў музыцы. Выразныя магчымасці дынамікі.

Халоднае і цёплае ў музыцы (тэмбр) (1 г). Спосабы перадачы халоднага і цёплага ў музыцы. Разнастайнасць музычных тэмбраў.

Высокія і нізкія гукі (рэгістр) (1 г). Высокія і нізкія гукі ў музыцы. Выразныя магчымасці рэгістраў.

Падагульняючы ўрок па тэме «Як расказвае музыка» (1 г).

Прыкладны музычны матэрыял

Беларускія народныя песні «Чубаценькі верабей», «Гэй ты, воўчанька».

«Пайшоў коўзацца каток». Муз. народная, сл. С.Шушкевіча.

«Зімовая калыханка». Муз. Л.Свердзеля, сл. В.Вярбы.

«Добрый жук». Муз. А.Спадавекіа, сл. Я.Шварца.

«Догадайся, кто поет». Муз. А.Цілічэевай, сл. А.Гангава.

«Здравствуй, зимушка-зима». Муз. А.Філіпенкі, сл. Т.Волгінай.

«Новогодняя хороводная». Муз. А.Астроўскага, сл. Ю.Ляднёва.

«Бубенчики». Муз. А.Цілічэевай, сл. М.Долінава.

«Песенка друзей». Муз. В.Герчык, сл. Я.Акіма.

«Новогодняя». Муз. В.Кавалёва, сл. А.Навуменкі.

І.Брамс. «Пятрушка».

Р.Шуман. «Смелы яздок», «Вясёлы селянін, які вяртаецца з працы», «Дзед Мароз» (са зб. фартэпіянных п’ес «Альбом для юнацтва»).

Р.Сурус. «Галоп», «Калыханка», «Жарты».

К.Сен-Санс. «Куры і пеўні», «Антылопы», «Чарапаха» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).

К.Цесакоў. «Гульня ў снежкі», «Снежны вальс».

С.Картэс. «У некаторым царстве» (з Маленькай сюіты для фартэпіяна «Казка»).

Ж.Ф.Рамо. «Тамбурын».

Д.Кабалеўскі. «Клоўны».

У.Агафоннікаў. «Сані са званочкамі».

П.Чайкоўскі. «Вальс снежных камякоў», «Танец Феі Дражэ» (з балета «Шчаўкунчык»).

Спосабы дзейнасці: слуханне і параўнанне музычных твораў, якія выконваюцца ў розных тэмпах, у розных рэгістрах, з рознай дынамікай; слуханне і параўнанне сугучнасцей, якія перадаюць святло і цень (лад) у музыцы; распазнаванне афарбоўкі гучання музыкі (тэмбраў) па слыху; дэкламацыя вершаў з рознай скорасцю вымаўлення, з рознай сілай гуку, з рознай вышынёй гуку; выкананне музычных папевак з паэтапным вар'іраваннем сродкаў музычнай выразнасці; выкананне мелодый з выкарыстаннем пластычнага інтанавання; развучванне і выкананне песень з выкарыстаннем музычна-рытмічных рухаў, з суправаджэннем на дзіцячых музычных інструментах; інсцэніроўка песень; агучванне вершаў з выкарыстаннем музычных інструментаў; стварэнне гукавых малюнкаў на аснове вершаў, на зададзеную тэму.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Навучэнцы павінны:

мець уяўленні аб:

выразнасці і вобразнасці ў музыцы;

гукаперайманні ў музыцы;

сродках музычнай выразнасці (святле і цені ў музыцы, скорасці выканання, гучнасці, афарбоўцы, вышыні гучання);

разнастайнасці музычных інструментаў;

умець:

(група прыватных уменняў)

распазнаваць перадачу ў музыцы светлага і цёмнага стану, хуткага і павольнага руху; гучнага – ціхага, халоднага – цёплага, высокага – нізкага гучання;

распазнаваць і выкарыстоўваць ва ўласнай мастацкай дзейнасці прыёмы гукаперайманння;

выкарыстоўваць ва ўласнай мастацкай дзейнасці розныя спосабы адлюстравання светлага і цёмнага стану, хуткага і павольнага руху; гучнага і ціхага, халоднага і цёплага, высокага і нізкага гучання;

ствараць гукавыя малюнкі;

(група ключавых уменняў)

удзельнічаць у калектыўнай мастацка-творчай дзейнасці;

знаходзіць спосабы самавыяўлення сродкамі музычнага мастацтва;

ацэньваць вынікі практычнай дзейнасці;

выкарыстоўваць набыты вопыт:

у самастойнай мастацка-творчай дзейнасці;

у дамашнім музіцыраванні.

III чвэрць

З ЧАГО ВЫРАСЛА МУЗЫКА (9 г)

Прыкладнае планаванне тэмы

З чаго пачынаецца музыка (1 г). Настрой і вобраз у музыцы. Выяўленчыя і выразныя магчымасці музыкі.

Песня, танец, марш (1 г). Жанравая разнастайнасць музыкі. «Першасныя» музычныя жанры: песня, танец, марш.

Жывы пульс музыкі (1 г). Пульсацыя (метр). Моцныя і слабыя долі «пульсу» (метра).

Якія бываюць маршы (1 г). Жанр маршу. Розныя віды маршаў (спартыўны, ваенны і інш.). Рытмічны малюнак маршу.

Якія бываюць танцы (2 г). Жанр танца. Відавая разнастайнасць танцаў.

Песня ў жыцці чалавека (1 г). Жанр песні. Песні народныя і кампазітарскія. Змест песень. Выразнасць выканання песень.

Песня, танец, марш сустракаюцца ў адным музычным творы (1 г). Песня-танец, песня-марш. Асаблівасці песень-танцаў і песень-маршаў.

Падагульняючы ўрок па тэме «З чаго вырасла музыка» (1 г).

Прыкладны музычны матэрыял

Беларуская веснавая песня «Ідзі, зіма, да Кракава».

Беларуская дзіцячая гульня «А на гары мак».

«В нашем классе» (марш, полька, вальс, песня). Муз. Д.Кабалеўскага.

«Калыханка». Муз. В.Раінчыка, сл. Г.Бураўкіна.

«Песенка о гномиках». Муз. і сл. В.Каваліва.

«Веселый музыкант». Муз. А.Філіпенкі, сл. Т.Волгінай.

«Солнечные зайчики». Муз. А.Паплянавай, сл. В.Татарынава.

«Барабан». Муз. Л.Сімаковіч, сл. Б.Жанчака.

«Песня юных защитников Отечества». Муз. В.Каваліва, сл. С.Лук'янавай.

«Птенчики». Муз. А.Цілічэевай, сл. М.Долінава.

Нямецкая народная песня «Весна», рускі тэкст С.Каратыгінай.

«Солдатик». Муз. Г.Курына, сл. М.Карэма, пер. М.Кудзінава.

«Начинаем перепляс». Муз. С.Сасніна, сл. П.Сіняўскага.

«Мама». Муз. Л.Бакалава, сл. С.Вігдарава.

Дж.Вердзі. «Марш» (з оперы «Аіда»).

Л.Бакерыні. «Менуэт».

П.Чайкоўскі. «Песня жаваранка», «Марш драўляных салдацікаў» (са зб. фартэпіянных п'ес «Дзіцячы альбом»).

Д.Кабалеўскі. «Танец маладога бегемота».

С.Баневіч. «Вальс на балі», «Паўночная полька» (з альбома «Па казках Ганса Хрысціяна Андэрсена»).

В.Кузняцоў. «Марш».

Г.Гарэлава. «Таўстун, які танцуе».

К.Сен-Санс. «Слон», «Акварыум», «Зязюля ў глыбіні лесу» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).

М.Мусаргскі. «Гапак» (з оперы «Сарочынскі кірмаш»).

М.Глінка. «Полька».

С.Пракоф'еў. «Марш».

С.Чарнецкі. «Сустрэчны марш».

М.Блантэр. «Футбольны марш».

В.Агапкін. «Развітанне славянкі».

І.Штраус. «Вальс».

С.Рахманінаў. «Італьянская полька».

Д.Шастаковіч. «Вальс-жарт».

Л.Шлег. «Калыханка маці».

Спосабы дзейнасці: слуханне мелодый з двухдольнай і трохдольнай пульсацыяй; суправаджэнне музыкі песень, танцаў, маршаў выразнымі рухамі; узнаўленне двухдольнай і трохдольнай пульсацыі пры дапамозе гучальных жэстаў, двухскладовых і трохскладовых слоў; дэкламацыя вершаў з выкарыстаннем раўнамернай пульсацыі; выкананне рытмічнага акампанементу да маршаў, танцаў (полькі, вальса), песень; выразнае выкананне песень з танцавальнымі рухамі, элементамі тэатралізацыі; падбор інструментаў для выканання акампанементу ў двухдольным і трохдольным памерах; стварэнне мелодыі калыханкі.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

мець уяўленні аб:

першасных музычных жанрах (песні, танцы, маршы) і іх прызначэнні ў жыцці чалавека;

відавой разнастайнасці песень, танцаў, маршаў;

метры (пульсе) і яго ролі ў музыцы;

умець:

(група прыватных уменняў)

распазнаваць песню, танец, марш; адрозніваць іх віды;

выдзяляць моцныя і слабыя долі «пульсу»;

узнаўляць раўнамерную пульсацыю;

выконваць рытмічны акампанемент да знаёмай мелодыі на аснове моцнай і слабай долі;

выразна выконваць песні з улікам іх зместу;

ствараць пры дапамозе гучальных жэстаў на аснове моцнай і слабай долі рытмічны акампанемент;

(група ключавых уменняў)

удзельнічаць у калектыўнай мастацка-творчай дзейнасці;

знаходзіць спосабы самавыяўлення сродкамі музычнага мастацтва;

ацэньваць вынікі практычнай дзейнасці;

выкарыстоўваць набыты вопыт:

у працэсе наведвання музычных канцэртаў;

у самастойнай мастацка-творчай дзейнасці;

у дамашнім музіцыраванні.

IV чвэрць

ПРА ШТО РАСКАЗВАЕ МУЗЫКА (9 г)

Прыкладнае планаванне тэмы

Музычныя гісторыі, расказаныя кампазітарамі (1 г). «Музычныя гісторыі». Узаемасувязь зместу музычных твораў са сродкамі музычнай выразнасці, выкарыстанымі аўтарам.

Музыка перадае пачуцці чалавека (2 г). Выразныя магчымасці музыкі. Перадача ў музыцы ўнутранага стану чалавека. Перадача пачуццяў (пяшчоты, радасці, трывогі), настрояў (весялосці, бадзёрасці, смутку).

Музыка адлюстроўвае розныя рысы характару (1 г). Выяўленча-выразныя магчымасці музыкі. Адлюстраванне ў музыцы характару чалавека.

Музыка перадае рух (1 г). Выяўленчыя магчымасці музыкі. Перадача ў музыцы руху.

Музыка малюе карціны (2 г). Перадача ў музыцы вобразаў прыроды. Поры года ў музыцы.

Музыка народнага свята (1 г). Музычны рэпертуар народнага свята. Роля музыкі ў народным святе.

Падагульняючы ўрок па тэме «Пра што расказвае музыка» (1 г).

Прыкладны музычны матэрыял

Эстонская народная песня «Взял волынку наш сосед».

Украінская народная песня «Иди, иди, дождичек».

«Пастушок». Муз. П.Падкавырава, сл. Я.Журбы.

«Окликание дождя». Муз. А.Лядава, сл. народныя.

«Бесконечная песенка». Муз. В.Кавалёва, сл. В.Семерніна.

«Волчок». Муз. І.Арсеева, сл. Л.Дымавай.

«Ягорачка». Муз. В.Сярых, сл. народныя.

Э.Грыг. «Матылёк».

Ж.Бізэ. «Ваўчок».

Л.К.Дакен. «Зязюля».

П.Чайкоўскі. «Хвароба лялькі», «Новая лялька» (са зб. фартэпіянных п’ес «Дзіцячы альбом»).

Г.Свірыдаў. «Упарты».

К.Сен-Санс. «Лебедзь» (з заалагічнай фантазіі «Карнавал жывёл»).

А.Залётнеў. «Балет мышэй».

Д.Кабалеўскі. «Труба і барабан», «Упарты брацік», «Сумная гісторыя».

В.Рэбікаў. «Мядзведзь».

А.Лядаў. «Музычная табакерка», «Пачвара».

І.Арсееў. «У госці» («Пехатой», «На веласіпедзе», «На машыне»).

Спосабы дзейнасці: вызначэнне зместу твора па выяўленча-выразных асаблівасцях музыкі; выкананне песень са здзяйсненнем выразных рухаў; агучванне вершаў з выкарыстаннем гукаперайманняў, ігрой на музычных інструментах; састаўленне мадэлі музычнага твора на аснове карціны, верша, казкі; састаўленне гукавых партрэтаў казачных персанажаў; інструментальная (вакальная) імправізацыя на зададзеную тэму; інсцэніроўка народнага свята.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

мець уяўленні аб:

здольнасці музыкі «расказваць» гісторыі;

ролі музыкі ў перадачы пачуццяў чалавека;

ролі музыкі ў перадачы руху;

ролі музыкі ў народным святе;

умець:

(група прыватных уменняў)

знаходзіць узаемасувязь зместу музычнага твора з выяўленча-выразнымі асаблівасцямі музыкі;

вызначаць перададзеныя ў музыцы пачуцці;

выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

(група ключавых уменняў)

удзельнічаць у калектыўнай мастацка-творчай дзейнасці;

знаходзіць спосабы самавыяўлення сродкамі музычнага мастацтва;

ацэньваць вынікі практычнай дзейнасці;

выкарыстоўваць набыты вопыт:

у самастойнай мастацка-творчай дзейнасці;

у дамашнім музіцыраванні.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Працоўнае навучанне»
для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Мэта навучання – фарміраванне асноў тэхналагічнай граматнасці навучэнцаў. Яна ўключае наступныя кампаненты:

адукацыйны – фарміраванне асноў праектна-канструктарскай, праектна-тэхналагічнай, выканальніцкай і прафарыентацыйнай кампетэнцый;

развіццёвы – спрыяць развіццю творчых здольнасцей, маніпулятыўных навыкаў, памяці, уважлівасці;

выхаваўчы – спрыяць выхаванню любові да працы і прыроды, павагі да людзей працы і вынікаў іх дзейнасці; адказнасці і добрасумленнасці; акуратнасці і ашчаднасці; дысцыплінаванасці і стараннасці, цярплівасці і настойлівасці ў дасягненні планаванага выніку; сама- і ўзаемаацэнкі; самастойнасці і ўзаемадапамогі.

Задачы:

у рамках *праектна-канструктарскай* кампетэнцыі:

азнаямленне навучэнцаў з рознымі відамі канструктарскай дакументацыі: схема, эскіз, чарцёж;

фарміраванне вопыту чытання і распрацоўкі найпрасцейшай канструктарскай дакументацыі;

у рамках *праектна-тэхналагічнай* кампетэнцыі:

азнаямленне навучэнцаў з тэхналагічнымі і інструкцыйнымі картамі на выраб, што выконваецца. Яны адлюстроўваюць паслядоўнасць пераўтварэння прадмета працы і інструменты, якія выкарыстоўваюцца (тэхналагічная карта), з дадаткам тлумачэнняў або інструкцый па выкананні (інструкцыйная карта);

фарміраванне вопыту чытання тэхналагічнай дакументацыі;

у рамках *выканальніцкай* кампетэнцыі:

фарміраванне прыёмаў і спосабаў выканання тэхналагічных аперацый апрацоўкі паперы, кардону, тэкстыльных, прыродных, падручных матэрыялаў;

фарміраванне вопыту індывідуальнай і калектыўнай працоўнай дзейнасці па выкананні простых вырабаў з розных матэрыялаў;

у рамках *прафарыентацыйнай* кампетэнцыі:

азнаямленне навучэнцаў са зместам працы работнікаў розных прафесій і з прафесійна важнымі якасцямі, неабходнымі для паспяховай працы.

Напрамкі навучання

Прадметы працы – асноўныя матэрыялы: папера, кардон, тэкстыльныя матэрыялы, падручныя (пластмаса, драўніна, метал), прыродныя матэрыялы. Сродкі працы – інструменты і прыстасаванні.

Прадукты (вынікі працы) – сувеніры (цацкі), дэкаратыўныя элементы інтэр'ера, прыстасаванні для працы.

Тэхналогія – паслядоўнае пераўтварэнне прадметаў працы з дапамогай сродкаў працы ў прадукты працы, якія маюць спажывецкую вартасць і асабістую значнасць для навучэнцаў.

Адукацыйныя падыходы (прадметныя)

Прадметна-тэхналагічны падыход прадугледжвае навучанне тэхналогіі ў працэсе выканання канкрэтных вырабаў, ажыццяўлення пэўных відаў работ.

Згодна з дзейнасным падыходам засваенне навучэнцамі зместу вучэбнага матэрыялу ажыццяўляецца ў працэсе ўласнай актыўнай дзейнасці. Дзейнасць пры гэтым разглядаецца як крыніца фарміравання асобы і галоўны фактар яе развіцця. У працэсе навучання важна актыўнае выкарыстанне разнастайных відаў дзейнасці (пазнавальнай, праектнай, камунікатыўнай, гульнявой).

Згодна з кампетэнтнасным падыходам галоўным у працэсе навучання з’яўляецца не фарміраванне асобных ведаў і ўменняў, а стварэнне ўмоў для развіцця здольнасці ажыццяўляць прадугледжаныя праграмай віды і спосабы дзейнасці. У змесце вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» вылучаны кампетэнцыі, якія ўяўляюць сабой сукупнасць інфармацыйных адзінак, што ўключаюць тэарэтычныя звесткі, спосабы дзейнасці, тэхналагічныя аперацыі і працэсы, якія адлюстроўваюць змест і характар пэўнага віду дзейнасці.

Вучэбная, вучэбна-працоўная, працоўная дзейнасць, маючы практыка-пераўтваральны характар, сама становіцца прадметам засваення. Кампетэнцыі як уласцівасці індывіда выяўляюцца ў выглядзе ўмеласці, спосабу асобаснай самарэалізацыі,

формы праяўлення здольнасцей. Веды, уменні і навыкі становяцца не мэтай, а сродкам развіцця асобы навучэнца, фарміравання яго кампетэнцый.

Згодна з культуралагічным падыходам працэс навучання павінен быць накіраваны на фарміраванне культуры асобы. Таму асноўнай мэтай вучэбнага прадмета з'яўляецца фарміраванне асноў тэхналагічнай граматнасці асобы. Гэтаму спрыяе вывучэнне тэхналогіі рамёстваў, рэалізацыя прынцыпу прадуктыўнасці, гэта значыць стварэнне асобасна і грамадска значнага прадукту дзейнасці, фарміраванне культуры працы і міжасобасных ўзаемадзеянняў у працэсе вучэбна-працоўнай дзейнасці.

Кампетэнцыі і змест, якое забяспечвае іх фарміраванне

Фарміраванне прадметна-канструктарскай кампетэнцыі забяспечваецца пры дапамозе паслядоўнага ўскладнення канструктарскай дакументацыі (ад простых схем да чарцяжоў разгортак і зборачных адзінак); прадметна-тэхналагічнай – ад простых схем да інструкцыйна-тэхналагічных карт; выканальніцкай – дзякуючы ўскладненню вырабаў і тэхналагічных аперацый, якія ажыццяўляюцца; прафарыентацыйнай – за кошт агульнага ўяўлення пра прафесіі (што робяць, чым працуюць, што ў выніку атрымліваюць, ад чаго залежыць поспех працы).

Прыватнаметадычныя прынцыпы адбору зместу навучання

Прынцып прадуктыўнасці прадугледжвае стварэнне асобасна і грамадска значнага прадукту дзейнасці, фарміраванне культуры працы і міжасобасных узаемадзеянняў у працэсе вучэбна-працоўнай дзейнасці.

Прынцып пераемнасці прадугледжвае апору на вопыт навучэнцаў, набыты на папярэдніх этапах навучання. Раздзелы праграмы дашкольнай адукацыі: ручная праца, праца ў прыродзе, самаабслугоўванне і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва – атрымліваюць далейшае развіццё пры вывучэнні наступных раздзелаў вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне»: тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў; тэхналогія раслінаводства; тэхналогія гаспадарання; тэхналогія народных рамёстваў.

Прынцып цэласнасці прадугледжвае ўключэнне навучэнцаў у вучэбна-працоўную дзейнасць па рэалізацыі цэласнай тэхналогіі ад ідэі будучага вырабу да яго выканання і з'яўлення новай ідэі, новай канструкцыі вырабу і/або тэхналогіі яго выканання. Пры гэтым прадугледжваецца паслядоўнае ўскладненне канструктыўных і тэхналагічных асаблівасцей вырабаў.

Прынцып варыятыўнасці азначае розныя варыянты адукацыйнага працэсу, якія дазваляюць дасягнуць мэт і задач працоўнага навучання ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту. Зыходзячы з патрэбнасцей, магчымасцей, здольнасцей навучэнцаў, запытаў бацькоў, магчымасцей матэрыяльна-тэхнічнай базы, асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага і сацыякультурнага асяроддзя, настаўніку даецца магчымасць уносіць карэктывы ў змест навучання.

Прынцып неабходнасці і дастатковасці тэарэтычных звестак для выканання практычных работ. Для разумення і ажыццяўлення тэхналогіі выканання вырабаў на кожным уроку акцэнтуецца ўвага на канструкцыйных матэрыялах, інструментах і прыстасаваннях, стадыях і этапах тэхналогіі, правілах арганізацыі працоўнага месца і бяспекі працы, крытэрыях і паказчыках ацэнкі якасці вырабу, а таксама на самаацэнцы дасягнення асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў вучэбна-працоўнай дзейнасці.

Прынцып інтэграцыі і рэалізацыі міжпрадметных сувязей прадугледжвае выкарыстанне звестак з іншых вучэбных прадметаў у працэсе пазнавальнай і вучэбна-працоўнай дзейнасці. Адрозніваюць папярэднія, спадарожныя і наступныя міжпрадметныя сувязі. Гэта азначае, што на ўроках працоўнага навучання можна не толькі абапірацца на веды і ўменні, засвоеныя вучнямі на іншых уроках, але і ўпершыню знаёміць з паняццямі, фарміраваць спосабы дзейнасці, якія пасля будуць прымяняцца на занятках па іншых вучэбных прадметах.

Вывучаемыя раздзелы:

«Тэхналогія і грамадства»;

«Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»;

«Тэхналогія народных рамёстваў»;

«Тэхналогія гаспадарання»;

«Тэхналогія раслінаводства»;

«Я і свет тэхналогій».

Раздзел ***«Тэхналогія і грамадства»*** дазваляе навучэнцам усвядоміць узаемаўплыў тэхналогіі і грамадства (вытворчасці); актуалізаваць вопыт, набыты ва ўстановах дашкольнай адукацыі, стварыць арыенціровачную аснову для паспяховага навучання, пазнаёміцца з правіламі арганізацыі працоўнай дзейнасці і правіламі бяспекі працы; аналізаваць стадыі (ідэя – вобраз – канструкцыя – паслядоўнасць выканання – выкананне – ацэнка – новая ідэя) і этапы тэхналогіі (падрыхтоўчы, асноўны і заключны). Акцэнтуецца ўвага на разнастайнасці матэрыялаў: канструкцыйныя (асноўныя матэрыялы вырабаў (канструкцый)), прыродныя і падручныя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца не па прамым прызначэнні.

У межах раздзела ***«Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»*** прадугледжана паслядоўнае азнаямленне з рознымі матэрыяламі: папера (I клас), кардон тонкі аднаслойны (II клас), калька, капіравальная і гафрыраваная папера, паліграфічны і ўпаковачны кардон (III клас); баваўняныя тканіны (I клас), ільняныя (II клас), шарсцяныя (III клас), тканіны і тэкстыльныя матэрыялы з сінтэтычных і змяшаных валокнаў (IV клас); ніткі для шыцця, вышывання, пляцення; прыродныя матэрыялы: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, плады рабіны, глогу, насенне ясеня, клёна, алешыны (I клас), шкарлупіна лясных і грэцкіх арэхаў, карані дрэў, насенне ліпы, дзядоўніку, пер'е (II клас), ракавінкі, каменьчыкі, яечная шкарлупіна (III клас), кара дрэў (IV клас); падручныя матэрыялы: шпагат, тонкі шнур, тасьма, саломінкі для кактэйлю (I клас), кардонныя каробкі, упакоўкі; пластмасавыя кубачкі, слоікі (II клас), пластыкавыя флаконы, драўляныя вырабы (палачкі для марожанага, прышчэпкі, дэталі драўлянага канструктара) (III клас), дрот (IV клас), што не толькі забяспечвае магчымасць азнаямлення з шырокім пералікам матэрыялаў, але і спрыяе развіццю фантазіі, творчай самарэалізацыі навучэнцаў.

У кожным наступным класе прадугледжваецца выкарыстанне ў практычнай дзейнасці ўсіх раней вывучаных матэрыялаў.

У практычнай дзейнасці пераважае выкананне вырабаў па ўзоры (I клас), графічнай выяве (II клас), эскізе і схеме (III клас), уласнай задуме (IV клас). Адначасова адбываецца ўскладненне вырабаў: ад аднадэталёвых да шматдэталёвых, ад плоскасных да аб'ёмных, ад нераздымных да раздымных.

Раздзел ***«Тэхналогія народных рамёстваў»*** знаёміць навучэнцаў з найбольш даступнымі для вучняў кожнага класа рамёствамі: выцінанка (сіметрычная, рапортная і чатырохпрамянёвая разеткавая выцінанка, выкананая па ўзоры з наяўнай разметкай) (I клас), сіметрычная, рапортная і васьміпрамянёвая разеткавая выцінанка па ўласнай разметцы (II клас), сіметрычная, рапортная і шасціпрамянёвая разеткавая выцінанка на аснове аналагаў (III клас), камбінаваная выцінанка па ўласнай задуме (IV клас)); фларыстыка (плоскасная аплікацыя ў паласе і квадраце (I клас), стылізацыя выяў жывёл, птушак, насякомых, пейзаж (II клас), стварэнне аб'ёмных кампазіцый (III клас), ікебана (IV клас)); саломапляценне (плоскасныя (II клас) і аб'ёмныя вырабы з трубчастай саломкі (III клас), саламяная скульптура (IV клас)); вязанне кручком (вязанне ланцужка з паветраных петляў, паўслупка, наклейванне ланцужкоў (III клас), вязанне слупка без накіду, выкананне вырабаў па схеме і славесным апісанні (IV клас)); вышыўка крыжыкам па ўзоры і схеме (IV клас). Арганізуючы заняткі ў рамках дадзенага раздзела, неабходна ўлічваць нацыянальныя і рэгіянальныя асаблівасці сацыякультурнай спадчыны (наяўнасць мастацкіх промыслаў: саломапляценне, інкрустацыя саломкай, ткацтва, вышыўка, роспіс, фларыстыка, кераміка і інш.).

Раздзел ***«Тэхналогія гаспадарання»*** спрыяе фарміраванню вопыту па самаабслугоўванні: сервіроўка стала да чаю (I клас), догляд адзення і абутку (II клас), дробны рамонт адзення (III клас), дробны рамонт кніг (IV клас), культуры паводзін у побыце, выхаванню самастойнасці.

Раздзел ***«Тэхналогія раслінаводства»*** пазнаёміць навучэнцаў з прыёмамі і правіламі догляду пакаёвых (I і II клас) і кветкава-дэкаратыўных (III і IV клас) раслін.

Раздзел ***«Я і свет тэхналогій»*** прызначаны для падвядзення вынікаў навучання за год, аналізу вучэбна-працоўных дасягненняў кожнага навучэнца, вызначэння ўзроўню засваення вывучаных тэхналогій. У дадзеным раздзеле прадугледжана выкананне калектыўных выніковых заданняў «Танец матылькоў» (I клас), «Квітнеючы луг» (II клас), «Падводнае царства» (III клас), у рамках якіх кожны вучань стварае выраб на зададзеную тэму. Матэрыялы і тэхналогію вырабу навучэнцы выбіраюць па ўласным жаданні. У IV класе на выніковых занятках адбываецца выстаўка-кірмаш вырабаў, выкананых вучнямі на ўроках і дома.

Паслядоўнасць вучэбных заняткаў прыводзіцца ў метадычных рэкамендацыях і каляндарна-тэматычным планаванні. Яна адлюстроўвае падрыхтоўку падарункавых сувеніраў да свят, цацак да Новага года, магчымасці вучняў па зборы прыроднага матэрыялу, а таксама рэкамендаваную псіхолагамі змену відаў працоўнай дзейнасці.

Ва ўсіх раздзелах ўведзена рубрыка «Прафесійная арыентацыя», прызначэнне якой – пазнаёміць навучэнцаў з рознымі прафесіямі, зместам працы па іх (прадмет (аб'ект) працы, сродкі працы, прадукт (вынік) працы, асноўныя віды работ), а таксама патрабаваннямі прафесіі да чалавека, яго асобасных (ўласцівасці і якасці асобы) кампетэнцый.

Асноўнымі метадамі працоўнага навучання з'яўляюцца дэманстрацыя, практыкаванні, доследы і назіранні, практычныя работы і метад праектаў, якія рэалізуюцца ў працэсе выканання навучэнцамі канкрэтных вырабаў, што адпавядаюць патрабаванням функцыянальнасці і эстэтычнай выразнасці (карысці і прыгажосці). Большая частка вучэбнага часу (не менш за 80 %) адведзена на практычную дзейнасць навучэнцаў. На выкананне вырабу можа адводзіцца 1 ці 2 навучальныя заняткі ў залежнасці ад складанасці канструкцыі і аб'ёму выкананай працы. Настаўнік можа выбраць любыя з вырабаў, прапанаваных у вучэбнай праграме (рубрыка «Прыкладныя вучэбныя заданні»), ці падабраць іншыя, канструкцыя і тэхналогія выканання якіх адпавядае зместу дадзенага раздзела. Вырабы могуць выконвацца па тэхналагічнай карце, малюнку, уяўленні (на аснове аналагаў), па ўласнай задуме. Настаўніку даецца магчымасць выкарыстоўваць каля 30 % вучэбнага часу па ўласным меркаванні пры ўмове дасягнення патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў, названых у адукацыйным стандарце па працоўным навучанні і ў вучэбнай праграме.

Прафарыентацыйная накіраванасць працоўнага навучання рэалізуецца праз гутаркі на вучэбных занятках, сустрэчы з людзьмі розных прафесій, экскурсіі.

У праграме вылучаны міжпрадметныя сувязі, якія дапамагаюць рэалізаваць інтэгратыўны характар прадмета «Працоўнае навучанне».

Курсівам з зорачкай адзначаны тэмы, якія з'яўляюцца неабавязковымі для вывучэння і могуць вывучацца па меркаванні настаўніка.

Пісьмовыя кантрольныя работы праграмай не прадугледжаны.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (30 г)

Тэхналогія і грамадства (2 г)

Уводзіны ў прадмет «Працоўнае навучанне» (2 г)

Тэарэтычныя звесткі. Чалавек, прырода, грамадства і свет тэхналогій. Праца ў нашым жыцці. Ручная праца. Прыгажосць і карысць рэчаў, якія вырабляюцца.

Крыніцы інфармацыі: падручнік, альбом «Цуда-майстэрня», сшытак самаацэнкі і інш.

Разнастайнасць матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў. Беражлівыя адносіны да прыроды і навакольных прадметаў. Правілы арганізацыі рабочага месца. Правілы бяспекі працы.

Што мы ўмеем рабіць сваімі рукамі? (гутарка пра вырабы, якія навучэнцы стваралі ва ўстановах дашкольнай адукацыі і ў хатніх умовах).

Пераемныя сувязі (з дашкольнай адукацыяй). Ручная праца. Самаабслугоўванне. Гаспадарча-бытавая праца. Праца ў прыродзе. Канструяванне. Дзіцячы дызайн. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Прафесійная арыентацыя. Людзі розных прафесій. Прафесіі бацькоў.

Практычная дзейнасць. Вызначэнне матэрыялаў, інструментаў і прыстасаванняў на аснове дэманстрацыі вырабаў настаўнікам. Арганізацыя рабочага месца.

Прыкладныя аб'екты працы

Прыстасаванні для работы: падстаўка для памазкоў для клею.

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: складванне сурвэтак (з вопыту дашкольнай адукацыі).

Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў (18 г)

Выкананне вырабаў з паперы і кардону (9 г)

Тэарэтычныя звесткі. Агульнае ўяўленне пра віды паперы: паліграфічная, чарцёжная, абгортачная, газетная. Элементарныя ўласцівасці паперы: трываласць; шурпатасць; тэхналагічныя ўласцівасці (здольнасць да згінання, скручвання, разрыву, разразання, склейвання); колер. Сыравіна для вытворчасці паперы – драўніна і макулатура. Прымяненне паперы.

Аплікацыя з геаметрычных фігур. Арнамент у паласе. Рытм у арнаменце.

Элементы графічнай граматы: лінія разрэзу, лінія згібу, месцы нанясення клею. Схемы складання арыгамі.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка з дапамогай шаблону, *трафарэта**, згінаннем; абрыванне, згінанне, рэзанне, склейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: розныя віды паперы.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, аловак, лінейка, памазок для клею і інш.

Дапаможныя матэрыялы: клей.

Прафесійная арыентацыя. Прафесійная дзейнасць людзей па вырабе паперы.

Міжпрадметныя сувязі.

Матэматыка: узаемнае размяшчэнне прадметаў. Прамая і крывая лініі. Адрэзак. Даўжыня адрэзка. Вымярэнне даўжыні адрэзка. Сантыметр.

Выяўленчае мастацтва: кампазіцыя – запаўненне ўсёй паверхні плоскасці аркуша паперы. Гарманічнае размяшчэнне малюнка на аркушы паперы. Выбар палажэння аркуша паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Адпаведнасць памеру малюнка памерам аркуша паперы. Узаемасувязь фігур кампазіцыі. Развіццё навыкаў самастойнага пошуку кампазіцыі. Рытм у дэкаратыўным адлюстраванні. Фарміраванне паняцця пра форму, яе прапорцыі. Арнамент.

Чалавек і свет: уплыў людзей на жыццё раслін.

Літаратурнае чытанне і беларуская мова: узбагачэнне слоўнікавага запасу (драўніна).

Практычная дзейнасць. Азнаямленне з элементарнымі ўласцівасцямі паперы. Параўнанне ўласцівасцей розных відаў паперы. Аналіз узораў вырабаў (форма, колер). Чытанне схем складання арыгамі і графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс выканання вырабу. Тлумачэнне плана работы. Выкананне простых аб'ектаў працы з выкарыстаннем вывучаных тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу выканання.

Прыкладныя аб'екты працы

Прыстасаванні для працы: каробачка для абрэзкаў паперы, закладка для кніг.

*Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: «*Пунсовы ветразь», «Семіколеравая кветачка», «Ураджай» – абрыўная аплікацыя. «Матылькі», «Замак», «Машына», «Пунсовая кветачка» – аплікацыя з геаметрычных фігур. «Квітнеючы луг», «Рыбкі ў акварыуме», «На паляне», «Падарожжа на машыне», «У цырку» – сюжэтная аплікацыя. Упрыгожанні да свята (ланцужкі, зорачкі, сняжынкі) – канструяванне з палосак паперы.

Цацкі: фігуркі жывёл, рыб, птушак і інш. – арыгамі, канструяванне з палосак паперы.

Выкананне вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў (4 г)

Тэарэтычныя звесткі. Агульнае ўяўленне пра тэкстыльныя матэрыялы (тканіна, ніткі). Выкарыстанне тэкстыльных матэрыялаў. Элементарныя ўласцівасці тэкстыльных матэрыялаў: трываласць, мяккасць, колер.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка па лякале, раскрой, склейванне, выцягванне нітак тканіны, разразанне, завязванне вузлоў. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: фланель, аднатонны паркаль, ніткі.

Інструменты і прыстасаванні: лякалы, кравецкая крэйда, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: клей.

Прафесійная арыентацыя. Агульнае ўяўленне пра прафесію ткача.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва: паняцце пра форму, яе прапорцыі. Выбар палажэння аркуша паперы ў залежнасці ад формы і размяшчэння прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Выразнасць колеру.

Матэматыка: вымярэнне даўжыні прадметаў.

Літаратурнае чытанне і беларуская мова: узбагачэнне слоўнікавага запасу (тэкстыльныя матэрыялы, баваўняная тканіна, фланель).

Практычная дзейнасць. Распазнаванне паркалю і фланелі па знешнім выглядзе, навобмацак. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў (матэрыял, форма). Чытанне графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс выканання вырабу. Выкананне простых вырабаў па ўзоры з выкарыстаннем вывучаных тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу стварэння.

Прыкладныя аб'екты працы

Прыстасаванні для працы: ігольнік-кніжка.

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: сурвэтка з махрамі, «Чароўны ўзор», «Цуда-кветка» (аплікацыя з нітак).

Дэкаратыўныя элементы адзення: кутасікі.

Выкананне вырабаў з прыродных матэрыялаў (3 г)

Тэарэтычныя звесткі. Агульнае ўяўленне пра прыродныя матэрыялы. Іх форма, колер, памеры. *Варыятыўнасць выкарыстання*.* Беражлівыя адносіны да прыроды.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: злучэнне дэталей з дапамогай пластыліну, склейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, *плады рабіны, глогу, барбарысу**, засушанае лісце і інш.

Інструменты і прыстасаванні: стэкі, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: пластылін, клей, папера.

Прафесійная арыентацыя. Прафесіі тыпу «чалавек – прырода» (азеляняльнік).

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва: паняцце пра разнастайнасць форм і колеру ў прыродзе. Паняцце пра форму, яе прапорцыі. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

Чалавек і свет: асеннія з'явы ў прыродзе. Выспяванне пладоў і насення раслін. Разнастайнасць і прыгажосць раслін. Уплыў людзей на жыццё раслін. Неабходнасць аховы раслін.

Практычная дзейнасць. Аналіз гатовых вырабаў (матэрыял). Выкананне простых вырабаў па ўзоры, *па ўяўленні** з выкарыстаннем вывучаных тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу выканання.

Прыкладныя вучэбныя заданні

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: фігуркі жывёл «Госці лесу», героі казак, мадэлі транспартных сродкаў.

Цацкі: «Пінгвіняты», «Залатая рыбка», «Матылёк», «Лесавічок», «Вожык» і інш.

Выкананне вырабаў з падручных матэрыялаў (2 г)

Тэарэтычныя звесткі. Нетрадыцыйнае выкарыстанне матэрыялаў. Другое жыццё рэчаў.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне, разразанне, нанізванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: шпагат, тонкі шнур, тасьма, вяроўка, саломінкі для кактэйлю.

Інструменты і прыстасаванні: памазок для клею, нажніцы, аловак, тоўстая іголка.

Дапаможныя матэрыялы: клей, папера, тонкі кардон, ніткі.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва: паняцце пра форму, яе прапорцыі. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

Літаратурнае чытанне і беларуская мова: узбагачэнне слоўнікавага запасу (шпагат, лінейныя матэрыялы).

Практычная дзейнасць. Аналіз канструкцыі ўзораў вырабаў. Чытанне графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс выканання вырабу. Выкананне простых вырабаў па ўзоры, *па ўяўленні** з выкарыстаннем вывучаных тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу стварэння.

Прыкладныя аб'екты працы

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: «Семіколеравая кветачка», «Вясёлыя звераняты» – пано са шпагату (калектыўная праца), «Церамок», упрыгажэнні да свята – падвескі з трубачак.

Цацкі: «Парсючок», «Кацяня», «Шчанюк» са шпагату.

Дыдактычны матэрыял: канструктар «Дзівосныя трубачкі».

Тэхналогія народных рамёстваў (5 г)

Выцінанка (2 г)

Тэарэтычныя звесткі. «Беларуская выцінанка». Сіметрычныя, рапортныя, разеткавыя ўзоры. Спосабы атрымання ўзору.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: складанне, выразанне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: тонкая белая і каляровая папера.

Інструменты: нажніцы, аловак.

Прафесійная арыентацыя. Знаёмства з творчасцю беларускіх народных майстроў.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва: паняцце пра лінію і яе разнавіднасці. Рытм у дэкаратыўным адлюстраванні.

Літаратурнае чытанне: узбагачэнне слоўніка (выцінанка, сіметрыя).

Практычная дзейнасць. Аналіз вырабаў. Чытанне графічных відарысаў, якія адлюстроўваюць працэс стварэння вырабу. Выкананне вырабаў па гатовай разметцы, *па ўяўленні**: складанне паперы ў 2, 4 згібы, выразанне элементаў. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу выканання.

Прыкладныя вучэбныя заданні

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: «Цуда-сняжынкі», гірлянды.

Запрашэнні, віншавальныя паштоўкі: «З Новым годам», «Усе ў госці да нас».

Фларыстыка (3 г)

Тэарэтычныя звесткі. Правілы збору і засушвання лісця. Беражлівыя адносіны да прыроды. Уласцівасці матэрыялаў (форма, колер, трываласць). Узор у паласе, квадраце.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: лісце дрэў і кустоў, засушанае ў плоскасці.

Інструменты: памазок для клею. Дапаможныя матэрыялы: клей.

Прафесійная арыентацыя. Знаёмства з творчасцю беларускіх майстроў фларыстыкі.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва: колеры асенняй прыроды. Паняцце пра разнастайнасць форм і колеру ў прыродзе. Выбар палажэння аркуша паперы ў залежнасці ад формы прадметаў, якія адлюстроўваюцца. Адпаведнасць памеру выявы памеру аркуша паперы.

Кампаноўка буйной выявы на аркушы паперы. Узаемасувязь фігур у кампазіцыі. Групаванне прадметаў у залежнасці ад іх формы.

Чалавек і свет: залатая восень. Разнастайнасць асенняй афарбоўкі лісця дрэў і кустоў. Лістапад. Уплыў людзей на жыццё раслін. Неабходнасць аховы раслін.

Літаратурнае чытанне і беларуская мова: узбагачэнне слоўнікавага запасу (фларыстыка).

Практычная дзейнасць. Параўнанне ўласцівасцей сырых і засушаных лістоў.Аналіз вырабаў. Выкананне вырабаў па ўзоры, *па ўяўленні**. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу выканання.

Прыкладныя аб'екты працы

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: пано «Дыван з асенніх лістоў», «Узоры восені», «Асенняя казка», узор з лістоў у паласе, квадраце.

Тэхналогія гаспадарання (3 г)

Забеспячэнне побыту сям'і (3 г)

Тэарэтычныя звесткі. Віды дзейнасці па самаабслугоўванні ў хатніх умовах. Словы «хачу» і «трэба» ў нашых сем'ях. Эканомія электраэнергіі і вады.

Афармленне падарункаў. *Афармленне інтэр'ера пакоя да свята*.*

Сервіроўка святочнага стала да чаю. Неабходны посуд. Складванне папяровых сурвэтак. Культура паводзін за сталом.

Прафесійная арыентацыя. Прафесіі тыпу «чалавек – чалавек» (афіцыянт). Гутарка «Добра там жывецца, дзе гуртам сеецца і жнецца».

Міжпрадметныя сувязі

Чалавек і свет: я і мая сям'я. Абавязкі дзіцяці ў сям'і. Небяспечныя сітуацыі дома. Правілы асабістай гігіены. Як даглядаць адзенне і абутак.

Беларуская мова і літаратурнае чытанне: успрыняцце і аналіз твораў (загадак, прыказак, казак і г.д.). Літаратурная творчасць і імправізацыя (складанне апавяданняў, казак). Культура маўлення.

Практычная дзейнасць. Арганізацыйна-дзейнасная гульня «Маміны (татавы) памочнікі». Афармленне падарункаў, класнага кабінета да свята (калектыўная работа). Сервіроўка стала да чаю.

Тэхналогія раслінаводства (1 г)

Догляд пакаёвых раслін (1 г)

Тэарэтычныя звесткі. Агульныя правілы догляду пакаёвых раслін.

Прафесійная арыентацыя. Прафесіі тыпу «чалавек – прырода» (кветкавод).

Міжпрадметныя сувязі

Чалавек і свет: расліны – частка жывой прыроды. Разнастайнасць і прыгажосць раслін.

Літаратурнае чытанне і беларуская мова: узбагачэнне слоўнікавага запасу (назвы раслін).

Практычная дзейнасць. Паліў і апырскванне раслін, рыхленне глебы, выдаленне пылу з лістоў, *мыццё паддонаў**.

Я і свет тэхналогій (1 г)

Падвядзенне вынікаў года. Выстаўка вырабаў, выкананых у бягучым годзе. Прэзентацыя і аналіз найлепшых вырабаў.

Рэкамендацыі па нарыхтоўцы ўлетку прыроднага матэрыялу, неабходнага для работы ў II класе: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, шкарлупіна арэхаў, карані дрэў, пер'е і інш.; кветкі, лісце, галінкі раслін, засушаныя ў плоскасці; саломка.

Практычная дзейнасць. Выкананне калектыўнай работы з выкарыстаннем вывучаных матэрыялаў і асвоеных тэхналагічных аперацый.

Прыкладнае выніковае заданне: калектыўная работа «Танец матылькоў».

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Прытрымлівацца правіл:

бяспечнай працы, арганізацыі рабочага месца;

беражлівых адносін да інструментаў, эканомнага расходавання матэрыялаў;

працоўнай дысцыпліны.

Мець уяўленне пра:

значэнне працы ў нашым жыцці;

асноўныя патрабаванні да якасці вырабу;

асноўныя ўласцівасці вывучаных матэрыялаў;

выцінанку і фларыстыку;

правілы эканоміі электраэнергіі і вады;

агульныя правілы догляду пакаёвых раслін;

прафесіі, з якімі пазнаёміліся на вучэбных занятках.

Распазнаваць:

вывучаныя матэрыялы, інструменты і прыстасаванні.

Чытаць і разумець:

графічныя відарысы паслядоўнасці выканання вырабаў, схемы складання арыгамі.

Ажыццяўляць (выконваць):

арганізацыю рабочага месца;

вывучаныя тэхналагічныя аперацыі выканання вырабаў (пад кіраўніцтвам настаўніка па ўзоры, малюнку);

ацэнку якасці гатовага вырабу і працэсу яго выканання;

сервіроўку стала да чаю;

паліў і апырскванне раслін, рыхленне глебы, выдаленне пылу з лістоў.

Набыць вопыт:

выканання простых вырабаў.

Выкарыстоўваць набытыя навыкі ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

планаваць сваю дзейнасць і кантраляваць яе ход;

ажыццяўляць арганізацыю свайго рабочага месца;

ажыццяўляць тэхналагічны працэс выканання вырабаў пад кіраўніцтвам настаўніка або дарослага па ўзоры, эскізе, малюнку;

ажыццяўляць аздабленне і ўпрыгажэнне гатовых вырабаў;

ажыццяўляць самыя простыя работы па доглядзе пакаёвых раслін;

ажыццяўляць сервіроўку стала да чаю;

прытрымлівацца правіл бяспечнай працы з матэрыяламі, інструментамі.

Выяўляць:

любоў да працы і прыроды, павагу да людзей працы і вынікаў іх дзейнасці;

уважлівасць, адказнасць і добрасумленнасць;

акуратнасць і беражлівасць.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Фізічная культура і здароўе»
для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Фізічная культура і здароўе» вырашае задачы агульнай фізкультурнай адукацыі, рознабаковага фізічнага, інтэлектуальнага, духоўна-маральнага развіцця і аздараўлення навучэнцаў. Яго змест накіраваны на ўмацаванне здароўя, прафілактыку захворванняў, фарміраванне здаровага фізічна актыўнага ладу жыцця навучэнцаў; аказвае развіваючы ўплыў на светапогляд навучэнцаў, фарміруе псіхічныя, псіхафізічныя, маральна-валявыя і іншыя якасці асобы. Рэгулярныя фізкультурна-аздараўленчыя навучальныя заняткі спрыяюць аднаўленню і павышэнню разумовай і фізічнай працаздольнасці навучэнцаў.

Спецыфічнай асаблівасцю вучэбнай праграмы вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» з'яўляецца выкарыстанне на кожных вучэбных занятках разнастайных сродкаў фізічнага выхавання для рашэння трыадзінай задачы адукацыі, выхавання і аздараўлення навучэнцаў.

Мэтай вывучэння вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца фарміраванне фізічнай культуры асобы і аздараўленне навучэнцаў з улікам іх узроставых асаблівасцей.

Адукацыйныя задачы:

– фарміраванне даступных у малодшым школьным узросце фізкультурных ведаў;

– фарміраванне рухальных уменняў і навыкаў;

– навучанне спосабам фізкультурнай дзейнасці;

– развіццё здольнасці прымяняць вывучаныя фізкультурныя веды, выкарыстоўваць рухальныя ўменні і навыкі ў пазаўрочны час;

– фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў бяспечных паводзін падчас арганізаваных і самастойных гульняў і фізкультурных заняткаў у экалагічна неспрыяльных умовах.

Выхаваўчыя задачы:

– выхаванне стаўлення да ўласнага здароўя і здароўя іншых як да каштоўнасці;

– развіццё патрэбы ў рэгулярнай фізкультурна-аздараўленчай і спартыўнай актыўнасці;

– садзейнічанне гарманічнаму фізічнаму, маральны-духоўнаму, інтэлектуальнаму і эмацыянальнаму развіццю;

– выхаванне дысцыплінаванасці, сумленнасці, выканаўчасці, калектывізму, спагадлівасці, смеласці;

– фарміраванне міжасобасных адносін з аднагодкамі ў працэсе фізкультурнай і спартыўнай дзейнасці.

Аздараўленчыя задачы:

– прафілактыка захворванняў, стрэсавых станаў;

– фарміраванне навыкаў здаровага фізічна актыўнага ладу жыцця;

– умацаванне фізічнага здароўя навучэнцаў;

– развіццё каардынацыйных і кандыцыйных здольнасцей;

– садзейнічанне рознабаковаму фізічнаму развіццю;

– фарміраванне правільнай паставы.

Для павышэння аздараўленчага эфекту вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» вучэбныя заняткі праводзяцца на адкрытых прышкольных пляцоўках.

Змест вучэбнай праграмы размеркаваны па наступных раздзелах (табл. 1, 5.):

«Асновы фізкультурных ведаў»;

«Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці»;

«Развіццё рухальных здольнасцей».

Тэмы раздзела **«Асновы фізкультурных ведаў»** вывучаюцца на ўроках фізічнай культуры на працягу навучальнага года ў форме непрацяглых апавяданняў, гутарак (5–10 мінут) і прадугледжваюць фарміраванне ў навучэнцаў ведаў і ўяўленняў пра фізічную культуру як пра частку агульнай культуры чалавека.

Раздзел **«Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці»** ўключае фізічныя практыкаванні, якія складаюць змест «школы рухаў»: розныя віды хадзьбы, бегу, скачкі, кіданне, лажанне, перамяшчэнне на лыжах, плаванне; элементы спартыўных і рухомых гульняў, практыкаванні ў раўнавазе і ў вісе, акрабатычныя практыкаванні.

Раздзел **«Развіццё рухальных здольнасцей»** змяшчае рухомыя гульні і гульнявыя заданні, тэставыя практыкаванні для вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей навучэнцаў.

Вучэбная праграма прадугледжвае пераважнае выкарыстанне гульнявой формы правядзення заняткаў з навучэнцамі, што павышае эфектыўнасць рашэння наступных задач:

– замацаванне і ўдасканаленне рухальных уменняў, навыкаў і вывучаных спосабаў дзейнасці;

– развіццё каардынацыйнай (дакладнае ўзнаўленне прасторавых, часавых і сілавых характарыстык рухаў, іх тэмпу і рытму; захаванне раўнавагі; хуткае і своечасовае рэагаванне на зменлівыя сітуацыі, узгодненасць адначасовых і паслядоўных рухаў рознамі часткамі цела) і кандыцыйных (хуткасных, сілавых, хуткасна-сілавых, агульнай вынослівасці, гнуткасці) здольнасцей.

Спецыфіка вучэбнай праграмы «Фізічная культура і здароўе» прадугледжвае:

– строгі дыферэнцыраваны падбор вучэбнага матэрыялу з улікам яго засваення навучэнцамі, аднесенымі па стане здароўя да асноўнай і падрыхтоўчай медыцынскіх груп[1];

– штогадовае выкананне уніфікаваных тэставых практыкаванняў для вызначэння індывідуальнага ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей навучэнцаў. Навучэнцы I класа выконваюць тэставыя практыкаванні адзін раз у канцы навучальнага года, а навучэнцы II–IV класаў – два разы ў навучальным годзе: у верасні і маі. Умовы выканання тэставых практыкаванняў для індывідуальнага вызначэння ўзроўню развіцця рухальных якасцей навучэнцаў выкладзены ў дадатках 2, 3;

– шчыльную ўзаемасувязь зместу ўрокаў фізічнай культуры і здароўя з рухальнай актыўнасцю навучэнцаў у рэжыме вучэбнага і падоўжанага дня, рэгулярны ўдзел у фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах.

останавливаться для отдыха или «срезать» дистанцию. Учащимся, нарушившим указанные правила, а также не финишировавшим, определяется низкий уровень развития двигательных способностей. Результат в беге измеряется с точностью до 1 с.

6-минутный бег выполняется на беговой дорожке стадиона, которая предварительно размечается на каждые 10 или 20 м. Рекомендуется проводить забеги раздельно среди мальчиков и девочек. Группа мальчиков (девочек) стартует одновременно. Во время бега учитель считает количество кругов, которые преодолели учащиеся. По истечении 6 мин учитель подает звуковой сигнал (например, свисток), после которого учащиеся переходят на шаг, запомнив место, где их застал сигнал. Затем учитель каждому индивидуально высчитывает длину преодоленной дистанции с учетом количества полных кругов и той части беговой дорожки, где учащийся перешел на шаг.

При выполнении тестового упражнения не допускается переходить на шаг, останавливаться для отдыха или «срезать» дистанцию. Учащимся, нарушившим указанные правила, а также не финишировавшим, определяется низкий уровень развития двигательных способностей. Результат измеряется с точностью до 10 м.

Вис на согнутых руках выполняется на гимнастической перекладине из исходного положения «вис хватом сверху». Каждому учащемуся предоставляется одна попытка. По команде учителя (одновременно включается секундомер) учащийся принимает исходное положение «вис на согнутых руках». При этом подбородок должен быть на уровне или выше уровня перекладины. Секундомер выключается тогда, когда подбородок учащегося опустится ниже уровня перекладины. Результат измеряется с точностью до 1 с.

Поднимание туловища из положения «лежа на спине» за 30 с выполняется на гимнастическом мате из исходного положения «лежа на спине, руки скрестно перед грудью, ладони на локтевых суставах, стопы ног зафиксированы». Угол в коленном суставе составляет 90 градусов.

Каждому учащемуся предоставляется одна попытка. Во время выполнения упражнения не допускаются рывки руками. Засчитывается количество наклонов туловища при касании локтевых и коленных суставов с последующим опусканием на спину и касанием лопатками гимнастического мата.

Бег 30 м проводится на прямой беговой дорожке стадиона. Допускается использование высокого или низкого старта. Каждому учащемуся предоставляется одна попытка. Учащемуся, нарушившему правила соревнований в беге (фальстарт, забегание на соседнюю дорожку), может быть предоставлена одна дополнительная попытка. Результат бега измеряется с точностью до 0,1 с.

Челночный бег 4 х 9 м выполняется в спортивном зале на половине волейбольной площадки. Количество участников в одном забеге – не более двух человек. Каждому учащемуся предоставляются две попытки подряд. По команде «На старт!» учащиеся подходят к линии старта (как правило, это середина волейбольной площадки), по команде «Внимание!» принимают положение высокого старта по направлению к лицевой линии, где напротив каждого лежат два бруска 50 х 50 х 100 мм на расстоянии 100 мм друг от друга.



По команде «Марш!» учащиеся бегут к лицевой линии, берут каждый по одному бруску (не затронув второй), поворачиваются и бегут обратно. Подбежав к линии «старт – финиш», кладут на нее (или за нее) брусок (бросать нельзя!), разворачиваются и бегут за оставшимся бруском. Подбежав к линии, берут свой второй брусок, разворачиваются, бегут к линии «старт – финиш» и, не снижая скорости, пересекают ее с бруском в руках.

Время выполнения челночного бега каждым учащимся фиксируется с точностью до 0,1 с. Засчитывается лучший результат из двух попыток.

Прыжок в длину с места выполняется толчком двумя ногами на полу спортивного зала. Каждому учащемуся предоставляются три попытки подряд. Не допускается выполнять прыжки в яму с песком. Результат измеряется с точностью до 1 см. Засчитывается лучший результат из трех попыток.

Наклон вперед из исходного положения «сидя на полу». Учащийся садится на пол, со стороны знака «–» (минус), пятки на ширине таза на линии ОВ упираются в упоры для ног, стопы вертикально. Два партнера с двух сторон прижимают его колени к полу, не позволяя сгибать ноги в коленных суставах.

Учащийся кладет одну ладонь на тыльную сторону другой ладони, опускает руки на пол, выполняет два предварительных наклона, скользя ладонями рук вдоль измерительной линейки по линии СД. На третьем наклоне учащийся максимально наклоняется вперед и в этом положении задерживается на 3 с. Результат фиксируется по отметке, достигнутой кончиками сомкнутых (!) средних пальцев рук, и определяется с точностью до 1 см.



УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская мова»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Ва ўмовах інфармацыйнага грамадства асаблівай увагі ў працэсе навучання беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі патрабуе развіццё моўнай асобы, яе здольнасцей і творчага патэнцыялу, неабходных для актыўнай дзейнасці, сацыяльнага самавызначэння і самарэалізацыі.

Мэта навучання – авалоданне навучэнцамі камунікатыўнымі ўменнямі і навыкамі, неабходнымі для эфектыўнага выкарыстання мовы ў розных сітуацыях зносін, развіццё іх творчага патэнцыялу, далучэнне праз мову да культурных традыцый беларускага народа.

Задачы навучання беларускай мове ў I–IV класах:

1) у межах *моўнай* кампетэнцыі:

асэнсаванне тэксту, сказа, слова і гука з пункту погляду іх функцыянавання;

авалоданне графікай беларускай мовы;

засваенне фанетычных, лексічных і граматычных ведаў для прымянення іх у маўленчай дзейнасці;

узбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў, засваенне вымаўленчых нормаў, правілаў правапісу;

2) у межах маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі:

фарміраванне камунікатыўных уменняў і навыкаў навучэнцаў;

развіццё практычных уменняў і навыкаў выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці;

развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў;

3) у межах лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый:

фарміраванне пачуццёва-вобразнага ўспрымання беларускай мовы і ўмення адрозніваць яе ад рускай мовы;

асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай культурнай каштоўнасці;

фарміраванне асэнсаванага ўспрымання беларускай літаратурнай мовы як сродку замацавання культурных традыцый, маральных каштоўнасцей грамадства;

засваенне правілаў маўленчага этыкету, сацыяльных норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін;

фарміраванне ў навучэнцаў пачуцця прыгажосці, мілагучнасці, выразнасці, эстэтычнай вартасці беларускай мовы.

Напрамкі навучання

Працэс развіцця асобы вучня пры навучанні беларускай мове павінен быць узаемазвязаным і садзейнічаць рэалізацыі наступных напрамкаў: ***моўнага*** (засваенне сістэмы мовы, заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, норм беларускай літаратурнай мовы), ***маўленчага*** (авалоданне спосабамі перадачы думкі сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай формах, у розных відах маўленчай дзейнасці: чытанні, слуханні, гаварэнні, пісьме), ***камунікатыўнага*** (авалоданне культурай маўлення, правіламі маўленчых зносін, уменнямі ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных відаў), ***лінгвакультуралагічнага*** (асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай каштоўнасці, сродку замацавання культурных традыцый, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы), ***сацыякультурнага*** (засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін, культурных каштоўнасцей беларускага народа і агульначалавечых каштоўнасцей, авалоданне правіламі беларускага маўленчага этыкету).

У аснову пабудовы курса беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі кладуцца зыходныя палажэнні *кампетэнтнаснага, лінгва-культуралагічнага, камунікатыўна-дзейнаснага і асобасна арыентаванага падыходаў.*

Кампетэнтнасны падыход у навучанні мове прадугледжвае разам з атрыманнем ведаў аб мове развіццё ўменняў аналізаваць і сістэматызаваць моўную інфармацыю, прымяняць яе ў маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з асобаснымі запатрабаваннямі для рашэння вучэбных, пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач. Рэалізацыя гэтага падыходу мае на ўвазе фарміраванне ў навучэнцаў шэрагу кампетэнцый. Кампетэнцыі ў моўнай адукацыі адлюстроўваюць здольнасць рэалізацыі моўных ведаў і ўменняў праз маўленчую дзейнасць у розных сітуацыях зносін, у тым ліку ў працэсе навучання. Асаблівасцю кампетэнтнаснага падыходу з'яўляецца метапрадметнасць – устаноўка на фарміраванне ў навучэнцаў універсальных (агульнавучэбных) уменняў, галоўнымі з якіх з'яўлялюцца ўменні мэтамеркавання, планавання, кантролю, ацэнкі (рэгулятыўныя).

Змест кампетэнцый, якія фарміруюцца пры вывучэнні беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

– *моўная кампетэнцыя* ўключае веды аб сістэме мовы, яе адзінках (тэкст, сказ, слова, гукі мовы) і правілах іх функцыянавання ў маўленні; уменні вылучаць адзінкі мовы, праводзіць розныя віды разбору (гука-літарны, разбор слова па саставе, па часцінах мовы, разбор па членах сказа); валоданне нормамі беларускай літаратурнай мовы;

– *маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя* ўключае валоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці; фарміраванне маўленчых паводзін, адэкватных мэтам і сітуацыям зносін; уменні выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў адпаведнасці з іх значэннем, выбіраць патрэбную моўную форму і спосабы выказвання думкі ў залежнасці ад умоў камунікацыі;

– *лінгвакультуралагічная кампетэнцыя* ўключае асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай каштоўнасці, сродку замацавання культурных традыцый, засваенне

нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы, авалоданне правіламі беларускага маўленчага этыкету;

– *сацыякультурная кампетэнцыя* ўключае ўсведамленне ролі беларускай мовы ў жыцці чалавека, паважлівае стаўленне да культуры і мовы беларускага народа і іншых народаў, засваенне сістэмы агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін.

Працэс навучання беларускай мове скіраваны на дасягненне наступных метапрадметных вынікаў навучання:

– уменне ўспрымаць і асэнсоўваць вучэбны матэрыял, які прад'яўляецца ў вербальнай форме, выдзяляць галоўнае ў ім, рацыянальна запамінаць, выконваць разумовыя аперацыі;

– уменне выкарыстоўваць маўленчыя сродкі і сродкі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для рашэння камунікатыўных і пазнаваўчых задач;

– уменне працаваць з вучэбнай кнігай, іншымі друкаванымі і аўдыёвізуальнымі крыніцамі інфармацыі,

– уменне працаваць з інфармацыяй (пошук, прымяненне, захаванне), рыхтаваць сваё выступленне і выступаць з аўдыё-, відэа- і графічным суправаджэннем;

– уменне слухаць суразмоўцу і весці дыялог, прызнаваць наяўнасць розных пунктаў погляду, выказваць сваё меркаванне і аргументаваць яго.

Сістэмна-функцыянальны падыход забяспечвае засваенне вучнямі моўных сродкаў, адбор і арганізацыю моўнага матэрыялу для авалодання *моўнай кампетэнцыяй.*

Лінгвакультуралагічны падыход да навучання прадугледжвае рэалізацыю задач фарміравання культурнага чалавека сродкамі беларускай мовы, паколькі яна з'яўляецца нацыянальнай каштоўнасцю, праяўленнем культуры народа. У логіцы лінгвакультуралагічнага падыходу мова разумеецца не толькі як сродак назапашвання ведаў і фарміравання ўменняў і навыкаў, але і як сродак станаўлення асобы навучэнца, усведамлення ім прыналежнасці да свайго народа, сваёй краіны. Праз мову адбываецца далучэнне асобы да светапогляду народа, яго гісторыі, культуры, сістэмы маральных і духоўных каштоўнасцей.

Лінгвакультуралагічны падыход рэалізуецца пры вывучэнні фактаў мовы розных узроўняў (фанетычных, лексічных, граматычных, узроўню тэксту) і знаходзіць у іх пацвярджанне асаблівасцей узаемасувязі мовы і культуры. Важнейшым спосабам выражэння культуралагічнай інфармацыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца культурнае (намінатыўнае, эмацыянальнае, экспрэсіўнае, ацэначнае, вобразнае, матывацыйнае) значэнне вывучаемых адзінак мовы (слоў, прыказак, прымавак, формул маўленчага этыкету, тэкстаў культуразнаўчага характару). *Лінгвакультуралагічны падыход* садзейнічае фарміраванню ў вучняў *лінгвакультуралагічнай и сацыякультурнай кампетэнцый*.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход да навучання беларускай мове прадугледжвае такую арганізацыю працэсу навучання, якая максімальна набліжаецца да рэальнага працэсу маўленчых зносін. Аб'ектам навучання становіцца маўленчая дзейнасць ва ўсіх яе відах. У аснове навучання знаходзяцца рэальныя маўленчыя дзеянні навучэнцаў, якія накіраваны не толькі на ўспрыманне і разуменне вусных і пісьмовых выказванняў на беларускай мове, але і на стварэнне беларускамоўных тэкстаў. Гэта садзейнічае развіццю маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Паколькі навучанне мове разглядаецца як культурны працэс, сутнасць якога заключаецца ў гуманістычным і творчым узаемадзеянні ўсіх яго удзельнікаў, яно грунтуецца на асноўных палажэннях *асобасна арыентаванага падыходу*. Гэты падыход характарызуецца тым, што у цэнтры навучальнай дзейнасці знаходзіцца асоба навучэнца (яго развіццё, задавальненне адукацыйных запатрабаванняў, інтарэсаў, творчых магчымасцяў).

Прынцыпы адбору зместу навучання:

сістэмна-функцыянальны прынцып прадугледжвае цэласнае адлюстраванне ў змесце навучання шматузроўневасці моўнай сістэмы і характарыстыку функцыянальных магчымасцей моўных адзінак кожнага ўзроўню (роля, якую яны выконваюць у маўленні);

прынцып мінімізацыі моўнага матэрыялу патрабуе адбіраць матэрыял з улікам яго значнасці для дасягнення пастаўленых мэт і задач навучання на ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

камунікатыўны прынцып азначае, што працэс навучання патрэбна забяспечыць адпаведным зместам для авалодання вучнямі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці (аўдзіраванне, гаварэнне, чытанне, пісьмо);

прынцып тэкстацэнтрызму мае на ўвазе адбор зместу навучання, які павінен забяспечыць арганізацыю адукацыйнага працэсу на аснове тэксту.

Змест вучэбнага прадмета «Беларуская мова» складаюць:

1. Моўныя веды, уменні і навыкі (веды аб сістэме моўных адзінак і заканамернасцях іх функцыянавання, фанетыка-артыкуляцыйныя навыкі, лексічныя, лексіка-граматычныя, арфаграфічныя і пунктуацыйныя ўменні і навыкі).

2. Маўленчыя ўменні і навыкі (уменні і навыкі ў розных відах маўленчай дзейнасці: аўдзіраванні, чытанні, гаварэнні, пісьмовым маўленні).

3. Камунікатыўныя ўменні і навыкі (уменні і навыкі выкарыстання розных відаў маўленчай дзейнасці ў пэўных маўленчых сітуацыях).

4. Агульныя звесткі пра беларускую мову, формы яе існавання і сферы ужывання, культурную і эстэтычную самакаштоўнасць беларускай мовы.

5. Традыцыйны маўленчы этыкет, моўная норма, міжмоўная аманімія.

Сістэма развіцця маўлення скіравана на авалоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці, фарміраванне ў навучэнцаў здольнасці разумець праслуханае ці прачытанае маўленчае паведамленне на беларускай мове, ствараць вуснае выказванне на беларускай мове для задавальнення камунікатыўнага намеру, паступовае авалоданне пісьмовым маўленнем. Для дасягнення пастаўленай мэты змест сістэмы развіцця маўлення прадстаўлены ў трох кірунках:

фарміраванне правільнага ўспрымання і разумення беларускай мовы пры слуханні і чытанні;

фарміраванне ўменняў гаварэння;

фарміраванне ўменняў пісьмовага маўлення.

Змест навучання па кожным кірунку размяркоўваецца з паступовым ускладненнем у кожным наступным класе і вызначае асноўныя віды вучэбнай работы, якімі павінны авалодаць навучэнцы на працягу ўсяго вучэбнага года. Гэтыя віды работы пададзены ў вучэбнай праграме ў канцы кожнага раздзела. Развіццё маўлення адбываецца праз павелічэнне самастойнасці навучэнцаў пры выкананні заданняў і практыкаванняў.

Вывучэнне беларускай мовы працягваецца пасля перыяду навучання грамаце і складаецца з наступных раздзелаў: «Родная мова», «Гукі і літары», «Слова», «Сказ», «Тэкст».

Раздзел «Родная мова» мае выразную лінгвакультуралагічную накіраванасць і спрыяе фарміраванню ў навучэнцаў устойлівай ўвагі да беларускага слова, асэнсаванню мовы як культурнага феномену. У практычнай дзейнасці навучэнцы раскрываюць асаблівасці вуснай і пісьмовай мовы, асноўныя яе функцыі, даведваюцца пра актуальныя правілы маўленчага этыкету.

Раздзел «Гукі і літары» вырашае задачы ўдасканалення фанетычных і графічных уменняў і навыкаў навучэнцаў. Пры вывучэнні раздзела даецца агульнае паняцце аб гукавым саставе слова, ролі галосных і зычных гукаў у слове, удасканальваюцца правапісныя ўменні, якія звязаны з напісаннем галосных у ненаціскным становішчы, абазначэннем цвёрдых і мяккіх, звонкіх і глухіх, падоўжаных зычных на пісьме. Фарміруецца ўменне правільна называць літары алфавіта і карыстацца ім, абазначаць гукі літарамі.

Раздзел «Слова» змяшчае звесткі пра слова як лексічную адзінку мовы, як назву таго, што можа быць прадметам думкі. У навучэнцаў фарміруюцца ўяўленні пра лексічнае значэнне, пра словы з блізкім і супрацьлеглым значэннем, пра падзел слоў на часціны мовы (на лагічнай аснове: па пытанні і значэнні).

Раздзел «Сказ» змяшчае звесткі пра сказ як камунікатыўную адзінку мовы. Уменні вызначаць граматычную аснову сказа, устанаўліваць сувязь паміж словамі ў сказе, ужываць сказы, розныя па мэце выказвання інтанацыі і будове, выкарыстоўваюцца навучэнцамі для самастойнай пабудовы звязных вусных выказванняў.

Вывучэнне раздзела «Тэкст» забяспечвае навучэнцаў неабходнымі ведамі і ўменнямі для актыўных маўленчых дзеянняў па стварэнні тэкстаў. Асаблівасцю вывучэння тэксту з'яўляецца тое, што ён разглядаецца як вынік маўленчай дзейнасці. Вывучэнне раздзела «Тэкст» мае практычную накіраванасць.

Асноўная задача навучання каліграфіі развіццё ў навучэнцаў уменняў і навыкаў плаўнага, правільнага, прыгожага і хуткага пісьма. Практыкаванні па каліграфіі праводзяцца на кожным уроку ў 2 класе. У навучэнцаў удасканальваюцца навыкі правільнага напісання літар, рацыянальнага злучэння іх у словах. З другога паўгоддзя другога класа ажыццяўляецца падрыхтоўка да пераводу навучэнцаў на пісьмо ў сшытках з разліноўкай у адну лінейку. Для гэтага практыкаванні па каліграфіі перыядычна праводзяцца на аркушах паперы з разліноўкай у адну лінейку. Змест працы па каліграфіі па магчымасці звязваецца з вывучаемым на ўроку фанетычным, лексічным, граматычным матэрыялам.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

II клас (85 гадзін)

РОДНАЯ МОВА (3 гадзіны)

Беларуская мова як дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь. Беларуская і руская мовы – роднасныя (блізкія паміж сабой).

Беларуская мова як сродак зносін паміж людзьмі (агульнае паняцце). Формы мовы: вусная і пісьмовая.

Беларуская мова – мова беларускага народа. Ужыванне слоў і зваротаў ветлівасці.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць

ветлівыя словы і звароты, якія выкарыстоўваюцца ў розных сітуацыях зносін (вітанне, развітанне, просьба, падзяка, прабачэнне).

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

адрозніваць вусную і пісьмовую формы мовы.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ужываць ветлівыя словы і звароты ў зносінах з гасцямі школы, з незнаёмымі людзьмі ў магазіне, транспарце, бібліятэцы, на пошце, і інш.).

ГУКІ І ЛІТАРЫ

(53 гадзіны, з іх 1 гадзіна – кантрольнае спісванне)

Агульнае паняцце пра гукі і літары (5 гадзін)

Гук як адзінка мовы. Вычляненне гукаў са слоў. Абазначэнне гукаў на пісьме літарамі. Алфавіт. Назвы літар алфавіта. Практычнае значэнне алфавіта. Знаёмства з арфаграфічным слоўнікам.

Галосныя гукі (17 гадзін)

Абазначэнне галосных гукаў на пісьме літарамі ***а, о, у, і, ы, э, е, ё, ю, я***. Абазначэнне літарамі ***е, ё, ю, я, і*** гукаў [йэ], [йо], [йу], [йа], [йі] у словах.

Роля галосных ва ўтварэнні складоў слова. Падзел слова на склады і для пераносу.

Націск у слове. Абазначэнне націску на пісьме. Роля націску ў адрозненні слоў. Націскныя і ненацісныя галосныя ў словах. Правапіс літар ***о, э – а; е, ё – я*** ў словах.

Зычныя гукі (31 гадзіна)

Літары ***у, ў*** (***у*** нескладовае). Правапіс ***ў*** у словах. Перанос слоў з ***ў***.

Парныя цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме літарамі ***е, ё, ю, я, і, ь***. Зацвярдзелыя гукі [ж], [ч], [ш], [р], [дж], [ц]. Напісанне літар ***а, о, у, ы, э*** пасля літар, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.

Вымаўленне слоў з цвёрдымі [д], [т] і мяккімі [дз’], [ц’] зычнымі. Напісанне літар ***е, ё, ю, я, і*** пасля ***дз***, ***ц,*** якія абазначаюць мяккія зычныя гукі.

Звонкія і глухія зычныя: парныя [б] – [п], [г] – [х], [д] – [т], [з] – [с], [б’] – [п’], [г’] – [х’], [дз’] – [ц’], [з’] – [с’], [ж] – [ш], [дж] – [ч]. Вымаўленне і правапіс слоў са звонкімі і глухімі зычнымі. Спосабы праверкі напісання парных звонкіх і глухіх зычных.

Падоўжаныя зычныя [з̄’], [с̄’], [дз̄’], [ц̄’], [л̄’], [н̄’], [ж̄], [ч̄], [ш̄]. Вымаўленне і правапіс слоў з падоўжанымі зычнымі. Абазначэнне на пісьме падоўжаных зычных падвоеным напісаннем адпаведнай літары. Абазначэнне на пісьме падоўжанага гука [дз’] спалучэннем літар ***ддз***. Падзел слоў з падоўжанымі зычнымі для пераносу.

Раздзяляльны ***ь*** і апостраф. Напісанне апострафа ў словах перад літарамі ***е, ё, ю, я, і***, калі літары галосных абазначаюць два гукі [йэ], [йо], [йу], [йа], [йі]. Напісанне раздзяляльнага ***ь*** *у* словах пасля ***дз, з, л, н, с, ц*** перад ***е, ё, ю, я, ю, і***, калі літары галосных абазначаюць два гукі [йэ], [йо], [йу], [йа], [йі].

Віды дзейнасці

Вусны і пісьмовы пераказ прачытанага тэксту па пытаннях і апорных словах, прапанаваных настаўнікам. Пабудова вуснага выказвання на вызначаную тэму па малюнках і апорных словах. Падзел праслуханага тэксту на сэнсавыя часткі і пераказ яго. Падбор апорных слоў і стварэнне вуснага выказвання па малюнку. Развіццё сказаў тэксту па пытаннях словамі, прапанаванымі настаўнікам. Вызначэнне на слых у праслуханым тэксце слоў з указанымі настаўнікам арфаграмамі. Вядзенне дыялогу па зададзеным узоры.

Навучальная пісьмовая работа (пераказ, 45–50 слоў – 1 гадзіна).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць:

беларускі алфавіт;

галосныя і зычныя гукі;

сэнсаадрознівальную ролю гукаў і націску ў словах;

складаўтваральную ролю галосных гукаў;

цвёрдыя і мяккія зычныя гукі;

парныя звонкія і глухія зычныя;

вывучаныя нормы беларускага правапісу:

правапіс **о, э – а** пад націскам і ў ненацісных складах;

правапіс **ё, е – я** пад націскам, у першым пераднацісным складзе і іншых ненацісных складах;

правапіс парных звонкіх-глухіх зычных на канцы слоў і перад зычнымі;

правапіс **т – ц, д – дз**;

правапіс зацвярдзелых зычных і галосных пасля іх;

правапіс падоўжаных зычных;

напісанне апострафа і раздзяляльнага мяккага знака;

напісанне **ў** пасля літар галосных гукаў.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

адрозніваць гукі і літары;

адрозніваць гукі галосныя і зычныя; парныя звонкія і глухія зычныя, цвёрдыя і мяккія зычныя;

выдзяляць гукі са слоў, характарызаваць іх у адпаведнасці з вывучанымі прыметамі;

абазначаць гукі літарамі ў адпаведнасці з вывучанымі нормамі беларускай графікі і правапісу;

падзяляць словы на склады і для пераносу;

вызначаць націскныя і ненацiскныя склады;

правяраць правапіс слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

практычна выкарыстоўваць алфавіт пры рабоце з бібліятэчным каталогам, пры складанні спіса;

захоўваць найбольш распаўсюджаныя арфаэпічныя нормы (вымаўленне гукаў **[о], [э], [а], [ў], [г], [г'], [ч], [дз`], [дж], [р], [ц`],** спалучэння гукаў **[шч]],** парных звонкіх і глухіх зычных);

захоўваць вывучаныя нормы арфаграфіі пры выкананні пісьмовых заданняў і ўласных запісаў (запіска, віншаванне, перапіска з сябрамі, сваякамі).

ТЭКСТ (5 гадзін)

Агульнае паняцце пра тэкст. Прыметы тэксту: тэматычнае адзінства сказаў, сэнсавая сувязь сказаў у тэксце, закончанасць. Тэма тэксту. Асноўная думка тэксту.

Загаловак тэксту. Падбор загалоўка да тэксту.

Падзел тэксту на часткі: пачатак, асноўная частка, заключная частка.

Віды дзейнасці

Стварэнне пісьмовага тэксту на вызначаную тэму па апорных словах, прапанаваных настаўнікам. Пашырэнне праслуханага тэксту адной з частак (пачаткам, асноўнай часткай, заключнай часткай). Падбор патрэбнага загалоўка да тэксту з шэрага прапанаваных, абгрунтаванне выбару.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць:

прыметы тэксту (тэма, асноўная думка, загаловак);

часткі тэксту: уступ, асноўная частка, заключная частка.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

адрозніваць тэкст ад набору сказаў, якія не звязаны паміж сабою;

вызначаць тэму і асноўную думку тэксту;

падбіраць загаловак да тэксту, абгрунтоўваць адпаведнасць загалоўка тэксту;

падзяляць тэкст на часткі: уступ, асноўная частка, заключная частка;

без памылак спісваць недэфармаваныя тэксты з рукапіснага ці друкаванага ўзору;

пісьмова пераказваць тэкст па пытаннях і апорных словах.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

удзельнічаць у дыялогах на даступныя навучэнцам тэмы;

рабіць ўласныя запісы (запіска, віншаванне, перапіска з сябрамі, сваякамі).

СКАЗ (5 гадзін)

Сказ як адзінка мовы (агульнае паняцце).

Асноўныя прыметы сказа. Сэнсавая і інтанацыйная закончанасць сказа. Вычляненне сказаў з тэксту. Вялікая літара ў пачатку сказа. Знакі прыпынку ў канцы сказаў: кропка, пытальнік, клічнік.

Вызначэнне граматычнай асновы ў сказе на лагічнай аснове (па пытаннях).

Сувязь слоў у сказе. Вызначэнне сувязі слоў у сказе па пытаннях.

Віды дзейнасці

Выказванне на прапанаваную настаўнікам тэму па апорных граматычных асновах. Стварэнне вуснага выказвання на прапанаваную тэму шляхам дапаўнення граматычных асноў дадатковымі членамі, прапанаванымі настаўнікам.

Навучальная пісьмовая работа **(пераказ, 45–50 слоў 1 гадзіна).**

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць:

прыметы сказа: сэнс, інтанацыя, закончанасць;

правілы афармлення пачатку і канца сказа.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

вызначаць межы сказа ў адпаведнасці з сэнсам і інтанацыяй, і афармляць іх пісьмова;

вызначаць сувязь слоў у сказе па пытаннях;

вызначаць граматычную аснову ў сказе на лагічнай аснове (па пытаннях).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

удзельнічаць у дыялогах на даступныя навучэнцам тэмы: правільна задаваць пытанні і даваць адказы на пытанні іншых, адэкватна перадаваць эмоцыі, захоўваць неабходную інтанацыю ў межах сказа.

СЛОВА

(16 гадзін, з іх 1 гадзіна – кантрольны дыктант)

Слова як моўная адзінка (агульнае паняцце). Значэнне слова. Словы з блізкім значэннем. Словы з супрацьлеглым значэннем. Падбор слоў з блізкім і супрацьлеглым значэннем. Знаёмства з тлумачальным слоўнікам.

Словы, якія абазначаюць прадметы і адказваюць на пытанні хто? або што? Роля ў мове слоў, якія абазначаюць прадметы. Напісанне з вялікай літары слоў, якія абазначаюць імёны, імёны па бацьку і прозвішчы людзей, клічкі жывёл, назвы краін, гарадоў, вёсак, рэк, азёр, вуліц, праспектаў, плошчаў.

Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў і адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія? Роля ў мове слоў, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў і адказваюць на пытанні што рабіць? што зрабіць? што раблю? і інш. Роля ў мове слоў, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

Агульнае паняцце пра прыназоўнікі. Прыназоўнікі ***у, на, з, па, да, ад, над, пад, каля*** і іх роля ў забеспячэнні сувязі слоў у сказе. Асобнае напісанне прыназоўнікаў з іншымі словамі.

Віды дзейнасці

Развіццё сказаў тэксту патрэбнымі па сэнсе словамі дапамогай слоўніка. Пісьмовы пераказ прачытанага тэксту па пытаннях, складзеных калектыўна. Вусны пераказ праслуханага тэксту па пытаннях, прапанаваных настаўнікам. Вядзенне дыялогу з ужываннем этыкетных слоў і выразаў, прапанаваных настаўнікам.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць:

пытанні, на якія адказваюць словы, што абазначаюць назвы прадметаў, прыметы прадметаў, дзеянні прадметаў;

правапіс вялікай літары ў імёнах і прозвішчах людзей, клічках жывёл, назвах краін, гарадоў, вёсак, рэк, азёр, вуліц, праспектаў, плошчаў.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

карыстацца арфаграфічным і тлумачальным слоўнікамі;

адрозніваць словы-назвы прадметаў, дзеянняў, прымет прадметаў па значэнні і пытанні;

адрозніваць словы-назвы прадметаў, якія адказваюць на пытанні *хто?, што?;*

ужываць прыназоўнікі для сувязі слоў у сказе і асобна пісаць іх (на практычным узроўні).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

практычна выкарыстоўваць алфавіт пры рабоце са слоўнікам.

ПАЎТАРЭННЕ (2 гадзіны)

Слоўнікавыя словы

Акварыум, бібліятэка, выйграць, герой, дзверы, дождж, калектыў, медаль, месяц, метро, мяккі, памяць, песня, подзвіг, Радзіма, рукзак, Рэспубліка Беларусь, свята, спектакль, стадыён, сябар, тэатр, цвёрды, чацвер, экскурсія, мядзведзь.

Кантрольныя пісьмовыя работы:

кантрольнае спісванне – 1 (I паўгоддзе, 25–30 слоў);

кантрольная работа па тэме – 3 (1 – I паўгоддзе, 2 – II паўгоддзе);

кантрольны дыктант – 1 (II паўгоддзе, 35-40 слоў);

кантрольны слоўнікавы дыктант – 2 (1 – I паўгоддзе, 6 слоў, 1 – II паўгоддзе, 7 слоў).

Рэзервовыя гадзіны – 1.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Літаратурнае чытанне» ўваходзіць у адукацыйную галіну «Беларуская літаратура», з'яўляецца падрыхтоўчым этапам адзінай непарыўнай літаратурнай адукацыі. **Мэта** навучання літаратурнаму чытанню на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі – закласці у вучняў асновы культурнага чытача, які ўсведамляе каштоўнасць літаратуры як мастацтва слова, можа ажыццяўляць самастойную чытацкую дзейнасць па асобасным успрыманні і асэнсаванні адпаведных узросту твораў мастацкай літаратуры.

Для рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні літаратурнаму чытанню на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вызначаны і вырашаюцца **задачы** па фарміраванні і развіцці ключавых кампетэнцый вучняў.

1. Сацыякультурнай кампетэнцыі:

забяспечыць усведамленне гуманістычных агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей на матэрыяле прачытаных ці праслуханых твораў;

прывучаць навучэнцаў да паслядоўнага выканання культурных норм;

актывізаваць пазнавальныя памкненні навучэнцаў у спасціжэнні беларускай нацыянальнай культуры, захаванні нацыянальна-культурных традыцый.

2. Асобаснай кампетэнцыі:

гарманічна фарміраваць навык чытання, комплекс чытацкіх уменняў, якія забяспечаць асэнсаванае ўспрыманне, поўнае, глыбокае разуменне і асобасную ацэнку маральнай праблематыкі і эстэтычнага плану твора;

стымуляваць імкненне да чытання кніг на беларускай мове;

выхоўваць павагу да кнігі як крыніцы самапазнання і развіцця.

3. Маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі:

развіваць вобразнае ўяўленне, маўленчую актыўнасць, здольнасць да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры;

фарміраваць агульнавучэбныя ўменні працы з тэкставай інфармацыяй розных відаў.

Зыходзячы з вызначаных задач, змест вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» павінен быць скіраваны на фарміраванне прыкладных аспектаў чытацкай кампетэнцыі вучняў на беларускай мове:

навыкаў чытання на беларускай мове (здольнасць правільна «агучваць» графічна зафіксаваны тэкст з разуменнем яго зместу);

уменняў асобасна асэнсаванага чытання мастацкіх і навукова-папулярных твораў, адпаведных узросту і ўзроўню валодання вучнямі маўленнем на беларускай мове;

прадуктыўнай чытацкай дзейнасці з тэкстам, кнігай на аснове комплекса бібліятэчна-бібліяграфічных уменняў.

Метадалагічнай асновай навучання літаратурнаму чытанню з'яўляюцца *культуралагічны, асобасна-арыентаваны, камунікатыўна-дзейнасны і кампетэнтнасны* падыходы.

Культуралагічны падыход вызначаецца нацыянальна-культурным кантэкстам зместу вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне», яго асноўнай асветніцкай фукцыяй знаёмства вучняў з самабытнай беларускай народнай і аўтарскай літаратурнай традыцыяй, з'явамі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры, сучаснай беларускай дзіцячай літаратурай як элементам культуры. У працэсе навучання адбываецца эмацыянальнае і разумовае спасціжэнне вучнямі нацыянальных культурных адметнасцей беларускай літаратуры. У кантэксце культуралагічнага падыходу стымулюецца пазнавальная актыўнасць вучняў у спасціжэнні гістарычных, навукова-папулярных, вобразна-мастацкіх звестак пра Беларусь, яе прыроду, гісторыю, традыцыі, побыт, міфалогію і г.д.

У сувязі з тым, што навучанне літаратурнаму чытанню мае выразныя сацыяльныя і псіхалагічныя перадумовы, а працэс авалодання дзейнасцю чытання індывідуалізаваны, то вядучым метадалагічным падыходам навучання чытанню на беларускай мове з'яўляецца *асобасна-арыентаваны* падыход. Асобаснаарыентаваны падыход дае магчымасць авалодання чытацкай дзейнасцю па індывідуальнай адукацыйнай траекторыі, што гарантуе максімальнае развіццё вучня ў межах яго магчымасцей.

Камунікатыўна-дзейнасным падыходам абумоўлена рэалізацыя патэнцыялу вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» ў навучанні маўленню на беларускай мове. Чытацкая дзейнасць, фарміраванне якой адбываецца на ўроках літаратурнага чытання, з'яўляецца кампанентам (элементам) камунікатыўнай кампетэнцыі і забяспечвае апасродкаваную камунікацыю праз пісьмовы тэкст. Камунікатыўна-дзейнасны падыход праяўляецца ў працэсе навучання, калі прачытаны ці праслуханы твор становіцца дзейсным сродкам развіцця маўленчых уменняў для задавальнення камунікатыўнага намеру, авалодання вучнямі нормамі маўленчых зносін, ажыццяўлення камунікацыі на беларускай мове. Змест вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» скіраваны на засваенне правілаў этычных паводзін пры маўленчых зносінах у розных сітуацыях Вучні знаёмяцца з этыкетнымі маўленчымі выразамі, на практычнай аснове вучацца прымяняць іх адпаведна камунікатыўнай сітуацыі.

Адукацыйны патэнцыял вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» праз прымяненне *кампетэнтнаснага* падыходу здольны забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў элементаў ключавых кампетэнцый, неабходных для выкарыстання вынікаў навучання ў сацыяльным жыцці асобы, яго развіцця і сацыяльнай адаптацыі. Чытацкая дзейнасць вучняў, авалоданне якой неабходна для набыцця камунікатыўнай кампетэнцыі,

разглядаецца ў кантэксце кампетэнтнаснага падыходу ў трох аспектах: як агульнавучэбнае ўменне, як від маўленчай дзейнасці і чытанне як літаратурна-эстэтычная дзейнасць.

У адпаведнасці з названымі метадалагічнымі падыходамі вызначаны **прынцыпы** адбору прадметнага зместу навучання: мастацка-эстэтычны і літаратуразнаўчы прынцыпы; прынцып уліку ўздзеяння на працэс навучання білінгвальнага асяроддзя; развіцця маўленчай дзейнасці; уліку ўзроставых і псіхалагічных асаблівасцей успрымання мастацкай літаратуры.

У адпаведнасці з *мастацка-эстэтычным і літаратуразнаўчым* прынцыпамі у якасці вучэбнага матэрыялу прапануюцца высокамастацкія літаратурныя творы, адпаведныя ўзроставым псіхалагічным магчымасцям вучняў. Мастацка-эстэтычны прынцып з'яўляецца ўмовай падбору такога складу кола чытання вучняў, каб яны мелі магчымасць пазнаёміцца з найлепшымі творамі беларускай дзіцячай літаратуры, якія з'яўляюцца нацыянальна-культурнай спадчынай беларускага народа. Згодна з літаратуразнаўчым прынцыпам, прапедэўтычны змест літаратурнай адукацыі адабраны такім чынам, каб забяспечыць бесканфліктны пераход да вывучэння беларускай літаратуры на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Навучанне літаратурнаму чытанню ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму падпарадкоўваецца прынцыпу *ўздзеяння на працэс навучання білінгвальнага асяроддзя*. Гэты прынцып вызначае адбор зместу навучання, з дапамогай якога будзе пераадольвацца інтэрферанцыйнае ўздзеянне рускай мовы пры фарміраванні навыку чытання, захаванні акцэнталагічнай нормы, разуменні лексічнага значэння слоў.

Прынцып *развіцця маўленчай дзейнасці* арыентуе на ўзаемазвязанае фарміраванне і развіццё ў вучняў маўленчых уменняў і навыкаў у працэсе чытання, слухання, гаварэння. На матэрыяле чытання пашыраецца і ўзбагачаецца слоўнікавы запас вучняў, фарміруюцца ўменні звязнага выкладу думак, засвойваецца літаратурная і маўленчая норма, развіваецца культура маўлення, культура суразмоўніцтва паміж настаўнікам і вучнямі.

Прынцып уліку *ўзроставых і псіхалагічных асаблівасцей успрымання мастацкай літаратуры* вызначае адбор у кола чытання вучняў разнастайных па тэматыцы і жанрах твораў з дынамічным сюжэтам, эмацыянальных, яркіх па форме і змесце. Гэтым прынцыпам вызначаецца ўзровень патрабаванняў да аб'ёму ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па літаратурным чытанні; чытацкія уменні, а таксама літаратуразнаўчыя уяўленні, падыходы да аналізу мастацкага твора, структуры ўрока чытання.

Для рэалізацыі пастаўленых задач у адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам, які скіроўвае на прымяненне вынікаў навучання ў жыццядзейнасці, змест вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» размеркаваны па раздзелах: «Фарміраванне базавых норм грамадзянскай, духоўнай і маральнай культуры вучняў праз асэнсаванне твораў», «Фарміраванне навыку чытання і агульнавучэбных уменняў», «Фарміраванне чытацкіх уменняў», «Фарміраванне самастойнай чытацкай дзейнасці з кнігай (пазакласнае чытанне)», «Фарміраванне ўяўленняў пра літаратуру як мастацтва слова», «Літаратурна-творчая дзейнасць і культура маўлення».

Раздзел *«Фарміраванне базавых норм грамадзянскай, духоўнай и маральнай культуры вучняў праз асэнсаванне твораў»* вылучаны для мэтанакіраванага фарміравання ў вучняў сістэмы каштоўнасных арыенціраў, выхавання маральна-этычных якасцей. Фарміраванне гуманістычнага светапогляду, выхаванне сістэмы нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей адбываецца ў працэсе аналізу і маральнай ацэнкі ўчынкаў і падзей, паказаных у творы. На матэрыяле ўспрынятых твораў вучні атрымліваюць звесткі пра нацыянальныя адметнасці беларускай культуры і побыту, далучаюцца да нацыянальных культурных традыцый. Пры чытанні і асэнсаванні мастацкіх твораў ажыццяўляецца апасродкаваная сацыялізацыя вучняў. На прыкладзе паводзін герояў твораў яны атрымліваюць дзейсны вопыт рэфлексіі ўласных паводзін і самавыхавання.

Пры фарміраванні навыку чытання, пра што гаворыцца ў раздзеле *«Фарміраванне навыку чытання і агульнавучэбных уменняў»* асноўная ўвага скіроўваецца на асэнсаванне вучнямі асаблівасцей чытання па-беларуску. З гэтай мэтай праводзіцца работа па

авалоданню арфаэпічнымі (правільнае вымаўленне беларускіх гукаў [ў], [дз`], [дж], [г], [ж], [ч], [р], [ц`], спалучэння [шч], падоўжаных зычных), выразнае вымаўленне галосных, перадача націску) і графічнымі асаблівасцямі беларускай мовы (літары і, ў, апостраф), усведамленню гэтых адрозненняў і іх паслядоўнай перадачай пры чытанні. У працэсе ўдасканалення тэхнікі чытання выпрацоўваецца правільнасць і асэнсаванасць чытання, авалоданне спосабамі чытання ўголас і сам сабе. Вырашаюцца задачы па фарміраванні ўменняў выразнага чытання праз усведамленне эмацыянальнага настрою твора і выкарыстанне сродкаў выразнасці (тон, тэмп, паўзы, лагічны націск). У адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам вучні павінны навучыцца карыстацца рознымі відамі чытання ў залежнасці ад задачы, якая ставіцца перад чытаннем тэксту.

У працэсе чытання і аналізу твораў гарманічна фарміруюцца навыкі чытання і комплекс чытацкіх уменняў, пералік якіх даецца ў раздзеле *«Фарміраванне чытацкіх уменняў»*. На іх аснове вучні ўспрымаюць твор, асэнсоўваюць яго маральную праблематыку і эстэтычны план, выказваюць пра твор уласныя меркаванні. Асваенне вучнямі чытацкіх уменняў з'яўляецца неабходнай умовай фарміравання чытацкай кампетэнцыі.

У раздзеле *«Фарміраванне самастойнай чытацкай дзейнасці з кнігай (пазакласнае чытанне)»* акрэслены змест і спосабы дзейнасці, якімі павінны авалодаць вучні на занятках пазакласнага чытання. Самастойная праца вучня з кнігай з'яўляецца неад'емнай часткай фарміравання чытацкай дзейнасці, дае магчымасць удасканалення навыку чытання. Заняткі пазакласнага чытання маюць на мэце пашырэнне чытацкага кругагляда вучняў, фарміраванне ўменняў працаваць з кнігамі і свабодна арыентавацца ў свеце дзіцячых кніг беларускіх пісьменнікаў, дзіцячых перыядычных выданняў на беларускай мове, выхоўваць патрэбу ў самастойным чытанні. Веды пра кнігі і аўтараў набываюцца ў працэсе непасрэднай практычнай дзейнасці з дзіцячымі кнігамі – калектыўнай, індывідуальнай і групавой.

Навучальным матэрыялам для пазакласнага чытання з'яўляюцца кнігі. Для калектыўнай працы пад кіраўніцтвам настаўніка прапануюцца не хрэстаматыі, а ілюстраваныя кнігі ў тыповым афармленні (прозвішча аўтара, загаловак, ілюстрацыі).

У працэсе навучання літаратурнаму чытанню вучні на практычным узроўні атрымліваюць першапачатковыя звесткі пра літаратуру як мастацтва слова. У змесце раздзела *«Фарміраванне ўяўленняў пра літаратуру як мастацтва слова»* вызначаны асноўныя літаратуразнаўчыя звесткі, з якімі вучні знаёмяцца на практычнай аснове ў працэсе працы з мастацкім творам. Веды аб літаратуры як мастацтве слова фарміруюцца на ўзроўні першапачатковых ведаў праз асваенне вобразнай функцыі мастацкага слова, усведамленне аўтарскай прыналежнасці твора, практычнае знаёмства з жанрамі.

Раздзел *«Літаратурна-творчая дзейнасць і культура маўлення»* вызначае змест камунікатыўна-арыентаванай творчай працы на падставе прачытанага ці праслуханага твора. Ажыццяўленне літаратурна-творчай дзейнасці на занятках літаратурнага чытання дае магчымасць актыўнага пашырэння і актывізацыі слоўніка вучняў, забяспечвае маўленчую практыку, спрыяе засваенню моўнай і маўленчай нормы, культуры маўленчых паводзін. На ўроках літаратурнага чытання фарміруюцца ўменні і навыкі гаварэння на беларускай мове. Творы мастацкай літаратуры з'яўляюцца прыкладамі правільнага маўлення і стымулююць выказванні вучняў на пэўную тэму, абуджаюць іх эстэтычныя пачуцці і творчы пачатак. У творах вучні назіраюць таксама трапнасць, выразнасць, дасціпнасць беларускай мовы, вучацца арыентавацца ў суразмоўніцтве, планаваць маўленчую дзейнасць, выбіраць моўныя сродкі, адпаведныя мэтам камунікацыі, ажыццяўляць камунікацыю ў адпаведнасці з этычнымі патрабаванням. Пры гэтым адбываецца пашырэнне і ўзбагачэнне слоўніка вучняў і яго актывізацыя, абуджаецца дзіцячая творчасць.

У II класе асноўная ўвага скіроўваецца на фарміраванне навыку чытання і чытацкіх уменняў вучняў. З гэтай мэтай праводзіцца работа па авалоданні арфаэпічнымі (правільнае вымаўленне беларускіх гукаў [ў], [г], [ж], [ч], [р], [ц'], спалучэнняў [шч], [дз'], [дж], падоўжаных зычных, выразнае вымаўленне галосных, перадача націску) і

графічнымі асаблівасцямі беларускай мовы (літары ***і, ў***, апостраф), усведамленні гэтых адрозненняў і іх паслядоўнай перадачы пры чытанні. У працэсе ўдасканалення тэхнікі чытання выпрацоўваецца яго правільнасць і асэнсаванасць, авалоданне спосабамі чытання ўголас і сам сабе. Вырашаюцца задачы па фарміраванні ўменняў выразнага чытання праз усведамленне эмацыянальнага настрою твора і выкарыстанне сродкаў выразнасці (гучнасць, інтанацыя сказа, паўзы).

Для гарманічнага фарміравання навыкаў чытання і чытацкіх уменняў праводзіцца сістэматычная праца па ўдасканаленні вымаўленчых навыкаў вучняў; уменняў вызначаць незразумелыя словы і выразы, якія могуць перашкаджаць асэнсаванню таго, што чытаецца; уменняў ажыццяўляць прагнозную дзейнасць да чытання ці слухання і ў працэсе ўспрымання; планамернае прывучэнне да сама- і ўзаемакантролю правільнасці чытання.

Заняткі пазакласнага чытання праводзяцца пасля вывучэння тэматычных раздзелаў кола чытання і займаюць увесь час урока. У перыяды паміж гэтымі ўрокамі арганізуецца чытанне вучнямі кніг з уласнай, класнай ці бібліятэкі ўстановы адукацыі, праводзяцца мерапрыемствы па прывучэнні вучняў да сістэматычнага самастойнага чытання кніг.

На занятках літаратурнага чытання неабходна рэалізоўваць міжпрадметныя сувязі з іншымі вучэбнымі прадметамі: з заняткамі беларускай мовы (складанне невялікіх апавяданняў пра герояў мастацкіх твораў, складанне працягу твора, знаходжанне слоў на вывучаныя арфаграфічныя правілы і інш.); з заняткамі выяўленчага мастацтва (разглядванне і слоўнае апісанне рэпрадукцый карцін па тэмах, сугучных тэмам вывучаемых твораў, ілюстраванне асобных эпізодаў мастацкага твора, удзел у выставах малюнкаў і іншых творчых работ паводле вывучаных твораў і інш.); з заняткамі музыкі (слуханне музычных твораў у адпаведнасці з мэтавымі ўстаноўкамі ўрока, назіранне за стварэннем вобразаў у літаратуры і музыцы, знаёмства з творамі музычнага мастацтва, у аснову якіх пакладзены паэтычныя творы, у тым ліку фальклорныя і інш.); з заняткамі працоўнага навучання (рамонт кніг, выраб кніг-самаробак, практычнае знаёмства з элементамі кнігі, выкарыстанне элементаў калектыўнай творчасці (аплікацыя, лепка паводле вывучаных мастацкіх твораў і інш).

II КЛАС

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

(**68 гадзін**, з іх 57 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і абагульненне ведаў па раздзелах чытання, 9 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання)

Кола чытання і слухання

Жанравая разнастайнасць кола чытання і слухання: вершы, апавяданні, казкі, жарты, загадкі, скорагаворкі, гумарыстычныя творы, пазнавальныя артыкулы з выхаваўчым патэнцыялам.

Аўтарская разнастайнасць кола чытання і слухання: дзіцячыя творы класікаў беларускай літаратуры, творы класікаў беларускай дзіцячай літаратуры; высокамастацкія дзіцячыя творы сучасных аўтараў.

Творы вуснай народнай творчасці: малыя жанры (загадкі, жарты, скорагаворкі, прыказкі, прымаўкі, лічылкі, прыкметы), народныя казкі.

Асноўныя раздзелы чытання. Рэкамендаваны пералік твораў

Рэкамендаваны пералік твораў складаецца са спісу твораў для чытання і вывучэння ў класе і спісу твораў для пазакласнага чытання. Спіс твораў для пазакласнага чытання з’яўляецца пашыраным і прыкладным. Ён мае рэкамендацыйны характар. Настаўнік можа выбраць для пазакласнага чытання тыя творы, якія прадстаўлены ў кніжных фондах бібліятэкі ўстановы адукацыі і раённай бібліятэкі.

Вераснёвы школьны ранак

(5 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра адносіны да вучобы, ролю кніг, важнасць старанной вучнёўскай працы.

Для чытання і вывучэння ў класе

А.Вольскі. «Коцева грамата».
В.Жуковіч. «Мае сябры».
Т.Мушынская. «Чаму плакалі кніжкі?».
М.Пазнякоў. «Першага верасня».
М.Чарняўскі. «Як Мікітка сукенку з'еў».

Для пазакласнага чытання

А.Дзеружынскі. «Хто вас у школу сабіраў?».
К.Камейша. «Задача».
І.Муравейка. «Пра мышку і кніжку».
В.Жуковіч. «Жураўліны вырай».
С.Панізнік. «Верасень».
М.Пазнякоў. «Сяргей».
А.Пісьмянкоў. «Саўка ды Грышка».
П.Прануза. «Піша літару Марына», «Бывай, лета!».
М.Чарняўскі. «Пайшлі ад нас канікулы».

Восеньскія гісторыі

(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра прыгажосць восеньскай прыроды, змены, якія адбываюцца ў прыродзе восенню.

Для чытання і вывучэння ў класе

В.Жуковіч. «Маладая восень».
Клаўдзія Каліна. «Верасень».
Г.Каржанеўская. «Песенька».
Якуб Колас. «Адлёт жураўлёў».
Т.Мушынская. «Як Дзяніска восені дапамагаў».
У.Ягоўдзік. «Лісічкі».

Для пазакласнага чытання

Г.Аўласенка. «Клён».
Р.Бензярук. «Хто каго перакрычыць?».
Вера Вярба. «Восень».
Н.Галіноўская. «На прагулцы».
М.Даніленка. «Восень шыла сарафан», «Па лясах і палях».
Я.Жабко. «Залатая казка», «Восень вераснёвая».
Максім Лужанін. «Восень».
М.Чарняўскі. «Павучковыя арэлі».
У.Ягоўдзік. «Восень на парозе».

Падарожжа ў свет казкі

(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Беларускія народныя казкі:
«Ганарыстая варона».
«Два маразы» (у апрацоўцы Якуба Коласа).
«Коцік, пеўнік і лісіца».
«Пшанічны каласок».
«Як курачка пеўніка ратавала».

Для пазакласнага чытання

«Каза-манюка».

«Дзедава рукавічка».
«Казка пра быка і яго сяброў».
«Камары і мядзведзь».
«Лісіца і гусак».
«Не сілай, а розумам».
«Хітры вол».
«Піліпка-сынок».

У свеце ветлівасці і дабрыні
(8 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра стаўленне людзей адзін да аднаго, добрыя і дрэнныя ўчынкі, неабходнасць ветлівасці і добразычлівасці ў жыцці.

Для чытання і вывучэння ў класе
Я.Бяганская. «Каму сказаць «дзякуй»?».
В.Вітка. «Чатыры пажаданні».
Н.Галіноўская. «Выратаваў».
Алесь Гарун. «Добрыя дзеці».
П.Кавалёў. «Падзяка».
І.Муравейка. «Чаму мяне не хваляць?».
Я.Пархута. «Кропелька».
Максім Танк. «Жук і слімак».
Цётка. «Гутарка асоту з крапівою».

Для пазакласнага чытання
Л.Арабей. «Зернятка і вецер».
Г.Аўласенка. «Сказ пра тое, як Алесік заблукаў аднойчы ў лесе».
Р.Бензярук. «Дружбакі», «Заяц, Вожык і Ручай», «Чыя моркаўка?».
Р.Бохан. «Добрага ранку».
Я.Бяганская. «Сябры».
Н.Галіноўская. «Ветлівы свавольнік».
В.Гурыновіч. «Добрыя суседзі».
А.Жук. «Хто вінаваты?».
В.Жуковіч. «Дзе прывітанне?».
У.Карызна. «Радасць».
Л.Качанка. «Яблычак».
М.Лук. «Выпадак з марожаным».
І.Муравейка. «Ціма», «Куплёная груша».
Т.Мушынская. «Самы смачны яблык».
А.Пальчэўскі. «Першая сяброўка».
Я.Пархута. «Птушыны інтэрнат».
П.Прануза. «Добры дзень».
Максім Танк. «Галінка і верабей».
М.Чарняўскі. «Каго баіцца зубр?».
А.Якімовіч. «Вось дык суседзі!».

Зімовыя прыгоды
(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра зімовыя змены ў прыродзе, працу і адпачынак зімой.

Для чытання і вывучэння ў класе
А.Вольскі. «Снежны бой».
Я.Галубовіч. «Андрэйка-памочнік».
В.Жуковіч. «З гары».
В.Лукша. «За што люблю я Новы год?».

Т.Мушынская. «Ветлівая сінічка».
Ю.Свірка. «З першым снегам!».
П.Ткачоў. «Пад Новы год».
Для пазакласнага чытання
У.Мазго. «Новы год».
Т.Бушко. «Сняжынка».
Н.Галіноўская. «Лясныя жыхары», «Размова сняжынак».
Я.Галубовіч. «Галкі грэюцца».
К.Камейша. «Першы снег».
У.Мазго. «Птушыная сталоўка».
М.Маляўка. «Белы вярблюд».
А.Марціновіч. «Верабейка Чыка».
І.Муравейка. «Для чаго снягір каляровы?».
М.Пазнякоў. «На горку!», «Зімовыя птушкі».
П.Прыходзька. «Сінічка».
П.Ткачоў. «Мікіткаў падарунак».
В.Хомчанка. «Галка», «Снег».

Пяшчотны свет сям'і

(8 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Творы пра ўзаемаадносіны, клопат, павагу ў сям'і.
Работа в «мастерской по ремонту книг».

Подготовка и участие в литературных утренниках и конкурсах.

СПИСОК ПРОИЗВЕДЕНИЙ ДЛЯ ЗАУЧИВАНИЯ НАИЗУСТЬ

И.Токмакова. «Осень».
И.Суриков. «Белый снег пушистый…».
И.Суриков. «Детство».
С.Маршак. «Снег теперь уже не тот…».
А.Плещеев. «Весна».
С.Маршак. «Дождь».
В.Боков. «Какая наша Родина!»
А.Стариков. «Мама и Родина».

ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К РЕЗУЛЬТАТАМ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

Знать:

фамилии авторов, с творчеством которых неоднократно встречались на страницах учебника, и их произведения (название, имена героев, основное содержание);

названия календарных месяцев года на русском языке;

произведения, рекомендованные для заучивания наизусть;

правила обращения с книгами.

Иметь первоначальные представления о:

произведениях устного народного творчества (скороговорки, загадки, пословицы и поговорки, сказки);

произведениях авторской литературы (рассказ, стихотворение, сказка);

изобразительно-выразительных средствах языка художественного произведения (сравнение, одушевление неживой природы, эмоционально-оценочные слова);

средствах выразительного чтения (сила голоса, пауза, интонация предложения).

Уметь:

слушать сказки, рассказы, стихотворения;

читать целыми словами вслух в темпе, который не препятствует пониманию прочитанного;

читать целыми словами правильно с соблюдением фонетико-орфоэпических норм русского языка:

правильно произносить при чтении и в устной речи специфические русские звуки [г], [г'], [р'] [ч'], [щ'], [д'], [т'];

правильно читать слова с буквами о, е, я в первом предударном слоге;

правильно произносить при чтении парные звонкие согласные на конце слова и в середине слова перед глухими согласными (*снег, тетрадь, книжка*);

произносить при чтении звук [л] на конце глаголов прошедшего времени м. р. ед. ч. *(пел)* и в словах типа *волк;*

звук [в] перед согласными в начале, середине и конце слов *(вниз, автор, лев);*

произносить при чтении звук [й] в словах, оканчивающихся на -ый, -ий, -ой (*добрый, звонкий, золотой*); звука [в] в окончаниях прилагательных и местоимений род. п ед. ч. м. р. и ср. р.(*красного, нашего*); звука [ц͡] в глагольных формах (*купаться*);

правильно произносить при чтении буквосочетания жи, ши, же, ше;

выразительно читать художественное произведение с соблюдением интонации предложения и пауз на знаках препинания;

оценивать свое и чужое чтение с позиций правильности и выразительности;

ориентироваться в содержании произведения *до* чтения (по заглавию, иллюстрациям и опорным словам);

выявлять в тексте непонятные слова и выражения, определять их значение через контекст, сноски и с помощью словаря;

с помощью учителя определять учебную задачу чтения: *что, с какой целью* должны прочитать;

планировать деятельность: с помощью учителя называть в последовательности действия при подготовке к чтению по ролям, выразительному чтению;

отвечать на вопросы о фактическом содержании произведения;

находить в тексте конкретный отрывок для подтверждения ответа на вопрос учителя;

находить в тексте начало и конец отрывка, который проиллюстрирован;

выделять действующих лиц произведения;

находить в тексте эпизод с описанием поступка героя;

оценивать с помощью учителя действия и поступки героев, определять к ним свое отношение;

подробно пересказывать небольшое произведение (рассказ повествовательного характера, сказку) по готовому плану, вопросам учителя, опорным словам, иллюстрациям;

оперировать литературными терминами: автор, заглавие, стихотворение, рассказ, сказка, скороговорка, загадка, пословица;

приводить примеры загадок, скороговорок, пословиц, сказок, стихов и рассказов из круга изученных произведений;

ориентироваться в книге: находить в оглавлении фамилию автора, название нужного произведения и соответствующую страницу;

выбирать книгу в соответствии с поставленной целью (по теме и жанру, авторской принадлежности) с помощью библиотекаря;

правильно называть прочитанное произведение, книгу (фамилия автора, заглавие).

Использовать приобретенные знания и умения в практической деятельности и повседневной жизни:

самостоятельно читать детские книжки на русском языке;

самостоятельно знакомиться с произведением и книгой *до* чтения;

ориентироваться в книгах по оглавлению: находить произведение по его названию в оглавлении и на нужной странице книги;

высказывать оценочные суждения о прочитанном произведении (герое, событии), книжке, просмотренном фильме, спектакле;

пользоваться переводным (русско-белорусским) и толковым словарями;

принимать участие в литературных конкурсах.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Матэматыка»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

МАТЭМАТЫКА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навучанне матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана на фарміраванне першапачатковых уяўленняў пра матэматыку як пра навуку, якая вывучае колькасныя адносіны і прасторавыя формы рэальнага свету. Вучэбны прадмет «Матэматыка» садзейнічае развіццю наглядна-вобразнага і славесна-лагічнага мыслення, закладвае асновы для фарміравання ў навучэнцаў алгарытмічнай культуры, пазнавальнай самастойнасці, паказвае магчымасці прымянення матэматычных ведаў у паўсядзённым жыцці.

Мэта навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі – фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для працягу навучання матэматыцы і іншым вучэбным прадметам на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, набыццё першапачатковага вопыту рашэння вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач; фарміраванне пазнавальных працэсаў і разумовых аперацый навучэнцаў.

Задачы навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

сфарміраваць уяўленні пра натуральны лік і лік нуль на аснове вывучэння ўтварэння, паслядоўнасці, чытання, запісу лікаў, іх разраднага складу, параўнання лікаў і выканання над імі арыфметычных дзеянняў, вымярэння велічыняў і рашэння тэкставых задач;

навучыць вызначаць, будаваць і даследаваць геаметрычныя фігуры, параўноўваць аднародныя велічыні, вызначаць лікавыя значэнні велічыняў з дапамогай вымярэнняў і вылічэнняў;

пазнаёміць са спосабамі падачы інфармацыі з дапамогай малюнкаў, схем, чарцяжоў, дыяграм, тэкстаў, табліц, матэматычнай сімволікі; сфарміраваць пачатковыя ўменні па пабудове мадэляў рэальных сітуацый з колькаснымі данымі;

стварыць умовы для авалодання асновамі лагічнага і алгарытмічнага мыслення, развіцця прасторавага ўяўлення, матэматычнай мовы;

забяспечыць атрыманне пачатковага вопыту прымянення матэматычных ведаў для рашэння вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач;

садзейнічаць развіццю цікавасці да матэматыкі, да даследавання матэматычнай існасці аб’ектаў навакольнага свету.

Метадычныя прынцыпы адбору зместу навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі

Прынцып вядучай ролі арыфметычнага матэрыялу. У адпаведнасці з дадзеным прынцыпам асноўнае месца ў змесце вучэбнага прадмета «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі адводзіцца фарміраванню паняцця цэлага неадмоўнага ліку.

Прынцып канцэнтрызму ў вывучэнні арыфметычнага матэрыялу. Згодна з дадзеным прынцыпам арыфметычны матэрыял на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі структурыруецца па канцэнтрах: спачатку вывучаюцца адназначныя лікі, потым двухзначныя лікі, далей – трохзначныя лікі і мнагазначныя лікі да мільёна. Вылучэнне канцэнтраў звязана з асаблівасцямі дзесятковай сістэмы злічэння. У кожным канцэнтры

вучні знаёмяцца са спосабамі ўтварэння, чытання і запісу лікаў, паслядоўнасцю лікаў, вучацца параўноўваць лікі і выконваць над імі арыфметычныя дзеянні.

Прынцып узаемасувязі зместавых ліній вучэбнага прадмета «Матэматыка»: арыфметычнага матэрыялу, велічыняў, геаметрычнага матэрыялу, элементаў алгебры. У адпаведнасці з дадзеным прынцыпам зместавыя лініі вучэбнага прадмета «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўзаемазвязаны і дапаўняюць адна адну. Вучэбны матэрыял, што вывучаецца ў рамках адной лініі, садзейнічае лепшаму засваенню матэрыялу другой лініі (перавод з адных адзінак вымярэння велічыняў у другія садзейнічае замацаванню нумарацыі лікаў; рашэнне ўраўненняў заснавана на веданні сувязі паміж кампанентамі і вынікамі дзеянняў; вылічэнне перыметра прамавугольніка звязана з веданнем уластыцівасцей арыфметычных дзеянняў і інш.). На кожным уроку комплексна рашаюцца задачы па фарміраванні ўяўленняў пра лік, велічыню, геаметрычныя фігуры і элементы алгебры.

Прынцып інтэграцыі вучэбнай матэматычнай тэорыі і практыкі рашэння тэкставых задач з прыкладным зместам. У адпаведнасці з дадзеным прынцыпам асаблівая роля ў вучэбным прадмеце «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі адводзіцца тэкставым задачам, на прыкладзе якіх вучні знаёмяцца з магчымасцямі прымянення матэматычнай тэорыі для рашэння прыкладных праблем.

Прынцып спалучэння гульнявой і вучэбна-пазнавальнай дзейнасці пры навучанні матэматыцы. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вялікае значэнне надаецца выкарыстанню ў навучанні дыдактычных гульняў. У гэты перыяд адбываецца змена вядучага віду дзейнасці (пераход ад гульнявой – да вучэбна-пазнавальнай). Дыдактычная гульня інтэгруецца ў вучэбна-пазнавальную дзейнасць, з аднаго боку, ствараючы магчымасці для вывучэння вучэбнага матэрыялу на даступным для вучняў узроўні, з другога – стымулюючы развіццё цікавасці да матэматыкі.

Прынцып навучання матэматыцы на аснове дзейнасці мадэлявання. У адпаведнасці з дадзеным прынцыпам навучанне матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана не толькі на засваенне даступнай для вучняў матэматычнай тэорыі, але і на фарміраванне ў іх пачатковых уяўленняў пра метады пабудовы матэматычных мадэляў. Уменне прадстаўляць істотныя характарыстыкі аб'ектаў, што вывучаюцца, з дапамогай мадэляў розных відаў садзейнічае свядомаму фарміраванню матэматычных паняццяў і спосабаў дзейнасці, аказвае станоўчы ўплыў на развіццё пазнавальнай самастойнасці вучняў.

Характарыстыка зместу навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі

У змесце вучэбнага прадмета «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вылучаюцца наступныя *асноўныя* лініі:

арыфметычны матэрыял;

велічыні і іх вымярэнне;

геаметрычны матэрыял;

алгебраічны матэрыял.

З дапамогай простых і састаўных *тэкставых задач* навучэнцы ўдакладняюць і абагульняюць веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні арыфметычнага і геаметрычнага матэрыялу, асноўных велічыняў і элементаў алгебры. Тэкставыя задачы даюць магчымасць прымяняць матэматычную тэорыю для вырашэння практычных праблем. У працэсе рашэння задач развіваецца маўленне, увага, уяўленне і мысленне навучэнцаў. Змест тэкставых задач забяспечвае пашырэнне кругагляду навучэнцаў, дазваляе рэалізаваць выхаваўчую функцыю навучання.

Вядучая роля ў навучанні матэматыцы адводзіцца арыфметычнаму матэрыялу. Арыфметычны матэрыял вывучаецца канцэнтрычна: адназначныя лікі, двухзначныя лікі да 20, лікі ад 21 да 100, трохзначныя лікі, мнагазначныя лікі ад 1000 да 1 000 000. Пераход да новага канцэнтра суправаджаецца не толькі пашырэннем мноства вывучаных лікаў, але

і сістэматызацыяй ведаў, увядзеннем новых паняццяў і спосабаў дзеянняў у дзейнасць навучэнцаў. Лінія велічыняў, геаметрычны і алгебраічны матэрыял з'яўляюцца спадарожнымі для лініі лікаў і арыфметычных дзеянняў. Знаёмства з велічынямі, вывучэнне элементаў геаметрыі і алгебры размеркавана па адпаведных канцэнтрах.

Арыфметычны матэрыял

Натуральныя лікі і нуль, арыфметычныя дзеянні над імі. У навучэнцаў фарміруюцца ўяўленні пра натуральны лік як вынік падліку і вымярэння велічыняў, пра ўтварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс лікаў, іх разрадны склад, параўнанне лікаў, арыфметычныя дзеянні над імі (складанне, вылічэнне, множанне, дзяленне), пра ўласцівасці арыфметычных дзеянняў (перамяшчальная ўласцівасць складання і множання, спалучальная ўласцівасць складання і множання, размеркавальная ўласцівасць множання), а таксама заснаваныя на гэтых уяўленнях вылічальныя ўменні і навыкі.

Долі. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы знаёмяцца з паняццем долі як адной з роўных частак цэлага (прадмета, геаметрычнай фігуры, велічыні), вучацца параўноўваць долі на практычнай аснове, рашаць тэкставыя задачы на знаходжанне долі ліку і ліку па яго долі.

Велічыні і іх вымярэнне

У цеснай сувязі з арыфметычным матэрыялам раскрываецца паняцце велічыні. Важным з практычнага пункту погляду з'яўляецца навучанне вымярэнню велічыняў. Навучэнцы атрымліваюць уяўленне пра тое, што лік з'яўляецца вынікам вымярэння велічыняў.

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы знаёмяцца з такімі велічынямі, як даўжыня, плошча, маса, час, і з адзінкамі іх вымярэння. Азначэнне гэтых велічыняў заснавана на выкарыстанні вымяральных інструментаў і вылічэнняў. Пры рашэнні тэкставых задач навучэнцы таксама знаёмяцца з прапарцыянальнымі велічынямі, лікавыя значэнні якіх вызначаюцца з дапамогай вылічэнняў (скорасць, час, адлегласць; цана, колькасць, кошт; урадлівасць, плошча, ураджай і інш.).

Геаметрычны матэрыял

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы знаёмяцца з геаметрычнымі фігурамі (пункт, прамая, адрэзак, ломаная, прамень, вугал, многавугольнік, прамавугольнік, квадрат, акружнасць, круг і інш.); вучацца знаходзіць даўжыні адрэзка і ломанай, перыметр многавугольніка, плошчу геаметрычнай фігуры з дапамогай палеткі, плошчу прамавугольніка па даўжынях яго старон, будаваць геаметрычныя фігуры. Навучэнцы выконваюць заданні з геаметрычным зместам, накіраваныя на фарміраванне прасторавых уяўленняў. Знаёмства з геаметрычнымі целамі (куб, прызма, піраміда, цыліндр, конус, шар) у працэсе навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на прапедэўтычным узроўні.

Алгебраічны матэрыял

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы знаёмяцца з алгебраічнымі паняццямі (лікавы выраз, роўнасць, няроўнасць, зменная, выраз са зменнай, ураўненне); вучацца чытаць і запісваць выразы, знаходзіць іх значэнні на аснове правіл парадку выканання дзеянняў, адрозніваць правільныя і няправільныя роўнасці і няроўнасці, абазначаць зменную літарамі лацінскага алфавіта, знаходзіць значэнне выразу пры зададзеным значэнні зменнай, рашаць ураўненні на аснове ўзаемасувязі паміж кампанентамі і вынікамі арыфметычных дзеянняў.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (136 г)

Паўтарэнне вывучанага ў I класе (8 г)

Адназначныя лікі: утварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс. Склад лікаў у межах 10. Двухзначныя лікі да 20: утварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс. Дзесятковы склад двухзначных лікаў да 20. Параўнанне лікаў у межах 20.

Таблічнае складанне і адніманне ў межах 10. Пазатаблічнае складанне і адніманне ў межах 20. Назвы кампанентаў і вынікаў дзеянняў складання і аднімання. Перамяшчальная ўласцівасць складання. Узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння складання.

Простыя задачы, якія раскрываюць сэнс дзеянняў складання і аднімання. Простыя задачы на павелічэнне і памяншэнне ліку на некалькі адзінак. Рашэнне простых задач на вызначэнне умяшчальнасці посуду і аб'ёму вадкасці (у літрах).

Геаметрычныя фігуры: пункт, прамая, крывая, адрэзак. Распазнаванне квадрата, круга, трохвугольніка, прамавугольніка.

Адзінкі вымярэння даўжыні (дэцыметр, сантыметр) і масы (кілаграм).

Таблічнае складанне і адпаведныя выпадкі аднімання (25 г)

Прыёмы складання адназначных лікаў з пераходам цераз дзясятак. Прыёмы аднімання лікаў з пераходам цераз дзясятак. Табліца складання адназначных лікаў у межах 20 і адпаведныя выпадкі аднімання.

Простыя задачы на павелічэнне і памяншэнне ліку на некалькі адзінак ва ўскоснай форме, на рознаснае параўнанне, на знаходжанне невядомага складаемага.

Ломаная. Звёны ломанай. Даўжыня ломанай.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па раздзеле «Таблічнае складанне і адпаведныя выпадкі аднімання»

Ведаць:

прыёмы складання і аднімання адназначных лікаў з пераходам цераз дзясятак;

табліцу складання адназначных лікаў у межах 20 і адпаведныя выпадкі аднімання;

назву геаметрычнай фігуры *ломаная*.

Умець:

складаць і аднімаць лікі ў межах 20, выкарыстоўваючы прыёмы складання і аднімання адназначных лікаў з пераходам цераз дзясятак;

рашаць задачы на павелічэнне і памяншэнне ліку на некалькі адзінак ва ўскоснай форме, на рознаснае параўнанне, на знаходжанне невядомага складаемага;

вызначаць і называць геаметрычную фігуру *ломаная*;

будаваць ломаную з зададзенымі даўжынямі звёнаў;

знаходзіць даўжыню ломаной;

выражаць значэнне даўжыні ломанай у розных адзінках вымярэння (дэцыметр, сантыметр);

карыстацца вывучанай матэматычнай тэрміналогіяй.

Лікі ад 21 да 100 (13 г)

Адназначныя і двухзначныя лікі. Дзясятак як лічыльная адзінка. Разрады дзясяткаў і адзінак. Утварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс двухзначных лікаў. Разрадны склад двухзначных лікаў. Прадстаўленне двухзначных лікаў у выглядзе сумы разрадных складаемых. Параўнанне двухзначных лікаў. Складанне і адніманне, заснаванае на веданні разраднага складу двухзначных лікаў. Складанне і адніманне двухзначных лікаў, заснаванае на веданні таблічнага складання і аднімання.

Простыя задачы на знаходжанне невядомага памяншаемага і аднімаемага. Адваротная задача.

Састаўная задача. Рашэнне састаўных задач у два дзеянні.

Адзінка даўжыні *метр*. Суадносіны паміж адзінкамі даўжыні (метр, дэцыметр, сантыметр).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па раздзеле «Лікі ад 21 да 100»

Ведаць:

спосабы ўтварэння і паслядоўнасць лікаў ад 21 да 100;

разрадны склад двухзначных лікаў;

прыёмы вуснага складання і аднімання лікаў у межах 100;

адзінка даўжыні *метр,* суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі даўжыні (метр, дэцыметр, сантыметр).

Умець:

чытаць, запісваць і параўноўваць лікі ў межах 100;

прадстаўляць двухзначныя лікі ў выглядзе сумы разрадных складаемых;

складаць і аднімаць лікі ў межах 100, выкарыстоўваючы вусныя прыёмы вылічэнняў;

рашаць задачы на знаходжанне невядомага памяншаемага і аднімаемага;

складаць простую задачу, адваротную дадзенай;

рашаць састаўныя задачы ў два дзеянні на складанне і адніманне;

выражаць значэнне даўжыні ў розных адзінках вымярэння (метр, дэцыметр, сантыметр).

Пазатаблічнае складанне і адніманне лікаў у межах 100 (64 г)

Спалучальная ўласцівасць складання. Вуснае складанне і адніманне лікаў у межах 100. Пісьмовае складанне і адніманне лікаў у межах 100. Праверка складання спосабам знаходжання складаемага. Праверка аднімання спосабам знаходжання памяншаемага і спосабам знаходжання аднімаемага на аснове ўзаемасувязі паміж кампанентамі і вынікам дзеяння аднімання.

Лікавыя выразы. Лікавыя выразы ў два дзеянні з дужкамі і без дужак. Парадак дзеянняў у выразах з дужкамі і без дужак. Чытанне, запіс і знаходжанне значэння лікавых выразаў. Роўнасці. Правільныя і няправільныя лікавыя роўнасці. Няроўнасці. Правільныя і няправільныя лікавыя няроўнасці.

Рашэнне састаўных задач у два дзеянні.

Прамень. Вугал. Віды вуглоў (прамы, тупы, востры). Многавугольнік. Прамавугольнік. Квадрат. Уласцівасці старон прамавугольніка (квадрата). Перыметр многавугольніка.

Адзінка часу *мінута.* Суадносіны паміж адзінкамі часу (гадзіна, мінута). Вызначэнне часу па цыферблатным гадзінніку з дакладнасцю да мінуты. Вызначэнне часу дня і ночы.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па раздзеле «Пазатаблічнае складанне і адніманне лікаў у межах 100»

Ведаць:

спалучальную ўласцівасць складання;

прыёмы вуснага і пісьмовага складання і аднімання лікаў у межах 100;

узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння аднімання;

спосабы праверкі вынікаў выканання арыфметычных дзеянняў складання і аднімання;

правілы парадку выканання дзеянняў у лікавых выразах з дужкамі і без дужак;

назвы геаметрычных фігур (прамень, вугал, многавугольнік);

віды вуглоў (прамы, тупы, востры);

азначэнні прамавугольніка, квадрата;

спосаб знаходжання перыметра многавугольніка;

адзінку часу *мінута*, суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі часу (гадзіна, мінута).

Умець:

складаць і аднімаць лікі ў межах 100, выкарыстоўваючы вусныя і пісьмовыя прыёмы вылічэнняў;

правяраць вынікі выканання арыфметычных дзеянняў складання і аднімання;

чытаць і запісваць лікавыя выразы ў два-тры дзеянні з дужкамі і без дужак;

прымяняць правілы парадку выканання дзеянняў у лікавых выразах у два-тры дзеянні з дужкамі і без дужак і знаходзіць іх значэнні;

вызначаць правільныя і няправільныя лікавыя роўнасці, правільныя і няправільныя лікавыя няроўнасці;

адрозніваць лікавы выраз, роўнасць і няроўнасць;

рашаць састаўныя задачы ў два дзеянні на складанне і адніманне;

вызначаць і называць вывучаныя геаметрычныя фігуры: прамень, вугал (прамы, тупы, востры), многавугольнік, прамавугольнік, квадрат;

адлюстроўваць вывучаныя геаметрычныя фігуры з дапамогай лінейкі на паперы з разліноўкай у клетку;

знаходзіць перыметр многавугольніка;

выражаць значэнне даўжыні ў розных адзінках вымярэння (метр, дэцыметр, сантыметр);

вызначаць час па цыферблатным гадзінніку з дакладнасцю да мінуты;

вызначаць час дня і ночы;

выконваць параўнанне, складанне і адніманне лікавых значэнняў велічыняў;

карыстацца вывучанай матэматычнай тэрміналогіяй.

Множанне і дзяленне (18 г)

Канкрэтны сэнс арыфметычных дзеянняў множання і дзялення. Простыя задачы, якія раскрываюць сэнс арыфметычнага дзеяння множання. Простыя задачы, якія раскрываюць сэнс арыфметычнага дзеяння дзялення (па змесце, на роўныя часткі).

Назвы кампанентаў і вынікаў арыфметычных дзеянняў множання і дзялення.

Перамяшчальная ўласцівасць множання. Узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння множання. Табліца множання з лікам 2, адпаведныя выпадкі дзялення. Табліца множання з лікам 3, адпаведныя выпадкі дзялення.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па раздзеле «Множанне і дзяленне»

Ведаць:

канкрэтны сэнс дзеянняў множання і дзялення;

назвы кампанентаў і вынікаў дзеянняў множання і дзялення;

перамяшчальная ўласцівасць множання;

узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння множання;

табліцы множання з лікамі 2 і 3, адпаведныя выпадкі дзялення.

Умець:

замяняць складанне аднолькавых складаемых множаннем; замяняць множанне складаннем аднолькавых складаемых;

называць кампаненты і вынікі арыфметычных дзеянняў множання і дзялення;

рашаць простыя задачы, якія раскрываюць сэнс арыфметычных дзеянняў множання і дзялення на практычнай аснове (з выкарыстаннем мностваў прадметаў).

Паўтарэнне вывучанага ў II класе (8 г)

Двухзначныя лікі да 100: утварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс. Разрадны склад двухзначных лікаў. Прадстаўленне двухзначных лікаў у выглядзе сумы разрадных складаемых. Параўнанне лікаў у межах 100.

Вуснае складанне і адніманне лікаў у межах 100. Пісьмовае складанне і адніманне лікаў у межах 100. Канкрэтны сэнс дзеяння множання. Таблічнае множанне і дзяленне з лікамі 2 і 3.

Рашэнне простых задач на складанне і адніманне. Рашэнне састаўных задач у два дзеянні на складанне і адніманне. Рашэнне простых задач, якія раскрываюць сэнс арыфметычных дзеянняў множання і дзялення.

Прамень. Вугал. Віды вуглоў (прамы, тупы, востры). Прамавугольнік. Квадрат. Перыметр многавугольніка.

Адзінкі даўжыні, суадносіны паміж імі (метр, дэцыметр, сантыметр).

Адзінкі часу, суадносіны паміж імі (гадзіна, мінута).

Пры вывучэнні матэматыкі ў II класе навучэнцы авалодваюць наступнымі **відамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці**:

аналізаваць вучэбнае заданне (вылучаць умову і патрабаванне);

разумець і супастаўляць інфармацыю, прадстаўленую ў выглядзе тэксту, рысунка, схемы, лікавага выразу або роўнасці;

разумець інфармацыю, прадстаўленую у таблічнай форме;

выяўляць і выкарыстоўваць заканамернасці;

знаходзіць аналогіі і прымяняць іх пры выкананні заданняў;

праводзіць параўнанне і класіфікацыю аб'ектаў;

выконваць дзеянні па алгарытме;

будаваць разважанні ў працэсе выканання вучэбных заданняў.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў II класа

Ведаць:

спосабы ўтварэння і паслядоўнасць лікаў ад 21 да 100;

разрадны склад двухзначных лікаў;

табліцу складання адназначных лікаў і адпаведныя выпадкі аднімання;

узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння аднімання;

спалучальную ўласцівасць складання;

прыёмы вуснага і пісьмовага складання і аднімання лікаў у межах 100;

спосабы праверкі вынікаў выканання арыфметычных дзеянняў складання і аднімання;

правілы парадку выканання дзеянняў у лікавых выразах з дужкамі і без дужак;

канкрэтны сэнс дзеянняў множання і дзялення;

назвы кампанентаў і вынікаў дзеянняў множання і дзялення;

перамяшчальную ўласцівасць множання;

узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння множання;

табліцы множання з лікамі 2 і 3, адпаведныя выпадкі дзялення;

назвы геаметрычных фігур (ломаная, прамень, вугал, многавугольнік);

віды вуглоў (прамы, тупы, востры);

азначэнні прамавугольніка, квадрата;

спосаб знаходжання перыметра многавугольніка;

адзінку даўжыні *метр*, суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі даўжыні (метр, дэцыметр, сантыметр);

адзінку часу *мінута*, суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі часу (гадзіна, мінута).

Умець:

чытаць , запісваць і параўноўваць лікі ў межах 100;

прадстаўляць двухзначныя лікі ў выглядзе сумы разрадных складаемых;

складаць і аднімаць лікі ў межах 100, выкарыстоўваючы вусныя і пісьмовыя прыёмы вылічэнняў;

правяраць вынікі выканання арыфметычных дзеянняў складання і аднімання;

чытаць і запісваць лікавыя выразы ў два-тры дзеянні з дужкамі і без дужак;

прымяняць правілы парадку выканання дзеянняў у лікавых выразах у два-тры дзеянні з дужкамі і без дужак, якія патрабуюць дзеянняў складання і аднімання, знаходзіць значэнні выразаў;

замяняць складанне аднолькавых складаемых множаннем; замяняць множанне складаннем аднолькавых складаемых;

называць кампаненты і вынікі арыфметычных дзеянняў множання і дзялення;

адрозніваць лікавы выраз, роўнасць і няроўнасць;

вызначаць правільныя і няправільныя лікавыя роўнасці, правільныя і няправільныя лікавыя няроўнасці;

рашаць задачы на павелічэнне і памяншэнне ліку на некалькі адзінак ва ўскоснай форме, на рознаснае параўнанне, на знаходжанне невядомага складаемага, на знаходжанне невядомага памяншаемага і аднімаемага;

складаць простыя задачы, адваротныя дадзенай задачы;

рашаць састаўныя задачы ў два дзеянні на складанне і адніманне;

рашаць простыя задачы, якія раскрываюць сэнс арыфметычных дзеянняў множання і дзялення на практычнай аснове (з выкарыстаннем мностваў прадметаў);

вызначаць і называць вывучаныя геаметрычныя фігуры: ломаная, прамень, вугал (прамы, тупы, востры), многавугольнік, прамавугольнік, квадрат;

адлюстроўваць вывучаныя геаметрычныя фігуры з дапамогай лінейкі на паперы з разліноўкай у клетку;

будаваць ломаную з зададзенымі даўжынямі звёнаў;

знаходзіць даўжыню ломанай і перыметр многавугольніка;

выражаць значэнне даўжыні ў розных адзінках вымярэння (метр, дэцыметр, сантыметр);

вызначаць час па цыферблатным гадзінніку з дакладнасцю да мінуты;

вызначаць час дня і ночы;

выконваць параўнанне, складанне і адніманне лікавых значэнняў велічыняў;

карыстацца вывучанай матэматычнай тэрміналогіяй.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

аналізу тэксту, рысунка, схемы з мэтай атрымання новай інфармацыі;

мадэлявання жыццёвай сітуацыі з дапамогай розных знакава-сімвалічных сродкаў;

рашэння практычных задач, звязаных з вылічэннямі;

ацэнкі даўжыняў прадметаў на аснове пачуццёвага ўспрымання і спосабаў вымярэння;

вызначэння часу па цыферблатным гадзінніку;

пабудовы і вымярэння геаметрычных аб’ектаў.

Кантрольныя работы:

Кантрольная пісьмовая работа – 2 (I паўгоддзе), 2 (II паўгоддзе).

Праверка навыкаў вуснага лічэння – 1 (I паўгоддзе), 1 (II паўгоддзе).

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Чалавек і свет»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ЧАЛАВЕК І СВЕТ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма вызначае мэту, задачы, структуру і змест вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Інтэграваны характар вучэбнага прадмета абумоўлены ўзроставымі псіхалагічнымі асаблівасцямі вучняў, арыентаванасцю на фарміраванне асноў светаўспрымання. Інтэграцыя звестак з прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (біялогіі, геаграфіі, фізікі, гісторыі, грамадазнаўства, этыкі, медыцыны) спрыяе фарміраванню ў вучняў цэласнай карціны свету ва ўзаемасувязі прыроды, грамадства, чалавека.

Асноўным аб’ектам пазнання вучняў на ўроках «Чалавек і свет» выступае натуральная прырода, што дазваляе паспяхова рашаць задачы фарміравання экалагічнай культуры, закладвае фундамент для працягу вывучэння шэрагу вучэбных прадметаў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Мэта вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» – фарміраванне асноў навуковага погляду на свет, экалагічнай і духоўна-маральнай культуры, уяўленняў і ведаў аб прыродзе, грамадстве і чалавеку, неабходных для рознабаковага ўзаемадзеяння з навакольным светам.

Дасягненне адзначанай мэты мае на ўвазе рашэнне наступных **задач**:

фарміраванне ўяўленняў і паняццяў пра аб'екты прыроды і з'явы, іх разнастайнасць, адзінства прыроднага і сацыяльнага, месца чалавека ў прыродзе і грамадстве;

авалоданне элементарнымі метадамі пазнання прыроды (распазнаванне, назіранне, эксперымент);

развіццё эмацыянальна-каштоўнасных адносін да прыроды, пазнавальнай цікавасці да вывучэння аб'ектаў жывой і нежывой прыроды;

фарміраванне вопыту прыродаахоўнай дзейнасці, выканання экалагічна абумоўленых норм паводзін;

засваенне ведаў пра арганізм чалавека, кампаненты здаровага ладу жыцця і спосабы яго рэалізацыі;

пашырэнне ведаў пра нормы і правілы культураадпаведных паводзін у навакольным сацыяльным асяроддзі, вопыт маральных адносін да людзей;

выхаванне патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, асноў грамадзянскай культуры;

фарміраванне вопыту пазнавальнай і творчай дзейнасці, развіццё прадметных і агульнавучэбных уменняў, адукацыйных кампетэнцый.

Змест вучэбнага прадмета комплексна прадстаўлены трыма ўзаемазвязанымі адукацыйнымі кампанентамі: «Прырода і чалавек» (вядучы кампанент), «Чалавек і яго здароўе», «Чалавек і грамадства». Змястоўны блок «Мая Радзіма – Беларусь» з'яўляецца састаўной часткай кампанента «Чалавек і грамадства» і вывучаецца ў IV класе на беларускай мове.

У аснову адукацыйнага кампанента «Прырода і чалавек» пакладзена канцэпцыя экалагічнай адукацыі асобы, што патрабуе фарміравання ў вучняў асноў экалагічнай культуры, засваення сістэмы першапачатковых экалагічных ведаў і ўменняў, іх прымянення ў канкрэтных жыццёвых сітуацыях, выхавання беражлівых адносін да прыроды, фарміравання вопыту практычнай прыродаахоўнай дзейнасці.

Вывучэнне кампанента «Прырода і чалавек» у I класе пабудавана па прынцыпе сезоннасці, бо даступныя дзецям непасрэдныя назіранні за зменамі ў нежывой і жывой прыродзе даюць наглядны матэрыял для засваення ўзаемазалежнасці з'яў у прыродзе ў розныя поры года. Абагульненне назіранняў за сезоннымі зменамі ў прыродзе, назапашаных эмпірычным шляхам, дазваляе падвесці вучняў да разумення прычын змены сезонаў у залежнасці ад нераўнамернасці асвятлення нашай планеты Сонцам. Вучні засвойваюць канкрэтныя веды пра змены ў нежывой і жывой прыродзе, вучацца тлумачыць сувязі, якія існуюць паміж асобнымі элементамі нежывой і жывой прыроды, пераконваюцца ў тым, што ў прыродзе ўсё ўзаемазвязана.

У працэсе вывучэння кампанента «Чалавек і яго здароўе» пашыраюцца і паглыбляюцца веды пра спосабы захавання і ўмацавання здароўя, фарміруюцца адпаведныя ўменні і навыкі.

Вывучэнне адукацыйнага кампанента «Чалавек і грамадства» дае магчымасць фарміравання ў вучняў уяўленняў пра краіну, у якой яны жывуць, свой горад (вёску); асэнсавання неабходнасці выказваць увагу і клопат пра членаў сям'і; выконваць правілы бяспечных паводзін у паўсядзённым жыцці.

У II класе адукацыйны кампанент «Прырода і чалавек» уключае раздзелы «Нежывая прырода і чалавек» і «Жывая прырода і чалавек».

Асноўная мэтавая ўстаноўка вывучэння раздзела «Нежывая прырода і чалавек» – паглыбленне ўяўленняў вучняў пра ваду, паветра, глебу. Прадметам вывучэння з'яўляюцца ўласцівасці найважнейшых аб'ектаў нежывой прыроды, іх значэнне для чалавека і меры па іх ахове. Пры вывучэнні ўласцівасцей вады, паветра, глебы ствараюцца ўмовы для фарміравання ў вучняў навыкаў даследчай дзейнасці, развіцця ўменняў доследным шляхам вызначаць уласцівасці аб'ектаў, параўноўваць і аналізаваць аб'екты навакольнага свету, фіксаваць вынікі назіранняў, рабіць высновы.

Мэта вывучэння раздзела «Жывая прырода і чалавек» – спрыяць фарміраванню ў вучняў гуманных, экалагічна абгрунтаваных і свядомых адносін да ўсяго жывога.

У аснову адбору зместу раздзела пакладзены краязнаўчы прынцып, які забяспечвае раскрыццё сутнасці паняццяў, што вывучаюцца, з дапамогай фактаў навакольнай рэчаіснасці. Краязнаўчы матэрыял выступае крыніцай тэарэтычных ведаў, сродкам пазнання і аб'ектам рашэння пазнавальных задач.

Пры вывучэнні дадзенага раздзела вучні знаёмяцца з групамі раслін і жывёл, вызначаюць сувязі, якія існуюць паміж раслінамі і жывёламі, рознымі групамі жывёл, паміж чалавекам і жывой прыродай.

Пры вывучэнні раздзела прадугледжваецца фарміраванне ў вучняў уменняў пазнаваць і апісваць (вусна) прадстаўнікоў раслiннага і жывёльнага свету, вызначаць і тлумачыць сувязі ў жывой і нежывой прыродзе, прагназаваць наступствы іх парушэння чалавекам. Засваенне зместу раздзела важнае ў аспекце набыцця вучнямі экалагічна абумоўленага практычнага вопыту ўзаемадзеяння з прыродой (догляд раслін і жывёл блізкага акружэння); выхавання эстэтычных пачуццяў здзіўлення, захаплення прыгажосцю прыроды.

Атрыманыя звесткі пра ўласцівасці вады, паветра, пра аб'екты жывой прыроды з'яўляюцца асновай для вывучэння кампанента «Чалавек і здароўе» і выкарыстоўваюцца для далейшага пашырэння ведаў пра здаровы лад жыцця.

Асноўнай мэтай вывучэння кампанента «Чалавек і грамадства» з'яўляецца фарміраванне пазітыўных эмацыянальна-каштоўнасных адносін вучняў да іншых людзей, засваенне ведаў аб правах і абавязках, правілах паводзін у грамадскіх месцах. Пры вывучэнні тэм «Сям'я» і «Эканоміка сям'і» ў вучняў фарміруюцца элементарныя эканамічныя ўяўленні (гаспадарка сям'і, бюджэт, грошы і да т. п.), якія ў далейшым робяцца асновай эканамічнай граматнасці, выхавання якасцей беражлівасці, руплівасці, гаспадарлівасці.

У III класе вывучэнне адукацыйнага кампанента «Прырода і чалавек» пачынаецца з раздзела «Планета, на якой мы жывём», пры вывучэнні якога вучні атрымліваюць агульнае ўяўленне пра планету Зямля. У іх фарміруюцца ўяўленні пра глобус як мадэль Зямлі, адбываецца знаёмства з фізічнай картай паўшар'яў. Пры вывучэнні раздзела «Арыентаванне на мясцовасці» вучні атрымліваюць веды пра гарызонт, стораны гарызонту, знаёмяцца з практычнымі спосабамі арыентавання.

Змест раздзела «Мой родны край» дазваляе на краязнаўчым матэрыяле глыбей раскрыць узаемасувязі ў прыродзе, сфарміраваць уяўленні пра формы зямной паверхні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, пра карысныя выкапні, іх уласцівасці.

Засваенне ведаў пра нежывую прыроду стварае аснову для вывучэння раслiннага і жывёльнага свету ў тэме «Прыродныя супольнасці роднага краю». Зместавымі элементамі вывучэння дадзенай тэмы з'яўляюцца найбольш распаўсюджаныя прыродныя супольнасці нашай краіны – лес, вадаём, балота, луг. Вучні даведваюцца пра іх асаблівасці, значэнне ў прыродзе, ролю ў жыццядзейнасці чалавека.

На аснове ведаў пра разнастайнасць раслін і жывёл Беларусі фарміруюцца ўменні вызначаць іх па асаблівых прыметах, тлумачыць асаблівасці прыстасавання жывых арганізмаў да навакольнага асяроддзя. У сістэме ведаў аб прыродзе асабліва важным з'яўляецца засваенне вучнямі правіл прыродаахоўных паводзін, узбагачэнне вопыту экалагічна абгрунтаваных паводзін у прыродзе, развіццё эмацыянальна-каштоўнасных адносін да прыроды.

Вывучэнне раздзела «Разнастайнасць раслін і жывёл на Зямлі» накіравана на паглыбленне ўяўленняў пра ўзаемасувязі нежывой і жывой прыроды, сістэматызацыю і пашырэнне ведаў аб асноўных групах прадстаўнікоў раслiннага і жывёльнага свету.

У адукацыйным кампаненце «Чалавек і яго здароўе» даецца агульнае ўяўленне пра ўнутраныя органы чалавека, функцыі, якія яны выконваюць, будову. Асаблівая ўвага надаецца пытанням асабістай гігіены, захадам, якія павінны рабіць вучні для захавання і ўмацавання свайго здароўя. Фарміруецца ўяўленне вучняў пра тое, што правільнае харчаванне з'яўляецца адным з галоўных фактараў захаванння здароўя чалавека.

Вывучэнне тэм «Апора цела і рух», «Органы пачуццяў чалавека. Вока – орган зроку», «Органы слыху, нюху, дотыку, смаку» накіравана на фарміраванне ў вучняў

чуйных і добразычлівых адносін да іншых людзей, выхаванне талерантнасці, цярпімасці і міласэрнасці да інвалідаў, людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Засваенне зместу вучэбнай праграмы «Чалавек і свет» арганізуецца праз урокі-гульні, урокі-падарожжы, урокі-даследаванні і інш. з выкарыстаннем форм, метадаў і прыёмаў, якія забяспечваюць самастойнае набыццё вучнямі ведаў і актыўнае асваенне спосабаў пазнання навакольнага свету, захаванне і падтрыманне працаздольнасці вучняў, зняцце фізічнага і псіхічнага напружання.

Сістэма ключавых кампетэнцый на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі фарміруецца шляхам засваення адпаведных кампанентаў зместу адукацыі з дапамогай універсальных вучэбных дзеянняў. Пры гэтым асаблівасці прадмета «Чалавек і свет» дазваляюць зрабіць выснову аб пераважнай ролі пазнавальных вучэбных дзеянняў, да якіх належаць навыкі ажыццяўлення разумовых аперацый (параўнання, класіфікацыі, аналізу, сінтэзу, абагульнення і інш.), навыкі працы з інфармацыяй (пошуку, ператварэння, уяўлення, перапрацоўкі, «згортвання» і «разгортвання»; навыкі асэнсаванага чытання і інш.), навыкі мадэлявання, у тым ліку з дапамогай знакава-сімвалічных сродкаў.

Пры арганізацыі вучэбнай дзейнасці неабходны перанос акцэнту з прыярытэту зместу адукацыі («Ведаю, што…») на прыярытэт асваення спосабаў дзеянняў («Ведаю, як…»). Вынікам навучання павінны стаць практыка-арыентаваныя прадметныя веды, здольнасць вучняў вырашаць праблемы, паспяхова дзейнічаць у жыццёвых сітуацыях на аснове сфарміраваных кампетэнцый. Дадзены падыход канкрэтызаваны ў змесце вучэбнага прадмета пад назвай «Вопыт практычнай дзейнасці».

Віды вучэбнай дзейнасці вучняў вызначаюцца ў залежнасці ад крыніцы атрымання інфармацыі – на слоўнай аснове (аповеду настаўніка, тэксту вучэбнага дапаможніка, кнігі для чытання, вучэбна-пазнавальнай літаратуры); на аснове ўспрымання ў працэсе назірання за аб’ектамі і з’явамі прыроды і дэманстрацыйнымі доследамі.

Асаблівая ўвага надаецца фарміраванню ўменняў вучняў працаваць з інфармацыяй, прычым не толькі з тэкставай, але і з такімі крыніцамі інфармацыі, як умоўныя абазначэнні, ілюстрацыя, табліца, схема, карта, прыродны матэрыял, раздатачны матэрыял і інш. Таксама ў працэсе навучання могуць быць выкарыстаны электронныя адукацыйныя рэсурсы і аўдыя- і відэаматэрыялы.

Пазнавальныя вучэбныя дзеянні ажыццяўляюцца шляхам лагічных аперацый вылучэння прымет аб’ектаў і з’яў, упарадкавання, параўнання і класіфікацыі на аснове істотных прымет, вызначэння аналогіі, прычынна-выніковых сувязей; аналізу, сінтэзу, высновы, абагульнення, сістэматызацыі і інш.

Асаблівае значэнне ў засваенні зместу вучэбнага прадмета маюць экскурсіі, якія дазваляюць пазнаваць навакольны свет праз назіранні, вывучаць навакольныя аб’екты з дапамогай розных органаў пачуццяў, прадстаўляць вынікі пазнання ў выглядзе разнастайных творчых прац (падзелак, малюнкаў, аповедаў-апісанняў і да т.п.), набываць вопыт прыродаахоўных паводзін і дзейнасці.

У раздзеле праграмы «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў» вызначаны прадметныя веды і ўменні, а таксама патрабаванні па іх выкарыстанні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці, якімі авалодваюць вучні II класа.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (34 г)

Прырода і чалавек (27 г)

Уводзіны (1 г)

Прырода вакол нас. Прырода жывая і нежывая. Прыметы адрознення аб’ектаў нежывой прыроды і жывых арганізмаў. Чалавек – частка жывой прыроды. Сувязь жывой і нежывой прыроды, узаемасувязі раслін і жывёл. Роля прыроды ў жыцці людзей.

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый

Нежывая прырода і чалавек (6 г)

Паветра і яго ўласцівасці. Паветра вакол нас. Уласцівасці паветра: празрыстае, без колеру, без паху, дрэнна праводзіць цяпло, добра прапускае сонечныя промні.

Значэнне і ахова паветра. Значэнне паветра для раслін, жывёл і ў жыцці чалавека. Роля раслін у падтрыманні чысціні паветра. Крыніцы забруджвання паветра і меры па яго ахове. Чыстае паветра – залог здароўя чалавека.

Вада і яе ўласцівасці. Вада ў прыродзе: у вадаёмах, у паветры, у глебе, у складзе жывых арганізмаў. Уласцівасці вады: без колеру, празрыстая вадкасць, цякучая, не мае смаку і паху, вада – растваральнік некаторых рэчываў.

Значэнне і ахова вады. Значэнне вады для раслін, жывёл і ў жыцці чалавека. Вада і здароўе чалавека. Пітная вада. Неабходнасць эканоміі вады пры яе выкарыстанні. Крыніцы забруджвання і меры па ахове вады.

Глеба. Склад глебы: пясок, гліна, паветра, вада, перагной. Асноўная прымета глебы – урадлівасць.

Значэнне глебы і клопат пра яе. Значэнне глебы для раслін, жывёл і ў жыцці чалавека. Знаёмства з насельнікамі глебы (на прыкладах дажджавога чарвяка і крата), іх асаблівасці і роля ў павышэнні ўрадлівасці глебы. Клопат чалавека пра захаванне і павышэнне ўрадлівасці глебы. Роля раслін у ахове глебы ад разбурэння.

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, назіранне за дэманстрацыйнымі доследамі.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Высвятленне доследным шляхам уласцівасцей паветра, вады, складу глебы.*

Жывая прырода і чалавек (20 г)

Расліны як частка жывой прыроды. Жыццёвыя формы раслін: дрэвы, кусты, травяністыя расліны, прыметы іх адрознення. Часткі расліны (на прыкладзе кветкавай): корань, сцябло, ліст, кветка, плод з насеннем, іх значэнне для расліны.

Умовы, неабходныя для росту і развіцця раслін (вада, паветра, цяпло, святло).

Дзікарослыя дрэвы. Ліставыя і хвойныя дрэвы Беларусі, іх значэнне ў прыродзе (падтрыманне чысціні паветра, ахова глебы ад разбурэння) і жыцці чалавека.

Дзікарослыя кусты. Найбольш распаўсюджаныя дзікарослыя кусты Беларусі, іх значэнне ў прыродзе і жыцці чалавека.

Лекавыя расліны Беларусі (дрэвы, кусты, травяністыя расліны). Іх значэнне ў жыцці чалавека.

Атрутныя расліны Беларусі. Асаблівасці знешняга выгляду. Меры перасцярогі пры сустрэчы з атрутнымі раслінамі.

Ахова раслін. Правілы прыродаахоўных паводзін у адносінах да раслін. Расліны Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь.

Культурныя расліны Беларусі. Агародныя, збожжавыя, пладовыя расліны; іх значэнне для чалавека.

Дэкаратыўныя расліны. Разнастайнасць і прыгажасць дэкаратыўных раслін, іх значэнне ў жыцці чалавека. Пакаёвыя расліны, правілы іх догляду. Расліны ў нашым доме і іх уплыў на здароўе чалавека (абагачэнне паветра кіслародам, увільгатненне, ачыстка паветра ад пылу).

Грыбы, іх разнастайнасць. Грыбы – асобая група жывых арганізмаў. Ядомыя і атрутныя грыбы. Правілы збору грыбоў.

Разнастайнасць жывёл. Насякомыя. Прыметы адрознення. Раслінаедныя, драпежныя, усёедныя насякомыя. Значэнне насякомых у прыродзе.

Рыбы. Разнастайнасць рыб. Асаблівасці іх знешняга выгляду ў сувязі з водным ладам жыцця. Раслінаедныя, драпежныя, усёедныя рыбы, іх значэнне ў прыродзе.

Земнаводныя (амфібіі). Іх асаблівасці, звязаныя з жыццём на сушы і ў вадзе. Жабы, рапухі, трытоны і іх харчаванне. Значэнне земнаводных у прыродзе.

Паўзуны (рэптыліі). Разнастайнасць паўзуноў. Прыметы адрознення знешняга выгляду. Харчаванне рэптылій, спосабы здабычы ежы. Значэнне паўзуноў у прыродзе.

Птушкі. Разнастайнасць птушак. Асаблівасці птушак. Раслінаедныя, насякомаедныя, драпежныя, усёедныя птушкі і іх значэнне ў прыродзе.

Млекакормячыя (звяры). Разнастайнасць звяроў, прыстасаванне да ўмоў жыцця. Прыметы адрознення млекакормячых. Раслінаедныя, драпежныя, усёедныя млекакормячыя. Значэнне звяроў у прыродзе.

Значэнне свойскіх і дзікіх жывёл у жыцці чалавека. Свойскія жывёлы – прадстаўнікі розных груп (млекакормячыя, птушкі, рыбы, насякомыя). Іх значэнне ў жыцці чалавека. Значэнне дзікіх жывёл у жыцці чалавека. Выкарыстанне ведаў пра жыццё жывёл пры стварэнні новай тэхнікі.

Меры перасцярогі пры абыходжанні з жывёламі. Небяспечныя сустрэчы з жывёламі ў прыродзе (пчолы, восы, чмялі, кляшчы). Прыметы адрознення гадзюкі і вужа, правілы бяспечных паводзін пры сустрэчы са змеямі. Правілы бяспекі пры абыходжанні з сабакамі і кошкамі на вуліцах.

Ахова жывёл. Правілы прыродаахоўных паводзін у адносінах да жывёл. Клопат чалавека пра жывёл у перыяд з'яўлення патомства. Рэдкія і знікаючыя жывёлы роднага краю. Жывёлы Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь.

Экскурсія «Дзікарослыя расліны Беларусі» (1 г)

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый, схем; назіранне, збор прыроднага матэрыялу.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Знаходжанне частак раслін. Вызначэнне падчас экскурсіі дзікарослых раслін (дрэў, кустоў, травяністых раслін). Уменне называць і паказваць, пазнаваць і апісваць (вусна) культурныя і дзікарослыя расліны, пакаёвыя расліны на прыкладзе натуральных аб'ектаў, гербарных узораў. Пасадка і догляд пакаёвых раслін. Выкананне правіл прыродаахоўных паводзін у адносінах да раслін.*

Параўнанне і апісанне знешняга выгляду ядомых і атрутных грыбоў (работа з муляжамі).

Распазнаванне жывёл па прыметах адрознення, апісанне знешняга выгляду аднаго-двух прадстаўнікоў разных груп жывёл. Назіранне за птушкамі, аказанне дапамогі зімуючым птушкам (зімой і ранняй вясной): развешванне, запаўненне, чыстка кармушак.

Збор насення пустазелля для падкормкі птушак (падчас экскурсіі ў прыроду). Выкананне правіл прыродаахоўных паводзін у адносінах да жывёл.

Чалавек і яго здароўе (3 г)

Клопат пра сваё здароўе. Рэжым дня. Важнасць выканання рэжыму дня. Чаргаванне працы і адпачынку ў рэжыме дня. Гігіена вучэбнай працы пры выкананні дамашняга задання. Рэжым дня школьніка ў будныя і выхадныя дні.

Правілы асабістай гігіены. Догляд поласці рота, пазногцяў і валасоў. Прадметы асабістай гігіены. Беражлівае стаўленне да рэчаў, уменне захоўваць у чысціні адзенне і абутак.

Харчаванне і здароўе. Значэнне ежы для чалавека. Ежа, карысная для здароўя. Значэнне ўжывання агародніны і садавіны для захавання і ўмацавання здароўя. Рэжым харчавання. Правілы культурных і бяспечных паводзін за сталом.

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый, мадэляванне сітуацый.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Выкананне рэжыму дня. Выкананне правіл гігіены вучэбнай працы пры падрыхтоўцы дамашняга задання, асабістай гігіены, культуры паводзін за сталом.*

Чалавек і грамадства (4 г)

Сям'я. Сям'я – самае блізкае акружэнне чалавека. Сям'я навучэнца (прозвішчы, імёны, імёны па бацьку членаў сям'і). Сямейныя традыцыі і сумесны адпачынак як спосабы ўмацавання сям'і. Узаемаадносіны ў сям'і і ўзаемадапамога членаў сям'і. Павага да старэйшых у сям'і. Шанаванне продкаў.

Эканоміка сям'і. Бюджэт сям'і, яго складнікі (даходы і расходы сям'і). Азбука эканоміі і беражлівасці ў сям'і.

Правы дзіцяці. Правы і абавязкі дзіцяці. Асноўныя правы дзіцяці (права на жыццё, ахову здароўя, жыллё, адукацыю, абарону ад жорсткасці і гвалту).

Правілы паводзін у грамадскіх месцах. Паважлівыя адносіны да навакольных людзей як паказчык культуры чалавека. Правілы паводзін у музеі, тэатры, бібліятэцы, транспарце, магазіне і да т.п.

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый, мадэляванне сітуацый.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Выкананне правіл паводзін на вуліцы, у грамадскіх месцах.*

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы адрознення аб'ектаў нежывой прыроды і жывых арганізмаў;

прыклады аб'ектаў жывой і нежывой прыроды;

уласцівасці паветра і вады, іх значэнне;

крыніцы забруджвання паветра і вады і меры па іх ахове;

склад глебы;

значэнне глебы, яе галоўную ўласцівасць – урадлівасць;

мерапрыёмствы па павышэнні ўрадлівасці глебы і яе ахове;

разнастайнасць жыццёвых форм раслін (дрэвы, кусты, травяністыя расліны), прыметы іх адрознення;

назвы частак расліны (корань, сцябло, ліст, кветка, плод);

умовы, неабходныя для росту і развіцця раслін;

назвы найбольш распаўсюджаных дзікарослых і культурных дрэў (не менш за 5), кустоў (не менш за 4), травяністых раслін (не менш за 3), лекавых раслін (не менш за 2), атрутных (не менш за 3), дэкаратыўных (не менш за 3);

назвы раслін Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь (не менш за 3);

ядомыя і атрутныя грыбы (не менш за 4);

прыметы адрознення насякомых, рыб, земнаводных (амфібій), паўзуноў (рэптылій), птушак, млекакормячых (звяроў);

групы жывёл паводле спосабу харчавання (раслінаедныя, драпежныя, усёедныя) (не менш за трох прадстаўнікоў кожнай групы);

назвы жывёл (насякомыя, рыбы, земнаводныя, паўзуны, птушкі, звяры) (не менш за трох прадстаўнікоў кожнай групы);

назвы жывёл Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь (не менш за 4);

правілы экалагічна правільных і бяспечных паводзін у прыродзе;

спосабы захавання і ўмацавання здароўя чалавека (асабістая гігіена, рэжым працы і адпачынку, фізкультура);

правілы асабістай гігіены;

правілы гігіены вучэбнай працы; важнасць неабходнасці чаргавання працы і адпачынку ў рэжыме дня вучняў;

правілы здаровага харчавання, культурных і бяспечных паводзін за сталом;

прозвішчы, імёны і імёны па бацьку членаў сям'і;

пра бюджэт сям'і і яго складнікі (даходы і расходы);

правы і абавязкі дзяцей у сям'і;

асноўныя правы дзіцяці (права на жыццё, ахову здароўя, жыллё, адукацыю, абарону ад гвалту);

правілы культурных паводзін у грамадскіх месцах.

Умець:

адрозніваць аб'екты жывой і нежывой прыроды;

прыводзіць прыклады сувязі раслін і жывёл, аб'ектаў жывой і нежывой прыроды;

праводзіць назіранні за аб'ектамі жывой і нежывой прыроды і расказваць пра свае назіранні;

праводзіць простыя доследы пры вывучэнні ўласцівасцей паветра, вады, глебы, частак раслін; выконваць інструкцыі і правілы тэхнікі бяспекі пры правядзенні доследаў;

на аснове доследаў і назіранняў выяўляць умовы, неабходныя для росту і развіцця раслін;

параўноўваць знешні выгляд і характэрныя асаблівасці насякомых, рыб, земнаводных, паўзуноў, птушак, звяроў (млекакормячых);

тлумачыць значэнне некаторых жывёл у прыродзе і жыцці людзей;

тлумачыць неабходнасць выканання правіл прыродаахоўных і бяспечных паводзін;

тлумачыць неабходнасць здаровага ладу жыцця (выканання рэжыму харчавання, асабістай гігіены, правільнага харчавання);

на аснове жыццёвых назіранняў прыводзіць прыклады праявы спачування, дабрыні, справядлівасці і інш.;

выказваць павагу да правоў і абавязкаў грамадзяніна краіны, запісаныя ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

тлумачыць неабходнасць выканання правіл паводзін на вуліцы, у транспарце, іншых грамадскіх месцах;

тлумачыць неабходнасць выканання правіл беражлівых адносін да рэчаў і прадметаў, паважлівага стаўлення да працы дарослых;

знаходзіць патрэбную інфармацыю ў вучэбным тэксце, малюнках, схемах, адказваць на пытанні па змесце прачытанага, пераказваць асобныя часткі тэксту, складаць апавяданне на аснове ілюстрацый; выкарыстоўваць вучэбныя тэксты, схемы, малюнкі, дадатковую навукова-папулярную літаратуру для пошуку неабходнай інфармацыі;

высказываць меркаванні, абмяркоўваць праблемныя пытанні, параўноўваць свае высказыванні з вучэбным тэкстам;

супрацоўнічаць з аднакласнікамі пры выкананні заданняў у парах і групах (уменне дамаўляцца, размяркоўваць працу, атрымліваць агульны вынік, ацэньваць асабісты ўклад).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці для:

выканання правіл прыродаахоўных паводзін (ахова паветра, вады, глебы);

догляду пакаёвых раслін;

догляду хатніх жывёл;

асэнсавання каштоўнасці прыроды, неабходнасці несці адказнасць за яе захаванне; выканання правіл паводзін у прыродзе і ўдзелу ў яе ахове;

свядомага выканання рэжыму дня, практыкаванняў ранішняй гімнастыкі, правіл здаровага харчавання, правіл паводзін падчас яды;

догляду поласці рота, пазногцяў, валасоў; выканання правіл асабістай гігіены;

арыентавання ў навакольным сацыяльным асяроддзі (кватэры, школе, на вуліцы, у горадзе (вёсцы));

эканомных і беражлівых адносін да сямейнага бюджэту;

планавання і кантролю сваіх дзеянняў, выканання правіл паводзін у грамадскіх месцах.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Выяўленчае мастацтва»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Выяўленчае мастацтва» адыгрывае значную ролю ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі. Ён закліканы рашаць задачы, звязаныя з перадачай мастацкіх каштоўнасцей культуры, выпрацаваных чалавецтвам, з мэтай эмацыянальна-чуйнага і

духоўна-маральнага развіцця асобы, фарміравання яе эстэтычнага вопыту і творчага патэнцыялу.

Выяўленчае мастацтва з'яўляецца найважнейшым фактарам пазнання навакольнага свету і феномену чалавека. Пры гэтым узнятыя праблемы падаюцца ў яркай, эмацыянальна афарбаванай форме, ініцыюючы ў адказ эмацыянальнае перажыванне вучняў. У выніку вобразы выяўленчага мастацтва засвойваюцца на эмацыянальным, рацыянальным, інтуітыўным і падсвядомым узроўнях.

Майстэрства выканання і выражаныя індывідуальна-аўтарскія рысы твораў выяўленчага мастацтва з'яўляюцца ўнікальнымі, іх немагчыма паўтарыць. У сувязі з гэтым мастацкая творчасць у сукупнасці з іншымі формамі мастацкай дзейнасці з'яўляецца істотным фактарам выяўлення і зацвярджэння індывідуальнасці вучня, яго здольнасцей, што вядуць да самаідэнтыфікацыі і выпрацоўкі ўласнага погляду на свет. На гэтай аснове вучні вучацца творча пераўтвараць навакольную рэчаіснасць і свой унутраны свет.

У адукацыйным працэсе прадмет «Выяўленчае мастацтва» вылучаецца дамінаваннем мастацка-творчай дзейнасці. У працэсе заняткаў выяўленчым мастацтвам актыўна развіваюцца такія сферы індывідуальнасці вучня, як вобразнае мысленне, фантазія, уяўленне, эмацыянальная сфера, разумовая дзейнасць, інтуіцыя і інш. Фарміруюцца прасторавыя і колеравыя ўяўленні, пачуцці меры, рытму, сіметрыі і асіметрыі, прапорцый, кампазіцыйнай раўнавагі, камбінаторныя і сенсорныя здольнасці.

Зыходзячы са спецыфікі вучэбнага прадмета асноўнай **мэтай** навучання з'яўляецца фарміраванне асноў мастацка-эстэтычнай, духоўна-маральнай культуры вучняў, азнаямленне з нацыянальным і сусветным мастацтвам, развіццё патрэбы ў мастацка-творчай дзейнасці.

Для рэалізацыі дадзенай мэты ставяцца наступныя ***задачы***:

фарміраванне ўяўленняў пра маральна-эстэтычныя каштоўнасці нацыянальнай культурнай спадчыны, выхаванне пачуцця павагі да культурнай спадчыны іншых народаў;

выхаванне эстэтычных адносін да рэчаіснасці, мастацтва, з'яў мастацкай культуры, развіццё эстэтычных пачуццяў і асноў эстэтычнага густу;

развіццё здольнасцей эстэтычнага ўспрымання і ацэнкі твораў мастацтва розных відаў і жанраў;

навучанне асновам выяўленчай граматнасці; удасканаленне практычных уменняў і навыкаў выяўленчай, дэкаратыўна-прыкладной і канструктарска-дызайнерскай дзейнасці, лепкі;

развіццё зрокавага ўспрымання, кампазіцыйнай і каларыстычнай культуры, прасторавага мыслення, уяўлення;

развіццё мастацка-творчых здольнасцей і творчай актыўнасці вучняў.

У вучняў пры вядучай ролі пазнавальнай дзейнасці фарміруюцца элементы уяўленняў, ведаў пра эстэтычныя і мастацкія з'явы. Вопыт назапашаных эмацыянальна-пачуццёвых уражанняў і эстэтычных перажыванняў знаходзіць адлюстраванне ў *мастацка-творчай дзейнасці*, садзейнічае развіццю творчага патэнцыялу, мастацка-творчых здольнасцей. Формай мастацкай творчасці вучняў з'яўляецца сістэма выяўленча-выразных сродкаў пластычных (прасторавых) мастацтваў.

У выніку мастацкай творчасці вучні набываюць навыкі стварэння *мастацкіх вобразаў*. Мастацка-эстэтычныя якасці работ вучняў будуць удасканальвацца ў працэсе авалодання імі ведамі ў сферы таго ці іншага віду мастацтва (графікі, жывапісу, скульптуры, архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну).

Узмацненне практыка-арыентаванай накіраванасці адукацыйнага працэсу абумовіла пераход да кампетэнтнаснага падыходу ў вызначэнні мэт і вынікаў мастацка-эстэтычнай адукацыі.

Рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу ў выкладанні выяўленчага мастацтва мае на ўвазе інтэграцыю ведаў і творчую самарэалізацыю асобы, фарміраванне ў вучняў пачатковых ***ключавых кампетэнцый*** – асобасных, метапрадметных і прадметных.

Да *асобасных кампетэнцый* належаць:

каштоўнасныя адносіны да нацыянальнага мастацтва свайго народа і народаў свету;

мастацка-вобразнае мысленне, назіральнасць і ўяўленне;

наяўнасць эстэтычных інтарэсаў і патрэб, эмацыянальна-каштоўнасных крытэрыяў жыццядзейнасці.

Метапрадметнымі кампетэнцыямі, якія фарміруюцца пры вывучэнні выяўленчага мастацтва, з'яўляюцца:

валоданне ўменнем «творчага бачання»;

уменне рацыянальна арганізоўваць працэс мастацка-творчай дзейнасці;

імкненне абменьвацца думкамі наконт мастацтва, валоданне культурай сутворчасці.

Прадметнымі (мастацка-эстэтычнымі) кампетэнцыямі (паводле Б.М.Няменскага) выступаюць:

веданне відаў і жанраў пластычных мастацтваў, асаблівасцей відаў мастацкай дзейнасці (адлюстраванне, канструяванне, дэкарыраванне (упрыгажэнне));

разуменне мастацка-вобразнай прыроды мастацтва;

здольнасць эстэтычна ўспрымаць, эмацыянальна ацэньваць і аналізаваць (з пасільным прымяненнем мастацтвазнаўчай тэрміналогіі) творы мастацтва, аб'екты і з'явы прыроды;

прымяненне спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў у працэсе адлюстравання аб'ектаў, канструявання вырабаў з паперы, лепкі з пластыліну, гліны, салёнага цеста, стварэння вобразаў у розных мастацкіх тэхніках (аплікацыя, мазаіка, калаж, выцінанка і інш.).

Асноўныя раздзелы вучэбнай праграмы:

«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і мастацтва» (уключае два падраздзелы: *«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці»*, *«Успрыманне твораў мастацтва»*);

«Практычная мастацка-творчая дзейнасць» (уключае чатыры падраздзелы: *«Засваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік», «Выява на плоскасці», «Лепка», «Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн»)*.

«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці» як састаўная частка мастацкай дзейнасці мае ў праграме параўнальна самастойную сістэму вучэбных задач па фарміраванні эстэтычнай свядомасці і эстэтычных пачуццяў вучняў.

Асаблівая ўвага надаецца сферы эстэтычных і этычных каштоўнасцей нацыянальнай культуры, духоўна-эстэтычнага ўдасканалення чалавека, эстэтычнага асваення прыроднага свету і свету «другой прыроды» – архітэктурнага і прадметнага асяроддзя пражывання чалавека.

Задачай дадзенага зместавага кампанента праграмы з'яўляецца развіццё ў вучняў назіральнасці, візуальнага ўспрымання формы і колеру прадметаў, уменне вызначаць адценні колеру аб'ектаў прыроды.

З мэтай сістэматычнага развіцця ў вучняў свядомага падыходу да ўспрымання эстэтычнага ў навакольнай рэчаіснасці змест дадзенага раздзела ў структуры праграмы ад класа да класа паступова пашыраецца. Значнае месца павінна быць адведзена відэаэкскурсіям у прыроду, разгляду і аналізу фотаздымкаў пейзажаў, архітэктурных збудаванняў, машын, адзення, мэблі – усяго, што можа садзейнічаць развіццю эстэтычнай чуйнасці, назапашванню зрокавых уражанняў, развіццю здольнасці заўважаць прыгожае і асаблівае ў прывычным асяроддзі.

Зместавы кампанент ***«Успрыманне твораў мастацтва»*** садзейнічае засваенню прадмета на мастацтвазнаўчым узроўні. Яго задачай з'яўляецца фарміраванне ключавых арыенціраў успрымання твораў выяўленчага мастацтва, пашырэнне мастацкага кругагляду вучняў, вывучэнне тэарэтычных асноў выяўленчага мастацтва, засваенне яго мовы, сістэмы сродкаў выразнасці.

У выніку засваення зместу дадзенага падраздзела праграмы вучні атрымліваюць уяўленне пра ролю мастацтва ў жыцці чалавека і грамадства, пра асновы нацыянальнага і сусветнага мастацтва, асаблівасці розных відаў і жанраў выяўленчага мастацтва, іх узаемасувязі.

Пры засваенні вучнямі твораў айчыннай мастацкай спадчыны выхоўваецца любоў да роднай культуры, адчування яе нацыянальнай самабытнасці, імкненне працягваць мастацкія традыцыі. Асаблівая ўвага надаецца знаёмству з творчасцю прафесійных і народных майстроў, мясцовымі мастацкімі шэдэўрамі. Вывучэнне помнікаў архітэктуры і выяўленчага мастацтва, мастацкіх промыслаў і рамёстваў свайго рэгіёна не толькі садзейнічае далучэнню вучняў да творчасці на аснове мясцовых традыцый, але і прывівае любоў да роднага краю, павагу да людзей, якія жывуць побач, фарміруе жаданне берагчы і прымнажаць мастацкі набытак сваёй вёскі ці горада і да т.п.

Пры азнаямленні вучняў з падраздзелам праграмы «Успрыманне твораў мастацтва» вельмі важным з'яўляецца развіццё навыкаў успрымання і аналізу твораў айчыннага і сусветнага мастацтва, фарміраванне ведаў і ўяўленняў пра творчасць мастакоў. Развіваюцца здольнасці вучняў суперажываць і эмацыянальна адгукацца на твор выяўленчага мастацтва, яго змест, уменне выказваць да яго свае адносіны. Вучні атрымліваюць навыкі ўспрымання твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, раскрываюць яго змест на аснове засвоеных паняццяў і тэрмінаў, адзначаюць даступныя іх разуменню мастацкія сродкі і раскрываюць іх ролю ў стварэнні мастацкага вобраза.

Пералік мастацкіх твораў, прапанаваных у праграме, з'яўляецца прыкладным. У некаторых выпадках настаўніку рэкамендуецца самастойна выбраць творы для азнаямлення вучняў (падбор наглядна-дыдактычнага матэрыялу павінен ажыццяўляцца ў адпаведнасці з тэматыкай раздзела, узроставымі асаблівасцямі вучняў). Прыярытэтнае значэнне мае азнаямленне навучэнцаў з творамі беларускай мастацкай спадчыны.

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва (праз дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый) павінна ажыццяўляцца на кожным занятку, акрамя тых урокаў, якія адводзяцца на вывучэнне асноў выяўленчай граматы. Успрыманне аб'ектаў, з'яў рэчаіснасці і твораў мастацтва, іх шматаспектны аналіз папярэднічаюць выкананню практычнай работы: у пачатку заняткаў плануецца гутарка (мультымедыйная прэзентацыя), наступная яго частка – практычная рэалізацыя тэмы (праца над творчай кампазіцыяй, лепка, дэкарыраванне вырабаў (эскіз роспісу, упрыгожванне адзення і да т.п.)).

Колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне зместу раздзела «**Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва**», размяркоўваецца на працягу ўсяго навучальнага года, у суме складае 4 гадзіны.

Па раздзеле праграмы «**Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва**» можна прадугледзець наступныя віды дзейнасці:

параўнанне формы і афарбоўкі аб'ектаў прыроды;

слоўная замалёўка асаблівасцей дзённага і вячэрняга асвятлення, параўнанне афарбоўкі прадметаў пры халодным і цёплым дзённым асвятленні;

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага паведамлення «Прыгажасць аб'ектаў і з'яў прыроды»;

ўспрыманне і абмеркаванне мастацкіх твораў па тэмах, рэкамендаваных у раздзеле праграмы;

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага паведамлення «Віды і жанры выяўленчага мастацтва», «Сродкі выразнасці жывапісу», «Сродкі выразнасці графікі», «Сродкі выразнасці скульптуры» і інш.

Акрамя гэтага на ўроку могуць быць арганізаваны:

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага сачынення «Прыгожае ў прыродзе і жыцці», «Які колер снегу», «Які колер у восені» і інш.;

конкурс на лепшае чытанне верша аб прыгажосці пораў года, прыродных з'яў і інш.;

відэаэкскурсіі па залах краязнаўчых і мастацкіх музеяў.

У аснову зместавага кампанента ***«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»*** пакладзены прынцып сістэматычнага развіцця ў вучняў уменняў мастацкага мадэлявання свету. У працэсе засваення зместу дадзенага раздзела на мастацка-творчым узроўні набываецца вопыт творчай дзейнасці, развіваюцца мастацкія здольнасці вучняў у галіне

колера- і формаўтварэння, асвойваюцца прасторавыя з'явы, фарміруюцца навыкі лепкі, дэкаратыўна-прыкладной дзейнасці, мастацкага канструявання (дызайну).

На занятках па выяўленчым мастацтве вучні малююць і лепяць з натуры, па памяці, па ўяўленні, займаюцца канструяваннем, выконваюць работы ў розных мастацкіх тэхніках.

Працэс практычнай мастацка-творчай дзейнасці патрабуе стварэння ўмоў для праявы ў вучняў пачуцця радасці ад вынікаў мастацкай працы, упэўненасці ў сваіх сілах, актыўнасці ў выбары мастацкіх сродкаў, тэхнікі і матэрыялу пры выкананні вучэбных і творчых заданняў (кампазіцый), фарміравання ўменняў самастойна выбіраць сюжэт і ўвасабляць творчую задуму на практыцы.

Змест раздзела «Практычная мастацка-творчая дзейнасць» уключае:

засваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік;

выяву на плоскасці;

лепку;

дэкаратыўна-прыкладную дзейнасць і дызайн.

Засваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік прадугледжвае азнаямленне з асаблівасцямі, тэхнічнымі прыёмамі і спосабамі працы з рознымі выяўленчымі матэрыяламі ў розных мастацкіх тэхніках. Вялікае значэнне мае наглядны паказ (дэманстрацыя) настаўнікам прыёмаў працы з матэрыяламі і інструментамі.

Выява на плоскасці ўключае маляванне з натуры, па памяці, па ўяўленні пасля непасрэдных назіранняў або па ўяўленні, выкананне сюжэтна-тэматычных кампазіцый, а таксама выкананне накідаў.

Змест практычнай дзейнасці падраздзела мае на ўвазе рашэнне чатырох асноўных груп вучэбных задач:

1) кампазіцыя;

2) форма, прапорцыі, канструкцыя;

3) колер і асвятленне;

4) прастора і аб'ём.

Засваенне дадзеных груп вучэбных задач, якія ляжаць у аснове выяўленчай граматнасці, павінна быць падпарадкавана свядомаму вырашэнню мастацкага вобраза ў адпаведнасці з узроставымі магчымасцямі вучняў.

Галоўнае ў рабоце па **кампазіцыі** – асваенне ўсёй паверхні аркуша паперы і запаўненне яго выявай, а ў лепцы і дэкаратыўнай рабоце – стварэнне цэласнай формы. Вучні вучацца адбіраць для кампазіцыі аб'екты адлюстравання, адпаведныя задуме, і маляваць іх буйна.

У рабоце над **формай** важна вучыць адчуваць вобразны характар формы, імкнуцца да паслядоўнага вобразнага ўскладнення пры яе адлюстраванні. Мадэляванне формы і аб'ёму ажыццяўляецца тонам і колерам. Для выпрацоўкі навыкаў аналізу формы і яе ўвасаблення ў мастацкім вобразе вялікае значэнне маюць заняткі лепкай, дэкаратыўна-прыкладной дзейнасцю, канструяваннем, дзе вучні актыўна працуюць з аб'ёмнай формай.

Асаблівая ўвага надаецца рэалістычнай перадачы **прапорцый** і **канструкцыі** прадметаў, што адлюстроўваюцца.

Пры працы з **колерам** ставіцца задача бачыць колер шматвобразна, адрозніваць і складаць патрэбныя адценні шляхам змешвання фарбаў. Аднак навучанне асновам колеразнаўства мае сваёй мэтай каларыстычнае рашэнне таго ці іншага мастацкага вобраза ў практычнай творчай дзейнасці.

Навучанне перадачы **прасторы** на паперы пачынаецца ў асноўным у працы па назіранні і на зададзеныя тэмы. Галоўная ўвага надаецца фарміраванню паняццяў у вучняў пра злом плоскасцей і мяжу злому (мяжа падлогі і сцяны, бачная мяжа зямлі і неба) і ўменню правільна размяшчаць прадметы на паверхні падлогі або зямлі.

Лепка прадугледжвае азнаямленне вучняў з прыёмамі і спосабамі лепкі, лепку рэльефу і аб'ёмных форм.

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн прадугледжваюць азнаямленне з прыёмамі дэкаратыўнага абагульнення форм і колеру прадметаў (аб'ектаў), відамі

арнаменту, асноўнымі кампазіцыйнымі схемамі твораў дэкаратыўна-прыкладнога характару, выкананне кампазіцый з прыроднага матэрыялу (лісце, кветкі, травы і да т. п.), у тэхніцы «аплікацыя», «манатыпія», «трафарэт», выкананне рэльефных кампазіцый з паперы, канструяванне аб'ёмных цацак на аснове разгортак геаметрычных цел і інш.

Спалучэнне выяўленчай дзейнасці з аб'ёмна-прасторавымі відамі работ (лепкай, канструяваннем, мадэляваннем), камбінаванне тэарэтычнага вывучэння асноў выяўленчай граматы з аналізам формы, прапорцый і канструкцыі прадмета, прымяненне і чаргаванне матэрыялаў і мастацкіх тэхнік (гуаш, акварэль, каляровая крэйда, туш, пластылін, гліна, аплікацыя, выцінанка, манатыпія і інш.) дазволяць вучням атрымаць уяўленне пра разнастайнасць сродкаў для стварэння мастацкага вобраза і будзе спрыяць свядомаму выбару матэрыялу ў залежнасці ад зместу і задумы работы.

Настаўнік мае магчымасць выбару выяўленчых матэрыялаў для выканання вучнямі творчага задання з улікам іх пажаданняў і ўзроставых асаблівасцей.

З мэтай індывідуалізацыі мастацка-творчага працэсу, максімальнага ўліку інтарэсаў і запатрабаванняў вучняў у праграме прадугледжана некалькі тэм для асваення канкрэтнай вучэбнай выяўленчай задачы. Тэмы з'яўляюцца прыкладнымі, настаўнік можа карэкціраваць іх па ўласным меркаванні. У асобных выпадках дапускаецца свабодны выбар вучнямі тэхнікі выканання кампазіцыі, калі гэта не перашкаджае пастаўленай вучэбнай задачы. Для пашырэння ўяўленняў навучэнцаў пра спецыфіку стварэння мастацкага вобраза і ажыццяўлення аналізу вучэбных дасягненняў вучняў у розных відах творчай дзейнасці некаторыя тэмы паўтараюцца ў розных класах.

Практычная мастацка-творчая дзейнасць узаемазвязана з успрыманнем і аналізам твораў мастацтва, назіраннямі вучняў за аб'ектамі і з'явамі прыроды (праз экскурсіі і дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый, рэпрадукцый мастацкіх твораў і фотаздымкаў). Накіды і замалёўкі, выкананыя падчас экскурсій у прыроду і прагляду мультымедыйных прэзентацый, могуць служыць асновай для вырашэння мастацкага вобраза пры стварэнні вучнямі сваіх кампазіцый.

Колькасць гадзін, адведзеных на вывучэнне зместу раздзела «**Практычная мастацка-творчая дзейнасць**», размяркоўваецца на працягу ўсяго вучэбнага года, у агульнай колькасці складае 30 вучэбных гадзін.

У раздзеле праграмы ***«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»*** можна прадугледзець наступныя віды дзейнасці:

параўнанне формы, прапорцый і канструкцыі аб'ектаў, што адлюстроўваюцца;

параўнанне кампазіцыйннага вырашэння мастацкіх твораў, вычляненне асаблівасцей прасторавага размяшчэння адлюстраваных аб'ектаў;

параўнанне каларыстычнага рашэння мастацкіх твораў, вычляненне асаблівасцей мадэліроўкі аб'ёму адлюстраваных аб'ектаў, перадачы стану і настрою прыроды і да т. п.;

параўнанне пластычнага рашэння вобразаў мастацкіх твораў розных відаў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

практычнае выкананне мастацка-творчых работ па тэмах, рэкамендаваных у раздзеле праграмы.

Акрамя гэтага на ўроку могуць быць арганізаваны:

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага сачынення «Асаблівасці перадачы аб'ёму прадметаў побыту», «Асаблівасці стылізацыі раслінных і жывёльных форм», «Асаблівасці канструявання аб'ёмнай цацкі на аснове разгорткі конуса (цыліндра, куба)» і інш.;

конкурс на лепшую творчую кампазіцію, выраб, падзелку і інш. (праводзіцца ў рамках міні-выстаўкі пры арганізацыі аналізу выкананых на ўроку работ і падвядзення вынікаў урока).

На адным уроку для рэалізацыі мэты і задач вучэбнага прадмета «Выяўленчае мастацтва» варта аб'ядноўваць вучэбны змест двух раздзелаў праграмы.

Праграмай рэкамендуецца наступнае размеркаванне часу па раздзелах і відах дзейнасці (педагог мае права на перараз меркаванне гадзін паміж падраздзеламі).

Размеркаванне вучэбных гадзін па раздзелах праграмы і відах дзейнасці

Раздзел праграмы	Віды дзейнасці	Колькасць гадзін
Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва	Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці	2
	Успрыманне твораў мастацтва	2
Практычная мастацка-творчая дзейнасць	Засваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік	3
	Адлюстраванне на плоскасці	15
	Вучэбныя задачы: – кампазіцыя; – прастора; – форма, прапорцыі, канструкцыя; – колер	 (3) (3) (3) (6)
	Лепка	5
	Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн	7
Усяго		**34**

Метады і формы работы з вучнямі разнастайныя: аповед, гутарка, дыскусія, выкарыстанне ілюстрацый і дэманстрацый, прагляд мультымедыйных прэзентацый і аналіз прадстаўленага матэрыялу, самастойная работа з падручнікам, выкананне трэніровачных практыкаванняў, выкананне мастацка-творчых практычных работ і інш.; правядзенне заняткаў, пабудаваных па законах мастацкай драматургіі, майстар-класаў; выкарыстанне нестандартных форм правядзення ўрокаў: урок-даследаванне, урок-практыкум, урок-падарожжа, урок-экскурсія, урок-гульня, урок-казка, інтэграваны ўрок і інш.; арганізацыя вучэбных экскурсій у музеі, на выстаўкі, па горадзе, сустрэчы і гутаркі з мастакамі і інш.

Зместам вучэбнай праграмы не прадугледжваецца выкананне практычнай работы ў якасці дамашняга задання. Да наступнага ўрока (на працягу тыдня) вучні павінны нарыхтаваць падсобны матэрыял, паназіраць за пэўнымі аб'ектамі або з'явамі прыроды, наведаць разам з бацькамі (аднакласнікамі) мастацкі музей ці мастацкую выстаўку і г. д. Па жаданні вучні могуць падабраць рэпрадукцыі карцін або літаратурны матэрыял, падрыхтаваць паведамленне пра гісторыю стварэння шэдэўра мастацтва або творчасць мастака, выканаць замалёўкі і накіды з архітэктурнага ці скульптурнага помніка (іх асноўнай мэтай з'яўляецца арыентацыя вучняў на эстэтычнае асваенне навакольнага свету: прыродных, культурных, архітэктурных помнікаў свайго горада або вёскі і да т.п.). Любога роду пазаўрочную выяўленчую дзейнасць вучняў настаўніку неабходна ўхваляць.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (34 г)

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва (4 г)

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці (2 г)

Эстэтычнае ўспрыманне навакольнага свету. Прыгажосць прыроды ў розныя поры года (экскурсіі, мультымедыйныя прэзентацыі).

Форма і колеравыя спалучэнні ў афарбоўцы аб'ектаў прыроды: лісце, кветкі, дрэвы, насякомыя і пад.

Успрыманне твораў мастацтва (2 г)

Віды і жанры выяўленчага мастацтва: жывапіс, графіка, скульптура; пейзаж, нацюрморт, партрэт; анімалістычны, побытавы, былінна-казачны жанры (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Архітэктурныя помнікі Беларусі (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Казачныя вобразы ў творчасці мастакоў (В.Васняцоў, І Білібін, М.Урубель, М.Селяшчук, Н.Паплаўская, Е. Лось, В.Славук і інш.).

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Сувязь дэкору з формай і прызначэннем прадмета (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Практычная мастацка-творчая дзейнасць (30 г)

Засваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік (3 г)

Прыёмы і спосабы працы графічнымі матэрыяламі (графітны аловак, туш, фламастары).

Прыёмы і спосабы працы акварэллю.

Асаблівасці выканання кампазіцый у тэхніцы «гуаш». Прыёмы і спосабы выканання вырабаў у тэхніцы «папяровая пластыка». Спосабы афарбоўкі паперы. Прыёмы трансфармацыі паперы: змінанне, згінанне, складванне, гафрыраванне, выгінанне, скручванне.

Асаблівасці выканання кампазіцый у тэхніцы «аплікацыя».

Асаблівасці выканання кампазіцый у тэхніцы «фларыстыка».

Адлюстраванне на плоскасці (15 г)

Кампазіцыя (3 г)

Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад зместу кампазіцыі, памераў аб'ектаў, што адлюстроўваюцца, пластычнага вырашэння вобразаў. Гарманічнае запаўненне паверхні аркуша паперы выявамі; вылучэнне кампазіцыйнага цэнтра: цягнік, пад'ёмны кран, жырафа, кракадзіл, вавёрка, вожык (мастацкі матэрыял на выбар настаўніка).

Рытмічная арганізацыя кампазіцыі: «Ляцяць журавы», «Качка з качанятамі» (гуаш).

Прастора (3 г)

Лінейная і святлопаветраная перспектыва. Перадача глыбіні прасторы. Адлюстраванне прадметаў з улікам іх узаемнага размяшчэння ў прасторы (побач, над, пад): «Я з мамай пад парасонам», «Збіраем грыбы (ягады)», «Будуецца новы дом», «Наша вуліца» і інш. (гуаш).

Форма, прапорцыі, канструкцыя (3 г)

Перадача характэрных асаблівасцей формы плоскіх і аб'ёмных прадметаў: шырокі – вузкі, высокі – нізкі. Параўнанне прадметаў па велічыні і форме: «Ліст асіны і вярбы», «Яблыкі і грушы», «Морква і бурак», «Гарбуз і кабачок» (гуаш, акварэль).

Перадача формы, прапорцый і канструкцыі прадметаў (аб'ектаў), што адлюстроўваюцца: «Нацюрморт» (графітны аловак, туш, гелевая ручка).

Колер (6 г)

Ахраматычнія (бясколерныя) і храматычныя (каляровыя) колеры. Асноўныя і састаўныя колеры. Цёплыя і халодныя колеры. Колеравая гама. Выкарыстанне цёплай і халоднай колеравай гамы пры адлюстраванні аб'ектаў прыроды: лісце, кветкі, кусты, дрэвы, матылькі (па памяці і ўяўленні).

Выкарыстанне цёплай і халоднай колеравай гамы пры выкананні ілюстрацый да беларускіх казак: «Каток – залаты лабок», «Залатая яблынька», «Залаты птах», «З рога ўсяго многа», «Мядзведзь» і інш.

Выкарыстанне колеру ў адпаведнасці з эмацыянальным зместам вобразаў (радасны і сумны, спакойны і напружаны): «Самы вясёлы клоўн», «Самотны П'еро», «Пахмурна», «Навальніца набліжаецца», «Сонечны дзянёк».

Лепка (5 г)

Выкананне рэльефу: «Казачны дамок», «Курачка Раба», «Царэўна Лебедзь», «Крошачка-хаўрошачка». Выкарыстанне гравіроўкі пры дэкарыраванні паверхні рэльефу.

Спосабы лепкі: пластычны, канструктыўны, камбінаваны. Выкананне аб'ёмнай скульптурнай выявы: лепка спосабам «выцягванне дэталяў з цэлага кавалка гліны/пластыліну» (пластычны спосаб) – «Качка», «Курачка», «Пеўнік». Лепка спосабам «складанне цэлага з асобных частак» (канструктыўны спосаб) – «Канёк-Гарбунок», «Конік» (паводле народнай цацкі). Лепка камбінаваным спосабам – «Хлопчык (дзяўчынка) з сабачкам», «Дрэсіроўшчык і мядзведзь» і інш.

Суадносіны двух прадметаў па масе і памеры, кампазіцыйная ўзаемасувязь аб'ектаў, што адлюстроўваюцца: «Слон і сланяня», «Собака і шчаня», «Вавёрка з ваверчанятамі», «Кот у ботах і Людаед», «Беласнежка і гномы» і інш.

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн (7 г)

Дэкаратыўнае абагульненне раслінных і жывёльных форм. Выразанне сіметрычных элементаў без папярэдняй прамалёўкі контуру: «Кветкі і матылькі», «Рознакаляровая палянка» і інш. (аплікацыя). Выразанне элементаў з папярэдняй прамалёўкай контуру. Фрыз для ўпрыгожвання класа: «Зімачка», «Вясновыя кветкі» (аплікацыя (калектыўная работа)).

Сувязь упрыгажэння (дэкору) з формай і прызначэннем прадмета. Выкананне эскізу роспісу пано, апрацоўчай дошкі, шкатулкі для рукадзелля.

Асаблівасці стварэння дэкаратыўнай кампазіцыі з прыроднага матэрыялу: «Вясёлыя лесавічкі», «Балотная пачвара», «Лясныя звяркі» (фларыстыка).

Асаблівасці выканання рэльефнай кампазіцыі: «Пунсовая кветачка», «Папараць-кветка», «Новы год у лесе», «У запаведніку» і інш. (папяровая пластыка).

Канструяванне аб'ёмных цацак на аснове разгортак геаметрычных цел: «Дед Мароз», «Снягурка», «Мышка», «Вавёрка» і г.д. (каляровая папера).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць/разумець:

адметныя асаблівасці асноўных відаў мастацтва (графіка, жывапіс, скульптура, архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва);

сродкі мастацкай выразнасці твораў графікі, жывапісу, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

назвы асноўных і састаўных колераў; эмацыянальна-вобразныя магчымасці колеру;

правілы працы з мастацкімі матэрыяламі, інструментамі і прыладамі;

адрозненні гуашавых і акварэльных фарбаў, прыёмы працы з дадзенымі матэрыяламі;

прыёмы лепкі, трансфармацыі паперы, выканання аплікацыі, выцінанкі, манатыпіі і інш.;

адметныя асаблівасці спосабаў лепкі;

асаблівасці кампазіцыйнага размяшчэння аб'ектаў, што адлюстроўваюцца;

законы лінейнай і святлопаветранай перспектывы;

паслядоўнасць выканання жывапіснай, графічнай і скульптурнай (рэльефнай, аб'ёмнай) кампазіцый, аплікацыі, манатыпіі, выцінанкі і інш.;

асноўныя кампазіцыйныя схемы, што выкарыстоўваюцца пры стварэнні вырабаў дэкаратыўна-прыкладнога характару.

Умець:

выбіраць фармат аркуша паперы і яго размяшчэнне ў залежнасці ад зместу кампазіцыі;

поўнасцю выкарыстоўваць паверхню аркуша паперы, адлюстроўваць прадметы суразмерна фармату;

перадаваць характэрныя асаблівасці формы прадметаў, што адлюстроўваюцца;

састаўляць колеры, неабходныя для рэалізацыі творчай задумы;

запаўняць малюнак колерам, не пакідаючы прабелаў паміж фігурамі і фонам;

працаваць з мастацкімі матэрыяламі і прыладамі (гуаш, пластылін, васковая крэйда, туш, каляровая папера, клей, пэндзлі, палачкі);

выбіраць дэкор у адпаведнасці з формай і прызначэннем прадмета;

выбіраць аптымальныя прыёмы трансфармацыі паперы пры канструяванні аб'ёмных цацак;

выбіраць аптымальныя спосабы лепкі;

упрыгожваць плоскія і аб'ёмныя прадметы арнаментам;

выконваць элементарныя правілы культуры працы (арганізацыя і ўборка працоўнага месца, акуратнае і беражлівае стаўленне да мастацкіх матэрыялаў і прылад);

выкарыстоўваць розныя мастацкія тэхнікі для вырашэння творчай задумы;

актыўна ўдзельнічаць у абмеркаванні і ацэнцы работ аднакласнікаў.

Выкарыстоўваць (прымяняць) у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

спецыяльную (мастацтвазнаўчую) тэрміналогію (лексіку);

рацыянальныя прыёмы рэзання паперы;
аптымальныя прыёмы трансфармацыі паперы пры канструяванні аб'ёмных цацак;
аптымальныя спосабы лепкі;
розныя мастацкія тэхнікі для вырашэння творчай задумы.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Музыка»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

МУЗЫКА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Мэта навучання вучэбнаму прадмету «Музыка» – фарміраванне музычнай культуры навучэнцаў як часткі іх духоўнай культуры.

Кампаненты мэты:

адукацыйны – засваенне музычнага мастацтва праз авалоданне музычнымі ведамі; слухацкімі, выканальніцкімі і кампазітарскімі ўменнямі; засваенне мастацкага спосабу пазнання свету;

выхаваўчы – выхаванне любові да музыкі, мастацтва; прысваенне чалавекам, які расце, каштоўнасцей, закладзеных у змесце твораў мастацтва;

развіццёвы – развіццё музычных, камунікатыўных, творчых здольнасцей; развіццё самастойнасці і ініцыятыўнасці ў вырашэнні творчых задач.

Звышзадачай вучэбнага прадмета «Музыка» з'яўляецца выяўленне цеснай сувязі музыкі і жыцця (Д.Б Кабалеўскі). Вырашэнне звышзадачы ажыццяўляецца праз выяўленне жыццёвых вытокаў і жыццёвага зместу музыкі, а таксама праз прымяненне ў рэальным жыцці набытых у працэсе навучання ведаў, уменняў, вопыту музычнай і мастацкай дзейнасці.

Задачы вучэбнага прадмета «Музыка»:

1. Фарміраванне прадметнай (музычнай) кампетэнцыі: выхаванне любові да музыкі, засваенне музычнага мастацтва (авалоданне музычнымі ведамі, слухацкімі, выканальніцкімі і кампазітарскімі ўменнямі), развіццё музычных здольнасцей.

Задача вырашаецца праз:

– фарміраванне ўяўленняў аб музыцы як самакаштоўным відзе мастацтва, яе змесце і выразнай мове;

– фарміраванне ўменняў слухаць, выконваць, ствараць музыку;

– развіццё музычных здольнасцей;

– набыццё вопыту ажыццяўлення музычнай дзейнасці.

2. Фарміраванне надпрадметнай (мастацкай) кампетэнцыі: развіццё мастацкага густу, набыццё вопыту самастойнай мастацка-творчай дзейнасці.

Задача вырашаецца праз:

– фарміраванне ўяўленняў аб музыцы як неад'емнай частцы мастацкай культуры, агульнасці зместу розных відаў мастацтва, адрозненнях у іх выразных мовах;

– засваенне мастацкага спосабу пазнання свету;

– развіццё мастацкіх здольнасцей;

– набыццё вопыту мастацка-творчай дзейнасці.

3. Фарміраванне метапрадметнай кампетэнцыі: развіццё камунікатыўных, творчых, аналітычных здольнасцей; уменняў вырашаць праблемы, несці адказнасць за вынікі індывідуальнай і калектыўнай работы.

Задача вырашаецца праз:

– фарміраванне ўяўленняў аб цеснай сувязі музыкі (мастацтва) з жыццём;

– набыццё вопыту вырашэння жыццёвых задач у працэсе мастацкай дзейнасці (у індывідуальнай, групавой і калектыўнай формах);

– развіццё камунікатыўных і творчых уменняў;

– набыццё вопыту змястоўнай ацэнкі вучэбнай (музычнай) дзейнасці.

Спецыфіка вучэбнага прадмета «Музыка» праяўляецца ў адначасовым вырашэнні ўсяго комплексу задач у працэсе навучання.

Прынцыпы навучання і адбору зместу

Навучанне вучэбнаму прадмету «Музыка» ажыццяўляецца на аснове наступных прынцыпаў:

– *Прынцыпу цэласнасці*, у адпаведнасці з якім музыка ў працэсе навучання разглядаецца ў адзінстве яе складнікаў: зместу, формы, жанравай асновы і выразнай мовы. Прынцып цэласнасці рэалізуецца праз тэматычную пабудову зместу вучэбнага прадмета. Усе тэмы аб'яднаны інтанацыйнай прыродай музыкі; у кожнай з іх інтанацыя выяўляе адно або некалькі сваіх значэнняў.

– *Прынцыпу полімастацкасці*, які дазваляе выйсці за межы прадметнага зместу і разгледзець музыку ў якасці аднаго з праяўленняў мастацкай культуры і ва ўсім багацці яе ўзаемасувязей з іншымі відамі мастацтва. У працэсе навучання акцэнтуецца ўвага на функцыях музыкі, якія з'яўляюцца агульнымі для мастацтва і мастацкай дзейнасці ў цэлым. Прынцып прадугледжвае пашырэнне і паглыбленне зместу навучання і выхавання за кошт узаемадзеяння і ўзаемаўзбагачэння розных відаў мастацтва. Узаемадзеянне мастацтваў выстройваецца вакол агульнага сэнсавага стрыжня, у якасці якога выступае тэматызм, што структуруе змест вучэбнага прадмета.

– *Прынцыпу сувязі з жыццём*, у адпаведнасці з якім успрыманне музыкі (мастацтва) разглядаецца ў якасці мастацка-вобразнага аналага жыцця, а музычная творчая дзейнасць – у якасці працэсу мадэліравання вырашэння жыццёвых праблем. Сацыякультурны кантэкст узнікнення і існавання музычнага мастацтва становіцца неад'емнай часткай зместу вучэбнага прадмета; веды і ўменні з'яўляюцца сродкам пранікнення навучэнцаў у свет музыкі, а праз яго – у разнастайныя праблемы жыцця. Прынцып сувязі з жыццём выступае ў якасці звышзадачы і генеральнай лініі навучання вучэбнаму прадмету.

Адбор зместу навучання вучэбнаму прадмету «Музыка» ажыццяўляецца ў апоры на прынцыпы мастацкай дыдактыкі – прынцыпы мастацкасці, вобразнасці, асацыятыўнасці, інтанацыйнасці і імправізацыйнасці.

Раздзелы, якія вывучаюцца

1 клас: «Свет гукаў», «Як расказвае музыка», «З чаго вырасла музыка», «Пра што расказвае музыка».

2 клас: «Сродкі музычнай выразнасці», «Падарожжа ў музычныя краіны – Оперу, Балет, Сімфонію, Канцэрт».

3 клас: «Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы», «Інтанацыя», «Развіццё музыкі», «Будова (формы) музыкі».

Асаблівасці арганізацыі навучання

Навучанне вучэбнаму прадмету «Музыка» ажыццяўляецца праз выкарыстанне метадаў праблематызацыі і мадэліравання мастацка-творчага працэсу (Л.В.Шкаляр).

Праблематызацыя зместу вучэбнага прадмета забяспечвае разгляд музычных твораў у якасці адказаў на жыццёвыя пытанні, пададзеныя ў эмацыянальна-вобразнай форме. Выкарыстанне метаду прадугледжвае даследаванне працэсу паходжання музыкі, прасочванне працэсу ўзнікнення з'яў і абазначэння паняццяў. Метад дазваляе ператварыць урок музыкі ў жывы даследчы працэс, падвесці навучэнцаў да разумення заканамернасцей

музычнай мовы як сістэмы мастацкіх сімвалаў, музычнай формы як асаблівай арганізацыі гэтых сімвалаў.

Метад мадэліравання мастацка-творчага працэсу накіраваны на ўзнаўленне працэсуальнасці музычных з'яў, забяспечвае дзейнаснае спасціжэнне музычнага мастацтва. На аснове пранікнення ў сутнасць мастацтва і яго заканамернасці аднаўляецца сам працэс паходжання мастацтва. Метад мадэліравання мастацка-творчага працэсу перамяшчае акцэнты з вывучэння вучэбнага матэрыялу на творчыя праяўленні навучэнцаў, дазваляе ім самастойна даследаваць працэсы музычнай творчасці на аснове рэфлексіі дзейнасці кампазітара, выканаўцы, слухача.

У рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу метады праблематызацыі і мадэліравання мастацка-творчага працэсу спалучаюцца з праектнымі формамі і метадамі работы.

Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу з'яўляюцца вучэбныя заняткі. Прытрымліванне прынцыпу «навучанне мастацтву ў формах самога мастацтва» вызначае прыярытэт арганізацыйных форм, якія адпавядаюць прыродзе мастацтва (урок-канцэрт, урок-гульня, урок-майстэрня, урок-тэатралізацыя, урок-кліп і інш.). У рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу шырокае распаўсюджванне атрымліваюць такія формы, як фасілітацыйныя дыскусіі і мастацка-творчыя праекты.

Фасілітацыйныя дыскусіі накіраваны на развіццё самастойнасці навучэнцаў у працэсе засваення вучэбнага матэрыялу, садзейнічаюць развіццю крытычнага мыслення, даследчыцкіх і камунікатыўных уменняў. Мастацка-творчыя праекты прадугледжваюць самастойнае вырашэнне навучэнцамі вучэбнай задачы, забяспечваюць развіццё самастойнасці, здольнасці да самаарганізацыі, гатоўнасці да супрацоўніцтва, стваральнай дзейнасці, садзейнічаюць выкарыстанню набытага вопыту для вырашэння жыццёвых праблем.

Змест вучэбнага прадмета (па класах)

Вучэбны прадмет «Музыка» вывучаецца ў колькасці 1 гадзіна на тыдзень. Працэс навучання музыцы раздзелены на этапы, якія адпавядаюць гадам навучання.

Змест вучэбнага прадмета ўключае:

– прадметныя веды і ўменні (у галіне музычнага мастацтва);

– надпрадметныя веды і вядучыя ўменні (у галіне мастацкай культуры);

– метапрадметныя (жыццёвыя) веды і ўменні (знаходзіць рашэнне праблем, браць на сябе адказнасць і інш.).

Прадметныя веды і ўменні забяспечваюць цэласнае спасціжэнне музычнага мастацтва; надпрадметныя веды і вядучыя ўменні – магчымасць арыентавацца ў разнастайнасці праяўленняў мастацкай культуры, актыўнае самавыяўленне ў мастацкай творчасці; метапрадметныя (жыццёвыя) веды і ўменні – эфектыўнае вырашэнне жыццёвых праблем.

Змест вучэбнага прадмета пабудаваны па лінейна-канцэнтрычным прынцыпе. На кожным этапе навучання пашыраюцца і паглыбляюцца ўяўленні навучэнцаў аб змесце, жанравай аснове, формах і выразнай мове музычнага мастацтва, удасканальваюцца ўменні ўспрымання і практычнай музычнай (мастацкай) дзейнасці.

Стрыжнёвай асновай зместу вучэбнага прадмета з'яўляецца тэматызм, у аснове якога ляжыць распрацаваная Д.Б.Кабалеўскім сістэма абагульненых уяўленняў аб музыцы як аб важнай частцы жыцця грамадства і самакаштоўным відзе мастацтва.

Першы год навучання забяспечвае фарміраванне агульнага ўяўлення аб музыцы як аб «мастацтве інтануемага сэнсу» (Б.У.Асаф'еў). У працэсе навучання фарміруюцца першасныя ўяўленні аб выразнасці гукавога аблічча свету, аб жыццёвых вытоках музыкі, яе ўсеабдымным змесце, багатай палітры выразных сродкаў, першасных музычных жанрах. Успрыманне і практычная музычная дзейнасць забяспечваюць засваенне пазіцый кампазітара, выканаўцы, слухача ў цэласнасці музычнай камунікацыі.

Фарміруюцца наступныя элементы кампетэнцый:

веды (на ўзроўні ўяўленняў) аб:

– гукавой палітры навакольнага свету;

– усеабдымным змесце музыкі, яе жыццёвых вытоках;

– пульсацыі як жыццёвай з’яве і яе праяўленні ў музыцы;

– першасных музычных жанрах;

– выразнай мове музычнага мастацтва;

уменні:

– эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

– выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

– актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці.

На ***другім годзе навучання*** ажыццяўляецца канкрэтызацыя ўяўленняў аб выразнай мове музычнага мастацтва. На аснове набытага вопыту практычнай музычнай дзейнасці ўводзяцца тэрміны, якія абазначаюць асноўныя сродкі музычнай выразнасці (рытм, тэмп, тэмбр, лад, рэгістр, дынаміка). Ажыццяўляецца азнаямленне з жанрамі прафесіянальнай музыкі – операй, балетам, сімфоніяй, канцэртам. Фарміруюцца ўяўленні аб інструментах сімфанічнага аркестра.

Фарміруюцца наступныя элементы кампетэнцый:

веды (на ўзроўні ўяўленняў) аб:

– сродках музычнай выразнасці, іх ролі ў «будаўніцтве» гістарычна сфарміраваных музычных форм;

– жанрах прафесіянальнай музыкі (оперы, балеце, сімфоніі, канцэрце);

– інструментах сімфанічнага аркестра;

уменні:

– эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

– выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

– актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці.

Змест ***трэцяга года навучання*** накіраваны на фарміраванне ўяўленняў аб музыцы як частцы мастацкай культуры. Засвойваюцца катэгорыі і паняцці, уласцівыя розным відам мастацтва (форма, інтанацыя, кампазіцыя, рытм і інш.).

Фарміруюцца наступныя элементы кампетэнцый:

веды (на ўзроўні ўяўленняў) аб:

– песеннасці, танцавальнасці, маршавасці;

– інтанацыі і яе розных значэннях;

– крыніцах і спосабах развіцця музыкі;

– музычным формаўтварэнні, разнастайнасці музычных форм;

уменні:

– вызначаць песенную, танцавальную, маршавую аснову музычных твораў;

– ствараць, выконваць, успрымаць інтанацыі рознага характару з выкарыстаннем магчымасцей розных відаў мастацтва;

– назіраць за развіццём музыкі, самастойна ажыццяўляць яе развіццё;

– увасабляць творчую задуму ў музычнай (мастацкай) форме;

– эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

– выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

– актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці.

З мэтай захавання і жывога існавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў кожным класе засвойваецца рамачны змест, што забяспечвае набыццё вопыту каляндарна-абрадавых дзеянняў у адпаведнасці з традыцыямі рэгіёна.

Лінейна-канцэнтрычны прынцып пабудовы зместу вучэбнага прадмета «Музыка» абумоўлівае выкарыстанне наступных **відаў дзейнасці** на працягу ўсяго перыяду навучання: слуханне, спеў, ігра на музычных інструментах, пластычнае інтанаванне, свабоднае дырыжыраванне, стварэнне, імправізацыя, рытмадэкламацыя, тэатралізацыя, слоўнае, графічнае, пластычнае мадэліраванне, іншыя віды мастацкай дзейнасці.

Ацэначная дзейнасць выступае ў якасці сувязнага звяна паміж пазнавальнай і пераўтваральнай дзейнасцю і з прычыны гэтага з’яўляецца неад’емнай часткай мастацкай творчасці. Навучанне вучэбнаму прадмету ў рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу прадугледжвае пашырэнне прасторы ацэначнай дзейнасці за кошт шырокага выкарыстання самаацэнкі і ўзаемаацэнкі.

I паўгоддзе

СРОДКІ МУЗЫЧНАЙ ВЫРАЗНАСЦІ

(16 г)

Прыкладнае планаванне тэмы

Як кампазітары, выканаўцы і слухачы разумеюць адзін аднаго (1 г). Выразная мова музычнага мастацтва. Выкарыстанне выразнай мовы музыкі ў дзейнасці кампазітара, выканаўцы, слухача.

Мелодыя – каралева музыкі (2 г). Роля мелодыі ў музычным творы. Магчымасць выканання мелодыі голасам і на музычных інструментах. Розныя спосабы адлюстравання вышыні і працягласці гукаў. Ноты. Нотны стан. Розныя спосабы фіксацыі (запісу) мелодыі.

Рытм – залаты ключык музыкі (2 г). Пульсацыя ў музыцы. Моцныя і слабыя долі. Рытм як першааснова музычнай мовы. Розныя спосабы запісу рытмічных малюнкаў. Сістэма працягласцей. Рытмасклады. Спосабы запісу і чытання рытмічных малюнкаў. Рытмічны акампанемент.

Лад – гармонія, парадак паміж гукамі (2 г). Лад як сродак музычнай выразнасці. Мажор. Мінор. Роля лада ў стварэнні музычнага вобраза. Абумоўленасць выбару лада зместам музыкі.

Тэмп у жыцці і ў музыцы (2 г). Тэмп як сродак музычнай выразнасці. Роля тэмпу ў стварэнні музычнага вобраза. Абумоўленасць выбару тэмпу зместам музыкі.

Сіла гуку (дынамічныя адценні) (2 г). Дынаміка як сродак музычнай выразнасці. Роля дынамікі ў стварэнні музычнага вобраза. Дынамічныя адценні. Абумоўленасць выбару сілы гуку зместам музыкі.

Рэгістр – краіна гукаў: высокіх, сярэдніх і нізкіх (2 г). Рэгістр як сродак музычнай выразнасці. Роля рэгістра ў стварэнні музычнага вобраза. Абумоўленасць выбару рэгістра зместам музыкі.

Тэмбр – афарбоўка музычных галасоў (2 г). Тэмбр як сродак музычнай выразнасці. Вакальныя і інструментальныя тэмбры. Роля тэмбру ў стварэнні музычнага вобраза. Абумоўленасць выбару тэмбру зместам музыкі.

Падагульняючы ўрок па тэме «Сродкі музычнай выразнасці» (1 г).

Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Муз. Н.Сакалоўскага, сл. М.Клімковіча і У.Карызны.

Беларускія народныя песні «Ляцелі гусёлкі», «Перапёлачка», «Запражыце сівых коней», «Грушка», «Каляда, каляда, дай, баба, пірага», «Ішла Каляда», «Го-го-го, каза», «Люлі, люлі, цэлы дом спіць».

«Песня о Родине». Муз. і сл. С.Галкінай.

«Родны бусел». Муз. С.Галкінай, сл. Н.Галіноўскай.

«Кружева осенние». Муз. і сл. Я.Жабко.

«Звуки музыки». Муз. Р.Роджэрса, рускі тэкст М.Цэйтлінай.

«Куркі». Муз. Л.Шлег, сл. А.Вольскага.

«Белочки». Муз. З.Левінай, сл. Л.Някрасавай.

«Пешки – крепкие орешки». Муз. Г.Струвэ, сл. В.Кручкова.

«Ежики смеются». Муз. В.Дарохіна, сл. К.Чукоўскага.

«Крокодил и Чебурашка». Муз. І.Арсеева.

«Мама». Муз. Ж.Буржаа і Т.Папа, сл. Ю.Энціна.

«Карусель». Муз. Д.Кабалеўскага, сл. І.Рахіла.

«Попутная песня». Муз. М.Глінкі, сл. Н.Кукальніка.

«Веселые путешественники». Муз. М.Старакадамскага, сл. С.Міхалкова.

«Игра в гостей». Муз. Д.Кабалеўскага, сл. І.Рахіла.

«Форель». Муз. Ф.Шуберта, пер. В.Кастамарава.
«Сурок». Муз. Л. ван Бетховена, сл. Н.Райскага.
«Воздушная песня». Муз. М.Старакадамскага, сл. Я.Далматоўскага.
«Малиновка». Муз. Л. ван Бетховена, сл. Г.Бюргера.
«Цымбалісты». Муз. Ю.Семянякі, сл. Э.Агняцвет.
«Музыканты». Муз. А.Рэмізоўскай, сл. Э.Агняцвет.
«Зіма». Муз. І.Лучанка, сл. Я.Коласа.
«Зимушка-зима». Муз. А.Маркелава, сл. Т.Сучковай.
«Песенька Дзеда-барадзеда». Муз. Л.Захлеўнага, сл. А.Вольскага.
«Батлеемска зорка». Муз. і сл. Я.Петрашэвіча.
І.Жыновіч. «Мелодыя».
В.Карэтнікаў. «Маленькі каўбой».
Д.Кабалеўскі. «Зайчык дражніць медзведзяня».
С.Майкапар. «Рэха ў гарах».
Б.Дварыёнас. «Драўляны конік».
В.Салманаў. «Раніца ў лесе», «Вечар».
Э.Грыг. «Танец эльфаў».
С.Пракоф'еў. Сімфанічная казка «Пеця і воўк».
Л. ван Бетховен. «Вясёлая. Сумная».

Спосабы дзейнасці: слуханне музычных твораў з наступным аналізам сродкаў музычнай выразнасці; параўнанне гучання мелодыі, якая выконваецца з акампанементам і без акампанементу; пластычнае інтанаванне мелодый (з узыходным, сыходным, скачкападобным рухам); выкананне рытмічных малюнкаў пры дапамозе гучальных жэстаў і рытмаскладоў; графічнае адлюстраванне рытму на пісьме; запіс нот на нотаносцы; адлюстраванне рытмаформул чацвяртнымі і восьмымі працягласцямі; рытмадэкламацыя вершаваных тэкстаў; выкананне рытмічных партытур з выкарыстаннем «гучальных» жэстаў; агучванне графічных запісаў мелодыі голасам і на гукавышынных музычных інструментах; выкананне рытмічных малюнкаў на фортэ і на піяна (гучальнымі жэстамі, голасам і на інструментах); выкананне рытмічнага акампанементу да песні; перадача асаблівасцей выразнай мовы музычнага твора пры дапамозе колеру, слова, пластыкі; колеравае і пластычнае мадэліраванне гучных і ціхіх гукаў; слуханне музычных твораў у выкананні розных вакальных галасоў, розных інструментаў; слоўнае апісанне гучання інструментаў; суаднясенне тэмбраў музычных інструментаў з канкрэтнымі вобразамі; вызначэнне вакальных і інструментальных тэмбраў у працэсе слухання музыкі; развучванне і выразнае выкананне твораў; выкананне песень з элементамі тэатралізацыі; інструментальная імправізацыя на зададзеную тэму з выкарыстаннем выразных магчымасцей дынамікі, тэмпу, рэгістра; стварэнне мадэлі мелодыі да вершаванага тэксту, аргументаваны адбор сродкаў музычнай выразнасці; стварэнне мелодыі на словы двухрадкоўяў, чатырохрадкоўяў.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Навучэнцы павінны:

мець уяўленні аб:

сродках музычнай выразнасці (мелодыі, рытме, ладзе, тэмпе, дынаміцы, рэгістры, тэмбры);

сістэме працягласцей;

дынамічных адценнях;

умець:

(група прыватных уменняў)

вызначаць сродкі музычнай выразнасці (лад, тэмп, дынаміку, рэгістр, тэмбр) у працэсе слухання музыкі;

свядома выкарыстоўваць сродкі музычнай выразнасці (лад, тэмп, дынаміку, рэгістр, тэмбр) у выканальніцкай дзейнасці;

узнаўляць і запісваць простыя рытмічныя малюнкі;

выконваць песню з рытмічным акампанементам;

самастойна мадэліраваць мастацкі вобраз, выкарыстоўваючы выразныя і выяўленчыя магчымасці мелодыі, рытму, лада, тэмпу, дынамікі, рэгістра, тэмбру;

эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

(група ключавых уменняў)

выкарыстоўваць сродкі музычнага мастацтва для творчага самавыяўлення;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць змястоўную ацэнку вынікам індывідуальнай і калектыўнай мастацкай дзейнасці;

выкарыстоўваць набыты вопыт:

у працэсе аналізу выразнай мовы мастацкіх тэкстаў;

у дамашнім музіцыраванні;

пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых праектаў.

II паўгоддзе
ПАДАРОЖЖА Ў МУЗЫЧНЫЯ КРАІНЫ – ОПЕРУ, БАЛЕТ, СІМФОНІЮ, КАНЦЭРТ
(18 г)

Прыкладнае планаванне тэмы

Песня, танец, марш запрашаюць у падарожжа (1 г). Песня, танец, марш як першасныя жанры музыкі. Выразныя асаблівасці песні, танца, марша.

Інструменты сімфанічнага аркестра (2 г). Сімфанічны аркестр. Групы інструментаў сімфанічнага аркестра. Выразныя магчымасці сімфанічнага аркестра. Роля дырыжора.

Музычнае падарожжа ў краіну Оперу (3 г). Опера. Характэрныя асаблівасці оперы. Оперныя нумары. Песня, танец, марш у оперным спектаклі. Асаблівасці існавання песні, танца, марша ў оперы.

Музычнае падарожжа ў краіну Балет (3 г). Балет. Характэрныя асаблівасці балета. Роля пластычных сродкаў у стварэнні мастацкага вобраза. Танец, марш у балетным спектаклі. Асаблівасці існавання танца, марша ў балеце.

Музычнае падарожжа ў краіну Сімфонію (2 г). Сімфонія. Характэрныя асаблівасці сімфоніі. Асаблівасці існавання песні, танца, марша ў сімфоніі. Магчымасць ператварэння мелодыі песні ў тэму сімфоніі.

Музычнае падарожжа ў краіну Канцэрт (2 г). Канцэрт. Характэрныя асаблівасці канцэрта. Прынцып спаборніцтва ў канцэрце. Роля аркестра і інструмента, які саліруе.

Як сябруюць з музыкай іншыя віды мастацтва (3 г). Узаемасувязь музыкі з іншымі відамі мастацтва. Узаемапранікненне мастацтваў. Мюзікл. Музыка кіно і тэлебачання.

Куды прывялі нас песня, танец, марш (1 г). Опера, балет, сімфонія, канцэрт – жанры прафесіянальнай музыкі.

Падагульняючы ўрок па тэме «Падарожжа ў музычныя краіны – Оперу, Балет, Сімфонію, Канцэрт» (1 г).

Прыкладны музычны матэрыял

Беларускія народныя песні: «Саўка ды Грышка», «Кума мая, кумачка», «Стара бабуленька казліка мела», «Пайшоў Ясь наш на лужок», «Вясна-красна, а зіма хараша», «Чаму табе, Масленка, ды не сем нядзель?», «Вяснянка», «Чырвонае кока», «Ды была ў бабкі курка рабенька», «Памажы, Божа, нам вясну гукаць».

Украінская народная песня «Журавель».

Руская народная песня «Уж как по мосту-мосточку».
«Студзень». Муз. М.Наско, сл. А.Дзеружынскага.
«Шпак». Муз. М.Анцава, сл. Я.Журбы.
«Липка». Муз. М.Красева, сл. П.Варанько, пер. з украінскай С.Маршака.
«Мульцікі-пульцікі». Муз. і сл. Я.Жабко.
«Бу-ра-ти-но!». Муз. А.Рыбнікава, сл. Ю.Энціна (з тэлефільма «Прыгоды Бураціна»).
«Хрыстос Васкрос». Муз. і сл. Л.Кебіч.
«Наша Перамога». Муз. А.Чыркуна, сл. У.Карызны.
«Наш край». Муз. Д.Кабалеўскага, сл. А.Прышэльца.
«Прекрасен мир поющий». Муз. Л.Абелян, сл. В.Сцяпанава.
Аўстрыйская народная песня «Козлік».
«Прынц і Ружа». Муз. М.Сацура, сл. Л.Дранько-Майсюка.
Нямецкая народная песня «Наш оркестр».
Р.Пукст. «Дзіцячы танец і хор», «Піянерская полька» (з оперы «Марынка»).
Я.Глебаў. «Бульба» (з балета «Мара»).
Я.Глебаў. Адажыа з балета «Маленькі прынц».
А.Хадоска. «Бураціна», «Карабас» (з балета «Залаты ключык»).
М.Чуркін. Сімфаньета «Беларускія карцінкі» (фінал).
М.Каваль. Фрагменты з оперы «Воўк і сямёра казлянят» (тэмы Малыша, Балбатушкі, Усёзнайкі, Таптушкі, Бадайкі. Калыханка Мамы-казы, Два хоры казлянят, сцэна «Гульні казлянят і напад Воўка», «Ваяўнічы марш», фінал).
Д.Кабалеўскі. Канцэрт № 3 для фартэпіяна з аркестрам (ч. II).
М.Красеў. Заключны хор з оперы «Муха-цакатуха».
М.Глінка. Марш Чарнамора з оперы «Руслан і Людміла».
М.Рымскі-Корсакаў. «Тры цуды» (з оперы «Казка пра цара Салтана»).
П.Чайкоўскі. Сімфонія № 2 (ч. IV).
П.Чайкоўскі. Хор сялян з оперы «Яўген Анегін».
П.Чайкоўскі. Неапалітанскі танец з балета «Лебядзінае возера».
П.Чайкоўскі. Марш з балета «Шчаўкунчык».
П.Чайкоўскі. «Вальс» (з балета «Спячая прыгажуня»).
А.Глазуноў. Сімфонія № 1 (ч. II).
С.Пракоф'еў. «Вальс», «Поўнач» (з балета «Папялушка»).
Ж.Бізэ. Марш Тарэадора з оперы «Кармэн».
В.А.Моцарт. Кавацiна Фігара з оперы «Вяселле Фігара».

Спосабы дзейнасці: вызначэнне жанравай асновы оперных, балетных нумароў; слуханне і аналіз оперных нумароў у выкананні мужчынскіх і жаночых галасоў; слуханне і выяўленне жанравай асновы фрагментаў сімфоній, канцэртаў; назіранне за «жыццём» народных песень у оперы, сімфоніі, канцэрце; падбор выразных рухаў, якія адпавядаюць характару музыкі; суправаджэнне гучання оперных, балетных нумароў ігрой на дзіцячых музычных інструментах; аналіз оперных, балетных нумароў на прадмет узаемадзеяння ў іх розных відаў мастацтва; слуханне і аналіз музычнай мовы сімфоній, канцэртаў; выяўленне асаблівасцей існавання песні, танца, марша ў сімфоніі, канцэрце; вызначэнне тэмбраў інструментаў сімфанічнага аркестра; характарыстыка тэмбраў музычных інструментаў, якія «ўдзельнічаюць» у стварэнні вобразаў герояў сімфанічнай казкі; вызначэнне тэмбраў інструментаў аркестра народных інструментаў; назіранне за «спаборніцтвам» інструмента, які саліруе, і аркестра ў канцэрце; развучванне і выкананне на музычных інструментах рытмічнай двухгалоснай (трохгалоснай) кампазіцыі з танцавальнай або маршавай жанравай асновай (на выбар настаўніка); выкананне песень з элементамі тэатралізацыі і інструментальным суправаджэннем; мадэліраванне мастацка-творчага працэсу па стварэнні опернага, балетнага спектакля, сімфанічнай казкі на вядомы казачны сюжэт; стварэнне макета дэкарацый для опернага, балетнага спектакля (на выбар навучэнцаў).

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Навучэнцы павінны:

мець уяўленні аб:

жанрах прафесіянальнай музыкі (оперы, балеце, сімфоніі, канцэрце);

групах інструментаў сімфанічнага аркестра;

саставе аркестра народных інструментаў;

умець:

(група прыватных уменняў)

распазнаваць жанры песні, танца, марша ў працэсе ўспрымання фрагментаў з оперы, балета, сімфоніі, канцэрта;

вызначаць па гучанні асобныя інструменты сімфанічнага аркестра;

сачыць за спаборніцтвам інструмента, які саліруе, і аркестра ў канцэрце;

выконваць песні з элементамі тэатралізацыі і інструментальным суправаджэннем;

ствараць мадэль музычнага спектакля на казачны сюжэт;

эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара;

(група ключавых уменняў)

выкарыстоўваць сродкі музычнага мастацтва для творчага самавыяўлення;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць змястоўную ацэнку вынікам індывідуальнай і калектыўнай мастацкай дзейнасці;

выкарыстоўваць набыты вопыт:

у працэсе наведвання музычных спектакляў і канцэртаў;

у дамашняй мастацкай практыцы;

пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых праектаў.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Працоўнае навучанне»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Мэта навучання – фарміраванне асноў тэхналагічнай граматнасці вучняў, якая ўключае кампаненты:

адукацыйны – фарміраванне асноў праектна-канструктарскай, праектна-тэхналагічнай, выканальніцкай і прафарыентацыйнай кампетэнцый;

развіццёвы – садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей, маніпуляцыйных навыкаў, памяці, уважлівасці;

выхаваўчы – спрыяць выхаванню любві да працы і прыроды, павагі да людзей працы і вынікаў іх дзейнасці; адказнасці і добрасумленнасці; акуратнасці і беражлівасці; дысцыплінаванасці, цярпення і настойлівасці ў дасягненні запланаванага выніку; сама- і ўзаемаацэнкі; самастойнасці і ўзаемадапамогі.

Задачы:

у рамках *праектна-канструктарскай* кампетэнцыі:

азнаямленне вучняў з разнастайнымі відамі канструктарскай дакументацыі: схема, эскіз, чарцёж;

фарміраванне вопыту чытання і распрацоўкі найпрасцейшай канструктарскай дакументацыі;

у рамках *праектна-тэхналагічнай* кампетэнцыі:

азнаямленне вучняў з тэхналагічнымі і інструкцыйнымі картамі на выраб, у якіх адлюстроўваецца паслядоўнасць пераўтварэння прадмета працы і інструменты (тэхналагічная карта), што выкарыстоўваюцца, з тлумачэннямі або інструкцыяй па выкананні (інструкцыйная карта);

фарміраванне вопыту чытання тэхналагічнай дакументацыі;

у рамках *выканальніцкай* кампетэнцыі:

фарміраванне прыёмаў і спосабаў выканання тэхналагічных аперацый апрацоўкі паперы, кардону, тэкстыльных, прыродных, падручных матэрыялаў;

фарміраванне вопыту індывідуальнай і калектыўнай працоўнай дзейнасці па стварэнні найпрасцейшых вырабаў з разнастайных матэрыялаў;

у рамках *прафарыентацыйнай* кампетэнцыі:

азнаямленне вучняў са зместам працы работнікаў розных прафесій і прафесійна важнымі якасцямі, неабходнымі для паспяховай працы.

Напрамкі навучання

Прадметы працы – асноўныя матэрыялы: папера, кардон, тэкстыльныя матэрыялы, падручныя (пластмаса, драўніна, метал), прыродныя матэрыялы.

Сродкі працы – інструменты і прылады.

Прадукты (вынікі працы) – сувеніры (цацкі), дэкаратыўныя элементы інтэр'ера, прылады для працы.

Тэхналогія – паслядоўнае пераўтварэнне прадметаў працы з дапамогай сродкаў працы ў прадукты працы, якія маюць кошт і асабістую для вучняў значнасць.

Адукацыйныя падыходы (прадметныя)

Прадметна-тэхналагічны падыход мае на ўвазе навучанне тэхналогіі ў працэсе стварэння канкрэтных вырабаў, ажыццяўлення пэўных відаў працы.

Згодна з дзейнасным падыходам засваенне вучнямі зместу вучэбнага матэрыялу ажыццяўляецца ў працэсе ўласнай актыўнай дзейнасці. Дзейнасць пры гэтым разглядаецца як крыніца фарміравання асобы і галоўны фактар яе развіцця. У працэсе навучання важна актыўнае выкарыстанне разнастайных відаў дзейнасці (пазнавальнай, праектнай, камунікатыўнай, гульнявой).

Згодна з кампетэнтнасным падыходам галоўнае ў працэсе навучання не фарміраванне асобных ведаў і ўменняў, а стварэнне ўмоў для развіцця здольнасці ажыццяўляць прадугледжаныя праграмай віды і спосабы дзейнасці. У змесце вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» вылучаны кампетэнцыі, якія ўяўляюць сабой сукупнасць інфармацыйных адзінак, у тым ліку тэарэтычных звестак, спосабаў дзейнасці, тэхналагічных аперацый і працэсаў, што адлюстроўваюць змест і характар пэўнага віду дзейнасці.

Вучэбная, вучэбна-працоўная, працоўная дзейнасць, маючы практыка-пераўтваральны характар, сама становіцца прадметам асваення. Кампетэнцыі як ўласцівасці індывіда праяўляюцца ў выглядзе ўмеласці, спосабу асобаснай самарэалізацыі, формы праяўлення здольнасцей. Веды, уменні і навыкі робяцца не мэтай, а сродкам развіцця асобы вучня, фарміравання яго кампетэнцый.

Згодна з культуралагічным падыходам працэс навучання павінен быць накіраваны на фарміраванне культуры асобы. Таму асноўнай мэтай вучэбнага прадмета з'яўляецца фарміраванне асноў тэхналагічнай граматнасці асобы. Гэтаму садзейнічае вывучэнне тэхналогіі рамёстваў, рэалізацыя прынцыпу прадукцыйнасці, гэта значыць стварэнне асобасна і грамадска значнага прадукту дзейнасці, фарміраванне культуры працы і міжасобаснага ўзаемадзеяння ў працэсе вучэбна-працоўнай дзейнасці.

Кампетэнцыі і змест, якія забяспечваюць іх фарміраванне

Фарміраванне прадметна-канструктарскай кампетэнцыі забяспечваецца шляхам паслядоўнага ўскладнення канструктарскай дакументацыі (ад простых схем да чарцяжоў разгортак і зборных адзінак); прадметна тэхналагічнай – ад простых схем да інструкцыйна-тэхналагічных карт; выканальніцкай – дзякуючы ўскладненню вырабаў і тэхналагічных аперацый; прафарыентацыйнай – за кошт агульнага ўяўлення аб прафесіях (што робяць, чым працуюць, што ў выніку атрымліваюць, ад чаго залежыць паспяховасць працы).

Прыватнаметадычныя прынцыпы адбору зместу навучання

Прынцып прадукцыйнасці мае на ўвазе стварэнне асобасна і грамадска значнага прадукту дзейнасці, фарміраванне культуры працы і міжасобаснага ўзаемадзеяння ў працэсе вучэбна-працоўнай дзейнасці.

Прынцып пераемнасці мае на ўвазе апору на вопыт вучняў, набыты на папярэдніх этапах навучання. Раздзелы праграмы дашкольнай адукацыі: ручная праца, праца ў прыродзе, самаабслугоўванне і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва атрымліваюць далейшае развіццё пры вывучэнні наступных раздзелаў вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне»: тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў; тэхналогія раслінаводства; тэхналогія гаспадарання; тэхналогія народных рамёстваў.

Прынцып цэласнасці мае на ўвазе ўключэнне вучняў у вучэбна-працоўную дзейнасць па рэалізацыі цэласнай тэхналогіі ад ідэі будучага вырабу да яго стварэння і з'яўлення новай ідэі, новай канструкцыі вырабу і/або тэхналогіі яго стварэння. Пры гэтым прадугледжваецца паслядоўнае ўскладненне канструкцыйных і тэхналагічных асаблівасцей вырабаў.

Прынцып варыятыўнасці азначае разнастайныя варыянты адукацыйнага працэсу, якія дазваляюць дасягнуць мэт і задач працоўнага навучання ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту. Зыходзячы з патрэб, магчымасцей, здольнасцей вучняў, запатрабаванняў бацькоў, магчымасцей матэрыяльна-тэхнічнай базы, асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага і сацыякультурнага акружэння, настаўніку даецца магчымасць уносіць карэктывы ў змест навучання.

Прынцып неабходнасці і дастатковасці тэарэтычных звестак для выканання практычных работ. Для разумення і ажыццяўлення тэхналогіі стварэння вырабаў на кожным уроку акцэнтуецца ўвага на канструкцыйных матэрыялах, інструментах і прыстасаваннях, стадыях і этапах тэхналогіі, правілах арганізацыі працоўнага месца і бяспекі працы, крытэрыях і паказчыках ацэнкі якасці вырабу, а таксама самаацэнкі дасягнення асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў вучэбна-працоўнай дзейнасці.

Прынцып інтэграцыі і рэалізацыі міжпрадметных сувязей мае на ўвазе выкарыстанне звестак з іншых вучэбных прадметаў у працэсе пазнавальнай і вучэбна-працоўнай дзейнасці. Адрозніваюць папярэднія, спадарожныя і наступныя міжпрадметныя сувязі. Гэта азначае, што на занятках па працоўным навучанні можна не толькі абапірацца на веды і ўменні, засвоеныя вучнямі на іншых вучэбных прадметах, але і ўпершыню знаёміць з паняццямі, фарміраваць спосабы дзейнасці, якія будуць у далейшым прымяняцца на занятках па іншых вучэбных прадметах.

Раздзелы, што вывучаюцца:

«Тэхналогія і грамадства»;

«Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»;

«Тэхналогія народных рамёстваў»;

«Тэхналогія гаспадарання»;

«Тэхналогія раслінаводства»;

«Я і свет тэхналогій».

Дадатковая інфармацыя (асаблівасці арганізацыі навучання прадмету)

Раздзел ***«Тэхналогія і грамадства»*** дазваляе навучэнцам усвядоміць узаемаўплыў тэхналогіі і грамадства (вытворчасці); актуалізаваць вопыт, набыты ва ўстановах дошкольнай адукацыі, стварыць арыенціровачную аснову для паспяховага навучання,

пазнаёміцца з правіламі арганізацыі працоўнай дзейнасці і правіламі бяспечнай працы; аналізаваць стадыі (ідэя – вобраз – канструкцыя – паслядоўнасць стварэння – стварэнне – ацэнка – новая ідэя) і этапы тэхналогіі (падрыхтоўчы, асноўны і заключны). Акцэнтуецца ўвага на разнастайнасці матэрыялаў: канструкцыйныя (асноўныя матэрыялы вырабаў (канструкцый)), прыродныя і падручныя матэрыялы, што выкарыстоўваюцца не па прамым прызначэнні.

У рамках раздзела ***«Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»*** прадугледжвае паслядоўнае азнаямленне з рознымі матэрыяламі: папера (I клас), кардон тонкі, аднаслойны (II клас), калька, капіравальная і гафрыраваная папера, паліграфічны і ўпаковачны кардон (III клас); баваўняныя тканіны (I клас), ільняныя (II клас), шарсцяныя (III клас) тканіны, тканіны і тэкстыльныя матэрыялы з сінтэтычных і змешаных валокнаў (IV клас); ніткі для шыцця, вышывання, пляцення; прыродныя матэрыялы: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, плады рабіны, глогу, насенне ясеня, клёна, вольхі (I клас), шкарлупкі лясных і грэцкіх арэхаў, карані дрэў, насенне ліпы, дзядоўнік, пёры (II клас), ракавінкі, каменьчыкі, лупінне яек (III клас), кара дрэў (IV клас); падручныя матэрыялы: шпагат, тонкі шнур, тасьма, вяроўка, саломінкі для кактэйлю (I клас), кардонкі, упакоўкі; пластмасавыя шклянкі, слоічкі (II клас), пластыкавыя флаконы, драўляныя вырабы (палачкі для марожанага, прышчэпкі, дэталі драўлянага канструктара) (III клас), дрот (IV клас), што не толькі забяспечвае магчымасць азнаямлення з шырокім пералікам матэрыялаў, але і садзейнічае развіццю фантазіі, творчай самарэалізацыі вучняў. У кожным наступным класе прадугледжваецца выкарыстанне ў практычнай дзейнасці ўсіх вывучаных раней матэрыялаў.

У практычнай дзейнасці пераважае стварэнне вырабаў па ўзоры (I клас), графічнай выяве (II клас), эскізе і схеме (III клас), уласнай задуме (IV клас). Адначасова адбываецца ўскладненне вырабаў: ад аднадэтальных да шматдэтальных, ад плоскасных да аб'ёмных, ад нераз'ёмных да раз'ёмных; ад статычных да дынамічных.

Раздзел ***«Тэхналогія народных рамёстваў»*** знаёміць з найбольш даступнымі для вучняў кожнага класа рамёствамі: выцінанка (сіметрычная, рапортная і чатырохпрамянёвая разеткавая выцінанка, створаная па ўзоры з разметкай (I клас), сіметрычная, рапортная і васьміпрамянёвая разеткавая выцінанка па ўласнай разметцы (II клас), сіметрычная, рапортная і шасціпрамянёвая разеткавая выцінанка на аснове аналагаў (III клас), камбінаваная выцінанка па ўласнай задуме (IV клас)); фларыстыка (плоскасная аплікацыя ў паласе і квадраце (I клас), стылізацыя выяў жывёл, птушак, насякомых, пейзаж (II клас), стварэнне аб'ёмных кампазіцый (III клас), ікебана (IV клас)); саломапляценне (плоскасныя (II клас) і аб'ёмныя вырабы з трубчастай саломкі (III клас), саламяная скульптура (IV клас)); вязанне кручком (вязанне ланцужка з паветраных петляў, паўслупка, наклейванне ланцужкоў (III клас), вязанне слупка без накіду, стварэнне вырабаў па схеме і слоўным апісанні (IV клас)); вышыўка «крыжыкам» па ўзоры і схеме (IV клас). Арганізуючы заняткі ў рамках дадзенага раздзела, неабходна ўлічваць нацыянальныя і рэгіянальныя асаблівасці сацыякультурнай спадчыны (наяўнасць мастацкіх промыслаў: саломапляценне, інкрустацыя саломкай, ткацтва, вышыўка, роспіс, фларыстыка, кераміка і інш.).

Раздзел ***«Тэхналогія гаспадарання»*** садзейнічае фарміраванню вопыту па самаабслугоўванні: сервіроўка стала для чаю (I клас), догляд адзення і абутку (II клас), дробны рамонт адзення (III клас), дробны рамонт кніг (IV клас), па культуры паводзін у побыце, выхаванні самастойнасці.

Раздзел ***«Тэхналогія раслінаводства»*** пазнаёміць вучняў з прыёмамі і правіламі догляду пакаёвых (I і II клас) і кветкава-дэкаратыўных (III і IV клас) раслін.

Раздзел «***Я і свет тэхналогій***» прызначаны для падвядзення вынікаў навучання за год, аналізу вучэбна-працоўных дасягненняў кожнага вучня, вызначэння ўзроўню асваення вывучаных тэхналогій. У дадзеным раздзеле прадугледжана выкананне калектыўных выніковых заданняў «Танец матылькоў» (I клас), «Луг цвіце» (II клас), «Падводнае царства» (III клас), у рамках якіх кожны вучань стварае выраб на зададзеную тэму. Матэрыялы і тэхналогію вучні выбіраюць самі. У IV класе на выніковых занятках праводзіцца выстаўка-кірмаш вырабаў, створаных вучнямі на ўроках і дома.

Паслядоўнасць вучэбных заняткаў прыведзена ў метадычных рэкамендацыях і каляндарна-тэматычным планаванні. Яна адлюстроўвае падрыхтоўку падарункавых сувеніраў да святаў, цацак да Новага года, магчымасці вучняў па зборы прыроднага матэрыялу, а таксама рэкамендаваную псіхолагамі змену відаў працоўнай дзейнасці.

Ва ўсіх раздзелах уведзена рубрыка «Прафесійная арыентацыя», прызначэнне якой – пазнаёміць вучняў з рознымі прафесіямі, зместам працы па іх (прадмет (аб'ект) працы, сродкі працы, прадукт (вынік) працы, асноўныя віды работ), а таксама патрабаваннямі прафесіі да чалавека, яго асобасных (уласцівасці і якасці асобы) кампетэнцый.

Асноўнымі метадамі працоўнага навучання з'яўляюцца дэманстрацыя, практыкаванні, доследы і назіранні, практычныя работы і метад праектаў, якія рэалізуюцца ў працэсе стварэння вучнямі канкрэтных вырабаў, адпаведных патрабаванням функцыянальнасці і эстэтычнай выразнасці (карысці і прыгажосці). Большая частка вучэбнага часу (не менш за 80 %) адводзіцца практычнай дзейнасці вучняў. На стварэнне вырабу можа адводзіцца 1 або 2 вучэбныя заняткі ў залежнасці ад складанасці канструкцыі і аб'ёму працы, што выконваецца. Настаўнік можа выбраць любыя з вырабаў, прапанаваных у вучэбнай праграме (рубрыка «Прыкладныя вучэбныя заданні»), ці падабраць іншыя, канструкцыя і тэхналогія стварэння якіх адпавядае зместу раздзела, што вывучаецца. Вырабы могуць ствараццца па тэхналагічнай карце, малюнку, уяўленні (на аснове аналагаў), па ўласнай задуме. Настаўнік мае магчымасць выкарыстоўваць каля 30 % вучэбнага часу (на сваё меркаванне) пры ўмове дасягнення патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў, указаных у адукацыйным стандарце па працоўным навучанні і ў вучэбнай праграме.

Прафарыентацыйная накіраванасць працоўнага навучання рэалізуецца праз гутаркі на вучэбных занятках, сустрэчы з людзьмі розных прафесій, экскурсіі.

У праграме вылучаны міжпрадметныя сувязі, якія дапамагаюць рэалізаваць інтэграцыйны характар прадмета «Працоўнае навучанне».

Курсівам з зорачкай пазначаны тэмы, якія з'яўляюцца неабавязковымі для вывучэння і могуць вывучацца па рашэнні настаўніка.

Пісьмовыя кантрольныя работы праграмай не прадугледжаны.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (34 г)

Тэхналогія і грамадства (1 г)

Тэарэтычныя звесткі. Агульнае ўяўленне пра асноўныя этапы тэхналогіі: падрыхтоўчы, асноўны, заключны. Азнаямленне са зместам навучання ў дадзеным годзе.

Знешні выгляд вучня і працоўнае месца. Правілы бяспечнай працы. Прадметы (матэрыялы) і сродкі (інструменты і прылады) працы, якія будуць выкарыстаны ў II класе. Прадукты (вынікі) працы. Асвоеныя ў I класе прыёмы і правілы працы з матэрыяламі. Культура працы.

Прафесійная арыентацыя. Гутарка «Што трэба для поспеху ў працы?». Якасці асобы, якія трэба развіваць у працэсе навучання.

Міжпрадметныя сувязі

Чалавек і свет. Прадметы прыроды і працы чалавека.

Практычная дзейнасць. Распазнаванне матэрыялаў, інструментаў і прылад, якія выкарыстоўваюцца ў II класе. Арганізацыя працоўнага месца. Стварэнне простага вырабу.

Прыкладныя аб'екты працы: папяровая шклянка.

Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў (19 г)

Стварэнне вырабаў з паперы і кардону (9 г)

Тэарэтычныя звесткі. Агульнае ўяўленне пра тонкі аднаслойны кардон, яго ўласцівасці (трываласць, таўшчыня) і прымяненне.

Элементы графічнай граматы: пабудова прамога вугла.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка з дапамогай шаблона, *трафарэта**, лінейкі, вугольніка, згінанне, рэзанне, скручванне, склейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: розныя віды паперы, тонкі аднаслойны кардон.

Інструменты і прылады: нажніцы, аловак, лінейка, вугольнік, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: клей.

Прафесійная арыентацыя. Гутарка «Як кніга да нас прыйшла?». Прафесіі работнікаў, якія ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы і выданні кнігі (падручніка): аўтар, рэдактар, вярстальшчык, карэктар, дызайнер, паліграфіст.

Міжпрадметныя сувязі

Матэматыка. Даўжыня. Адзінка даўжыні – метр. Прамы вугол. Прамавугольнік. Квадрат. Ломаная. Звёны ломанай. Даўжыня ломанай. Перыметр многавугольніка.

Выяўленчае мастацтва. Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы прадметаў, што адлюстроўваюцца, і іх размяшчэння. Рытмічная арганізацыя адлюстравання спосабам паўтору, чаргавання. Дэкаратыўнае абагульненне раслінных і жывёльных форм. Светлыя і цёмныя адценні колеру. Падбор колеру кампазіцыі ў адпаведнасці з эмацыянальным зместам вобразаў. Састаўленне невялікіх скульптурных груп з работ вучняў.

Практычная дзейнасць. Параўнанне ўласцівасцей тонкага кардону і паперы. Аналіз канструкцыі вырабаў. Стварэнне вырабаў па ўзоры, графічнай выяве, *уласнай задуме** з выкарыстаннем тэхналагічных аперацый, што вывучаюцца. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу стварэння.

Прыкладныя вучэбныя заданні

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: «Космас» – канструяванне з палосак паперы; «Марскія глыбіні», «У лесе» – аплікацыя, мазаіка; ёлачныя ўпрыгажэнні – плоскія фігуркі з кардону, канструяванне з палосак паперы; вазачка – модульнае арыгамі.

Цацкі: фігуркі жывёл; дамок – аб'ёмнае канструяванне.

Дыдактычны матэрыял: настольны тэатр, канструктар «Чароўныя палоскі».

Прылады для працы: кардонкі-арыгамі.

Запрашэнні і віншавальныя паштоўкі: «З Днём настаўніка», «З Днём маці» (аплікацыя).

Стварэнне вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў (6 г)

Тэарэтычныя звесткі. Агульнае ўяўленне пра баваўняныя і льняныя тканіны, іх уласцівасці (таўшчыня, шчыльнасць, трываласць, фактура). Лён і бавоўна – сыравіна для вырабу тканін. Ніткі для шыцця, вышывання, пляцення. Колеравыя спалучэнні тканіны і нітак, *нітак паміж сабой**. Дэкаратыўнае афармленне вырабаў. Размяшчэнне ўзору па ўсёй паверхні, па перыметры, уздоўж аднаго, двух бакоў, у кутку.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка па лякале, раскрой, вышыўка швамі «наперад іголку», «наперад іголку з перавівам», пляценне, завязванне вузлоў. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: аднатонная баваўняная і/ці льняная тканіна, ніткі для шыцця, вышывання, пляцення.

Інструменты і прылады: нажніцы, іголка, ніткаўдзявальнік, напарстак, крэйда кравецкая, аловак, лякала, лінейка.

Прафесійная арыентацыя. Швачка.

Міжпрадметныя сувязі

Матэматыка. Прамы вугал. Прамавугольнік. Квадрат. Перыметр многавугольніка. Даўжыня. Развіццё вылічальных і вымяральных навыкаў.

Выяўленчае мастацтва. Сувязь формы і аздаблення прадмета з яго прызначэннем. Светлыя і цёмныя адценні колеру. Колеравыя спалучэнні. Выбар колеру ў залежнасці ад эмацыянальнага зместу.

Чалавек і свет. Значэнне раслін у жыцці людзей. Ахова раслін чалавекам.

Руская мова і літаратурнае чытанне. Развіццё маўлення і ўзбагачэнне слоўнікавага запасу.

Практычная дзейнасць. Параўнанне ўласцівасцей паперы і тканіны. Аналіз формы і канструкцыі вырабу. Стварэнне вырабаў па ўзоры, графічнай выяве, *уласнай задуме**: з выкарыстаннем тэхналагічных аперацый, што вывучаюцца. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу стварэння.

Прыкладныя вучэбныя заданні

Прылады для працы: закладкі, петлі і рамкі для афармлення гатовага вырабу.

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: сурвэтка для снедання.

Дэкаратыўныя элементы адзення: насоўка, шнуры, падвескі, раменьчык, фенечкі.

Цацкі: падзелкі, цацачныя прылады, упрыгожаныя вывучанымі швамі, ніткавая лялька.

Стварэнне вырабаў з прыродных матэрыялаў (2 г)

Тэарэтычныя звесткі. Пашырэнне ўяўленняў аб прыродных матэрыялах. Узаемасувязь, прапарцыянальнасць фігур у кампазіцыі. *Стылізацыя**.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: злучэнне дэталяў з дапамогай пластыліну, клею. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: шышкі, жалуды, каштаны, галінкі, шкарлупкі арэхаў, карані дрэў, пёры і інш.

Інструменты і прылады: стэкі, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: пластылін, клей, папера.

Прафесійная арыентацыя. Ляснік, егер. Беражлівае стаўленне да прыроды.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Дэкаратыўнае абагульненне раслінных і жывёльных форм. Суадносіны двух прадметаў па масе і памеры. Састаўленне невялікіх скульптурных груп з работ вучняў.

Чалавек і свет. Разнастайнасць раслін. Часткі раслін. Значэнне раслін у прыродзе і жыцці людзей. Ахова раслін чалавекам. Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь. Правілы прыродаахоўных паводзін.

Руская мова і літаратурнае чытанне. Развіццё маўлення і ўзбагачэнне слоўнікавага запасу.

Практычная дзейнасць. Стварэнне вырабаў па малюнку, уяўленні, *уласнай задуме**: з выкарыстаннем тэхналагічных аперацый, што вывучаюцца. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу стварэння.

Прыкладныя вучэбныя заданні

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: кампазіцыі на тэмы казак «Ліса і дзяцел», «Тры парасяці», «Калабок».

Цацкі: карабельчыкі, фігуркі жывёл, птушак, людзей.

Стварэнне вырабаў з падручных матэрыялаў (2 г)

Тэарэтычныя звесткі. Картанажныя і пластмасавыя вырабы. Варыянты другаснага выкарыстання.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне, абклейванне, разразанне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: кардонкі; пластмасавыя шклянкі, слоічкі.

Інструменты і прылады: нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: папера, ніткі, папяровы шпагат, шнур, клей, лейкапластыр, двухбаковы скотч.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Сувязь формы і аздаблення прадмета з яго прызначэннем.

Суадносіны двух прадметаў па масе і памеры.

Руская мова і літаратурнае чытанне. Развіццё маўлення і ўзбагачэнне слонікавага запасу.

Практычная дзейнасць. Стварэнне вырабаў па ўзоры, малюнку, *уласнай задуме** з выкарыстаннем тэхналагічных аперацый, што вывучаюцца. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу стварэння.

Прыкладныя вучэбныя заданні

Прылады для працы: падстаўка для алоўкаў, канцылярскіх прылад.

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: вазачкі, шкатулкі, рамкі для пано і фатаграфій.

Цацкі: казачныя персанажы, стылізаваныя фігуркі жывёл.

Тэхналогія народных рамёстваў (9 г)

Выцінанка (3 г)

Тэарэтычныя звесткі. Гістарычныя звесткі пра выцінанку. Спосабы атрымання ўзору. Разеткавыя (васьміпрамянёвыя), сіметрычныя, рапортныя выцінанкі.

Пашырэнне ўяўленняў пра форму, узор, арнамент. Паслядоўнасць аналізу: знешняя форма, элементы арнаменту (геаметрычныя фігуры), кампазіцыя (сіметрыя, рытм). Патрабаванні да ўзораў для выцінанкі.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: складванне, выразанне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: белая і каляровая папера.

Інструменты: аловак, нажніцы.

Прафесійная арыентацыя. Знаёмства з творчасцю беларускіх народных майстроў.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, яго сувязь з прыродай. Дэкаратыўнае абагульненне раслінных і жывёльных форм. Раслінныя матывы ў арнаменце.

Руская мова і літаратурнае чытанне. Развіццё маўлення і ўзбагачэнне слонікавага запасу.

Практычная дзейнасць. Стварэнне вырабаў па гатовай разметцы, *уяўленні**: *распрацоўка** з выкарыстаннем тэхналагічных аперацый, што вывучаюцца. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу стварэння.

Прыкладныя вучэбныя заданні

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: «цуда-сняжынкі», пано, сурвэтка, гірлянда.

Дэкаратыўныя элементы для афармлення вырабаў з паперы, кардону, падручных матэрыялаў.

Запрашэнні, віншавальныя паштоўкі: «З Новым годам», «Запрашаем у госці».

Фларыстыка: аплікацыя з засушаных раслін (3 г)

Тэарэтычныя звесткі. Стылізаванае адлюстраванне жывёл, насякомых, птушак, рыб, пейзажу з матэрыялаў флоры.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка, разразанне, наклейванне, *сушка гатовага вырабу**. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: расліны, засушаныя ў плоскасці.

Інструменты і прылады: аловак, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: папера, клей.

Прафесійная арыентацыя. Фларыст. Гутарка «Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь».

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Выбар становішча аркуша паперы ў залежнасці ад формы прадметаў, што адлюстроўваюцца, і іх размяшчэння; запаўненне плоскасці аркуша буйнымі выявамі. Светлыя і цёмныя адценні колеру. Выбар колеру ў залежнасці ад эмацыянальнага зместу сюжэта, што адлюстроўваецца. Дэкаратыўнае абагульненне форм прадметаў.

Чалавек і свет. Разнастайнасць раслін. Часткі раслін. Значэнне раслін у прыродзе і жыцці людзей. Ахова раслін чалавекам. Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь. Правілы прыродаахоўных паводзін.

Практычная дзейнасць. Стварэнне вырабаў па ўзоры, *уяўленні**: з выкарыстаннем тэхналагічных аперацый, што вывучаюцца. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу стварэння.

Прыкладныя вучэбныя заданні

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: тэматычныя кампазіцыі «Матылёк-прыгажун», «Страказа», «Жар-птушка», «Залатая рыбка», «Восеньскі пейзаж», «Цуда-кветка».

Запрашэнні, паштоўкі: «Любімай мамачцы», «Да пабачэння, восень».

Саломапляценне (дэкаратыўныя элементы) (3 г)

Тэарэтычныя звесткі. Беларускае саломапляценне. Падрыхтоўка саломы да работы. Трубчастая саломка.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: ачыстка, разразанне на часткі, наклейванне на папяровую аснову, перавязванне пучка. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: саломка, трава.

Інструменты: нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: трывалыя ніткі, папера, клей.

Прафесійная арыентацыя. Знаёмства з творчасцю беларускіх народных майстроў.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, яго сувязь з прыродай.

Чалавек і свет. Найбольш распаўсюджаныя культурныя расліны.

Практычная дзейнасць. Стварэнне вырабаў з саламяных трубачак ці травы па ўзоры з выкарыстаннем тэхналагічных аперацый, што вывучаюцца. Ацэнка гатовага вырабу і працэсу стварэння.

Прыкладныя вучэбныя заданні

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: гірлянды, ланцужкі, ліхтарыкі, сонейкі, пано (аплікацыя) і інш.

Цацкі: ёлачныя ўпрыгажэнні.

Тэхналогія гаспадарання (3 г)

Забеспячэнне быту сям'і

Тэарэтычныя звесткі. Патрабаванні да знешняга выгляду. Догляд сябе, адзення, абутку. Беражлівае стаўленне да адзення і абутку.

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера. *Афармленне інтэр'ера да свята*.*

Правілы этыкету. Выбар і ўпакоўка падарункаў. Уручэнне кветак і падарункаў. Як прымаць падарункі.

Прафесійная арыентацыя. Гутарка «Падарожжа на швейную фабрыку».

Міжпрадметныя сувязі

Руская мова. Этыка маўлення, пабудова дыялогу.

Літаратурнае чытанне. Прагаворванне і завучванне скорагаворак, лічылак.

Чалавек і свет. Знешні выгляд вучня. Сямейныя традыцыі і звычаі. Будні і святы.

Практычная дзейнасць. Самааналіз знешняга выгляду, адзення, абутку. Выкананне найпрасцейшых аперацый па доглядзе адзення, абутку.

Стварэнне ўпрыгажэнняў для навагодняй ёлкі. *Афармленне класнага кабінета да свята**. Упакоўка падарункаў. Ролевая гульня «Ідзём у госці».

Тэхналогія раслінаводства (1 г)

Догляд пакаёвых раслін

Тэарэтычныя звесткі. Уяўленне пра размяшчэнне раслін у інтэр'еры. Асноўныя патрабаванні да догляду розных відаў раслін.

Прафесійная арыентацыя. Кветкавод.

Міжпрадметныя сувязі

Чалавек і свет. Значэнне раслін у жыцці людзей. Разнастайнасць раслін. Умовы, неабходныя для росту і развіцця раслін. Праца людзей па вырошчванні культурных раслін.

Практычная дзейнасць. Найпрасцейшы догляд пакаёвых раслін.

Я і свет тэхналогій (1 г)

Падвядзенне вынікаў года. Прэзентацыя вырабаў, створаных у гэтым годзе. Гульня «Майстэрня падарункаў». Рэкамендацыі па нарыхтоўцы ўлетку прыродных матэрыялаў, неабходных для работы ў III класе: ракавінкі, каменьчыкі, лупінне яек; расліны, засушаныя з захаваннем аб'ёмнай формы; саломка.

Практычная дзейнасць. Выкананне калектыўнай работы з выкарыстаннем вывучаных матэрыялаў і асвоеных тэхналагічных аперацый.

Прыкладнае выніковае заданне. Калектыўная работа «Луг цвіце».

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Вучні павінны:

выконваць правілы:

бяспечнай працы;

арганізацыі працоўнага месца;

беражлівых адносін да інструментаў, эканомнага расходавання матэрыялаў;

працоўнай дысцыпліны;

мець уяўленне пра:

асноўныя этапы тэхналогіі: падрыхтоўчы, асноўны, заключны;

асноўныя патрабаванні да якасці вырабу;

асноўныя ўласцівасці вывучаных матэрыялаў;

выцінанку, фларыстыку, саломапляценне;

патрабаванні да знешняга выгляду, правілы догляду сябе, адзення, абутку, правілы этыкету;

асноўныя патрабаванні да догляду розных відаў пакаёвых раслін;

прафесіі, з якімі пазнаёміліся;

вызначаць:

вывучаныя матэрыялы, інструменты і прылады;

характарызаваць:

вывучаныя спосабы злучэння дэталяў;

чытаць і разумець:

графічныя выявы паслядоўнасці стварэння вырабаў, схемы складвання арыгамі;

ажыццяўляць (выконваць):

арганізацыю працоўнага месца; вывучаныя тэхналагічныя аперацыі стварэння вырабаў (пад кіраўніцтвам настаўніка па ўзоры, малюнку); ацэнку якасці гатовага вырабу і працэсу яго стварэння; элементарны догляд адзення і абутку; догляд пакаёвых раслін;

выкарыстоўваць набытыя навыкі ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

планаваць сваю дзейнасць і кантраляваць яе ход;

ажыццяўляць арганізацыю свайго працоўнага месца;

ажыццяўляць тэхналагічны працэс стварэння вырабаў самастойна ці пад кіраўніцтвам настаўніка або дарослага па ўзоры, эскізе, малюнку;

ажыццяўляць аздабленне і афармленне гатовых вырабаў;

ажыццяўляць найпрасцейшыя работы па доглядзе дэкаратыўных раслін;

выконваць правілы асабістай гігіены і бяспечнай працы з матэрыяламі, інструментамі, электрапрыборамі;

праяўляць:

любоў да працы і прыроды, павагу да людзей працы і вынікаў іх дзейнасці;

уважлівасць, адказнасць і добрасумленнасць;

акуратнасць і беражлівасць;

дакладнасць, дысцыплінаванасць і назіральнасць.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Фізічная культура і здароўе»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Фізічная культура і здароўе» вырашае задачы агульнай фізкультурнай адукацыі, рознабаковага фізічнага, інтэлектуальнага, духоўна-маральнага развіцця і аздараўлення навучэнцаў. Яго змест накіраваны на ўмацаванне здароўя, прафілактыку захворванняў, фарміраванне здаровага фізічна актыўнага ладу жыцця навучэнцаў; аказвае развіваючы ўплыў на светапогляд навучэнцаў, фарміруе псіхічныя, псіхафізічныя, маральна-валявыя і іншыя якасці асобы. Рэгулярныя фізкультурна-аздараўленчыя вучэбныя заняткі спрыяюць аднаўленню і павышэнню разумовай і фізічнай працаздольнасці навучэнцаў.

Спецыфічнай асаблівасцю вучэбнай праграмы вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» з'яўляецца выкарыстанне на кожных вучэбных занятках разнастайных сродкаў фізічнага выхавання для рашэння трыадзінай задачы адукацыі, выхавання і аздараўлення навучэнцаў.

Мэтай вывучэння вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца фарміраванне фізічнай культуры асобы і аздараўленне навучэнцаў з улікам іх узроставых асаблівасцей.

Адукацыйныя задачы:

– фарміраванне даступных у малодшым школьным узросце фізкультурных ведаў;

– фарміраванне рухальных уменняў і навыкаў;

– навучанне спосабам фізкультурнай дзейнасці;

– развіццё здольнасці прымяняць вывучаныя фізкультурныя веды, выкарыстоўваць рухальныя ўменні і навыкі ў пазаўрочны час;

– фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў бяспечных паводзін падчас арганізаваных і самастойных гульняў і фізкультурных заняткаў у экалагічна неспрыяльных умовах.

Выхаваўчыя задачы:

– выхаванне стаўлення да ўласнага здароўя і здароўя іншых як да каштоўнасці;

– развіццё патрэбы ў рэгулярнай фізкультурна-аздараўленчай і спартыўнай актыўнасці;

– садзейнічанне гарманічнаму фізічнаму, маральны-духоўнаму, інтэлектуальнаму і эмацыянальнаму развіццю;

– выхаванне дысцыплінаванасці, сумленнасці, выканаўчасці, калектывізму, спагадлівасці, смеласці;

– фарміраванне міжасобасных адносін з аднагодкамі ў працэсе фізкультурнай і спартыўнай дзейнасці.

Аздараўленчыя задачы:

– прафілактыка захворванняў, стрэсавых станаў;

– фарміраванне навыкаў здаровага фізічна актыўнага ладу жыцця;

– умацаванне фізічнага здароўя навучэнцаў;

– развіццё каардынацыйных і кандыцыйных здольнасцей;

– садзейнічанне рознабаковаму фізічнаму развіццю;

– фарміраванне правільнай паставы.

Для павышэння аздараўленчага эфекту вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» вучэбныя заняткі праводзяцца на адкрытых прышкольных пляцоўках.

Змест вучэбнай праграмы размеркаваны па наступных раздзелах (табл 1, 5.):

«Асновы фізкультурных ведаў»;

«Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці»;

«Развіццё рухальных здольнасцей».

Тэмы раздзела **«Асновы фізкультурных ведаў»** вывучаюцца на ўроках фізічнай культуры на працягу навучальнага года ў форме непрацяглых апавяданняў, гутарак (5–10 мінут) і прадугледжваюць фарміраванне ў навучэнцаў ведаў і ўяўленняў пра фізічную культуру як пра частку агульнай культуры чалавека.

Раздзел **«Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці»** ўключае фізічныя практыкаванні, якія складаюць змест «школы рухаў»: розныя віды хадзьбы, бегу, скачкі, кіданне, лажанне, перамяшчэнне на лыжах, плаванне; элементы спартыўных і рухомых гульняў, практыкаванні ў раўнавазе і ў вісе, акрабатычныя практыкаванні.

Раздзел **«Развіццё рухальных здольнасцей»** змяшчае рухомыя гульні і гульнявыя заданні, тэставыя практыкаванні для вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей навучэнцаў.

Вучэбная праграма прадугледжвае пераважнае выкарыстанне гульнявой формы правядзення заняткаў з навучэнцамі, што павышае эфектыўнасць рашэння наступных задач:

– замацаванне і ўдасканаленне рухальных уменняў, навыкаў і вывучаных спосабаў дзейнасці;

– развіццё каардынацыйнай (дакладнае ўзнаўленне прасторавых, часавых і сілавых характарыстык рухаў, іх тэмпу і рытму; захаванне раўнавагі; хуткае і своечасовае рэагаванне на зменлівыя сітуацыі, узгодненасць адначасовых і паслядоўных рухаў рознамі часткамі цела) і кандыцыйных (хуткасных, сілавых, хуткасна-сілавых, агульнай вынослівасці, гнуткасці) здольнасцей.

Спецыфіка вучэбнай праграмы «Фізічная культура і здароўе» прадугледжвае:

– строгі дыферэнцыраваны падбор вучэбнага матэрыялу з улікам яго засваення навучэнцамі, аднесенымі па стане здароўя да асноўнай і падрыхтоўчай медыцынскіх груп[1];

– штогадовае выкананне уніфікаваных тэставых практыкаванняў для вызначэння індывідуальнага ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей навучэнцаў. Навучэнцы I класа выконваюць тэставыя практыкаванні адзін раз у канцы навучальнага года, а навучэнцы II–IV класаў – два разы ў навучальным годзе: у верасні і маі. Умовы выканання тэставых практыкаванняў для індывідуальнага вызначэння ўзроўню развіцця рухальных якасцей навучэнцаў выкладзены ў дадатках 2, 3;

– шчыльную ўзаемасувязь зместу ўрокаў фізічнай культуры і здароўя з рухальнай актыўнасцю навучэнцаў у рэжыме вучэбнага і падоўжанага дня, рэгулярны ўдзел у фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах.

[1] Навучэнцы, аднесеныя паводле стану здароўя да спецыяльнай медыцынскай групы, займаюцца на вучэбных занятках фізічнай культуры і здароўя па спецыяльных вучэбных праграмах, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Прыярытэтнымі для вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» з'яўляюцца:

– *агульнавучэбныя ўменні і навыкі*: назіранне, аналіз, вымярэнне, ацэнка, параўнанне, удзел у дыялогу;

– *універсальныя спосабы дзейнасці*: даследаванне нескладаных практычных сітуацый, звязаных з рашэннем рухальных задач пераважна ва ўмовах гульнявой дзейнасці;

– *фізкультурныя кампетэнцыі*: маторная (рухальная), *самакантролю* падчас заняткаў; *агульнакультурная* кампетэнцыя (у пытаннях узнікнення і адраджэння Алімпійскіх гульняў, дасягненняў на іх айчынных спартсменаў).

Вынікі асваення вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» сфармуляваны ў вучэбных патрабаваннях да навучэнцаў, якія сканчаюць I, II, III і IV класы. Прыярытэтам вучэбнага прадмета з'яўляецца засваенне зместу, значнага для:

– станаўлення гуманістычнай накіраванасці асобы;

– павышэння эмацыянальнай насычанасці вучэбнай дзейнасці навучэнцаў;

– фарміравання індывідуальных нормаў дзейнасці і паводзін на вучэбных занятках;

– станаўлення каштоўнаснага стаўлення да свайго здароўя;

– самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі;

– вядзення здаровага фізічна актыўнага ладу жыцця.

Вучэбна-метадычнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» рэгламентуецца дакументам, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь[1].

[1] Пералік і нормы забеспячэння спартыўным інвентаром і абсталяваннем, неабходным для арганізацыі фізічнага выхавання навучэнцаў пры атрыманні імі агульнай сярэдняй, спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, правядзення з імі фізкультурна-аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемстваў (зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 14.07.2014 № 105).

Змест вучэбнага прадмета

Табліца 1

Прыкладнае размеркаванне вучэбнага матэрыялу

Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу	Колькасць гадзін
Асновы фізкультурных ведаў	2
Асновы бяспекі ведаў	0,5
Гігіенічныя веды	0,25
Здаровы лад жыцця	0,5
Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі	0,25
Алімпізм і алімпійскі рух	0,5
Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці	66
Страявыя практыкаванні	3
Агульнаразвіццёвыя практыкаванні	4
Хадзьба	2
Бег	6
Скачкі	6
Кіданне	6
Лажанне	5
Акрабатычныя парктыкаванні	10
Практыкаванні ў раўнавазе	4
Элементы спартыўных і рухавых гульняў	12
Перамяшчэнне на лыжах[1]	8
Плаванне	да 16 гадзін
Развіццё рухальных здольнасцей[2]	
Рухавыя гульні і гульнявыя заданні	+
Вызначэнне ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей[3]	+
Прыкладныя рэкамендацыі па тыднёваму рухальнаму рэжыму	+
УСЯГО	68

[1] Пры бясснежнай зіме замяняецца вучэбным матэрыялам іншых тэм.

[2] Час, які адводзіцца на кожным уроку на развіццё рухальных здольнасцей навучэнцаў, уваходзіць у разлік гадзін адпаведнай тэмы раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

[3] Плануецца на апошнія два тыдні навучальнага года.

АСНОВЫ ФІЗКУЛЬТУРНЫХ ВЕДАЎ

Асновы бяспекі заняткаў. Правілы бяспечных паводзін у месцах заняткаў фізічнай культурай. Правілы паводзін пры траўмах і няшчасных выпадках. Правілы паводзін на вадзе.

Гігіенічныя веды. Правілы дыхання пры выкананні агульнаразвіццёвых практыкаванняў. Правілы правядзення водных працэдур, прыёму паветраных і сонечных ваннаў.

Здаровы лад жыцця. Паняцце і ўплыў здаровага ладу жыцця навучэнцаў на стан здароўя, настрой, поспехі ў вучобе.

Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі. Патрабаванні да выканання комплексу практыкаванняў ранішняй гімнастыкі і фізкультурных мінутак. Правілы выканання тэставых практыкаванняў: чаўночны бег, падцягванне ў вісе, нахіл уперад са становішча седзячы, падыманне і апусканне тулава са становішча «лежачы на спіне», бег 30 м, 6-мінутны бег.

Алімпізм і алімпійскі рух. Уяўленне пра сучасныя Алімпійскія гульні. Алімпійская сімволіка і атрыбутыка (эмблема, агонь, сцяг, гімн, дэвіз, талісманы, алімпійскія ўзнагароды). Цырымоніі адкрыцця і закрыцця Алімпійскіх гульняў.

УМЕННІ, НАВЫКІ, СПОСАБЫ ДЗЕЙНАСЦІ

Страявыя практыкаванні. Разлік на «першы – другі»; размыканне і змыканне прыстаўным крокам; перастраенні з адной шарэнгі ў дзве і назад; перамяшчэнне ў калоне па адным з выкананнем каманд: «У абход – шагам марш!», «Проціходам налева (направа) – марш!», «Па дыяганалі – марш!».

Агульнаразвіццёвыя практыкаванні. Рыўковыя і кругавыя рухі рукамі, махавыя рухі нагамі з зыходнага становішча стоячы; выпады наперад, убок, назад з адначасовым падыманнем рук у бакі, уверх, адвядзеннем назад; кругавыя рухі рукамі ў выпадах; нахілы ўперад з зыходнага становішча «седзячы», «стоячы, ногі разам, ногі паасобку»; комплексы практыкаванняў ранішняй гімнастыкі і фізкультурных мінутак.

Хадзьба. На насках рукі на поясе, за галаву, уверх, у бакі; у паўпрысядзе, на знешнім баку ступні, з высокім падыманнем бядра, прыстаўным крокам управа і ўлева.

Бег. На месцы, па разметках, «змейкай» і «васьмёркай», на зададзеную адлегласць і час; 30 м з высокага старту; чаўночны бег 4 х 9 м.

Скачкі. На дзвюх нагах па разметках; на адной назе «па класах» (квадратах); у глыбіню з мяккім прызямленнем; праз кароткую і доўгую скакалку; у даўжыню з месца штуршком дзвюма нагамі і з разбегу.

Кіданне. Набіўнога мяча 0,5 кг дзвюма рукамі ад грудзей і знізу наперад-уверх з зыходнага становішча «стоячы ногі на шырыні плячэй тварам у бок кідання»; кіданне малога мяча з месца на далёкасць з зыходнага становішча «стоячы тварам у бок кідання», на зададзеную адлегласць, у гарызантальную і вертыкальную цэль (гімнастычны абруч) з адлегласці 3–4 м.

Лажанне. Па нахіленай гімнастычнай лаўцы ва ўпоры стоячы на каленях, ва ўпоры прысеўшы; па гімнастычнай сценцы ў гарызантальным напрамку прыстаўным крокам з папераменным перахопліваннем рук, у вертыкальным напрамку рознаіменным і аднайменным спосабамі; падцягванне на руках лежачы на жываце і бёдрах на гарызантальнай гімнастычнай лаўцы; падцягванне на перакладзіне ў вісе (хлопчыкі), у вісе стоячы (дзяўчынкі).

Акрабатычныя практыкаванні. Хуткая групоўка з асноўнай стойкі, рукі ўверсе далонямі наперад, з упору прысеўшы, з зыходнага становішча «лежачы на спіне, рукі ўверсе далонямі наперад»; кулёк наперад у групоўцы; стойка на лапатках сагнуўшы ногі; са стойкі на лапатках сагнуўшы ногі перакат наперад ва ўпор прысеўшы; перакат убок прагнуўшыся з зыходнага становішча «лежачы на грудзях, рукі ўверх», убок у групоўцы са стойкі на каленях.

Элементы спартыўных і рухомых гульняў. Перакідванне з рукі ў руку тэніснага мяча; падкідванне ўверх тэніснага мяча з наступнай лоўляй яго дзвюма рукамі.

Кідкі валейбольнага мяча[1] адной і дзвюма рукамі адно аднаму з лоўляй дзвюма рукамі; падкідванне валейбольнага мяча і лоўля дзвюма рукамі з двума-трыма хлапкамі, з адскокам ад падлогі, з адным-двума крокамі ўправа і ўлева, з паваротам на 180°; перакідванне мяча праз сетку дзвюма рукамі ад грудзей, ад галавы, адной рукой ад пляча; удары мячом аб падлогу адной рукой з высокім, сярэднім і нізкім адскокам; кідкі мяча адной і дзвюма рукамі ў вертыкальную цэль (гімнастычны абруч, ніжні край якога на вышыні 1,5–2 м ад падлогі).

[1] Дапускаецца выкарыстоўваць гумовы мяч дыяметрам 25–30 см.

Вядзенне футбольнага мяча[2] адной нагой, папераменна правай і левай нагой па прамой, «змейкай»; чаўночны бег з вядзеннем мяча. Вядзенне адначасова двух мячоў. Спыненне мяча, які коціцца, правай і левай нагамі. Перадачы мяча ў парах адно аднаму правай і левай нагамі. Удары па нерухомым мячы ўнутраным бокам ступні з пападаннем у вароты.

[2] Тое ж.

Перамяшчэнне на лыжах. Пастраенне з лыжамі ў руках у шарэнгу, у калону па адным; надзяванне лыж на снезе; павароты пераступаннем на месцы; перамяшчэнне на лыжах ступаючым і слізгальным крокам; спускі на лыжах з горак з невялікім ухілам; пад'ём у гару ступаючым крокам.

Плаванне. Прысяды з пагружэннем у ваду з галавой; выдых у ваду з паваротам галавы; даставанне прадметаў з дна, расплюшчваючы вочы ў вадзе; слізганне лежачы на грудзях, на спіне; рухі ног спосабам «кроль» з апорай рукамі аб дно, борцік басейна або з падтрымкай партнёра; слізганне пасля адштурхоўвання з рухамі ног спосабам «кроль» на спіне, на грудзях; узгодненыя рухі рук з дыханнем стоячы на дне і ў спалучэнні з хадзьбой; плаванне з апорай адной і дзвюма рукамі аб дошку; плаванне з дапамогай ног і грабкоў адной рукой з рознымі палажэннямі другой рукі; саскок з борціка ў ваду ўніз нагамі з розным становішчам рук; спад у ваду з зыходнага становішча «седзячы на борціку, рукі ўверсе».

РАЗВІЦЦЁ РУХАЛЬНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ

Рухавыя гульні і гульнявыя заданні

Гульні і гульнявыя заданні для ўдасканалення каардынацыйных здольнасцей: «Паспрабуй злаві», «Прыдумай сам», «Мяч збоку», «Забаронены рух», «Мы – вясёлыя рабяты», «Карусель», «Забаўнікі», «Фігуры», «Па сцежцы», «Хто як ходзіць?», «Карлікі і веліканы», «Хто лішні?».

Гульні і гульнявыя заданні з бегам: «Хутка вазьмі – хутка пакладзі», «Займі свае месцы», «Перамяні прадмет», «Бег за сцяжкамі», «Каршун і квактуха», «Пасадка бульбы», «Мы – вясёлыя рабяты», «Коннікі-спартсмены».

Гульні і гульнявыя заданні са скачкамі: «Скакуны», «Човен», «Пераскачы цераз ручаёк», «Конікі», «Парашутысты», «Верабейчыкі-паскакунчыкі», «Скачкі па палосках», «Воўк у рове», «Вудачка скачковая», «Зайцы ў агародзе».

Гульні і гульнявыя заданні з кіданнем: «Лаві мяч», «Цэлься без промаху», «Перадаў – сядай», «Пагрузка кавуноў», «Гонка мячоў», «Трапны снайпер», «Па мішэнях».

Гульні і гульнявыя заданні з лажаннем: «З мячом пад дугой», «Перапаўзі – не ўпусці», «Хто хутчэй да сцяжка?», «Кацяняты і шчаняты», «Пералёт птушак», «Пажарныя», «Мядзведзі і пчолы».

Гульні і гульнявыя заданні з перамяшчэннем на лыжах: «Лыжныя рэйкі», «Лыжны поезд», «Аленевая запрэжка», «Хто самы хуткі?», «Смялей з горкі».

Гульні і гульнявыя заданні ў басейне на вадзе: «Салкі на вадзе», «Бусел», «Жабкі», «Жучок-павучок», «Помпа», «Невад», «Карасікі і шчупак», «Цягнік у тунэлі», «Карусель», «Хвалі і мора», «На буксіры», «Медуза», «Паплавок», «Цюлені».

Гульня з выкананнем тэставых практыкаванняў «Выконвай без памылак».

Вызначэнне ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей навучэнцаў

Узроўні развіцця рухальных здольнасцей навучэнцаў вызначаюцца з дапамогай тэставых практыкаванняў, якія выконваюцца на пачатку і ў канцы навучальнага года. На працягу аднаго ўрока рэкамендуецца планаваць і выконваць не больш за два тэставыя практыкаванні. Крытэрыі вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей навучэнцаў пададзены ў табліцах 6, 7.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Мець уяўленне:

аб правілах здаровага ладу жыцця;

аб уплыве здаровага ладу жыцця на здароўе і настрой чалавека;

аб алімпійскай сімволіцы;

аб цырымоніях адкрыцця і закрыцця Алімпійскіх гульняў.

Ведаць і выконваць:

правілы бяспечных паводзін на ўроках фізічнай культуры і здароўя і падчас самастойных заняткаў;

гігіенічныя патрабаванні да спартыўнага адзення і абутку для заняткаў фізічнай культурай;

правілы дыхання падчас заняткаў фізічнымі практыкаваннямі;

правілы здаровага ладу жыцця.

Валодаць навыкамі і спосабамі выканання:

страявых каманд і практыкаванняў;

гульнявых заданняў з хадзьбой, бегам, скачкамі, кіданнем, лажаннем;

тэставых практыкаванняў;

практыкаванняў для фарміравання правільнай паставы.

Выкарыстоўваць набытыя веды, уменні, навыкі на ўроках і ў паўсядзённым жыцці:

для выканання патрабаванняў здаровага ладу жыцця;

для выканання правіл бяспечных паводзін у працэсе ўдзелу ў фізкультурна-аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемствах, рухавых гульнях;

для рэгулярнага выканання ранішняй гімнастыкі і фізкультурных мінутак;

для падтрымання правільнай паставы;

для правільнага выканання тэставых практыкаванняў;

для заняткаў плаваннем.

Дадатак 3

УМОВЫ ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ

Бег 30 метраў праводзіцца на прамой бегавой дарожцы стадыёна. Дапускаецца выкарыстанне высокага ці нізкага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Вучню, які парушыў правілы спаборніцтваў па бегу (фальстарт, забяганне на суседнюю дарожку), можа быць дадзена адна дадатковая спроба. Вынік бегу вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

Чаўночны бег 4 х 9 м выконваецца ў спартыўнай зале на палавіне валейбольнай пляцоўкі. Колькасць удзельнікаў у адным забегу – не больш за 2 чалавекі. Кожнаму вучню даецца дзве спробы запар. Па камандзе «Падрыхтавацца!» вучні падыходзяць да лініі старту (як правіла, гэта сярэдзіна валейбольнай пляцоўкі) і прымаюць становішча

высокага старту па напрамку пярэдняй лініі, дзе насупраць кожнага навучэнца ляжаць 2 брускі 50х50 х100 мм на адлегласці 100 мм адзін ад аднаго.

Па камандзе «Марш!» вучні бягуць да пярэдняй лініі, бяруць кожны па адным бруску (не закрануўшы другі), паварочваюцца і бягуць назад. Падбегшы да лініі «старт-фініш», кладуць на яе (або за яе) брусок (кідаць нельга!), разварочваюцца і бягуць за бруском, які застаўся. Падбегшы да лініі, бяруць свой другі брусок, разварочваюцца, бягуць да лініі «старт-фініш» і, не зніжаючы хуткасці, перасякаюць яе з бруском у руках.

Час выканання практыкавання бегу кожным вучнем фіксуецца з дакладнасцю да 0,1 секунды. Залічваецца найлепшы вынік з дзвюх спроб.



Скачок у даўжыню з месца выконваецца штуршком дзвюма нагамі на падлозе спартыўнай залы. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Не дапускаецца выконваць скачкі ў яму з пяском. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца найлепшы вынік з трох спроб.

Віс на сагнутых руках выконваецца на гімнастычнай перакладзіне з зыходнага становішча «віс хватам зверху». Кожнаму вучню даецца адна спроба. Па камандзе настаўніка (адначасова ўключаецца секундамер) навучэнец прымае зыходнае становішча «віс на сагнутых руках». Пры гэтым падбародак павінен быць на ўзроўні або вышэй за ўзровень перакладзіны. Секундамер выключаецца тады, калі падбародак вучня апусціцца ніжэй за ўзровень перакладзіны. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 секунды.

Падыманне тулава са становішча «лежачы на спіне» за 30 секунд выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча «лежачы на спіне, рукі скрыжаваныя перад грудзьмі, далоні на локцевых суставах, ступні ног зафіксаваныя».

Вугал у каленным суставе складае 90°.

Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца рыўкі рукамі. Залічваецца колькасць нахілаў тулава пры дотыку локцевых і каленных суставаў з наступным апусканнем на спіну і дотыкам лапаткамі гімнастычнага мата.

Нахіл уперад з зыходнага становішча «седзячы на падлозе». Навучэнец садзіцца на падлогу, з боку знака «–» (мінус), пяткі на шырыні таза на лініі ОВ упіраюцца ва ўпоры для ног, стопы вертыкальна. Два партнёры з двух бакоў прыціскаюць яго калені да падлогі, не дазваляючы згінаць ногі.

Навучэнец кладзе адну далонь на тыльны бок другой далоні, апускае рукі на падлогу, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі па лініі СД. На трэцім нахіле навучэнец максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на 3 секунды. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнутых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра.



Бег 800, 1000 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна з высокага старту. Рэкамендуецца клас дзяліць на групу дзяўчынак і групу хлопчыкаў. Старт – групавы. Кожнаму навучэнцу даецца адна спроба. Не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Навучэнцам, якія парушылі названыя правілы, а таксама тым, хто не фінішаваў, вызначаецца нізкі ўзровень развіцця рухальных здольнасцей. Вынік бегу вымяраецца з дакладнасцю да 1 секунды.

6-мінутны бег выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна, якая папярэдне пазначаецца на кожныя 10 ці 20 метраў. Рэкамендуецца праводзіць забегі асобна сярод хлопчыкаў і дзяўчынак. Група хлопчыкаў (дзяўчынак) стартуе адначасова. Падчас бегу настаўнік лічыць колькасць кругоў, якія пераадолелі вучні. Па заканчэнні 6 мінут настаўнік падае гукавы сігнал (напрыклад, свісток), пасля якога вучні пераходзяць на крок, запомніўшы месца, дзе яны пачулі сігнал. Затым настаўнік кожнаму індывідуальна вылічвае даўжыню пераадоленай дыстанцыі з улікам колькасці поўных кругоў і той часткі бегавой дарожкі, дзе навучэнец перайшоў на крок.

Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Навучэнцам, якія парушылі названыя правілы, а таксама тым, хто не фінішаваў, вызначаецца нізкі ўзровень развіцця рухальных здольнасцей. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 10 метраў.

Табліца 6

Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей дзяўчынак II класа

№ п/п	Тэставае практыкаванне	Узроўні развіцця рухальных здольнасцей, балы									
		нізкі		ніжэйшы за сярэдні		сярэдні		вышэйшы за сярэдні		высокі	
		1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
1	Бег 30 м (с)	7,6 і больш	7,4	7,1	6,9	6,7	6,6	6,4	6,3	6,1	6,0 і менш
2	Чаўночны бег 4 х 9 м (с)	13,9 і больш	13,6	13,1	12,9	12,6	12,4	12,2	12,0	11,8	11,4 і менш
3	Скачок у даўжыню з месца (см)	104 і менш	105	114	119	123	125	130	132	137	142 і больш
4	Падыманне тулава са становішча «лежачы на спіне» за 30 с (разоў)	10 і менш	13	14	16	17	18	19	20	21	24 і больш
5	Нахіл уперад (см)	–5 і менш	–3	0	2	4	5	7	9	11	12 і больш
6	6-мінутны бег (м) *або* бег 800 м (мін, с)	700 і менш	710	800	870	920	960	1000	1030	1080	1150 і больш
		6,41 і больш	6,40	6,09	5,55	5,40	5,28	5,15	5,01	4,48	4,34 і менш

Табліца 7

Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей хлопчыкаў II класа

№ п/п	Тэставае практыкаванне	Узроўні развіцця рухальных здольнасцей, балы									
		нізкі		ніжэйшы за сярэдні		сярэдні		вышэйшы за сярэдні		высокі	
		1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
1	Бег 30 м (с)	7,2 і больш	7,0	6,9	6,7	6,6	6,4	6,3	6,1	6,0	5,8 і менш
2	Чаўночны бег 4 х 9 м (с)	13,4 і больш	13,1	12,8	12,6	12,3	12,0	11,8	11,6	11,4	11,0 і менш
3	Скачок у даўжыню з месца (см)	104 і менш	109	114	118	123	128	132	137	142	146 і больш
4	Віс на сагнутых руках (с)	1 і менш	3	6	8	11	13	16	18	21	23 і больш

5	Нахіл уперад (см)	–10 і менш	–8	–5	–3	–1	1	3	6	8	10 і больш
6	6-мінутны бег (м) *або*	760 і менш	770	890	950	1000	1030	1090	1130	1190	1220 і больш
	бег 1000 м (мін, с)	7,41 і больш	7,40	6,59	6,42	6,26	6,10	5,54	5,38	5,21	5,05 і менш

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Асновы бяспекі жыццядзейнасці»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

АСНОВЫ БЯСПЕКІ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Найважнейшай састаўной часткай сістэмы грамадскай бяспекі ў Рэспубліцы Беларусь з’яўляецца навучанне падрастаючага пакалення асновам бяспекі жыццядзейнасці, што замацавана ў Дырэктыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны» ад 11 сакавіка 2004 года.

Ключавая роля ў справе падрыхтоўкі падрастаючага пакалення да бяспечнай жыццядзейнасці адводзіцца ўстановам агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх змест кожнага з вучэбных прадметаў уносіць свой уклад у фарміраванне ў вучняў сучаснага ўзроўню культуры бяспекі. Асаблівае месца займае вучэбны прадмет «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» (АБЖ), праз змест якога рэалізуецца падрыхтоўка вучняў да бяспечнай жыццядзейнасці ў рэальным навакольным асяроддзі – прыродным, тэхнагенным і сацыяльным. Толькі праз адукацыю можна забяспечыць павышэнне агульнага ўзроўню культуры насельніцтва краіны ў сферы бяспекі жыццядзейнасці і зніжэння адмоўнага ўплыву «чалавечага фактару» на бяспеку жыццядзейнасці асобы, грамадства і дзяржавы.

Мэта навучання АБЖ – фарміраванне ў вучняў вопыту бяспечных паводзін, развіццё асобасных, маральных і фізічных якасцей, якія гарантуюць бяспечныя паводзіны, і выхаванне адказных адносін да асабістай і грамадскай бяспекі.

Задачы навучання:

сфарміраваць уяўленні пра асновы бяспекі жыццядзейнасці;

забяспечыць засваенне ведаў пра здаровы лад жыцця;

спрыяць атрыманню практычнага вопыту па распазнаванні і ацэнцы разнастайных небяспечных і надзвычайных сітуацый навакольнага асяроддзя па характэрных прыметах іх з’яўлення, а таксама на аснове аналізу спецыяльнай інфармацыі, атрыманай з разнастайных крыніц;

развіць здольнасці ацэньваць небяспечныя сітуацыі, прымаць рашэнні і дзейнічаць бяспечна з улікам сваіх магчымасцей;

сфарміраваць мадэлі бяспечных паводзін ва ўмовах паўсядзённага жыцця і ў розных небяспечных і надзвычайных сітуацыях.

Вучэбная праграма заснавана на ідэях асобасна-арыентаванага, дзейнаснага і кампетэнтнаснага падыходаў да адбору зместу адукацыі і арганізацыі адукацыйнага працэсу.

Асобасна-арыентаваны падыход мае на ўвазе стварэнне ўмоў для праявы і развіцця асобасных якасцей вучняў, уліку іх інтарэсаў, індывідуальных асаблівасцей і магчымасцей. Яго рэалізацыя забяспечыць дасягненне запланаваных вынікаў і створыць

аснову для самастойнага паспяховага засваення навучэнцамі ведаў пра небяспеку разнастайнага паходжання, меры па іх папярэджанні, ліквідацыі наступстваў; развіццё ўменняў прымаць рашэнні і дзейнічаць бяспечна з улікам сваіх магчымасцей.

Рэалізацыя ідэй *дзейнаснага падыходу* дазволіць уключыць вучняў у самастойную вучэбна-пазнавальную дзейнасць, у навучанне яе прыёмам. Толькі праз уласную актыўную дзейнасць вучань зможа спасцігаць асновы бяспечнай жыццядзейнасці, развіваць і ўдасканальваць асобасныя якасці, неабходныя для бяспечных паводзін у розных жыццёвых сітуацыях.

Рэалізацыя *кампетэнтнаснага падыходу* да адбору зместу адукацыі і арганізацыі адукацыйнага працэсу па АБЖ забяспечыць падрыхтоўку вучняў да жыцця, фарміраванне ў іх *ключавых кампетэнцый у сферы бяспекі жыццядзейнасці:*

каштоўнасна-сэнсавыя – здольнасць бачыць і разумець навакольны свет, арыентавацца ў ім, вызначаць і ацэньваць разнастайныя небяспечныя і надзвычайныя сітуацыі навакольнага асяроддзя, усведамляць, што найвышэйшая каштоўнасць грамадства – чалавек, яго жыццё і здароўе; валоданне ўменнем прымаць рашэнні, ацэньваць свае паводзіны, рысы свайго характару;

вучэбна-пазнавальныя – валоданне ўменнямі вызначаць мэты пазнавальнай дзейнасці па АБЖ; валоданне ўменнямі весці сябе бяспечна ў найбольш тыповых сітуацыях дарожнага руху, прымяняць веды пажарнай бяспекі пры ўзгараннях у асобных памяшканнях кватэры, пры ўзгаранні электрапрыбораў; здольнасць вызначаць прычынна-выніковыя сувязі таго, што адбываецца ў навакольным асяроддзі; валоданне ўменнем самастойна выконваць разнастайныя творчыя работы, праекты;

камунікатыўныя – валоданне ўменнямі самастойна ўступаць у кантакт з любым суразмоўцам, выконваць нормы і правілы зносін, слухаць суразмоўцу, выказваючы павагу і цярпімасць да чужога пункту погляду, па магчымасці пазбягаць або граматна вырашаць канфлікты ў зносінах з равеснікамі, змяняць пры неабходнасці свае маўленчыя паводзіны, карэктна завяршаць сітуацыю зносін; валоданне навыкамі працы ў групе; здольнасць заўважаць небяспечныя сітуацыі пры зносінах з іншымі людзьмі;

інфармацыйныя – здольнасць свядома ўспрымаць інфармацыю, што распаўсюджваецца па каналах СМІ; валоданне ўменнем аналізаваць атрыманую з дапамогай рэальных аб'ектаў (тэлевізара, магнітафона, тэлефона, факса, камп'ютара, прынтара, мадэма) і інфармацыйных тэхналогій (аўдыя- і відэазапісаў, электроннай пошты, СМІ, інтэрнэту) інфармацыю з пазіцыі задачы, якая рашаецца, рабіць высновы з мэтай пазбегнуць ашуканства, падману, небяспечных кантактаў з незнаёмцамі ў інтэрнэце;

асобаснага самаўдасканалення – наяўнасць асобасных якасцей, якія гарантуюць бяспечныя паводзіны ў розных жыццёвых сітуацыях;

здароўезберагальныя – валоданне навыкамі асабістай гігіены; наяўнасць патрэбы выконваць нормы здаровага ладу жыцця; наяўнасць вопыту арыентавання ў прадуктах харчавання; здольнасць адрозніваць карысныя і шкодныя звычкі; валоданне элементарнымі спосабамі аказання першай дапамогі.

Праблематыка бяспекі ахоплівае многія сферы чалавечай дзейнасці і з'яўляецца вынікам узаемадзеяння людзей з навакольным асяроддзем, светам і чалавецтвам у цэлым. Вучэбнай праграмай вызначаны для разгляду наступныя зместавыя лініі з галін бяспекі жыццядзейнасці: асабістая і калектыўная бяспека; распазнаванне і ацэнка розных небяспечных і надзвычайных сітуацый, абарона ад іх; навакольнае асяроддзе і бяспека ў ім; стаўленне да здароўя і здаровага ладу жыцця.

Пры адборы зместу вучэбнай праграмы і яе пабудове ўлічаны педагагічныя прынцыпы адукацыйнага працэсу ў сферы асноў бяспекі жыццядзейнасці: *мінімізацыя тэарэтычных звестак* з улікам іх значнасці для практыкі; *бесперапыннасць навучання з II па VIII клас* і *паступовае павелічэнне інфармацыйнай і выхаваўчай нагрузкі* вучняў у сферы асноў бяспекі жыццядзейнасці з улікам іх узроставых асаблівасцей і ўзроўню падрыхтоўкі па астатніх вучэбных прадметах.

Агульным прынцыпам пабудовы вучэбнай праграмы, што аб'ядноўвае яе раздзелы, з'яўляецца *прынцып пашырэння сацыяльнага вопыту бяспечнай жыццядзейнасці* вучняў.

Вучэбны матэрыял у вучэбнай праграме прадстаўлены сістэмай паняццяў, азначэнняў, правіл, якія складаюць тэарэтычную базу для фарміравання ў вучняў вопыту бяспечных паводзін у паўсядзённым жыцці.

Спецыфіка вучэбнага прадмета «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» раскрываецца ў назве і змесце яго раздзелаў:

I. «Асабістая і калектыўная бяспека»;

II. «Засцярога ад надзвычайных сітуацый»;

III. «Навакольнае асяроддзе і бяспека»;

IV. «Здаровы лад жыцця».

Змест кожнага раздзела складзены з апорай на вопыт практычнай дзейнасці вучняў II класа, узровень іх агульнага развіцця. У кожнага раздзела свае задачы. Аднак іх комплекснае рашэнне дазваляе дасягнуць мэты вучэбнага прадмета.

Галоўнымі задачамі раздзела «Асабістая і калектыўная бяспека» з'яўляюцца: азнаямленне вучняў з асноўнымі відамі бяспекі жыццядзейнасці (транспартнай, антыкрымінальнай, псіхалагічнай, сацыяльнай); развіццё ў іх індывідуальных якасцей, якія гарантуюць асабістую бяспеку; назапашванне практычнага вопыту па распазнаванні і ацэнцы разнастайных небяспечных і надзвычайных сітуацый навакольнага асяроддзя (ва ўстанове адукацыі, у дамашніх умовах, у транспартных сродках, на дарогах, у двары, у прыродзе) па характэрных прыметах іх з'яўлення. Змест раздзела «Асабістая і калектыўная бяспека» дазваляе не толькі пазнаёміць вучняў з правіламі паводзін дома ў выпадку адстутнасці дарослых, з правіламі паводзін у выпадку выяўлення безгаспадарчых ці падазроных прадметаў, пашырыць уяўленні пра ўзаемаадносіны з равеснікамі, пра чужых, незнаёмых людзей і паводзіны пры сустрэчы з такімі людзьмі, але і сфарміраваць мадэлі бяспечных паводзін ва ўмовах паўсядзённага жыцця.

У сістэме асабістай і калектыўнай бяспекі асаблівае месца займае транспартная бяспека, абумоўленая пастаянным ростам колькасці ахвяр аўтамабільных аварый, лётных здарэнняў, катастроф на моры і чыгунцы. У вучэбнай праграме ў раздзеле «Асабістая і калектыўная бяспека» адведзена значная колькасць гадзін на разгляд пытанняў асабістай і калектыўнай бяспекі на дарогах, у транспартных сродках у розныя поры года.

Асабістая і калектыўная (грамадская) бяспека складае базавы сэнс паняцця «бяспека жыццядзейнасці», якое можна вызначыць як бяспечнае ўзаемадзеянне чалавека з асяроддзем пражывання. У сувязі з гэтым пытанні асабістай і калектыўнай бяспекі разглядаюцца ва ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы з пункту погляду тэматыкі і задач раздзелаў.

Змест раздзела «Засцярога ад надзвычайных сітуацый» уключае сістэму ведаў пра надзвычайныя сітуацыі, цесную ўзаемасувязь паміж станам навакольнага асяроддзя, створанай чалавекам тэхнасферай, сацыяльнай сферай і катастрофамі.

У раздзел «Засцярога ад надзвычайных сітуацый» састаўной часткай увайшоў матэрыял аб пажарнай бяспецы. Змест раздзела накіраваны на развіццё ў вучняў здольнасці ацэньваць небяспечныя сітуацыі, прымаць рашэнні і дзейнічаць бяспечна з улікам сваіх магчымасцей, весці сябе так, каб не зрабіцца прычынай небяспечных сітуацый.

У працэсе вывучэння раздзела «Навакольнае асяроддзе і бяспека» вучні атрымаюць навыкі бяспечных паводзін у найбліжэйшым асяроддзі (у доме, двары, установах адукацыі, на вадаёмах і каля іх у розныя поры года, у прыродных умовах, пры сустрэчы з жывёламі), якія змогуць выкарыстоўваць у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці. Вучні навучацца быць пільнымі і асцярожнымі, а ў выпадку неабходнасці аператыўна і правільна звяртацца (выклікаць) у адпаведныя службы экстранай дапамогі.

Раздзел «Здаровы лад жыцця» рашае задачы маральнага выхавання навучэнцаў, атрымання імі сістэматызаваных уяўленняў пра асабістае здароўе, здаровы лад жыцця, фарміраванне індывідуальнай сістэмы здаровага ладу жыцця, захавання і ўмацавання здароўя. У вучэбнай праграме надаецца ўвага фарміраванню карысных звычак. Асобна прадстаўлены матэрыял пра шкодныя звычкі (курэнне тытуню, ужыванне наркатычных

рэчываў і алкаголю): яны разглядаюцца з пункту погляду ўплыву на здароўе і з пункту погляду наступстваў, да якіх могуць прывесці.

Настаўнік мае права змяніць паслядоўнасць вывучэння раздзелаў і тэм для кожнага класа з улікам мясцовых умоў і наяўнасці матэрыяльна-тэхнічнай базы пры ўмове захавання цэласнасці сістэмы падрыхтоўкі вучняў, не парушаючы пры гэтым логікі вывучэння.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (34 г)

Раздзел «Асабістая і калектыўная бяспека» (16 г)

Правілы дарожнага руху (12 г)

Азнаямленне з асноўнымі паняццямі правіл дарожнага руху

Дарожны рух, удзельнік дарожнага руху (вадзіцель, пасажыр, пешаход). Элементы дарогі: праезная частка, астравок бяспекі, тратуар, пешаходны пераход (наземны, падземны, надземны), пешаходная дарожка, пункт прыпынку маршрутных транспартных сродкаў. Транспартныя сродкі: аўтамабіль (легкавы аўтамабіль, грузавы аўтамабіль, аўтобус); веласіпед; колавы трактор; прычэп; мапед; матацыкл; трамвай; тралейбус; гужавы транспартны сродак; транспартны сродак аператыўнага прызначэння. Ступень небяспечнасці кожнага з іх (пп. 2.17, 2.77, 2.8, 2.44, 2.46, 2.55, 2.42, 2.72, 2.49, 2.47, 2.78, 2.1, 2.2, 2.5, 2.22, 2.27, 2.28, 2.54, 2.67, 2.71, 2.13 п. 2 Правіл).

Бяспечны маршрут у школу і са школы дамоў

Перамяшчэнне ў школу і са школы дамоў, выкарыстанне святлоадбівальных элементаў. Схемы індывідуальных маршрутаў («дом – школа – дом»), патэнцыяльныя небяспечнасці на іх.

Святлафор

Віды святлафораў. Сігналы святлафора, іх прызначэнне. Абавязак удзельнікаў дарожнага руху кіравацца сігналамі святлафора (п. 39, 42 і дадатак 1 да Правіл).

Надвор'е, пара года і дарога

Уплыў пары года, умоў надвор'я і часу сутак на бяспеку дарожнага руху. Правілы бяспечных паводзін пры руху на дзіцячых веласіпедах, роліках, лыжах, санках і каньках.

Знаёмства з дарожнымі знакамі і дарожнай разметкой (на ўзроўні азнаямлення)

Дарожныя знакі: «Пешаходная дарожка», «Канец пешаходнай дарожкі»; «Пешаходны пераход», «Падземны пешаходны пераход», «Надземны пешаходны пераход»; «Веласіпедная дарожка», «Канец веласіпеднай дарожкі»; «Жылая зона», «Канец жылой зоны»; «Пункт прыпынку» (дарожныя знакі 4.6.1, 4.6.2, 5.16.1, 5.16.2, 5.17.1, 5.17.2, 5.17.3, 5.17.4, 4.5.1, 4.5.2, 5.38, 5.39, 5.12.1, 5.12.2, 5.13.1, 5.13.2, 5.14.1 – дадатак 2 да Правіл, гарызантальная дарожная разметка 1.29–1.31 – дадатак 3 да Правіл).

Паводзіны на пункце прыпынку маршрутных транспартных сродкаў

Аўтобус, тралейбус, трамвай – маршрутныя транспартныя сродкі. Зона пункта прыпынку. Правілы паводзін на пасадачных пляцоўках пры чаканні, па прыбыцці і пры адпраўцы маршрутных транспартных сродкаў. Пасадка ў маршрутны транспартны сродак, паводзіны ў ім і выхад з яго. Правілы пераходу дарогі пры высадцы з маршрутнага транспартнага сродку. Староннія прадметы і бяспека дарожнага руху (пп. 2.25, 18.4, п. 23, 24 Правіл).

Агульныя правілы пераходу праезнай часткі дарогі

Пераход праезнай часткі дарогі ў спецыяльна абазначаных для пераходу месцах (п. 17 Правіл, дадатак 1 да Правіл, дарожныя знакі 5.16.1, 5.16.2, дадатак 2 і лініі дарожнай разметкі 1.14.1–1.14.3, дадатак 3 да Правіл). Пераход праезнай часткі ў дварыі.

Дарожная разметка на пешаходным пераходзе

Прызначэнне гарызантальной дарожнай разметкі. Сувязь паміж значэннем гарызантальнай дарожнай разметкі, дарожных знакаў і сігналамі святлафораў на пешаходным пераходзе. Паўтарэнне асноўных правіл пераходу праезнай часткі дарогі (п. 17, 39, 42, 114 Правіл, дадатак 1 да Правіл, дарожныя знакі 5.16.1, 5.16.2, дадатак 2 і

лініі гарызантальнай дарожнай разметкі 1.14.1–1.14.3, 1.15, 1.17.1, 1.17.2, дадатак 3 да Правіл).

Асабістая бяспека (4 г)

Бяспечнае асяроддзе дома

Азнаямленне з паняццямі «небяспечнасць», «бяспека». Паводзіны дома ў выпадку адсутнасці дарослых. Дзеянні пры званку ў дзверы, спробе пранікнення ў кватэру чужога чалавека.

Спосабы захоўвання ключа ад дома. Адрас і тэлефон – канфідэнцыйная інфармацыя.

Правілы міжасобасных адносін

Спрэчка з сябрамі – крыніца небяспечнасці. Маўленчыя канфлікты і іх вырашэнне.

Правілы паводзін у выпадку знаходжання безгаспадарчых ці падазроных прадметаў

Безгаспадарчыя ці падазроныя прадметы. Дзеянні пры знаходжанні безгаспадарчых, падазроных, выбуханебяспечных прадметаў.

Раздзел «Засцярога ад надзвычайных сітуацый» (5 г)

Пажарная бяспека

Азнаямленне з надзвычайнымі сітуацыямі (на ўзроўні ўяўленняў)

Агонь карысны і небяспечны

Агульныя звесткі аб працэсе гарэння (на ўзроўні ўяўленняў), пажары і яго развіцці. Карысць, якую прыносіць агонь чалавеку. Уменне чалавека выкарыстоўваць агонь на карысць. Шкод, які наносіць агонь, што выйшаў з-пад кантролю.

Пажары ад гульняў дзяцей з агнём

Пажаранебяспечныя гульні дзяцей. Пажары, што ўзнікаюць ад гульняў дзяцей з запалкамі, запальнічкамі, іншымі прадметамі, якія могуць стаць прычынай узгарання ў доме. Наступствы пажараў. Меры па іх папярэджанні.

Папярэджанне пажараў і траўмаў у быце

Узнікненне пажараў ад электрапрыбораў (на ўзроўні ўяўленняў). Навыкі правільнага карыстання электрапрыборамі (уключэнне, выключэнне). Правілы паводзін, якія дазваляюць пазбегнуць апёкаў і траўмаў у кватэры (доме), у памяшканнях малой плошчы.

Спосабы паведамлення пра неабходнасць аказання дапамогі пры пажары

Выклік пажарнай службы па тэлефоне. Звесткі, якія пры гэтым неабходна паведаміць. Іншыя спосабы паведамлення: зварот да дарослых (суседзяў, прахожых), падача сігналу аб сваім месцы знаходжання пасля прыбыцця пажарнай службы. Шкод, што наносіцца падманным выклікам.

Раздзел «Навакольнае асяроддзе і бяспека» (5 г)

Правілы бяспечных паводзін на вадзе

Возера, рэкі, іншыя прыродныя вадаёмы, басейны, аквапаркі, ванны. Правілы бяспечных паводзін пры купанні. Небяспечнасць знаходжання каля вадаёмаў у розныя поры года.

Бяспечныя паводзіны дома

Мачымыя небяспечнасці ў жылых і адміністрацыйных памяшканнях, небяспечнасць вышыні. Бяспечныя і небяспечныя прадметы ў доме (газавая і электрычная пліты, прас, сталовыя прылады, інструменты для рукадзелля і дробнага рамонту). Бяспечное абыходжанне з прадметамі хатняга ўжытку.

Паводзіны на лесвічнай пляцоўцы, па-за памяшканнем, якое выпадкова замкнулася (кватэра, ліфт, дача). Паводзіны з суседзямі і чужымі людзьмі. Бяспека пры ўваходзе ў пад’езд, ліфт. Паводзіны ў ліфце.

Бяспечныя паводзіны ў двары

Бяспечныя гульні ў двары. Гульнявая пляцоўка. Арэлі і бяспека. Небяспечнасці ў склепах, ліфтах, на гарышчах. Паводзіны з чужымі людзьмі. Месца асаблівай небяспечнасці (драбіны, ачышчальныя збудаванні, калодзежы, траншэі).

Бяспечнае асяроддзе ва ўстанове адукацыі

Калідоры, класы і іншыя памяшкання, іх прызначэнне. Бяспечнае абыходжанне з прадметамі ў класе. Бяспечныя паводзіны ў класе (у калідорах, на лесвіцах, у гардэробе, на прышкольнай тэрыторыі). Правілы захавання асабістых рэчаў.

Хатнія жывёлы

Хатнія жывёлы ў горадзе і свойскія ў сельскай мясцовасці. Выпадкі агрэсіўнасці і шаленства жывёл. Магчымасць траўмаў ад жывёл і іх наступствы. Меры бяспекі пры абыходжанні і догляд хатніх жывёл.

Раздзел «Здаровы лад жыцця» (8 г)

Актыўныя формы здаровага ладу жыцця

Значэнне рэжыму дня, ранішняй гімнастыкі і загартоўвання для здароўя. Адзенне па сезоне. Роля заняткаў фізкультурай і спортам.

Правілы гігіены

Асабістая гігіена, мыццё рук. Шляхі перадачы інфекцыйных захворванняў. Прафілактыка захворванняў, выкліканых паразітамі.

Харчаванне і здароўе

Здаровае харчаванне. Прафілактыка пераядання. Гігіена харчавання.

Карысныя і шкодныя звычкі

Карысныя звычкі і іх уплыў на здароўе. Пагубныя наступствы шкодных звычак (уплыў алкаголю і наркотыкаў на здароўе і паводзіны чалавека; шкод, які наносіцца курэннем здароўю чалавека).

Парадак выкліку «хуткай дапамогі»

Навучанне парадку выкліку «хуткай дапамогі»: паведамленне прозвішча, імя, апісання месца здарэння, нумара ўстановы адукацыі, дамашняга адраса. Адказнасць за падманны выклік.

Асобасныя вынікі вучэбнай дзейнасці:

разуменне значнасці ведаў пра бяспечныя паводзіны і выкананне правіл дарожнага руху для бяспечнай жыццядзейнасці;

разуменне значнасці выканання правіл бяспекі падчас руху ў школу і са школы дамоў;

здольнасць вызначаць патэнцыйна небяспечныя месцы, усведамленне небяспечнасці іх самастойнага наведвання;

здольнасць вызначаць патэнцыйна небяспечныя прадметы ў побыце;

здольнасць адрозніваць небяспечныя сітуацыі і адэкватна дзейнічаць для гарантавання ўласнай бяспекі;

наяўнасць такіх якасцей асобы, як уважлівасць і асцярожнасць;

усведамленне неабходнасці ўзаемадзеяння з дарослымі пры ўзнікненні небяспечных сітуацый;

здольнасць выконваць патрабаванні дарослых у небяспечных сітуацыях.

Прадметныя вынікі вучэбнай дзейнасці:

разуменне ўзаемасувязі паміж небяспечнай сітуацыяй і неабходнасцю выкарыстоўваць веды пра меры па яе папярэджанні;

здольнасць прымяняць веды, атрыманыя пры вывучэнні іншых прадметаў, для разумення і аналізу патэнцыйных небяспечнасцей навакольных з'яў;

наяўнасць вопыту бяспечных паводзін у выпадку ўзнікення небяспечнай сітуацыі ў непасрэднай зоне пастаяннага пражывання (кватэра, двор) і часовага знаходжання;

уменне весці сябе бяспечна ў найбольш тыповых сітуацыях дарожнага руху;

уменне граматна прымяняць веды пажарнай бяспекі ў выпадках ўзгарання ў асобных памяшканнях кватэры, пры ўзгаранні электрапрыбораў;

здольнасць адрозніваць небяспечныя сітуацыі пры абыходжанні з іншымі людзьмі;

уменне весці сябе бяспечна пры знаходжанні дома без дарослых, па-за домам у суправаджэнні дарослых;

уменне самастойна эвакуіравацца з памяшкання пры ўзнікненні небяспечнасці;

уменне выклікаць пажарную службу і «хуткую дапамогу».

Змест вучэбнага прадмета «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» для II класа абумоўлівае выкарыстанне наступных **відаў і спосабаў дзейнасці**:

рэгулятыўныя: складанне плана і паслядоўнасці дзеянняў пры рашэнні сітуацыйных задач; ацэнка вынікаў сваёй дзейнасці; пастаноўка мэт; мадэляванне сітуацый з праяўленнем бяспечных паводзін ва ўмовах паўсядзённага жыцця; складанне пад кіраўніцтвам настаўніка схем, інструкцый, алгарытмаў бяспечных паводзін; аналізу спецыяльнай інфармацыі, якая атрымліваецца з разнастайных крыніц; трэнінг па правільным выкліку па тэлефоне пажарнай службы і «хуткай дапамогі»;

камунікатыўныя: адказы на пытанні па змесце праслуханай інфармацыі; уключэнне ў дыялог, удзел у абмеркаванні пытанняў; выказыванне свайго пункту погляду і ўлік пункту погляду іншых людзей; доказ уласнага пункту погляду; планаванне вучэбнага супрацоўніцтва з настаўнікам і равеснікамі; выкананне разнастайных сацыяльных роляў у калектыве;

пазнавальныя: успрыманне на слых інфармацыі; успрыманне візуальнай інфармацыі; распазнаванне разнастайных небяспечных і надзвычайных сітуацый навакольнага асяроддзя (ва ўстанове адукацыі, у хатніх умовах, у транспартных сродках, на дарогах, у двары, у прыродзе) па характэрных прыметах іх з'яўлення; знаёмства з новымі паняццямі; разгляд, аналіз і рашэнне сітуацыйных задач (з выкарыстаннем слайдаў мультымедыйнай прэзентацыі), звязаных з дарожным рухам, з пажарнай бяспекай; аналіз аб'ектаў, выбар падстаў і крытэрыяў для параўнання; правядзенне назіранняў; вывучэнне правіл дарожнага руху, правіл бяспечных паводзін удзельнікаў дарожнага руху на дарогах, у транспартных сродках, вывучэнне правіл пажарнай бяспекі, бяспечных паводзін дома ў выпадку адсутнасці дарослых, паводзін у выпадку знаходжання безгаспадарчых ці падазроных прадметаў, правіл паводзін пры сустрэчы з незнаёмымі людзьмі, правіл здаровага ладу жыцця; практыкумы па набыцці звычкі выконваць правілы дарожнага руху ў якасці і пешахода, і пасажыра; маляванне і расфарбоўванне ў адпаведнасці з тэмай урока; выкананне тэматычных гульнявых практыкаванняў; самастойнае выкананне заданняў у адпаведнасці з тэматыкай вучэбнай праграмы, творчых заданняў.

Для дыягностыкі сфарміраванасці ўменняў і навыкаў рэкамендуюцца наступныя ***формы кантролю***: франтальнае апытанне; індывідуальнае апытанне; практыкум; тэсціраванне.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская мова»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з рускай мовай навучання і выхавання

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Ва ўмовах інфармацыйнага грамадства асаблівай увагі ў працэсе навучання беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі патрабуе развіццё моўнай асобы, яе здольнасцей і творчага патэнцыялу, неабходных для актыўнай дзейнасці, сацыяльнага самавызначэння і самарэалізацыі.

Мэта навучання – авалоданне навучэнцамі камунікатыўнымі ўменнямі і навыкамі, неабходнымі для эфектыўнага выкарыстання мовы ў розных сітуацыях зносін, развіццё іх творчага патэнцыялу, далучэнне праз мову да культурных традыцый беларускага народа.

Задачы навучання беларускай мове ў I–IV класах:

1) у межах *моўнай* кампетэнцыі:

асэнсаванне тэксту, сказа, слова і гука з пункту погляду іх функцыянавання;

авалоданне графікай беларускай мовы;

засваенне фанетычных, лексічных і граматычных ведаў для прымянення іх у маўленчай дзейнасці;

узбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў, засваенне вымаўленчых нормаў, правілаў правапісу;

2) у межах маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі:

фарміраванне камунікатыўных уменняў і навыкаў навучэнцаў;

развіццё практычных уменняў і навыкаў выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці;

развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў;

3) у межах лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый:

фарміраванне пачуццёва-вобразнага ўспрымання беларускай мовы і ўмення адрозніваць яе ад рускай мовы;

асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай культурнай каштоўнасці;

фарміраванне асэнсаванага ўспрымання беларускай літаратурнай мовы як сродку замацавання культурных традыцый, маральных каштоўнасцей грамадства;

засваенне правіл маўленчага этыкету, сацыяльных норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін;

фарміраванне ў навучэнцаў пачуцця прыгажосці, мілагучнасці, выразнасці, эстэтычнай вартасці беларускай мовы.

Напрамкі навучання

Працэс развіцця асобы вучня пры навучанні беларускай мове павінен быць узаемазвязаным і садзейнічаць рэалізацыі наступных напрамкаў: ***моўнага*** (засваенне сістэмы мовы, заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, норм беларускай літаратурнай мовы), ***маўленчага*** (авалоданне спосабамі перадачы думкі сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай формах, у розных відах маўленчай дзейнасці: чытанні, слуханні, гаварэнні, пісьме), ***камунікатыўнага*** (авалоданне культурай маўлення, правіламі маўленчых зносін, уменнямі ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных відаў), ***лінгвакультуралагічнага*** (асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай каштоўнасці, сродку замацавання культурных традыцый, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы), ***сацыякультурнага*** (засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін, культурных каштоўнасцей беларускага народа і агульначалавечых каштоўнасцей, авалоданне правіламі беларускага маўленчага этыкету).

У аснову пабудовы курса беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі кладуцца зыходныя палажэнні *кампетэнтнаснага, лінгвакультуралагічнага, камунікатыўна-дзейнаснага і асобасна арыентаванага падыходаў.*

Кампетэнтнасны падыход у навучанні мове прадугледжвае разам з атрыманнем ведаў аб мове развіццё ўменняў аналізаваць і сістэматызаваць моўную інфармацыю, прымяняць яе ў маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з асобаснымі запатрабаваннямі для рашэння вучэбных, пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач. Рэалізацыя гэтага падыходу мае на ўвазе фарміраванне ў навучэнцаў шэрагу кампетэнцый. Кампетэнцыі ў моўнай адукацыі адлюстроўваюць здольнасць рэалізацыі моўных ведаў і ўменняў праз маўленчую дзейнасць у розных сітуацыях зносін, у тым ліку ў працэсе навучання. Асаблівасцю кампетэнтнаснага падыходу з'яўляецца метапрадметнасць – установка на фарміраванне ў навучэнцаў універсальных (агульнавучэбных) уменняў, галоўнымі з якіх з'яўляюцца ўменні мэтамеркавання, планавання, кантролю, ацэнкі (рэгулятыўныя).

Змест кампетэнцый, якія фарміруюцца пры вывучэнні беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

моўная кампетэнцыя ўключае веды аб сістэме мовы, яе адзінках (тэкст, сказ, слова, гукі мовы) і правілах іх функцыянавання ў маўленні; уменні вылучаць адзінкі мовы, праводзіць розныя віды разбору (гука-літарны, разбор слова па саставе, па часцінах мовы, разбор па членах сказа); валоданне нормамі беларускай літаратурнай мовы;

маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя ўключае валоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці; фарміраванне маўленчых паводзін, адэкватных мэтам і сітуацыям зносін; уменні выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў адпаведнасці з іх значэннем, выбіраць патрэбную моўную форму і спосабы выказвання думкі ў залежнасці ад умоў камунікацыі;

лінгвакультуралагічная кампетэнцыя ўключае асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай каштоўнасці, сродку замацавання культурных традыцый, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы, авалоданне правіламі беларускага маўленчага этыкету;

сацыякультурная кампетэнцыя ўключае ўсведамленне ролі беларускай мовы ў жыцці чалавека, паважлівае стаўленне да культуры і мовы беларускага народа і іншых народаў, засваенне сістэмы агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін.

Працэс навучання беларускай мове скіраваны на дасягненне наступных метапрадметных вынікаў навучання:

уменне ўспрымаць і асэнсоўваць вучэбны матэрыял, які прад'яўляецца ў вербальнай форме, выдзяляць галоўнае ў ім, рацыянальна запамінаць, выконваць разумовыя аперацыі;

уменне выкарыстоўваць маўленчыя сродкі і сродкі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для рашэння камунікатыўных і пазнаваўчых задач;

уменне працаваць з вучэбнай кнігай, іншымі друкаванымі і аўдыявізуальнымі крыніцамі інфармацыі;

уменне працаваць з інфармацыяй (пошук, прымяненне, захаванне), рыхтаваць сваё выступленне і выступаць з аўдыя-, відэа- і графічным суправаджэннем;

уменне слухаць суразмоўцу і весці дыялог, прызнаваць наяўнасць розных пунктаў погляду, выказваць сваё меркаванне і аргументаваць яго.

Сістэмна-функцыянальны падыход забяспечвае засваенне вучнямі моўных сродкаў, адбор і арганізацыю моўнага матэрыялу для авалодання *моўнай кампетэнцыяй.*

Лінгвакультуралагічны падыход да навучання прадугледжвае рэалізацыю задач фарміравання культурнага чалавека сродкамі беларускай мовы, паколькі яна з'яўляецца нацыянальнай каштоўнасцю, праяўленнем культуры народа. У логіцы лінгвакультуралагічнага падыходу мова разумеецца не толькі як сродак назапашвання ведаў і фарміравання ўменняў і навыкаў, але і як сродак станаўлення асобы навучэнца, усведамлення ім прыналежнасці да свайго народа, сваёй краіны. Праз мову адбываецца далучэнне асобы да светапогляду народа, яго гісторыі, культуры, сістэмы маральных і духоўных каштоўнасцей.

Лінгвакультуралагічны падыход рэалізуецца пры вывучэнні фактаў мовы розных узроўняў (фанетычных, лексічных, граматычных, узроўню тэксту) і знаходзіць у іх пацвярджэнне асаблівасцей узаемасувязі мовы і культуры. Важнейшым спосабам выражэння культуралагічнай інфармацыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца культурнае (намінатыўнае, эмацыянальнае, экспрэсіўнае, ацэначнае, вобразнае, матывацыйнае) значэнне вывучаемых адзінак мовы (слоў, прыказак, прымавак, формул маўленчага этыкету, тэкстаў культуразнаўчага характару). *Лінгвакультуралагічны падыход* садзейнічае фарміраванню ў вучняў *лінгвакультуралагічнай и сацыякультурнай кампетэнцый*.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход да навучання беларускай мове прадугледжвае такую арганізацыю працэсу навучання, якая максімальна набліжаецца да рэальнага працэсу маўленчых зносін. Аб'ектам навучання становіцца маўленчая дзейнасць ва ўсіх яе відах. У аснове навучання знаходзяцца рэальныя маўленчыя дзеянні навучэнцаў, якія накіраваны не толькі на ўспрыманне і разуменне вусных і пісьмовых выказванняў на

беларускай мове, але і на стварэнне беларускамоўных тэкстаў. Гэта садзейнічае развіццю маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Паколькі навучанне мове разглядаецца як культурны працэс, сутнасць якога заключаецца ў гуманістычным і творчым узаемадзеянні ўсіх яго ўдзельнікаў, яно грунтуецца на асноўных палажэннях *асобасна арыентаванага падыходу*. Гэты падыход характарызуецца тым, што у цэнтры навучальнай дзейнасці знаходзіцца асоба навучэнца (яго развіццё, задавальненне адукацыйных запатрабаванняў, інтарэсаў, творчых магчымасцяў).

Прынцыпы адбору зместу навучання:

сістэмна-функцыянальны прынцып прадугледжвае цэласнае адлюстраванне ў змесце навучання шматузроўневасці моўнай сістэмы і характарыстыку функцыянальных магчымасцей моўных адзінак кожнага ўзроўню (роля, якую яны выконваюць у маўленні);

прынцып мінімізацыі моўнага матэрыялу патрабуе адбіраць матэрыял з улікам яго значнасці для дасягнення пастаўленых мэт і задач навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

камунікатыўны прынцып азначае, што працэс навучання патрэбна забяспечыць адпаведным зместам для авалодання вучнямі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці (аўдзіраванне, гаварэнне, чытанне, пісьмо);

прынцып тэкстацэнтрызму мае на ўвазе адбор зместу навучання, які павінен забяспечыць арганізацыю адукацыйнага працэсу на аснове тэксту.

Змест вучэбнага прадмета «Беларуская мова» складаюць:

1. Моўныя веды, уменні і навыкі (веды аб сістэме моўных адзінак і заканамернасцях іх функцыянавання, фанетыка-артыкуляцыйныя навыкі, лексічныя, лексіка-граматычныя, арфаграфічныя і пунктуацыйныя ўменні і навыкі).

2. Маўленчыя ўменні і навыкі (уменні і навыкі ў розных відах маўленчай дзейнасці: аўдзіраванні, чытанні, гаварэнні, пісьмовым маўленні).

3. Камунікатыўныя ўменні і навыкі (уменні і навыкі выкарыстання розных відаў маўленчай дзейнасці ў пэўных маўленчых сітуацыях).

4. Агульныя звесткі пра беларускую мову, формы яе існавання і сферы ўжывання, культурную і эстэтычную самакаштоўнасць беларускай мовы.

5. Традыцыйны маўленчы этыкет, моўная норма, міжмоўная аманімія.

Сістэма развіцця маўлення скіравана на авалоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці, фарміраванне ў навучэнцаў здольнасці разумець праслуханае ці прачытанае маўленчае паведамленне на беларускай мове, ствараць вуснае выказванне на беларускай мове для задавальнення камунікатыўнага намеру, паступовае авалоданне пісьмовым маўленнем. Для дасягнення пастаўленай мэты змест сістэмы развіцця маўлення прадстаўлены ў трох кірунках:

фарміраванне правільнага ўспрымання і разумення беларускай мовы пры слуханні і чытанні;

фарміраванне ўменняў гаварэння;

фарміраванне ўменняў пісьмовага маўлення.

Змест навучання па кожным кірунку размяркоўваецца з паступовым ускладненнем у кожным наступным класе і вызначае асноўныя віды вучэбнай работы, якімі павінны авалодаць навучэнцы на працягу ўсяго вучэбнага года. Гэтыя віды работы пададзены ў вучэбнай праграме ў канцы кожнага раздзела. Развіццё маўлення адбываецца праз павелічэнне самастойнасці навучэнцаў пры выкананні заданняў і практыкаванняў.

Навучанне беларускай мове пачынаецца з **падрыхтоўчага** перыяду (I клас, вусны курс). Яго дамінуючымі задачамі з'яўляюцца фарміраванне ўменняў асэнсаванага ўспрымання беларускага маўлення на слых, выхаванне ў навучэнцаў актыўнай слухацкай пазіцыі, тактоўнага слухача, выпрацоўка вымаўленчых навыкаў, прапедэўтыка навучання чытанню па-беларуску, забеспячэнне станоўчага эмацыянальнага фону і матывацыі вывучэння беларускай мовы. Практычнае авалоданне лексічным багаццем мовы ажыццяўляецца ў час суразмоўніцтва па змесце пачутага ці прачытанага тэксту, у працэсе

вядзення дыялогаў. У час суразмоўніцтва адбываецца азнаямленне навучэнцаў з маўленчым этыкетам.

Вывучэнне беларускай мовы працягваецца інтэграваным **уступным курсам** (пачатак II класа). Вядучай задачай гэтага курса з'яўляецца навучанне чытанню. На працягу ўступнага курса ўрокі маюць інтэграваны характар і праводзяцца без падзелу на ўрокі мовы і літаратурнага чытання. Адначасова з навучаннем чытанню навучэнцы авалодваюць графічнай сістэмай беларускай мовы, працягваюць практыкавацца ва ўспрыманні тэкстаў на слых, удасканальваюць вымаўленчыя навыкі. Падчас чытання і спісвання слоў, сказаў, тэкстаў адбываецца назіранне за графіка-арфаграфічнымі асаблівасцямі беларускай мовы.

Далейшае навучанне мове структуруецца па раздзелах «Гукі і літары», «Слова», «Сказ», «Тэкст». Паступовае асваенне навучэнцамі маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі адбываецца на матэрыяле гэтых раздзелаў.

Раздзел «Гукі і літары» вырашае задачы ўдасканалення фанетычных і графічных уменняў і навыкаў навучэнцаў. Пры вывучэнні раздзела даецца агульнае паняцце аб гукавым саставе слова, ролі галосных і зычных гукаў у слове, удасканальваюцца правапісныя ўменні, якія звязаны з напісаннем галосных у ненаціскным становішчы, абазначэннем цвёрдых і мяккіх, звонкіх і глухіх, падоўжаных зычных на пісьме. Фарміруецца ўменне правільна называць літары алфавіта і карыстацца ім, абазначаць гукі літарамі.

Раздзел «Слова» змяшчае звесткі пра слова як лексічную адзінку мовы, як назву таго, што можа быць прадметам думкі. У навучэнцаў фарміруюцца ўяўленні пра падзел слоў на часціны мовы (на лагічнай аснове: па пытанні і значэнні).

Раздзел «Сказ» (II клас) змяшчае звесткі пра сказ як асноўную камунікатыўную адзінку мовы. Уменні вызначаць граматычную аснову сказа, устанаўліваць сувязь паміж словамі ў сказе, ужываць сказы, розныя па мэце выказвання, інтанацыі і будове, выкарыстоўваюцца навучэнцамі для самастойнай пабудовы звязных вусных выказванняў.

Вывучэнне раздзела «Тэкст» забяспечвае навучэнцаў неабходнымі ведамі і ўменнямі для актыўных маўленчых дзеянняў па стварэнні тэкстаў. Асаблівасцю вывучэння тэксту з'яўляецца тое, што ён разглядаецца як вынік маўленчай дзейнасці. Вывучэнне раздзела «Тэкст» мае практычную накіраванасць.

Асноўная задача навучання каліграфіі – развіццё ў навучэнцаў уменняў і навыкаў плаўнага, правільнага, прыгожага і хуткага пісьма. Практыкаванні па каліграфіі праводзяцца на кожным уроку ў II класе. У навучэнцаў выпрацоўваюцца навыкі напісання спецыфічных беларускіх літар (***І***, ***і***, ***ў***), слоў з апострафам, удасканальваюцца навыкі правільнага злучэння літар у словах. Пачынаючы з другога паўгоддзя практыкаванні па каліграфіі перыядычна праводзяцца на аркушах паперы з разліноўкай у адну лінейку. Змест працы па каліграфіі па магчымасці звязваецца з вывучаемым на ўроку фанетычным, лексічным, граматычным матэрыялам.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА (94 г)

Уступны курс (18 г)

Удасканаленне ўменняў асэнсаванага ўспрымання беларускай мовы на слых: прагназаванне зместу тэксту па ілюстрацыі і загалоўку; актыўнае слуханне; гутарка па змесце пачутага тэксту, вызначэнне дзеючых асоб, іх учынкаў, паслядоўнасці падзей, выказванне адносін да падзей тэксту. Асэнсаванне вылучанай настаўнікам лінгвакультуралагічнай інфармацыі тэксту.

Фарміраванне навыкаў чытання і элементарнага пісьма на беларускай мове. Узнаўленне і ўдасканаленне навыкаў вымаўлення гукаў [ў], [г], [ч], [р], [ц'], спалучэнняў гукаў [шч], [дз'], [дж]. Абазначэнне іх літарамі, прапісванне літар, складоў і слоў. Чытанне слоў, сказаў, тэкстаў. Распазнаванне літары ***і***, апострафа. Фарміраванне графічных навыкаў напісання І, ***і***, апострафа. Чытанне і пісьмо слоў з імі.

Фарміраванне першапачатковых чытацкіх уменняў: прагназаванне зместу тэксту па ілюстрацыі і загалоўку; вызначэнне дзеючых асоб, іх учынкаў, паслядоўнасці падзей; вылучэнне незразумелых слоў і выразаў, устанаўленне іх значэння з дапамогай настаўніка; выказванне адносін да падзей тэксту.

Віды дзейнасці

Чытанне тэкстаў, выяўленне іх разумення ў гутарцы па змесце. Ажыццяўленне сама- і ўзаемакантролю правільнасці чытання. Праглядавае чытанне тэксту з мэтай адшукаць адказ на пытанне. Вылучэнне з праслуханага тэксту слоў з гукамі [ў], [г], [ч], [р], [ц’]*, са спалучэннямі гукаў* [шч], [дз’], [дж]*. Арфаэпічна правільнае вымаўленне і завучванне скорагаворак, невялікіх вершаў з гэтымі гукамі. Стварэнне з дапамогай настаўніка выказвання па малюнках і апорных словах. Вусны пераказ тэксту па пытаннях, апорных словах, прапанаваных настаўнікам.*

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць:

гукі і літары беларускай мовы, якія адрозніваюць яе ад рускай мовы.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

правільна вымаўляць гукі [ў], [г], [ч], [р], [ц’], спалучэнні гукаў [шч], [дз’], [дж], абазначаць іх літарамі;

правільна пісаць літары І, ***і***, апостраф;

правільна чытаць склады і словы з гукамі [ў], [г], [ч], [р], [ц’], спалучэннямі гукаў [шч], [дз’], [дж], з літарамі ***І, і***, апострафам.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

адшукваць адказ на пытанне ў прачытаным і праслуханым тэксце;

удзельнічаць у дыялогах на даступныя тэмы з захаваннем арфаэпічна правільнага вымаўлення гукаў [ў], [г], [ч], [р], [ц’], спалучэнняў гукаў [шч], [дз’], [дж];

правільна абазначаць на пісьме гукі [ў], [ц’], спалучэнні гукаў [шч], [дз’], [дж], правільна пісаць словы з літарамі І, ***і***, апострафам пры выкананні пісьмовых заданняў і ўласных запісаў (запіска, віншаванне, перапіска з сябрамі, сваякамі).

Гукі і літары

(54 г, з іх 1 г – кантрольнае спісванне)

Гукі і літары. Абазначэнне гукаў на пісьме літарамі.

Беларускі алфавіт. Знаёмства з арфаграфічным слоўнікам.

Роля вялікай літары ў мове: напісанне ў пачатку сказа, у імёнах і прозвішчах людзей, клічках жывёл, назвах краін, гарадоў, вёсак, рэк, азёр, вуліц, праспектаў, плошчаў.

Галосныя і зычныя гукі.

Вымаўленне і правапіс слоў з літарай ***ў***. Ужыванне ***ў*** у беларускай мове замест ***в, л*** у рускай мове.

Склад. Падзел слоў на склады.

Правілы пераносу слоў. Перанос слоў з літарамі ***ў, й, дз, дж, ь***.

Націск. Вызначэнне націскных і ненаціскных складоў. Словы беларускай і рускай мовы, якія адрозніваюцца націскам.

Вымаўленне галосных гукаў [о], [э] – [а]. Правапіс літар ***о, э – а; е, ё – я***.

Вымаўленне і правапіс цвёрдых і мяккіх зычных: абазначэнне мяккасці зычных літарамі ***е, ё, і, ю, я***, ***ь***; ужыванне парных [д] – [дз’], [т] – [ц’], зацвярдзелых [ж], [дж], [р], [ч], [ш], [ц] і галосных пасля іх.

Вымаўленне і правапіс парных звонкіх і глухіх зычных [б] – [п], [г] – [х], [д] – [т], [з] – [с], [б’] – [п’], [г’] – [х’], [дз’] – [ц’], [з’] – [с’], [ж] – [ш], [дж] – [ч] на канцы слоў і перад зычнымі.

Вымаўленне і правапіс падоўжаных зычных. Перанос слоў з імі.

Раздзяляльны ***ь*** і апостраф. Вымаўленне, правапіс і перанос слоў з імі.

Віды дзейнасці

Вусны і пісьмовы пераказ прачытанага тэксту па пытаннях і апорных словах, прапанаваных настаўнікам. Пабудова вуснага выказвання на вызначаную тэму па малюнках і апорных словах. Падзел праслуханага тэксту на сэнсавыя часткі і пераказ яго. Падбор апорных слоў і стварэнне вуснага выказвання па малюнку. Развіццё сказаў тэксту па пытаннях словамі, прапанаванымі настаўнікам. Вызначэнне на слых у праслуханым тэксце слоў з указанымі настаўнікам арфаграмамі. Вядзенне дыялогу па зададзеным узоры.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

беларускі алфавіт;

галосныя і зычныя гукі;

сэнсаадрознівальную ролю гукаў;

складаўтваральную ролю галосных гукаў;

сэнсаадрознівальную ролю націску ў словах;

цвёрдыя і мяккія зычныя;

парныя звонкія і глухія зычныя;

асноўныя нормы беларускага правапісу:

– правапіс літар ***о, э – а*** пад націскам і ў ненаціскных складах;

– правапіс літар ***ё, е – я*** пад націскам, у першым пераднаціскным складзе і іншых ненаціскных складах;

– правапіс слоў з парнымі звонкімі/глухімі зычнымі на канцы слоў і перад зычнымі;

– правапіс літар ***т – ц, д – дз***;

– правапіс слоў з зацвярдзелымі зычнымі;

– правапіс слоў з падоўжанымі зычнымі;

– напісанне апострафа і раздзяляльнага ***ь***;

– напісанне літары ***ў*** пасля літар галосных гукаў;

– напісанне вялікай літары ў імёнах і прозвішчах людзей, мянушках жывёл, назвах краін, гарадоў, вёсак, рэк, азёр, вуліц, праспектаў, плошчаў.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

адрозніваць гукі і літары;

адрозніваць гукі галосныя і зычныя; парныя звонкія і глухія зычныя, цвёрдыя і мяккія зычныя;

выдзяляць гукі са слоў, характарызаваць іх у адпаведнасці з вывучанымі прыметамі;

абазначаць гукі літарамі ў адпаведнасці з вывучанымі нормамі беларускай графікі і правапісу;

падзяляць словы на склады і для пераносу;

вызначаць націскныя і ненаціскныя склады;

правяраць правапіс слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі;

карыстацца арфаграфічным слоўнікам.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

практычна выкарыстоўваць алфавіт пры рабоце з бібліятэчным каталогам, пры складанні спіса;

захоўваць найбольш распаўсюджаныя арфаэпічныя нормы (вымаўленне [о], [э] – [а], [ў], [г], [г’], [ч], [р], [ц’], спалучэнняў гукаў [шч], [дз’], [дж], парных звонкіх і глухіх зычных);

захоўваць вывучаныя нормы арфаграфіі пры выкананні пісьмовых заданняў і ўласных запісаў (запіска, віншаванне, перапіска з сябрамі, сваякамі).

Слова (8 г)

Значэнне слова. Знаёмства з руска-беларускім і беларуска-рускім слоўнікамі.

Словы, якія называюць прадметы. Прыназоўнік, правапіс прыназоўнікаў (на практычным узроўні). Словы, якія называюць прыметы прадметаў. Словы, якія называюць дзеянні прадметаў.

Віды дзейнасці

Развіццё сказаў тэксту патрэбнымі па сэнсе словамі з дапамогай слоўніка. Пісьмовы пераказ прачытанага тэксту па пытаннях, складзеных калектыўна. Вусны пераказ праслуханага тэксту па пытаннях, прапанаваных настаўнікам. Вядзенне дыялогу з ужываннем этыкетных слоў і выразаў, прапанаваных настаўнікам.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

пытанні, на якія адказваюць словы, што абазначаюць назвы прадметаў, прыметы прадметаў, дзеянні прадметаў.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

карыстацца руска-беларускім і беларуска-рускім слоўнікамі;

адрозніваць словы – назвы прадметаў, дзеянняў, прымет прадметаў – па значэнні і пытанні;

адрозніваць словы – назвы прадметаў, якія адказваюць на пытанні хто? што?;

ужываць прыназоўнікі для сувязі слоў у сказе і асобна пісаць іх (на практычным узроўні).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ужываць у адпаведнасці з сітуацыяй зносін ветлівыя словы і звароты (у зносінах са сваякамі, настаўнікамі, сябрамі);

практычна выкарыстоўваць алфавіт пры рабоце са слоўнікам.

Сказ (5 г, з іх 1 г – кантрольны дыктант)

Сказ як адзінка мовы (агульнае паняцце). Выражэнне ў сказе закончанай думкі. Афармленне сказа на пісьме.

Вызначэнне граматычнай асновы сказа на лагічнай аснове (па пытаннях).

Сувязь слоў у сказе. Вызначэнне сувязі слоў у сказе па пытаннях.

Віды дзейнасці

Выказванне на прапанаваную настаўнікам тэму па апорных граматычных асновах. Стварэнне вуснага выказвання на прапанаваную тэму шляхам дапаўнення граматычных асноў данымі членамі, прапанаванымі настаўнікам.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы сказа: сэнс, інтанацыя, закончанасць;

правілы афармлення пачатку і канца сказа.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

вызначаць межы сказа ў адпаведнасці з сэнсам і інтанацыяй і афармляць іх пісьмова;

вызначаць сувязь слоў у сказе па пытаннях;

вызначаць граматычную аснову ў сказе на лагічнай аснове (па пытаннях).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

удзельнічаць у дыялогах на даступныя тэмы: правільна задаваць пытанні і даваць адказы на пытанні іншых, адэкватна перадаваць эмоцыі, захоўваць неабходную інтанацыю ў межах сказа.

Тэкст (5 г)

Агульнае паняцце пра тэкст. Тэма тэксту. Прыметы тэксту: тэматычнае адзінства сказаў, сувязь сказаў у тэксце, закончанасць. Устанаўленне паслядоўнасці выказвання думкі ў тэксце.

Загаловак тэксту. Падбор загалоўка да тэксту.

Падзел тэксту на часткі: пачатак, асноўная частка, заключная частка.

Віды дзейнасці

Стварэнне пісьмовага тэксту на вызначаную тэму па апорных словах, прапанаваных настаўнікам. Пашырэнне праслуханага тэксту адной з частак (пачаткам, асноўнай часткай, заключнай часткай).

Навучальная пісьмовая работа (пераказ, 40–45 слоў – 1 гадзіна).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

прыметы тэксту (тэма, асноўная думка, загаловак);

часткі тэксту: пачатак, асноўная частка, заключная частка.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

адрозніваць тэкст ад набору сказаў, якія не звязаны паміж сабой;

вызначаць тэму тэксту;

падбіраць загаловак да тэксту, абгрунтоўваць адпаведнасць загалоўка тэксту;

падзяляць тэкст на часткі: пачатак, асноўная частка, заключная частка;

без памылак спісваць недэфармаваныя тэксты з рукапіснага ці друкаванага ўзору;

пісьмова пераказваць тэкст па пытаннях і апорных словах.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ствараць нескладаныя маналагічныя выказванні ў форме апавядання на даступныя вучням тэмы (пра сваякоў, школу, сяброў, розныя здарэнні, справы, навакольны свет, Радзіму).

Паўтарэнне (3 г)

Слоўнікавыя словы

Калідор, лесвіца, відэлец, кватэра, дождж, дзверы, талерка, рукзак, сусед, сцюжа, ёсць, Рэспубліка Беларусь, акварыум, герой, калектыў, тэатр, месяц, метро, мяккі, памяць, стадыён, тэатр, цвёрды, чацвер, мядзведзь, медаль.

Кантрольныя пісьмовыя работы:

кантрольнае спісванне – 1 (I паўгоддзе, 20–25 слоў);

кантрольны дыктант (II паўгоддзе, 25–30 слоў);

кантрольная работа па тэме – 2 (1 – I паўгоддзе, 1 – II паўгоддзе);

кантрольны слоўнікавы дыктант – 2 (I паўгоддзе, 5 слоў; II паўгоддзе, 6 слоў).

Рэзервовыя гадзіны – 1.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

**Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)»
для II класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з рускай мовай навучання і выхавання**

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА (ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Літаратурнае чытанне» ўваходзіць у адукацыйную галіну «Беларуская літаратура», з'яўляецца падрыхтоўчым этапам адзінай непарыўнай літаратурнай адукацыі. Мэта навучання літаратурнаму чытанню на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі – закласці ў вучняў асновы культурнага чытача, які ўсведамляе каштоўнасць літаратуры як мастацтва слова, можа ажыццяўляць самастойную чытацкую дзейнасць па асобасным успрыманні і асэнсаванні адпаведных узросту твораў мастацкай літаратуры.

Для рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні літаратурнаму чытанню на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вызначаны і вырашаюцца задачы па фарміраванні і развіцці ключавых кампетэнцый вучняў.

1. Сацыякультурнай кампетэнцыі:

забяспечыць усведамленне гуманістычных агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей на матэрыяле прачытаных ці праслуханых твораў;

прывучаць навучэнцаў да паслядоўнага выканання культурных норм;

актывізаваць пазнавальныя памкненні навучэнцаў у спасціжэнні беларускай нацыянальнай культуры, захаванні нацыянальна-культурных традыцый.

2. Асобаснай кампетэнцыі:

гарманічна фарміраваць навык чытання, комплекс чытацкіх уменняў, якія забяспечаць асэнсаванае ўспрыманне, поўнае, глыбокае разуменне і асобасную ацэнку маральнай праблематыкі і эстэтычнага плана твора;

стымуляваць імкненне да чытання кніг на беларускай мове;

выхоўваць павагу да кнігі як крыніцы самапазнання і развіцця.

3. Маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі:

развіваць вобразнае ўяўленне, маўленчую актыўнасць, здольнасць да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры;

фарміраваць агульнавучэбныя ўменні працы з тэкставай інфармацыяй розных відаў.

Зыходзячы з вызначаных задач, змест вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» павінен быць скіраваны на фарміраванне прыкладных аспектаў чытацкай кампетэнцыі вучняў на беларускай мове:

навыкаў чытання на беларускай мове (здольнасць правільна «агучваць» графічна зафіксаваны тэкст з разуменнем яго зместу);

уменняў асобасна асэнсаванага чытання мастацкіх і навукова-папулярных твораў, адпаведных узросту і ўзроўню валодання вучнямі маўленнем на беларускай мове;

прадуктыўнай чытацкай дзейнасці з тэкстам, кнігай на аснове комплексу бібліятэчна-бібліяграфічных уменняў.

Метадалагічнай асновай навучання літаратурнаму чытанню з'яўляюцца *культуралагічны, асобасна арыентаваны, камунікатыўна-дзейнасны і кампетэнтнасны* падыходы.

Культуралагічны падыход вызначаецца нацыянальна-культурным кантэкстам зместу вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне», яго асноўнай асветніцкай фукцыяй знаёмства вучняў з самабытнай беларускай народнай і аўтарскай літаратурнай традыцыяй, з'явамі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры, сучаснай беларускай дзіцячай літаратурай як элементам культуры. У працэсе навучання адбываецца эмацыянальнае і разумовае спасціжэнне вучнямі нацыянальных культурных адметнасцей беларускай літаратуры. У кантэксце культуралагічнага падыходу стумулюецца пазнавальная актыўнасць вучняў у спасціжэнні гістарычных, навукова-папулярных, вобразна-мастацкіх звестак пра Беларусь, яе прыроду, гісторыю, традыцыі, побыт, міфалогію і г.д.

У сувязі з тым, што навучанне літаратурнаму чытанню мае выразныя сацыяльныя і псіхалагічныя перадумовы, а працэс авалодання дзейнасцю чытання індывідуалізаваны, то вядучым метадалагічным падыходам навучання чытанню на беларускай мове з'яўляецца *асобасна арыентаваны* падыход. Асобасна арыентаваны падыход дае магчымасць авалодання чытацкай дзейнасцю па індывідуальнай адукацыйнай траекторыі, што гарантуе максімальнае развіццё вучня ў межах яго магчымасцей.

Камунікатыўна-дзейнасным падыходам абумоўлена рэалізацыя патэнцыялу вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» ў навучанні маўленню на беларускай мове. Чытацкая дзейнасць, фарміраванне якой адбываецца на ўроках літаратурнага чытання, з'яўляецца кампанентам (элементам) камунікатыўнай кампетэнцыі і забяспечвае апасродкаваную камунікацыю праз пісьмовы тэкст. Камунікатыўна-дзейнасны падыход праяўляецца ў працэсе навучання, калі прачытаны ці праслуханы твор становіцца дзейсным сродкам развіцця маўленчых уменняў для задавальнення камунікатыўнага намеру, авалодання вучнямі нормамі маўленчых зносін, ажыццяўлення камунікацыі на беларускай мове. Змест вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» скіраваны на засваенне правілаў этычных паводзін пры маўленчых зносінах у розных сітуацыях. Вучні знаёмяцца з этыкетнымі маўленчымі выразамі, на практычнай аснове вучацца прымяняць іх адпаведна ўмовам камунікацыі.

Адукацыйны патэнцыял вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» праз прымяненне *кампетэнтнаснага* падыходу здольны забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў элементаў ключавых кампетэнцый, неабходных для выкарыстання вынікаў навучання ў сацыяльным жыцці асобы, яго развіцця і сацыяльнай адаптацыі. Чытацкая дзейнасць вучняў, авалоданне якой неабходна для набыцця камунікатыўнай кампетэнцыі, разглядаецца ў кантэксце кампетэнтнаснага падыходу ў трох аспектах: як агульнавучэбнае ўменне, як від маўленчай дзейнасці і чытанне як літаратурна-эстэтычная дзейнасць.

У адпаведнасці з названымі метадалагічнымі падыходамі вызначаны **прынцыпы** адбору прадметнага зместу навучання: мастацка-эстэтычны і літаратуразнаўчы прынцыпы; прынцып уліку ўздзеяння на працэс навучання білінгвальнага асяроддзя; развіцця маўленчай дзейнасці; уліку ўзроставых і псіхалагічных асаблівасцей успрымання мастацкай літаратуры.

У адпаведнасці з *мастацка-эстэтычным і літаратуразнаўчым* прынцыпамі ў якасці вучэбнага матэрыялу прапануюцца высокамастацкія літаратурныя творы, адпаведныя ўзроставым псіхалагічным магчымасцям вучняў. Мастацка-эстэтычны прынцып з'яўляецца ўмовай падбору такога складу кола чытання вучняў, каб яны мелі магчымасць пазнаёміцца з найлепшымі творамі беларускай дзіцячай літаратуры, якія з'яўляюцца нацыянальна-культурнай спадчынай беларускага народа. Згодна з літаратуразнаўчым прынцыпам, прапедэўтычны змест літаратурнай адукацыі адабраны такім чынам, каб забяспечыць бесканфліктны пераход да вывучэння беларускай літаратуры на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Навучанне літаратурнаму чытанню ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму падпарадкоўваецца прынцыпу *ўздзеяння на працэс навучання білінгвальнага асяроддзя*. Гэты прынцып вызначае адбор зместу навучання, з дапамогай якога будзе пераадольвацца інтэрферанцыйнае ўздзеянне рускай мовы пры фарміраванні навыку чытання, захаванні акцэнталагічнай нормы, разуменні лексічнага значэння слоў.

Прынцып *развіцця маўленчай дзейнасці* арыентуе на ўзаемазвязанае фарміраванне і развіццё ў вучняў маўленчых уменняў і навыкаў у працэсе чытання, слухання, гаварэння. На матэрыяле чытання пашыраецца і ўзбагачаецца слоўнікавы запас вучняў, фарміруюцца ўменні звязнага выкладу думак, засвойваецца літаратурная і маўленчая норма, развіваецца культура маўлення, культура суразмоўніцтва паміж настаўнікам і вучнямі.

Прынцып уліку *ўзроставых і псіхалагічных асаблівасцей успрымання мастацкай літаратуры* вызначае адбор у кола чытання вучняў разнастайных па тэматыцы і жанрах твораў з дынамічным сюжэтам, эмацыянальных, яркіх па форме і змесце. Гэтым прынцыпам вызначаецца ўзровень патрабаванняў да аб'ёму ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па літаратурным чытанні; чытацкія ўменні, а таксама літаратуразнаўчыя ўяўленні, падыходы да аналізу мастацкага твора, структуры ўрока чытання.

Для рэалізацыі пастаўленых задач у адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам, які скіроўвае на прымяненне вынікаў навучання ў жыццядзейнасці, змест вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» размеркаваны па раздзелах: «Фарміраванне базавых норм грамадзянскай, духоўнай і маральнай культуры вучняў праз асэнсаванне твораў», «Фарміраванне навыку чытання і агульнавучэбных уменняў», «Фарміраванне чытацкіх уменняў», «Фарміраванне самастойнай чытацкай дзейнасці з кнігай (пазакласнае чытанне)», «Фарміраванне ўяўленняў пра літаратуру як мастацтва слова», «Літаратурна-творчая дзейнасць і культура маўлення».

Раздзел «*Фарміраванне базавых норм грамадзянскай, духоўнай и маральнай культуры вучняў праз асэнсаванне твораў*» вылучаны для мэтанакіраванага фарміравання ў вучняў сістэмы каштоўнасных арыенціраў, выхавання маральна-этычных якасцей. Фарміраванне гуманістычнага светапогляду, выхаванне сістэмы нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей адбываецца ў працэсе аналізу і маральнай ацэнкі ўчынкаў і падзей, паказаных у творы. На матэрыяле ўспрынятых твораў вучні атрымліваюць звесткі пра нацыянальныя адметнасці беларускай культуры і побыту, далучаюцца да нацыянальных культурных традыцый. Пры чытанні і асэнсаванні мастацкіх твораў ажыццяўляецца апасродкаваная сацыялізацыя вучняў. На прыкладзе паводзін герояў твораў яны атрымліваюць дзейсны вопыт рэфлексіі ўласных паводзін і самавыхавання.

Пры фарміраванні навыку чытання, пра што гаворыцца ў раздзеле «*Фарміраванне навыку чытання і агульнавучэбных уменняў*», асноўная ўвага скіроўваецца на асэнсаванне вучнямі асаблівасцей чытання па-беларуску. З гэтай мэтай праводзіцца работа па авалоданні арфаэпічнымі (правільнае вымаўленне беларускіх гукаў [ў], [дз'], [дж], [г], [ж], [ч], [р], [ц'], спалучэння [шч], падоўжаных зычных), выразнае вымаўленне галосных, перадача націску) і графічнымі асаблівасцямі беларускай мовы (літары і, ў, апостраф), усведамленню гэтых адрозненняў і іх паслядоўнай перадачай пры чытанні. У працэсе ўдасканалення тэхнікі чытання выпрацоўваецца правільнасць і асэнсаванасць чытання, авалоданне спосабамі чытання ўголас і сам сабе. Вырашаюцца задачы па фарміраванні ўменняў выразнага чытання праз усведамленне эмацыянальнага настрою твора і выкарыстанне сродкаў выразнасці (тон, тэмп, паўзы, лагічны націск). У адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам вучні павінны навучыцца карыстацца рознымі відамі чытання ў залежнасці ад задачы, якая ставіцца перад чытаннем тэксту.

У працэсе чытання і аналізу твораў гарманічна фарміруюцца навыкі чытання і комплекс чытацкіх уменняў, пералік якіх даецца ў раздзеле «*Фарміраванне чытацкіх уменняў*». На іх аснове вучні ўспрымаюць твор, асэнсоўваюць яго маральную праблематыку і эстэтычны план, выказваюць пра твор уласныя меркаванні. Асваенне вучнямі чытацкіх уменняў з'яўляецца неабходнай умовай фарміравання чытацкай кампетэнцыі.

У раздзеле «*Фарміраванне самастойнай чытацкай дзейнасці з кнігай (пазакласнае чытанне)*» акрэслены змест і спосабы дзейнасці, якімі павінны авалодаць вучні на занятках пазакласнага чытання. Самастойная праца вучня з кнігай з'яўляецца неад'емнай часткай фарміравання чытацкай дзейнасці, дае магчымасць удасканалення навыку чытання. Заняткі пазакласнага чытання маюць на мэце пашырэнне чытацкага кругагляду

вучняў, фарміраванне ўменняў працаваць з кнігамі і свабодна арыентавацца ў свеце дзіцячых кніг беларускіх пісьменнікаў, дзіцячых перыядычных выданняў на беларускай мове, выхоўваць патрэбу ў самастойным чытанні. Веды пра кнігі і аўтараў набываюцца ў працэсе непасрэднай практычнай дзейнасці з дзіцячымі кнігамі – калектыўнай, індывідуальнай і групавой.

Навучальным матэрыялам для пазакласнага чытання з'яўляюцца кнігі. Для калектыўнай працы пад кіраўніцтвам настаўніка прапануюцца не хрэстаматыі, а ілюстраваныя кнігі ў тыповым афармленні (прозвішча аўтара, назва, ілюстрацыі).

У працэсе навучання літаратурнаму чытанню вучні на практычным узроўні атрымліваюць першапачатковыя звесткі пра літаратуру як мастацтва слова. У змесце раздзела «*Фарміраванне ўяўленняў пра літаратуру як мастацтва слова*» вызначаны асноўныя літаратуразнаўчыя звесткі, з якімі вучні знаёмяцца на практычнай аснове ў працэсе працы з мастацкім творам. Веды аб літаратуры як мастацтве слова фарміруюцца на ўзроўні першапачатковых уяўленняў праз асваенне вобразнай функцыі мастацкага слова, усведамленне аўтарскай прыналежнасці твора, практычнае знаёмства з жанрамі.

Раздзел «*Літаратурна-творчая дзейнасць і культура маўлення*» вызначае змест камунікатыўна-арыентаванай творчай працы на падставе прачытанага ці праслуханага твора. Ажыццяўленне літаратурна-творчай дзейнасці на занятках літаратурнага чытання дае магчымасць актыўнага пашырэння і актывізацыі слоўніка вучняў, забяспечвае маўленчую практыку, спрыяе засваенню моўнай і маўленчай нормы, культуры маўленчых паводзін. На ўроках літаратурнага чытання фарміруюцца ўменні і навыкі гаварэння на беларускай мове. Творы мастацкай літаратуры з'яўляюцца прыкладамі правільнага маўлення і стымулююць выказванні вучняў на пэўную тэму, абуджаюць іх эстэтычныя пачуцці і творчы пачатак. У творах вучні назіраюць таксама трапнасць, выразнасць, дасціпнасць беларускай мовы, вучацца арыентавацца ў суразмоўніцтве, планаваць маўленчую дзейнасць, выбіраць моўныя сродкі, адпаведныя мэтам камунікацыі, ажыццяўляць камунікацыю ў адпаведнасці з этычнымі патрабаваннямі. Пры гэтым адбываецца пашырэнне і ўзбагачэнне слоўніка вучняў і яго актывізацыя, абуджаецца дзіцячая творчасць.

У II класе асноўная ўвага скіроўваецца на фарміраванне навыку чытання і чытацкіх уменняў вучняў. З гэтай мэтай праводзіцца работа па авалоданні арфаэпічнымі (правільнае вымаўленне беларускіх гукаў [ў], [г], [ж], [ч], [р], [ц'], [дз'], [дж], спалучэння [шч], падоўжаных зычных, выразнае вымаўленне галосных, перадача націску) і графічнымі асаблівасцямі беларускай мовы (літары ***і, ў***, апостраф), усведамленні гэтых адрозненняў і іх паслядоўнай перадачы пры чытанні. У працэсе ўдасканалення тэхнікі чытання выпрацоўваецца яго правільнасць і асэнсаванасць, авалоданне спосабамі чытання ўголас і сам сабе. Вырашаюцца задачы па фарміраванні ўменняў выразнага чытання праз усведамленне эмацыянальнага настрою твора і выкарыстанне сродкаў выразнасці (гучнасць, інтанацыя сказа, паўзы).

Для гарманічнага фарміравання навыкаў чытання і чытацкіх уменняў праводзіцца сістэматычная праца па ўдасканаленні вымаўленчых навыкаў вучняў; уменняў вызначаць незразумелыя словы і выразы, якія могуць перашкаджаць асэнсаванню таго, што чытаецца; уменняў ажыццяўляць прагнозную дзейнасць да чытання ці слухання і ў працэсе ўспрымання; планамернае прывучэнне да сама- і ўзаемакантролю правільнасці чытання. У адпаведнасці з магчымасцямі класа настаўнік адбірае для класнага чытання такі аб'ём вучэбнага матэрыялу, прапанаванага ў тэматычных раздзелах, які забяспечыць фарміраванне ўменняў і навыкаў вучняў.

Пазакласнае чытанне ў II класе ўключае два этапы фарміравання чытацкай самастойнасці: падрыхтоўчы і пачатковы. На *падрыхтоўчым этапе*, згодна з методыкай выкладання пазакласнага чытання, адбываецца непасрэднае чытанне-разглядванне невялікіх маляўніча афармленых кніг з мэтай фарміравання ўменняў вызначаць змест кнігі па знешніх паказчыках, выбіраць патрэбную кнігу з рэкамендацыйнага спісу ці выставы кніг. Арганізуецца актыўнае асэнсаванае ўспрыманне вучнямі твора з кнігі на слых.

Па меры авалодання чытаннем на беларускай мове пачынаецца выкладанне пазакласнага чытання па методыцы *пачатковага этапу* фарміравання чытацкай самастойнасці. На ўроках пазакласнага чытання пасля чытання-разглядвання кніг вучні самастойна чытаюць твор з кнігі, якую прынеслі на ўрок.

Заняткі пазакласнага чытання праводзяцца пасля вывучэння тэматычных раздзелаў кола чытання і займаюць увесь час урока. У перыяды паміж гэтымі ўрокамі арганізуецца чытанне вучнямі кніг з уласнай, класнай ці бібліятэкі ўстановы адукацыі, праводзяцца мерапрыемствы па прывучэнні вучняў да сістэматычнага самастойнага чытання кніг.

На занятках літаратурнага чытання неабходна рэалізоўваць міжпрадметныя сувязі з іншымі вучэбнымі прадметамі: з заняткамі беларускай мовы (складанне невялікіх апавяданняў пра герояў мастацкіх твораў, складанне працягу твора, знаходжанне слоў на вывучаныя арфаграфічныя правілы і інш.); з заняткамі выяўленчага мастацтва (разглядванне і слоўнае апісанне рэпрадукцый карцін па тэмах, сугучных тэмам вывучаемых твораў, ілюстраванне асобных эпізодаў мастацкага твора, удзел у выставах малюнкаў і іншых творчых работ паводле вывучаных твораў і інш.); з заняткамі музыкі (слуханне музычных твораў у адпаведнасці з мэтавымі ўстаноўкамі ўрока, назіранне за стварэннем вобразаў у літаратуры і музыцы, знаёмства з творамі музычнага мастацтва, у аснову якіх пакладзены паэтычныя творы, у тым ліку фальклорныя і інш.); з заняткамі працоўнага навучання (рамонт кніг, выраб кніг-самаробак, практычнае знаёмства з элементамі кнігі, выкарыстанне элементаў калектыўнай творчасці (аплікацыя, лепка паводле вывучаных мастацкіх твораў і інш).

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

(59 г[1], з іх 49 г – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і абагульненне ведаў па раздзелах чытання, 9 г – пазакласнае чытанне, 1 г – абавязковы кантроль навыку чытання)

[1] Вывучэнне «Літаратурнага чытання» пачынаецца пасля ўступнага курса беларускай мовы. 9 г выкарыстана на інтэграваны ўступны курс.

Кола чытання

Жанравая разнастайнасць кола чытання: вершы, апавяданні, казкі, жарты, загадкі, скорагаворкі, гумарыстычныя творы, пазнавальныя артыкулы з выхаваўчым патэнцыялам.

Аўтарская разнастайнасць кола чытання: дзіцячыя творы класікаў беларускай літаратуры, творы класікаў беларускай дзіцячай літаратуры, высокамастацкія дзіцячыя творы сучасных аўтараў.

Творы вуснай народнай творчасці: малыя жанры (загадкі, жарты, скорагаворкі, прыказкі, прымаўкі, лічылкі, прыкметы), народныя казкі.

Асноўныя раздзелы чытання. Рэкамендаваны пералік твораў

Рэкамендаваны пералік твораў складаецца са спісу твораў «Для чытання і вывучэння ў класе» і спісу твораў «Для пазакласнага чытання». Спіс твораў для пазакласнага чытання з'яўляецца пашыраным і прыкладным. Ён мае рэкамендацыйны характар. Настаўнік прапануе для пазакласнага чытання тыя творы, якія прадстаўлены ў кніжных фондах бібліятэкі ўстановы адукацыі і раённай бібліятэкі.

Колеры года. Восень

(6 г, з іх 1 г – пазакласнае чытанне)

Творы пра прыгажосць восеньскай прыроды, змены, якія адбываюцца ў прыродзе восенню.

Для чытання і вывучэння ў класе

Вера Вярба. «Восень».

М.Даніленка. «Па лясах і палях».

Р.Ігнаценка. «Лістапад у лесе».
Якуб Колас. «Адлёт жураўлёў».
П.Прануза. «Бывай, лета!».
М.Чарняўскі. «Павучковыя арэлі».
У.Ягоўдзік. «Восень на парозе».
Для пазакласнага чытання
Г.Аўласенка. «Клён».
Р.Бензярук. «Хто каго перакрычыць?».
Н.Галіноўская. «На прагулцы».
М.Даніленка. «Восень шыла сарафан».
А.Дзеружсынскі. «Хто вас у школу сабіраў?».
Я.Жабко. «Залатая казка», «Восень вераснёвая».
В.Жуковіч. «Маладая восень».
Клаўдзія Каліна. «Верасень».
Г.Каржанеўская. «Песенька».
Т.Мушынская. «Як Дзяніска восені дапамагаў».
М.Пазнякоў. «Першага верасня».
С.Панізнік. «Верасень».
У.Ягоўдзік. «Лісічкі».

Маёй Радзімы дзіўны свет
(7 г, з іх 1 г – пазакласнае чытанне)

Творы пра адносіны да Радзімы, хлеба, пра прыродныя сімвалы Беларусі.
Для чытання і вывучэння ў класе
А.Бадак. «Шкадаванне».
Р.Бензярук. «Хмарчын ручнік».
А.Грачанікаў. «Беларускія краявіды».
А.Дзеружсынскі. «Хлебная скарынка».
*В.Жуковіч. «*Васілёк»
А.Зэкаў. «Беларускі край».
А.Кобец-Філімонава. «Кропелька».
Ф.Рамашка. «Татава поле».
Л.Улашчанка. «Хлеб».
М.Чарняўскі. «Лён-ляночак».
Для пазакласнага чытання
Р.Бензярук. «Шпак і Верабей».
А.Вольскі. «Няма прыгажэй», «Беларусь».
Н.Галіноўская. «Журка-журавель».
А.Дзеружсынскі. «Васілёк», «Прыляцеў я ў свой край».
В.Жуковіч. «Жураўліны вырай», «Незаменнае».
М.Калачынскі. «Размова з жураўлём».
У.Ліпскі. «Салдацкае пісьмо».
Т.Мушынская. «Якія бываюць словы?».
М.Пазнякоў. «Міколкавы пытанні», «Скарб», «Родная мова».
Жывая кніга беларускай прыроды
(6 г, з іх 1 г – пазакласнае чытанне)
Творы пра жывёл і расліны беларускага краю.
Для чытання і вывучэння ў класе
Г.Аўласенка. «Сказ пра тое, як Алесік заблукаў аднойчы ў лесе».
А.Бялевіч. «У лесе».
В.Вольскі. «Гаспадар пушчы».
Н.Галіноўская. «Хто жыве ў траве?».
В.Жуковіч. «Птушыная мова».

Янка Журба. «Мядзведзь».
Р.Ігнаценка. «У арэхах».
Ф.Рамашка. «Званочкі на рабіне».
Для пазакласнага чытання
Д.Бічэль. «Зубры».
В.Вольскі. «Вавёрка».
Н.Галіноўская. «Лясныя жыхары», «Арабінка».
І.Галубовіч. «Шышкі пад снегам», «Галкі грэюцца».
М.Даніленка. «Абляпіха».
Р.Ігнаценка. «Рамантык», «Плячо да пляча», «Трывога».
У.Караткевіч. «Белавежа».
У.Мазго. «Птушыная сталоўка».
А.Марціновіч. «Верабейка Чыка».
І.Муравейка. «Для чаго снягір каляровы?», «Зімовы сад».

Колеры года. Зіма
(6 г, з іх 1 г – пазакласнае чытанне)

Творы пра зімовыя забавы, святы, прыродныя з’явы.
Для чытання і вывучэння ў класе
Н.Галіноўская. «Размова сняжынак».
В.Жуковіч. «З гары».
Р.Ігнаценка. «Чырвоныя гронкі рабіны».
У.Мазго. «Новы год».
Т.Мушынская. «Мех, снег і смех».
Ф.Рамашка. «Пагрэйся, ветрык».
В.Хомчанка. «Галка», «Снег».
Беларуская народная казка «Два Маразы» (у апрацоўцы Якуба Коласа).
Для пазакласнага чытання
М.Бусько. «Зіма».
Т.Бушко. «Сняжынка».
А.Вольскі. «Снежны бой».
Я.Галубовіч. «Андрэйка-памочнік».
М.Даніленка. «Як Петрык мароз напалохаў».
К.Жук. «Беларуская зіма».
В.Жуковіч. «Снежная баба».
К.Камейша. «Першы снег».
В.Караткевіч. «Апошняя сняжынка».
В.Лукша. «За што люблю я Новы год?».
Т.Мушынская. «Ветлівая сінічка», «Зімовыя забавы».
М.Пазнякоў. «На горку!», «Зімовыя птушкі».
П.Прыходзька. «Сінічка».
Ю.Свірка. «З першым снегам!».
П.Ткачоў. «Мікіткаў падарунак», «Пад Новы год».

Сустрэча з казкай
(5 г, з іх 1 г – пазакласнае чытанне)

Знаёмства з беларускімі народнымі казкамі.
Для чытання і вывучэння ў класе
«Каза-манюка», «Лісіца і гусак», «Муха-пяюха», «Хітры вол».
Для пазакласнага чытання
«Баран – бок абадран».
«Дзедава рукавічка».

«Казка пра быка і яго сяброў».
«Камары і мядзведзь».
«Коцік, пеўнік і лісіца».
«Не сілай, а розумам».
«Піліпка-сынок».
«Пшанічны каласок».
«Сабака і воўк»
«Сынок-з-кулачок».
«Як курачка пеўніка ратавала».

Урокі жыцця
(6 г, з іх 1 г – пазакласнае чытанне)

Творы пра добрыя і дрэнныя ўчынкі, стаўленне людзей адзін да аднаго, павагу і клопат, адносіны да працы.

Для чытання і вывучэння ў класе
Эдзі Агняцвет. «Хто пачынае дзень?».
В.Вітка. «Чатыры пажаданні».
У.Карызна. «Самая лепшая».
Янка Купала. «Хлопчык і лётчык».
В.Ластоўскі. «Варона і рак».
І.Муравейка. «Куплёная груша».
Максім Танк. «Жук і слімак».
В.Хомчанка. «Самы лепшы малюнак».
А.М.Якімовіч. «Хто самы добры?».

Для пазакласнага чытання
Л.Арабей. «Зернетка і вецер».
Г.Аўласенка. «Сказ пра Мураша-лайдака».
Р.Бензярук. «Клекатунчык», «Заяц, Вожык і Ручай», «Чыя моркаўка?».
Я.Бяганская. «Каму сказаць «дзякуй»», «Сябры».
Н.Галіноўская. «Ветлівы свавольнік», «Няўважлівыя лісяняты», «Выратаваў».
В.Гурыновіч. «Добрыя суседзі».
М.Даніленка. «Заяц Доўгае Вуха», «Салодкая цыбуля».
А.Дзеружсынскі. «Памочніца».
А.Жук. «Хто вінаваты?».
В.Жуковіч. «Не ўмею, паспею…», «Хто вінаваты?».
Р.Ігнаценка. «Наш мосцік».
У.Карызна. «Чыстая градка».
Л.Качанка. «Яблычак».
Клаўдзія Каліна. «Хлопчык Пакідайчык».
М.Лук. «Выпадак з марожаным».
І.Муравейка. «Ціма», «Тры лыжкі».
Т.Мушынская. «Самы смачны яблык».
У.Немізанскі. «Два Васі».
С.Панізнік. «Чарадзейныя словы».
М.Пазнякоў. «Хлеб».
Н.Парукаў. «Не хапіла работы».
Я.Пархута. «Кропелька».
П.Прануза. «Добры дзень», «На градцы».
Б.Сачанка. «Насцечка».
В.Ткачоў. «Гузак».

Клопат пра тых, хто навокал
(6 г, з іх 1 г – пазакласнае чытанне)

Творы экалагічнай тэматыкі, пра ахову жывёл і раслін, стаўленне да хатніх жывёл.
Для чытання і вывучэння ў класе
А.Вольскі. «Грыбы», «Безбілетная падарожніца».
В.Гарбук. «Вясновыя кветкі».
Алесь Гарун. «Добрыя дзеці».
М.Пазнякоў. «Шпачынае гняздо», «Ландыш».
Ф.Рамашка. «Пацеркі на снезе».
В.Хомчанка. «Венікі».
Для пазакласнага чытання
Я.Брыль. «Жыў-быў вожык».
А.Бутэвіч. «Цікаўная котка».
П.Кавалёў. «Жыві сабе, зайчык!».
Я.Пархута. «Снегавічок».
Ю.Свірка. «Ласіны стажок», «Сняжок».
А.Ставер. «Матылёк».
П.Ткачоў. «Шэрая курачка», «Ласяня».
М.Янчанка. «Бярозка».

Колеры года. Вясна
(6 г, з іх 1 г – пазакласнае чытанне)

Творы пра абуджэнне прыроды пасля зімы, вясновыя змены.
Для чытання і вывучэння ў класе
Вера Вярба. «Пралеска».
Якуб Колас. «Прылёт птушак», «Песня аб вясне».
Я.Пархута. «Птушыны інтэрнат».
Ф.Рамашка. «Першы колер вясны».
Цётка. «Сварба».
Міхась Чарот. «Вясенняя раніца».
Для пазакласнага чытання
Г.Аўласенка. «Аб чым спяваюць птушкі?», «Ганарлівая кветачка».
Я.Бяганская. «Дзе начавалі рукавічкі?».
С.Валодзька. «Пчолы і кветкі».
Н.Галіноўская. «Вясновая бярозка».
Я.Галубовіч. «Вожык і Ручаёк», «Бярозавыя ледзянцы».
А.Дзеружынскі. «Птушыныя напевы».
Янка Журба. «Пчолка».
Р.Ігнаценка. «Птушыныя клопаты».
А.Кажэра. «Сінютка-анютка».
Клаўдзія Каліна. «Надыход вясны», «Фіялка».
Т.Кляшторная. «Шпак».
У.Мазго. «Сябры вясны».
М.Маляўка. «Каб вясна хутчэй настала».
І.Муравейка. «Няўжо вясна?».
П.Прануза. «Я вясну малюю».
П.Саковіч. «Коцікі».

Сям'я – прытулак дабрыні
(6 г, з іх 1 г – пазакласнае чытанне)

Творы пра ўзаемаадносіны ў сям'і, павагу да бацькоў і старэйшых.

Для чытання і вывучэння ў класе
В.Гарбук. «Незнарок і знарок».
М.Даніленка. «Чароўнае слова».
Г.Каржанеўская. «Памочніца».
Т.Кляшторная. «Дзіцячыя мары».
У.Мацвеенка. «Трускалкі».
І.Муравейка. «Праўнук Перамогі».
Л.Рублеўская. «Мышка Пік-Пік прыбірае норку».
П.Ткачоў. «Як сон знайшлі».
А.М.Якімовіч. «Што любіць бабуля?».
Для пазакласнага чытання
Эдзі Агняцвет. «Маме».
Р.Бензярук. «Малінавы чай».
Вера Вярба. «Матуліны рукі».
Н.Галіноўская. «Бабуліна песня», «Камп'ютаршчык», «Песня для мамы».
Я.Жабко. «Самы любы мой дзянёк».
В.Жуковіч. «Свая дапамога».
Клаўдзія Каліна. «Кампот».
У.Ліпскі. «Цацкі».
І.Муравейка. «Адно яечка на дваіх».
Т.Мушынская. «Цяжка быць дарослым».
М.Пазнякоў. «Садзім алею».
М.Пісьмянкоў. «Бабчыны дранікі».
П.Прануза. «Маміны рукі», «Сам».
Я.Радкевіч. «Хто самы моцны?».
М.Рудзішкін. «Свята Перамогі».
Д.Слаўковіч. «Разумны аловак».
П.Сушко. «Зязюля».
П.Ткачоў. «Незвычайны дыктант».
В.Хомчанка. «Апельсін», «Мама», «Гузік».

Колеры года. Лета
(4 г)

Творы пра летні адпачынак, прыгоды.
Для чытання і вывучэння ў класе
М.Дукса. «Развітаемся, званок!».
Клаўдзія Каліна. «Чэрвень і сонейка».
І.Муравейка. «Колеры года».
Ф.Рамашка. «Слёзы лілеі».
Цётка. «Гутарка асоту з крапівою».

Фарміраванне базавых норм грамадзянскай, духоўнай і маральнай культуры вучняў праз асэнсаванне твораў

Вызначэнне ўчынку персанажа прачытанага ці праслуханага твора і наступстваў гэтага ўчынку. Назіранне праяў чалавечых якасцей праз учынкі персанажаў твораў і маральная ацэнка ўчынкаў з пункту погляду гуманістычных каштоўнасцей.

Вылучэнне ў творах жыццёвых сітуацый, у якіх дэманструюцца правілы і этычныя формы паводзін, замацаваных у грамадстве, каштоўнасныя адносіны да навакольнага асяроддзя.

Узбагачэнне эмацыянальнага вопыту на падставе прачытанага твора (знаходжанне ў творы знешніх праяў чалавечых эмоцый і пачуццяў, адпаведных ім апісанняў малюнкаў

прыроды). Стымуляванне эмпатыўных пачуццяў у вучняў (спачуванне, суперажыванне і інш.), перажыванне і выказванне іх з дапамогай настаўніка.

Назіранне за ўласнымі эстэтычнымі пачуццямі, перажыванне і выказванне іх з дапамогай настаўніка.

Каштоўнаснае асэнсаванне вызначанай настаўнікам культуралагічнай інфармацыі ў творы (беларускія народныя традыцыі, элементы бытавой і духоўнай культуры, нацыянальныя рысы характару).

Знаёмства праз змест прачытаных ці праслуханых твораў з традыцыйнымі заняткамі беларусаў, народнымі рамёствамі (ганчарства, саломапляценне, вышыўка і інш.), нацыянальнымі прадметамі побыту, беларускім нацыянальным касцюмам, традыцыйнымі народнымі песнямі, танцамі, гульнямі.

Знаёмства на матэрыяле літаратурных твораў з традыцыйнымі сімваламі беларусаў (васілёк, бульба, бусел, зубр, лён, ручнік), арганізацыя пошуку дадатковай тэкставай і ілюстрацыйнай інфармацыі пра іх.

Фарміраванне навыку чытання і агульнавучэбных уменняў

Фарміраванне правільнага і асэнсаванага чытання ўголас з хуткасцю, якая не перашкаджае разуменню.

Выпрацоўка навыкаў правільнага вымаўлення гукаў [ў], [г], [ж], [ч], [р], [ц’], [дз’], [дж], спалучэння [шч], падоўжаных зычных; фарміраванне ўмення захоўваць акцэнталагічныя нормы пры чытанні слоў з вызначаным націскам.

Знаходжанне твора ў дапаможніку па пазначанай старонцы. Арыентацыя ў рубрыках дапаможніка. Ззнаходжанне назвы твора, імя і прозвішча яго аўтара.

Раўнамерна ўважлівае ці вывучальнае (паглыбленае) чытанне вучэбнага тэксту, мастацкага ці навукова-папулярнага твора.

Праглядавае чытанне тэксту з мэтай пошуку інфармацыі. Адказ і пастаноўка пытанняў па змесце з выкарыстаннем слоў пачутага ці прачытанага твора, выбарачнае чытанне. Асваенне сродкаў выразнага чытання: перадача інтанацыі на падставе знакаў прыпынку ў канцы сказа, захаванне паўз у адпаведнасці са знакамі прыпынку.

Асваенне спосабаў завучвання на памяць па апорных словах, вобразных малюнках.

Фарміраванне ўмення ацэньваць правільнасць і выразнасць (гучнасць, захаванне інтанацыі сказа і паўз) пачутага чытання.

Кантрольная работа. Праверка навыку чытання – 1 гадзіна (II паўгодзе).

Фарміраванне чытацкіх уменняў

Прагназаванне зместу да чытання твора па ілюстрацыях і загалоўку.

Работа над загалоўкам твора: суаднясенне загалоўка са зместам твора.

Работа над мовай твора: вылучэнне незразумелых слоў і выразаў, высвятленне іх значэння праз кантэкст, пераклад з дапамогай настаўніка; вылучэнне слоў, падобных па гучанні да слоў рускай мовы, і высвятленне іх значэння з дапамогай настаўніка.

Знаходжанне і асэнсаванне з дапамогай настаўніка вобразных слоў і выразаў, прыказак і прымавак, вызначэнне іх ролі ў паэтычным і празаічным творы.

Работа над вобразам персанажа: вызначэнне дзеючых асоб твора, іх учынкаў, рыс характараў; знаходжанне апісання дзеючай асобы, карцін прыроды, вызначэнне адносін аўтара да персанажа.

Работа над зместам і ідэяй твора: устанаўленне прычынна-выніковых сувязей паміж падзеямі ў творы; вызначэнне тэмы і галоўнай думкі твора з дапамогай настаўніка; вылучэнне сэнсавых частак твора з дапамогай настаўніка (па пытаннях, па вызначаных загалоўках); знаходжанне ў тэксце ўрыўкаў, якія праілюстраваны; вызначэнне агульнага эмацыянальнага настрою паэтычнага твора; вылучэнне асобных вобразных малюнкаў.

Работа па асэнсаванні асобаснага стаўлення да твора: выказванне ўласных адносін да дзеючых асоб, іх учынкаў, зместу твора.

Фарміраванне самастойнай чытацкай дзейнасці з кнігай (пазакласнае чытанне)

Падрыхтоўчы этап (4 г)

Чытанне-разглядванне адпаведных узросту ілюстраваных кніг аб'ёмам да 20 старонак: асэнсаванае ўспрыманне твора кнігі на слых; фіксацыя сюжэту; ацэнка падзей і ўчынкаў герояў; устанаўленне адпаведнасці ілюстрацый зместу кнігі; знаходжанне на вокладцы назвы кнігі, прозвішча аўтара; самастойнае чытанне праслуханага твора.

Вызначэнне структурных элементаў кнігі: вокладка, назва кнігі, прозвішча аўтара, старонка, пераплёт. Выкананне правіл беражлівага абыходжання з кнігай.

Фарміраванне элементарных бібліяграфічных уменняў: самастойны выбар кніг для чытання-разглядвання з кніжнай выставы ў класным кутку чытання.

Пачатковы этап (6 г)

Чытанне-разглядванне адпаведных узросту ілюстраваных кніг аб'ёмам да 30 старонак: прагназаванне зместу кнігі па вокладцы і ілюстрацыях; вызначэнне назвы і аўтара кнігі, правільнае называнне кнігі; самастойнае асэнсаванае чытанне кнігі пад кіраўніцтвам настаўніка; выказванне ўласных уражанняў ад кнігі; устанаўленне суадносін твор – аўтар – кніга з дапамогай настаўніка.

Пашырэнне чытацкага кругагляду праз знаёмства з новымі кнігамі, прапанаванымі настаўнікам.

Фарміраванне элементарных бібліяграфічных уменняў: выбар кнігі для чытання з класнай бібліятэкі ці сумесна з бібліятэкарам у бібліятэцы ўстановы адукацыі.

Арганізацыя сістэматычнага чытання кніг, часопісаў, газет на беларускай мове з класнай бібліятэкі і бібліятэкі ўстановы адукацыі, абмеркаванне прачытанага.

Выкананне правіл паводзін у бібліятэцы, паважлівае стаўленне да прафесіі бібліятэкара.

Фарміраванне ўяўленняў пра літаратуру як мастацтва слова

Усведамленне аўтарскай прыналежнасці твора (уменне правільна называць твор і яго аўтара).

Слуханне і чытанне аўтарскіх вершаў, апавяданняў, казак, твораў вуснай народнай творчасці, актуальнай узросту тэматыкі з выхаваўчым патэнцыялам для ўзбагачэння эстэтычнай сферы вучняў, фарміравання эстэтычнага густу, асобасных адносін вучняў да літаратурнага твора як з'явы мастацтва.

Вызначэнне жанравых асаблівасцей казкі, знаходжанне гэтых асаблівасцей у прачытаных ці праслуханых казках.

Практычнае знаёмства з малымі жанрамі вуснай народнай творчасці (загадка, лічылка, заклічка, жарт, скорагаворка).

Практычнае засваенне ў працэсе працы над творамі значэння слоў *тэма, падзея, дзеючая асоба, учынак, эпізод, казка.*

Літаратурна-творчая дзейнасць і культура маўлення

Чытанне па ролях, інсцэніраванне эпізоду твора.

Падрабязны пераказ невялікага апавядальнага твора ці яго часткі з дапамогай настаўніка (па малюнках, пытаннях, загалоўках сэнсавых частак, апорных словах).

Калектыўная пабудова элементарнага выказвання на вызначаную тэму па малюнках, апорных словах, загалоўках сэнсавых частак, з дапамогай настаўніка.

Калектыўнае складанне казкі па сюжэце (малюнках) і апорных словах з вызначаным настаўнікам колам персанажаў.

Пашырэнне ведаў маўленчага этыкету (словы прывітання, развітання, прабачэння, падзякі), разыгрыванне сітуацый і вядзенне дыялогаў з іх выкарыстаннем.

Этыка маўленчых паводзін у размове з бацькамі, старэйшымі, аднагодкамі. Далікатнасць маўлення.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць і разумець:

прозвішчы аўтараў, назвы і змест 5 твораў, якія вывучаліся;

на памяць вершы *Якуб Колас* «Адлёт журавлёў», *А. Грачанікаў* «Беларускія краявіды», *А. Дзеружынскі* «Хлебная скарынка», *У. Карызна* «Самая лепшая», *Якуб Колас* «Песня аб вясне»;

правілы беражлівага абыходжання з кнігамі.

Мець першаснае ўяўленне пра:

малыя жанры вуснай народнай творчасці (загадка, лічылка, заклічка, жарт, скорагаворка);

аўтарскія творы (верш, апавяданне, казка);

сродкі выразнага чытання (гучнасць, захаванне інтанацыі сказа і паўз).

Валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці:

арфаэпічна правільна і асэнсавана чытаць уголас па складах і цэлымі словамі з захаваннем інтанацыі сказа і паўз;

прагназаваць змест твора па ілюстрацыях і загалоўку;

вылучаць незразумелыя словы і выразы, устанаўліваць іх значэнне з дапамогай настаўніка;

адказваць на пытанні па фактычным змесце твора;

вызначаць дзеючых асоб;

знаходзіць эпізод з апісаннем учынку дзеючай асобы;

знаходзіць урыўкі тэксту, якія адпавядаюць ілюстрацыі;

даваць уласную ацэнку ўчынкам герояў твора;

падрабязна пераказваць частку тэксту ці невялікі апавядальны тэкст (па малюнках, пытаннях, загалоўках сэнсавых частак, апорных словах);

правільна называць прачытаны твор (аўтар, загаловак);

прыводзіць прыклады казак з ліку вывучаных твораў;

ацэньваць правільнасць і выразнасць уласнага і праслуханага чытання;

дарэчна ўжываць тэрміны *тэма*, *падзея*, *дзеючая асоба*, *учынак*, *эпізод*, *казка*;

арыентавацца ў кнізе: знаходзіць у змесце прозвішча аўтара, назву твора і старонку;

выбіраць па рэкамендацыі настаўніка кнігу для чытання ў класнай бібліятэчцы ці сумесна з бібліятэкарам у бібліятэцы ўстановы адукацыі.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ацэньваць уласныя паводзіны і жыццёвыя сітуацыі з пазіцый маральных норм і культурных каштоўнасцей;

асэнсавана выбіраць і чытаць творы, адпаведныя ўзросту, абменьвацца думкамі па прачытаным ці праслуханым творы;

асэнсавана ўспрымаць вусную і пісьмовую інфармацыю для задавальнення пазнавальных інтарэсаў;

узбагачаць эмацыянальна-каштоўнасны вопыт праз успрыманне твораў розных відаў мастацтва.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Учебная программа по учебному предмету
«Русский язык»
для II класса учреждений общего среднего образования
с русским языком обучения и воспитания

РУССКИЙ ЯЗЫК

ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Цель обучения: формирование у учащихся языковых, коммуникативно-речевых умений, обеспечивающих эффективное общение на русском языке в устной и письменной речи.

Задачи обучения:

в рамках языковой компетенции:

формирование представлений о языке как знаковой системе и общественном явлении;

усвоение знаний из области фонетики, лексики, морфемики, морфологии, синтаксиса и формирование на их основе произносительных, орфографических, грамматических, пунктуационных умений и навыков;

формирование элементарных способов анализа изучаемых явлений языка (звуко-буквенный разбор слов, разбор слов по составу, по частям речи, по членам предложения);

в рамках коммуникативно-речевой компетенции:

обогащение словарного запаса учащихся;

развитие связной устной и письменной речи учащихся, умения пользоваться языком во всех видах речевой деятельности (слушание, говорение, чтение, письмо);

формирование умения работать с орфографическим и толковым словарями;

усвоение речеведческих понятий (текст; тема, основная мысль, заголовок текста; трёхчастное строение текста; план текста; типы текстов);

формирование умения адекватно понимать информацию устного и письменного сообщения (определять тему, основную мысль);

формирование умения отбирать языковые средства для создания собственных высказываний в соответствии с темой и основной мыслью;

овладение формулами речевого этикета;

формирование культуры речевого общения и поведения;

в рамках лингвокультурологической компетенции:

знакомство с элементами культуры и быта русского народа;

обогащение речи учащихся лексикой, пословицами, поговорками, отражающими национальный колорит и мудрость народа;

формирование ценностного отношения к русскому языку как хранителю культуры народа и духовного наследия всего человечества и одновременно воспитание уважения к культуре и языкам других национальностей;

развитие интеллектуальных и творческих способностей учащихся, нравственных качеств личности средствами языка;

развитие устойчивого интереса к изучению русского языка;

в рамках метапредметной компетенции:

формирование *универсальных (общеучебных) умений и навыков*, главными из которых являются умения целеполагания, планирования, контроля, оценки (регулятивные).

Задачи обучения русскому языку решаются в единстве с решением *воспитательных задач*, неразрывности и взаимодействия языка, культуры и личности ученика.

Направления обучения

Коммуникативная направленность обучения предусматривает взаимосвязанное обучение языку и речи. Теоретические сведения служат средством, обеспечивающим речевое общение в различных видах речевой деятельности. Знакомство с новым языковым явлением, его введение осуществляется не изолированно, а в тексте, предложении, с указанием на его связи с другими явлениями языка, на особенности его употребления в речи. Такой подход способствует развитию у учащихся способности (умений и навыков) решать языковыми средствами коммуникативные задачи в разных ситуациях общения.

Образовательные подходы

Компетентностный подход обусловлен социальными потребностями общества в компетентной, творческой личности с продуктивным типом мышления, способной к культурному саморазвитию, самостоятельному овладению знаниями и способами деятельности, решению конкретных проблем и задач в различных жизненных сферах. Он означает перенос акцента с процесса усвоения знаний на результат обученности учащихся, когда качество обучения русскому языку определяется способностью учащихся эффективно общаться на русском языке в устной и письменной форме. Особенностью компетентностного подхода является также метапредметность – установка на формирование у учащихся *универсальных* (*общеучебных*) умений, главными из которых являются умения целеполагания, планирования, контроля, оценки (регулятивные).

Культурологический подход означает реализацию единства и взаимодействия языка, культуры и личности в процессе обучения; направленность содержания обучения на комплексное формирование у учащихся средствами русского языка познавательных способностей, воспитание духовных, нравственных качеств личности; приобщение учащихся к культурным ценностям, выработанным народом; осознания себя как личности, принадлежащей к определенному культурному и языковому сообществу.

Личностно-деятельностный подход является интегрирующим средством в решении заявленных задач обучения русскому языку на I ступени общего среднего образования. Данный подход реализует основные требования к современному учебному процессу. В центре внимания находится ученик с его интересами, потребностями, способностями. Роль учителя не сводится к простой «передаче» знаний. На первый план выдвигается его организаторская и коммуникативная деятельность по созданию условий для учебного общения; организация обучения как сотрудничество и диалог с учащимися, при котором учащийся в процессе обучения выступает не объектом воздействия слова учителя. Процесс обучения при этом выстраивается как обучение *учебной деятельности* по овладению *речевой деятельностью* (слушание, говорение, чтение, письмо) на русском языке. Личностно-деятельностный подход в обучении содействует развитию у учащихся языковых и творческих способностей, воспитанию социально значимых качеств личности, пробуждает интерес к созидательной творческой деятельности.

Компетенции и содержание, обеспечивающее их формирование

Реализация компетентностного подхода в обучении русскому языку учащихся I ступени общего среднего образования проявляется в направленности процесса обучения на формирование у учащихся элементов языковой, коммуникативно-речевой, лингвокультурологической, метапредметной компетенций, в совокупности обеспечивающих развитие умений и навыков эффективного владения русским языком.

Языковая компетенция формируется в процессе усвоения знаний о единицах языка: (звук, слог, слово, морфема (окончание, корень слова, приставка, суффикс), предложение, текст; формирование представлений об особенностях функционирования единиц языка в речи; усвоение языковых норм (орфоэпических, орфографических, пунктуационных).

Коммуникативно-речевая компетенция связана с усвоением речеведческих понятий и формированием на их основе умения понимать готовые тексты; отбирать языковые средства и создавать собственные устные и письменные высказывания с учетом целей, задач, ситуации общения, а также правил речевого этикета и социальных норм поведения.

Лингвокультурологическая компетенция формируется через дидактический материал, в процессе работы с текстами различных жанров, в которых закреплены основные нравственные ценности народа и которые отражают историю и культуру русского и белорусского народов. Учащийся осознает себя носителем языка, личностью, которая через язык усваивает систему общечеловеческих и национальных ценностей, культуру речевого общения и поведения.

Метапредметная компетенция связана с формированием у учащихся универсальных (общеучебных) умений и навыков, уровень освоения которых в значительной степени влияет на успешность обучения в последующих классах.

Принципы отбора содержания обучения

Системно-описательный принцип, в соответствии с которым языковой материал в курс русского языка отбирается и изучается в последовательности, отражающей многоуровневый характер русского языка.

Принцип функциональности. Опора на принцип функциональности в отборе содержания обучения означает, что языковые сведения должны отбираться с учетом их значимости и важности для решения коммуникативных задач обучения на I ступени общего среднего образования.

Принцип минимизации языкового материала при определении содержания обучения русскому языку базируется на учете возрастных и психологических особенностей познавательной деятельности учащихся начальных классов. На основе принципа минимизации отбор языкового материала в учебную программу осуществлен в объеме, который обеспечивает достижение заявленных целей и задач обучения русскому языку учащихся на I ступени общего среднего образования.

Общие сведения о процессе горения (на уровне представлений), пожаре и его развитии. Польза, которую приносит огонь человеку. Умение человека использовать огонь на благо. Вред, наносимый огнем, вышедшим из-под контроля.

Пожары от игр детей с огнем

Пожароопасные игры детей. Пожары, возникающие от шалости детей со спичками, зажигалками, иными предметами, которые могут стать причиной возгорания в доме. Последствия пожаров. Меры по их предупреждению.

Предупреждение пожаров и травм в быту

Возникновение пожаров от электроприборов (на уровне представлений). Навыки правильного пользования электроприборами (включение, выключение). Правила поведения, позволяющие избежать ожогов и травм в квартире (доме), в помещениях малой площади.

Способы сообщения о необходимости оказания помощи при пожаре

Вызов пожарной службы по телефону. Сведения, которые при этом необходимо сообщить. Иные способы сообщения: обращение к взрослым (соседям, прохожим), подача сигнала о своем месте нахождения после прибытия пожарной службы. Вред наносимый ложным вызовом.

Раздел «Окружающая среда и безопасность»
(5 ч)

Правила безопасного поведения на воде

Озера, реки, иные природные водоемы, бассейны, аквапарки, ванны. Правила безопасного поведения при купании. Опасность нахождения возле водоемов в разное время года.

Безопасное поведение дома

Возможные опасности в жилых и административных помещениях, опасность высоты. Безопасные и опасные предметы в доме (газовая и электрическая плиты, утюг, столовые предметы, инструменты для рукоделия и мелкого ремонта). Безопасное обращение с предметами домашнего обихода.

Поведение на лестничной площадке, при случайно закрывшемся помещении (квартире, лифте, даче). Поведение с соседями и чужими людьми. Безопасность при входе в подъезд, лифт. Поведение в лифте.

Безопасное поведение во дворе

Безопасные игры во дворе. Игровая площадка. Качели и безопасность. Опасности в подвалах, лифтах, на чердаках. Поведение с чужими людьми. Места особой опасности (приставные лестницы, очистные сооружения, колодцы, траншеи).

Безопасная среда в учреждении образования

Коридоры, классы и др. помещения, их назначение. Безопасное обращение с предметами в классе. Безопасное поведение в классе (в коридорах, на лестницах, в гардеробе, на пришкольной территории). Правила обеспечения сохранности личных вещей.

Домашние животные

Домашние животные в городе и сельской местности. Случаи агрессивности и бешенства животных. Возможность травм от животных и их последствия. Меры безопасности при обращении и уход за домашними животными.

Раздел «Здоровый образ жизни» (8 ч)

Активные формы здорового образа жизни

Значение режима дня, утренней гимнастики и закаливание для здоровья. Одежда по сезону. Роль занятий физкультурой и спортом.

Правила гигиены

Личная гигиена, мытье рук. Пути передачи инфекционных заболеваний. Профилактика заболеваний вызванных паразитами.

Питание и здоровье

Здоровое питание. Профилактика переедания. Гигиена питания.

Полезные и вредные привычки

Полезные привычки и их влияние на здоровье. Пагубные последствия вредных привычек (влияние алкоголя и наркотиков на здоровье и поведение человека; вред, наносимый курением здоровью человека).

Порядок вызова «скорой помощи»

Обучение порядку вызова «скорой помощи»: сообщение фамилии, имени, описания места события, номера учреждения образования, домашнего адреса. Ответственность за ложный вызов.

Личностные результаты учебной деятельности:

понимание значимости знаний о безопасном поведении и соблюдении правил дорожного движения для безопасной жизнедеятельности;

понимание значимости соблюдения правил безопасности во время движения в школу и из школы домой;

способность распознавать потенциально опасные места, осознание опасности их самостоятельного посещения;

способность распознавать потенциально опасные предметы в быту;

способность различать опасные ситуации и адекватно действовать для обеспечения собственной безопасности;

наличие таких качеств личности, как внимательность и осторожность;

осознание необходимости взаимодействия со взрослыми при возникновении опасных ситуаций;

способность выполнять требования взрослых в опасных ситуациях.

Предметные результаты учебной деятельности:

понимание взаимосвязи между опасной ситуацией и необходимостью использовать знания о мерах по ее предупреждению;

способность применять знания, полученные при изучении других предметов, для понимания и анализа потенциальных опасностей окружающих явлений;

наличие опыта безопасного поведения в случае возникновения опасной ситуации в непосредственной зоне постоянного проживания (квартира, двор) и временного пребывания;

умение вести себя безопасно в наиболее типичных ситуациях дорожного движения;

умение грамотно применять знания пожарной безопасности в случаях возгорания в отдельных помещениях квартиры, при возгорании электроприборов;

способность различать опасные ситуации при общении с другими людьми;

умение вести себя безопасно при нахождении дома без взрослых, вне дома в сопровождении взрослых;

умение самостоятельно эвакуироваться из помещения при возникновении опасности;

умение вызвать пожарную службу и «скорую помощь».

Содержание учебного предмета «Основы безопасности жизнедеятельности» для II класса обусловило использование следующих **видов и способов деятельности:**

Регулятивные: составление плана и последовательности действий при решении ситуационных задач; оценка результатов своей деятельности; постановка целей; моделирование ситуаций с проявлением безопасного поведения в условиях повседневной жизни; составление под руководством учителя схем, инструкций, алгоритмов безопасного поведения; анализа специальной информации, получаемой из различных источников; тренинг по правильному вызову по телефону пожарной службы и «скорой помощи».

Коммуникативные: ответы на вопросы по содержанию прослушанной информации; вступление в диалог, участие в обсуждении вопросов; высказывание своей точки зрения и учет точки зрения других людей; доказательство собственной точки зрения; планирование учебного сотрудничества с учителем и сверстниками; выполнение различных социальных ролей в коллективе.

Познавательные: восприятие на слух информации; восприятие визуальной информации; распознавание различных опасных и чрезвычайных ситуаций окружающей

среды (в учреждении образования, в домашних условиях, в транспортных средствах, на дорогах, во дворе, в природе) по характерным признакам их появления; знакомство с новыми понятиями; рассматривание, анализ и решение ситуационных задач (с использованием слайдов мультимедийной презентации), связанных с дорожным движением, с пожарной безопасностью; анализ объектов, выбор оснований и критериев для сравнения; проведение наблюдений; изучение правил дорожного движения, правил безопасного поведения участников дорожного движения на дорогах, в транспортных средствах, изучение правил пожарной безопасности, безопасного поведения дома в случае отсутствия взрослых, поведения в случае обнаружения бесхозных или подозрительных предметов, правил поведения при встрече с незнакомыми людьми, правил здорового образа жизни; практикумы по приобретению привычки соблюдать правила дорожного движения и в качестве пешехода, и пассажира; рисование и раскрашивание в соответствии с темой урока; выполнение тематических игровых упражнений; самостоятельное выполнение заданий в соответствии с тематикой учебной программы, творческих заданий.

Для диагностики сформированности умений и навыков рекомендуются следующие ***формы контроля***: фронтальный опрос; индивидуальный опрос; практикум; тестирование.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская мова»
для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Ва ўмовах інфармацыйнага грамадства асаблівай увагі ў працэсе навучання беларускай мове на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі патрабуе развіццё моўнай асобы, яе здольнасцей і творчага патэнцыялу, неабходных для актыўнай дзейнасці, сацыяльнага самавызначэння і самарэалізацыі.

Мэта навучання – авалоданне навучэнцамі камунікатыўнымі ўменнямі і навыкамі, неабходнымі для эфектыўнага выкарыстання мовы ў розных сітуацыях зносін, развіццё іх творчага патэнцыялу, далучэнне праз мову да культурных традыцый беларускага народа.

Задачы навучання беларускай мове ў I–IV класах:

1) у межах *моўнай* кампетэнцыі:

асэнсаванне тэксту, сказа, слова і гука з пункта погляду іх функцыянавання;

авалоданне графікай беларускай мовы;

засваенне фанетычных, лексічных і граматычных ведаў для прымянення іх у маўленчай дзейнасці;

узбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў, засваенне вымаўленчых норм, правіл правапісу;

2) у межах маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі:

фарміраванне камунікатыўных уменняў і навыкаў навучэнцаў;

развіццё практычных уменняў і навыкаў выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці;

развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў;

3) у межах лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый:

фарміраванне пачуццёва-вобразнага ўспрымання беларускай мовы і ўмення адрозніваць яе ад рускай мовы;

асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай культурнай каштоўнасці;

фарміраванне асэнсаванага ўспрымання беларускай літаратурнай мовы як сродку замацавання культурных традыцый, маральных каштоўнасцей грамадства;

засваенне правіл маўленчага этыкету, сацыяльных норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін;

фарміраванне ў навучэнцаў пачуцця прыгажосці, мілагучнасці, выразнасці, эстэтычнай вартасці беларускай мовы.

Напрамкі навучання. Працэс развіцця асобы вучня пры навучанні беларускай мове павінен быць узаемазвязаным і садзейнічаць рэалізацыі наступных напрамкаў: ***моўнага*** (засваенне сістэмы мовы, заканамернасцей і правіл функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, норм беларускай літаратурнай мовы), ***маўленчага*** (авалоданне спосабамі перадачы думкі сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай формах, у розных відах маўленчай дзейнасці: чытанні, слуханні, гаварэнні, пісьме), ***камунікатыўнага*** (авалоданне культурай маўлення, правіламі маўленчых зносін, уменнямі ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных відаў), ***лінгвакультуралагічнага*** (асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай каштоўнасці, сродку замацавання культурных традыцый, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы), ***сацыякультурнага*** (засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін, культурных каштоўнасцей беларускага народа і агульначалавечых каштоўнасцей, авалоданне правіламі беларускага маўленчага этыкету).

У аснову курса беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі кладуцца зыходныя палажэнні *кампетэнтнаснага, лінгвакультуралагічнага, камунікатыўна-дзейнаснага* і *асобасна арыентаванага падыходаў.*

Кампетэнтнасны падыход у навучанні мове прадугледжвае разам з атрыманнем ведаў пра мову развіццё ўменняў аналізаваць і сістэматызаваць моўную інфармацыю, прымяняць яе ў маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з асобаснымі запатрабаваннямі для рашэння вучэбных, пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач. Рэалізацыя гэтага падыходу мае на ўвазе фарміраванне ў навучэнцаў шэрага кампетэнцый. Кампетэнцыі ў моўнай адукацыі адлюстроўваюць здольнасць рэалізацыі моўных ведаў і ўменняў праз маўленчую дзейнасць у розных сітуацыях зносін, у тым ліку ў працэсе навучання. Асаблівасцю кампетэнтнаснага падыходу з'яўляецца метапрадметнасць – устаноўка на фарміраванне ў навучэнцаў універсальных (агульнавучэбных) уменняў, галоўнымі з якіх з'яўляюцца ўменні мэтамеркавання, планавання, кантролю, ацэнкі (рэгулятыўныя).

Змест кампетэнцый, якія фарміруюцца пры вывучэнні беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

моўная кампетэнцыя уключае веды пра сістэму мовы, яе адзінкі (тэкст, сказ, слова, гукі мовы) і правілах іх функцыянавання ў маўленні; уменні вылучаць адзінкі мовы, праводзіць розныя віды разбору (гука-літарны, разбор слова па саставе, па часцінах мовы, разбор па членах сказа); валоданне нормамі беларускай літаратурнай мовы;

маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя уключае валоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці; фарміраванне маўленчых паводзін, адэкватных мэтам і сітуацыям зносін; уменні выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў адпаведнасці з іх значэннем, выбіраць патрэбную моўную форму і спосабы выказвання думкі ў залежнасці ад умоў камунікацыі;

лінгвакультуралагічная кампетэнцыя уключае асэнсаванне беларускай мовы як нацыянальнай каштоўнасці, сродку замацавання культурных традыцый, засваенне нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы, авалоданне правіламі беларускага маўленчага этыкету;

сацыякультурная кампетэнцыя уключае ўсведамленне ролі беларускай мовы ў жыцці чалавека, паважлівае стаўленне да культуры і мовы беларускага народа і іншых народаў, засваенне сістэмы агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, засваенне сацыяльных норм маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін.

Працэс навучання беларускай мове скіраваны на дасягненне наступных метапрадметных вынікаў навучання:

уменне ўспрымаць і асэнсоўваць вучэбны матэрыял, які прад'яўляецца ў вербальнай форме, выдзяляць галоўнае ў ім, рацыянальна запамінаць, выконваць разумовыя аперацыі;

уменне выкарыстоўваць маўленчыя сродкі і сродкі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для рашэння камунікатыўных і пазнавальных задач;

уменне працаваць з вучэбнай кнігай, іншымі друкаванымі і аўдыёвізуальнымі крыніцамі інфармацыі;

уменне працаваць з інфармацыяй (пошук, прымяненне, захаванне), рыхтаваць сваё выступленне і выступаць з аўдыё-, відэа- і графічным суправаджэннем;

уменне слухаць суразмоўцу і весці дыялог, прызнаваць наяўнасць розных пунктаў погляду, выказваць сваё меркаванне і аргументаваць яго.

Сістэмна-функцыянальны падыход забяспечвае засваенне вучнямі моўных сродкаў, адбор і арганізацыю моўнага матэрыялу для авалодання *моўнай кампетэнцыяй.*

Лінгвакультуралагічны падыход да навучання прадугледжвае рэалізацыю задач фарміравання культурнага чалавека сродкамі беларускай мовы, паколькі яна з'яўляецца нацыянальнай каштоўнасцю, праяўленнем культуры народа. У логіцы лінгвакультуралагічнага падыходу мова разумеецца не толькі як сродак назапашвання ведаў і фарміравання ўменняў і навыкаў, але і як сродак станаўлення асобы навучэнца, усведамлення ім прыналежнасці да свайго народа, сваёй краіны. Праз мову адбываецца далучэнне асобы да светапогляду народа, яго гісторыі, культуры, сістэмы маральных і духоўных каштоўнасцей.

Лінгвакультуралагічны падыход рэалізуецца пры вывучэнні фактаў мовы розных узроўняў (фанетычных, лексічных, граматычных, узроўню тэксту) і знаходзіць у іх пацверджанне асаблівасцей узаемасувязі мовы і культуры. Важнейшым спосабам выражэння культуралагічнай інфармацыі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляецца культурнае (намінатыўнае, эмацыянальнае, экспрэсіўнае, ацэначнае, вобразнае, матывацыйнае) значэнне вывучаемых адзінак мовы (слоў, прыказак, прымавак, формул маўленчага этыкету, тэкстаў культуразнаўчага характару). *Лінгвакультуралагічны падыход* садзейнічае фарміраванню ў вучняў *лінгвакультуралагічнай і сацыякультурнай кампетэнцый*.

Камунікатыўна-дзейнасны падыход да навучання беларускай мове прадугледжвае такую арганізацыю працэсу навучання, якая максімальна набліжаецца да рэальнага працэсу маўленчых зносін. Аб'ектам навучання становіцца маўленчая дзейнасць ва ўсіх яе відах. У аснове навучання знаходзяцца рэальныя маўленчыя дзеянні навучэнцаў, якія накіраваны не толькі на ўспрыманне і разуменне вусных і пісьмовых выказванняў на беларускай мове, але і на стварэнне беларускамоўных тэкстаў. Гэта садзейнічае развіццю *маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі*.

Паколькі навучанне мове разглядаецца як культурны працэс, сутнасць якога заключаецца ў гуманістычным і творчым узаемадзеянні ўсіх яго ўдзельнікаў, яно грунтуецца на асноўных палажэннях *асобасна арыентаванага падыходу*. Гэты падыход характарызуецца тым, што ў цэнтры навучальнай дзейнасці знаходзіцца асоба навучэнца (яго развіццё, задавальненне адукацыйных запатрабаванняў, інтарэсаў, творчых магчымасцей).

Прынцыпы адбору зместу навучання:

сістэмна-функцыянальны прынцып прадугледжвае цэласнае адлюстраванне ў змесце навучання шматузроўневасці моўнай сістэмы і характарыстыку функцыянальных магчымасцей моўных адзінак кожнага ўзроўню (роля, якую яны выконваюць у маўленні);

прынцып мінімізацыі моўнага матэрыялу патрабуе адбіраць матэрыял з улікам яго значнасці для дасягнення пастаўленых мэт і задач навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

камунікатыўны прынцып азначае, што працэс навучання патрэбна забяспечыць адпаведным зместам для авалодання вучнямі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці (аўдзіраванне, гаварэнне, чытанне, пісьмо);

прынцып тэкстацэнтрызму мае на ўвазе адбор зместу навучання, які павінен забяспечыць арганізацыю адукацыйнага працэсу на аснове тэксту.

Змест вучэбнага прадмета «Беларуская мова» складаюць:

1. Моўныя веды, уменні і навыкі (веды пра сістэму моўных адзінак і заканамернасці іх функцыянавання, фанетыка-артыкуляцыйныя навыкі, лексічныя, лексіка-граматычныя, арфаграфічныя і пунктуацыйныя ўменні і навыкі).

2. Маўленчыя ўменні і навыкі (уменні і навыкі ў розных відах маўленчай дзейнасці: аўдзіраванні, чытанні, гаварэнні, пісьмовым маўленні).

3. Камунікатыўныя ўменні і навыкі (уменні і навыкі выкарыстання розных відаў маўленчай дзейнасці ў пэўных маўленчых сітуацыях).

4. Агульныя звесткі пра беларускую мову, формы яе існавання і сферы ўжывання, культурную і эстэтычную самакаштоўнасць беларускай мовы.

5. Традыцыйны маўленчы этыкет, моўная норма, міжмоўная аманімія.

Сістэма развіцця маўлення скіравана на авалоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці, фарміраванне ў навучэнцаў здольнасці разумець праслуханае ці прачытанае маўленчае паведамленне на беларускай мове, ствараць вуснае выказванне на беларускай мове для задавальнення камунікатыўнага намеру, паступовае авалоданне пісьмовым маўленнем. Для дасягнення пастаўленай мэты змест сістэмы развіцця маўлення прадстаўлены ў трох кірунках:

фарміраванне правільнага ўспрымання і разумення беларускай мовы пры слуханні і чытанні;

фарміраванне ўменняў гаварэння;

фарміраванне ўменняў пісьмовага маўлення.

Змест навучання па кожным кірунку размяркоўваецца з паступовым ускладненнем у кожным наступным класе і вызначае асноўныя віды вучэбнай дзейнасці, якімі павінны авалодаць навучэнцы на працягу ўсяго вучэбнага года. Гэтыя віды дзейнасці пададзены ў вучэбнай праграме ў канцы кожнага раздзела. Развіццё маўлення адбываецца праз павелічэнне самастойнасці навучэнцаў пры выкананні заданняў і практыкаванняў.

Вывучэнне беларускай мовы ў III класе пачынаецца раздзелам «Паўтарэнне», які мае на мэце актуалізаваць веды вучняў пра гукі мовы, іх абазначэнне на пісьме літарамі, пра напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе правапісу.

Вывучэнне раздзела «Тэкст» мае практычную накіраванасць і забяспечвае навучэнцаў неабходнымі ведамі і ўменнямі для актыўных маўленчых дзеянняў па стварэнні тэкстаў. Асаблівасцю вывучэння тэксту з'яўляецца тое, што ён разглядаецца як вынік маўленчай дзейнасці. Асноўнымі задачамі вывучэння раздзела «Тэкст» у III класе з'яўляюцца фарміраванне ўяўленняў пра спосабы выказвання асноўнай думкі ў тэксце, выпрацоўка ўменняў складаць план тэксту з пытальных і апавядальных сказаў, складаць тэкст па плане.

Раздзел «Сказ» змяшчае звесткі пра сказ як камунікатыўную адзінку мовы. Уменні вызначаць граматычную аснову сказа, устанаўліваць сувязь паміж словамі ў сказе, ужываць сказы, розныя па мэце выказвання, інтанацыі і будове, выкарыстоўваюцца навучэнцамі для самастойнай пабудовы звязных вусных выказванняў.

У тэме «Лексічнае значэнне слова» прадугледжваецца азнаямленне з мнагазначнымі словамі, з сінонімамі і антонімамі, з міжмоўнымі амонімамі, з ужываннем слоў у прамым і пераносным значэнні. Гэта дазволіць разнастаіць маўленне навучэнцаў, узбагаціць яго, зрабіць дакладным і правільным.

Тэма «Склад слова» прадугледжвае вывучэнне марфемнай будовы слоў. Знаёмства са складам слова вельмі важнае для развіцця маўлення навучэнцаў, таму што спрыяе павелічэнню іх лексічнага запасу, пашырае магчымасці самастойнага прадуктыўнага ўтварэння новых слоў. Веданне марфемнай будовы слова – адна з умоў паспяховай выпрацоўкі арфаграфічных уменняў і навыкаў навучэнцаў.

Тэма «Часціны мовы» ўключае звесткі пра назоўнік, прыметнік, дзеяслоў. Выпрацоўка ўмення аднясення слова да пэўнай часціны мовы неабходна для развіцця арфаграфічнай пісьменнасці навучэнцаў, паколькі дазваляе свядома засвоіць правапіс,

заснаваны на марфалагічным прынцыпе. Навучэнцы практыкуюцца ў правядзенні элементарнага марфалагічнага разбору вывучаемых часцін мовы.

Асноўная задача навучання каліграфіі – удасканаленне ў навучэнцаў уменняў і навыкаў плаўнага, правільнага, прыгожага і хуткага пісьма. У III класе практыкаванні па каліграфіі выконваюцца па меры неабходнасці з мэтай прывучэння да рытмічнага пісьма. Заданні дыферэнцыруюцца з улікам каліграфічных недахопаў кожнага з навучэнцаў. Змест працы па каліграфіі па магчымасці звязваецца з вывучаемым на ўроку фанетычным, лексічным, граматычным матэрыялам.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

(87 гадзін)

Паўтарэнне (5 гадзін)

Гукі мовы, іх абазначэнне на пісьме літарамі. Вымаўленне і правапіс слоў з ***ў***. Вымаўленне галосных [о], [э] – [а]. Правапіс літар ***о, э–а***; ***е, ё–я***. Вымаўленне і правапіс слоў з гукамі [д] – [дз’], [т] – [ц’], зацвярдзелымі, падоўжанымі зычнымі. Правапіс слоў з раздзяляльным мяккім знакам і апострафам.

ТЭКСТ (6 гадзін)

Асноўная думка тэксту. Спосабы выказвання асноўнай думкі ў тэксце: выражэнне асноўнай думкі тэксту адным з яго сказаў; выражэнне асноўнай думкі тэксту загалоўкам.

План тэксту. Складанне плана тэксту з пытальных і апавядальных сказаў.

Віды дзейнасці. *Складанне тэксту са сказаў. Слуханне тэксту, адказы на пытанні па змесце. Вызначэнне і фармулёўка тэмы і асноўнай думкі тэксту. Выбар і выкарыстанне моўных сродкаў для выказвання думкі ў тэксце. Прагназаванне зместу тэксту па назве і малюнках да яго. Суаднясенне назвы з тэмай тэксту, асноўнай думкай тэксту. Аднаўленне дэфармаванага тэксту. Падбор загалоўка да тэксту. Падзел тэксту на часткі і складанне плана. Вусны і пісьмовы падрабязны пераказ невялікага апавядальнага тэксту па калектыўна складзеным плане. Вуснае паведамленне на зададзеную тэму па апорных словах, падабраных самастойна з дапамогай слоўніка. Сачыненне па серыі малюнкаў і калектыўна складзеным плане.*

Навучальная пісьмовая работа (*1 гадзіна*, пераказ).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць:

спосабы выражэння асноўнай думкі ў тэксце;

ролю плана пры стварэнні тэксту.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

вызначаць тэму і фармуляваць асноўную думку тэксту;

пад кіраўніцтвам настаўніка складаць план гатовага тэксту або самастойнага выказвання;

падрабязна пераказваць змест праслуханага тэксту (аб’ёмам не больш за 70 слоў) у вуснай і пісьмовай форме па калектыўна складзеным плане;

выбарачна пераказваць змест праслуханага тэксту ў вуснай форме.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ствараць нескладаныя маналагічныя выказванні па плане на даступныя навучэнцам тэмы (пра свае захапленнні; добрыя ўчынкі; пра краіну; горад (вёску), у якіх яны жывуць; пра прыроду роднага краю).

СКАЗ (14 гадзін)

Сказы апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя. Інтанацыя сказа. Знакі прыпынку ў канцы сказаў. Асаблівасці клічных сказаў.

Галоўныя і даданыя члены сказа. Дзейнік і выказнік – галоўныя члены сказа (агульнае паняцце). Вызначэнне дзейніка і выказніка ў сказах.

Вызначэнне сувязі слоў у сказе (словазлучэнняў). Даданыя члены сказа (без падзелу на віды). Вызначэнне даданых членаў сказа, якія звязаны з дзейнікам. Вызначэнне даданых членаў сказа, якія звязаны з выказнікам.

Віды дзейнасці. *Вызначэнне меж сказаў у тэксце. Знаходжанне сказаў сярод прапанаваных спалучэнняў і груп слоў. Распазнаванне апавядальных, пытальных, пабуджальных, клічных сказаў у тэксце на слых. Пабудова сказаў, розных па мэце выказвання і інтанацыі. Складанне сказаў з прапанаваных слоў па малюнку. Сінтаксічны разбор сказаў. Суаднясенне сказаў з іх схемамі. Графічнае выдзяленне ў сказе граматычнай асновы. Знаходжанне слоў, якія пашыраюць граматычную аснову сказа. Развіццё сказаў даданымі членамі па пытаннях, малюнках. Вуснае апавяданне па малюнку або серыі малюнкаў і апорных словах, прапанаваных настаўнікам. Выбар з тэксту і пераказ той яго часткі, якая адпавядае пастаўленаму пытанню (выбарачны пераказ). Слуханне тэксту, падзел на сэнсавыя часткі, вусны пераказ адной сэнсавай часткі.*

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць:

адрозненні паміж апавядальнымі, пытальнымі і пабуджальнымі сказамі;

асаблівасці клічных сказаў;

правілы пастаноўкі знакаў прыпынку ў канцы сказа;

прыметы галоўных і даданых членаў сказа.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

аналізаваць і коратка характарызаваць сказы ў адпаведнасці з вывучанымі прыметамі;

правільна інтанаваць апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя, клічныя сказы;

ставіць знакі прыпынку ў канцы апавядальных, пытальных і клічных сказаў;

вызначаць галоўныя і даданыя члены сказа;

вызначаць сувязь слоў у сказе (словазлучэнні) па пытаннях.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

удзельнічаць у дыялогах на даступныя навучэнцам тэмы: выкарыстоўваць сказы розных тыпаў, адэкватна перадаваць эмоцыі, захоўваць неабходную інтанацыю ў межах сказа.

СЛОВА (56 гадзін)

Значэнне слова (7 гадзін)

Значэнне слова. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слова. Словы з блізкім значэннем (сінонімы). Словы, якія маюць супрацьлеглае значэнне (антонімы).

Знаёмства на практычным узроўні з выпадкамі міжмоўнай аманіміі ў беларускай і рускай мовах (без увядзення тэрміна).

Віды дзейнасці. *Суаднясенне прадмета на малюнку са словам і значэннем слова. Тлумачэнне значэнняў слоў з улікам іх будовы. Называнне слова па яго лексічным значэнні. Вылучэнне адназначных і мнагазначных слоў. Вызначэнне прамога і пераноснага значэння мнагазначных слоў. Падбор сінонімаў. Падбор антонімаў. Вуснае паведамленне на прапанаваную тэму з ужываннем слоў з блізкім і супрацьлеглым значэннем. Складанне*

сказаў з мнагазначнымі словамі ў прамым і пераносным значэнні, з міжмоўнымі амонімамі (дыван, люстра і інш.). Высвятленне значэння слова пры дапамозе тлумачальнага слоўніка.

Навучальная пісьмовая работа (*1 гадзіна*, сачыненне).

Склад слова

(22 гадзіны, з іх 1 гадзіна – кантрольны дыктант)

Роднасныя (аднакаранёвыя) словы. Корань як агульная частка аднакаранёвых слоў. Падбор аднакаранёвых слоў і абазначэнне кораня.

Канчатак як частка слова. Роля канчатка ў змяненні слова (на прыкладах слоў розных часцін мовы). Канчатак як сродак сувязі слоў у сказе. Агульнае паняцце пра нулявы канчатак. Вызначэнне і абазначэнне канчатка слова (у тым ліку і нулявога).

Прыстаўка як частка слова. Утварэнне слоў з новым значэннем пры дапамозе прыставак. Вызначэнне і абазначэнне прыставак у словах. Правапіс прыставак *аб-, ад-, над-, пад-, з-(с-)*. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на *з, с (раз-(рас-), без-(бес-), уз-(ус-))*. Адрозненне прыставак ад прыназоўнікаў. Апостраф у словах з прыстаўкамі. Падваенне зычных на стыку прыстаўкі і кораня.

Суфікс як частка слова. Роля суфіксаў ва ўтварэнні слоў. Вызначэнне і абазначэнне суфіксаў у слове. Падваенне зычных на стыку кораня і суфікса.

Віды дзейнасці. *Знаходжанне сярод прапанаваных слоў роднасных. Тлумачэнне правапісу галосных у каранях слоў. Падбор праверачных аднакаранёвых слоў да прапанаваных. Выдзяленне прыстаўкі і кораня ў словах, вызначэнне апошняга зычнага прыстаўкі, першага зычнага кораня. Складанне тэксту з ужываннем роднасных слоў, прапанаваных настаўнікам. Знаходжанне ў тэкстах слоў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі (памяншальна-ласкальнымі, павелічальнымі). Развіццё сказаў у тэксце патрэбнымі па сэнсе словамі з сінанімічнымі, антанімічнымі прыстаўкамі. Сачыненне па малюнку і калектыўна складзеным плане.*

Навучальная пісьмовая работа (*1 гадзіна*, сачыненне).

Часціны мовы (27 гадзін, з іх 1 гадзіна – кантрольны дыктант з граматычным заданнем)

Агульнае паняцце пра самастойныя і службовыя часціны мовы (на практычным узроўні). Распазнаванне назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў у сказах і тэкстах, вызначэнне іх ролі. Роля прыназоўнікаў у сказе.

Назоўнік як часціна мовы. Адрозненне адушаўлёных і неадушаўлёных назоўнікаў па пытаннях (на практычным узроўні). Адзіночны і множны лік назоўнікаў. Мужчынскі, жаночы і ніякі род назоўнікаў. Вызначэнне роду назоўнікаў пры дапамозе слоў ***ён, мой; яна, мая; яно, маё***. Назоўнікі, род і лік якіх не супадаюць у беларускай і рускай мовах. Змяненне назоўнікаў у сказе па пытаннях.

Прыметнік як часціна мовы. Сувязь прыметніка з назоўнікам у сказе. Змяненне прыметнікаў па родах і ліках у залежнасці ад назоўнікаў, з якімі яны звязаны. Вызначэнне ліку і роду (у адзіночным ліку) прыметнікаў.

Дзеяслоў як часціна мовы. Адзіночны і множны лік дзеясловаў. Цяперашні, прошлы і будучы час дзеясловаў. Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах і ліках. Адрозненне націску ў граматычных формах дзеясловаў у рускай і беларускай мовах. Правапіс ***не*** з дзеясловамі.

Віды дзейнасці. *Вызначэнне ролі назоўнікаў у сказах. Утварэнне форм адзіночнага і множнага ліку назоўнікаў. Вызначэнне ролі прыметнікаў у сказах. Утварэнне розных форм ліку і роду прыметнікаў. Вызначэнне ролі дзеясловаў у сказах. Утварэнне розных форм ліку і часу дзеясловаў. Развіццё сказаў у тэксце патрэбнымі па сэнсе назоўнікамі, прыметнікамі, дзеясловамі. Знаходжанне ў тэксце назоўнікаў, прыметнікаў пэўнага роду і ліку. Пашырэнне сказаў назоўнікамі і прыметнікамі ў патрэбнай форме. Знаходжанне ў тэксце дзеясловаў пэўнага часу і ліку. Змяненне часу дзеясловаў у сказе. Падзел*

праслуханага тэксту на сэнсавыя часткі, вусны пераказ па сэнсавых частках. Пісьмовы пераказ тэксту па калектыўна складзеным плане.

Навучальная пісьмовая работа (*1 гадзіна*, пераказ).

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў

Ведаць:

пра ўжыванне слоў у прамым і пераносным значэнні;

ролю канчатка ў слове;

пра назоўнікі, род і лік якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах;

прыметы сінонімаў, антонімаў;

часткі слова (канчатак, корань, суфікс, прыстаўка), іх ролю ў слове;

прыметы аднакаранёвых слоў;

правапіс падвоеных зычных на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса;

правапіс прыставак *аб-, ад-, над-, пад-, з-(с-), раз-(рас-)*, *без-(бес-)*, *уз-(ус-)*;

правапіс апострафа ў словах з прыстаўкамі;

асноўныя лексіка-граматычныя прыметы назоўніка, прыметніка, дзеяслова;

правапіс ***не*** з дзеясловамі.

Умець (валодаць спосабамі пазнавальнай дзейнасці):

вызначаць прамое і пераноснае значэнне слова ў сказе;

адрозніваць і параўноўваць словы блізкія і супрацьлеглыя па значэнні, мнагазначныя словы;

выкарыстоўваць сінонімы, антонімы, мнагазначныя словы ў патрэбным значэнні ў маўленні;

аналізаваць і коратка характарызаваць склад слоў выразнай будовы;

падбіраць аднакаранёвыя словы;

правільна пісаць словы з падвоенымі зычнымі на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса;

правільна пісаць словы з прыстаўкамі *аб-, ад-, над-, пад-, з-(с-), раз-(рас-)*, *без-(бес-)*, *уз-(ус-)*;

правільна пісаць словы з апострафам пасля прыставак;

змяняць назоўнікі па ліках, вызначаць род і лік назоўнікаў;

змяняць прыметнікі па родах і ліках, вызначаць род і лік прыметнікаў;

дапасоўваць прыметнікі да назоўнікаў у патрэбнай форме пры складанні ўласных сказаў і тэкстаў;

змяняць дзеясловы па ліках і часах, змяняць дзеясловы прошлага часу па родах;

вызначаць час, лік дзеясловаў, род дзеясловаў прошлага часу;

спалучаць назоўнікі з дзеясловамі пры складанні ўласных сказаў і тэкстаў;

пісаць ***не*** з дзеясловамі.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ужываць ветлівыя словы і звароты ў зносінах з гасцямі школы, з незнаёмымі людзьмі ў магазіне, транспарце, бібліятэцы, на пошце і інш.;

захоўваць вывучаныя нормы арфаграфіі пры выкананні пісьмовых заданняў і ўласных запісаў (запіска, віншаванне, перапіска з сябрамі, сваякамі, запрашэнне).

Паўтарэнне (5 гадзін)

Слоўнікавыя словы

Адцвітаць, адчыніць, асцярожны, блішчаць, булён, бутэрброд, воблака, восеньскі, вулей, выйсці, гасцінец, гарадскі, дзённік, звінець, павук, пенал, пошта, пясчаны, свяціць, смяяцца, сшытак, шчасце.

Кантрольныя пісьмовыя работы:

кантрольны дыктант – 1 (I паўгоддзе, 40–45 слоў);

кантрольны дыктант з граматычным заданнем – 1 (II паўгоддзе, 45–50 слоў);

кантрольная работа па тэме – 3 (1 – I паўгоддзе, 2 – II паўгоддзе);

кантрольны слоўнікавы дыктант – 4 (2 – I паўгоддзе, 8 слоў, 2 – II паўгоддзе, 10 слоў).

Рэзервовыя гадзіны – 1.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)»
для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА (ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Літаратурнае чытанне» ўваходзіць у адукацыйную галіну «Беларуская літаратура», з'яўляецца падрыхтоўчым этапам адзінай непарыўнай літаратурнай адукацыі.

Мэта навучання літаратурнаму чытанню на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі – закласці ў вучняў асновы культурнага чытача, які ўсведамляе каштоўнасць літаратуры як мастацтва слова, можа ажыццяўляць самастойную чытацкую дзейнасць па асобасным успрыманні і асэнсаванні адпаведных узросту твораў мастацкай літаратуры.

Для рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў навучанні літаратурнаму чытанню на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вызначаны і вырашаюцца **задачы** па фарміраванні і развіцці ключавых кампетэнцый вучняў.

1. Сацыякультурная кампетэнцыя:

забяспечыць усведамленне гуманістычных агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей на матэрыяле прачытаных ці праслуханых твораў;

прывучаць навучэнцаў да паслядоўнага выканання культурных норм;

актывізаваць пазнавальныя памкненні навучэнцаў у спасціжэнні беларускай нацыянальнай культуры, захаванні нацыянальна-культурных традыцый.

2. Асобасная кампетэнцыя:

гарманічна фарміраваць навык чытання, комплекс чытацкіх уменняў, якія забяспечаць асэнсаванае ўспрыманне, поўнае, глыбокае разуменне і асобасную ацэнку маральнай праблематыкі і эстэтычнага плана твора;

стымуляваць імкненне да чытання кніг на беларускай мове;

выхоўваць павагу да кнігі як крыніцы самапазнання і развіцця.

3. Маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя:

развіваць вобразнае ўяўленне, маўленчую актыўнасць, здольнасць да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры;

фарміраваць агульнавучэбныя ўменні працы з тэкставай інфармацыяй розных відаў.

Зыходзячы з вызначаных задач змест вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» павінен быць скіраваны на фарміраванне прыкладных аспектаў чытацкай кампетэнцыі вучняў на беларускай мове:

навыкаў чытання на беларускай мове (здольнасць правільна агучваць графічна зафіксаваны тэкст з разуменнем яго зместу);

уменняў асобасна асэнсаванага чытання мастацкіх і навукова-папулярных твораў, адпаведных узросту і ўзроўню валодання вучнямі маўленнем на беларускай мове;

прадуктыўнай чытацкай дзейнасці з тэкстам, кнігай на аснове комплексу бібліятэчна-бібліяграфічных уменняў.

Метадалагічнай асновай навучання літаратурнаму чытанню з'яўляюцца *культуралагічны, асобасна арыентаваны, камунікатыўна-дзейнасны* і *кампетэнтнасны* падыходы.

Культуралагічны падыход вызначаецца нацыянальна-культурным кантэкстам зместу вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне», яго асноўнай асветніцкай фукцыяй знаёмства вучняў з самабытнай беларускай народнай і аўтарскай літаратурнай традыцыяй, з'явамі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры, сучаснай беларускай дзіцячай літаратурай як элементам культуры. У працэсе навучання адбываецца эмацыянальнае і разумовае спасціжэнне вучнямі нацыянальных культурных адметнасцей беларускай літаратуры. У кантэксце культуралагічнага падыходу стымулюецца пазнавальная актыўнасць вучняў у спасціжэнні гістарычных, навукова-папулярных, вобразна-мастацкіх звестак пра Беларусь, яе прыроду, гісторыю, традыцыі, побыт, міфалогію і г.д.

У сувязі з тым што навучанне літаратурнаму чытанню мае выразныя сацыяльныя і псіхалагічныя перадумовы, а працэс авалодання дзейнасцю чытання індывідуалізаваны, вядучым метадалагічным падыходам навучання чытанню на беларускай мове з'яўляецца *асобасна арыентаваны падыход*. Асобасна арыентаваны падыход дае магчымасць авалодання чытацкай дзейнасцю па індывідуальнай адукацыйнай траекторыі, што гарантуе максімальнае развіццё вучня ў межах яго магчымасцей.

Камунікатыўна-дзейнасным падыходам абумоўлена рэалізацыя патэнцыялу вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» ў навучанні маўленню на беларускай мове. Чытацкая дзейнасць, фарміраванне якой адбываецца на ўроках літаратурнага чытання, з'яўляецца кампанентам (элементам) камунікатыўнай кампетэнцыі і забяспечвае апасродкаваную камунікацыю праз пісьмовы тэкст. Камунікатыўна-дзейнасны падыход праяўляецца ў працэсе навучання, калі прачытаны ці праслуханы твор становіцца дзейсным сродкам развіцця маўленчых уменняў для задавальнення камунікатыўнага намеру, авалодання вучнямі нормамі маўленчых зносін, ажыццяўлення камунікацыі на беларускай мове. Змест вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» скіраваны на засваенне правіл этычных паводзін пры маўленчых зносінах у розных сітуацыях. Вучні знаёмяцца з этыкетнымі маўленчымі выразамі, на практычнай аснове вучацца прымяняць іх адпаведна камунікатыўнай сітуацыі.

Адукацыйны патэнцыял вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» праз прымяненне *кампетэнтнаснага падыходу* здольны забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў элементаў ключавых кампетэнцый, неабходных для выкарыстання вынікаў навучання ў сацыяльным жыцці асобы, яе развіцця і сацыяльнай адаптацыі. Чытацкая дзейнасць вучняў, авалоданне якой неабходна для набыцця камунікатыўнай кампетэнцыі, разглядаецца ў кантэксце кампетэнтнаснага падыходу ў трох аспектах: 1) як агульнавучэбнае ўменне; 2) як від маўленчай дзейнасці; 3) чытанне як літаратурна-эстэтычная дзейнасць.

У адпаведнасці з названымі метадалагічнымі падыходамі вызначаны **прынцыпы** адбору прадметнага зместу навучання: мастацка-эстэтычны і літаратуразнаўчы прынцыпы; прынцып уліку ўздзеяння на працэс навучання білінгвальнага асяроддзя; развіцця маўленчай дзейнасці; уліку ўзроставых і псіхалагічных асаблівасцей успрымання мастацкай літаратуры.

У адпаведнасці з *мастацка-эстэтычным* і *літаратуразнаўчым прынцыпамі* ў якасці вучэбнага матэрыялу прапануюцца высокамастацкія літаратурныя творы, адпаведныя ўзроставым псіхалагічным магчымасцям вучняў. Мастацка-эстэтычны прынцып з'яўляецца ўмовай падбору такога літаратурнага матэрыялу, каб вучні мелі магчымасць пазнаёміцца з найлепшымі творамі беларускай дзіцячай літаратуры, якія з'яўляюцца нацыянальна-культурнай спадчынай беларускага народа. Згодна з літаратуразнаўчым прынцыпам прапедэўтычны змест літаратурнай адукацыі адабраны такім чынам, каб

забяспечыць бесканфліктны пераход да вывучэння беларускай літаратуры на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Навучанне літаратурнаму чытанню ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму падпарадкоўваецца *прынцыпу ўздзеяння на працэс навучання білінгвальнага асяроддзя*. Гэты прынцып вызначае адбор зместу навучання, з дапамогай якога будзе пераадольвацца інтэрферэнцыйнае ўздзеянне рускай мовы пры фарміраванні навыку чытання, захаванні акцэнталагічнай нормы, разуменні лексічнага значэння слоў.

Прынцып развіцця маўленчай дзейнасці арыентуе на ўзаемазвязанае фарміраванне і развіццё ў вучняў маўленчых уменняў і навыкаў у працэсе чытання, слухання, гаварэння. На матэрыяле чытання пашыраецца і ўзбагачаецца слоўнікавы запас вучняў, фарміруюцца ўменні звязнага выкладу думак, засвойваюцца літаратурная і маўленчая нормы, развіваецца культура маўлення, культура суразмоўніцтва паміж настаўнікам і вучнямі.

Прынцып уліку ўзроставых і *псіхалагічных асаблівасцей успрымання мастацкай літаратуры* вызначае адбор у кола чытання вучняў разнастайных па тэматыцы і жанрах твораў з дынамічным сюжэтам, эмацыянальных, яркіх па форме і змесце. Гэтым прынцыпам вызначаецца ўзровень патрабаванняў да аб'ёму ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па літаратурным чытанні, чытацкія ўменні, а таксама літаратуразнаўчыя ўяўленні, падыходы да аналізу мастацкага твора, структуры ўрока чытання.

Для рэалізацыі пастаўленых задач у адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам, які скіроўвае на прымяненне вынікаў навучання ў жыццядзейнасці, змест вучэбнага прадмета «Літаратурнае чытанне» размеркаваны па раздзелах: «Фарміраванне базавых норм грамадзянскай, духоўнай і маральнай культуры вучняў праз асэнсаванне твораў», «Фарміраванне навыку чытання і агульнавучэбных уменняў», «Фарміраванне чытацкіх уменняў», «Фарміраванне самастойнай чытацкай дзейнасці з кнігай (пазакласнае чытанне)», «Літаратурна-творчая дзейнасць і культура маўлення», «Фарміраванне ўяўленняў пра літаратуру як мастацтва слова».

Раздзел *«Фарміраванне базавых норм грамадзянскай, духоўнай і маральнай культуры вучняў праз асэнсаванне твораў»* вылучаны для мэтанакіраванага фарміравання ў вучняў сістэмы каштоўнасных арыенціраў, выхавання маральна-этычных якасцей. Фарміраванне гуманістычнага светапогляду, выхаванне сістэмы нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей адбываецца ў працэсе аналізу і маральнай ацэнкі ўчынкаў і падзей, паказаных у творы. На матэрыяле ўспрынятых твораў вучні атрымліваюць звесткі пра нацыянальныя адметнасці беларускай культуры і побыту, далучаюцца да нацыянальных культурных традыцый. Пры чытанні і асэнсаванні мастацкіх твораў ажыццяўляецца апасродкаваная сацыялізацыя вучняў. На прыкладзе паводзін герояў твораў яны атрымліваюць дзейсны вопыт рэфлексіі ўласных паводзін і самавыхавання.

Пры фарміраванні навыку чытання, пра што гаворыцца ў раздзеле *«Фарміраванне навыку чытання і агульнавучэбных уменняў»*, асноўная ўвага скіроўваецца на асэнсаванне вучнямі асаблівасцей чытання па-беларуску. З гэтай мэтай праводзіцца работа па авалоданні арфаэпічнымі (правільнае вымаўленне беларускіх гукаў [ў], [дз'], [дж], [г], [ж], [ч], [р], [ц'], спалучэння [шч], падоўжаных зычных, выразнае вымаўленне галосных, перадача націску) і графічнымі асаблівасцямі беларускай мовы (літары ***і, ў***, апостраф), па ўсведамленні гэтых адрозненняў і іх паслядоўнай перадачы пры чытанні. У працэсе ўдасканалення тэхнікі чытання выпрацоўваецца правільнасць і асэнсаванасць чытання, авалоданне спосабамі чытання ўголас і сам сабе. Вырашаюцца задачы па фарміраванні ўменняў выразнага чытання праз усведамленне эмацыянальнага настрою твора і выкарыстанне сродкаў выразнасці (тон, тэмп, паўзы, лагічны націск). У адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам вучні павінны навучыцца карыстацца рознымі відамі чытання ў залежнасці ад задачы, якая ставіцца перад чытаннем тэксту.

У працэсе чытання і аналізу твораў гарманічна фарміруюцца навыкі чытання і комплекс чытацкіх уменняў, пералік якіх даецца ў раздзеле *«Фарміраванне чытацкіх уменняў»*. На іх аснове вучні ўспрымаюць твор, асэнсоўваюць яго маральную праблематыку і эстэтычны план, выказваюць пра твор уласныя меркаванні. Асваенне

вучнямі чытацкіх уменняў з'яўляецца неабходнай умовай фарміравання чытацкай кампетэнцыі.

У раздзеле *«Фарміраванне самастойнай чытацкай дзейнасці з кнігай (пазакласнае чытанне)»* акрэслены змест і спосабы дзейнасці, якімі павінны авалодаць вучні на занятках пазакласнага чытання. Самастойная праца вучня з кнігай з'яўляецца неад'емнай часткай фарміравання чытацкай дзейнасці, дае магчымасць удасканалення навыку чытання. Заняткі пазакласнага чытання маюць на мэце пашырэнне чытацкага кругагляду вучняў, фарміраванне ўменняў працаваць з кнігамі і свабодна арыентавацца ў свеце дзіцячых кніг беларускіх пісьменнікаў, дзіцячых перыядычных выданняў на беларускай мове, выхоўваць патрэбу ў самастойным чытанні. Веды пра кнігі і аўтараў набываюцца ў працэсе непасрэднай практычнай дзейнасці з дзіцячымі кнігамі – калектыўнай, індывідуальнай і групавой.

Навучальным матэрыялам для пазакласнага чытання з'яўляюцца кнігі. Для калектыўнай працы пад кіраўніцтвам настаўніка прапануюцца не хрэстаматыі, а ілюстраваныя кнігі з прозвішчам аўтара, назвай кнігі, ілюстрацыямі.

У працэсе навучання літаратурнаму чытанню вучні на практычным узроўні атрымліваюць першапачатковыя звесткі пра літаратуру як мастацтва слова. У змесце раздзела *«Фарміраванне ўяўленняў пра літаратуру як мастацтва слова»* вызначаны асноўныя літаратуразнаўчыя звесткі, з якімі вучні знаёмяцца ў працэсе працы з мастацкім творам. Веды пра літаратуру як мастацтва слова фарміруюцца на ўзроўні першапачатковых ведаў праз асваенне вобразнай функцыі мастацкага слова, усведамленне аўтарскай прыналежнасці твора, практычнае знаёмства з жанрамі.

Раздзел *«Літаратурна-творчая дзейнасць і культура маўлення»* вызначае змест камунікатыўна арыентаванай творчай працы на падставе прачытанага ці праслуханага твора. Ажыццяўленне літаратурна-творчай дзейнасці на ўроках літаратурнага чытання дае магчымасць актыўнага пашырэння і актывізацыі слоўніка вучняў, забяспечвае маўленчую практыку, спрыяе засваенню моўнай і маўленчай нормы, культуры маўленчых паводзін. На ўроках літаратурнага чытання фарміруюцца ўменні і навыкі гаварэння на беларускай мове. Творы мастацкай літаратуры з'яўляюцца прыкладамі правільнага маўлення і стымулююць выказванні вучняў на пэўную тэму, абуджаюць іх эстэтычныя пачуцці і творчы пачатак. У творах вучні назіраюць таксама трапнасць, выразнасць, дасціпнасць беларускай мовы, вучацца арыентавацца ў суразмоўніцтве, планаваць маўленчую дзейнасць, выбіраць моўныя сродкі, адпаведныя мэтам камунікацыі, ажыццяўляць камунікацыю ў адпаведнасці з этычнымі патрабаваннямі. Пры гэтым адбываецца пашырэнне і ўзбагачэнне слоўніка вучняў і яго актывізацыя, абуджаецца дзіцячая творчасць.

У III–IV класах асноўная ўвага скіроўваецца на фарміраванне чытацкіх уменняў для паглыбленага асэнсавання літаратурнага твора, яго эстэтычнага ўспрымання. Праводзіцца праца па ўспрыманні навукова-папулярнага твора з мэтай падрыхтоўкі да навучання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі, захавання пераемнасці. Значная ўвага на занятках павінна адводзіцца фарміраванню інфармацыйных уменняў пошуку, асэнсаванага ўспрымання, абмеркавання і ацэнкі інфармацыі розных відаў, атрыманай з розных крыніц для матываванага вучэбнымі задачамі выкарыстання. Такая праца арганізуецца з выкарыстаннем адпаведных узросту перыядычных выданняў.

Працягваецца ўдасканаленне тэхнікі чытання, праводзіцца праца па развіцці артыкуляцыйнага апарату, пашырэнні поля зроку. Значная ўвага павінна быць нададзена фарміраванню ўменняў сама- і ўзаемакантролю чытання.

Заняткі па фарміраванні самастойнай чытацкай дзейнасці з кнігай (пазакласнае чытанне) у III класе праводзяцца згодна з методыкай асноўнага перыяду, а ў IV – заключнага перыяду навучання пазакласнаму чытанню. Заняткі пазакласнага чытання праводзяцца пасля вывучэння тэматычных раздзелаў кола чытання і займаюць увесь час урока.

У III–IV класах фарміраванне самастойнай чытацкай дзейнасці абавязкова ўключае наведванне бібліятэк з мэтай выбару кніг для чытання. Для абуджэння цікавасці і

пазнавальнай актыўнасці вучняў мэтазгодна (па магчымасці) наведваць сацыякультурныя ўстановы.

На ўроках літаратурнага чытання неабходна рэалізоўваць міжпрадметныя сувязі з іншымі вучэбнымі прадметамі: з беларускай мовай (складанне невялікіх апавяданняў пра герояў мастацкіх твораў, складанне працягу твора, знаходжанне слоў на вывучаныя арфаграфічныя правілы і інш.); з выяўленчым мастацтвам (разглядванне і слоўнае апісанне рэпрадукцый карцін па тэмах, сугучных тэмам вывучаемых твораў, ілюстраванне асобных эпізодаў мастацкага твора, удзел у выстаўках малюнкаў і іншых творчых работ паводле вывучаных твораў і г. д.); з музыкай (слуханне музычных твораў у адпаведнасці з мэтавымі ўстаноўкамі ўрока, назіранне за стварэннем вобразаў у літаратуры і музыцы, знаёмства з творамі музычнага мастацтва, у аснову якіх пакладзены паэтычныя творы, у тым ліку фальклорныя і інш.); з працоўным навучаннем (рамонт кніг, выраб кніг-самаробак, практычнае знаёмства з элементамі кнігі, выкарыстанне элементаў калектыўнай творчасці (аплікацыя, лепка паводле вывучаных мастацкіх твораў і інш).

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

(70 гадзін, з іх 58 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і абагульненне ведаў па раздзелах чытання, 9 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – абавязковы кантроль навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў)

Кола чытання

Жанравая разнастайнасць кола чытання: вершы, апавяданні, казкі, жарты, загадкі, скорагаворкі, гумарыстычныя творы, пазнавальныя артыкулы з выхаваўчым патэнцыялам.

Аўтарская разнастайнасць кола чытання: дзіцячыя творы класікаў беларускай літаратуры, творы класікаў беларускай дзіцячай літаратуры; высокамастацкія дзіцячыя творы сучасных аўтараў.

Творы вуснай народнай творчасці: малыя жанры (загадкі, жарты, скорагаворкі, прыказкі, лічылкі, прыкметы), казкі.

Асноўныя раздзелы чытання. Рэкамендаваны пералік твораў

Рэкамендаваны пералік твораў складаецца са спісу твораў для чытання і вывучэння ў класе і спісу твораў для пазакласнага чытання. Спіс твораў для пазакласнага чытання з'яўляецца пашыраным і прыкладным. Ён мае рэкамендацыйны характар. Настаўнік выбірае для пазакласнага чытання тыя творы, якія прадстаўлены ў кніжных фондах бібліятэкі ўстановы адукацыі і раённай бібліятэкі.

1. ПРЫГОЖАЯ ПТУШКА ПЕР'ЕМ, А ЧАЛАВЕК ВУЧЭННЕМ

(5 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Л.Арабей. «Новы сшытак».
Н.Галіноўская. «Дзень добры, школа!».
Н.Гілевіч. «Калі ранец лёгкі і калі цяжкі?».
М.Дукса. «Ці так чытала?».
Прыказкі пра адносіны да вучэння.
В.Хомчанка. «Крыўда».

Для пазакласнага чытання

Э.Агняцвет. «Грамацеі», «Параска і падказка», «Свята кнігі».
Я.Бяганская. «Цяжкая задача».
А.Вольскі. «Непералётны вырай».
М.Гіль. «Першы настаўнік».
находить в библиотеке книги по заданной теме, пользуясь рекомендательными указателями, тематическими книжными выставками или открытым доступом к книжным полкам;

выбирать книгу в соответствии с поставленной целью;

самостоятельно знакомиться с книгой по ее внешним показателям (фамилия автора, заглавие, иллюстрации);

определять тему чтения и жанр;

пользоваться оглавлением;

определять тему творчества писателя по его книгам;

находить информацию о личности и творчестве писателя с помощью предисловий и послесловий к его книгам, справочной литературы, ЭСО;

составлять книжную выставку по теме, указанной учителем;

самостоятельно знакомиться с детским журналом и газетой с помощью просмотрового чтения;

пользоваться словарями, книгами-справочниками.

Индивидуальная и групповая работа с книгой во внеурочное время

Посещение библиотеки и ориентация в мире книг по тематической и авторской книжной выставке в пространстве библиотеки.

Работа в читальном зале со справочной литературой, детскими журналами и газетами.

Составление книжных выставок по теме, указанной учителем.

Работа в «мастерской по ремонту книг».

Подготовка и участие в литературных викторинах, утренниках и конкурсах.

СПИСОК ПРОИЗВЕДЕНИЙ ДЛЯ ЗАУЧИВАНИЯ НАИЗУСТЬ

Колядная песня (по выбору учащихся).

Купальская песня (по выбору учащихся).

И.Крылов. «Чиж и Голубь».

А.Барто. «Игра в слова» (отрывок по выбору учащихся).

Н.Некрасов. «Славная осень!..».

С.Есенин. «Поет зима – аукает...».

Т.Белозеров. Поэтическая миниатюра (по выбору учащихся).

Г.Новицкая. Поэтическая миниатюра (по выбору учащихся).

ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К РЕЗУЛЬТАТАМ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

Знать:

фамилии авторов, с творчеством которых знакомились неоднократно на уроках литературного чтения, и их произведения (название, имена героев, основное содержание);

произведения, рекомендованные для заучивания наизусть;

правила работы в читальном зале библиотеки (школьной, районной).

Иметь первоначальные представления:

о/об жанре как разновидности литературных произведений;

жанровых особенностях произведений фольклора: народной песни, сказки, пословицы;

жанровых особенностях произведений авторской литературы: литературной сказки, рассказа, басни, стихотворения;

видах народных песен (веснянки, жнивные, колядные, масленичные, купальские);

видах сказок (волшебная, о животных, бытовая);

видах стихотворений (стихотворения-описания, стихотворения-портреты);

способах построения произведения (от лица автора или героя);

изобразительно-выразительных средствах языка художественного произведения (сравнение, олицетворение, эпитет, звукопись, эмоционально-оценочные слова);

научно-познавательном тексте.

Уметь:

читать правильно, осознанно и выразительно вслух целыми словами тексты разных типов (художественный, научно-познавательный, учебный) в соответствии с орфоэпическими нормами и в темпе, который не препятствует пониманию прочитанного;

выразительно читать подготовленное художественное произведение или отрывок из него с соблюдением пауз на знаках препинания, интонации предложения в соответствии с эмоциональным настроением произведения, состоянием героя;

читать по ролям диалог героев произведения, отдельные эпизоды сюжетных произведений (сказка, рассказ);

оценивать свое и чужое чтение с позиций правильности и выразительности.

определять учебную задачу чтения: *что, с какой целью* должны прочитать;

планировать свою деятельность: называть в последовательности действия при подготовке к чтению по ролям, выразительному чтению, словесному рисованию;

прогнозировать до чтения содержание произведения по иллюстрациям и заголовку;

выявлять в тексте непонятные слова и выражения, определять их значение через контекст, сноски и с помощью словаря;

определять тему и главную мысль произведения (самостоятельно и с помощью учителя);

находить в тексте слова, которые указывают на эмоциональное настроение героя, его чувства, отношение автора к изображенным явлениям;

характеризовать героя на основании его поведения, переживаний и поступка, выражать свое отношение к нему;

выявлять авторскую точку зрения и выражать свои суждения о поступках героев; давать свою оценку поступку, герою;

создавать словесные иллюстрации по содержанию произведения (словесное описание по воображению героя произведения, словесное рисование по воображению поэтических картин, эпизодов текста);

работать с текстом: делить на смысловые части, составлять план, подробно и выборочно пересказывать художественное произведение по готовому плану;

работать в группе, создавая инсценировки несложных сюжетных произведений;

критически оценивать детские творческие работы в процессе обсуждения;

ориентироваться в литературных терминах и употреблять их к месту при ответе на вопрос: фольклор, устное народное творчество, жанр, произведение, басня, писатель, поэт, эпизод, герой (персонаж), портрет, характеристика, олицетворение, эпитет, сравнение, рифма, научно-познавательный текст, титульный лист, предисловие, оглавление, номер журнала, год издания журнала, экземпляр;

приводить примеры народных песен, пословиц, сказок (народных и литературных), стихов, рассказов, басен из круга изученных произведений;

различать художественный и научно-познавательный текст;

находить в библиотеке книги по заданной теме, пользуясь рекомендательными указателями, тематическими книжными выставками или открытым доступом к книжным полкам;

самостоятельно знакомиться с произведением и книгой до чтения;

пользоваться справочным аппаратом учебника.

Использовать приобретенные знания и умения в практической деятельности и повседневной жизни:

самостоятельно выбирать и читать книги, детскую периодику;

пользоваться всеми видами библиотечно-библиографической помощи;

самостоятельно знакомиться с произведением и книгой до чтения;

ориентироваться в книгах по оглавлению;

высказывать оценочные суждения о прочитанном произведении (герое, событии), книге, просмотренном фильме, спектакле;

пользоваться толковым словарем;

принимать участие в литературных конкурсах.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Замежная мова (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская)»
для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ЗАМЕЖНАЯ МОВА
(АНГЛІЙСКАЯ, НЯМЕЦКАЯ, ФРАНЦУЗСКАЯ, ІСПАНСКАЯ, КІТАЙСКАЯ)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У сучасным свеце замежная мова разглядаецца як сродак фарміравання і выхавання маральна адказнай асобы, як сродак зносін, пазнання, асэнсавання і інтэрпрэтацыі фактаў іншай культуры. Галоўнае прызначэнне замежных моў – забяспечваць узаемадзеянне і

супрацоўніцтва народаў, выключаць магчымасці негатыўнага ўплыву на працэс нацыянальнай самаідэнтыфікацыі і культурнага самавызначэння асобы; павышаць гатоўнасць чалавека да асобаснай і прафесійнай самарэалізацыі праз выкарыстанне замежнай мовы нараўне з роднай мовай у якасці матэрыяльнай формы функцыянавання свайго мыслення. Валоданне замежнымі мовамі – важная перадумова адаптацыі чалавека ў жыцці ў глабалізаваным свеце.

Вучэбны прадмет «Замежная мова» прызначаны служыць фарміраванню полікультурнай асобы. Адпаведна, працэс навучання замежнай мове накіраваны на падрыхтоўку вучняў да розных форм адносін і зносін паміж індывідамі і групамі, якія належаць да розных культур.

Магчымасці вучэбнага прадмета «Замежная мова» ў падрыхтоўцы вучня да міжкультурнай камунікацыі надзвычай вялікія. Вучань далучаецца да духоўнага багацця іншых народаў; у яго фарміруецца вобраз свету, які адпавядае сацыяльным, палітычным і культурным рэаліям сучаснай рэчаіснасці; фарміруецца другасная кагнітыўная свядомасць, якая забяспечвае ўвесь комплекс іншамоўнай камунікатыўнай дзейнасці; адбываецца развіццё маўленчых працэсаў і маўленчых механізмаў, здольнасці перадаваць у ходзе іншамоўных зносін уласныя думкі і пачуцці; узнікаюць перадумовы для развіцця асобы вучня праз узбагачэнне эмацыянальна-пачуццёвай сферы асобы. Моўныя здольнасці фарміруюцца ў адзінстве параджэння маўлення і ўспрымання маўлення.

Мэты навучання замежнай мове

Генеральная мэта навучання замежнай мове заключаецца ў фарміраванні вучняў як суб’ектаў міжкультурнай камунікацыі праз авалоданне імі іншамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыяй і развіццём у іх якасцей полікультурнай асобы, запатрабаваных сучасным інфармацыйным грамадствам ва ўмовах глабалізацыі. Генеральная мэта прадугледжвае пастаноўку і рэалізацыю адукацыйных, развіццёвых і выхаваўчых мэт у іх адзінстве.

Адукацыйныя мэты: моўнае і маўленчае развіццё асобы вучня шляхам забеспячэння практычнага валодання замежнай мовай як эфектыўным сродкам зносін у адзінстве яго кагнітыўнай, камунікатыўнай і экспрэсіўнай функцый; засваенне і актуалізацыя ведаў пра вывучаемую замежную мову; авалоданне навыкамі і ўменнямі іншамоўнай маўленчай дзейнасці (успрыманне і разуменне іншамоўнага маўлення на слых, гаварэнне, чытанне, пісьмо і пісьмовае маўленне).

Развіццёвыя мэты: забяспечваюць кагнітыўнае, камунікатыўнае, эмацыянальнае развіццё вучняў; авалоданне спосабамі фарміравання і фармулявання думкі на замежнай мове; развіццё лінгвістычнага кампанента гуманітарнага мыслення; узбагачэнне эмацыянальна-пачуццёвай сферы асобы.

Выхаваўчыя мэты: забеспячэнне ўзбагачэння духоўнага свету вучняў, выхавання ў іх культуры мыслення, пачуццяў, паводзін; развіцця гуманістычных каштоўнасных арыентацый, уменняў ажыццяўляць зносіны ў кантэксце дыялогу культур; фарміраванне псіхалагічнай гатоўнасці да міжмоўнай міжкультурнай камунікацыі; адаптацыі асобы да іншага сацыяльнага асяроддзя.

Задачы замежнай мовы як вучэбнага прадмета:

развіццё камунікатыўнай культуры вучняў, засваенне імі вуснага і пісьмовага маўлення на ўзроўні, які з’яўляецца дастатковым для адэкватнай трактоўкі інфармацыі, якая перадаецца і прымаецца;

кагнітыўнае развіццё вучняў, якое праяўляецца ў пераструктураванні асобных фрагментаў індывідуальнага вобраза карціны свету і ўспрыманні свету вывучаемай мовы праз штучна фарміруемы ў свядомасці лінгвадыдактычны канструкт, што дазваляе ўспрымаць даступны пазнанню свет у адпаведнасці з яго (гэтага свету) уласнымі сацыяльнымі, палітычнымі, культурнымі, моўнымі рэаліямі, а не праз проста пераклад на гэтую мову схем роднай, нацыянальнай карціны свету;

сацыякультурнае развіццё асобы, арыентаванае на ўспрыманне «іншага» ў яго непадобнасці праз пазнанне каштоўнасцей новай культуры ў дыялогу з роднай;

супастаўленне вывучаемай мовы з роднай і культуры гэтай мовы з нацыянальнай; фарміраванне ўменняў прадстаўляць сваю краіну і культуру ва ўмовах іншамоўных міжкультурных зносін;

развіццё каштоўнасных арыентацый вучняў, якое ажыццяўляецца праз фарміраванне гуманістычнай пазіцыі асобы шляхам стварэння ўмоў для ўзбагачэння адпаведнага канструктыўнага вопыту эмацыянальна-пачуццёвых адносін як важнейшага фактару ўзнікнення ў чалавека станоўчага ўспрымання «іншага», паважлівых адносін да яго, прызнанне разнастайнасці культур; з'яўленне ў вучняў імкнення да супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння з іншымі народамі;

развіццё матывацыі да вывучэння замежнай мовы праз фарміраванне патрэбнасцей лепш і дакладней разумець навакольны свет і быць зразуметым ім; усведамленне важнасці валодання замежнай мовай для сацыялізацыі ў сучасным свеце;

развіццё самаадукацыйнага патэнцыялу вучняў, забеспячэнне іх гатоўнасці да самастойнай працы над мовай, у тым ліку неабходнымі тэхнікамі вучэбна-пазнавальнай працы, стратэгіямі самааналізу і саманазірання.

У якасці комплексных характарыстык, што выражаюць змест задач, разглядаюцца кампетэнцыі, таму што яны задаюць нормы і патрабаванні да валодання замежнай мовай, якія дазваляюць прасачыць ступень сумеснай рэалізацыі мэт і задач.

Міжкультурная кампетэнцыя – стратэгічная кампетэнцыя, валоданне якой заклікана забяспечыць асэнсаванне вучнямі іншай сацыякультуры, пазнанне імі сэнсавых арыенціраў іншага лінгвасоцыуму, уменне бачыць падабенства і адрозненне паміж культурамі і ўлічваць іх у працэсе іншамоўных зносін.

Камунікатыўная кампетэнцыя – валоданне сукупнасцю маўленчых, моўных, сацыякультурных норм вывучаемай мовы, а таксама кампенсаторнымі і вучэбна-пазнавальнымі ўменнямі, якія дазваляюць выпускніку ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі рашаць маўленчыя, адукацыйныя, пазнавальныя і іншыя задачы, што стаяць перад ім. У састаў гэтай інтэграцыйнай кампетэнцыі ўваходзяць моўная, маўленчая, сацыякультурная, вучэбна-пазнавальная, кампенсанторная кампетэнцыі, якія разглядаюцца як субкампетэнцыі.

Маўленчая кампетэнцыя – сукупнасць навыкаў і ўменняў маўленчай дзейнасці (гаварэнне, успрыманне на слых, чытанне, пісьмо), веданне норм маўленчых паводзін; набыццё на гэтай аснове вопыту іх выкарыстання для пабудовы лагічнага і звязнага па форме і змесце выказвання, а таксама для тлумачэння сэнсу выказванняў іншых людзей.

Моўная кампетэнцыя – сукупнасць моўных ведаў аб правілах функцыянавання моўных сродкаў (фанетычных, арфаграфічных, лексічных і граматычных) у маўленні і навыкаў іх выкарыстання з камунікатыўнымі мэтамі.

Сацыякультурная кампетэнцыя – сукупнасць ведаў пра нацыянальна-культурную спецыфіку краін вывучаемай мовы, уменняў будаваць свае маўленчыя і немаўленчыя паводзіны ў адпаведнасці з гэтай спецыфікай, уменне прадстаўляць на гэтай аснове сваю краіну і яе культуру ва ўмовах іншамоўных міжкультурных зносін.

Кампенсаторная кампетэнцыя – сукупнасць уменняў выкарыстоўваць дадатковыя вербальныя сродкі і невербальныя спосабы для рашэння камунікатыўных задач ва ўмовах дэфіцыту існуючых моўных сродкаў.

Вучэбна-пазнавальная кампетэнцыя – сукупнасць агульных і сацыяльных вучэбных уменняў, неабходных для ажыццяўлення самастойнай дзейнасці па авалоданні замежнай мовай, вопыт іх выкарыстання.

Паслядоўнае і ўзаемазвязанае авалоданне пазначанымі ключавымі кампетэнцыямі забяспечвае фарміраванне ў вучняў адпаведных кампетэнтнасцей.

У сваёй сукупнасці мэты і задачы прадугледжваюць праектаванне і арганізацыю адукацыйнага працэсу на аснове патрабаванняў асобасна-арыентаванага, кампетэнтнаснага, камунікатыўнага, кагнітыўнага і сацыякультурнага падыходаў у іх адзінстве. Адсюль вынікае, што ў якасці важнейшых прынцыпаў ажыццяўлення адукацыйнага працэсу вызначаюцца наступныя:

забеспячэнне разумення культуры і ладу жыцця іншага народа і гатоўнасць «успрымаць іншага ў яго непадобнасці», усведамленне вучнямі прыналежнасці да роднай культуры;

адзінства рэалізацыі камунікатыўнай, культурна-прагматычнай і аксіялагічнай функцый вывучаемай мовы;

арыентацыя працэсу навучання на забеспячэнне дыялогу культур на аснове ўсебаковага ўліку ўзаемасувязей: мова – мысленне – культура;

забеспячэнне сацыялізацыі вучняў сродкамі замежнай мовы;

арганізацыя навучання замежнай мове як сродку іншамоўных зносін на аснове мадэліравання сітуацый міжкультурнай камунікацыі.

Выкладзеныя палажэнні вызначаюць патрабаванні да зместу адукацыі.

Агульныя патрабаванні да зместу адукацыі

Змест вучэбнага прадмета «Замежная мова» вызначаецца ў адзінстве прадметнага і эмацыянальна-каштоўнаснага кампанентаў.

Эмацыянальна-каштоўнасны кампанент зместу адукацыі ўключае сукупнасць адносін асобы да сусветнай моўнай і культурнай спадчыны, да працэсу авалодання ёй з мэтай асобаснага росту; забяспечвае набыццё вопыту іншамоўных зносін шляхам рэфлексіі, самапазнання, самавызначэння. Працэс авалодання замежнай мовай набывае для вучня асобасны сэнс.

Прадметны змест адукацыі ўключае наступныя кампаненты:

сферы зносін і прадметна-тэматычны змест маўлення;

віды маўленчай дзейнасці і моўны матэрыял;

сацыякультурныя веды: культуразнаўчыя, краіназнаўчыя і лінгвакраіназнаўчыя;

кампенсаторныя і вучэбна-пазнавальныя ўменні і навыкі самастойнай работы з іншамоўным матэрыялам.

Прадметны кампанент зместу забяспечвае валоданне замежнай мовай як сродкам міжкультурных зносін.

Адбор зместу вучэбнага матэрыялу, які патрэбна засвоіць, ажыццяўляецца на аснове наступных метадалагічных арыенціраў:

накіраванасць педагагічнага працэсу на падрыхтоўку да міжкультурных зносін;

усебаковы ўлік узаемасувязей: мова – мысленне – культура;

прад'яўленне каштоўнасцей пазнавальнай культуры ў дыялогу з роднай;

інтэграцыя моўнага, сацыякультурнага, аксіялагічнага кампанентаў зместу навучання;

аўтэнтычнасць і каштоўнасная значнасць іншамоўных матэрыялаў;

адпаведнасць вучэбнага матэрыялу сучасным гутарковым нормам вывучаемай мовы.

Структураванне вучэбнага матэрыялу ажыццяўляецца на аснове наступных патрабаванняў:

бесперапыннае канцэнтрычнае прад'яўленне і назапашванне ведаў;

паэтапнае фарміраванне навыкаў і ўменняў;

пераемнасць этапаў працэсу авалодання замежнай мовай;

пастаянная апора на моўны, маўленчы і асобасны суб'ектны вопыт вучняў;

спалучанасць у авалоданні маўленнем і сістэмай мовы;

стварэнне магчымасцей для фарміравання ўменняў самастойнай работы з іншамоўнымі інфармацыйнымі крыніцамі з самаадукацыйнай мэтай.

Спецыфіка зместу моўнай адукацыі прадугледжвае паслядоўны ўлік у адукацыйным працэсе наступных асноўных палажэнняў камунікатыўна арыентаванага навучання:

ажыццяўленне адукацыйнага працэсу ва ўмовах, набліжаных да рэальных зносін;

мадэляванне сітуацый зносін, якія стымулююць вучняў да вырашэння камунікатыўных задач у працэсе вывучэння замежнай мовы;

выкарыстанне камунікатыўна арыентаваных заданняў на аснове імітацыйных, гульнявых і свабодных зносін;

сітуатыўна абумоўленае авалоданне лексікай і граматыкай вывучаемай мовы;

актыўнае ўцягванне вучняў у працэс зносін у якасці маўленчых партнёраў;

стварэнне матывацыйнай гатоўнасці і патрэбнасці вучняў успрымаць і засвойваць вучэбны матэрыял ва ўмовах, набліжаных да рэальных зносін.

Сферы зносін і прадметна-тэматычны змест маўлення

Сацыяльна-бытавая сфера. Мая сям'я. Знешнасць. Прадукты харчавання. Мой пакой. Класны пакой. Жывёлы.

Вучэбна-працоўная сфера. Школьныя прылады.

Сацыяльна-пазнавальная сфера. Поры года.

Маўленчыя ўменні

Успрыманне і разуменне маўлення на слых – уменне разумець іншамоўнае маўленне ў працэсе непасрэдных зносін з субяседнікам, уменне разумець рознажанравыя тэксты з рознай паўнатой і дакладнасцю пранікнення ў іх змест.

Гаварэнне – уменне ажыццяўляць дыялагічныя і маналагічныя зносіны ў адпаведнасці з мэтамі, задачамі і ўмовамі камунікацыі, з захаваннем норм маўленчага этыкету.

Чытанне – уменне чытаць і разумець рознажанравыя тэксты з рознай паўнатой і дакладнасцю пранікнення ў іх змест у залежнасці ад віду чытання і далейшага выкарыстання інфармацыі.

Пісьмо і пісьмовае маўленне – навыкі напісання літар алфавіта, слоў і сказаў з апорай на ўзор; уменне правільна пісаць сваё імя, прозвішча, дату.

Моўныя веды і навыкі

Веды пра сістэму вывучаемай мовы, правілы функцыянавання моўных сродкаў (фанетычных, лексічных, граматычных) у маўленні і навыкі іх выкарыстання з камунікатыўнымі мэтамі.

Сацыякультурныя веды і ўменні

Веданне сацыякультурнага кантэксту сваёй краіны і краін вывучаемай мовы, уменні наладжваць свае маўленчыя паводзіны ў адпаведнасці з іх спецыфікай, прадстаўляць сваю краіну і яе культуру ва ўмовах іншамоўных міжкультурных зносін.

Кампенсаторныя ўменні

Уменні выкарыстоўваць розныя вербальныя і невербальныя сродкі для кампенсацыі недахопаў у камунікацыі ва ўмовах дэфіцыту моўных сродкаў, недахопу маўленчага і сацыяльнага вопыту.

Вучэбна-пазнавальныя ўменні

Агульныя і спецыяльныя вучэбныя ўменні, неабходныя для ажыццяўлення самастойнай пазнавальнай дзейнасці па авалоданні іншамоўнымі зносінамі і культурай краін вывучаемай мовы.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

105 гадзін

Сфера зносін	Прадметна-тэматычны змест	Камунікатыўныя задачы
		На канец навучальнага года вучань павінен у м е ц ь
Сацыяльна-бытавая	Мая сям'я	Паздаровацца, развітацца, пазнаёміцца; паведаміць асабістую інфармацыю (імя, прозвішча, узрост, месцажыхарства); расказаць пра блізкіх сваякоў (імя, месцажыхарства); распытаць субяседніка пра членаў яго сям'і

	Знешнасць	Апісаць сваю знешнасць (асноўныя часткі цела, колер валасоў, колер вачэй, рост, узрост); апісаць знешнасць членаў сям'і; расказаць пра знешнасць сябра; пазнаць чалавека па апісанні знешнасці
	Прадукты харчавання	Назваць прадукты харчавання; расказаць пра свае смакавыя перавагі; распытаць пра смакавыя перавагі субяседніка; прапанаваць пачастунак; прыняць/адхіліць прапанову; падзякаваць
	Мой пакой. Класны пакой	Расказаць пра асноўныя прадметы мэблі ў пакоі, класе; распытаць пра асноўныя прадметы мэблі ў пакоі, класе; расказаць пра размяшчэнне прадметаў у пакоі, класе; апісаць сваё рабочае месца ў класе; папрасіць прабачэння за спазненне на ўрок; папрасіць дазволу ўвайсці і выйсці
	Жывёлы	Назваць і апісаць жывёл (афарбоўка, велічыня, харчаванне); расказаць, што жывёла ўмее рабіць; выказаць свае адносіны да жывёл
Вучэбна-працоўная	Школьныя прылады	Паведаміць пра наяўнасць/адсутнасць школьных прылад, іх месцазнаходжанне; назваць асноўныя віды дзейнасці на ўроку; ветліва папрасіць/прапанаваць школьныя прылады (ручку, аловак, кнігу і г. д.)
Сацыяльна-пазнавальная	Поры года	Назваць і апісаць поры года; расказаць пра любімую пару года; расказаць пра надвор'е сёння

ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАКТЫЧНАГА ВАЛОДАННЯ ВІДАМІ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны разумець на слых указанні настаўніка, якія звязаны з вядзеннем урока; іншамоўныя тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару, якія пабудаваны на вывучаным моўным матэрыяле, у прад'яўленні настаўніка і ў гуказапісе, у тэмпе, набліжаным да натуральнага, з візуальнай апорай.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, верш, песня.

Працягласць гучання тэксту – 0,5 мінуты.

Гаварэнне

Дыялагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець запытваць і паведамляць інфармацыю асабістага характару з захаваннем элементарных норм маўленчага этыкету.

Віды дыялогу: этыкетны дыялог, дыялог-распытванне.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка – 3.

Маналагічнае маўленне

Вучні павінны ўмець:

паведамляць інфармацыю ў межах вывучанага моўнага матэрыялу;

апісваць прадметы.

Віды маналагічнага выказвання: паведамленне, апісанне.

Аб'ём выказвання – не менш за 4 фразы.

Чытанне

Вучні павінны:

ведаць літары алфавіта і асноўныя гука-літарныя адпаведнасці;

умець чытаць услых і самі сабе кароткія тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару, якія пабудаваны на вывучаным моўным матэрыяле.

Віды тэкстаў: казка, апавяданне, рыфмоўка, верш.

Аб'ём тэксту – прыкладна 750 друкаваных знакаў з прабеламі.

Пісьмо і пісьмовае маўленне

Вучні павінны ўмець:
пісаць усе літары алфавіта;
пісаць словы і сказы з апорай на ўзор;
правільна пісаць сваё імя, прозвішча, дату;
апісваць свой пакой, класны пакой, любімую жывёліну, пару года і інш.

МОЎНЫ МАТЭРЫЯЛ

АНГЛІЙСКАЯ МОВА

Фанетыка

Гукі англійскай мовы, працягласць і кароткасць галосных гукаў. Адсутнасць аглушэння звонкіх зычных. Рэдукцыя гукаў у ненаціскных складах. Інтанацыя формул маўленчага этыкету.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 50 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфікс лічэбнікаў *-teen*.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: утварэнне множнага ліку назоўнікаў з дапамогай *-s, -es*.

Артыкль: формы неазначальнага артыкля *a/an*, азначальны артыкль *the.*

Прыметнік: месца прыметніка ў сказе.

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 1–20.

Займеннік: асабовыя і прыналежныя займеннікі.

Дзеяслоў: сцвярджальная і адмоўная формы дзеясловаў *to be, to have* ў *Present Simple*. Загадны лад.

Мадальны дзеяслоў *can* для выказвання дазволу, магчымасці, здольнасці выконваць дзеянні.

Прыназоўнік: прыназоўнікі месца *in, on, under*.

Злучнік: and.

Сінтаксіс

Простыя апавядальныя і пытальныя сказы з дзеясловамі *to be, to have* ў *Present Simple*. Сказы з аднароднымі членамі. Безасабовыя сказы з фармальным дзейнікам *it (It's warm. It's spring)*.

НЯМЕЦКАЯ МОВА

Фанетыка

Гукі нямецкай мовы, іх літарная адпаведнасць; працягласць і кароткасць галосных, палаталізацыя і прыдыханне. Аглушэнне зычных у канцы склада, слова. Цвёрды прыступ. Націск у словах. Інтанацыя простага апавядальнага сказа. Інтанацыя пытальных сказаў.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 50 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: словаскладанне: назоўнік + назоўнік, лічэбнік + лічэбнік.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

М а р ф а л о г і я

Назоўнік: род назоўнікаў (біялагічны род). Назоўнік у назоўным і вінавальным склонах.

Артыкль азначальны артыкль *(der, die, das)*; ужыванне азначальнага артыкля перад назвамі пор года і месяцамі.

Неазначальны артыкль *(ein, eine)*; ужыванне неазначальнага артыкля ў структуры «дзеяслоў *sein* + назоўнік».

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 1–20; 10–100 (лічэнне дзясяткамі).

Займеннік: асабовыя займеннікі ў назоўным склоне. Прыналежныя займеннікі *mein, dein, sein, ihr, unser* у назоўным склоне.

Дзеяслоў: паўназначныя дзеясловы; дзеяслоў *sein* у цяперашнім часе *(Präsens Aktiv)*.

Мадальны дзеяслоў *können* для выказвання здольнасці, мадальны дзеяслоў *wollen* для выказвання пажадання.

С і н т а к с і с

Просты апавядальны сказ: прамы і адваротны парадак слоў. Парадак слоў у сказе з мадальным дзеясловам і інфінітывам. Безасабовыя сказы *(Es ist kalt. Es regnet. Es ist Winter)*.

Пытальныя сказы з пытальным словам і без пытальнага слова.

Ужыванне адмоўя *nicht* у простых сказах.

ФРАНЦУЗСКАЯ МОВА

Фанетыка

Адрозненне на слых і дакладнае вымаўленне ўсіх гукаў французскай мовы. Націск у асобным слове і рытмічнай групе. Асноўныя выпадкі счаплення і звязвання. Інтанацыя апавядальнага (сцвярджальнага і адмоўнага), пытальнага (з пытальным словам і пытальным зваротам *est-ce que*) і пабуджальнага сказаў.

Інтанацыя формул маўленчага этыкету.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 50 лексічных адзінак.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

М а р ф а л о г і я

Назоўнік: род і лік назоўнікаў.

Артыкль: азначальны і неазначальны, частковы (з назвамі прадуктаў харчавання).

Прыметнік: род і лік прыметнікаў, прыналежныя прыметнікі *(mon/ma, mes, ton/ta, tes, son/sa, ses)*. Пытальныя прыметнікі *quel(s), quelle(s)*.

Займеннік: асабовыя займеннікі ў ролі дзейніка (акрамя *on*). Пытальныя займеннікі *qui, qu'est-ce que*; націскныя займеннікі *moi, toi.*

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі ад 1 да 20.

Дзеяслоў: цяперашні час *le présent* дзеясловаў *avoir, êktre.* Дзеясловы ў загадным ладзе.

Прыслоўе: пытальныя прыслоўі *comment, quand, combien, où.*

Прыназоўнік: прыназоўнікі *à, de, avec, sur, sous, dans.*

Злучнік: et.

С і н т а к с і с

Парадак слоў у апавядальным і пабуджальным сказах. Канструкцыя *c'est ... / ce sont ...* . Безасабовыя звароты *il y a, il fait*. Парадак слоў у пытальным сказе, пабудаваным з дапамогай інтанацыі, пытальнага звароту *est-ce que*.

Адмоўная форма апавядальнага сказа.

ІСПАНСКАЯ МОВА

Фанетыка

Гукі іспанскай мовы. Пастаноўка націску ў слове. Адсутнасць змякчэння цвёрдых зычных перад *e, i*. Інтанацыя сцвярджальных, адмоўных, апавядальных сказаў. Інтанацыя пытальных сказаў з пытальным словам і без пытальнага слова.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 50 лексічных адзінак.

Словаўтварэнне: суфікс *-ito(a).*

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

М а р ф а л о г і я

Назоўнік: род і лік назоўнікаў.

Артыкль: неазначальны артыкль мужчынскага і жаночага роду, нулявы артыкль, зліянне артыкля з прыназоўнікам *del, al.*

Прыметнік: звычайная ступень параўнання; род і лік прыметнікаў; дапасаванне прыметнікаў да назоўнікаў.

Займеннік: асабовыя займеннікі ў ролі дзейніка; прыналежныя займеннікі (кароткая форма); пытальныя займеннікі *¿qué?, ¿quién?, ¿quiénes?, ¿cuánto(s)?, ¿cuánta(s)?.*

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 1–50.

Прыслоўе: mucho, poco, muy, bien, mal; пытальныя прыслоўі *¿dónde?, ¿cómo?.*

Дзеяслоў: спражэнне правільных дзеясловаў і няправільных *(estar, ser, ir, tener, saber, poder, querer)* у *Presente de Indicativo*. Дзеяслоўныя канструкцыі *saber + Infinitivo, poden + Infinitivo, querer + Infininivo.* Дзеяслоў *gustar (me gusta, te gusta…).*

Безасабовая канструкцыя *hay* + назоўнік.

Прыназоўнік: de, con, sin, para, en; прыназоўнікі і прыназоўнікавыя звароты месца *en, entre, sobre, bajo / debajo de, delante de, detrás de, cerca de, lejos de.*

Злучнік: y.

С і н т а к с і с

Безасабовыя сказы тыпу: *Nieva. Llueve. Hacefrío (calor). Hacemal (buen) tiempo.*

КІТАЙСКАЯ МОВА

ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАКТЫЧНАГА ВАЛОДАННЯ ВІДАМІ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны р а з у м е ц ь на слых указанні настаўніка, якія звязаны з вядзеннем урока, іншамоўныя тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару, якія пабудаваны на вывучаным моўным матэрыяле, у прад'яўленні настаўніка і ў гуказапісе, у тэмпе, набліжаным да натуральнага, з візуальнай апорай.

Віды тэкстаў: апавяданне, рыфмоўка, скорагаворка, верш, песня.

Працягласць гучання тэксту – 0,5 мінуты.

Гаварэнне

Дыялагічнае маўленне

Вучні павінны ў м е ц ь запытваць і паведамляць інфармацыю асабістага характару з захаваннем норм маўленчага этыкету.

Віды дыялогу: этыкетны дыялог, дыялог-распытванне.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка – 3.

Маналагічнае маўленне

Вучні павінны ў м е ц ь:

паведамляць інфармацыю ў межах вывучанага моўнага матэрыялу;

апісваць прадметы.

Віды маналагічнага выказвання: паведамленне, апісанне.

Аб'ём выказвання – не менш за 4 фразы.

Чытанне

Вучні павінны:

ведаць знакі транскрыпцыі;

умець суадносіць іерогліф з транскрыпцыйным знакам і малюнкам, які абазначае канкрэтныя прадметы і дзеянні;

чытаць услых і самі сабе кароткія тэксты маналагічнага і дыялагічнага характару (4–5 сказаў), пабудаваныя на вывучаным моўным матэрыяле, напісаныя з дапамогай транскрыпцыйных знакаў.

Віды тэкстаў: апавяданне, рыфмоўка, загадка, скорагаворка, верш, песня.

Пісьмо і пісьмовае маўленне

Вучні павінны ўмець:

пісаць усе транскрыпцыйныя знакі, выкарыстоўваючы паўдрукаваны шрыфт;

пісаць словы і сказы ў транскрыпцыі з апорай на ўзор;

пісаць прасцейшыя элементы іерогліфа (рыскі) і іерогліфы па ўзоры (20 адзінак);

пісаць рыскі ў правільным парадку.

МОЎНЫ МАТЭРЫЯЛ

Фанетыка

Гукі і тоны кітайскай мовы.

Лексіка

Прадуктыўны мінімум: 200 лексічных адзінак.

Рэцэптыўны мінімум: 50 лексічных адзінак.

Граматыка

Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення

Марфалогія

Назоўнік: адзіночны і множны лік.

Лічыльнае слова: 个, 只, 本, 岁, 块, 支, 把.

Займеннік: асабовыя займеннікі 我, 你, 他, 她, 我们, 你们, 他们; указальны займеннік 这.

Лічэбнік: колькасныя лічэбнікі 1–20.

Дзеяслоў: маўленчыя структуры з найбольш частотнымі дзеясловамі; загадны лад.

Паслялог: паслялогі месца 里面, 上面, 下面, 前面, 后面.

Сінтаксіс

Злучальны злучнік 和.

Пытальная часціца 吗.

Простыя апавядальныя сказы з дзеясловамі 是，有.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны валодаць **сацыякультурнымі ведамі і ўменнямі**:

ведаць на памяць асобныя рыфмаваныя творы дзіцячага фальклору краіны вывучаемай мовы, даступныя па змесце і форме;

умець удзельнічаць у элементарным этыкетным дыялогу (знаёмства, прывітанне, развітанне, падзяка, прабачэнне);

умець сцісла расказаць пра сябе, сваіх блізкіх сваякоў і распытаць пра гэта замежнага равесніка;

умець напісаць сваё імя і прозвішча на вывучаемай мове.

Вучні павінны валодаць **кампенсаторнымі ўменнямі** ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці:

успрыманне і разуменне маўлення на слых

прагназаваць змест аўдыятэксту па загалоўку;

абапірацца на сродкі зрокавай нагляднасці (малюнкі, фотаздымкі);

чытанне

прагназаваць змест тэксту па загалоўку;

абапірацца на сродкі зрокавай нагляднасці (малюнкі, фотаздымкі);

гаварэнне

удакладняць змест выказвання з дапамогай мімікі і жэстаў;

пісьмо і пісьмовае маўленне

выкарыстоўваць узор (літары, словы, сказы) у якасці апоры.

Вучні павінны валодаць **вучэбна-пазнавальнымі ўменнямі**:

дзейнічаць па аналогіі (па ўзоры) пры рашэнні камунікатыўных задач.

Вучні павінны выкарыстоўваць набыты **моўны, маўленчы і сацыякультурны вопыт**:

для псіхалагічнай адаптацыі да новай мовы і культуры;

выкарыстання вывучаемай мовы як сродку зносін.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Матэматыка»
для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

МАТЭМАТЫКА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Навучанне матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана на фарміраванне першапачатковых уяўленняў пра матэматыку як навуку, якая вывучае колькасныя адносіны і прасторавыя формы навакольнага свету. Вучэбны прадмет «Матэматыка» садзейнічае развіццю наглядна-вобразнага і слоўналагічнага мыслення, закладвае асновы для фарміравання ў вучняў алгарытмічнай культуры, пазнавальнай самастойнасці, паказвае магчымасці прымянення матэматычных ведаў у паўсядзённым жыцці.

Мэта навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі – фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для працягу навучання матэматыцы і іншым вучэбным прадметам на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі; набыццё першапачатковага вопыту рашэння вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач; фарміраванне пазнавальных працэсаў і мысліцельных аперацый вучняў.

Задачы навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

сфарміраваць уяўленне пра натуральны лік і лік «нуль» на аснове вывучэння ўтварэння, паслядоўнасці, чытання, запісу лікаў, іх разраднага саставу, параўнання лікаў і выканання над імі арыфметычных дзеянняў, вымярэння велічынь і рашэння тэкставых задач;

навучыць распазнаваць, будаваць і даследаваць геаметрычныя фігуры, параўноўваць аднародныя велічыні, вызначаць лікавыя значэнні велічынь з дапамогай вымярэнняў і вылічэнняў;

пазнаёміць са спосабамі прадстаўлення інфармацыі з дапамогай рысункаў, схем, чарцяжоў, дыяграм, тэкстаў, табліц, матэматычнай сімволікі; сфарміраваць пачатковыя ўменні па пабудове мадэлей рэальных сітуацый з колькаснымі данымі;

стварыць умовы для авалодання асновамі лагічнага і алгарытмічнага мыслення, развіцця прасторавага ўяўлення, матэматычнага маўлення;

забяспечыць набыццё пачатковага вопыту прымянення матэматычных ведаў для рашэння вучэбна-пазнавальных і вучэбна-практычных задач;

садзейнічаць развіццю цікавасці да матэматыкі, да даследавання матэматычнай сутнасці аб'ектаў навакольнага свету.

Метадычныя прынцыпы адбору зместу навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі

Прынцып вядучай ролі арыфметычнага матэрыялу. У адпаведнасці з дадзеным прынцыпам асноўнае месца ў змесце вучэбнага прадмета «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі адводзіцца фарміраванню паняцця цэлага неадмоўнага ліку.

Прынцып канцэнтрызму ў вывучэнні арыфметычнага матэрыялу. Згодна з гэтым прынцыпам арыфметычны матэрыял на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі структуруецца па канцэнтрах: спачатку вывучаюцца адназначныя лікі, потым – двухзначныя, далей – трохзначныя і мнагазначныя лікі да мільёна. Вылучэнне канцэнтраў звязана з асаблівасцямі дзесятковай сістэмы злічэння. У кожным канцэнтры вучні знаёмяцца са спосабамі ўтварэння, чытання і запісу лікаў, паслядоўнасцю лікаў, вучацца параўноўваць лікі і выконваць над імі арыфметычныя дзеянні.

Прынцып узаемасувязі змястоўных ліній вучэбнага прадмета «Матэматыка»: арыфметычнага матэрыялу, велічынь, геаметрычнага матэрыялу, элементаў алгебры. У адпаведнасці з гэтым прынцыпам змястоўныя лініі вучэбнага прадмета «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўзаемазвязаны і дапаўняюць адна адну. Вучэбны матэрыял, які вывучаецца ў межах адной лініі, садзейнічае лепшаму засваенню матэрыялу другой лініі (перавод з адных адзінак вымярэння велічынь у іншыя садзейнічае замацаванню ведаў пра разрадны састаў лікаў; рашэнне ўраўненняў заснавана на разуменні сувязі паміж кампанентамі і вынікамі арыфметычных дзеянняў; вылічэнне перыметра прамавугольніка звязана з веданнем уласцівасцей арыфметычных дзеянняў і інш.). На кожным уроку комплексна рашаюцца задачы па фарміраванні ўяўленняў пра лік, велічыню, геаметрычныя фігуры і элементы алгебры.

Прынцып інтэграцыі вучэбнай матэматычнай тэорыі і практыкі рашэння тэкставых задач з прыкладным зместам. Адпаведна гэтаму прынцыпу асаблівая роля ў вучэбным прадмеце «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі адводзіцца тэкставым задачам, на прыкладзе якіх вучні знаёмяцца з магчымасцямі прымянення матэматычнай тэорыі для рашэння практычных праблем.

Прынцып спалучэння гульнёвай і вучэбна-пазнавальнай дзейнасці пры навучанні матэматыцы. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вялікае значэнне надаецца выкарыстанню ў навучанні дыдактычных гульняў. У гэты перыяд адбываецца змена вядучага віду дзейнасці (пераход ад гульнёвай да вучэбна-пазнавальнай). Дыдактычная гульня інтэгруецца ў вучэбна-пазнавальную дзейнасць, з аднаго боку, ствараючы магчымасць для вывучэння вучэбнага матэрыялу на даступным для вучняў узроўні, з другога боку, стымулюючы развіццё інтарэсу да матэматыкі.

Прынцып навучання матэматыцы на аснове дзейнасці мадэліравання. У адпаведнасці з гэтым прынцыпам навучанне матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана не толькі на засваенне даступнай для вучняў матэматычнай тэорыі, але і на фарміраванне ў іх пачатковых уяўленняў пра метады пабудовы матэматычных мадэлей. Уменне ўяўляць істотныя характарыстыкі вывучаемых аб'ектаў з дапамогай мадэлей розных відаў садзейнічае ўсвядомленаму фарміраванню матэматычных паняццяў і спосабаў дзейнасці, аказвае станоўчы ўплыў на развіццё пазнавальнай самастойнасці вучняў.

Характарыстыка зместу навучання матэматыцы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі

У змесце вучэбнага прадмета «Матэматыка» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вылучаюцца наступныя *асноўныя* лініі:

арыфметычны матэрыял;

велічыні і іх вымярэнне;

геаметрычны матэрыял;

алгебраічны матэрыял.

З дапамогай простых і састаўных *тэкставых задач* вучні ўдакладняюць і абагульняюць веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні арыфметычнага і геаметрычнага матэрыялу, асноўных велічынь і элементаў алгебры. Тэкставыя задачы даюць магчымасць прымяняць матэматычную тэорыю для рашэння практычных праблем. У працэсе рашэння задач развіваюцца маўленне, увага, уяўленне і мысленне. Змест тэкставых задач забяспечвае пашырэнне кругагляду вучняў, дазваляе рэалізаваць выхаваўчую функцыю навучання.

Вядучая роля ў навучанні матэматыцы адводзіцца арыфметычнаму матэрыялу, які вывучаецца канцэнтрычна: адназначныя лікі, двухзначныя лікі да 20, лікі ад 21 да 100, трохзначныя лікі, мнагазначныя лікі ад 1000 да 1 000 000. Пераход да новага канцэнтра суправаджаецца не толькі пашырэннем мноства вывучаных лікаў, але і сістэматызацыяй ведаў, увядзеннем новых паняццяў і спосабаў дзеянняў у дзейнасць вучняў. Лінія велічынь, геаметрычны і алгебраічны матэрыял з'яўляюцца спадарожнымі для лініі лікаў і арыфметычных дзеянняў. Знаёмства з велічынямі, вывучэнне элементаў геаметрыі і алгебры размеркавана па адпаведных канцэнтрах.

Арыфметычны матэрыял

Натуральныя лікі і нуль, арыфметычныя дзеянні над імі.

У вучняў фарміруюцца ўяўленні пра натуральны лік як вынік лічэння і вымярэння велічынь; утварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс лікаў, іх разрадны састаў; параўнанне лікаў, арыфметычныя дзеянні над імі (складанне, адніманне, множанне, дзяленне); уласцівасці арыфметычных дзеянняў (перамяшчальная ўласцівасць складання і множання, спалучальная ўласцівасць складання і множання, размеркавальная ўласцівасць множання), а таксама заснаваныя на гэтых уяўленнях вылічальныя ўменні і навыкі.

Долі. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучні знаёмяцца з паняццем долі як адной з роўных частак цэлага (прадмета, геаметрычнай фігуры, велічыні), вучацца параўноўваць долі на практычнай аснове, рашаць тэкставыя задачы на знаходжанне долі ліку і ліку па яго долі.

Велічыні і іх вымярэнне

У цеснай сувязі з арыфметычным матэрыялам раскрываецца паняцце велічыні. Важным з практычнага пункта гледжання з'яўляецца навучанне вымярэнню велічынь. Вучні атрымліваюць уяўленне пра тое, што лік з'яўляецца вынікам вымярэння велічыні.

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучні знаёмяцца з такімі велічынямі, як даўжыня, плошча, маса, час, і з адзінкамі іх вымярэння. Вызначэнне значэнняў гэтых велічынь заснавана на выкарыстанні вымяральных інструментаў і вылічэнняў. Пры рашэнні тэкставых задач вучні таксама знаёмяцца з прапарцыянальнымі велічынямі, лікавыя значэнні якіх вызначаюцца з дапамогай вылічэнняў (скорасць, час, адлегласць; цана, колькасць, кошт; ураджайнасць, плошча, ураджай і інш.).

Геаметрычны матэрыял

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучні знаёмяцца з геаметрычнымі фігурамі (пункт, прамая, адрэзак, ломаная, прамень, вугал, многавугольнік, прамавугольнік,

квадрат, акружнасць, круг і інш.); вучацца знаходзіць даўжыні адрэзка і ломанай, перыметр многавугольніка, плошчу геаметрычнай фігуры з дапамогай палеткі; вылічваць плошчу прамавугольніка па даўжынях яго старон; будаваць геаметрычныя фігуры. Вучні выконваюць заданні з геаметрычным зместам, накіраваныя на фарміраванне прасторавых уяўленняў. Знаёмства з геаметрычнымі целамі (куб, прызма, піраміда, цыліндр, конус, шар) на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца на прапедэўтычным узроўні.

Алгебраічны матэрыял

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучні знаёмяцца з алгебраічнымі паняццямі (лікавы выраз, роўнасць, няроўнасць, зменная, выраз са зменнай, ураўненне); вучацца чытаць і запісваць выразы, знаходзіць іх значэнні на аснове правіл парадку выканання дзеянняў; адрозніваць правільныя і няправільныя роўнасці і няроўнасці; абазначаць зменную літарамі лацінскага алфавіта, знаходзіць значэнне выразу пры зададзеным значэнні зменнай; рашаць ураўненні на аснове ўзаемасувязі паміж кампанентамі і вынікамі арыфметычных дзеянняў.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(140 гадзін)

Паўтарэнне вывучанага ў II класе (12 гадзін)

Двухзначныя лікі да 100: утварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс. Разрадны састаў двухзначных лікаў. Прадстаўленне двухзначных лікаў у выглядзе сумы разрадных складаемых. Параўнанне лікаў у межах 100.

Вуснае складанне і адніманне лікаў у межах 100. Пісьмовае складанне і адніманне лікаў у межах 100.

Знаходжанне невядомых кампанентаў пры складанні. Праверка складання. Знаходжанне невядомых кампанентаў пры адніманні. Праверка аднімання. Парадак выканання дзеянняў у выразах з дужкамі і без дужак.

Сэнс дзеянняў множання і дзялення. Назвы кампанентаў і вынікаў дзеянняў множання і дзялення. Перамяшчальная ўласцівасць множання. Узаемасувязь кампанентаў і выніку дзеяння множання. Таблічнае множанне і дзяленне з лікам 2. Таблічнае множанне і дзяленне з лікам 3.

Рашэнне простых і састаўных тэкставых задач вывучаных відаў.

Прамень. Вугал. Віды вуглоў (прамы, тупы, востры). Прамавугольнік. Квадрат. Перыметр многавугольніка.

Адзінкі даўжыні, суадносіны паміж імі (метр, дэцыметр, сантыметр). Адзінкі часу, суадносіны паміж імі (гадзіна, мінута).

Множанне і дзяленне (65 гадзін)

Таблічнае множанне і дзяленне. Узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння дзялення. Множанне 1 на лік, множанне ліку на 1. Множанне 0 на лік, множанне ліку на 0. Дзяленне ліку на 1, дзяленне ліку на лік, роўны дзялімаму. Дзяленне 0 на лік. Немагчымасць дзялення на 0. Множанне 10 на лік, множанне ліку на 10. Дзяленне ліку на 10, дзяленне з дзеллю 10.

Размеркавальная ўласцівасць множання. Множанне двухзначнага ліку на адназначны лік. Дзяленне сумы на лік. Дзяленне двухзначнага ліку на адназначны лік. Дзяленне двухзначнага ліку на двухзначны лік. Праверка множання спосабам знаходжання аднаго з множнікаў. Праверка дзялення спосабам знаходжання дзялімага. Праверка дзялення спосабам знаходжання дзельніка. Дзяленне з астачай. Праверка дзялення з астачай.

Парадак выканання дзеянняў у выразах без дужак і з дужкамі, якія ўтрымліваюць дзеянні адной ступені і розных ступеней.

Простыя задачы на павелічэнне (памяншэнне) ліку ў некалькі разоў у прамой і ўскоснай форме. Простыя задачы на кратнае параўнанне.

Атрыманне долі, параўнанне долей на практычнай аснове. Задачы на знаходжанне долі ліку і ліку па яго долі.

Задачы на знаходжанне чацвёртага прапарцыянальнага.

Рашэнне задач у 2–3 дзеянні на складанне, адніманне, множанне і дзяленне.

Зменная. Выразы са зменнай. Знаходжанне значэння выразу пры зададзеным значэнні зменнай.

Ураўненне. Рашэнне ўраўненняў спосабам падбору і на аснове ўзаемасувязі паміж кампанентамі і вынікам арыфметычнага дзеяння.

Віды трохвугольнікаў: прамавугольны, тупавугольны, востравугольны.

Абазначэнне геаметрычных фігур літарамі лацінскага алфавіта.

Пабудова прамавугольніка (квадрата) з зададзенымі даўжынямі старон.

Вылічэнне перыметра прамавугольніка (квадрата).

Плошча. Параўнанне плошчаў геаметрычных фігур. Адзінка плошчы – *квадратны сантыметр.* Палетка. Вымярэнне плошчы геаметрычных фігур з дапамогай палеткі.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па раздзеле «Множанне і дзяленне»

Ведаць:

табліцу множання адназначных лікаў і адпаведныя выпадкі дзялення;

узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння дзялення;

размеркавальную ўласцівасць множання;

правіла дзялення сумы на лік;

прыёмы вуснага множання і дзялення лікаў на адназначны лік, вуснага дзялення двухзначнага ліку на двухзначны лік;

спосаб выканання дзялення з астачай;

спосабы праверкі вынікаў выканання арыфметычных дзеянняў множання і дзялення;

правілы парадку выканання дзеянняў у лікавых выразах з дужкамі і без дужак, якія ўтрымліваюць дзеянні адной ступені і розных ступеней;

спосабы атрымання долі і параўнання долей на практычнай аснове;

спосабы рашэння ўраўненняў: падбор значэння зменнай, вызначэнне значэння зменнай на аснове ўзаемасувязі паміж кампанентамі і вынікамі арыфметычных дзеянняў;

віды трохвугольнікаў: прамавугольны, тупавугольны, востравугольны;

спосаб вылічэння перыметра прамавугольніка і квадрата;

спосаб знаходжання плошчы геаметрычнай фігуры з дапамогай палеткі.

Умець:

выконваць вуснае множанне і дзяленне лікаў на адназначны лік у межах 100;

выконваць і правяраць дзяленне з астачай;

выконваць множанне лікаў на лікі 0, 1 і на 10;

выконваць вуснае дзяленне лікаў на двухзначны лік у межах 100;

правяраць вынікі выканання арыфметычных дзеянняў множання і дзялення;

чытаць і запісваць лікавыя выразы ў 2–3 дзеянні з дужкамі і без дужак;

прымяняць правілы парадку выканання дзеянняў у лікавых выразах у 2–3 дзеянні з дужкамі і без дужак і знаходзіць іх значэнні;

адрозніваць лікавы выраз, роўнасць, няроўнасць, ураўненне;

знаходзіць значэнне выразу са зменнай пры зададзеным значэнні зменнай;

рашаць ураўненні спосабам падбору і на аснове ўзаемасувязі паміж кампанентамі і вынікамі дзеянняў;

рашаць простыя задачы на павелічэнне і памяншэнне ліку ў некалькі разоў у прамой і ўскоснай форме;

рашаць задачы на кратнае параўнанне;

рашаць задачы на знаходжанне чацвёртага прапарцыянальнага;

рашаць задачы ў 2–3 дзеянні;

рашаць задачы на знаходжанне долі ліку і ліку па яго долі;

абазначаць і называць геаметрычныя фігуры з дапамогай літар лацінскага алфавіта;

будаваць прамавугольнік (квадрат) з указанымі даўжынямі старон;

вылічваць перыметр прамавугольніка (квадрата);

параўноўваць плошчы геаметрычных фігур;

знаходзіць плошчу геаметрычнай фігуры з дапамогай палеткі;

выражаць лікавыя значэнні велічынь у розных адзінках вымярэння;

выконваць параўнанне, складанне і адніманне, множанне і дзяленне лікавых значэнняў велічынь;

карыстацца вывучанай матэматычнай тэрміналогіяй.

Трохзначныя лікі (56 гадзін)

Сотня як лічэбная адзінка. Разрады соцень, дзясяткаў і адзінак. Утварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс трохзначных лікаў. Разрадны састаў трохзначных лікаў. Прадстаўленне трохзначных лікаў у выглядзе сумы разрадных складаемых. Параўнанне лікаў у межах 1000.

Складанне і адніманне, якое грунтуецца на веданні паслядоўнасці трохзначных лікаў і іх разраднага саставу. Складанне і адніманне, множанне і дзяленне, якое грунтуецца на таблічных і пазатаблічных вылічэннях у межах 100.

Пісьмовае складанне і адніманне трохзначных лікаў.

Пісьмовае множанне і дзяленне трохзначных лікаў на адназначны лік.

Рашэнне задач у 2–3 дзеянні на складанне, адніманне, множанне і дзяленне.

Простыя і састаўныя задачы на вызначэнне цаны, колькасці, кошту.

Простыя і састаўныя задачы на вызначэнне скорасці, часу, адлегласці. Задачы на рух у супрацьлеглых напрамках (знаходжанне адлегласці). Задачы на сустрэчны рух (знаходжанне адлегласці).

Адзінка даўжыні – *кіламетр*. Суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі даўжыні (кіламетр, метр, дэцыметр, сантыметр).

Адзінкі масы: *тона, цэнтнер, грам*. Суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі масы (тона, цэнтнер, кілаграм, грам).

Адзінкі часу: *суткі, секунда*. Суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі часу (суткі, гадзіна, мінута, секунда). Рашэнне простых задач на вылічэнне часу заканчэння, пачатку і працягласці падзеі (з дакладнасцю да гадзіны). Поўнач. Поўдзень.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па раздзеле «Трохзначныя лікі»

Ведаць:

утварэнне, паслядоўнасць лікаў ад 0 да 1000;

разрадны састаў трохзначных лікаў;

прыёмы вуснага і пісьмовага складання і аднімання лікаў у межах 1000;

прыёмы вуснага і пісьмовага множання і дзялення лікаў у межах 1000;

адзінку даўжыні – *кіламетр*, суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі даўжыні (кіламетр, метр, дэцыметр, сантыметр);

адзінкі масы: *тона, цэнтнер, грам*; суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі масы (тона, цэнтнер, кілаграм, грам);

адзінкі часу: *суткі, секунда*; суадносіны паміж вывучанымі адзінкакмі часу (суткі, гадзіна, мінута, секунда).

Умець:

чытаць, запісваць і параўноўваць лікі ў межах 1000;

складаць і аднімаць лікі ў межах 1000;

выконваць вуснае множанне і дзяленне лікаў у межах 1000 у выпадках, заснаваных на вылічэннях у межах 100;

выконваць пісьмовае множанне і дзяленне трохзначных лікаў на адназначны лік;

рашаць састаўныя задачы ў 2–3 дзеянні;

рашаць простыя і састаўныя задачы на вызначэнне цаны, колькасці, кошту;

рашаць простыя і састаўныя задачы на вызначэнне скорасці, часу, адлегласці;

рашаць простыя задачы на вызначэнне часу заканчэння, пачатку і працягласці падзеі (з дакладнасцю да гадзіны);

выражаць лікавыя значэнні велічынь у розных адзінках вымярэння;

выконваць параўнанне, складанне і адніманне, множанне і дзяленне лікавых значэнняў велічынь;

карыстацца вывучанай матэматычнай тэрміналогіяй.

Паўтарэнне вывучанага ў III класе (7 гадзін)

Трохзначныя лікі: утварэнне, паслядоўнасць, чытанне, запіс. Разрадны састаў трохзначных лікаў. Прадстаўленне трохзначных лікаў у выглядзе сумы разрадных складаемых. Параўнанне лікаў у межах 1000.

Таблічнае множанне і дзяленне. Множанне і дзяленне двухзначнага ліку на адназначны, дзяленне двухзначнага ліку на двухзначны. Множанне 1 на лік, множанне ліку на 1. Множанне 0 на лік, множанне ліку на 0. Дзяленне ліку на 1, дзяленне ліку на лік, роўны дзялімаму. Дзяленне 0 на лік. Немагчымасць дзялення на 0. Множанне 10 на лік, множанне ліку на 10. Дзяленне ліку на 10, дзяленне з дзеллю 10. Дзяленне з астачай.

Вуснае і пісьмовае складанне і адніманне лікаў у межах 1000.

Вуснае і пісьмовае складанне і адніманне лікаў у межах 1000.

Вуснае множанне і дзяленне лікаў у межах 1000.

Пісьмовае множанне і дзяленне трохзначных лікаў на адназначны лік.

Знаходжанне значэння выразу са зменнай пры зададзеных значэннях зменнай.

Рашэнне ўраўненняў на аснове ўзаемасувязі паміж кампанентамі і вынікам арыфметычнага дзеяння.

Рашэнне задач на знаходжанне долі ліку і ліку па яго долі.

Рашэнне простых задач на павелічэнне і памяншэнне ліку ў некалькі разоў у прамой і ўскоснай форме; на кратнае параўнанне.

Рашэнне задач на знаходжанне чацвёртага прапарцыянальнага.

Рашэнне простых і састаўных задач на вызначэнне цаны, колькасці, кошту.

Рашэнне простых і састаўных задач на вызначэнне скорасці, часу, адлегласці; на рух у супрацьлеглых напрамках і на сустрэчны рух (знаходжанне адлегласці).

Рашэнне простых задач на вылічэнне часу заканчэння, пачатку і працягласці падзей (з дакладнасцю да гадзіны).

Пабудова прамавугольніка (квадрата) з указанымі старанамі.

Вымярэнне плошчы геаметрычнай фігуры з дапамогай палеткі.

Суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі даўжыні, масы, часу.

Пры вывучэнні матэматыкі ў III класе вучні авалодваюць наступнымі **відамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці**:

аналізаваць вучэбнае заданне (выдзяляць умову і патрабаванне);

вылучаць істотнае і неістотнае ў тэксце вучэбнага задання;

знаходзіць патрэбную інфармацыю ў вучэбных дапаможніках;

разумець і супастаўляць інфармацыю, прадстаўленую ў выглядзе тэксту, рысунка, схемы, лікавага і літарнага выразу або роўнасці;

выкарыстоўваць для рашэння задач кароткія запісы, схематычныя рысункі і чарцяжы;

супастаўляць розныя спосабы рашэння задачы;

рашаць задачы рознымі спосабамі (у тым выпадку, калі яны дапускаюць розныя спосабы рашэння);

разумець інфармацыю, прадстаўленую ў таблічнай форме;

запаўняць/дапаўняць табліцы данымі, якіх не хапае;

выяўляць і выкарыстоўваць заканамернасці;

знаходзіць аналогіі і прымяняць іх пры выкананні заданняў;

праводзіць параўнанне і класіфікацыю аб'ектаў;

выконваць дзеянні па алгарытме;

будаваць разважанне ў працэсе рашэння задач, выканання заданняў;

выкарыстоўваць чарцёжныя інструменты (лінейку, вугольнік) для пабудовы і вымярэння.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ III КЛАСА

Ведаць:

паслядоўнасць лікаў ад 0 да 1000;

разрадны састаў трохзначных лікаў;

размеркавальную ўласцівасць множання;

правіла дзялення сумы на лік;

прыёмы вуснага і пісьмовага складання і аднімання лікаў у межах 1000;

узаемасувязь паміж кампанентамі і вынікам дзеяння дзялення;

табліцу множання адназначных лікаў і адпаведныя выпадкі дзялення;

спосаб выканання дзялення з астачай;

спосабы праверкі вынікаў выканання арыфметычных дзеянняў множання і дзялення;

прыёмы вуснага і пісьмовага множання і дзялення лікаў у межах 1000;

правілы парадку выканання дзеянняў у лікавых выразах з дужкамі і без дужак, якія ўтрымліваюць дзеянні адной ступені і розных ступеней;

спосабы атрымання долі і параўнання долей на практычнай аснове;

спосабы рашэння ўраўненняў: падбор значэння зменнай, вызначэнне значэння зменнай на аснове ўзаемасувязі паміж кампанентамі і вынікамі арыфметычных дзеянняў;

віды трохвугольнікаў: прамавугольны, тупавугольны, востравугольны;

спосаб вылічэння перыметра прамавугольніка і квадрата;

спосаб знаходжання плошчы геаметрычнай фігуры з дапамогай палеткі;

адзінку даўжыні – *кіламетр*; суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі даўжыні (кіламетр, метр, дэцыметр, сантыметр);

адзінкі масы: *тона, цэнтнер, грам*; суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі масы (тона, цэнтнер, кілаграм, грам);

адзінку плошчы – *квадратны сантыметр*;

адзінкі часу: *суткі, секунда*; суадносіны паміж вывучанымі адзінкамі часу (суткі, гадзіна, мінута, секунда).

Умець:

чытаць, запісваць і параўноўваць лікі ў межах 1000;

складаць і аднімаць лікі ў межах 1000;

выконваць вуснае множанне і дзяленне лікаў у межах 100, вуснае множанне і дзяленне лікаў у межах 1000 у выпадках, заснаваных на вылічэннях у межах 100;

выконваць множанне лікаў на лік 0, 1 і 10;

выконваць і правяраць дзяленне з астачай;

выконваць пісьмовае множанне і дзяленне трохзначных лікаў на адназначны лік;

правяраць вынікі выканання арыфметычных дзеянняў множання і дзялення;

чытаць і запісваць лікавыя выразы ў 2–3 дзеянні з дужкамі і без дужак;

прымяняць правілы парадку выканання дзеянняў у лікавых выразах у 2–3 дзеянні з дужкамі і без дужак і знаходзіць іх значэнні;

адрозніваць лікавы выраз, роўнасць, няроўнасць, ураўненне;

знаходзіць значэнне выразу са зменнай пры зададзеным значэнні зменнай;

рашаць ураўненні спосабам падбору на аснове ўзаемасувязі паміж кампанентамі і вынікамі дзеянняў;

рашаць простыя задачы на павелічэнне і памяншэнне ліку ў некалькі разоў у прамой і ўскоснай форме;

рашаць задачы на кратнае параўнанне;

рашаць задачы на знаходжанне долі ліку і ліку па яго долі;

рашаць састаўныя задачы ў 2–3 дзеянні;

рашаць задачы на знаходжанне чацвёртага прапарцыянальнага;

рашаць простыя і састаўныя задачы на вызначэнне цаны, колькасці, кошту;

рашаць простыя і састаўныя задачы на вызначэнне скорасці, часу, адлегласці;

распазнаваць і называць вывучаныя геаметрычныя фігуры;

абазначаць і называць геаметрычныя фігуры з дапамогай літар лацінскага алфавіта;

будаваць прамавугольнік (квадрат) з указанымі даўжынямі старон;

вылічваць перыметр прамавугольніка (квадрата);

параўноўваць плошчы геаметрычных фігур;

знаходзіць плошчу геаметрычнай фігуры з дапамогай палеткі;

вызначаць час па цыферблатным гадзінніку;

рашаць простыя задачы на вылічэнне часу заканчэння, пачатку і працягласці падзеі (з дакладнасцю да гадзіны);

выражаць лікавыя значэнні велічынь у розных адзінках вымярэння;

выконваць параўнанне, складанне і адніманне, множанне і дзяленне лікавых значэнняў велічынь;

карыстацца вывучанай матэматычнай тэрміналогіяй.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

для аналізу тэксту, рысунка, схемы, табліцы з мэтай атрымання новай інфармацыі;

мадэлявання жыццёвай сітуацыі з дапамогай розных знакава-сімвалічных сродкаў;

рашэння практычных задач, звязаных з вылічэннямі;

ацэнкі даўжыні, масы, плошчы прадметаў на аснове пачуццёвага ўспрымання і спосабаў вымярэння;

вызначэння часу па цыферблатным гадзінніку;

ацэнкі часавых прамежкаў (пачатак, канец, працягласць);

атрымання долей і знаходжання долей аб’ектаў;

пабудовы і вымярэння геаметрычных аб’ектаў.

Кантрольныя работы:

кантрольная пісьмовая работа – 4 (2 – I паўгоддзе, 2 – II паўгоддзе);

праверка навыку вуснага лічэння – 2 (1 – I паўгоддзе, 1–II паўгоддзе).

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет» для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

ЧАЛАВЕК І СВЕТ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма вызначае мэту, задачы, структуру і змест вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Інтэграваны характар вучэбнага прадмета

абумоўлены ўзроставымі псіхалагічнымі асаблівасцямі вучняў, накіраванасцю на фарміраванне асноў светапогляду. Інтэграцыя звестак з прыродазнаўчанавуковых і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (біялогіі, геаграфіі, фізікі, гісторыі, грамадазнаўства, этыкі, медыцыны) садзейнічае фарміраванню ў вучняў цэласнай карціны свету ва ўзаемасувязі прыроды, грамадства, чалавека.

Асноўным аб'ектам пазнання вучняў на ўроках «Чалавек і свет» выступае прырода, што дазваляе паспяхова вырашаць задачы фарміравання экалагічнай культуры, закладвае падмурак для працягу вывучэння шэрагу вучэбных прадметаў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Мэта вучэбнага прадмета «Чалавек і свет» – фарміраванне асноў навуковага светапогляду, экалагічнай і духоўна-маральнай культуры, ведаў аб прыродзе, грамадстве і чалавеку, неабходных для рознабаковага ўзаемадзеяння з навакольным светам.

Дасягненне пазначанай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных **задач**:

фарміраванне паняццяў пра аб'екты прыроды і з'явы, іх разнастайнасць, адзінства прыроднага і сацыяльнага, месца чалавека ў прыродзе і грамадстве;

авалоданне элементарнымі метадамі пазнання прыроды (распазнаванне, назіранне, эксперымент);

развіццё эмацыянальна-каштоўнасных адносін да прыроды, пазнавальнага інтарэсу да вывучэння аб'ектаў жывой і нежывой прыроды;

фарміраванне вопыту прыродаахоўнай дзейнасці, выкананне экалагічна абумоўленых норм паводзін;

асваенне ведаў пра арганізм чалавека, кампаненты здаровага ладу жыцця і спосабы яго рэалізацыі;

пашырэнне ведаў пра нормы і правілы культураадпаведных паводзін у навакольным сацыяльным асяроддзі, вопыту маральных адносін да людзей;

выхаванне патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, асноў грамадзянскай культуры;

фарміраванне вопыту пазнавальнай і творчай дзейнасці, развіццё прадметных і агульнавучэбных уменняў, адукацыйных кампетэнцый.

Змест вучэбнага прадмета комплексна прадстаўлены трыма ўзаемазвязанымі адукацыйнымі кампанентамі: **«Прырода і чалавек»** (галоўны кампанент), **«Чалавек і яго здароўе»**, **«Чалавек і грамадства»**. Змястоўны блок **«Мая Радзіма – Беларусь»** з'яўляецца састаўной часткай кампанента «Чалавек і грамадства» і вывучаецца ў IV класе на беларускай мове.

У аснову адукацыйнага кампанента «Прырода і чалавек» пакладзена *канцэпцыя экалагічнай адукацыі асобы*, што прадугледжвае фарміраванне ў вучняў асноў экалагічнай культуры, засваенне сістэмы першапачатковых экалагічных ведаў і ўменняў, прымяненне іх у канкрэтных жыццёвых сітуацыях, выхаванне беражлівых адносін да прыроды, фарміраванне вопыту практычнай прыродаахоўнай дзейнасці.

Вывучэнне кампанента «Прырода і чалавек» у *I класе* пабудавана па прынцыпе сезоннасці, таму што даступныя вучням непасрэдныя назіранні за зменамі ў нежывой і жывой прыродзе даюць наглядны матэрыял для засваення ўзаемазалежнасці з'яў у прыродзе ў розныя поры года. Абагульненне назіранняў за сезоннымі зменамі ў прыродзе, назапашаных эмпірычным шляхам, дазваляе падвесці вучняў да разумення прычын змены сезонаў у залежнасці ад нераўнамернасці асвятлення нашай планеты Сонцам. Вучні засвойваюць канкрэтныя веды пра змяненні ў нежывой і жывой прыродзе, вучацца тлумачыць сувязі, якія існуюць паміж асобнымі элементамі нежывой і жывой прыроды, упэўніваюцца ў тым, што ў прыродзе ўсё ўзаемазвязана.

У працэсе вывучэння кампанента «Чалавек і яго здароўе» пашыраюцца і паглыбляюцца веды пра спосабы захавання і ўмацавання здароўя, фарміруюцца адпаведныя ўменні і навыкі.

Вывучэнне адукацыйнага кампанента «Чалавек і грамадства» дае магчымасць фарміравання ў вучняў уяўленняў пра краіну, у якой яны жывуць, свой горад (вёску); усведамлення неабходнасці праявіць увагу і клопат да членаў сям'і; выконваць правілы бяспечных паводзін у паўсядзённым жыцці.

У *II класе* адукацыйны кампанент «Прырода і чалавек» уключае раздзелы: «Нежывая прырода і чалавек» і «Жывая прырода і чалавек».

Асноўная мэтавая ўстаноўка вывучэння раздзела «Нежывая прырода і чалавек» – паглыбленне ўяўленняў вучняў пра ваду, паветра, глебу. Прадметам вывучэння з'яўляюцца ўласцівасці важнейшых аб'ектаў нежывой прыроды, іх значэнне для чалавека і меры па іх ахове. Пры вывучэнні ўласцівасцей вады, паветра, глебы ствараюцца ўмовы для фарміравання ў вучняў навыкаў даследчай дзейнасці, развіцця ўменняў доследным шляхам вызначаць уласцівасці аб'ектаў, параўноўваць і аналізаваць аб'екты навакольнага свету, фіксаваць вынікі назіранняў, рабіць вывады.

Мэта вывучэння раздзела «Жывая прырода і чалавек» – садзейнічаць фарміраванню ў вучняў гуманных, экалагічна абгрунтаваных і ўсвядомленых адносін да ўсяго жывога.

У аснову адбору раздзела пакладзены краязнаўчы прынцып, які забяспечвае раскрыццё сутнасці вывучаемых паняццяў праз факты навакольнай рэчаіснасці. Краязнаўчы матэрыял выступае як крыніца тэарэтычных ведаў, сродак пазнання і аб'ект рашэння пазнавальных задач.

Пры вывучэнні дадзенага раздзела вучні знаёмяцца з групамі раслін і жывёл, устанаўліваюць сувязі, якія існуюць паміж раслінамі і жывёламі, рознымі групамі жывёл, паміж чалавекам і жывой прыродай.

Пры вывучэнні раздзела прадугледжваецца фарміраванне ў вучняў уменняў даведвацца і апісваць (вусна) прадстаўнікоў раслiннага і жывёльнага свету, устанаўліваць і тлумачыць сувязі ў жывой і нежывой прыродзе, прагназаваць вынікі іх парушэння чалавекам. Засваенне зместу раздзела важнае ў аспекце набыцця вучнямі экалагічна абумоўленага практычнага вопыту ўзаемадзеяння з прыродай (догляд раслін і жывёл бліжэйшага наваколля); выхаванне эстэтычных пачуццяў – здзіўлення, захаплення прыгажосцю прыроды.

Атрыманыя звесткі пра ўласцівасці вады, паветра, аб'екты жывой прыроды з'яўляюцца асновай для вывучэння кампанента «Чалавек і яго здароўе» і выкарыстоўваюцца для далейшага пашырэння ведаў пра здаровы лад жыцця.

Асноўнай мэтай вывучэння кампанента «Чалавек і грамадства» з'яўляецца фарміраванне пазітыўных эмацыянальна-каштоўнасных адносін вучняў да іншых людзей, засваенне ведаў аб правах і абавязках, правілах паводзін у грамадскіх месцах. Пры вывучэнні тэм «Сям'я» і «Эканоміка сям'і» ў вучняў фарміруюцца элементарныя эканамічныя ўяўленні (гаспадарка сям'і, бюджэт, грошы і г. д.), якія ў далейшым становяцца асновай эканамічнай граматнасці, выхавання якасцей беражлівасці, гаспадарлівасці, руплівасці.

У *III класе* вывучэнне адукацыйнага кампанента «Прырода і чалавек» пачынаецца з раздзела «Планета, на якой мы жывём», пры вывучэнні якога вучні атрымліваюць агульнае ўяўленне пра планету Зямля. У вучняў фарміруюцца ўяўленні пра глобус як мадэль Зямлі, адбываецца знаёмства з фізічнай картай паўшар'яў. Пры вывучэнні раздзела «Арыентаванне на мясцовасці» вучні атрымліваюць веды пра гарызонт, стораны гарызонту, знаёмяцца з практычнымі спосабамі арыентавання.

Змест раздзела «Мой родны край» дазваляе на краязнаўчым матэрыяле больш глыбока раскрыць узаемасувязі ў прыродзе, сфарміраваць уяўленні пра форму зямной паверхні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, пра карысныя выкапні, іх уласцівасці.

Засваенне ведаў пра нежывую прыроду стварае аснову для вывучэння раслiннага і жывёльнага свету ў тэме «Прыродныя згуртаванні роднага краю».

Змястоўнымі элементамі вывучэння гэтай тэмы з'яўляюцца найбольш распаўсюджаныя прыродныя згуртаванні нашай краіны: лес, вадаём, балота, луг. Вучні даведаюцца пра іх своеасаблівасць, значэнне ў прыродзе, ролю ў жыццядзейнасці чалавека.

На аснове ведаў пра разнастайнасць раслін і жывёл Беларусі фарміруюцца ўменні распазнаваць іх па характэрных прыкметах, тлумачыць асаблівасці прыстасавання жывых арганізмаў да навакольнага асяроддзя. У сістэме ведаў аб прыродзе асабліва важным з'яўляецца асваенне вучнямі правіл прыродаахоўных паводзін, узбагачэнне вопыту

экалагічна абгрунтаваных паводзін у прыродзе, развіццё эмацыянальна-каштоўнасных адносін да прыроды.

Вывучэнне раздзела «Разнастайнасць раслін і жывёл на Зямлі» накіравана на паглыбленне ўяўленняў пра ўзаемасувязі нежывой і жывой прыроды, сістэматызацыю і пашырэнне ведаў пра асноўныя групы прадстаўнікоў раслiннага і жывёльнага свету.

У адукацыйным кампаненце «Чалавек і яго здароўе» даецца агульнае ўяўленне пра ўнутраныя органы чалавека, іх функцыі, будову. Асаблівая ўвага надаецца пытанням асабістай гігіены, мерапрыемствам, якія павінны выконваць вучні для захавання і ўмацавання свайго здароўя. Фарміруецца ўяўленне вучняў пра тое, што правільнае харчаванне з'яўляецца адным з галоўных фактараў захавання здароўя чалавека.

Вывучэнне тэм «Апора цела і рух», «Органы пачуццяў чалавека. Вока – орган зроку», «Органы слыху, нюху, дотыку, смаку» накіравана на фарміраванне ў вучняў спагадлівых і добразычлівых адносін да іншых людзей, выхаванне цярпімасці і міласэрнасці да інвалідаў, людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Засваенне зместу вучэбнай праграмы «Чалавек і свет» арганізуецца праз урокі-гульні, урокі-падарожжы, урокі-даследаванні і іншыя з выкарыстаннем форм, метадаў і прыёмаў, якія забяспечваюць самастойнае набыццё вучнямі ведаў і актыўнае асваенне спосабаў пазнання навакольнага свету, захаванне і падтрымку працаздольнасці вучняў, зняцце фізічнага і псіхічнага напружання.

Сістэма ключавых кампетэнцый на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі фарміруецца шляхам засваення адпаведных кампанентаў зместу адукацыі з дапамогай універсальных вучэбных дзеянняў. Пры гэтым асаблівасці прадмета «Чалавек і свет» дазваляюць зрабіць вывад пра пераважную ролю пазнавальных вучэбных дзеянняў, да якіх адносяцца: навыкі ажыццяўлення мысліцельных аперацый (параўнання, класіфікацыі, аналізу, сінтэзу, абагульнення і інш.), навыкі работы з інфармацыяй (пошуку, пераўтварэння, падачы, перапрацоўкі, скарачэння і разгортвання; навыкі сэнсавага чытання і інш.), навыкі мадэлявання, у тым ліку з дапамогай знакава-сімвалічных сродкаў.

Пры арганізацыі вучэбнай дзейнасці неабходны перанос акцэнту з прыярытэту зместу адукацыі («Ведаю, што...») на прыярытэт асваення спосабаў дзеянняў («Ведаю, як...»). Вынікам навучання павінны стаць практыка-арыентаваныя прадметныя веды, здольнасць вучняў рашаць праблемы, паспяхова дзейнічаць у жыццёвых сітуацыях на аснове сфарміраваных кампетэнцый. Такі падыход канкрэтызаваны ў змесце вучэбнага прадмета пад назвай «Вопыт практычнай дзейнасці».

Віды вучэбнай дзейнасці вучняў вызначаюцца ў залежнасці ад крыніцы атрымання інфармацыі – на вуснай аснове (аповеду настаўніка, тэксту вучэбнага дапаможніка, кнігі для чытання, вучэбна-пазнавальнай літаратуры), на аснове ўспрымання ў працэсе назірання за аб'ектамі і з'явамі прыроды і дэманстрацыйнымі доследамі.

Асаблівая ўвага надаецца фарміраванню ўменняў вучняў працаваць з інфармацыяй, пры гэтым не толькі з тэкставай, але і з такімі крыніцамі інфармацыі, як умоўныя абазначэнні, ілюстрацыя, табліца, схема, карта, прыродны матэрыял, раздатачны матэрыял і інш. Таксама ў працэсе навучання могуць быць выкарыстаны электронныя адукацыйныя рэсурсы, аўдыя- і відэаматэрыялы.

Пазнавальныя вучэбныя дзеянні ажыццяўляюцца праз лагічныя аперацыі вылучэння прыкмет аб'ектаў і з'яў, упарадкавання, параўнання і класіфікацыі на аснове істотных прыкмет, устанаўлення аналогіі, прычынна-выніковых сувязей; аналізу, сінтэзу, вываду, абагульнення, сістэматызацыі і інш.

Асаблівае значэнне ў засваенні зместу вучэбнага прадмета маюць экскурсіі, якія дазваляюць пазнаваць навакольны свет праз назіранні, вывучаць навакольная аб'екты з дапамогай розных органаў пачуццяў, прадстаўляць вынікі пазнання ў выглядзе розных творчых работ (вырабаў, малюнкаў, апісанняў і г.д.), набываць вопыт прыродаахоўных паводзін і дзейнасці.

У раздзеле праграмы «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў» вызначаны прадметныя веды і ўменні, а таксама патрабаванні па іх выкарыстанні ў практычнай дзейнасці і штодзённым жыцці, якімі авалодаюць вучні I–IV класаў.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
(35 гадзін)

ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК (25 гадзін)

Планета, на якой мы жывём (2 гадзіны)

Зямля – наш агульны дом. Зямля як планета Сонечнай сістэмы. Выгляд Зямлі з космасу. Глобус – мадэль Зямлі. Паўночны полюс, Паўднёвы полюс. Экватар. Паўночнае і Паўднёвае паўшар'і. Мацерыкі і акіяны на глобусе (назва і размяшчэнне на глобусе).

Фізічная карта паўшар'яў. Карта – крыніца атрымання інфармацыі пра навакольны свет. Адрозненне глобуса і фізічнай карты паўшар'яў. Мацерыкі, акіяны, экватар, Паўднёвы і Паўночны полюсы на фізічнай карце паўшар'яў. Беларусь на глобусе і фізічнай карце паўшар'яў.

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый, работа з глобусам і фізічнай картай паўшар'яў.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Знаходжанне на глобусе і фізічнай карце паўшар'яў мацерыкоў, акіянаў.*

Арыентаванне на мясцовасці (3 гадзіны)

Гарызонт. Стораны гарызонту. Гарызонт, лінія гарызонту. Асноўныя і прамежкавыя стораны гарызонту.

Арыентаванне на мясцовасці па компасе. Компас, яго прызначэнне, будова. Вызначэнне старон гарызонту па компасе.

Арыентаванне па Сонцы і мясцовых прыродных прыкметах. Вызначэнне старон гарызонту па Сонцы. Мясцовыя прыродныя прыкметы для арыентавання.

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый, схем; назіранне.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Асваенне спосабаў арыентавання на мясцовасці па компасе, Сонцы і мясцовых прыродных прыкметах.*

Мой родны край (15 гадзін)

Формы зямной паверхні. Раўніны і горы як асноўныя формы паверхні Зямлі. Узгорак. Гара.

Раўнінная паверхня тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і яе значэнне. Раўніны, нізіны, узвышшы на фізічнай карце Беларусі.

Карысныя выкапні – падземныя багацці краіны. Пясок і гліна – найбольш распаўсюджаныя карысныя выкапні. Іх уласцівасці.

Выкарыстанне і ахова карысных выкапняў. Торф, нафта, каменная соль, калійная соль і іх выкарыстанне. Радовішчы карысных выкапняў на фізічнай карце Беларусі. Ахова карысных выкапняў.

Прыродныя згуртаванні Беларусі. Лес і яго насельнікі. Асноўныя прыродныя згуртаванні: лес, вадаём, балота, луг. Лес – прыродны дом для раслін і жывёл. Расліны і жывёлы лесу. Узаемасувязі жывых арганізмаў у прыродным згуртаванні «лес».

Лясныя багацці Беларусі. Значэнне лесу ў прыродзе і для чалавека. Значэнне лесу для аховы глебы, рэк, азёр. Лес – месца адпачынку дзяцей і дарослых. Прыродаахоўная дзейнасць па захаванні лесу.

Вадаём і яго насельнікі. Расліны і жывёлы прэсных вадаёмаў (рэк і азёр). Прыстасаванне жывых арганізмаў да ўмоў пражывання. Узаемасувязі паміж раслінамі і жывёламі вадаёмаў.

Водныя багацці Рэспублікі Беларусь. Прыродныя і штучныя вадаёмы. Рэкі і азёры, адметныя прыкметы ракі і возера. Часткі ракі. Буйнейшыя рэкі і азёры на фізічнай карце Беларусі. Прыгажосць рэк і азёр Беларусі. Выкарыстанне вадаёмаў у гаспадарчай дзейнасці людзей. Ахова вадаёмаў ад забруджвання.

Балота і яго насельнікі. Расліны і жывёлы балот. Прыстасаванне жывых арганізмаў да ўмоў пражывання. Узаемасувязь паміж раслінамі і жывёламі балот.

Значэнне балот у прыродзе і жыцці чалавека. Значэнне балот для захавання чысціні паветра, рэдкіх раслін і жывёл, рэк і азёр Беларусі. Балота – прыродная фабрыка торфу. Уплыў дзейнасці чалавека на прыроднае згуртаванне «балота». Клопаты чалавека пра ахову балот.

Луг і яго насельнікі. Расліны і жывёлы лугу, іх прыстасаванне да ўмоў пражывання. Узаемасувязь раслін і жывёл у прыродных згуртаваннях.

Значэнне лугоў у прыродзе і жыцці чалавека. Значэнне лугоў для жыцця раслін і жывёл. Расліны-меданосы і лекавыя расліны лугу. Кармавыя травы – галоўнае багацце лугоў. Выкарыстанне лугоў у гаспадарчай дзейнасці чалавека. Клопат пра захаванне лугоў.

Ахова прыроды – важная задача дзяржавы. Прыродныя тэрыторыі нашай рэспублікі, якія асабліва ахоўваюцца, іх значэнне ў ахове раслін і жывёл. Запаведнікі і нацыянальныя паркі Рэспублікі Беларусь. Унікальная прырода Нацыянальнага парку «Белавежская пушча».

Экскурсіі ў прыроду (2 гадзіны). *Тэмы экскурсій настаўнік выбірае самастойна з улікам магчымасцей рэгіёна.*

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый, схем; назіранне, правядзенне доследаў, работа з фізічнай картай Беларусі.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Знаходжанне на фізічнай карце Беларусі асноўных форм зямной паверхні, буйнейшых рэк і азёр.*

Апісанне карысных выкапняў і іх уласцівасцей. Знаходжанне на фізічнай карце Беларусі радовішчаў карысных выкапняў.

Распазнаванне прыродных згуртаванняў і іх насельнікаў. Выкананне правіл прыродаахоўных паводзін у прыродных згуртаваннях.

Разнастайнасць раслін і жывёл на Зямлі (5 гадзін)

Багацце прыроды Зямлі. Залежнасць разнастайнасці раслiннага і жывёльнага свету ад наяўнасці цяпла і вільгаці.

Расліны – насельнікі сушы. Расліны цяплалюбівыя і холадаўстойлівыя. Расліны засухаўстойлівыя і вільгацелюбівыя. Расліны святлолюбівыя і ценевыносліывыя.

Расліны – насельнікі мораў і акіянаў. Іх прыстасаванні да ўмоў жыцця ў розных месцах зямнога шара.

Жывёлы – насельнікі сушы. Іх прыстасаванні да ўмоў жыцця ў розных месцах зямнога шара.

Жывёлы мораў і акіянаў, іх прыстасаванні да ўмоў жыцця.

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый, работа з фізічнай картай Беларусі.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Распазнаванне некалькіх відаў раслін і жывёл розных месцаў зямнога шара.*

Чалавек і яго здароўе (10 гадзін)

Чалавек – частка жывой прыроды. Падабенства чалавека і іншых жывых арганізмаў. Адрозненне чалавека ад іншых жывых арганізмаў (чалавек – істота разумная). Арганізм чалавека як адзінае цэлае. Органы і сістэмы органаў чалавека.

Скура. Значэнне скуры для арганізма чалавека. Гігіена скуры.

Апора цела і рух. Шкілет і мышцы. Іх значэнне для забеспячэння апоры і руху арганізма. Значэнне фізічных практыкаванняў для развіцця мышцаў і шкілета. Правільная пастава, яе значэнне для здароўя чалавека. Захаванне правільнай паставы. Дзеці-інваліды. Уважлівыя адносіны да людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Кровазварот. Органы кровазвароту – сэрца і крывяносныя сасуды. Пульс. Значэнне органаў кровазвароту. Значэнне руху ва ўмацаванні сэрца (карысць ранішняй гімнастыкі, рухомых гульняў на свежым паветры, пасільнай фізічнай працы).

Дыханне. Органы дыхання, іх значэнне. Гігіена дыхання, папярэджанне прастудных захворванняў. Значэнне чыстага паветра для здароўя чалавека. Шкода курэння для здароўя чалавека.

Органы стрававання і выдзялення. Органы стрававання, іх значэнне. Органы выдзялення. Выдаленне з арганізма непатрэбных рэчываў. Роля нырак у ачыстцы арганізма ад непатрэбных рэчываў. Правілы здаровага харчавання, іх значэнне ў захаванні здароўя чалавека. Шкоднае ўздзеянне алкаголю на здароўе.

Нервовая сістэма. Галаўны мозг, спінны мозг, нервы. Значэнне нервовай сістэмы для арганізма чалавека. Гігіена нервовай сістэмы.

Органы пачуццяў чалавека. Вока – орган зроку. Значэнне зроку для чалавека. Гігіена зроку. Правілы прагляду тэлеперадач і работы на камп'ютары. Уважлівыя адносіны да людзей з аслабленым зрокам.

Органы слыху, нюху, дотыку, смаку. Вуха – орган слыху. Догляд вушэй. Слых і глухата. Уважлівыя адносіны да людзей з аслабленым слыхам. Органы нюху, дотыку, смаку, іх значэнне і гігіена.

Правілы здаровага ладу жыцця (абагульняльны ўрок).

Віды дзейнасці

Работа з вучэбным дапаможнікам, аналіз ілюстрацый, схем, макетаў; назіранне, мадэляванне сітуацый.

Вопыт практычнай дзейнасці. *Захаванне правільнай паставы, выкананне правіл здаровага харчавання, правіл гігіены нервовай сістэмы.*

Клопат пра чысціню скуры; захаванне зроку і слыху.

Знаходжанне пульсуючага крывяноснага сасуда на запясці і падлік колькасці ўдараў пульсу за мінуту.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Ведаць:

назвы мацерыкоў і акіянаў;

асноўныя стораны гарызонту;

розныя спосабы арыентавання на мясцовасці;

асноўныя формы зямной паверхні Рэспублікі Беларусь;

адметныя прыкметы ракі і возера;

найбольш распаўсюджаныя карысныя выкапні Рэспублікі Беларусь (пясок, гліна, торф, нафта, калійная і каменная солі);

асноўныя прыродныя згуртаванні роднага краю (лес, вадаём, балота, луг);

пра асноўныя органы і сістэмы органаў арганізма чалавека;

асноўныя правілы здаровага ладу жыцця (ахова зроку і слыху, зберажэнне здаровай нервовай сістэмы, выпрацоўка і захаванне правільнай паставы, умацаванне сэрца, гігіена дыхання, здаровага харчавання, догляд скуры);

пра шкоду курэння і алкаголю для арганізма чалавека.

Умець:

паказваць на глобусе, фізічнай карце паўшар'яў мацерыкі і акіяны;

паказваць на фізічнай карце Рэспублікі Беларусь важнейшыя рэкі і азёры, буйнейшыя нізіны, раўніны, узвышшы, радовішчы карысных выкапняў;

ацэньваць свае паводзіны і ўчынкі іншых людзей у адносінах да прыроды на аснове маральных і экалагічных норм;

ацэньваць свае паводзіны і ўчынкі іншых людзей у адносінах да людзей, якія акружаюць іх, на аснове гуманістычных каштоўнасцей і маральных норм;

адрозніваць некалькі відаў найбольш распаўсюджаных раслін і жывёл Беларусі: расліны і жывёлы лесу (не менш за 6), расліны і жывёлы вадаёма (не менш за 4), расліны і жывёлы балота (не менш за 4), расліны і жывёлы лугу (не менш за 4);

тлумачыць узаемасувязь раслін і жывёл у прыродным згуртаванні (лес, вадаём, балота, луг);

тлумачыць рознабаковае значэнне прыроды для чалавека, уплыў дзейнасці людзей на прыроду;

тлумачыць асаблівасці прыстасавання раслін і жывёл лесу, вадаёма, балота, лугу да ўмоў пражывання;

тлумачыць неабходнасць выканання правіл прыродаахоўных паводзін у прыродных згуртаваннях і ўдзелу ў ажыццяўленні пасільнай прыродаахоўнай дзейнасці;

тлумачыць неабходнасць выканання правіл і норм здаровага ладу жыцця;

знаходзіць патрэбную інфармацыю ў вучэбным тэксце, на малюнках, схемах; адказваць на пытанні па змесце прачытанага, пераказваць асобныя часткі тэксту, састаўляць аповед на аснове ілюстрацый; выкарыстоўваць вучэбныя тэксты, схемы, малюнкі, дадатковую пазнавальную літаратуру для пошуку неабходнай інфармацыі;

выказваць меркаванні, абмяркоўваць праблемныя пытанні, параўноўваць свае выказванні з вучэбным тэкстам;

супрацоўнічаць з аднакласнікамі пры выкананні заданняў у парах і групах (уменне дамаўляцца, размяркоўваць работу, атрымліваць агульны вынік, ацэньваць асабісты ўклад).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

для арыентавання на мясцовасці;

распазнавання і апісання раслін і жывёл бліжэйшага прыроднага навакольля;

выканння правіл прыродаахоўных паводзін і прыродаахоўнай дзейнасці;

выканання правіл зберажэння і ўмацавання здароўя, заняткаў фізічнай культурай і спортам;

выканання маральных норм.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Выяўленчае мастацтва»
для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Выяўленчае мастацтва» адыгрывае вялікую ролю ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі. Ён закліканы вырашаць задачы, звязаныя з перадачай мастацкіх каштоўнасцей культуры, выпрацаваных чалавецтвам, з мэтай эмацыянальна-пачуццёвага і духоўна-маральнага развіцця асобы, фарміраваннем яе эстэтычнага вопыту і творчага патэнцыялу.

Выяўленчае мастацтва з’яўляецца важнейшым фактарам пазнання навакольнага свету і феномена чалавека. Пры гэтым праблемы, якія ўзнімаюцца, падаюцца ў яркай,

эмацыянальна афарбаванай форме, ініцыіруючы ў адказ эмацыянальнае перажыванне вучняў. У выніку вобразы выяўленчага мастацтва засвойваюцца на эмацыянальным, рацыянальным, інтуітыўным і падсвядомым узроўнях.

Майстэрства выканання і адлюстраванне індывідуальна-аўтарскіх рыс твораў выяўленчага мастацтва з'яўляюцца ўнікальнымі, якія не падлягаюць варыятыўнаму ўзнаўленню. У сувязі з гэтым выяўленчая творчасць у сукупнасці з іншымі формамі мастацкай дзейнасці з'яўляецца істотным фактарам выяўлення і ўмацавання індывідуальнасці вучня, яго здольнасцей, якія вядуць да самаідэнтыфікацыі і выпрацоўкі асабістага погляду на свет. На гэтай аснове вучні вучацца творча пераўтвараць навакольную рэчаіснасць і свой унутраны свет.

У адукацыйным працэсе прадмет «Выяўленчае мастацтва» адрозніваецца дамінаваннем мастацка-творчай дзейнасці. У працэсе заняткаў выяўленчым мастацтвам актыўна развіваюцца такія сферы індывідуальнасці вучня, як вобразнае мысленне, фантазія, уяўленне, эмацыянальная сфера, мысліцельная дзейнасць, інтуіцыя і інш. Фарміруюцца прасторавыя і колеравыя ўяўленні, пачуццё меры, рытму, сіметрыі і асіметрыі, прапорцый, кампазіцыйнай раўнавагі, камбінаторныя і сенсорныя навыкі.

Зыходзячы са спецыфікі вучэбнага прадмета асноўнай **мэтай** навучання з'яўляецца фарміраванне асноў мастацка-эстэтычнай, духоўна-маральнай культуры вучняў, азнаямленне з нацыянальным і сусветным мастацтвам, развіццё патрэбнасці ў мастацка-творчай дзейнасці.

Для рэалізацыі гэтай мэты ставяцца наступныя **задачы:**

фарміраванне ўяўленняў пра маральна-эстэтычныя каштоўнасці нацыянальнай культурнай спадчыны, выхаванне пачуцця павагі да культурнай спадчыны іншых народаў;

выхаванне эстэтычных адносін да рэчаіснасці, мастацтва, з'яў мастацкай культуры, развіццё эстэтычных пачуццяў і задаткаў мастацкага густу;

развіццё здольнасцей эстэтычнага ўспрымання і ацэнкі твораў мастацтва розных відаў і жанраў;

навучанне асновам выяўленчай граматы; удасканаленне практычных уменняў і навыкаў выяўленчай, дэкаратыўна-прыкладной і канструктарска-дызайнерскай дзейнасці, лепкі;

развіццё зрокавага ўспрымання, кампазіцыйнай і каларыстычнай культуры, прасторавага мыслення, уяўлення;

развіццё мастацка-творчых здольнасцей і творчай актыўнасці вучняў.

У вучняў пры вядучай ролі пазнавальнай дзейнасці фарміруюцца элементы ўяўленняў, ведаў пра эстэтычныя і мастацкія з'явы. Вопыт назапашаных эмацыянальна-пачуццёвых уражанняў і эстэтычных перажыванняў знаходзіць адлюстраванне ў *мастацка-творчай дзейнасці*, садзейнічае развіццю творчага патэнцыялу, мастацка-творчых здольнасцей.

Формай мастацкай творчасці вучняў з'яўляецца сістэма выяўленча-выразных сродкаў пластычных (прасторавых) мастацтваў.

У выніку мастацкай творчасці вучні набываюць навыкі стварэння *мастацкіх вобразаў*. Мастацка-эстэтычныя якасці работ вучняў будуць удасканальвацца ў працэсе авалодання імі ведаў у галіне таго ці іншага віду мастацтва (графікі, жывапісу, скульптуры, архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну).

Узмацненне практыка-арыентаванай накіраванасці адукацыйнага працэсу абумовіла пераход да кампетэнтнаснага падыходу ў вызначэнні мэт і вынікаў мастацка-эстэтычнай адукацыі.

Рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу ў выкладанні выяўленчага мастацтва прадугледжвае інтэграцыю ведаў і творчую самарэалізацыю асобы, фарміраванне ў вучняў пачатковых класаў ***ключавых кампетэнцый*** – асобасных, метапрадметных і прадметных.

Да *асобасных кампетэнцый* адносяцца:

каштоўнасныя адносіны да нацыянальнага мастацтва свайго народа і народаў свету;

мастацка-вобразнае мысленне, назіральнасць і ўяўленне;

наяўнасць эстэтычных інтарэсаў і патрэбнасцей, эмацыянальна-каштоўнасных крытэрыяў жыццядзейнасці.

Метапрадметнымі кампетэнцыямі, якія фарміруюцца пры вывучэнні выяўленчага мастацтва, з'яўляюцца:

валоданне ўменнем «творчага бачання»;

уменне рацыянальна арганізаваць працэс мастацка-творчай дзейнасці;

імкненне гутарыць на тэмы мастацтва, валоданне культурай сутворчасці.

Прадметнымі (мастацка-эстэтычнымі) кампетэнцыямі (паводле Б. М. Няменскага) выступаюць:

веданне відаў і жанраў пластычных мастацтваў, асаблівасцей відаў мастацкай дзейнасці: адлюстравання, канструявання, дэкарыравання (упрыгожвання);

разуменне мастацка-вобразнай прыроды мастацтва;

здольнасць эстэтычна ўспрымаць, эмацыянальна ацэньваць і аналізаваць (з пасільным прымяненнем мастацтвазнаўчай тэрміналогіі) творы мастацтва, аб'екты і з'явы прыроды;

прымяненне спецыяльных ведаў, уменняў і навыкаў у працэсе адлюстравання аб'ектаў, канструявання вырабаў з паперы, лепкі з пластыліну, гліны, салёнага цеста, стварэння вобразаў у розных мастацкіх тэхніках («аплікацыя», «мазаіка», «калаж», «выцінанка» і інш.).

Асноўныя раздзелы вучэбнай праграмы

«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва» (складаецца з 2 падраздзелаў: «Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці» і «Успрыманне твораў мастацтва»).

«Практычная мастацка-творчая дзейнасць» (складаецца з 4 падраздзелаў: «Асваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік», «Адлюстраванне на плоскасці», «Лепка», «Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн»).

«Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці» як састаўная частка мастацкай дзейнасці мае ў праграме адносна самастойную сістэму вучэбных задач па фарміраванні эстэтычнай свядомасці і эстэтычных пачуццяў вучняў.

Асаблівая ўвага надаецца сферы эстэтычных і этычных каштоўнасцей нацыянальнай культуры, духоўна-эстэтычнага ўдасканалення чалавека, эстэтычнага асваення прыроднага свету і свету «другой прыроды» – архітэктурнага і прадметнага асяроддзя знаходжання чалавека.

Задачай дадзенага змястоўнага кампанента праграмы з'яўляецца мэтанакіраванае развіццё ў вучняў назіральнасці, візуальнага ўспрымання формы і колеру прадметаў, уменне вызначаць адценнне колеру аб'ектаў прыроды.

З мэтай сістэматычнага развіцця ў вучняў свядомага падыходу да ўспрымання эстэтычнага ў навакольнай рэчаіснасці змест гэтага раздзела ў структуры праграмы ад класа да класа паступова пашыраецца. Значнае месца павінна быць адведзена відэаэкскурсіям у прыроду, разгляданню і аналізу фотаздымкаў пейзажаў, архітэктурных збудаванняў, машын, адзення, мэблі, – усяго, што можа садзейнічаць развіццю эстэтычнай чуйнасці, назапашванню зрокавых уражанняў, развіццю здольнасці заўважаць прыгожае і асаблівае ў звыклым асяроддзі.

Змястоўны кампанент ***«Успрыманне твораў мастацтва»*** садзейнічае асваенню прадмета на мастацтвазнаўчым узроўні. Яго задачай з'яўляецца фарміраванне ключавых арыенціраў успрымання твораў выяўленчага мастацтва, пашырэнне мастацкага кругагляду вучняў, вывучэнне тэарэтычных асноў выяўленчага мастацтва, асваенне яго мовы, сістэмы выразных сродкаў.

У выніку асваення зместу гэтага раздзела праграмы вучні атрымліваюць уяўленне пра ролю мастацтва ў жыцці чалавека і грамадства, асновы нацыянальнага і сусветнага мастацтва, асаблівасці розных відаў і жанраў выяўленчага мастацтва, іх узаемасувязь.

Пры асваенні вучнямі твораў айчыннай мастацкай спадчыны выхоўваецца любоў да роднай культуры, адчуванне яе нацыянальнай своеасаблівасці, імкненне працягваць

мастацкія традыцыі. Асаблівая ўвага надаецца знаёмству з творчасцю прафесійных і народных майстроў, мясцовымі мастацкімі славутасцямі. Вывучэнне помнікаў архітэктуры і выяўленчага мастацтва, мастацкіх промыслаў і рамёстваў свайго рэгіёна не толькі садзейнічае далучэнню вучняў да творчасці на аснове мясцовых традыцый, але і прывівае любоў да роднага краю, павагу да людзей, якія жывуць побач, фарміруе жаданне берагчы і памнажаць мастацкі здабытак сваёй вёскі, горада і да т.п.

Пры азнаямленні вучняў з падраздзелам праграмы «Успрыманне твораў мастацтва» вельмі важным з'яўляецца развіццё навыкаў успрымання і аналізу твораў айчыннага і сусветнага мастацтва, фарміраванне ведаў і ўяўленняў пра творчасць мастакоў. Развіваюцца здольнасці вучняў суперажываць і эмацыянальна адгуквацца на твор выяўленчага мастацтва, яго змест, уменне выказаць да яго свае адносіны. Вучні атрымліваюць навыкі ўспрымання твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, раскрываюць яго змест на аснове засвоеных паняццяў і тэрмінаў, адзначаюць даступныя іх разуменню мастацкія сродкі і раскрываюць іх ролю ў стварэнні мастацкага вобраза.

Пералік мастацкіх твораў, прапанаваных у праграме, з'яўляецца прыкладным. У некаторых выпадках настаўніку рэкамендуецца самастойна падабраць твор для азнаямлення вучняў (падбор наглядна-дыдактычнага матэрыялу на ўспрыманне павінен ажыццяўляцца ў адпаведнасці з тэматыкай раздзела, узроставымі асаблівасцямі вучняў). Прыярытэтнае значэнне мае азнаямленне вучняў з творамі беларускай мастацкай спадчыны.

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва (праз дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый) павінна мець месца на кожным уроку, акрамя тых урокаў, якія адводзяцца на вывучэнне асноў выяўленчай граматы. Успрыманне аб'ектаў, з'яў рэчаіснасці і твораў мастацтва, іх шматаспектны аналіз папярэднічае выкананню практычнай работы: у пачатку заняткаў прапануецца гутарка (мультымедыйная прэзентацыя), наступная іх частка – практычная рэалізацыя тэмы: стварэнне творчай кампазіцыі, лепка, дэкарыраванне вырабаў (эскіз роспісу, упрыгожванне адзення і г.д.).

Час, адведзены на вывучэнне вучэбнага зместу раздзела «Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва», размяркоўваецца на працягу навучальнага года, сумарна складае ў III класе 5 вучэбных гадзін.

Па раздзеле праграмы «Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва» прадугледжваюцца наступныя *віды дзейнасці*:

параўнанне формы і афарбоўкі аб'ектаў прыроды;

слоўная замалёўка асаблівасцей дзённага і вячэрняга асвятлення, параўнанне афарбоўкі прадметаў пры халодным і цёплым дзённым асвятленні;

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага паведамлення «Прыгажосць аб'ектаў і з'яў прыроды»;

успрыманне і абмеркаванне мастацкіх твораў па тэмах, якія рэкамендаваны ў раздзелах праграмы;

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага паведамлення «Віды і жанры выяўленчага мастацтва», «Выразныя сродкі жывапісу», «Выразныя сродкі графікі», «Выразныя сродкі скульптуры» і інш.

Акрамя гэтага на ўроку могуць быць арганізаваны:

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага сачынення «Прыгожае ў прыродзе і жыцці», «Які колер мае снег», «Які колер у восені» і інш.;

конкурс на лепшае чытанне верша аб прыгажосці пор года, прыродных з'яў і інш.;

відэаэкскурсіі па залах краязнаўчых і мастацкіх музеяў.

У аснову змястоўнага кампанента ***«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»*** пакладзены прынцып сістэматычнага развіцця ў вучняў уменняў мастацкага мадэлявання свету. У працэсе асваення зместу дадзенага раздзела, які ажыццяўляецца на мастацка-творчым узроўні, набываецца вопыт творчай дзейнасці, развіваюцца мастацкія здольнасці вучняў у галіне колера- і формаўтварэння, асвойваюцца прасторавыя з'явы, фарміруюцца навыкі лепкі, дэкаратыўна-прыкладной дзейнасці, мастацкага канструявання (дызайну).

На занятках выяўленчым мастацтвам вучні малююць і лепяць з натуры, па памяці, па ўяўленні, канструююць, выконваюць работы ў розных мастацкіх тэхніках.

Працэс практычнай мастацка-творчай дзейнасці патрабуе стварэння ўмоў для праяўлення ў вучняў пачуцця радасці ад вынікаў мастацкай працы, упэўненасці ў сваіх сілах, актыўнасці ў выбары мастацкіх сродкаў, тэхнікі і матэрыялу пры выкананні вучэбных і творчых заданняў (кампазіцый), фарміравання ўменняў самастойна выбіраць сюжэт і ажыццяўляць творчую задуму на практыцы.

Змест раздзела «Практычная мастацка-творчая дзейнасць» уключае:

асваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік;

адлюстраванне на плоскасці;

лепку;

дэкаратыўна-прыкладную дзейнасць і дызайн.

Асваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік прадугледжвае азнаямленне з асаблівасцямі, тэхнічнымі прыёмамі і спосабамі работы з рознымі выяўленчымі матэрыяламі ў розных мастацкіх тэхніках. Вялікае значэнне мае наглядны паказ (дэманстрацыя) настаўнікам прыёмаў работы з матэрыяламі і інструментамі.

Адлюстраванне на плоскасці ўключае маляванне з натуры, па памяці, па ўяўленні пасля непасрэдных назіранняў, выкананне сюжэтна-тэматычных кампазіцый, а таксама выкананне эскіза.

Змест практычнай дзейнасці падраздзела прадугледжвае рашэнне чатырох асноўных груп вучэбных задач:

1) кампазіцыя;

2) форма, прапорцыі, канструкцыя;

3) колер і асвятленне;

4) прастора і аб’ём.

Асваенне гэтых груп вучэбных задач, якія ляжаць у аснове выяўленчай граматнасці, павінна быць падпарадкавана свядомаму рашэнню мастацкага вобраза ў адпаведнасці з узроставымі магчымасцямі вучняў.

Галоўнае ў рабоце **па кампазіцыі** – асваенне ўсёй паверхні аркуша і запаўненне яго выявай, а ў лепцы і дэкаратыўнай рабоце – стварэнне цэльнай формы. Вучні вучацца адбіраць для кампазіцыі аб’екты адлюстравання, якія адпавядаюць задуме, і маляваць іх буйна.

У рабоце **над формай** важна вучыць адчуваць вобразны характар формы, імкнуцца да паслядоўнага вобразнага ўскладнення пры яе адлюстраванні. Мадэліроўка формы і аб’ёму ажыццяўляецца тонам і колерам. Для выпрацоўкі навыкаў аналізу формы і яе ўвасаблення ў мастацкім вобразе вялікае значэнне маюць заняткі лепкай, дэкаратыўна-прыкладной дзейнасцю, канструяваннем, на якіх вучні актыўна працуюць з аб’ёмнай формай.

Асаблівая ўвага надаецца рэалістычнай перадачы **прапорцый** і **канструкцыі** прадметаў, якія адлюстроўваюцца.

У рабоце з **колерам** ставіцца задача бачыць колер разнастайна, адрозніваць і састаўляць патрэбныя адценні, змешваючы фарбы. Аднак мэта навучання асновам колеразнаўства – гэта каларыстычнае рашэнне таго або іншага мастацкага вобраза ў практычнай творчай дзейнасці.

Навучанне **перадачы прасторы** на паперы пачынаецца ў асноўным у працы па назіранні і на прапанаваныя тэмы. Галоўная ўвага надаецца фарміраванню ў вучняў паняццяў пра злом плоскасцей і межы злому (мяжа падлогі і сцяны, бачная мяжа зямлі і неба) і ўменні правільна размяшчаць прадметы на паверхні падлогі і зямлі.

Лепка прадугледжвае азнаямленне вучняў з прыёмамі і спосабамі лепкі, лепку рэльефа і аб’ёмных форм.

Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн прадугледжваюць азнаямленне з прыёмамі дэкаратыўнага абагульнення форм і колеру прадметаў (аб’ектаў), відамі арнаменту, асноўнымі кампазіцыйнымі схемамі твораў дэкаратыўна-прыкладнога характару, выкананне кампазіцый з прыроднага матэрыялу (лісця, кветак, травы і да т. п.),

у тэхніках «аплікацыя», «манатыпія», «трафарэт», выкананне рэльефных кампазіцый з паперы, канструяванне аб'ёмных цацак на аснове разгорткі геаметрычных цел і інш.

Спалучэнне выяўленчай дзейнасці з аб'ёмна-прасторавымі відамі работ (лепкай, канструяваннем, мадэляваннем), камбінаванне тэарэтычнага вывучэння асноў выяўленчай граматы з аналізам формы, прапорцый і канструкцыі прадмета, прымяненне і чаргаванне матэрыялаў і мастацкіх тэхнік (гуаш, акварэль, каляровыя крэйдачкі, туш, пластылін, гліна, «аплікацыя», «выцінанка», «манатыпія» і інш.) дазволіць вучням атрымаць уяўленне пра разнастайнасць сродкаў для стварэння мастацкага вобраза і будзе садзейнічаць свядомаму выбару матэрыялу ў залежнасці ад зместу і задумкі работы.

Настаўніку прадстаўляецца магчымасць выбару выяўленчых матэрыялаў для выканання вучнямі творчага задання з улікам іх пажаданняў, пераваг і ўзроставых асаблівасцей.

З мэтай індывідуалізацыі мастацка-творчага працэсу, максімальнага ўліку інтарэсаў і запатрабаванняў вучняў у праграме прадугледжваецца некалькі тэм для асваення пэўнай вучэбнай выяўленчай задачы. Тэмы з'яўляюцца прыкладнымі, настаўнік можа карэкціраваць іх па сваім меркаванні. У асобных выпадках дапускаецца свабодны выбар вучнямі тэхнікі выканання кампазіцыі, калі гэта не супярэчыць пастаўленай вучэбнай задачы.

Практычная мастацка-творчая дзейнасць узаемазвязана з успрыманнем і аналізам твораў мастацтва, назіраннямі вучняў за аб'ектамі і з'явамі прыроды (праз экскурсіі і дэманстрацыю мультымедыйных прэзентацый, рэпрадукцый мастацкіх твораў і фотаздымкаў). Эскізы і замалёўкі, выкананыя ў час экскурсій у прыроду і прагляду мультымедыйных прэзентацый, могуць служыць асновай для рашэння мастацкага вобраза пры стварэнні вучнямі творчых кампазіцый.

Час, адведзены на вывучэнне вучэбнага зместу раздзела «Практычная мастацка-творчая дзейнасць», размяркоўваецца на працягу навучальнага года, сумарна складае 30 вучэбных гадзін.

Па раздзеле праграмы *«Практычная мастацка-творчая дзейнасць»* прадугледжваюцца наступныя *віды дзейнасці*:

параўнанне формы, прапорцый і канструкцыі аб'ектаў, якія адлюстроўваюцца;

параўнанне кампазіцыйнага рашэння мастацкіх твораў, вычляненне асаблівасцей прасторавага размяшчэння адлюстраваных аб'ектаў;

параўнанне каларыстычнага рашэння мастацкіх твораў, вычляненне асаблівасцей мадэліроўкі аб'ёму адлюстраваных аб'ектаў, перадачы стану і настрою прыроды і г. д.;

параўнанне пластычнага рашэння вобразаў мастацкіх твораў розных відаў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

практычнае выкананне мастацка-творчых работ па тэмах, рэкамендаваных у раздзелах праграмы.

Акрамя гэтага на ўроку могуць быць арганізаваны:

падрыхтоўка і прэзентацыя вуснага сачынення «Асаблівасці перадачы аб'ёму прадметаў быту», «Асаблівасці стылізацыі раслінных і жывёльных форм», «Асаблівасці канструявання аб'ёмнай цацкі на аснове разгорткі конуса (цыліндра, куба)» і інш.;

конкурс на лепшую творчую кампазіцыю, выраб і інш. (праводзіцца ў межах міні-выстаўкі пры арганізацыі аналізу выкананых на ўроку работ і падвядзенні вынікаў урока).

На адным уроку для рэалізацыі мэты і задач вучэбнага прадмета «Выяўленчае мастацтва» мэтазгодна аб'ядноўваць змест двух раздзелаў вучэбнай праграмы.

Вучэбнай праграмай рэкамендуецца наступнае размеркаванне часу па раздзелах праграмы і відах дзейнасці (педагог мае права на перараз меркаванне гадзін паміж падраздзеламі).

Размеркаванне вучэбных гадзін па раздзелах праграмы і відах дзейнасці

Раздзелы праграмы	Віды дзейнасці	Колькасць гадзін
Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці і твораў мастацтва	Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці	1
	Успрыманне твораў мастацтва	4
Практычная мастацка-творчая дзейнасць	Асваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік	3
	Адлюстраванне на плоскасці	14
	Вучэбныя задачы:	
	Кампазіцыя	3
	Прастора	2
	Форма, прапорцыі, канструкцыя	3
	Колер	6
	Лепка	6
	Дэкаратыўна-прыкладная дзейнасць і дызайн	7
Усяго		35

Метады і формы работы з вучнямі на занятках разнастайныя: расказ, гутарка, дыскусія, прымяненне ілюстрацый і дэманстрацый, прагляд мультымедыйнай прэзентацыі і аналіз паказанага матэрыялу, самастойная работа з падручнікам, выкананне трэніровачных практыкаванняў, выкананне мастацка-творчых практычных работ і інш.; правядзенне заняткаў, пабудаваных па законах мастацкай драматургіі, майстар-класаў; выкарыстанне нестандартных форм правядзення ўрокаў: урок-даследаванне, урок-падарожжа, урок-гульня, урок-казка, інтэграваны ўрок і інш.; арганізацыя вучэбных экскурсій у музеі, на выстаўкі, па горадзе, сустрэчы і гутаркі з мастакамі і інш.

Змест вучэбнай праграмы не прадугледжвае выканання практычнай работы ў якасці дамашніх заданняў. Да наступнага ўрока (на працягу тыдня) вучні павінны нарыхтаваць дапаможны матэрыял, паназіраць за пэўнымі аб'ектамі або з'явамі прыроды, наведаць разам з бацькамі (аднакласнікамі) мастацкі музей, мастацкую выстаўку і г.д. Па ўласным жаданні вучні могуць падабраць рэпрадукцыі або літаратурны матэрыял, падрыхтаваць паведамленне пра гісторыю стварэння твора мастацтва або творчасць мастака, выканаць замалёўкі і эскізы з архітэктурнага ці скульптурнага помніка (іх асноўнай мэтай з'яўляецца арыентацыя вучняў на эстэтычнае асваенне навакольнага свету: прыроднага, помнікаў культуры, архітэктурных славутасцей свайго горада або вёскі і г.д.). Любога роду пазаўрочную выяўленчую дзейнасць вучняў настаўніку неабходна заахвочваць.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

(35 гадзін)

ЭСТЭТЫЧНАЕ ЎСПРЫМАННЕ РЭЧАІСНАСЦІ І ТВОРАЎ МАСТАЦТВА (5 гадзін)

Эстэтычнае ўспрыманне рэчаіснасці (1 гадзіна)

Разнастайнасць форм і колераў у прыродзе. Прыгажосць аб'ектаў і з'яў прыроды ў розныя поры года (мультымедыйная прэзентацыя, экскурсія).

Успрыманне твораў мастацтва (4 гадзіны)

Віды і жанры выяўленчага мастацтва.

Жывапіс. Выразныя сродкі жывапісу. *М.Казакевіч.* «Нарачанская зямля»; *Ф.Талстой.* «Букет кветак, матылёк і птушка»; *В.Вярсоцкі.* «Дарогі Міншчыны»; *В.Бялыніцкі-Біруля.* «Зімні сон»; *К.Пятроў-Водкін.* «Ранішні нацюрморт»; *В.Цвірка.* «Блакітны дзень»; *І.Айвазоўскі.* «Чорнае мора», ««Марыя» ў шторм», «Бой брыга «Меркурыя» з турэцкімі судамі»; *С.Каткоў.* «Хутар Альбуць»; *Б.Залкінд*. «Вуліца ў Вільні»; *І.Левітан.* «Залатая восень»; *Я.Зайцаў.* «Партрэт юнага партызана»; *З.Серабракова.* «Каця з нацюрмортам»; *М.Апіёк.* «Ружы»; *Рэмбрандт.* «Аўтапартрэт»; *Ф.Хальс.* «Цыганка»; *Караваджа.* «Юнак з лютняй»; *Ф.Снайдэрс.* «Фруктовая крама»; *Хеда.* «Нацюрморт. Снеданне» і інш. (на выбар настаўніка).

Графіка. Выразныя сродкі графікі. Сувязь ілюстрацыі са зместам твора. Ілюстрацыі мастакоў-графікаў да дзіцячых кніг (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Скульптура. Выразныя сродкі скульптуры. *Мікеланджэла.* «Давід»; *А.Глебаў.* «Янка Купала»; *А.Бембель.* «Гастэла»; *М.Врубель.* «Садко»; *В.Ватагін.* «Мядзведзь, які балансіруе»; *А.Шатэрнік.* «Каляды» і інш. (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Архітэктура. Архітэктурныя помнікі рэгіёнаў Беларусі. Сучасныя жылыя і грамадскія архітэктурныя збудаванні (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Сувязь дэкора з формай і прызначэннем прадмета. Дэкаратыўнае абагульненне формы і колеру ў творах народнага мастацтва (ілюстрацыйны матэрыял на выбар настаўніка).

ПРАКТЫЧНАЯ МАСТАЦКА-ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ (30 гадзін)

Асваенне тэхналагічных асаблівасцей мастацкіх тэхнік (3 гадзіны)

Прыёмы і спосабы работы графічнымі матэрыяламі (графітны аловак, туш, фламастары).

Прыёмы і спосабы работы акварэллю.

Асаблівасці выканання кампазіцыі ў тэхніцы «гуаш».

Прыёмы і спосабы выканання вырабаў у тэхніцы «папяровая пластыка». Спосабы афарбоўкі паперы ў патрэбныя колеры. Прыёмы трансфармацыі паперы: змінанне, згінанне, складванне, гафрыраванне, выгінанне, скручванне.

Асаблівасці выканання кампазіцыі ў тэхніцы «аплікацыя».

Асаблівасці выканання кампазіцыі ў тэхніцы «фларыстыка».

Асаблівасці выканання кампазіцыі ў тэхніцы «трафарэт».

Асаблівасці выканання кампазіцыі ў тэхніцы «манатыпія».

АДЛЮСТРАВАННЕ НА ПЛОСКАСЦІ (14 гадзін)

Кампазіцыя (3 гадзіны)

Выкарыстанне фармату нетрадыцыйных прапорцый для стварэння кампазіцыі («Навагодняя ёлка», «Дамы на нашай вуліцы», «Вясенні луг»). Поўнае выкарыстанне паверхні аркуша для перадачы мастацкай задумы, спосабы выдзялення кампазіцыйнага цэнтра («Восеньскі матыў», «Катанне з гор», «У лесе»).

Мастацкі матэрыял: гуаш, акварэль, крэйдачкі, фламастары.

Прастора (2 гадзіны)

Адкрытая і закрытая прастора. Перадача глыбіні прасторы («Асенні нацюрморт» (маляванне з натуры), «На катку», «Футбол», «Трактары ў полі», «Спартсмены рыхтуюцца да Алімпіяды», «Навасёлле», «У залах музея»).

Мастацкі матэрыял: гуаш, акварэль, фламастары.

Форма, прапорцыі, канструкцыя (3 гадзіны)

Перадача характару галоўнай формы, яе частак, іх узаемнага размяшчэння («На выстаўцы машын», «Новенькі трактар»).

Мастацкі матэрыял: гуаш, акварэль, фламастары.

Асаблівасці будовы і асноўныя прапорцыі цела чалавека і жывёл, размяшчэнне частак цела пры руху (тулава, канечнасці, шыя, галава). Выкананне кампазіцыі («Карнавал», «У свеце жывёл», «Скачкі», ілюстрацый да твораў А.Вольскага «Еду ў госці да слана», верша С.Маршака «Мельник, мальчик и осёл»).

Мастацкі матэрыял: гуаш, акварэль, фламастары.

Перадача канструкцыі аб'ектаў з улікам іх прасторавага становішча («Будуецца новы дом»).

Мастацкі матэрыял на выбар настаўніка.

Колер (6 гадзін)

Перадача стану і настрою прыроды («Восень у парку», «Восень», «Зіма (вясна) у горадзе (вёсцы)»).

Мастацкі матэрыял: гуаш, акварэль.

Выкарыстанне светлых і цёмных адценняў колеру пры стварэнні рэалістычных, дэкаратыўных, фантазійных і абстрактных кампазіцый («Вясёлка», «Салют», «Агні», «Святочны горад», «Казачны замак»).

Мастацкі матэрыял на выбар вучняў.

Эмацыянальны, вобразны змест колеру (радасны, напружаны, спакойны). Перадача колеравага вобразу аб'ектаў (прадметаў) і з'яў прыроды («Родныя прасторы», «Навальніца насоўваецца», «Ветраны дзень», «Захад», «Золак», «Туманны ранак», «Зімовы вечар»).

Мастацкі матэрыял: гуаш, акварэль.

Лепка (6 гадзін)

Лепка канструкцыйным спосабам (састаўленне цэлага з асобных частак) фігурак абагульненай формы па тыпу народных гліняных цацак («Зубраня», «Баранчык», «Конік»).

Перадача дынамікі пры лепцы чалавека, жывёлы (лепка канструктыўным або камбінаваным спосабам – «Чалавек, які бяжыць», «Конь, які скача»).

Узаемадзеянне фігур у скульптурнай кампазіцыі (лепка камбінаваным спосабам – «Барцы», «Коннік», «Жывёлы на арэне цырка»).

Перадача характэрных поз і рухаў жывёл, людзей (лепка пластычным спосабам – выцягванне дэталей з цэлага кавалка гліны, лепка канструкцыйным спосабам – «Сабака на задніх лапах», «Мядзведзь, які танцуе», «Коннік»).

Лепка рэльефу: птушкі, рыбы, узор з раслінных форм (пластычная сувязь элементаў, перадача руху, суадносіны мас).

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ І ДЫЗАЙН (7 гадзін)

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Сувязь дэкору з формай і прызначэннем прадмета.

Рытмічнае чаргаванне форм у дэкаратыўнай кампазіцыі. Выкананне фрыза: «Кветкі і матылькі» (аплікацыя), «Танцуючыя сняжынкі» (выцінанка).

Дэкаратыўнае абагульненне формы: састаўленне фігурак і кампазіцый з засушаных траў, лістоў, кветак: «Лясныя жыхары», «У свеце жывёл», «Падводнае царства», «Асенні букет» (фларыстыка).

Выкарыстанне фактуры і формы прыродных матэрыялаў. «Букет», «Нацюрморт» (манатыпія, трафарэт).

Адзінства формы прадмета і ўпрыгажэння: «Узор для дыванка», «Арнамент для хусткі» і інш.

Прыёмы выканання рэльефных кампазіцый: «Букет», «Зімовы пейзаж», «Рознакаляровая палянка» або рэльефных партрэтаў персанажаў казак: «Васіліса Прыгожая», «Мальвіна», «Марфачка» і інш. – папяровая пластыка.

Прыёмы выканання аб'ёмных цацак: «Важанятка», «Дзед Мароз», «Снягурка», «Гарманіст», «Квяточніца», «Лісічка», «Паўлін», «Кацяня» і інш. – папяровая пластыка.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

На канец навучальнага года вучні будуць

ведаць/разумець:

адметныя асаблівасці асноўных відаў мастацтва (графіка, жывапіс, скульптура, архітэктура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва);

адметныя асаблівасці жанраў выяўленчага мастацтва;

сродкі мастацкай выразнасці твораў графікі, жывапісу, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;

паслядоўнасць размяшчэння ў каляровым крузе шасці колераў (чырвоны, аранжавы, жоўты, зялёны, сіні, фіялетавы);

назвы адценняў колераў (светла-зялёны, цёмна-чырвоны і інш.);

асаблівасці будовы цела чалавека і жывёлы, становішча частак фігуры (тулава, канечнасці, шыя і галава) пры перадачы руху;

асаблівасці размеркавання святлоценевых градацый на прадметах (аб'ектах), якія адлюстроўваюцца;

адметныя асаблівасці спосабаў лепкі;

спосабы трансфармацыі паперы;

асаблівасці кампазіцыйнага размяшчэння аб'ектаў, якія адлюстроўваюцца;

законы лінейнай і святлопаветранай перспектывы;

паслядоўнасць выканання жывапіснай, графічнай і скульптурнай (рэльефнай, аб'ёмнай) кампазіцый, аплікацыі, манатыпіі, выцінанкі і інш.;

асноўныя кампазіцыйныя схемы, якія выкарыстоўваюцца пры стварэнні твораў дэкаратыўна-прыкладнога характару;

умець:

выбіраць фармат аркуша і яго становішча ў залежнасці ад зместу кампазіцыі;

поўнасцю выкарыстоўваць плоскасць аркуша, адлюстроўваць прадметы суразмерна фармату;

перадаваць характэрныя асаблівасці формы прадметаў, якія адлюстроўваюцца;

састаўляць колеры, неабходныя для рэалізацыі творчай задумы;

запаўняць малюнак колерам, не пакідаючы прабелаў паміж фігурамі і фонам;

падбіраць адценне колеру з улікам вобразнага зместу працы;

мадэляваць аб'ём аб'ектаў, якія адлюстроўваюцца, з улікам асвятлення;

перадаваць вертыкальнае і нахільнае становішча прадметаў у прасторы;

перадаваць планавасць і глыбіню прасторы ў кампазіцыі;

выбіраць аптымальныя спосабы лепкі;

выбіраць аптымальныя прыёмы трансфармацыі паперы пры канструяванні аб'ёмных цацак, выкананні рэльефных кампазіцый;

выкарыстоўваць мастацкія матэрыялы і тэхнікі для рашэння творчай задумы;

удзельнічаць у абмеркаванні работ аднакласнікаў;

выконваць элементарныя правілы культуры працы (арганізацыя і прыбіранне рабочага месца, акуратныя і беражлівыя адносіны да мастацкіх матэрыялаў і прылад).

Выкарыстоўваць у практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

спецыяльную (мастацтвазнаўчую) тэрміналогію (лексіку);

рацыянальныя прыёмы рэзання паперы;

аптымальныя прыёмы трансфармацыі паперы пры канструяванні аб'ёмных цацак;

аптымальныя спосабы лепкі;

розныя мастацкія тэхнікі для рашэння творчай задумы.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Музыка»
для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

МУЗЫКА

Мэта навучання вучэбнаму прадмету «Музыка» – фарміраванне музычнай культуры вучняў як часткі іх духоўнай культуры.

Адукацыйны кампанент мэты: асваенне музычнага мастацтва праз авалоданне музычнымі ведамі, слухацкімі, выканальніцкімі і кампазітарскімі ўменнямі; асваенне мастацкага спосабу пазнання свету.

Выхаваўчы кампанент мэты: выхаванне любові да музыкі, мастацтва, прысваенне падрастаючым чалавекам каштоўнасцей, закладзеных у змесце твораў мастацтва.

Развіваючы кампанент мэты: развіццё музыкальных, камунікатыўных, творчых здольнасцей; развіццё самастойнасці і ініцыятыўнасці ў вырашэнні творчых задач.

Звышзадачай вучэбнага прадмета «Музыка» з'яўляецца выяўленне цеснай сувязі музыкі і жыцця (Д.Б.Кабалеўскі). Рашэнне звышзадачы ажыццяўляецца праз выяўленне жыццёвых вытокаў і жыццёвага зместу музыкі, а таксама праз прымяненне ў рэальным жыцці набытых у працэсе навучання ведаў, уменняў, вопыту музычнай і мастацкай дзейнасці.

Задачы вучэбнага прадмета «Музыка»:

1. Фарміраванне прадметнай (музычнай) кампетэнцыі: выхаванне любові да музыкі, асваенне музычнага мастацтва (авалоданне музычнымі ведамі, слухацкімі, выканальніцкімі і кампазітарскімі ўменнямі), развіццё музыкальных здольнасцей.

Задача рашаецца:

праз фарміраванне ўяўленняў аб музыцы як самакаштоўным відзе мастацтва, яе змесце і выразнай мове;

фарміраванне ўменняў слухаць, выконваць, ствараць музыку;

назапашванне вопыту ажыццяўлення музычнай дзейнасці.

2. Фарміраванне надпрадметнай (мастацкай) кампетэнцыі: развіццё мастацкага густу, назапашванне вопыту самастойнай мастацка-творчай дзейнасці.

Задача рашаецца:

праз фарміраванне ўяўленняў аб музыцы як неад'емнай частцы мастацкай культуры, агульнасці зместу розных відаў мастацтва, адрозненнях у іх выразных мовах;

асваенне мастацкага спосабу пазнання свету;

развіццё мастацкіх здольнасцей;

назапашванне вопыту мастацка-творчай дзейнасці.

3. Фарміраванне метапрадметнай кампетэнцыі: развіццё камунікатыўных, творчых, аналітычных здольнасцей, уменняў рашаць праблемы, несці адказнасць за вынікі індывідуальнай і калектыўнай работы.

Задача рашаецца:

праз фарміраванне ўяўленняў аб цеснай сувязі музыкі (мастацтва) з жыццём;

назапашванне вопыту рашэння жыццёвых задач у працэсе мастацкай дзейнасці (у індывідуальнай, групавой і калектыўнай формах);

развіццё камунікатыўных і творчых уменняў;

назапашванне вопыту змястоўнага ацэньвання вучэбнай (музычнай) дзейнасці.

Спецыфіка вучэбнага прадмета «Музыка» праяўляецца ў адначасовым рашэнні ўсяго комплексу задач у працэсе навучання.

Прынцыпы навучання і адбору зместу

Навучанне вучэбнаму прадмету «Музыка» ажыццяўляецца на аснове наступных прынцыпаў:

прынцыпу цэласнасці, у адпаведнасці з якім музыка ў працэсе навучання разглядаецца ў адзінстве яе састаўляючых: зместу, формы, жанравай асновы і выразнай мовы. Прынцып цэласнасці рэалізуецца праз тэматычную будову зместу вучэбнага прадмета. Усе тэмы аб'яднаны інтанацыйнай прыродай музыкі, у кожнай з іх інтанацыя праяўляе адно або некалькі сваіх значэнняў;

прынцып полімастацкасці, які дазваляе выйсці за межы прадметнага зместу і разгледзець музыку ў якасці аднаго з праяўленняў мастацкай культуры і ва ўсім багацці яе ўзаемасувязей з іншымі відамі мастацтва. У працэсе навучання акцэнтуюцца функцыі музыкі, якія з'яўляюцца агульнымі для мастацтва і мастацкай дзейнасці ў цэлым. Прынцып прадугледжвае пашырэнне і паглыбленне зместу адукацыі і выхавання за кошт узаемадзеяння і ўзаемаўзбагачэння розных відаў мастацтва. Узаемадзеянне мастацтва выстройваецца вакол агульнага сэнсавага стрыжня, у якасці якога выступае тэматызм. Ён структурыруе змест вучэбнага прадмета;

прынцып сувязі з жыццём, у адпаведнсці з якім успрыманне музыкі (мастацтва) разглядаецца ў якасці мастацка-вобразнага аналага жыцця, а музычная творчая дзейнасць – у якасці працэсу мадэлявання рашэння жыццёвых праблем. Сацыякультурны кантэкст узнікнення і бытавання музычнага мастацтва з'яўляецца неад'емнай часткай зместу вучэбнага прадмета; веды і ўменні становяцца сродкам пранікнення вучняў у свет музыкі, а праз яго – у розныя праблемы жыцця. Прынцып сувязі з жыццём выступае ў якасці звышзадачы і генеральнай лініі навучання вучэбнаму прадмету.

Адбор зместу навучання вучэбнаму прадмету «Музыка» ажыццяўляецца з апорай на прынцыпы мастацкай дыдактыкі – *прынцыпы мастацкасці, вобразнасці, асацыятыўнасці, інтанацыйнасці і імправізацыйнасці.*

Раздзелы, якія вывучаюцца

I клас: «Свет гукаў», «Як расказвае музыка», «З чаго вырасла музыка», «Аб чым расказвае музыка».

II клас: «Сродкі музычнай выразнасці», «Падарожжа ў музычныя краіны – Оперу, Балет, Сімфонію, Канцэрт».

III клас: «Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы», «Інтанацыя», «Развіццё музыкі», «Будова (формы) музыкі».

Асаблівасці арганізацыі навучання

Навучанне вучэбнаму прадмету «Музыка» ажыццяўляецца шляхам выкарыстання метадаў праблематызацыі і мадэлявання мастацка-творчага працэсу (Л.В.Шкаляр).

Праблематызацыя зместу вучэбнага прадмета забяспечвае разгляд музычных твораў у якасці адказаў на жыццёвыя пытанні, пададзеныя ў эмацыянальна-вобразнай форме. Выкарыстанне метаду прадугледжвае прасочванне працэсу паходжання музыкі, працэсу ўзнікнення з'яў і пазначаных паняццяў. Метад дазваляе ператварыць урок музыкі ў жывы даследчы працэс, падвесці вучняў да разумення заканамернасцей музычнай мовы як сістэмы мастацкіх сімвалаў, музычнай формы як асобнай арганізацыі гэтых сімвалаў.

Метад мадэлявання мастацка-творчага працэсу накіраваны на ўзнаўленне працэсуальнасці музычных з'яў, забяспечвае дзейнаснае зразуменне музычнага мастацтва. На аснове пранікнення ў сутнасць мастацтва і яго заканамернасці ўзнаўляецца сам працэс паходжання мастацтва. Метад мадэлявання мастацка-творчага працэсу перамяшчае акцэнты з вывучэння вучэбнага матэрыялу на творчыя праяўленні вучняў, дазваляе ім самастойна прасочваць працэсы музычнай творчасці на аснове рэфлексіі дзейнасці кампазітара, выканаўцы, слухача.

У рэчышчы кампетэтнаснага падыходу метады праблематызацыі і мадэлявання мастацка-творчага працэсу спалучаюцца з праектнымі формамі і метадамі работы.

Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу з'яўляецца ўрок. Прытрымліванне прынцыпу «навучанне мастацтву ў формах самога мастацтва» вызначае прыярытэт арганізацыйных форм, адпаведных прыродзе мастацтва (урок-канцэрт, урок-гульня, урок-майстэрня, урок-тэатралізацыя, урок-кліп і інш.). Шырокае распаўсюджанне атрымліваюць такія формы, як фасілітацыйныя дыскусіі і мастацка-творчыя праекты.

Фасілітацыйныя дыскусіі накіраваны на развіццё самастойнасці вучняў у ходзе засваення вучэбнага матэрыялу, садзейнічаюць развіццю крытычнага мыслення, даследчых і камунікатыўных уменняў.

Мастацка-творчыя праекты прадугледжваюць самастойнае рашэнне вучнямі вучэбнай задачы, забяспечваюць развіццё самастойнасці, здольнасці да самаарганізацыі, гатоўнасці да супрацоўніцтва, стваральнай дзейнасці, садзейнічаюць выкарыстанню набытага вопыту для рашэння жыццёвых праблем.

Змест вучэбнага прадмета (па класах)

Вучэбны прадмет «Музыка» вывучаецца з I па IV клас у колькасці 1 гадзіна на тыдзень. Працэс навучання музыцы падзелены на 4 этапы, якія адпавядаюць гадам навучання.

Змест вучэбнага прадмета ўключае:

прадметныя веды і ўменні (у галіне музычнага мастацтва);

надпрадметныя веды і вядучыя ўменні (у галіне мастацкай культуры);

метапрадметныя (жыццёвыя) веды і ўменні (знаходзіць рашэнні праблем, браць на сябе адказнасць і інш.).

Прадметныя веды і ўменні забяспечваюць цэласнае зразуменне музычнага мастацтва; надпрадметныя веды і вядучыя ўменні – магчымасць арыентавацца ў разнастайнасці праяўленняў мастацкай культуры, актыўнае самавыражэнне ў мастацкай творчасці; метапрадметныя веды і ўменні – эфектыўнае рашэнне жыццёвых праблем.

Змест вучэбнага прадмета пабудаваны па лінейна-канцэнтрычным прынцыпе. На кожным этапе навучання пашыраюцца і паглыбляюцца ўяўленні вучняў пра змест, жанравую аснову, формы і выразнасць мовы музычнага мастацтва, удасканальваюцца ўменні ўспрымання і практычнай музычнай (мастацкай) дзейнасці.

Стрыжнёвай асновай зместу вучэбнага прадмета з'яўляецца тэматызм, у аснове якога ляжыць распрацаваная Д.Б.Кабалеўскім сістэма абагульненых уяўленняў аб музыцы як аб важнай частцы жыцця грамадства і самакаштоўным відзе мастацтва.

Першы год навучання забяспечвае фарміраванне агульнага ўяўлення аб музыцы як аб «мастацтве, сэнс якога інтануецца» (Б.У.Асаф'еў). У ходзе навучання фарміруюцца першасныя ўяўленні аб выразнасці гукавога аблічча свету, аб жыццёвых вытоках музыкі, яе ўсеабдымным зместе, багатай палітры выразных сродкаў, першасных музычных жанрах. Успрыманне і практычная музычная дзейнасць забяспечваюць асваенне пазіцый кампазітара, выканаўцы, слухача ў цэласнасці музычнай камунікацыі.

Фарміруюцца наступныя элементы кампетэнцый:

веды (на ўзроўні ўяўленняў):

аб гукавой палітры навакольнага свету;

усеабдымным змесце музыкі, яго жыццёвых вытоках;

пульсацыі як жыццёвай з'яве і яе праяўленні ў музыцы;

першасных музычных жанрах;

выразнай мове музычнага мастацтва;

уменні:

эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці.

На ***другім годзе навучання*** ажыццяўляецца канкрэтызацыя ўяўленняў аб выразнай мове музычнага мастацтва. На аснове назапашанага вопыту практычнай музычнай дзейнасці ўводзяцца тэрміны, якія абазначаюць асноўныя сродкі музычнай выразнасці (рытм, тэмп, тэмбр, лад, рэгістр, дынаміка). Ажыццяўляецца азнаямленне з жанрамі прафесійнай музыкі – операй, балетам, сімфоніяй, канцэртам. Фарміруюцца ўяўленні аб інструментах сімфанічнага аркестра.

Фарміруюцца наступныя элементы кампетэнцый:

веды (на ўзроўні ўяўленняў):

аб сродках музычнай выразнасці, іх ролі ў «будаўніцтве» музычных форм, якія склаліся гістарычна;

жанрамі прафесійнай музыкі (опера, балет, сімфонія, канцэрт);

інструментах сімфанічнага аркестра;

уменні:

эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці.

Змест ***трэцяга года навучання*** накіраваны на фарміраванне ўяўленняў аб музыцы як частцы мастацкай культуры. Асвойваюцца катэгорыі і паняцці, уласцівыя розным відам мастацтва (форма, інтанацыя, кампазіцыя, рытм і інш.).

Фарміруюцца наступныя элементы кампетэнцый:

веды (на ўзроўні ўяўленняў):

аб песеннасці, танцавальнасці, маршавасці;

інтанацыі і яе розных значэннях;

крыніцах і спосабах развіцця музыкі;

музычным формаўтварэнні, разнастайнасці музычных форм;

уменні:

вызначаць песенную, танцавальную, маршавую аснову музычных твораў;

ствараць, выконваць, успрымаць інтанацыі рознага характару з выкарыстаннем магчымасцей розных відаў мастацтва;

назіраць за развіццём музыкі, самастойна ажыццяўляць яе развіццё;

увасабляць творчы замысел у музычную (мастацкую) форму;

эмацыянальна ўспрымаць і разумець музычныя творы;

выразна выконваць песні і інструментальныя кампазіцыі;

актыўна праяўляць сябе ў мастацкай творчасці.

З мэтай захавання і жывога бытавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў кожным класе асвойваецца рамкавы змест, які забяспечвае назапашванне вопыту каляндарна-абрадавых дзеянняў у адпаведнасці з традыцыямі рэгіёна.

Лінейна-канцэнтрычны прынцып пабудовы зместу вучэбнага прадмета «Музыка» абумоўлівае выкарыстанне наступных **відаў дзейнасці** на працягу ўсяго перыяду навучання: слуханне, спевы, ігра на музычных інструментах, пластычнае інтанаванне, свабоднае дырыжыраванне, сачыненне, імправізацыя, рытмадэкламацыя, тэатралізацыя, слоўнае, графічнае, пластычнае мадэляванне, іншыя віды мастацкай дзейнасці.

Ацэначная дзейнасць выступае ў якасці сувязнага звяна паміж пазнавальнай і пераўтваральнай дзейнасцю і, як вынік гэтага, з'яўляецца неад'емнай часткай мастацкай творчасці. Навучанне вучэбнаму прадмету ў рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу прадугледжвае пашырэнне прасторы ацэначнай дзейнасці за кошт шырокага выкарыстання самаацэнкі і ўзаемаацэнкі.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

I чвэрць

ПЕСЕННЫ, ТАНЦАВАЛЬНЫ І МАРШАВЫ ХАРАКТАР МУЗЫЧНАЙ МОВЫ

(8 гадзін)

Прыкладнае планаванне тэмы

Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы (1 гадзіна). Песеннасць, танцавальнасць, маршавасць. Адрозненне песеннасці, танцавальнасці, маршавасці ад песні, танца, марша.

Песенны характар музычнай мовы (2 гадзіны). Характэрныя асаблівасці песеннай музычнай мовы. Кантыленныя спевы. Інструментальная музыка песеннага характару. Перадача песеннага характару музыкі праз пластычнае інтанаванне, графічнае мадэляванне. Стварэнне музычных фрагментаў песеннага характару.

Танцавальны характар музычнай мовы (2 гадзіны). Характэрныя асаблівасці танцавальнай музычнай мовы. Паняцці «танцавальнасць», «акцэнт». Вакальная і інструментальная музыка танцавальнага характару. Падкрэсліванне танцавальнага характару музыкі пры дапамозе рытмічнага акампанементу. Перадача танцавальнага характару музыкі праз графічнае мадэляванне, выразныя рухі. Стварэнне рытмічнага акампанементу да музычных твораў танцавальнага характару.

Маршавы характар музычнай мовы (2 гадзіны). Характэрныя асаблівасці маршавай музычнай мовы. Паняцце «маршавасць», «пункцір».

Вакальная і інструментальная музыка маршавага характару. Падкрэсліванне маршавага характару музыкі пры дапамозе рытмічнага акампанементу. Перадача маршавага характару музыкі праз выразныя рухі. Стварэнне рытмічнага акампанементу да твораў маршавага характару.

Абагульняльны ўрок па тэме «Песенны, танцавальны і маршавы характар музычнай мовы» (1 гадзіна).

Прыкладны музычны матэрыял

«Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь». Муз. *Н.Сакалоўскага,* сл. *М.Клімковіча і У.Карызны.*

Беларуская народная песня-танец «Мікіта».

«Дуб». Муз. *А.Чыркуна,* сл. *Янкі Купалы.*

«Мы дружим с музыкой». Муз. *Ё.Гайдна,* рускі тэкст *П.Сіняўскага.*

«Жывіца». Муз. *А.Безенсон,* сл. *Т.Мушынскай.*

«Лесной праздник». Муз. *Ж.Металідзі,* сл. *А.Фаткіна.*

«Заўжды ляці». Муз. *Я.Глебава*, сл. *А.Вольскага.*

«Песенка слонёнка о самом себе». Муз. *А.Даньшовай,* сл. *А.Зарубіна.*

«Выйшаў бусел пагуляць». Муз. *А.Даньшовай,* сл. *А.Зарубіна.*

Г.Пукст. Арыёза Марынкі (з аперы «Марынка»).

В.Войцік. «Пад старым дубам».

П.Чайкоўскі. Дуэт Машы і Прынца (з балета «Шчаўкунок»).

Г.Гарэлава. «Папяровая балерына», «Кароль з каралевай».

М.Глінка. Сімфанічная ўверцюра «Арагонская хота»; «Паланэз» (з оперы «Іван Сусанін»).

Г.Вагнер. «Крокі».

А.Залётнеў. «Уступ», «Песенька Каваля» (з оперы «Адчыніце, казляняткі»), сл. П. Макаля.

Я.Паплаўская. «Восеньскі малюнак».

Я.Глебаў. Інтэрмедыя (з араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства»).

Ф.Шапен. Паланэз A-dur.

А.Дворжак. Славянскі танец № 8.

Ж.Б.Люлі. «Марш для турэцкай цырымоніі».

Віды дзейнасці: выяўленне характэрных асаблівасцей песеннай, танцавальнай і маршавай музычнай мовы; фарміраванне пераліку прыкмет песеннасці, танцавальнасці, маршавасці; прымяненне пераліку прыкмет і інструментарыя для выяўлення характару музычнай мовы ў працэсе слухання; назіранне за развіццём музыкі; перадача малюнкаў мелодыі сродкамі графікі; разметка музычнай партытуры; выразнае выкананне твораў з улікам выяўленых рыс песеннасці, танцавальнасці, маршавасці; стварэнне мадэлі музычнага твора песеннага, танцавальнага, маршавага характару (калектыўна); сачыненне мелодыі песеннага, танцавальнага, маршавага характару (калектыўна).

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Вучні павінны:

мець уяўленне:

аб характэрных асаблівасцях песеннай музычнай мовы;

характэрных асаблівасцях танцавальнай музычнай мовы;

характэрных асаблівасцях маршавай музычнай мовы;

інструментальнай і вакальнай музыцы;

умець:

(група прыватных уменняў)

выразна выконваць творы з улікам рыс песеннасці, танцавальнасці, маршавасці;

перадаваць песенны характар музычнай мовы праз пластычнае інтанаванне і выразнасць ліній;

перадаваць танцавальны характар музычнай мовы праз выразнасць рухаў і графічнае мадэляванне;

перадаваць маршавы характар музычнай мовы праз выразнасць рухаў;

самастойна ствараць музычныя фрагменты песеннага, танцавальнага і маршавага характару;

эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнага вобраза;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара;

(група ключавых уменняў)

выкарыстоўваць сродкі музычнага мастацтва для творчага самавыражэння;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць эмацыянальна афарбаваную змястоўную ацэнку вынікам вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:

пры наведванні канцэртных, культурна-масавых мерапрыемстваў;

у дамашнім музыцыраванні;

пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых (у тым ліку мультымедыйных) праектаў.

II чвэрць

ІНТАНАЦЫЯ (8 гадзін)

Прыкладнае планаванне тэмы

Выразнасць слова, музыкі, руху (1 гадзіна). Інтанацыя як выразнасць слова, музыкі, руху. Інтанацыйная аснова музыкі. Мадэляванне інтанацый праз слова, гук, рух.

Блізкасць маўленчай і музычнай інтанацыі (1 гадзіна). Удасканаленне ўменняў выразна выконваць літаратурныя і музычныя творы. Перадача жыццёвых з’яў праз слова і гук: выяўленне падабенства і адрознення.

«Зерне-інтанацыя» (1 гадзіна). Характэрныя асаблівасці «зерня-інтанацыі». Вызначэнне «зерня-інтанацыі» музычнага фрагмента. Вызначэнне характару «зерня-

інтанацыі». Выкананне «зерня-інтанацыі» на гукавысотных інструментах. Стварэнне «зерняў-інтанацый» рознага характару.

Выразная інтанацыя (1 гадзіна). Вызначэнне інтанацый, якія перадаюць настрой, стан. Мадэляванне выразных інтанацый гукам, рухам, словам.

Выяўленчая інтанацыя (1 гадзіна). Вызначэнне інтанацый, якія перадаюць з'явы навакольнай рэчаіснасці. Мадэляванне выяўленчых інтанацый.

Выразныя і выяўленчыя інтанацыі сустракаюцца ў адным музычным творы (2 гадзіны). Поліінтанацыйны характар музычнай мовы. Адрозненне выразных і выяўленчых інтанацый.

Абагульняльны ўрок па тэме «Інтанацыя» (1 гадзіна).

Прыкладны музычны матэрыял

Беларускія народныя песні «Як пагнала бабуленька куранятак пасці», «Сеў жучок на сучок».

Швейцарская народная песня «Зязюля».

«В путь». Муз. *Ф.Шуберта*, сл. *В.Мюллера*.

«Весёлая песенка», «Грустная песенка», «Тихая песенка», «Громкая песенка», «Медленная песенка», «Быстрая песенка». Муз. *Г.Струвэ*, сл. *В.Віктарава*.

«Зима». Муз. *Ц.Кюі*, сл. *Я.Баратынскага*.

«Зіма». Муз. *І.Лучанка*, сл. *Якуба Коласа*.

«Навагодні карагод». Муз. *І.Лучанка*, сл. *В.Лучанок*.

«Котёнок и щенок». Муз. *Т.Патапенка*, сл. *В.Віктарава*.

Ё.Гайдн. Сімфонія № 101 «Гадзіннік» (фрагмент).

У.Кур'ян. «Гадзіннік».

А.Друкт. «Гарэзлівыя прыпеўкі».

Э.Тырманд. «Дзве сяброўкі».

М.Рымскі-Корсакаў. «Палёт чмяля» (з оперы «Казка пра цара Салтана»); «Акіян – мора сіняе» (уступ да оперы «Садко»); тэма Астролага, арыя Шамаханскай царыцы (з оперы «Залаты пеўнік»).

Э.Грыг. «Песня Сольвейг» (з музыкі да драмы Г.Ібсена «Пер Гюнт»).

Л.К.Дакен. «Зязюля».

Б.Сметана. «Влтава» (з сімфанічнай паэмы «Мая Радзіма»).

В.Карэтнікаў. «У зімовым лесе», «Вальс вакол навагодняй ёлкі» (з сюіты «Поры года»).

Віды дзейнасці: складанне пераліку эмацыянальных станаў, настрояў; скарыстанне шкалы эмацыянальных станаў для вызначэння характару твора ў працэсе слухання; складанне выразнай партытуры твора на аснове шкалы эмацыянальных станаў, выразнае чытанне літаратурных тэкстаў; выяўленне падабенства і адрозненняў у перадачы эмацыянальных станаў сродкамі маўленчай і музычнай інтанацыі; узбагачэнне выразнасці гука (інтанацыі) выразнасцю слова, руху (жэста); інсцэніроўка песні; назіранне за развіццём музыкі, выяўленне выразных і выяўленчых магчымасцей музычных твораў; вылучэнне «зерняў-інтанацый» з музычнай тканіны; вызначэнне характару «зерняў-інтанацый» (на аснове выкарыстання шкалы эмацыянальных станаў); назіранне за развіццём мелодыі з «зерня-інтанацыі»; выяўленне выяўленчых і выразных інтанацый; параўнанне выяўленчых магчымасцей маўленчых і музычных інтанацый; выкананне «зерня-інтанацыі» на гукавысотных інструментах; выкананне выяўленчых інтанацый голасам і на гукавысотных інструментах; выразнае выкананне твораў з улікам выяўленых выразных і выяўленчых магчымасцей; складанне «партытуры» твора (колеравай, шумавой); стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша; стварэнне розных варыянтаў развіцця «зерня-інтанацыі»; мадэляванне выяўленчых інтанацый; падрыхтоўка даследчага або мастацка-творчага праекта па тэме чвэрці.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Вучні павінны:

мець уяўленне:

аб інтанацыі як выразнасці гука, слова, руху;

блізкасці маўленчай і музычнай інтанацыі;

«зерне-інтанацыі»;

выразнасці і выяўленчасці музыкі;

умець:

(група прыватных уменняў)

мадэліраваць інтанацыю праз гук, слова, рух;

вызначаць характар «зярня-інтанацыі»;

выконваць «зерні-інтанацыі» на гукавысотных інструментах;

самастойна ствараць «зерні-інтанацыі» рознага характару;

выкарыстоўваць у самастойнай мастацкай дзейнасці розныя спосабы перадачы ўнутранага свету чалавека і з'яў навакольнай рэчаіснасці;

эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара;

(група ключавых уменняў)

выкарыстоўваць сродкі музычнага мастацтва для творчага самавыражэння;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць эмацыянальна афарбаваную змястоўную ацэнку вынікам вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:

у працэсе аналізу выразнай мовы мастацкіх тэкстаў;

у працэсе публічнага выканання мастацкіх тэкстаў;

у дамашнім музыцыраванні;

пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых (у тым ліку мультымедыйных) праектаў.

III чвэрць

РАЗВІЦЦЁ МУЗЫКІ (10 гадзін)

Прыкладнае планаванне тэмы

Як расказваюць і слухаюць музычныя гісторыі (1 гадзіна). Развіццё музыкі (часавая прырода музычнага мастацтва). Спосабы развіцця музыкі. Роля сродкаў музычнай выразнасці ў развіцці музыкі.

Як развівае музыку кампазітар (1 гадзіна). Спосабы развіцця музыкі, якія выкарыстоўвае кампазітар. Магчымасці змянення мелодыі, тэмпу, дынамікі, лада, тэмбру, рэгістра гучання.

Развіццё мелодыі (1 гадзіна). Выразныя магчымасці мелодыі. Назіранне за развіццём музычных інтанацый. Запіс мелодый.

Дынамічнае развіццё музыкі (1 гадзіна). Павелічэнне і памяншэнне сілы гука. Выкарыстанне сродкаў дынамічнага развіцця ў дзейнасці выканаўцы і кампазітара. Перадача дынамічнага развіцця музыкі праз колеравае, слоўнае мадэляванне, пластычнае (амплітуда) інтанаванне.

Тэмпавае развіццё музыкі (1 гадзіна). Паскарэнне і запавольванне тэмпу. Выкарыстанне сродкаў тэмпавага развіцця ў дзейнасці кампазітара і выканаўцы. Перадача тэмпавага развіцця музыкі праз слоўнае мадэляванне, пластычнае інтанаванне.

Тэмбравае і рэгістравае развіццё музыкі (1 гадзіна). Выразныя магчымасці тэмбраў галасоў і інструментаў. Выразныя магчымасці змянення рэгістраў. Выкарыстанне сродкаў тэмбравага і рэгістравага развіцця ў дзейнасці кампазітара. Перадача тэмбравага развіцця музыкі праз слоўнае і колеравае мадэляванне. Перадача рэгістравага развіцця музыкі праз слоўнае, графічнае, прасторавае мадэляванне.

Ладавае развіццё музыкі (1 гадзіна). Выразныя магчымасці мажору і мінору. Выкарыстанне сродкаў ладавага развіцця ў творчасці кампазітара. Перадача ладавага развіцця музыкі праз слоўнае і колеравае мадэляванне.

Майстэрства выканаўцаў (1 гадзіна). Сродкі развіцця музыкі, якія выкарыстоўваюць выканаўцы. Музычная імправізацыя. Складанне выканальніцкага плана твора.

Музычныя дыялогі (1 гадзіна). Музычны дыялог. Выкананне музычнага пытання і адказу. Адбор сродкаў музычнай выразнасці для асабістай творчай дзейнасці. Стварэнне музычнага дыялогу.

Абагульняльны ўрок па тэме «Развіццё музыкі» (1 гадзіна).

Прыкладны музычны матэрыял

Беларуская народная песня «Сядзіць камар на дубочку».
«Снегопад». Муз. *Ж.Металідзі*, сл. *Э.Фарджэн*.
«Почему медведь зимой спит». Муз. *Л.Кніпера*, сл. *А.Каваленкава*.
«Песенка солнечных зайчиков». Муз. *У. Казеніна*, сл. *Ф.Лаўбе*.
«Как под мельницей». Муз. *М.Андрэевай*, словы народныя.
«Поезд». Муз. *М.Мятлова*, сл. *Т.Сікорскай*.
«Медведь и комар». Муз. *А.Праслянёва*, сл. *В.Шуміліна*.
«Улитка». Муз. *В.Кікты*, сл. *С.Сяровай*.
«Тень-тень, потетень». Муз. *В.Каліннікава*, словы народныя.
«Сороконожка». Муз. *А.Даньшовай*, сл. *У.Арлова*.
Іранская народная песня «Дождж».
В.Карэтнікаў. «Снежны гарадок» (з сюіты «Поры года»).
Г.Гарэлава. «Варона на слізкім даху».
Я.Глебаў. Фантазія на тэму беларускай народнай песні «Перапёлачка».
Э.Грыг. «Раніца», «У пячоры горнага караля» (з сюіты «Пер Гюнт»).
Э.Грыг. «Вясельны дзень у Трольхаўгене».
Ф.Шуберт. Вальс h-mo.
В.А.Моцарт. Дуэт Папагена і Папагены (з оперы «Чароўная флейта»).
А.Вівальдзі. «Бура на моры»; канцэрт для скрыпкі з аркестрам «Зіма» (ч. 1).

Віды дзейнасці: назіранне за развіццём музыкі; выяўленне сродкаў выразнасці, выкарыстаных кампазітарам для стварэння і развіцця музычнага вобраза; назіранне за развіццём мелодыі; адлюстраванне рытмічных і гукавысотных змяненняў мелодыі праз выразныя рухі рук; перадача гукавысотнага развіцця мелодыі сродкамі графікі або пластычнага інтанавання; выкананне рытмічнага малюнка на шумавых інструментах; назіранне за дынамічным развіццём музыкі, адлюстраванне дынамічных змяненняў праз колеравую палітру; выяўленне тэмпавага развіцця музыкі, перадача яго праз рухі; назіранне за ладавымі зменамі ў музыцы, перадача ладавых змяненняў праз карткі-смайлікі; выразнае выкананне твораў з улікам выяўленых змяненняў; выяўленне музычнага дыялогу (пытанняў і адказаў); выразнае выкананне песні ў рэжыме дыялогу; пластычная імправізацыя на аснове праслуханага твора; інсцэніроўка песні; складанне выканальніцкага плана песні з указаннем сродкаў выканальніцкага развіцця, якія будуць выкарыстаны; стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове верша; развіццё мелодыі шляхам змянення вышыні гукаў і рытмічнага малюнка; эксперыментаванне з ладавымі, дынамічнымі, тэмбравымі, рэгістравымі змяненнямі мелодыі; сачыненне папеўкі з выкарыстаннем розных сродкаў музычнага развіцця; сачыненне музычнага дыялогу або яго частак (пытанне і адказ); падрыхтоўка даследчага або мастацка-творчага праекта па тэме чвэрці.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Вучні павінны:
м е ц ь у я ў л е н н е:
аб спосабах развіцця музыкі;

сродках музычнай выразнасці, якія выкарыстоўваюць кампазітар і выканаўца для развіцця музыкі;

тэмпавым, дынамічным, ладавым, рэгістравым, тэмбравым развіцці музыкі;

музычным дыялогу, яго будове;

у м е ц ь:

(група прыватных уменняў)

сачыць за развіццём мелодыі і адлюстроўваць яго пры дапамозе лініі;

выконваць рытмічны малюнак, запісаны з дапамогай сімвалаў і працягласцей;

сачыць за дынамічным, тэмпавым, ладавым, рэгістравым, тэмбравым развіццём музыкі і адлюстроўваць яго з дапамогай слоўнага, колеравага, графічнага, пластычнага і прасторавага мадэлявання;

імправізаваць (развіваць мелодыю);

складаць выканальніцкі план твора;

выкарыстоўваць тэмпавае, дынамічнае, ладавае, рэгістравае, тэмбравае развіццё музыкі ва ўласнай творчай дзейнасці;

выконваць і ствараць музычныя дыялогі;

эмацыянальна адгуквацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара;

(група ключавых уменняў)

выкарыстоўваць сродкі музычнага мастацтва для творчага самавыражэння;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць эмацыянальна афарбаваную змястоўную ацэнку вынікам вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:

у працэсе аналізу выразнай мовы мастацкіх тэкстаў;

пры распрацоўцы плана выканання мастацкіх тэкстаў;

пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых (у тым ліку мультымедыйных) праектаў.

IV чвэрць

БУДОВА (ФОРМЫ) МУЗЫКІ (9 гадзін)

Прыкладнае планаванне тэмы

Разнастайнасць будовы музычных твораў (1 гадзіна). Разнастайнасць музычных форм. Будова (формы) музычных твораў.

Кантрасты і паўторы ў жыцці і музыцы (2 гадзіны). Кантрасты і паўторы як жыццёвая аснова будовы музычных твораў. Узаемасувязь зместу і будовы музычных твораў. Элементы музычнай мовы. Матыў. Фраза. Сказ. Вызначэнне музычных фраз на слых і па нотным запісе. Дыханне па фразах пры выкананні вакальных твораў.

Як музыка расказвае гісторыі, у якіх няма кантрастаў (1 гадзіна). Музычныя творы, у якіх няма кантрастаў. Кульмінацыя як вяршыня развіцця музыкі. Вызначэнне кульмінацыі на слых і па нотным запісе.

Двухчасткавая форма (1 гадзіна). Чаргаванне кантрастаў і паўтораў у музычнай форме. Двухчасткавая кантрастная форма. Адлюстраванне двухчасткавай кантрастнай формы пры дапамозе сімвалаў (іншых сродкаў). Запеў, прыпеў, куплет. Выкананне вакальнага твора ў двухчасткавай кантрастнай форме. Канструяванне музычных фрагментаў у двухчасткавай форме.

Трохчасткавая рэпрызная форма (1 гадзіна). Рэпрыза як паўтор часткі музычнага твора. Адлюстраванне трохчасткавай рэпрызнай формы пры дапамозе сімвалаў (іншых сродкаў). Выкананне музычных твораў у трохчасткавай рэпрызнай форме. Канструяванне музычных фрагментаў у трохчасткавай форме.

Ронда (1 гадзіна). Рэфрэн, эпізод. Адлюстраванне формы ронда пры дапамозе сімвалаў (іншых сродкаў). Выкананне музычных твораў у форме ронда.

Варыяцыі (1 гадзіна). Змяненне музыкі. Тэма, варыяцыі. Вызначэнне тэмы і варыяцый пры праслухоўванні музычнага твора.

Абагульняльны ўрок па тэме «Будова (формы) музыкі» (1 гадзіна).

Прыкладны музычны матэрыял

Беларускі народны танец «Карагодны».

Беларускія народныя песні «А мы грушу пасадзілі», «Пад калінаю, пад малінаю», «На лугу, на лугу зелянёшанькім».

Беларуская народная песня «Кума мая, кумачка» ў апрацоўцы В.Серых.

Беларуская народная песня «Кума мая, кумачка» ў апрацоўцы Ё.Хаазена для карыльёна.

Руская народная танцавальная песня «Камарынская».

«Прятки». Муз. *А.Думчанкі*, сл. *А.Кушнера*.

«Доброта». Муз. *І.Лучанка*, сл. *Н.Тулупавай*.

«Весёлые медвежата». Муз. *А.Паплянавай*, сл. *Н.Пікулёвай*.

«Болтунья». Муз. *С.Пракоф'ева*, сл. *А.Барто*.

«Зачем нам выстроили дом?». Муз. *Д.Кабалеўскага*, сл. *В.Віктарава*.

А.Літвіноўскі. «Вячэрнія аблокі».

В.Карэтнікаў. «Летнім вечарам» (з сюіты «Поры года»).

П.Чайкоўскі. «Італьянская песенька», «Баба Яга», «Няньчына казка», «Камарынская» (са зборніка фартэпіянных п'ес «Дзіцячы альбом»).

М.Глінка. Сімфанічная ўверцюра «Камарынская».

Ф.Шапэн. Прэлюдыя № 7.

Э.Грыг. «Танец Анітры» (з музыкі да драмы Г.Ібсена «Пер Гюнт»).

Віды дзейнасці: назіранне за развіццём музыкі, выяўленне кантрасных сродкаў музычнай выразнасці; вызначэнне элементаў музычнай мовы (фраза, сказ), вызначэнне кульмінацыі; адлюстраванне элементаў музычнай мовы праз выразныя рухі рук; разметка нотнага тэксту па фразах; вызначэнне будовы твора (адначасткавых, двухчасткавых, трохчасткавых, у форме ронда, у форме варыяцый) у працэсе слухання; адлюстраванне будовы твора праз геаметрычныя фігуры; выяўленне частак твора, якія паўтараюцца (рэфрэн), і новых частак твора (эпізоды), якія маюць форму ронда; назіранне за змяненнем асноўнай мелодыі; падбор выканальніцкіх сродкаў для падкрэслівання кантрастаў; выразнае выкананне твораў; выразнае выкананне песні (дыханне па фразах); інсцэніроўка твора; складанне выканальніцкага плана твора з выкарыстаннем кантрасных элементаў; складанне выканальніцкага плана з улікам вырыянтаў выканання асноўнай мелодыі; стварэнне мадэлі музычнага твора на аснове літаратурнага тэксту; канструяванне музычнага твора з раней падрыхтаваных музычных фрагментаў (фраз); складанне двух-, трохчасткавых кампазіцый; кампазіцый у форме ронда з раней падрыхтаваных музычных фрагментаў; вар'іраванне мелодыі; падрыхтоўка даследчага або мастацка-творчага праекта па тэме чвэрці.

Патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Вучні павінны:

м е ц ь у я ў л е н н е:

аб узаемасувязі зместу і формы музычнага твора;

кантрастах і паўторах у жыцці і музыцы;

элементах музычнай мовы (матыве, фразе, сказе; кульмінацыі);

музычных формах (двухчасткавая, трохчасткавая, варыяцыі, ронда);

у м е ц ь:

(група прыватных уменняў)

вызначаць асобныя элементы музычнага маўлення (фразы) на слых і па нотным запісе;

вызначаць будову музычных твораў і адлюстроўваць яе пры дапамозе сімвалаў або іншых сродкаў;

выконваць творы ў двухчасткавай кантраснай, трохчасткавай рэпрызнай формах, форме ронда;

самастойна канструяваць творы ў двухчасткавай, трохчасткавай рэпрызнай формах, форме ронда;

эмацыянальна адгукацца на гучанне музыкі, даваць характарыстыку музычнаму вобразу;

ажыццяўляць музычную дзейнасць у пазіцыях слухача, выканаўцы, кампазітара;

(група ключавых уменняў)

выкарыстоўваць сродкі музычнага мастацтва для творчага самавыражэння;

удзельнічаць у арганізацыі і выкананні калектыўных творчых работ;

даваць эмацыянальна афарбаваную змястоўную ацэнку вынікам вучэбнай дзейнасці.

Выкарыстоўваць набыты вопыт:

пры аналізе мастацкіх тэкстаў (формы і зместу);

у самастойнай творчай дзейнасці (пры стварэнні мастацкіх тэкстаў);

пры рэалізацыі даследчых, мастацка-творчых (у тым ліку мультымедыйных) праектаў.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Працоўнае навучанне»
для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ПРАЦОЎНАЕ НАВУЧАННЕ

Тлумачальная запіска

Мэта навучання – фарміраванне асноў тэхналагічнай граматнасці вучняў, якая ўключае кампаненты:

адукацыйны – фарміраванне асноў праектна-канструктарскай, праектна-тэхналагічнай, выканальніцкай і прафарыентацыйнай кампетэнцый;

развіваючы – садзейнічанне развіццю творчых здольнасцей, маніпулятыўных навыкаў, памяці, уважлівасці;

выхаваўчы – садзейнічанне выхаванню любові да працы і прыроды, павагі да людзей працы і вынікаў іх дзейнасці; адказнасці і добрасумленнасці; акуратнасці і беражлівасці; дысцыплінаванасці і стараннасці; цярплівасці і настойлівасці ў дасягненні планаемага выніку, сама- і ўзаемаацэнкі; самастойнасці і ўзаемадапамогі.

Задачы:

у межах *праектна-канструктарскай кампетэнцыі*:

азнаямленне вучняў з рознымі відамі канструктарскай дакументацыі: схемай, эскізам, чарцяжом;

фарміраванне вопыту чытання і распрацоўкі прасцейшай канструктарскай дакументацыі;

у межах *праектна-тэхналагічнай кампетэнцыі*:

азнаямленне вучняў з тэхналагічнымі і інструкцыйнымі картамі на выраб, у якіх адлюстроўваюцца паслядоўнасць пераўтварэння прадмета працы і інструменты, якія выкарыстоўваюцца (тэхналагічная карта), з дабаўленнем тлумачэнняў або інструкцый па выкананні (інструкцыйная карта);

фарміраванне вопыту чытання тэхналагічнай дакументацыі;

у межах *выканальніцкай кампетэнцыі*:

фарміраванне прыёмаў і спосабаў выканання тэхналагічных аперацый апрацоўкі паперы, кардону, тэкстыльных, прыродных, падручных матэрыялаў;

фарміраванне вопыту індывідуальнай і калектыўнай працоўнай дзейнасці па вырабе простых прадметаў з розных матэрыялаў;

у межах *прафарыентацыйнай кампетэнцыі*:

азнаямленне вучняў са зместам працы работнікаў розных прафесій і прафесійна важнымі якасцямі, неабходнымі для паспяховай працы.

Напрамкі навучання

Прадметы працы – асноўныя матэрыялы: папера, кардон, тэкстыльныя, падручныя (пластмаса, драўніна, метал), прыродныя матэрыялы.

Сродкі працы – інструменты і прыстасаванні.

Прадукты (вынікі працы) – сувеніры (цацкі), дэкаратыўныя элементы інтэр'ера, прыстасаванні для работы.

Тэхналогія – паслядоўнае пераўтварэнне прадметаў працы з дапамогай сродкаў працы ў прадукты працы, якія маюць спажывецкую вартасць і асабістую значнасць для вучняў.

Адукацыйныя падыходы (прадметныя)

Прадметна-тэхналагічны падыход прадугледжвае навучанне тэхналогіі ў працэсе вырабу канкрэтных прадметаў, ажыццяўлення пэўнага віду работ.

Згодна з *дзейнасным падыходам* засваенне вучнямі зместу вучэбнага матэрыялу ажыццяўляецца ў працэсе асабістай актыўнай дзейнасці. Дзейнасць пры гэтым разглядаецца як крыніца фарміравання асобы і галоўны фактар яе развіцця. У працэсе навучання важна актыўнае выкарыстанне разнастайных відаў дзейнасці: пазнавальнай, праектнай, камунікатыўнай, гульнёвай.

Згодна з *кампетэнтнасным падыходам* галоўнае ў працэсе навучання не фарміраванне асобных ведаў і ўменняў, а стварэнне ўмоў для развіцця здольнасці ажыццяўляць прадугледжаныя вучэбнай праграмай віды і спосабы дзейнасці. У змесце вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» вылучаны кампетэнцыі, якія ўяўляюць сабой сукупнасць інфармацыйных адзінак, што ўключаюць тэарэтычныя звесткі, спосабы дзейнасці, тэхналагічныя аперацыі і працэсы, якія адлюстроўваюць змест і характар пэўнага віду дзейнасці.

Вучэбная, вучэбна-працоўная, працоўная дзейнасць, маючы практыка-пераўтваральны характар, сама становіцца прадметам засваення. Кампетэнцыі як уласцівасці індывіда праяўляюцца ў выглядзе ўмеласці, спосабу асобаснай самарэалізацыі, формы праяўлення здольнасцей. Веды, уменні і навыкі становяцца не мэтай, а сродкам развіцця асобы вучня, фарміравання яго кампетэнцый.

Згодна з *культуралагічным падыходам* працэс навучання павінен быць накіраваны на фарміраванне культуры асобы, таму асноўнай мэтай вучэбнага прадмета з'яўляецца фарміраванне асноў тэхналагічнай граматнасці асобы. Гэтаму спрыяе вывучэнне тэхналогіі рамёстваў, рэалізацыя прынцыпу прадукцыйнасці, гэта значыць стварэнне асобасна і грамадска значнага прадукту дзейнасці, фарміраванне культуры працы і міжасобаснага ўзаемадзеяння ў працэсе вучэбна-працоўнай дзейнасці.

Кампетэнцыя і змест, які забяспечвае іх фарміраванне

Фарміраванне прадметна-канструктарскай кампетэнцыі забяспечваецца шляхам паслядоўнага ўскладнення канструктарскай дакументацыі (ад простых схем да чарцяжоў-разгортак і зборачных адзінак); прадметна-тэхналагічнай (ад простых схем да інструкцыйна-тэхналагічных карт); выканальніцкай – дзякуючы ўскладненню вырабаў і

тэхналагічным аперацыям, якія ажыццяўляюцца; прафарыентацыйнай – за кошт агульнага ўяўлення аб прафесіях (што робяць, чым працуюць, што ў выніку атрымліваюць, ад чаго залежыць паспяховасць працы).

Прыватнаметадычныя прынцыпы адбору зместу навучання

Прынцып прадукцыйнасці прадугледжвае стварэнне асобасна і грамадска значнага прадукту дзейнасці, фарміраванне культуры працы і міжасобаснага ўзаемадзеяння ў працэсе вучэбна-працоўнай дзейнасці.

Прынцып пераемнасці прадугледжвае апору на вопыт вучняў, набыты на папярэдніх этапах навучання. Раздзелы праграмы дашкольнай адукацыі: «Ручная праца», «Праца ў прыродзе», «Самаабслугоўванне» і «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» – атрымліваюць далейшае развіццё пры вывучэнні наступных раздзелаў вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне»: «Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў», «Тэхналогія раслінаводства», «Тэхналогія гаспадарання», «Тэхналогія народных рамёстваў».

Прынцып цэласнасці прадугледжвае ўключэнне вучняў у вучэбна-працоўную дзейнасць па рэалізацыі цэласнай тэхналогіі ад ідэі будучага вырабу да яга выканання і з'яўлення новай ідэі, новай канструкцыі вырабу і/або тэхналогіі па яго выкананні. Пры гэтым прадбачваецца паслядоўнае ўскладненне канструктыўных і тэхналагічных асаблівасцей вырабаў.

Прынцып варыятыўнасці азначае розныя варыянты адукацыйнага працэсу, які дазваляе дасягнуць мэт і задач працоўнага навучання ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту. Зыходзячы з патрэбнасцей, магчымасцей, здольнасцей вучняў, запытаў бацькоў, магчымасцей матэрыяльна-тэхнічнай базы, асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага і сацыякультурнага асяроддзя, настаўніку даецца магчымасць уносіць карэктывы ў змест навучання.

Прынцып неабходнасці і дастатковасці тэарэтычных звестак для выканання практычных работ. Для разумення і ажыццяўлення тэхналогіі вырабу таго ці іншага прадмета на кожным уроку акцэнтуецца ўвага на канструкцыйных матэрыялах, інструментах і прыстасаваннях, стадыях і этапах тэхналогіі, правілах арганізацыі рабочага месца і бяспекі працы, крытэрыях і паказчыках ацэнкі якасці вырабу, а таксама самаацэнцы дасягнення асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў вучэбна-працоўнай дзейнасці.

Прынцып інтэграцыі і рэалізацыі міжпрадметных сувязей прадугледжвае выкарыстанне звестак з іншых вучэбных прадметаў у працэсе пазнавальнай і вучэбна-працоўнай дзейнасці. Адрозніваюць папярэднія, адначасовыя і наступныя міжпрадметныя сувязі. Гэта значыць, што не толькі на занятках па працоўным навучанні можна абапірацца на веды і ўменні, засвоеныя вучнямі на ўроках па іншых вучэбных прадметах, але і ўпершыню знаёміць з паняццямі, фарміраваць спосабы дзейнасці, якія прыменяцца ў будычыні на ўроках па іншых вучэбных прадметах.

Вывучаемыя раздзелы:

«Тэхналогія і грамадства»;

«Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»;

«Тэхналогія народных рамёстваў»;

«Тэхналогія гаспадарання»;

«Тэхналогія раслінаводства»;

«Я і свет тэхналогій».

Асаблівасці арганізацыі навучання прадмету

Раздзел ***«Тэхналогія і грамадства»*** дазваляе вучням усвядоміць узаемаўплыў тэхналогіі і грамадства (вытворчасці); актуалізаваць вопыт, набыты ва ўстановах дашкольнай адукацыі, стварыць арыенціровачную аснову для паспяховага навучання; пазнаёміцца з правіламі арганізацыі працоўнай дзейнасці і правіламі бяспечнай работы;

аналізаваць стадыі (ідэя – вобраз – канструкцыя – паслядоўнасць вырабу – выраб – ацэнка – новая ідэя) і этапы тэхналогіі (падрыхтоўчы, асноўны і заключны). Акцэнтуецца ўвага на разнастайнасці матэрыялаў: канструкцыйныя (асноўныя) матэрыялы вырабаў (канструкцый), прыродныя і падручныя матэрыялы, якія выкарыстоўваюцца не па прамым прызначэнні.

У межах раздзела ***«Тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў»*** прадугледжана паслядоўнае азнаямленне з рознымі матэрыяламі: паперай (I клас), кардонам тонкім аднаслойным (II клас), калькай, капіравальнай і гафрыраванай паперай, паліграфічным і ўпаковачным кардонам (III клас), баваўнянымі тканінамі (I клас), льнянымі (II клас), шарсцянымі (III клас), тканінамі і тэкстыльнымі матэрыяламі з сінтэтычных і змешаных валокнаў (IV клас), ніткамі для шыцця, вышывання, пляцення; прыроднымі матэрыяламі: шышкамі, жалудамі, каштанамі, галінкамі, пладамі рабіны, глогу, насеннем ясеня, клёна, вольхі (I клас), шалупайкамі лясных і грэцкіх арэхаў, каранямі дрэў, насеннем ліпы, лопуху, пер'ем (II клас), ракавінкамі, каменьчыкамі, шалупайкамі яек (III клас), карой дрэў (IV клас), падручнымі матэрыяламі: шпагатам, тонкім шнурам, тасьмой, вяроўкай, саломінкамі для кактэйлю (I клас), кардоннымі каробкамі, упакоўкай; пластмасавымі шкляначкамі, слоікамі (II клас), пластыкавымі флаконамі, драўлянымі вырабамі: палачкамі для марожанага, прышчэпкамі, дэталямі драўлянага канструктара (III клас), дротам (IV клас), што забяспечвае магчымасць не толькі азнаямлення з шырокім пералікам матэрыялаў, але і садзейнічае развіццю фантазіі, творчай самарэалізацыі вучняў. У кожным наступным класе прадугледжана выкарыстанне ў практычнай дзейнасці ўсіх вывучаных раней матэрыялаў.

У практычнай дзейнасці пераважае выраб прадметаў па ўзоры (I клас), графічным адлюстраванні (II клас), эскізе і схеме (III клас), уласнай задуме (IV клас). Адначасова адбываецца ўскладненне вырабаў: ад аднадэталёвых да шматдэталёвых, ад плоскасных да аб'ёмных, ад нераз'ёмных да раз'ёмных, ад статычных да дынамічных.

Раздзел ***«Тэхналогія народных рамёстваў»*** знаёміць з найбольш даступнымі для вучняў кожнага класа рамёствамі: выцінанкай (сіметрычная, рапортная і чатырохпрамянёвая разеткавая выцінанка, выкрабленая па ўзоры з ужо нанесенай разметкай (I клас), сіметрычная, рапортная і васьміпрамянёвая разеткавая выцінанка па ўласнай разметцы (II клас), сіметрычная, рапортная і шасціпрамянёвая разеткавая выцінанка на аснове аналагаў (III клас), камбінаваная выцінанка па ўласнай задуме (IV клас)); фларыстыкай (плоскасная аплікацыя ў паласе і квадраце (I клас), стылізацыя адлюстравання звяроў, птушак, насякомых, пейзаж (I клас), стварэнне аб'ёмных кампазіцый (III клас), ікебана (IV клас)); саломапляценнем (плоскасныя (II клас) і аб'ёмныя вырабы з трубчастай саломы (III клас), саламяная скульптура (IV клас)); вязаннем кручком (вязанне ланцужка з паветраных вочак, паўслупка, наклейванне ланцужкоў (III клас), вязанне слупка без накіду, выраб прадмета па схеме і слоўным апісанні (IV клас)); вышыўкай крыжам па ўзоры і схеме (IV клас). Арганізуючы ўрокі ў межах гэтага раздзела, неабходна ўлічваць нацыянальныя і рэгіянальныя асаблівасці сацыякультурнай спадчыны (наяўнасць мастацкіх промыслаў: саломапляцення, інкрустацыі саломкай, ткацтва, вышыўкі, роспісу, фларыстыкі, керамікі і інш.).

Раздзел ***«Тэхналогія гаспадарання»*** спрыяе фарміраванню вопыту па самаабслугоўванні (сервіроўка стала к чаю (I клас); догляд адзення і абутку (II клас); дробны рамонт адзення (III клас); дробны рамонт кніг (IV клас)); культуры паводзін у побыце, выхаванню самастойнасці.

Раздзел ***«Тэхналогія раслінаводства»*** пазнаёміць вучняў з прыёмамі і правіламі догляду пакаёвых (I і II класы) і кветкава-дэкаратыўных (III і IV класы) раслін.

Раздзел ***«Я і свет тэхналогій»*** прызначаны для падвядзення вынікаў навучання за год, аналізу вучэбна-працоўных дасягненняў кожнага вучня, вызначэння ўзроўню асваення вывучаных тэхналогій. У гэтым раздзеле прадугледжана выкананне калектыўных выніковых заданняў – «Танец матылькоў» (I клас), «Квітнеючы луг» (II клас), «Падводнае царства» (III клас), у межах якіх кожны вучань стварае выраб на зададзеную тэму. Матэрыялы і тэхналогію выканання вучні выбіраюць па ўласным

жаданні. У IV класе на выніковым уроку праводзіцца выстаўка-кірмаш вырабаў, зробленых вучнямі на занятках і дома.

Паслядоўнасць урокаў адлюстравана ў метадычных рэкамендацыях і каляндарна-тэматычным планаванні, дзе ўлічаны падрыхтоўка падарункавых сувеніраў к святам, навагодніх цацак, магчымасці вучняў па зборы прыроднага матэрыялу, а таксама рэкамендаваная псіхолагамі змена відаў працоўнай дзейнасці.

Ва ўсіх раздзелах уведзена рубрыка «Прафесійная арыентацыя», прызначэнне якой – пазнаёміць вучняў з рознымі прафесіямі, зместам працы (прадмет (аб'ект) працы, сродкі працы, прадукт (вынік) працы, асноўныя віды работ), а таксама патрабаваннямі прафесіі да чалавека, яго асобасных (уласцівасці і якасці асобы) кампетэнцый.

Асноўнымі метадамі працоўнага навучання з'яўляюцца дэманстрацыя, практыкаванні, вопыты і назіранні, практычныя работы і метад праектаў, што рэалізуюцца ў працэсе вырабу вучнямі канкрэтных прадметаў, якія адпавядаюць патрабаванням функцыянальнасці і эстэтычнай выразнасці (карысці і прыгажосці). Большая частка вучэбнага часу (не менш за 80 %) адводзіцца практычнай дзейнасці вучняў. На выраб можа адводзіцца 1 або 2 урокі ў залежнасці ад складанасці канструкцыі і аб'ёму выконваемай работы. Настаўнік можа выбраць любыя з вырабаў, прапанаваных у вучэбнай праграме (рубрыка «Прыкладныя вучэбныя заданні»), або падабраць іншыя, канструкцыя і тэхналогія вырабу якіх адпавядае зместу вывучаемага раздзела. Вырабы можна рабіць па тэхналагічнай карце, малюнку, уяўленні (на аснове аналагаў), па ўласнай задуме. Настаўніку даецца магчымасць выкарыстоўваць каля 30 % вучэбнага часу па ўласным меркаванні пры ўмове дасягнення патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў, якія прыведзены ў адукацыйным стандарце па працоўным навучанні і ў вучэбнай праграме.

Прафарыентацыйная накіраванасць працоўнага навучання рэалізуецца праз гутаркі на ўроках, сустрэчы з людзьмі розных прафесій, экскурсіі.

У праграме вылучаны міжпрадметныя сувязі, якія дапамагаюць рэалізаваць інтэграцыйны характар прадмета «Працоўнае навучанне».

Курсівам з зорачкай (*) пазначаны тэмы, якія з'яўляюцца неабавязковымі і могуць вывучацца па меркаванні настаўніка.

Пісьмовыя кантрольныя работы праграмай не прадугледжаны.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

(35 гадзін)

ТЭХНАЛОГІЯ І ГРАМАДСТВА (1 гадзіна)

Тэарэтычныя звесткі. Агульнае ўяўленне пра стадыі тэхналогіі (ідэя, вобраз, план, выкананне, ацэнка). Азнаямленне са зместам навучання ў бягучым годзе.

Арганізацыя рабочага месца. Правілы бяспечнай работы. Прадметы, сродкі, прадукты працы ў III класе. Культура працы.

Прафесійная арыентацыя. Гутаркі «Што рабілі летам сваімі рукамі?», «Ад чаго залежыць поспех у працы?».

Практычная дзейнасць. Арганізацыя рабочага месца. Выраб паштоўкі. Распазнанне стадый тэхналогій пры выбары і вырабе паштоўкі.

Прыкладнае вучэбнае заданне: віншавальная паштоўка, дэкарыраваная аплікацыяй.

ТЭХНАЛОГІЯ АПРАЦОЎКІ МАТЭРЫЯЛАЎ (19 гадзін)

Выкананне вырабаў з паперы і кардону (9 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі. Пашырэнне ўяўленняў пра віды і ўласцівасці паперы (калька, капіравальная, гафрыраваная папера) і кардону (паліграфічны, упаковачны).

Агульнае ўяўленне аб раз'ёмных (шчыліннае або з дапамогай надрэзаў) і нераз'ёмных (клеявое, пляценнем) злучэннях дэталей.

Асновы графічнай граматы: лінія нябачнага контуру, размерныя лініі. Графічныя адлюстраванні (эскіз, чарцёж).

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка чарцёжнымі інструментамі, выразанне па знешнім і ўнутраным контурах, згінанне, злучэнне дэталей рознымі спосабамі. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: розныя віды паперы, паліграфічны і ўпаковачны (гафрыраваны) кардон.

Дапаможны матэрыял: клей.

Інструменты, прыстасаванні: нажніцы, аловак, лінейка, вугольнік, *стэплер*, *дзіркакол**, памазок для клею.

Прафесійная арыентацыя. Прафесіі работнікаў паліграфічнай прамысловасці (прадмет, сродкі, прадукт працы; віды работ; прафесійна важныя якасці).

Міжпрадметныя сувязі

Матэматыка. Плошча. Абазначэнне адрэзка, трохвугольніка. Уласцівасці прамавугольніка і квадрата.

Выяўленчае мастацтва. Форма, яе часткі, узаемнае размяшчэнне частак. Рытмічнае чаргаванне форм, сіметрыя. Адзінства формы прадмета і аздаблення. Сувязь формы з прызначэннем. Паняцце пра яркія, кантрастныя, цьмяныя і мяккія колеравыя рашэнні. Эмацыянальны, вобразны змест колеру. Выбар становішча аркуша ў залежнасці ад зместу малюнка.

Практычная дзейнасць. Параўнанне ўласцівасцей паліграфічнага і ўпаковачнага кардону. Вывучэнне ўласцівасцей калькі і капіравальнай паперы.

Аналіз формы і спосабаў злучэння дэталей у вырабе. Выкананне вырабу па тэхнічным малюнку, эскізу, схеме з выкарыстаннем вывучаных тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і тэхналогіі выканання.

Прыкладныя аб'екты працы

Прыстасаванні для працы: закладка для кнігі.

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: рамкі для фатаграфій, шары (арыгамі), сувенірныя кашолкі, пано «Святочныя зоркі», «Кошык з кветкамі», «Сланечнікі» – аплікацыя.

Цацкі: фігуркі жывёл.

Выкананне вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў (6 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі. Агульнае ўяўленне аб шарсцяных, шаўковых тканінах. Шэрсць і шоўк – сыравіна для вытворчасці шарсцяных і шаўковых тканін. Перапляценне нітак у тканіне. Разнастайнасць тканін па малюнку (аднаго колеру, у гарошак, палоску, з кветачкамі і інш.). Правы і левы бок тканіны. Варыятыўнасць выкарыстання нітак. Пампоны. Ізанітка.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка, раскрой па прамалінейных і крывалінейных контурах, злучэнне дэталей сцяблістым швом, *швом «назад іголку»**, аздабленне сцяблістым і тамбурным швамі, *швом «пятля ўпрыкрэп»**, абвіванне кольцаў, сцягванне нітак, разрэзванне нітак, надрэзванне асновы для ізаніткі, перапляценне асновы ніткамі. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: баваўняныя тканіны (аднаго колеру і з пячатаным малюнкам), *ільняныя і шарсцяныя тканіны**, ніткі для шыцця, вышывання, пляцення.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, іголка, ніткаўдзявальнік, кравецкія шпількі, напарстак, крэйда кравецкая, аловак, лякала, лінейка, вугольнік.

Дапаможныя матэрыялы: папера, кардон, клей, пацерачкі.

Прафесійная арыентацыя. Мастак-мадэльер (прадмет, сродкі, прадукт працы; віды работ; прафесійна важныя якасці).

Міжпрадметныя сувязі

Матэматыка. Уласцівасць прамавугольніка і квадрата.

Выяўленчае мастацтва. Форма, яе часткі, узаемнае размяшчэнне частак. Адзінства формы прадмета і яго аздабленне. Сувязь формы з прызначэннем. Паняцце пра яркія, кантрастныя, цьмяныя і мяккія колеравыя рашэнні. Эмацыянальны, вобразны змест колеру.

Практычная дзейнасць. Параўнанне ўласцівасцей шаўковых і шарсцяных тканін: таўшчыня, трываласць, шчыльнасць, гладкасць. Выкананне вырабаў па ўзоры, схеме, графічнай выяве, *уласнай задуме** з выкарыстаннем вывучаных тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і тэхналогіі выканання.

Прыкладныя аб'екты працы

Прыстасаванні для працы: мяшэчак для рукадзелля.

Дэкаратыўныя элементы касцюма: насоўка з манаграмай.

Дэкаратыўныя элементы: афармленне вокладкі кнігі, альбома, рамка для віншавання, для гатовых работ – ізанітка.

Запрашэнні, віншавальныя паштоўкі: «Загадкавыя ўзоры» – ізанітка.

Цацкі: пальчыкавая лялька для дамашняга тэатра, пляскатыя мяккія цацкі, цацкі з пампонаў (пчолка, кацяня, зайчаня, парася, птушка).

Выкананне вырабаў з прыродных матэрыялаў (2 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Пашырэнне ўяўленняў аб прыродных матэрыялах, іх уласцівасцях (форма, колер, памеры). Варыятыўнасць выкарыстання.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: злучэнне дэталей з дапамогай пластыліну, клею. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: ракавінкі, каменчыкі, шалупайкі яек і інш.

Інструменты і прыстасаванні: стэкі, аловак, нажніцы, памазок для клею.

Дапаможныя матэрыялы: папера, пластылін, клей.

Прафесійная арыентацыя. Скульптар (прадмет, сродкі, прадукт працы; віды работ; прафесійна важныя якасці).

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Узаемасувязь фігур у скульптурнай кампазіцыі. Перадача характэрных рыс асноўнай формы і дэталей прадмета з выкарыстаннем фактуры і формы прыродных матэрыялаў. Асноўныя асаблівасці будовы цела чалавека і жывёліны, размяшчэнне частак цела ў руху. Перадача характэрных поз і рухаў жывёлы. Перадача настрою ў вобразе.

Практычная дзейнасць. Аналіз формы і канструкцыі вырабу, тэхналогіі выканання. Выкананне вырабаў па ўяўленні, па ўласнай задуме з выкарыстаннем вывучаных тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу, тэхналогіі выканання.

Прыкладныя аб'екты працы

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: міні-скульптуры: «Сябры», «Паўлін», «Лебедзі», «Царэўна-жаба», «Казачны домік», «Залатая рыбка», «Шчаня»; пано з шалупаек яек.

Цацкі: «Сувенірная крама».

Выкананне вырабаў з падручных матэрыялаў (2 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Агульнае ўяўленне аб пластмасах і іх уласцівасцях (лёгкасць, гнуткасць, трываласць, колер, святлопранікальнасць). Прымяненне пластмас.

Агульнае ўяўленне аб драўніне і яе ўласцівасцях (трываласць, колер, тэкстура, вільгацеўстойлівасць). Прымяненне драўніны.

Варыятыўнасць выкарыстання падручных матэрыялаў.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разметка, *рэзанне**, наклейванне, склейванне, *злучэнне сшываннем**, *афарбоўка**. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: розныя пластыкавыя флаконы, драўляныя вырабы (палачкі для марожанага, прышчэпкі, дэталі драўлянага канструктара і інш.).

Інструменты: нажніцы, памазок для клею, пэндзаль, аловак, лінейка, *тоўстая іголка**.

Дапаможныя матэрыялы: папера, тканіна, ніткі, прыродныя матэрыялы, клей, *акварэльныя або акрылавыя фарбы**.

Прафесійная арыентацыя. Сталяр (прадмет, сродкі, прадукт працы; віды работ; прафесійна важныя якасці).

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Перадача характару галоўнай формы, яе частак, іх узаемнага размяшчэння. Асноўныя асаблівасці будовы цела чалавека і жывёліны, размяшчэнне частак цела ў руху. Перадача характэрных поз і рухаў жывёл. Перадача настрою ў вобразе.

Практычная дзейнасць. Аналіз формы і канструкцыі вырабу. Выкананне вырабаў па ўзоры, малюнку, *уласнай задуме** з выкарыстаннем вывучаемых тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і тэхналогіі выканання.

Прыкладныя аб'екты працы

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: ваза для кветак, ваза для садавіны, упрыгожанні для стала.

Цацкі: фігуркі казачных персанажаў, мадэлі транспартных сродкаў.

ТЭХНАЛОГІЯ НАРОДНЫХ РАМЁСТВАЎ (11 гадзін)

Выцінанка (3 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Узоры для выцінанкі: геаметрычныя, раслінныя, зааморфныя. Асноўныя правілы састаўлення ўзору. Шасціпрамянёвая разеткавая выцінанка.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: складванне, выразанне, наклейванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: белая і каляровая папера.

Інструменты: нажніцы, аловак.

Дапаможныя матэрыялы: клей-карандаш.

Прафесійная арыентацыя. Знаёмства з творчасцю беларускіх народных майстроў. Прафесійна важныя якасці майстра.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Рытмічнае чаргаванне форм, сіметрыя.

Літаратурнае чытанне. Узбагачэнне слоўнікавага запасу.

Практычная дзейнасць. Выкананне вырабаў па ўзоры, *па ўласнай задуме** з выкарыстаннем вывучаемых тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і тэхналогіі выканання.

Прыкладныя аб'екты працы

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: «Узоры прыроды», праект ажурнай агароджы варот, балконаў або шалёўкі, бардзюра.

Дэкаратыўныя элементы для афармлення інтэр'ера: пано, навагоднія ўпрыгажэнні.

Вязанне кручком (4 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Агульнае ўяўленне аб матэрыялах для вязання кручком. Віды нітак, іх прымяненне і ўласцівасці. *Адпаведнасць нумара кручка таўшчыні нітак**.

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: вязанне паветранага вочка, паўслупка, наклейванне ланцужкоў. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: ніткі для вязання.

Інструменты: кручок, нажніцы.

Прафесійная арыентацыя. Знаёмства з творчасцю беларускіх народных майстроў.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Паняцце пра яркія, кантрастныя, цьмяныя і мяккія колеравыя рашэнні. Эмацыянальны, вобразны змест колеру. Адзінства формы і аздаблення. Сувязь формы прадмета з яго прызначэннем.

Літаратурнае чытанне. Узбагачэнне слоўнікавага запасу.

Практычная дзейнасць. Выкананне вырабаў па ўзоры, малюнку з выкарыстаннем вывучаных тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і тэхналогіі выканання.

Прыкладныя аб'екты працы

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: «Мелодыя ветру», «Вясёлка» – контурныя аплікацыі.

Дэкаратыўныя элементы касцюма: упрыгажэнні з ланцужкоў.

Цацкі: птушанятка, свінка, вожык з ланцужкоў паветраных вочак.

Фларыстыка (2 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Расліны для стварэння аб'ёмных кампазіцый. Правілы збору і засушвання раслін. Правілы аранжыроўкі раслін: прапорцыі, *сіметрыя, асіметрыя, ураўнаважанасць*.*

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: наклейванне, абрэзка, звязванне пучкоў, размяшчэнне на аснове і мацаванне. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: расліны, засушаныя з захаваннем аб'ёмнай формы.

Інструменты і прыстасаванні: нажніцы, аснова для мацавання раслін (грыб губа, каробкі, пластыкавыя ўпакоўкі).

Дапаможныя матэрыялы: папера, пластылін, ніткі.

Прафесійная арыентацыя. Фларыст (прадмет, сродкі, прадукт працы; віды работ; прафесійна важныя якасці).

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Паняцце пра яркія, кантрастныя, цьмяныя і мяккія колеравыя рашэнні. Эмацыянальны, вобразны змест колеру. Перадача характэрных рыс асноўнай формы і дэталей прадмета з выкарыстаннем фактуры і формы прыродных матэрыялаў. Адзінства формы прадмета і аздаблення.

Практычная дзейнасць. Выкананне вырабаў па ўзоры, *уяўленні**, малюнку з выкарыстаннем вывучаемых тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і тэхналогіі выканання.

Прыкладныя аб'екты працы

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: восеньскі букет, насценныя ўпрыгажэнні, «Фларыстычны калаж».

Саломапляценне (дэкаратыўныя «павукі») (2 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Падрыхтоўка трубчатай саломкі да работы. Змяненне ўласцівасцей саломкі пры ўвільгатненні. Спосабы злучэння дэталей. Віды ўпрыгожвання гатовых вырабаў (каляровымі ніткамі, тасьмой).

Асноўныя тэхналагічныя аперацыі: разразанне на часткі, нанізванне, перавязванне пучка, *перапляценне саломін ніткамі**. Патрабаванні да якасці выканання.

Асноўныя матэрыялы: саломка або пластмасавыя трубачкі для кактэйлю.

Інструменты: нажніцы, тоўстая іголка.

Дапаможныя матэрыялы: ніткі.

Прафесійная арыентацыя. Народны майстар саломапляцення. Знаёмства з творчасцю беларускіх народных майстроў.

Міжпрадметныя сувязі

Выяўленчае мастацтва. Форма, яе часткі, узаемнае размяшчэнне частак. Адзінства формы прадмета і ўпрыгожання.

Чалавек і свет. Расліны поля.

Практычная дзейнасць. Параўнанне ўласцівасцей сухой і вільготнай саломкі. Выкананне вырабаў па ўзоры, малюнку, уласнай задуме з выкарыстаннем вывучаемых тэхналагічных аперацый. Ацэнка гатовага вырабу і тэхналогіі выканання.

Прыкладныя аб'екты працы

Дэкаратыўныя элементы інтэр'ера: кутасік, сонейка, «павук» (калектыўная праца).

Цацкі: ёлачныя ўпрыгажэнні.

ТЭХНАЛОГІЯ ГАСПАДАРАННЯ (2 гадзіны)

Забеспячэнне побыту сям'і (2 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Догляд адзення. Дробны рамонт адзення.

Карнавальны касцюм і маска.

Прафесійная арыентацыя. Майстар па рамонту адзення.

Міжпрадметныя сувязі

Беларуская мова. Этыка маўлення, пабудова дыялогу.

Літаратурнае чытанне. Развіццё маўлення.

Практычная дзейнасць. Прышыванне гузікаў з дзвюма адтулінамі, *чатырма адтулінамі*.*

Выраб масак.

ТЭХНАЛОГІЯ РАСЛІНАВОДСТВА (1 гадзіна)

Догляд пакаёвых раслін (1 гадзіна)

Тэарэтычныя звесткі. Пашырэнне ўяўленняў аб кветкава-дэкаратыўных раслінах: настурцыі, календуле, касмеі і інш. Правілы падрыхтоўкі насення аднагадовых раслін да сяўбы. Догляд раслін.

Прафесійная арыентацыя. Садавод (прадмет, сродкі, прадукт працы; віды работ; прафесійна важныя якасці).

Міжпрадметныя сувязі

Чалавек і свет. Раслінны свет.

Практычная дзейнасць. Падрыхтоўка насення да сяўбы. Падрыхтоўка глебы. Сяўба насення. *Догляд пасеваў. Назіранне за ростам раслін*.*

Я І МІР ТЭХНАЛОГІЙ (1 гадзіна)

Падвядзенне вынікаў года. Аналіз лепшых вырабаў. Гульня «Загадка Самадзелкіна».

Рэкамендацыі па нарыхтоўцы летам прыроднага матэрыялу, неабходнага для працы ў IV класе (жалуды, каштаны, шышкі, галінкі дрэў і інш., расліны, засушаныя з захаваннем аб'ёмнай формы, саломка).

Практычная дзейнасць. Выкананне калектыўнай работы з выкарыстаннем вывучаных матэрыялаў і асвоеных тэхналагічных аперацый.

Прыкладнае выніковае заданне. Калектыўная работа «Падводнае царства».

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Вучні павінны:

кіравацца правіламі: бяспечнай працы; арганізацыі рабочага месца; беражлівых адносін да інструментаў; эканомнага расходавання матэрыялаў; працоўнай дысцыпліны;

мець уяўленне: пра асноўныя стадыі тэхналогіі (ідэя, вобраз, план, выкананне, ацэнка); асноўныя патрабаванні да якасці вырабу; асноўныя ўласцівасці вывучаных

матэрыялаў; выцінанку, фларыстыку, саломапляценне, вязанне кручком; аднагадовыя кветкавыя расліны; прафесіі, з якімі пазнаёміліся;

распазнаваць вывучаныя матэрыялы, інструменты і прыстасаванні;

характарызаваць вывучаныя спосабы злучэння дэталей;

чытаць і разумець графічнае адлюстраванне паслядоўнасці выканання вырабаў, схемы складвання арыгамі;

ажыццяўляць (выконваць): арганізацыю рабочага месца; вывучаныя тэхналагічныя аперацыі выканання вырабаў (пад кіраўніцтвам настаўніка па ўзоры, малюнку); ацэнку якасці гатовага вырабу і працэсу яго выканання; прышыванне гузікаў; падрыхтоўку і пасадку насення аднагадовых раслін.

Выкарыстоўваць набытыя навыкі ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

планаваць сваю дзейнасць і кантраляваць яе ход;

ажыццяўляць арганізацыю свайго рабочага месца;

ажыццяўляць тэхналагічны працэс выканання вырабаў пад кіраўніцтвам настаўніка або дарослага па ўзоры, эскізе, малюнку;

ажыццяўляць апрацоўку і ўпрыгожванне гатовых вырабаў;

выконваць прасцейшы догляд пакаёвых раслін;

выконваць правілы асабістай гігіены і бяспечнай працы з матэрыяламі, інструментамі, электрапрыборамі;

праяўляць любоў да працы і прыроды, павагу да людзей працы і вынікаў іх дзейнасці; уважлівасць, адказнасць і добрасумленнасць; акуратнасць і беражлівасць; дакладнасць, рацыянальнасць і эканомнасць працоўных дзеянняў; дысцыплінаванасць і стараннасць, цярплівасць і настойлівасць у дасягненні запланаванага выніку; назіральнасць, творчасць і мастацкі густ; аб’ектыўнасць і аргументаванасць сама- і ўзаемаацэнкі; самастойнасць і ўзаемадапамогу; імкненне да самаадукацыі, самавыхавання і самаразвіцця.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Фізічная культура і здароўе»
для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання

ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І ЗДАРОЎЕ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Фізічная культура і здароўе» вырашае задачы агульнай фізкультурнай адукацыі, рознабаковага фізічнага, інтэлектуальнага, духоўна-маральнага развіцця і аздараўлення вучняў.

Змест вучэбнага прадмета накіраваны на ўмацаванне здароўя, прафілактыку захворванняў, фарміраванне здаровага, фізічна актыўнага ладу жыцця вучняў; аказвае развіваючы ўплыў на светапогляд вучняў, фарміруе псіхічныя, псіхафізічныя, маральна-валявыя і іншыя якасці асобы. Рэгулярныя фізкультурна-аздараўленчыя вучэбныя заняткі спрыяюць аднаўленню і павышэнню разумовай і фізічнай працаздольнасці вучняў.

Спецыфічнай асаблівасцю вучэбнай праграмы па прадмеце «Фізічная культура і здароўе» з’яўляецца выкарыстанне на кожным уроку разнастайных сродкаў фізічнага выхавання для вырашэння трэадзінай задачы адукацыі, выхавання і аздараўлення вучняў.

Мэтай вывучэння вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі з'яўляюцца фарміраванне фізічнай культуры асобы і аздараўленне вучняў з улікам іх узроставых асаблівасцей.

Адукацыйныя задачы:

фарміраванне даступных у малодшым школьным узросце фізкультурных ведаў;

фарміраванне рухальных уменняў і навыкаў;

навучанне спосабам фізкультурнай дзейнасці;

развіццё здольнасці прымяняць засвоеныя фізкультурныя веды, выкарыстоўваць рухальныя ўменні і навыкі ў пазаўрочны час;

фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў бяспечных паводзін пры правядзенні арганізаваных і самастойных гульняў і фізкультурных заняткаў у экалагічна неспрыяльных умовах.

Выхаваўчыя задачы:

выхаванне адносін да ўласнага здароўя і здароўя іншых як да каштоўнасці;

развіццё патрэбнасці ў рэгулярнай фізкультурна-аздараўленчай і спартыўнай актыўнасці;

садзейнічанне гарманічнаму фізічнаму, духоўна-маральнаму, інтэлектуальнаму і эмацыянальнаму развіццю;

выхаванне дысцыплінаванасці, сумленнасці, стараннасці, калектывізму, спагадлівасці, смеласці;

фарміраванне міжасобасных адносін з аднагодкамі ў працэсе фізкультурнай і спартыўнай дзейнасці.

Аздараўленчыя задачы:

прафілактыка захворванняў, стрэсавых станаў;

фарміраванне навыкаў здаровага, фізічна актыўнага ладу жыцця;

умацаванне фізічнага здароўя вучняў;

развіццё каардынацыйных і кандыцыйных здольнасцей;

садзейнічанне рознабаковаму фізічнаму развіццю;

фарміраванне правільнай паставы.

Для павышэння аздараўленчага эфекту вучняў урокі па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» праводзяцца на адкрытых прышкольных пляцоўках.

Змест вучэбнай праграмы размеркаваны па наступных раздзелах:

«Асновы фізкультурных ведаў»;

«Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці»;

«Развіццё рухальных здольнасцей» (табл. 1).

Тэмы раздзела ***«Асновы фізкультурных ведаў»*** вывучаюцца на ўроках фізічнай культуры і здароўя на працягу навучальнага года ў форме непрацяглых гутарак (5–10 хвілін) і прадугледжваюць фарміраванне ў вучняў ведаў і ўяўленняў пра фізічную культуру як частку агульнай культуры чалавека.

Раздзел ***«Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці»*** ўключае пералік фізічных практыкаванняў, якія складаюць змест «школы рухаў»: разнавіднасці хадзьбы, бегу; скачкі, кіданне, лажанне, перамяшчэнне на лыжах, плаванне; элементы спартыўных і рухавых гульняў, практыкаванні ў раўнавазе і ў вісе, акрабатычныя практыкаванні.

Змест раздзела **«Развіццё рухальных здольнасцей»** прадстаўлены рухавымі гульнямі і гульнёвымі заданнямі, тэставымі практыкаваннямі для вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў.

Вучэбная праграма прадугледжвае пераважнае выкарыстанне гульнёвай формы правядзення ўрокаў, што павышае эфектыўнасць вырашэння наступных задач:

замацаванне і ўдасканаленне рухальных уменняў, навыкаў і вывучаных спосабаў дзейнасці;

развіццё каардынацыйных (дакладнае ўзнаўленне прасторавых, часавых і сілавых характарыстык рухаў, іх тэмпу і рытму; захоўванне раўнавагі; хуткае і своечасовае рэагаванне на зменлівыя сітуацыі; узгодненасць адначасовых і паслядоўных рухаў

рознымі часткамі цела) і кандыцыйных (хуткасных, сілавых, хуткасна-сілавых, агульнай вынослівасці, гнуткасці) здольнасцей.

Спецыфіка вучэбнай праграмы «Фізічная культура і здароўе» прадугледжвае:

строгі дыферэнцыраваны падбор вучэбнага матэрыялу з улікам яго засваення вучнямі, аднесенымі па стане здароўя да асноўнай і падрыхтоўчай медыцынскіх груп[1];

штогадовае выкананне ўніфікаваных тэставых практыкаванняў для вызначэння індывідуальнага ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў (у III класе – два разы на вучэбны год – у верасні і маі). Умовы выканання тэставых практыкаванняў для індывідуальнага вызначэння ўзроўню развіцця рухальных якасцей вучняў выкладзены ў Дадатку;

цесную ўзаемасувязь зместу ўрокаў фізічнай культуры і здароўя з рухальнай актыўнасцю вучняў у рэжыме вучэбнага і падоўжанага дня, рэгулярным удзелам у фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемствах.

[1] Вучні, аднесеныя па стане здароўя да спецыяльнай медыцынскай групы, займаюцца па асобных вучэбных праграмах, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і ўзгодненых з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Прыярытэтнымі для вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» з'яўляюцца:

агульнавучэбныя ўменні і навыкі: назіранне, аналіз, вымярэнне, ацэнка, параўнанне, удзел у дыялогу;

універсальныя спосабы дзейнасці: даследаванне нескладаных практычных сітуацый, звязаных з вырашэннем рухальных задач пераважна ва ўмовах гульнёвай дзейнасці;

фізкультурныя кампетэнцыі: *маторная* (рухальная), *самакантролю* ў час заняткаў, *агульнакультурная* кампетэнцыя (у пытаннях узнікнення і адраджэння Алімпійскіх гульняў, дасягненняў на іх айчынных спартсменаў).

Вынікі засваення вучэбнага прадмета «Фізічная культура і здароўе» сфармуляваны ў вучэбных патрабаваннях да вучняў, якія заканчваюць I, II, III і IV класы. *Прыярытэтам вучэбнага прадмета* з'яўляецца асваенне зместу, значнага:

для станаўлення гуманістычнай накіраванасці асобы;

павышэння эмацыянальнай насычанасці вучэбнай дзейнасці вучняў;

фармавання індывідуальных норм дзейнасці і паводзін на ўроках;

станаўлення каштоўнасных адносін да свайго здароўя;

самастойных заняткаў фізічнымі практыкаваннямі;

вядзення здаровага, фізічна актыўнага ладу жыцця.

Вучэбна-метадычнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце «Фізічная культура і здароўе» рэгламентуецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь[2].

[2] Пералік і нормы забеспячэння спартыўным інвентаром і абсталяваннем, неабходнымі для арганізацыі фізічнага выхавання вучняў пры атрыманні імі агульнай сярэдняй, спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, правядзення з імі фізкультурна-аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемстваў (зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 14.07.2014 № 105).

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

Табліца 1

Прыкладнае размеркаванне вучэбнага матэрыялу

Раздзелы, тэмы вучэбнага матэрыялу	Колькасць гадзін
Асновы фізкультурных ведаў	2
Асновы бяспекі заняткаў	0,5
Гігіенічныя веды	0,25
Здаровы лад жыцця	0,5
Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі	0,25

Алімпізм і алімпійскі рух	0,5
Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці	68
Страявыя практыкаванні	3
Агульнаразвіццёвыя практыкаванні	4
Хадзьба	2
Бег	6
Скачкі	6
Кіданне	6
Лажанне	5
Акрабатычныя практыкаванні	10
Практыкаванні ў раўнавазе	4
Элементы спартыўных і рухавых гульняў	14
Перамяшчэнне на лыжах[1]	8
Плаванне[2]	да 16 гадзін
Развіццё рухальных здольнасцей[3]	
Рухавыя гульні і гульнявыя заданні	+
Вызначэнне ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў[4]	+
Прыкладныя рэкамендацыі па тыднёвым рухальным рэжыме	+
УСЯГО	70

[1] Пры бясснежнай зіме замяняецца вучэбным матэрыялам іншых тэм.

[2] Пры наяўнасці ўмоў для навучання плаванню ў аб'ёме да 16 гадзін за кошт часткі «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

[3] Час, які адводзіцца на кожным уроку на развіццё рухальных здольнасцей навучэнцаў, уваходзіць у разлік гадзін адпаведнай тэмы раздзела «Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці».

[4] Плануецца на апошнія два тыдні навучальнага года.

Асновы фізкультурных ведаў

Асновы бяспекі заняткаў. Правілы бяспечных паводзін вучняў у месцах заняткаў фізічнай культурай. Правілы пазбягання ўздзеяння наступстваў аварыі на ЧАЭС і іншых неспрыяльных экалагічных фактараў мясцовага значэння.

Гігіенічныя веды. Патрабаванні да спартыўнага адзення і абутку ў розныя поры года. Пераахалоджванне і меры папярэджання. Значэнне і правілы закальвання. Уплыў заняткаў фізічнымі практыкаваннямі на разумовую працаздольнасць вучня.

Здаровы лад жыцця. Шкодныя звычкі і іх адмоўны ўплыў на здароўе вучня. Правілы і нормы здаровага, фізічна актыўнага ладу жыцця. Рухальны рэжым вучня ў розныя поры года.

Самастойныя заняткі фізічнымі практыкаваннямі. Правілы выканання практыкаванняў для павышэння разумовай працаздольнасці пры падрыхтоўцы дамашніх заданняў. Практыкаванні для фарміравання правільнай паставы.

Алімпізм і алімпійскі рух. П'ер дэ Кубертэн – заснавальнік сучаснага алімпійскага руху. Зімнія і летнія Алімпійскія гульні. Віды спорту, уключаныя ў праграму зімніх і летніх Алімпійскіх гульняў.

Уменні, навыкі, спосабы дзейнасці

Страявыя практыкаванні: выкананне каманд «Шырэй крок!», «Часцей крок!», «Радзей крок!», «Проціходам па адным налева і направа ў абход – марш!», «Змейкай – марш!»; пастраенне ў дзве шарэнгі, перастраенне з дзвюх шарэнг у два кругі.

Агульнаразвіццёвыя практыкаванні: рыўковыя і кругавыя рухі рукамі; махавыя рухі нагамі; выпады наперад, убок, назад; прысяданні з рознаіменнымі рухамі рук (адна ўбок, другая наперад; адна ўверх, другая ўбок і г. д.); прысяданні і выпады з адначасовымі кругавымі рухамі рукамі; нахілы, выпады і прысяданні з гімнастычнай палкай, з мячом, са скакалкай у руках; комплекс практыкаванняў ранішняй гімнастыкі.

Хадзьба: са зменай даўжыні і частаты крокаў, з пераступаннем цераз прадметы, прыстаўным крокам у правы і левы бакі, выпадам улева і ўправа, ступаючы ў кольцы або ў кругі, у прысядзе, скрыжаваным крокам улева і ўправа, спіной наперад.

Бег: са змяненнем скорасці, у зададзеным тэмпе, з пераадоленнем умоўных перашкод, з перадачай эстафет, 30 м на час, на адлегласць на працягу 6 мінут, чаўночны бег 4 х 9 м.

Скачкі: на месцы штуршком дзвюх ног з паваротам на 180°, у глыбіню, у вышыню з разбегу цераз рызінку, цераз кароткую і доўгую скакалку на дзвюх і на адной назе, па «па класах» папераменна на адной або на дзвюх нагах, у даўжыню з месца штуршком дзвюма нагамі.

Кіданне: кідкі набіўнога мяча дзвюма рукамі ад грудзей наперад-уверх; знізу ўперад-уверх на далёкасць і зададзеную адлегласць; кіданне малога мяча з месца з зыходнага становішча стоячы тварам у бок кідання на далёкасць, на зададзеную адлегласць, у гарызантальную і вертыкальную цэль (гімнастычны абруч) з адлегласці 4–5 м.

Лажанне: па гімнастычнай лесвіцы ў гарызантальным напрамку з паваротам 360° у вертыкальным напрамку аднайменным і рознаіменным спосабамі.

Вісы: віс на сагнутых руках (хлопчыкі); размахванне выгінамі ў вісе на перакладзіне; падцягванне ў вісе на высокай (хлопчыкі) і ў вісе стоячы на нізкай (дзяўчынкі) перакладзіне.

Акрабатычныя практыкаванні: паўшпагат і шпагат з апорай на рукі; кулёк наперад у групоўцы; перакат управа (улева) са стойкі на правым (левым) калені, левая (правая) нага ўбок на насок, рукі ў бакі; «мост» са становішча лежачы на спіне.

Практыкаванні ў раўнавазе: на рэйцы перавернутай гімнастычнай лаўкі (на гімнастычным бервяне); хадзьба на насках, прыстаўным крокам у правы і левы бок, павароты на 180° і 360° стоячы на дзвюх нагах, упор прысеўшы, упор стоячы на калені, саскок прагнуўшыся з упору прысеўшы.

Элементы спартыўных і рухавых гульняў: перакідванне тэніснага мяча адно аднаму з лоўляй дзвюма рукамі; падкідванне ўверх тэніснага мяча; падкідванне ўверх тэніснага мяча з наступнай лоўляй аднайменнай і рознаіменнай рукамі.

Кідкі валейбольнага мяча[1] адной і дзвюма рукамі адно аднаму з лоўляй дзвюма рукамі; падкідванне валейбольнага мяча і лоўля дзвюма рукамі з двума-трыма воплескамі, з адскокам ад падлогі, з адным-двума крокамі ўправа і ўлева, з паваротам на 180° і 360°; перакідванне мяча ў парах цераз сетку дзвюма рукамі ад грудзей, ад галавы, адной рукой ад пляча з лоўляй дзвюма рукамі; удары мячом аб падлогу адной рукой з высокім, сярэднім і нізкім адскокам; кідкі мяча адной і дзвюма рукамі ў вертыкальную цэль (гімнастычны абруч, ніжні край якога на вышыні 1,5–2 м ад падлогі).

Вядзенне футбольнага мяча[2] адной нагой, папераменна правай і левай нагой па прамой, «змейкай», васьмёркай; чаўночны бег з вядзеннем мяча папераменна правай і левай нагой; вядзенне нагамі адначасова двух мячоў; спыненне мяча, які коціцца, правай і левай нагой; перадачы мяча ў парах адно аднаму правай і левай нагой; удары па нерухомым мячы ўнутраным бокам ступні, сярэдзінай пад'ёма з пападаннем у вароты, жангліраванне мячом адной нагой; эстафеты з вядзеннем і перадачамі мяча нагамі.

Перамяшчэнне на лыжах: папераменным двухкрокавым ходам; з раўнамернай скорасцю да 1,5 км; пад'ём «паўелачкай» і «лесвічкай» па пакатым схіле, спускі ў высокай і нізкай стойцы; павароты пераступаннем у руху, тармажэнне «паўплугам».

Плаванне: спад у ваду са становішча седзячы на борціку рукі ўверсе; скачок у ваду ўніз нагамі; выдыхі ў ваду з паваротам галавы; слізганне лежачы на грудзях і на спіне; рухі нагамі спосабам «кроль» з апорай рукамі аб дно, борцік басейна, з падтрымкай партнёра; узгодненыя рухі рук з дыханнем (стоячы на дне, у спалучэнні з хадзьбой); плаванне з дапамогай ног з апорай рукамі аб дошку, з дапамогай ног і грабкоў адной рукой з розным становішчам другой рукі; з дапамогай рук; праплыванне адрэзкаў 6–12 м з поўнай каардынацыяй рухаў.

РАЗВІЦЦЁ РУХАЛЬНЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ

Рухавыя гульні і гульнявыя заданні

Развіццё каардынацыйных і кандыцыйных рухальных здольнасцей на ўроках фізічнай культуры і здароўя дасягаецца ў працэсе шматразовага паўтарэння фізічных практыкаванняў і спосабаў дзейнасці, а таксама ўдзелу ў рухавых гульнях і выкананні спаборніцкіх заданняў.

У III класе неабходна планаваць і ажыццяўляць мэтанакіраванае развіццё асноўных рухальных здольнасцей з акцэнтаваным развіццём скорасна-сілавых здольнасцей ног, статычнай раўнавагі і агульнай вынослівасці (хлопчыкі, дзяўчынкі), статычнай сілавой вынослівасці мышцаў – згібальнікаў рук (дзяўчынкі) сілы мышцаў – разгібальнікаў рук (хлопчыкі, дзяўчынкі), гнуткасці (дзяўчынкі, дынамічнай сілавой вынослівасці мышцаў – згібальнікаў тулава (хлопчыкі, дзяўчынкі), дынамічнай сілавой вынослівасці мышцаў – згібальнікаў рук і гнуткасці (хлопчыкі).

Гульні і гульнявыя заданні з выкананнем страявых каманд: «Хутка ў круг», «Слухай каманду», «Музычная задумка», «Дакладны паварот», «Запомні свой колер», «Пляцень», «Шышкі, жалуды, арэхі», «Перамена месцаў».

Гульні і гульнявыя заданні для ўдасканалення каардынацыйных здольнасцей: «Карусель», «Забаронены рух», «Два лагеры», «Арэшак», «Святлафор», «Фігуры», «Пастух і воўк», «Спрытны верабей», «Метка», «Шчупак», «Вяроўка-змейка», «Парашутысты», «Ліса і куры», «Бізунчык», «Займай сваё месца», «Праз купіны і пянёчкі», «Квач», «Уюны».

Гульні і гульнявыя заданні з бегам: «Паспрабуй дагнаць», «Бег тройкамі», «Поезд», «Пасадка гародніны», «Дзень-ноч», «Каманда хутканогіх», «Птушкі ў гнёздах», «Кругавая эстафета».

Гульні і гульнявыя заданні са скачкамі: «Скачкі па палосках», «Хто вышэй?», «З купіны на купіну», «Зайцы ў агародзе», «Ліса і куры», «Квач на адной назе», «Квач прысеўшы», «Эстафета са скачкамі».

Гульні і гульнявыя заданні з кіданнем: «Паспрабуй адбяры!», «Перадаў – сядай», «Перакідванне мячоў», «Мяч – капітану», «Гонка мячоў па крузе», «Эстафета з мячом», «Зямля, вада, паветра».

Гульні і гульнявыя заданні з перамяшчэннем на лыжах: «Квач просты», «Хто далей?», «Шырэй крок», «Хто самы хуткі?», «За мной!», лыжная эстафета без палак.

Гульні і гульнявыя заданні на вадзе ў басейне: «Дэльфіны», «Уюны», «Мачта», «Хто вышэй выскачыць?», «Карасі і карпы», «Вадалазы», «Барацьба за мяч», эстафеты з дошкай, з мячом.

Гульня з выкананнем тэставых практыкаванняў «Выконвай без памылак».

Вызначэнне ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў

Тэставыя практыкаванні выконваюцца вучнямі ў пачатку і канцы навучальнага года. На працягу аднаго ўрока рэкамендуецца планаваць і выконваць не больш за два тэставыя практыкаванні. Крытэрыі вызначэння ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей вучняў прадстаўлены у табліцах 2, 3.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Мець уяўленне:

аб правілах здаровага ладу жыцця;

шкодных прывычках і іх негатыўным уплыве на стан здароўя;

станоўчым уплыве здаровага, фізічнага ладу жыцця на стан здароўя;

алімпійскай сімволіцы; летніх і зімовых відах спорту, якія ўключаны ў праграму Алімпійскіх гульняў.

Ведаць і выконваць:

патрабаванні здаровага ладу жыцця;

аптымальны рухальны рэжым у вучэбныя і невучэбныя дні;

правілы папярэджання траўматызму на ўроках фізічнай культуры і здароўя і падчас самастойных заняткаў;

гігіенічныя патрабаванні да спартыўнага адзення і абутку для заняткаў фізічнай культурай;

комплексы практыкаванняў для прафілактыкі міяпіі і скаліёзу.

Валодаць навыкамі і спосабамі выканання:

страявых каманд стоячы на месцы і ў руху;

гульнёвых заданняў і заданняў з характарам спаборніцтва з выкарыстаннем фізкультурнага інвентару;

самастойна развучаных рухомых гульняў;

тэставых практыкаванняў з дасягненнем індывідуальна максімальных вынікаў.

Выкарыстоўваць набытыя веды, уменні, навыкі на ўроках і ў паўсядзённым жыцці:

для выканання патрабаванняў здаровага ладу жыцця;

выканання правіл бяспечных паводзін падчас фізкультурна-аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемствах;

выканання ранішняй гімнастыкі і фізкультурных мінутак;

падтрымання правільнай паставы;

удзелу ў развучаных рухавых гульнях;

выканання тэставых практыкаванняў у адпаведнасці з іх умовамі;

самастойнага ўтрымання на вадзе і плавання з апорай на плавацельную дошку[1].

[1] Пры арганізацыі навучання навыкам плавання.

Табліца 2

Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей дзяўчынак III класа

№ п/п	Тэставае практыкаванне	Узроўні развіцця рухальных здольнасцей, балы									
		Нізкі		Ніжэйшы за сярэдні		Сярэдні		Вышэйшы за сярэдні		Высокі	
		1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
1	Бег 30 м (с)	7,3 і больш	7,2	6,9	6,6	6,5	6,3	6,2	6,1	5,9	5,8 і менш
2	Чаўночны бег 4 х 9 м (с)	13,3 і больш	13,2	12,7	12,4	12,2	12,0	11,9	11,6	11,4	11,1 і менш
3	Скачок у даўжыню з месца (см)	114 і больш	115	120	125	129	134	138	141	147	152 і больш
4	Падыманне тулава з зыходнага становішча лежачы на спіне за 30 с (разоў)	13 і менш	14	16	17	18	19	20	21	22	24 і больш
5	Нахіл уперад (см)	–4 і менш	–3	0	2	3	5	6	8	10	12 і больш
6	6-мінутны бег (м)	770 і менш	780	890	930	980	1000	1030	1080	1120	1190 і больш
	або										
	бег 800 м (мін, с)	6,11 і больш	6,10	5,46	5,33	5,20	5,08	4,55	4,34	4,30	4,17 і менш

Табліца 3

Шкала ацэнкі ўзроўню развіцця рухальных здольнасцей хлопчыкаў

№ п/п	Тэставае практыкаванне	Узроўні развіцця рухальных здольнасцей, балы									
		Нізкі		Ніжэйшы за сярэдні		Сярэдні		Вышэйшы за сярэдні		Высокі	
		1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
1	Бег 30 м (с)	6,9 і больш	6,8	6,6	6,5	6,4	6,2	6,1	5,9	5,8	5,6 і менш
2	Чаўночны бег 4 х 9 м (с)	12,8 і больш	12,7	12,5	12,2	11,9	11,7	11,4	11,2	10,9	10,7 і менш
3	Скачок у даўжыню з месца (см)	119 і менш	120	124	129	134	139	144	149	154	159 і больш
4	Віс на сагнутых руках (с)	2 і менш	5	7	10	13	15	20	21	23	26 і больш
5	Нахіл уперад (см)	–9 і менш	–7	–4	–2	0	2	4	5	8	10 і больш
6	6-мінутны бег (м) *або* бег 1000 м (мін, с)	910 і менш 6,54 і больш	920 6,53	1000 6,38	1040 6,22	1080 6,07	1110 5,52	1150 5,37	1200 5,22	1230 5,06	1280 і больш 4,51 і менш

Дадатак

УМОВЫ ВЫКАНАННЯ ТЭСТАВЫХ ПРАКТЫКАВАННЯЎ

Бег 30 метраў праводзіцца на прамой бегавой дарожцы стадыёна. Дапускаецца выкарыстанне высокага ці нізкага старту. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Вучню, які парушыў правілы спаборніцтваў па бегу (фальстарт, забяганне на суседнюю дарожку), можа быць дадзена адна дадатковая спроба. Вынік бегу вымяраецца з дакладнасцю да 0,1 секунды.

Чаўночны бег 4 х **9 м** выконваецца ў спартыўнай зале на палавіне валейбольнай пляцоўкі. Колькасць удзельнікаў у адным забегу – не больш за 2 чалавекі. Кожнаму вучню даецца дзве спробы запар. Па камандзе «На старт!» вучні падыходзяць да лініі старту (як правіла, гэта сярэдзіна валейбольнай пляцоўкі), па камандзе «Увага!» прымаюць становішча высокага старту па напрамку пярэдняй лініі, дзе насупраць кожнага вучня ляжаць 2 брускі 50 х 50 х 100 мм на адлегласці 100 мм адзін ад аднаго (рыс. 1).

Па камандзе «Марш!» вучні бягуць да пярэдняй лініі, бяруць кожны па адным бруску (не закрануўшы другі), паварочваюцца і бягуць назад. Падбегшы да лініі «старт-фініш», кладуць на яе (або за яе) брусок (кідаць нельга!), разварочваюцца і бягуць за бруском, які застаўся. Падбегшы да лініі, бяруць свой другі брусок, разварочваюцца, бягуць да лініі «старт-фініш» і, не зніжаючы скорасці, перасякаюць яе з бруском у руках.



Рыс. 1

Час выканання практыкавання бегу кожным вучнем фіксуецца з дакладнасцю да 0,1 секунды. Залічваецца лепшы вынік з двух спробаў.

Скачок у даўжыню з месца выконваецца штуршком дзвюма нагамі на падлозе спартыўнай залы. Кожнаму вучню даецца тры спробы запар. Не дапускаецца выконваць скачкі ў яму з пяском. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 сантыметра. Залічваецца лепшы вынік з трох спроб.

Віс на сагнутых руках выконваецца на гімнастычнай перакладзіне з зыходнага становішча віс хватам зверху. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Па камандзе настаўніка (адначасова ўключаецца секундамер) вучань прымае зыходнае становішча віс на сагнутых руках. Пры гэтым падбародак павінен быць на ўзроўні або вышэй за ўзровень перакладзіны. Секундамер выключаецца тады, калі падбародак вучня апусціцца ніжэй за ўзровень перакладзіны. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 1 секунды.

Падыманне тулава са становішча лежачы на спіне за 30 секунд выконваецца на гімнастычным маце з зыходнага становішча лежачы на спіне, рукі скрыжаваныя перад грудзьмі, далоні на локцевых суставах, ступні ног зафіксаваныя. Вугал у каленным суставе складае 90°.

Кожнаму вучню даецца адна спроба. Падчас выканання практыкавання не дапускаюцца рыўкі рукамі. Залічваецца колькасць нахілаў тулава пры дотыку локцевых і каленных суставаў з наступным апусканнем на спіну і дотыкам лапаткамі гімнастычнага мата.

Нахіл уперад з зыходнага становішча седзячы на падлозе. Вучань садзіцца на падлогу, з боку знака «–» (мінус), пяткі на шырыні таза на лініі ОВ упіраюцца ва ўпоры для ног, стопы вертыкальна. Два партнёры з двух бакоў прыціскаюць яго калені да падлогі, не дазваляючы згінаць ногі.

Вучань кладзе адну далонь на тыльны бок другой, апускае рукі на падлогу, выконвае два папярэднія нахілы, слізгаючы далонямі рук уздоўж вымяральнай лінейкі па лініі СД. На трэцім нахіле вучань максімальна нахіляецца ўперад і ў гэтым становішчы затрымліваецца на 3 секунды. Вынік фіксуецца па метцы, дасягнутай кончыкамі самкнутых (!) сярэдніх пальцаў рук, і вызначаецца з дакладнасцю да 1 сантыметра (рыс. 2).



Рыс. 2

Бег 800, 1000 метраў выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна з высокага старту. Рэкамендуецца клас дзяліць на групу дзяўчынак і групу хлопчыкаў. Старт – групавы. Кожнаму вучню даецца адна спроба. Не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі названыя правілы, а таксама тым, хто не фінішаваў, вызначаецца нізкі ўзровень развіцця рухальных здольнасцей. Вынік бегу вымяраецца з дакладнасцю да 1 секунды.

6-мінутны бег выконваецца на бегавой дарожцы стадыёна, якая папярэдне пазначаецца на кожныя 10 ці 20 метраў. Рэкамендуецца праводзіць забегі асобна сярод хлопчыкаў і дзяўчынак. Група хлопчыкаў (дзяўчынак) стартуе адначасова. Падчас бегу настаўнік лічыць колькасць кругоў, якія пераадолелі вучні. Па заканчэнні 6 мінут настаўнік падае гукавы сігнал (напрыклад, свісток), пасля якога вучні пераходзяць на крок, запомніўшы месца, дзе яны пачулі сігнал. Затым настаўнік кожнаму індывідуальна вылічвае даўжыню пераадоленай дыстанцыі з улікам колькасці поўных кругоў і той часткі бегавой дарожкі, дзе вучань перайшоў на крок.

Пры выкананні тэставага практыкавання не дапускаецца пераходзіць на крок, спыняцца для адпачынку або «зразаць» дыстанцыю. Вучням, якія парушылі названыя правілы, а таксама тым, хто не фінішаваў, вызначаецца нізкі ўзровень развіцця рухальных здольнасцей. Вынік вымяраецца з дакладнасцю да 10 метраў.

УТВЕРЖДЕНО

Постановление
Министерства образования
Республики Беларусь
27.07.2017 № 90

**Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце
«Асновы бяспекі жыццядзейнасці»
для III класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання і выхавання**

АСНОВЫ БЯСПЕКІ ЖЫЦЦЯДЗЕЙНАСЦІ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Найважнейшай часткай сістэмы грамадскай бяспекі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца навучанне падрастаючага пакалення асновам бяспекі жыццядзейнасці, што замацавана ў Дырэктыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 сакавіка 2004 г. № 1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны».

Галоўная роля ў падрыхтоўцы падрастаючага пакалення да бяспечнай жыццядзейнасці адводзіцца ўстановам агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх вывучэнне ўсіх вучэбных прадметаў спрыяе фарміраванню ў вучняў сучаснага ўзроўню культуры бяспекі. Асаблівае месца займае вучэбны прадмет «Асновы бяспекі жыццядзейнасці», праз змест якога рэалізуецца падрыхтоўка вучняў да бяспечнай жыццядзейнасці ў рэальным навакольным асяроддзі – прыродным, тэхнагенным і сацыяльным. Толькі праз адукацыю можна забяспечыць павышэнне агульнага ўзроўню культуры насельніцтва краіны ў галіне бяспекі жыццядзейнасці і зніжэнне адмоўнага ўплыву «чалавечага фактару» на бяспеку жыццядзейнасці асобы, грамадства і дзяржавы.

Мэты навучання прадмету «Асновы бяспекі жыццядзейнасці» – фарміраванне ў вучняў вопыту бяспечных паводзін; развіццё асобасных, маральных і фізічных якасцей, якія забяспечваюць такія паводзіны; выхаванне адказных адносін да асабістай і грамадскай бяспекі.

Задачы навучання:

сфарміраваць у вучняў уяўленні пра асновы бяспекі жыццядзейнасці;

